Сямён Шарэцкі

# ІХ ЛЁСЫ ЗВЯЗАНЫ З ВІЛЬНЯЙ

KAMUNIKAT.org

Вільнюс 2001 г.

*У кнізе на прыкладзе жыцця некалькіх беларускіх патрыётаў паказаны лёс значнай часткі беларускага народа, якому давялося ва ўмовах двух самых крывавых іншаземных рэжымаў XX стагоддзя змагацца за адраджэнне сваёй нацыянальнай дзяржавы і культуры.*

KAMUNIKAT.org

## УВОДЗІНЫ

Жыццё кожнага чалавека - гэта адно імгненне ў развіцці таго ці іншага народа, а тым больш у развіцці ўсяго чалавецтва. Але ўся гісторыя апошніх складаецца з дзеянняў асобных людзей, якія жылі, тварылі, а пасля адыйшлі ў іншы свет. І кожны з іх, як асоба, аказаў свой пэўны, няхай сабе і не вельмі значны, уплыў на развіццё таго ці іншага гістарычнага працэса, або ўмацаванне і паляпшэнне матэрыяльнай базы. Гэта іх розумам і рукамі пабудаваны прыгожыя гарады і дарогі, створаны цудоўныя машыны і выдатныя гатункі садавіны, гародніны, збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур, пароды жывёлы, асушаны непралазныя балоты і праведзены каналы ў стэпах, пасаджаны новыя лясы, створаны бессмяротныя шэдэўры паэзіі, музыкі, мастацтва. І вельмі шкада, што абжыцці многіх мільёнаў людзей не застаецца з цягам часу ніякіх успамінаў, або нават і следу. У сувязі з гэтым чалавецтва страціла вельмі багаты вопыт, які ўняслі з сабою на той свет многія нашыя продкі. А ў той жа час, як адзначае вядомы беларускі гісторык Мікола Ермаловіч, “Гістарычны вопыт - гэта адна з тых, неабходных для народа ношаў, з якой ён бярэ патрэбныя для поступу наперад жыццёвыя рэсурсы. З свайго мінулага народ чэрпае ўласныя прыклады як таго, што натхняе, так і таго, што засцярагае ад паўтарэння зробленых памылак.” І ў гэтым плане каштоўным з`яўляецца вопыт кожнага чалавека, які жыў ці жыве на зямлі, а тым больш, калі ён сумленны сын свайго народа і займаецца стваральнай і грамадска-карыснай працай.

У Беларусі, на жаль, да апошніх гадоў вельмі мала выдавалася мемуарнай і іншай літаратуры, у якой расказвалася б аб жыцці і дзейнасці канкрэтных людзей. Адсутнасць гэткай літаратуры збядняе гісторыю народа, якая з`яўляецца апісаннем яго развіцця (асобных падзей, рэлігіі, літаратуры, мастацтва, эканомікі, грамадска-палітычнага ладу і іншых бакоў жыцця). Без апісання жыцця і дзейнасці канкрэтных людзей гісторыя заўжды будзе сухою

і бязлікаю.

Небагатая колькасць мемуарнай літаратуры і мастацка-біяграфічных аповедаў аб жыцці канкрэтных людзей у Беларусі тлумачыцца, на наш погляд, трагічнасцю самой гісторыі беларускага народа, якая яшчэ на зары яго развіцця была абарвавяна крывёю Полацкага князя Рагвалода і яго сыноў. Беларускі народ, як нацыя, яшчэ не паспеў як след выспець, як ужо страціў сваю дзяржаўнасць, у 1696 годзе была забаронена, як афіцыйная, яго мова. А калі ў апошняй чвэрці XVIII стагоддзя ён апынуўся ў складзе Расійскай імперыі, дык навогул быў адкінуты ў сваім развіцці на стагоддзе назад. У той час, калі ў Вялікім княстве Літоўскім ужо была праведзена аграрная рэформа і ў дзяржаўным будаўніцтве пачалі закладвацца некаторыя дэмакратычныя прынцыпы, Расійская імперыя перажывала яшчэ самы роскві т прыгоннага права і самаўладання. Кожная асоба была абмежавана ў сваіх дзеяннях. Згодна Граматы імператрыцы Кацярыны II, для вольнага насельніцтва і то была вызначана нават колькасць коней, якую яны мелі права запрагаць, каб ездзіць па горадзе. Напрыклад, знатным грамадзянам дазвалялася ездзіць у карэце параю ці чацвярнёю коней, купцам першай гільдыі - толькі параю, купцам другой гільдыі - у калясцы параю, а купцам трэцяй гільдыі забаранялася запрагаць і летам і зімою больш аднаго каня. А што тычыцца прыгонных сялян, дык усё іх жыццё рэгламентавалася памешчыкамі, без якіх яны не маглі ступіць і кроку.

Амаль усе гэтыя парадкі прыгоннага права былі адноўлены ў Савецкім Саюзе, які з`яўляўся спадкаемцам Расійскай імперыі. Устаноўлены ў выніку кастрычніцкага пераварота (1917 г.) бальшавіцкі рэжым у Петраградзе быў гвалтоўна экспартаваны і на тэрыторыю Беларусі. Людзі зноў былі апутаны вядомымі і невядомымі для іх правіламі, інструкцыямі розных арганізацый і прынятых дыктатарскім рэжымам законаў; а сяляне ў дадатак да гэтага былі яшчэ і наглуха “прыкаваны” да “свайго” калгаса. Без дазволу старшыні калгаса, як некалі і прыгонныя без дазволу памешчыка, яны не маглі выехаць нават на лячэнне. Прадоўжылася праводзімая царскімі ўладамі русіфікацыя іншых народаў.

У такіх умовах індывідуальнасць канкрэтнага чалавека тапілася ў агульнай масе таго пласта насельніцтва, да якога ён належаў. Улады імкнуліся трымаць людзей у пакорнасці і ўсімі сваімі дзеяннямі выхоўвалі ў іх псіхалогію не гаспадара свайго лёсу, а раба, які быў бы гатовы толькі працаваць і бездакорна

падпарадкоўвацца існуючым уладам. Таму для свайга самавыражэння большасць таленавітых беларускіх дзеячоў вымушаны былі шукаць месца за межамі свайго краю. А тыя, хто гэтага не змог зрабіць, пападалі ў няміласць уладам, або і наогул гінулі. Нямою сведкаю бальшавіцкага разбою сталі вядомыя ва ўсім свеце Курапаты.

Асабліва цяжкай была доля людзей ваеннага пакалення. Ім, у дадатак да сталінскіх рэпрэсій, давялося перажыць яшчэ і самую лютую вайну, якую толькі ведала чалавецтва. Помнікамі, якія нагадваюць людзям аб здзейсненых нямецка-фашысцкім рэжымам злачынствах на беларускай зямлі, з`яўляюцца Хатынь, Трасцянец і іншыя.

Кожны з людзей, каму давялося перажыць усе гэтыя пакуты, не страціўшы свой нацыянальны гонар, валодае бязцэнным жыццёвым вопытам, які патрэбна захаваць для будучых пакаленняў.

З часу сталінскіх рэпрэсій і заканчэння Другой сусветнай вайны мінула ўжо нямала часу. І гэта дае магчымасць паглядзець на паводзіны канкрэтных людзей і інтарэсы, якія імі рухалі ў тую пару, больш аб`ектыўна, без лішніх эмоцый. Бо пры аналізе гістарычных падзей і паступкаў іх удзельнікаў, як і пры разглядзе мастацкіх карцін, нельга ўявіць іх сапраўдную сутнасць, калі знаходзішся на блізкай ад іх адлегласці.

Нялёгкі час перажывае наш народ і зараз. Тая ж Расія, якая ўсё яшчэ ніяк не можа пазбавіцца ад таталітарызму, імкнецца трымаць пад сваім уплывам і Беларусь. Створаны ў рэспубліцы пры падтрымцы расійскіх шавіністычных колаў рэжым з`яўляецца па сваёй сутнасці не толькі дыктатарскім, але па свайму нацыянальнаму складу і адносінах да беларускага народа і акупацыйным. У якасці галоўнай сваёй задачы ён ставіць адраджэнне былой Расійскай імперыі і таталітарнага ладу, які існаваў у Савецкім Саюзе.

Да сучаснага моманту даюць аб сабе ведаць прыроджаныя плямы выхаванай стагоддзямі рабскай псіхалогіі і ў самога беларускага народа. Праўда, радуе тое, што ў апошнія гады ўсё больш і больш беларусаў ужо не толькі пачынаюць адчуваць сябе цэльнымі вольнымі асобамі, але і настойліва змагаюцца за незалежнасць сваёй Радзімы, шляхам правяддзення культурна-асветніцкай работы дапамагаюць астатняй частцы беларускага народа вызваліцца ад рабскай псіхалогіі. Названая дзейнасць стала

мэтай іх жыцця, бо яны разглядаюць яе як праяўленне сваіх асабістых патрэбаў жыць у незалежнай і вольнай краіне. Гэта людзі розных прафесій, у кожнага з іх сваё жыццё, але ўсе яны ганарацца сваёй прыналежнасцю да беларускага народа.

У дадзенай кнізе і расказваецца аб некаторых з гэткіх людзей, у прыватнасці, тых, з якімі мне пашчасціла спаткацца і побач працаваць, калі я жыў у Вільні. Розныя сцежкі прывялі сюды гэтых людзей, ды і прыехалі яны ў Вільню ў розныя гады: напрыклад, Хведар Нюнька - у час Другой сусветнай вайны, Ніна Брылеўская - у год вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. А Кастусь і Лёдзя Шышэі прыехалі сюды напачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя, павандраваўшы да гэтага на працягу доўгага часу па дарогах выпрабаванняў і пакутаў.

Пры напісанні біяграфічных аповедаў аб дадзеных асобах, акрамя іншых крыніцаў, выкарыстаны і іх асабістыя ўспаміны аб перажытым, бо вельмі важна ведаць, як яны самі ацэньваюць сваю дзейнасць і тыя падзеі, удзельнікамі якіх ім давялося быць. Менавіта толькі пры гэткім падыходзе ў чытача ёсць магчымасць сфармаваць на ўсё гэта і сваю думку.

Акрамя характарыстыкі галоўных асобаў, якім прысвечаны аповеды, значнае месца ў кнізе адводзіцца апісанню той мясцовасці, дзе гэтыя людзі нарадзіліся і жылі, а таксама расказу аб тых, з кім яны разам працавалі і працуюць, змагаючыся за нашу беларускую справу. Гэта дае магчымасць больш глыбока зразумець саміх герояў, якім прысвечаны дадзеныя аповеды, і адначасова ўзгадаць аб іншых вядомых беларускіх патрыётах.

На будучае лічу сваім абавязкам напісаць яшчэ некалькі аповедаў аб іншых вядомых беларусах - сваіх сучасніках, з якімі мяне ў розныя гады жыцця зводзіў лёс і якія пакінулі прыемныя ўражанні, - гэта мае настаўнікі, калегі па працы на сяле і кіраўнікі раёнаў, пісьменнікі і вучоныя, дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, а таксама тыя сумленныя беларусы, якія вымушаны былі пакінуць Радзіму і пасяліцца ў іншых краінах; але, нягледзячы на гэта, яны не забыліся аб сваім этнічным паходжанні і працягваюць змаганне за адраджэнне нашага ўласнага дому - беларускай нацыянальнай дзяржавы. Бо без гэткай дзяржавы нельга стварыць такія ўмовы, каб кожны чалавек мог быць гаспадаром свайго лёсу і жыць так, як ён сам хоча, канешне, не мешаючы пры гэтым іншым людзям рабіць тое ж самае.

# ЗМАГАР ЗА БЕЛАРУСКАСЦЬ
## (Хведар Нюнька)

У Еўропе цяжка назваць яшчэ адзін народ, у якога б так трагічна склаўся лёс, як у беларусаў. А здарылася гэта, мабыць, таму, што наша краіна размешчана ў самым геаметрычным цэнтры Еўропы, на скрыжаванні шляхоў з поўначы на поўдзень і з усходу на захад, а таксама на стыку дзвюх цывілізацый - заходняй, якая развівалася цэлыя стагоддзі пад уплывам рымска-каталіцкай царквы і яе вытворных пратэстанскіх канфесій, і ўсходняй, дзе вызначальнай з`яўляецца праваслаўная рэлігія з яе візантыйскімі традыцыямі чынапаважання і падпарадкавання царквы дзяржаве. Тэрыторыя Беларусі з`яўлялася на працягу доўгага часу месцам сутыкнення і барацьбы многіх плямёнаў і народаў за сваю веру і правы іх уладароў. Таму самі беларусы часта аказваліся ў вельмі цяжкім становішчы. У пошуках кавалка хлеба многія з іх выязджалі ў Амерыку, Сібір, Аўстралію, Заходнюю і Паўночную Еўропу, дзе і сёння жыве шмат нашых суайчыннікаў. Усе гэтыя беларусы па навуковаму лічацца эміграцыяй.

Але ёсць беларусы, якія апынуліся за мяжой Бацькаўшчыны ў выніку ўсялякіх перадзелаў тэрыторыі, прычым часта не на карысць Беларусі. Частка тэрыторый, дзе з даўніх часоў жылі і працягваюць жыць беларусы, апынулася сёння ў складзе суседніх дзяржаў. Гэткай тэрыторыяй з`яўляецца і Віленшчына, дзе беларусаў нельга назваць эмігрантамі, бо яны, разам з літоўцамі, з`яўляюцца тут прадстаўнікамі карэннага этнасу. Аднак і ў Віленскім краі ёсць многа беларусаў такіх, якія ў свой час пераехалі сюды з іншых раёнаў, прычым у тыя гады, калі Віленшчына адміністрацыйна не ўваходзіла ў склад Літвы. У сувязі з гэтым аб такіх беларусах нельга сказаць, што яны ў сённяшняй Літве эмігранты. Але, як бы там не было, на гэтых землях зараз пражывае вялікая колькасць людзей, што па-ранейшаму лічаць сябе беларусамі і сваёй роднай моваю - беларускую. Менавіта на беларускай мове яны размаўляюць паміж сабою ў час штодзённых адносін. Больш таго, многія з іх

праводзяць значную працу, каб дапамагчы сваёй роднай маці _ Беларусі - стаць на дэмакратычны шлях развіцця і ўвайсці ў еўрапейскія структуры. Сярод гэткіх беларусаў-віленчукоў, з якімі мне давялося пазнаёміцца, самай каларытнай асобай з`яўляецца старшыня грамадскага аб`яднання “Таварыства Беларускай Культуры ў Літве” Хведар Якубавіч Нюнька.

Нарадзіўся Хведар Якубавіч у вёсцы Алешавічы Шчучынскага павету (цяпер Мастоўскага раёна) 5 сакавіка (па іншых крыніцах - 6 красавіка) 1928 года. У той час Алешавічы былі невялікай вёскай - тут налічвалася 16 хатаў. Палова насельніцтва належала да каталіцкага веравызнання, а палова - да праваслаўнага. У вёсцы не было школы і ніякай культавай установы. Як і ў многіх іншых вёсках Заходняй Беларусі, у Алешавічах кожную суботу людзі падмяталі насупраць сваёй сядзібы вуліцу і навогул імкнуліся ўтрымліваць свой населены пункт у чысціні. Вёска Алешавічы была вядома ва ўсёй акрузе тым, што прыкладна з паўкіламетра ад яе знаходзіўся маёнтак пана Станіслава Незабытоўскага, які меў 6 тысяч гектараў ворнай зямлі і сенажацяў, а таксама 3 тысячы гектараў лесу. Затое ў саміх алешаўскіх сялян зямлі было няшмат - ад 2,5 да 8 дзесяцін. І толькі ў аднаго гаспадара мелася 16 дзесяцінаў. Так што кожны год алешаўцам прыходзілася прасіць у Незабытоўскага кавалак зямлі пад пашу, за што з панам яны разлічваліся шляхам адработак. На памешчыцкай сенажаці сяляне нарыхтоўвалі сабе і сена. Прычым, умовы былі кабальныя: патрэбна было сенаваць за адну чацвертую частку сена, а астатніх тры забіраў пан.

Маючы мала сваёй зямлі, сям`я Нюнькаў брала за невялікую плату ў арэнду зямлю і ў жыдоў, што жылі ў суседняй вёсцы Малевічы. Жыды, якіх у Малевічах жыло сямей дзесяць, сваёй зямлі самі амаль не апрацоўвалі, а займаліся галоўным чынам гандлем. На іх зямлі вельмі добра расла грэчка. Вось Нюнькі і сеялі там дзесяціну гэтай каштоўнай культуры.

Ад памешчыка Незабытоўскага алешаўскія сяляне залежалі яшчэ і тым, што іх нівы з усіх бакоў былі акружаны яго зямлёю. Гэта абавязвала сялян вельмі пільна глядзець за скацінаю, каб яна не зайшла на панскія ўгоддзі. Бо калі гэткае здаралася, пан даваў вялікі штраф, а калі штрафу не было чым плаціць, трэба было зноў-такі адпрацоўваць. У Алешавічах скаціну пасвілі не радоўкаю, як гэта рабілася ў больш вялікіх вёсках і сёлах, а

кожны пасвіў сам сваю. І гэта ўваходзіла ў абавязкі галоўным чынам дзяцей. Таму апошнія з малых гадоў прывучаліся да працы і дысцыпліны. Гадоў з дзесяці -двананццаці алешаўскія дзеці ўжо хадзілі і ў заробкі да пана Незабытоўскага - збіралі з канюшыны каменне, палолі і палівалі грады гародніны, выконвалі і іншую работу. Пры гэтым патрэбна адзначыць, што працоўны дзень як у сялянскіх гаспадарках, так і на панскім полі доўжыўся 10-12 гадзінаў. Вось за гэткі дзень у царскі час дзеці атрымлівалі ў пана 10 капеек. Каб параўнаць многа гэта ці мала, трэба сказаць, што боты каштавалі тады паўтара рубля.

У тыя гады, акрамя пасьбы скаціны, дзеці рана прыцягваліся да выканання і іншых работ, асабліва такіх, як рэзка сечкі, малацьба збожжа цэпам, выбіранне бульбы. Дапамагалі яны бацькам і пры нарыхтоўцы дроў. Усё гэта перадавалася ў беларускіх вёсках з пакалення ў пакаленне, што з гадамі выхавала ў народа гэткую рысу як працалюбівасць. А паколькі больш 90 працэнтаў беларусаў жыло ў вёсцы, дык яшчэ і гэткую - як павага да зямлі.

З вядомых людзей, якія ў той час жылі ў вёсцы Алешавічы, трэба назваць Бобрыка Івана, што служыў у Чапаеўскай дывізіі. Іван калі-нікалі распавядаў аднавяскоўцам аб вядомым чырвоным камандзіры. Меў Бобрык 8 гектараў зямлі. А што тычыцца Нюнькаў, дык у Алешавічах гэткае прозвішча насілі аж шэсць гаспадароў. І ва ўсіх іх было па 2,5 дзесяціны зямлі. Столькі зямлі меў і бацька Хведара - Якуб, які нарадзіўся ў 1901 годзе і пражыў доўгае і нялёгкае жыццё, аб якім ён паспрабаваў нават напісаць успаміны.

На жаль, успаміны Якуба Нюнькі нідзе не надрукаваны. Але паколькі яго жыццё з`яўляецца тыповым для лёсаў многіх сялян Заходняй Беларусі, дык мае сэнс з названых успамінаў нешта нагадаць. Больш таго, гэта дапаможа лепш уявіць, у якой сям`і нарадзіўся і выхоўваўся сын Якуба - Хведар, аб якім ідзе размова ў дадзеным расказе.

Паколькі сям`я Нюнькаў была малазямельнай і жыла небагата, дык Якуб, як і яго меншыя браты і сёстры, бываў у дзяцінстве на вуліцы толькі вясною і летам. А з надыходам халадоў, асабліва зімою, у двор выходзіў зусім рэдка. Большасць часу хлопчык праводзіў у хаце. З гадоў пяці-шасьці Якуб стаў выконваць усе тыя абавязкі, якія мелі і іншыя сялянскія дзеці ў такім узросце, тым больш, што ў сям`і сярод

дзяцей ён быў старэйшым. У школу Якуб пайшоў, калі яму споўнілася ўжо дзевяць гадоў. Хадзіць трэба было за 3 кіламетры ў суседнюю вёску - Ятвескае народнае вучылішча, якое давала чатырохкласную адукацыю. І паколькі ў тыя гады зімы былі марозныя і снежныя, дык у самыя маразы і завірухі бацькі падвозілі дзяцей у школу па чарзе. Усяго з Алешавічаў тады хадзіла ў школу дванаццаць дзяцей. У школах, калі хто не выконваў хатняга задання ці парушаў дысцыпліну, дзяцей білі і ставілі ў кут на калені, падсыпаўшы папярэдне гароху ці грэчкі, а не, дык і зусім дробных каменьчыкаў. Настаўнікам, што вучыў той клас, у які хадзіў Якуб, быў Іван Бялуга. Божы закон выкладаў святар мясцовай царквы Яўген Бекярэвіч. Асобным прадметам у школе была вайсковая справа, у час заняткаў на якой кожнаму вучню выдавалі драўляную вінтоўку, вучылі ўсім страявым прыёмам і нават гулялі ў ваенныя гульні. Заняткі па вайсковай падрыхтоўцы праходзілі тры разы на тыдзень. Скончыў Якуб вучылішча ў 1913 годзе “на выдатна”. Пасведчанне, выдадзенае па сканчэнні вучылішча, мела вялікі фармат, на ім у золаце змяшчаліся партрэты ўсіх членаў царскай сям`і. Яго падпісалі настаўнік Іван Бялуга і святар Яўген Бякярэвіч, а таксама інспектар.

У час летніх канікул Якуб, як і іншыя алешаўскія дзеці, хадзіў у заробкі ў агарод памешчыка Незабытоўскага. Агароднікам у пана ў тыя гады працаваў Сянкевіч, баптыст па веравызнанню. Таму ён больш маліўся, чым глядзеў за рабочымі, ён ніколі не прымушаў іх да працы. А вечарам пасля працы Сянкевіч часта заклікаў дзяцей да сябе дамоў і чытаў ім Біблію, вучыў іх пець святыя песні. Песні пелі па-руску, бо не было іх перакладу на беларускую мову. Адну з тых песень Якуб запамятаў на ўсё жыццё:

Известна нам церковь живая,
В которой отрадно так быть,
Христову любовь воспевая,
В нем жажду его нам хвалить.

А яшчэ чым запамятаўся Якубу агароднік Сянкевіч, дык гэта тым, як ён (Якуб), разам са сваімі аднагодкамі, хадзіў да яго купляць панскія яблыкі, якія захоўваліся ў склепе аж да вясны. Грошай у сялян у той час не было. Таму, каб ісці за пакупкай,

дзецям прыходзілася выпрошваць у маці некалькі яек. За адно яйка давалі адзін яблык. Але Сянкевіч дзецям давяраў, а, мабыць, і хацеў, каб яны ўзялі сабе некалькі яблыкаў і задарма. Таму, забраўшы ад іх яйкі, ён пасылаў за яблыкамі адных. А дзеці гэтым карысталіся і нагружалі ў кішэні столькі яблыкаў, колькі ў іх змяшчаліся. Узгадваючы аб гэткіх выпадках, Якуб у сваіх успамінах адзначыў: “былі жулікі”. Але ўспаміны пісаліся ўжо тады, калі Якуб стаў дзедам. А ў час дзяцінства яму, як і іншым дзецям, заўжды хацелася залезці ў чужы агарод, сарваць чужы яблык ці грушу. У такім узросце чужое здавалася нашмат смачнейшым, чым сваё. А тут не трэба было нікуды залазіць і рваць, яблыкі стаялі ў скрынках і ляжалі на паліцах. Таму не ўзяць лішні яблык у кішэню - гэта, на думку дзяцей, быў проста грэх.

Памятае Якуб, як аднойчы іх вёску наведалі цыганы, і ён, узяўшы таксама некалькі яек, разам са сваім малодшым братам Юзікам і іншымі алешаўскімі дзецьмі бегалі да цыганоў варажыць. Безумоўна, на гэты раз ён браў яйкі без запытання ў маці. Цыганкі гаварылі амаль усім дзецям стандартныя словы: вырасцеш, цябе забяруць у войска і гэтак далей. Але калі гэткія словы цыганка сказала і брату Якуба Юзіку, які тады часта хварэў, усе дзеці сталі смяяцца, маўляў, хто ж яго, хворага, будзе браць у нейкае войска. Аднак тая цыганка сказала праўду. Калі Язэп вырас, дык служыў у польскім войску поўны збор.

У 1914 годзе пачалася Першая сусветная вайна. Яна спачатку ішла недзе далёка ад Алешавічаў. Але, мабыць, ужо ў той час расійскія ўлады  былі няўпэўненыя ў сваіх сілах і рыхтавалі да абароны гарады Гарадзенскай губерні, безумоўна - у першую чаргу, сам губернскі цэнтр. Капаць акопы і канавы каля Гародні забіралі людзей і з Алешавічаў. А тым часам панікі ў вёсцы дадала яшчэ і вайсковая камісія, якая прыехала ў вёску адбіраць для патрэбаў вайны жывёлу. Неўзабаве мабілізавалі на працу для фронта разам з іншымі аднавяскоўцамі і бацьку Якуба - Івана. Праводзячы сваіх родных і блізкіх, людзі плакалі, а адна жанчына нават страціла прытомнасць. Калі бацька пайшоў з дому, Якуб застаўся самым старэйшым мужчынам у сям`і. Яму было тады чатырнаццаць гадоў. І калі ўлічыць, што ў ваенныя гады развіццё розуму ў дзяцей апярэджвае іх узрост, дык і Якуб лічыў сябе ўжо амаль дарослым мужчынам. Ён прыслухоўваўся да вясковых роспаведаў і на падставе іх

імкнуўся прымаць тыя ці іншыя свае рашэнні. Напрыклад, калі ў 1915 годзе фронт стаў набліжацца да Гародні, аб тым, што рабіць, у Алешавічах думкі раздваіліся: праваслаўныя святары агітавалі сваю паству адступаць у глыб Расіі, бо немцы, маўляў, усіх застаўшыхся паб`юць; а ксяндзы, нааадварот, гаварылі, што католікаў немцы біць не будуць, таму няма чаго кудысьці ехаць, трэба заставацца дома.

Маці Якуба таксама лічыла, што трэба заставацца разам з аднавяскоўцамі каталіцкага веравызнання дома, і што, маўляў, будзе ім, тое і нам. Больш таго, яна гаварыла, што нават сходзіць і папросіць у каталікоў ражанец, каб ад іх не адрозніваецца. Але Якуб, як малады гаспадар, сказаў, што трэба ехаць разам з аднаверцамі. І яго думка стала вырашальнай. На калёсах хутка зрабілі буду, у якую б маглі схавацца маці з меншымі дзецьмі, на воз паклалаі сякія-такія пажыткі, у тым ліку і двое парасятаў па месяцаў тры, а астатняе дабро закапалі ў зямлю на схаванне, і рушылі ў дарогу.

Выехаўшы на тракт, Якуб убачыў цьму-цьмушчую рухаючагася на ўсход народу. Усе ўцякалі далей ад вайны. На першы начлег спыніліся ў лесе. На вячэру зарэзалі адно з іх парасят. Якубу яно здавалася тады такім смачным, што хлопец, узгадваючы прыемны пах парасяціны, аблізваўся яшчэ дзён два.

Але хутка ўжо сталі чутнымі і выбухі бомбаў, снарадаў, што гаварыла аб набліжэнні вайны ў дадзеныя мясціны. Таму, каб хутчэй рухацца, людзі пачалі скідаць з вазоў амаль усё, без чаго толькі можна было абыйсціся. На дарозе валяліся кублы, бочкі, мяшкі, напоўненыя дабром, і нават скруткі палатна. Якуб таксама распароў мяшок і выпусціў пудоў са два жыта пад калёсы. Гэта ён зрабіў зноў-такі супраць волі маці.

Але было тут ужо не да матэрыяльных каштоўнасцяў. Людзі стаміліся. Асабліва цяжка пераносілі дарогу дзеці. Яны ўвесь час хацелі спаць і дзе сядзелі, там і засыналі. Аднаго разу, седзячы на калодцы кола, заснуў і Юзік. Таму, калі сталі спяшацца ехаць, і Якуб, не прыкмеціўшы меншага брата, пагнаў кабылу, дык Юзік патрапіў пад кола. Але, дзякуй Богу, устаў і пайшоў, як ні ў чым не бывала. Выратавала хлопчыка ад смерці, мабыць, тое, што пад коламі было вельмі шмат пяску.

Праз некалькі дзён дарогі людзі сталі гінуць як мухі. Аб гэтым сведчылі свежыя магілы і на скорую руку зробленыя крыжы, якія

часта прыходзілася бачыць на абочынах дарогі.

Сапраўды няма больш жахлівага злачынства супраць людзей, чым вайна. Яна нясе з сабою смерць, калецтва, сіроцтва, голад, холад і, мабыць, самае небяспечнае для людзей - паніку, якая ў многім павялічвае пералічаныя няшчасці. У час панікі чалавек страчвае арыентыры і губляецца ў сваіх дзеяннях. Так здарылася і ў тую вайну з беларусамі. Са Шчучынскага і іншых заходніх паветаў людзі ўцякалі ад вайны на ўсход, а жыхары Наваградскага павета знаходзілі сабе схованкі на захадзе - каля Зэльвы і ў іншых месцах.

Аб тым, што алешаўцам можна было заставацца ў сваёй вёсцы, гавараць і яшчэ адзін факт. Не даязджаючы да Менску, мноства падводаў бежанцаў сталі каля нейкай ракі. У гэты час праз яе пераправуляліся адступаючыя войскі, якія адначасова рыхтавалі мост, каб пасля сваёй пераправы яго спаліць. Але жыхары Алешавічаў стаялі ў чарзе на пераправу праз раку першымі, іх вайскоўцы яшчэ прапусцілі. А ўжо стаяўшых за імі людзей з суседняй вёскі Крывулькі праз мост не пусцілі. Яго запалілі. Пасля гэтага крывулькаўцы вярнуліся дамоў і там спакойна перажылі ўсю вайну.

Ну а тых, хто ехаў на ўсход, з Менску адпраўлялі вагонамі: каго ў Ніжні Ноўгарад, каго ў Сібір - куды хто жадаў. Якуб Нюнька і яшчэ чатыры знаёмыя яму сям`і вырашылі ехаць у Ніжні Ноўгарад, бо нехта сказаў, што ў названай губерні шмат фабрыкаў і заводаў, а значыць і лягчэй будзе ўладкавацца на працу. Прадаўшы за 300 рублёў кабылу і воз, Нюнькі пагрузіліся разам са знаёмымі ў адзін вагон - цялятнік. Дарога ад Менску да Ніжняга аказалася даўжынёю амаль у месяц, бо на станцыях стаялі вельмі падоўгу. Там бежанцам давалі бясплатна кіпяток і ўволю сухароў. Калі прыехалі ў Ніжні Ноўгарад і Якуб пайшоў у горад, ён здзівіўся не толькі велічынёю дамоў, але і тым, што тут гандлем займаліся самі расіяне, а не жыды, як гэта было ў Беларусі. Зайшоўшы ў крамы, беларусы-бежанцы пачалі таргавацца, чым выклікалі ў мясцовага насельніцтва смех, бо ў Расіі ў крамах ніхто не таргаваўся. Гэта ў Беларусі таргаваліся жыды, каб ашукаць пакупнікоў. Якуб купіў сабе чайнік.

З Ніжняга Ноўгараду бежанцаў павезлі параходам па рацэ Ака да станцыі Вакса. Па чыгунцы і на параходзе бежанцаў везлі бясплатна. У Ваксе іх чакала мясцовае начальства з прыехаўшымі за імі падводамі. Сям`ю Нюнькаў прызначылі ў

сяло Дзмітраўка, якое знаходзілася ад Ваксы на адлегласці 25 кіламетраў. Ехалі туды на падводах. У Дзмітраўцы налічвалася каля 300 дамоў. Тут былі царква, школа, валасная ўправа. Мясцовыя людзі сустрэлі бежанцаў з Беларусі ветліва. У прыватнасці, Нюнькам, як салдацкай і мнагадзетнай сям`і, далі някепскую кватэру, нанеслі хлеба, сала і іншых прадуктаў. Так што тыя 130 рублёў, якія плацілі маці на дзяцей за бацьку, нават сталі класці на ашчадную кніжку. Але Дзмітраўцы яшчэ і параілі хлопцам пайсці пажабраваць, патлумачыўшы пры гэтым, што ў тым няма ніякага сораму. І Якуб разам з меншым братам Язэпам пайшлі па хатах прасіць "міластыню радзі Хрыста". Гэта таксама дапамагала перажыць ваеннае ліхалецце. Больш таго, як пісаў у сваіх успамінах Якуб, праз некалькі дзён яму з братам ужо стала нават хацецца хадзіць па хатах і жабраваць. На гэтай падставе ён робіць выснову, што да жабрацтва, як і да курэння ці гарэлкі, можна прывыкнуць.

Але з кожным месяцам хлопцы станавіліся ўсё большымі і дужэйшымі. Таму ім захацелася мець больш прыстойны заробак, чым сабраныя шляхам жабрацтва кавалкі хлеба, бульба і іншыя прадукты. І яны разам з мясцовымі жыхарамі пайшлі нарыхтоўваць дровы. Дапамагаць ім узялася і маці. Праўда, з першага разу ў Нюнькаў нічога не атрымалася. Пры нарыхтоўцы дроў яны пілавалі сосны, прыгодныя на будаўнічы матэрыял, за што іх маглі аштрафаваць. Але, паколькі гэта былі бежанцы, ды сярод іх не было дарослага мужчыны, дык іх проста прагналі з лесу без усялякага штрафу. Аднак праз дні тры Нюнькі пайшлі ў лес зноў, прычым, на гэты раз ужо пілавалі галоўным чынам бярозу. За два тыдні яны нарыхтавалі 30 кубаметраў дроў, хаця іх шліхты аказаліся на 20 сантыметраў ніжэйшыя, чым патрабаваў стандарт. Але і гэта ім таксама даравалі і прынялі дровы за 30 кубаметраў, за што нядрэнна заплацілі.

Настаў 1916 год. Ад бацькі не было ніякіх звестак. Таму Якуб напісаў запыт у пашпартны стол Петраграда, які ўзначавальвала дачка цара Таня. Адказ на запыт прыйшоў праз два тыдні. У ім паведамлялася, што Нюнька Іван Пятровіч знаходзіцца ў Магілёве і працуе на хлебапякарні. Атрымаўшы адрас, паслалі бацьку пісьмо, у якім паведамілі, дзе знаходзяцца. А неўзабаве прыехаў ён і сам. З вяртаннем бацькі сям`я пераехала за 25 кіламетраў у тую ж Ваксу, а там

знаходзіўся драцяны завод, на якім працавала да 2 тысяч рабочых. Працоўны дзень доўжыўся 12 гадзін. Вось туды на працу і ўладкаваўся бацька. Стала лягчэй, тым больш, што пры заводзе працавала крама, у якой цэны былі адносна невысокімі. Дырэктарам завода працаваў немец Шварцбарт.

Аднак надышоў 1917 год з яго рэвалюцыйнымі песнямі і разбурэннямі. Для моладзі ўсё гэта спачатку было цікава і прыцягальна. У сваіх успамінах Якуб узгавадвае, з якім задавальненнм ён глядзеў на цягнік, які рухаўся па вузкай калейцы і быў увесь аблеплены чырвонымі сцягамі. Ехаўшыя на ім рабочыя спявалі песню: “Вставай, поднимайся, рабочий народ”. Шварцбарта прагналі і заводам стаў кіраваць рабочы камітэт. А тым часам у краіне пачалася неразбярыха. Стала адчувацца, што з павелічэннем колькасці рэвалюцыйных песень, лозунгаў, мітынгаў у крамах пачалі знікаць тавары, з`явіліся талоны. Стала голадна. Узмацняўся бандытызм. А ў 1918 годзе яшчэ пацяжэла. Нават рабочым харчы сталі адпускаць толькі па нормах: давалі 1 кілаграм аўсянай мукі на чалавека ў суткі. Спечаныя з яе ляпёшкі былі нясмачнымі і з асцюкамі. На чыгунцы з`явіліся мяшочнікі. Уся гэтая разруха, голад, адсутнасць належнай медыцынскай дапамогі сталі прычынай таго, што людзі пачалі павальна хварэць, а многія і паміраць. Сям`я Нюнькаў таксама страціла дваіх сваіх маленькіх дзяцей. І цяжка сказаць, як было б далей, каб восенню не з`явілася магчымасць вярнуцца дамоў.

Мяжу паміж новай бальшавіцкай Расеяй і тэрыторыяй, якая знаходзілася пад немцамі, пераехалі каля Оршы. Тут патрэбна было прайсці каранцін. У гэтым праявілася нямецкая пунктуальнасць і насцярожанасць. Немцы добра ведалі, якое становішча ў Савецкай Расіі, і таму баяліся, каб інфекцыйныя хваробы не пранік лі адтуль на тэрыторыю, дзе знаходзіліся іх войскі. Але да гэтага ў сям`і Нюнькаў прыбавілася яшчэ адна бяда - захварэў бацька Іван. Яго нават паклалі ў бальніцу. Аднак праз некалькі дзён стала ясна, што лекары слаба яму могуць дапамагчы - у яго была рожа. А таму патрэбна было шукаць спецыяліста з народнай медыцыны - знахара ці знахарку. І калі жонка Івана прывяла яе (знахарку) у бальніцу, дык, убачыўшы, што каля хворага з`явілася новая лекарка, доктар выгнаў яе. Дарэчы, прафесійныя лекары заўжды адносіліся раўніва да народных, мабыць, таму, што пры лячэнні некаторых хваробаў

адчувалі сваё бяссілле перад імі. Вось так здарылася і ў дадзеным выпадку: менавіта знахарака дапамагла Івану Нюньку і ён ачуняў. А Якуб у той час, як бацька лячыўся, не траціў марна часу: бегаў у Оршы на вакзал і падносіў чамаданы і такім чынам зарабляў грошы.

Даехаўшы да Ваўкавыска, патрэбна было зноў прайсці каранцін. З гэтай мэтай Нюнькаў памясцілі ў асобныя памяшканні, якія былі агароджаны калючым дротам. Выходзіць без дазволу з гэтага двара было нельга. Але ж і сядзець за дротам Якубу не хацелася. І таму, знайшоўшы ціхае месца, якое было нябачным для аховы, хлопец вылез і пайшоў у горад. Там яго прыкмеціў немец і па паводзінах хлопца зразумеў, што гэта не мясцовы жыхар. Немец затрымаў Якуба і прымусіў паказаць тое месца ў агароджы, праз якое ён вылез. А ў гэты час маці ўжо падняла гвалт і стала плакаць, бо нехта сказаў, што ўсіх тых, хто спрабуе парушыць устаноўлены каранцінам парадак, растрэльваюць. Аднак усё абыйшлося невялікім перапалохам.

Усім, хто прайшоў каранцін, немцы дазволілі вярнуцца дамоў. Гэта была ўжо позняя восень 1918 года. У панскім маёнтку гаспадарылі немцы. Якуб уладкаваўся там памочнікам повара. А бацька Іван, здабыўшы каня, стаў вазіць і пераганяць ваду, якая заставалася стаяць перамешанай са спіртам яшчэ з часу ад`езду тутэйшых людзей у бежанства, калі спірт выпусцілі з цыстэрнаў у канаву. Здабыты гэткім чынам спірт, ці дакладней гарэлку, Нюнькі прадавалі.

А тым часам на пачатку 1919 года пайшлі чуткі, што немцаў хутка прагоняць бальшавікі. Праз некалькі тыдняў немцы ўжо нават з`ехалі ў Шчучын. І тут сяляне хутка кінуліся рабаваць маёнтак. Але раптам немцы зноў вярнуліся, і ўсіх тых, хто хацеў скарыстацца неразбярыхаю і паквапіўся на дармавое багацце, сабралі каля солтыса, білі нагайкамі і прыкладамі, ад чаго некалькі чалавек нават памерлі, а аднаго навогул застрэлілі, калі ён спрабаваў забраць з маёнтка нейкую жывёліну. Пры гэтым трэба адзначыць, што і Нюнькі таксама прывялі тады дамоў з маёнтка быка і дзве авечкі, але змаглі своечасова ўцячы ад немцаў у лес. Пасля расправы немцы прымусілі ўсіх адвезці і аднесці нарабаванае дабро назад у маёнтак, што зрабілі таксама і Нюнькі: Якуб з бацькам.

Праз два месяцы немцаў усё ж такі сапраўды не стала. На тэрыторыю Заходняй Беларусі прыйшлі войскі Польшчы, а з імі

вярнулася і гаспадыня маёнтку, а разам - і ўсе былыя адносіны: за пашу патрэбна было адпрацоўваць, прыходзілася браць сенажаць на ўмовах адну частку сенаваць сабе, а тры - пані, дровы нарыхтоўваць без сякеры, пры падыходзе да панічоў, амаль за трыццаць крокаў, - здымаць шапку. Палякі зрабілі ва ўсіх вобыск, і ў каго была знойдзена гарэлка, а тым больш самагонныя апараты, усіх пасадзілі ў турму. Два тыдні ў турме сядзеў і Якуб.

У 1920 годзе ў Шчучынскім павеце з`явіліся бальшавікі. Іх войска ўразіла сваёй убогасцю: хто быў у ботах, хто ў чаравіках, а хто і навогул у лапцях. Чырвонаармейцы сталі прыцягваць мясцовае насельніцтва да падвозкі снарадаў і іншых боепрыпасаў. Не пазбег гэткай долі і Якуб. У той жа час бальшавікі нечым і падабаліся сялянам. Абмежаваўшы пані Незабытоўскую адным пакоем, яны далі магчымасць карыстацца палацам усім жыхарам Алешавічаў. У палацы налічвалася ўсяго каля ста пакояў. Там пачалі арганізоўвацца танцы, ставіцца спектаклі. Многім алешаўцам, асабліва бяднейшым, падабалася і тое, што самую пані бальшавіцкія ўлады прымусілі працаваць разам з усімі ў полі.

Аднак бальшавікі як прыйшлі, так хутка і пачалі ўцякаць. На іх месца заступілі палякі. І ў маёнтку аднавіліся ўсё тыя ж панскія парадкі. Безумоўна, што і палякі, жыўшыя на тэрыторыі Заходняй Беларусі, усё гэта віталі. Але беларусам радавацца не было чаго. Таму сярод мясцовых жыхароў-беларусаў таксама знайшліся людзі, якія зноў сталі думаць аб адраджэнні беларускай дзяржавы. Больш таго, у гэтым накірунку пачалі прадпрымацца і практычныя крокі. Якуб памятае, як ён быў у час прыстольнага свята ў вёсцы Раковічы, і там, адкуль ні вазьміся, з`явілася шэсць незнаёмых яму маладых хлопцаў, якія адкрыта выступалі і агітавалі за стварэнне сваёй незалежнай дзяржавы. Ён запамятаў нават іх зварот да сабраўшыхся вакол іх людзей: “Браткі! Нам няма чаго чакаць: бальшавікі ўжо зарганізаваліся, Польшча зарганізавалася, таму і нам таксама ня трэба спаць у шапку! Нас, беларусаў, шмат. Мы павінны стварыць сваю беларускую рэспубліку! І ўсе разам мы можам гэта зрабіць на сваёй Бацькаўшчыне!”. Узгадвае Якуб і аб тым, што ў іх вёсцы ведалі аб стварэнні ў Вільні з мэтай адраджэння незалежнай Беларусі нейкага Цэнтра. Ды і ў саміх вёсках таксама ствараліся беларускія гурткі. Асабліва актыўнічала

моладзь. Напрыклад, у тых жа Алешавічах ён сам быў абраным старшынёю гэткага гуртка. З Вільні Якубу дасылалі літаратуру і бланкі для ўліку членаў гуртка. І такі рух, хаця і не прывёў да перамогі, але не знікаў аж да самага 1939 года, нягледзячы на рэпрэсіі з боку польскіх уладаў.

Але жыццё патрабавала і іншага. Якуб стаў задумвацца, як жыць далей. Ён навучыўся іграць на гармоніку, для чаго спачатку здабыў старую хромку (граматыку), а пазней з`ездзіў у Ваўкавыск і купіў новы гармонік, як казалі, нямецкага строю. На ім Якуб сыграў нават дванаццаць вяселляў і на кожным зарабіў па 15 злотых. Праўда, за гэта патрэбна было гадзіны тры-чатыры “пілаваць”, але гэта быў заробак усё ж такі нядрэнны. Аднак патрэбна было думаць і аб больш сур`ёзным заробку. Таму Якуб разам з братам Язэпам вырашылі пайсці вясною і летам на заробкі ў лес, дзе займаліся галоўным чынам нарыхтоўкай драўляных брусоў даўжынёю 12 футаў (1 фут=30, 48 сантыметраў) і таўшчынёю 12 на 12 сантыметраў. За кожны такі брусок плацілі па аднаму злоту. А за працоўны дзень Якуб з Язэпам маглі зрабіць 12 гэткіх брускоў. Зімою браты шукалі заробку на будоўлі. Прычым, на першых парах работу прыходзілася шукаць самім. Ходзячы па вёсках, яны заўважалі, у чыім двары ляжаў лес, у хату таго і заходзілі з запытам, што гаспадар плануе з лесу рабіць. А з цягам часу аб Нюньках, як аб прафесійных будаўніках і сумленных хлопцах, пайшлі па вёсках чуткі. Таму ўжо шукаць іх пачалі самі сяляне, каму патрэбна было нешта будаваць. Разлічваліся з будаўнікамі галоўным чынам збожжам - 80 пудоў за зруб хаты. Займаліся браты і тым, што сталі купляць лес, будаваць з яго хаты, хлявы, гумны і прадаваць людзям; куплялі галоўным чынам тыя, хто прыехаў з Амерыкі, куды ў тыя гады некаторыя жыхары Заходняй Беларусі ездзілі на заробкі. Заняліся Якуб з Язэпам і сталяркай - рабілі вокны і дзверы. Дарэчы, займаючыся гэткай справай, Якуб прыглядзеў сабе ў суседняй вёсцы прыгожую дзяўчыну Ліду, якая і стала яго жонкай. Вяселле згулялі ў чэрвені 1925 года. А тым часам у 1926 годзе Якубу з братам Язэпам зноў пашчасціла. Яны выйгралі конкурс нават у дыпламаваных майстроў па рамонту царквы: трэба было паправіць пахілены на купале крыж і пафарбаваць бронзай іканастас. Конкурс Нюнькі выйгралі таму, што названую работу ўзяліся выканаць за 600 злотых, у той час, як іншыя майстры патрабавалі за яе 1200

злотых.

Але ў адзін з тых дваццатых гадоў, выконваючы заказ царквы, у Якуба былі і непрыемнасці. А справа заключалася ў наступным: перад Вялікаднем яму даручылі з`ездзіць у Гародню і купіць пэўную колькасць свечак і іншых неабходных царкоўных тавараў, за што, безумоўна, абяцалі заплаціць. Для гэтай мэты яму далі 100 злотых. Прыехаўшы ў Гародню і адыйшоўшы некалькі метраў ад вакзала, яго запыніў якісьці незнаёмы. Якуб прыпыніўся. Пасля чаго незнаёмец ветліва прывітаўся і стаў пытаць у Якуба, ці ведае ён, дзе можна памяняць залатыя рэчы на звычайныя польскія злоты. На што Якуб адказаў, што ён не тутэйшы і таму не ведае. Але ў гэты момант да іх падышоў ужо другі незнаёмы. Па знешняму выгляду было бачна, што гэта быў жыд, які ні з таго ні з сяго таксама прыпыніўся і запытаў, аб чым ідзе размова. Незнаёмец, папрасіўшы Якуба, каб той крыху затрымаўся, стаў тлумачыць, што ён з Чарнігаўскай губерні і яму патрэбны злоты, а для гэтага ў яго ёсць залатыя рэчы, якія ён хоча памяняць. Жыд папрасіў паказаць гэтыя рэчы. Незнаёмец доўга трымаў руку ў кішэні і ў рэшце рэшт дастаў пярсцёнак, сказаўшы пры гэтым, што ён гатовы аддаць залатую рэч за 15 злотых. Але жыд адразу перахапіў ініцыятыву і паабяцаў даць за пярсцёнак 20 злотых, каб незнаёмец прадаў яго толькі яму, а не Якубу. Пасля гэтага незнаёмец зноў звярнуўся да Якуба і папрасіў яго затрымацца яшчэ, за што паабяцаў заплаціць 3 злотых, маўляў, нехта падыдзе яшчэ і можа даць за прярсцёнак 25 злотых. Пачуўшы сказанае незнаёмцам, Якуб у душы здзівіўся і падумаў - вось як добра жыць у вялікім горадзе: нічога не рабіў, а ўжо, лічы, у кішэні ляжаць 3 злотых. А жыд тут жа пагадзіўся заплаціць і новую суму. Тады незнаёмец, глянуўшы спачатку на Якуба, а пасля на жыда, кажа: “Не, я табе не прадам. Лепш вось гэтаму чалавеку аддам за 13 злотых, чым жыду за 25”. Пасля гэткай размовы жыд, нібы пакрыўдзіўшыся, сказаў: “Ну няхай купляе ён”. А сам у гэты час міргнуў Якубу вокам, маўляў, купляй, а я пасля адкуплю пярсцёнак у цябе і ты на гэтым заробіш. Безумоўна, ад гэткага “халяўнага” заробку Якуб не ўстрымаўся, тым больш, што ў кішэні ляжалі царкоўныя грошы. Ён дастаў 15 злотых і забраў пярсцёнак. А незнаёмец, атрымаўшы грошы, хутка знік у натоўпе людзей, што, некуды спяшаючыся, ішлі па вуліцы. Пакуль Якуб адлічваў грошы, знік і жыд. А пасля высветлілася, што ён купіў у незнаёмца не залаты,

а дзіцячы цацачны пярсцёнак, які каштаваў толькі 5 грошаў. Радавала толькі тое, што ў гэты дзень Якуб купіў і ўсе неабходныя для царквы тавары, за што яму нядрэнна заплацілі.

Выпадак з пакупкай "залатога" пярсцёнка Якуб яшчэ доўга аналізаваў і лічыў для сябе гэты выпадак навукай, дарэчы, якая яму спатрэбілася ў 1932 годзе, калі ён меў ужо сваю краму і ездзіў за таварамі ў Гародню і Ваўкавыск. А тут вось нехта падказаў, што ў Беластоку гэткія тавары можна купіць нашмат танней. Таму, сабраўшы 2 тысячы злотых, ён сеў у аўтобус і паехаў у Беласток. Прыехаўшы ў названы горад, які для яго, у адрозненне ад Ваўкавыску ці Гародні, быў яшчэ незнаёмым, Якуб стаў шукаць аптовыя базы. Але раптам у гэты час яму спатрэбілася зайсці ў прыбіральню. І як толькі ён завярнуў у бліжэйшы двор, за ім зайшлі туды два незнаёмцы з кіямі. Якуб зразумеў, што гэта жулікі, якія прыкмецілі ў ім прыехаўшага з правінцыі гандляра. А незнаёмцы пытаюць: "Дзе тут можна памяняць золата на злоты?". Якуб імгненна ўзгадаў аб гарадзенскім пярсцёнку і, нават забыўшыся аб сваіх патрэбах, стаў "даваць задні ход". Балазе, у гэты час адыходзіў аўтобус у Ваўкавыск, у які ён і заскочыў. Заехаўшы ў Ваўкавыск, Якуб купіў неабходныя тавары і паехаў дамоў. Такім чынам, атрыманая некалькі гадоў назад у Гародні навука для Якуба не прайшла дарма. Дарэчы, стаўшы гандляром, ён спатыкаў таго незнаёмца, што калісьці яго падмануў з "залатым пярсцёнкам": гэты чалавек сапраўды быў родам з Чарнігаўшчыны, але жыў у Гародні і таксама меў сваю краму.

А тады, у другой палове дваццатых гадоў у Якуба і Ліды сталі нараджацца дзеці: спачатку дачка Аля, а пасля і сын Хведар, што ўскладніла адносіны Якуба і яго сям`і з бацькамі. Таму ён з задавальненнем успрыняў параду купца лесу Більчыцкага, жыда па нацыянальнасці, пераехаць у Масты і заняцца гандлем.

Тагачасныя Масты - гэта было мястэчка. Стаіць яно ў вельмі прыгожым месцы на беразе ракі Нёман пры ўпадзенні ў яе другой ракі - Зэльвянкі. У той час у Мастах пачала будавацца фабрыка па вырабу фанеры, на якую ў Польшчы быў попыт, а значыць, і добрая перспектыва для фабрыкі. І сапраўды, пабудаванае ў тыя гады прадпрыемства стала базавым для развіцця ў Мастах лесапераапрацоўчай прамысловасці. Зараз там існуе Мастоўскае вытворча-дрэваапрацоўчае аб`яднанне, у склад якога ўваходзяць мэблявая фабрыка і два цэхі: фанерных

і гнутаклеевых дэталяў, драўляна-стружкавых пліт. Самі Масты сталі ў 1955 годзе горадам і з`яўляюцца раённым цэнтрам.

Каб прыцягнуць з вёскі рабочую сілу, уласнік фабрыкі пан Канапацкі імкнуўся стварыць добрыя ўмовы для тых, хто перасяляўся ў Масты. Для забудовы дома ён даваў бясплатна пляц і ўсяляк падтрымліваў тых, хто вырашыў пакінуць сваё былое месцажыхарства. Пры гэтым цікава заўважыць, што ўсіх тых, каму ён даваў пляц, абавязкова папярэджваў, што дом патрэбна будаваць толькі дабротным. Для сябе Канапацкі пабудаваў такі дом, якіх, мабыць, не было і ў Вільні. Толькі на адным другім паверсе налічвалася каля 80 пакояў. У доме быў свой касцёл, а пад домам вялізны склеп для захоўвання на зіму гародніны і фруктаў.

Атрымаўшы пляц плошчай 0,12 гектара, Якуб з братам Язэпам купілі ў памешчыцы Незабытоўскай лес і хутка збудавалі зруб памерам 10 на 6 метраў. Зруб будавалі ў Алешавічах, а восенню 1929 года з дапамогай аднавяскоўцаў перавезлі яго ў Масты. Так што праз два тыдні зруб стаяў ужо на новым месцы. Таму Якубу не раз прыходзіла ў галаву думка аб эфектыўнасці талакі (калектыўнай дапамогі), якая ў Беларусі існуе з даўніх часоў.

Талака ўяўляла сабою праяўленне старажытнага калектывізму, які ў далёкія часы існаваў ва ўсходніх славян. Для выканання некаторых палявых работ (сенаванне, копка бульбы, малацьба збожжа і гэтак далей) сяляне склікалі сваякоў і іншых аднавяскоўцаў, што дапамагала значна скараціць час, а пасля і выкарыстоўваць машыны, напрыклад, малатарні, якія для іх абслугоўвання патрабуюць значнай колькасці рабочых. Талака шырока выкарыстоўвалася пры будаўніцтве хатаў, хлявоў і іншых забудоў, асабліва пры перавозцы лесу, зруба з аднаго месца на другое. У дні талакі пасля сканчэння працы гаспадар, каб аддзячыць памагатых, звычайна ўчыняў вячэру і, безумоўна, з чаркай.

Нюнькам спатрэбіўся нядоўгі час, каб у доме падрыхтаваць адзін пакой для жылля, а другі для крамы. Заставалася толькі адно - знайсці для першага завозу тавараў грошы. Але і тут Якубу пашанцавала: 100 даляраў пазычыў чалавек, які толькі што прыехаў з заробкаў з Амерыкі. Сведкамі пры падпісанні вэксаля, якія бралі на сябе абавязацельствы, калі Якуб не змог бы у прызначаны тэрмін вярнуць “амерыканцу” грошы і

выплаціць пэўную суму за аказаную паслугу, пагадзіліся зрабіць гэта самі, сталі бацька Іван і сваяк з Крывулек Гаўрыіл Граматка. Прыйшлося прадаць і пасаг жонкі - карову і нават некаторыя рэчы. Усё гэта, безумоўна, было ў пэўнай ступені рызыкай, але Якуба не пакідала і ўпэўненасць: фабрыка разрасталася, колькасць працуючых на ёй рабочых дасягнула 1000 чалавек і ўсім ім патрэбны былі харчовыя тавары.

За таварамі Якуб з братам паехалі ў Гародню. Падабраць іх асартымент дапамаглі тыя ж жыды, у якіх куплялі тавары, бо яны былі зацікаўленымі ў тым, каб Нюнькі хутчэй прадалі тавары і прыехалі за імі другі раз. Першым гандляром-аптавіком, да якога Нюнькі звярнуліся ў Гародні, быў Каплан. А параіў Нюнькам звярнуцца да Каплана Болтач, які меў краму ў сяле Ятвіск. Аптовая база Каплана размяшчалася ў самым цэнтры горада - на пляцы Баторыя. У той час Якуб і Язэп набралі солі, крупы, цукру, рыбы і іншых “хадавых” рэчаў. Спатрэбілася толькі чатыры гадзіны, каб крама зноў стала пустою. Праўда, прыйшлося прадаваць тавары не толькі за наяўныя грошы, але і ў крэдыт (пад запіс у сшытку) да атрымання рабочымі чарговага заробку. Але гэтак рабілі і жыды, і палякі, якія мелі ў Мастах таксама некалькі крамаў. Так што праз два дні Нюнькам прыйшлося зноў ехаць у Гародню за таварамі. Справы пайшлі добра і далей. Таму праз дзесяць месяцаў з дня адкрыцця крамы Якуб разлічыўся з “амэрыканцам” - вярнуў яму 100 даляраў і заплаціў за карыстанне пазыкай 200 злотых, ды і крама была поўная тавараў. Якуб стаў аўтарытэтным гандляром і сярод аптавікоў. Яны яго паважалі і яму верылі. Ён мог заказваць тавары для сваёй крамы нават па тэлефоне.

Безумоўна, што поспех у гандлёвай справе Якубу і яго брату Язэпу даставаўся не проста. Трэба было ўкласці і смякалку і шмат фізічнай працы, ноччу недаспаць. Каб хутчэй пайшлі справы, у хату пасяліліся, нягледзячы на тое, што яна яшчэ не прасохла, і таму на яе сценах у час марозаў ўзнікаў лёд. Першую зіму ў Мастах Якуб жыў без сям`і - Ліда з дваімі малымі дзецьмі зімавала ў Алешавічах. На першых парах прыходзілася на ўсім эканоміць. Самі елі тыя прадукты, якія не раскупаліся. Але галоўнае было дасягнута: Якуб стаў самастойным гаспадаром і меў сваю перспектыўную справу. Вось гэтыя рысы характару - любоў да працы, настырнасць пры дасягненні

пастаўленай мэты і ўменне паважаць сябе - Якуб не толькі захаваў на ўсё жыццё, але і перадаў іх свайму сыну Хведару, якога ў маленстве чамусьці называлі Эдзікам.

У 1932 годзе Якуб купіў мотаровар "Закс", набыў радыё, што маглі сабе дазволіць толькі польскія чыноўнікі і багатыя людзі. Калі ён ехаў на мотароварыы ў Алешавічы, заўжды браў з сабою бутэльку гарэлкі, каб пачаставаць сваіх знаёмых. Пры гэтым трэба адзначыць, што Якуб імкнуўся і ўмеў падтрымліваць добрыя адносіны з многімі людзьмі. Ён быў вельмі слоўны: калі што абяцаў, дык абавязкова выконваў. Таму яго паважалі і яму верылі. Якуб мог не толькі заказваць тавары па тэлефоне, але набраць у тых жа жыдоў тавараў без аплаты і без усялякіх пісьмовых абавязацельстваў, проста на слова. Многім хацелася стаць яго сябрамі. А знаёмыя ксяндзы прапанавалі Якубу перайсці ў каталіцкую рэлігію, на што ён, як чалавек прынцыпаў, пагадзіцца не мог.

Але людзі глядзелі на поспех Якуба ўсё ж такі па-рознаму: адны ганарыліся, што ў іх ёсць гэткі знаёмы, другія - зайздросцілі, а трэція палічылі, што, калі гэта зрабіў Якуб Нюнька, дык чаму гэтага не могуць зрабіць яны. А некаторыя нават і паспрабавалі адчыніць свае крамы. Праўда, у большасці гэткіх рызыкантаў нічога не атрымалася - яны хутка збанкрутавалі.

УЯкуба Нюнькі ўсё ладзілася паспяхова пакуль працавала фанерная фабрыка, а калі яна стала банкрутаваць і рабочыя пачалі атрымліваць несвоечасова і малы заробак, дык і гандаль таксама стаў малаэфектыўным. Ускладнілі працу крамы і самі адносіны ўласніка фабрыкі Канапацкага да Якуба. Фабрыкант даў рабочым загад не хадзіць у краму Нюнькі, а тым, хто дадзены загад не выконваў, пагражаў звальненнем з працы. З гэтай нагоды Канапацкі нават паставіў стоража, які ўвесь час наглядаў за крамай Нюнькі. На такія адносіны фабрыканта да Якуба Нюнькі пабудзілі дзве прычыны. Першая з іх заключалася ў тым, што Нюнька быў чалавекам левай арыентацыі, і, купіўшы радыё, часта ўключаў Маскву або Менск на поўную моц, асабліва на 1-ае Мая ці іншыя савецкія святы, і даваў слухаць бальшавіцкую прапаганду рабочым, што, безумоўна, фабрыканту зусім не падабалася. А другой прычынай стаў кур`ер Канапацкага Дамбоўскі, які з пачатку адкрыцця крамы з`яўляўся ў Нюнькі сталым і выгадным пакупнікам. Гэта быў

прыгожы сабою і заўжды апрануты ў новенькі касцюм кавалер, чым прыцягваў да сябе ўвагу не адной жанчыны. Калі казаць праўду, дык яму адзін час сымпатызавала і жонка Якуба Ліда. А дазволіць сабе гэткую роскаш у набыцці адзення ды і харчовых тавараў Дамбоўскі мог таму, што падабраў ключы ад панскай касы. Але, як кажуць, колькі вяровачка не вілася б, а канец будзе. Так атрымалася і ў дадзеным выпадку. Касір Канапацкага прыкмеціў, хто, акрамя яго, мае ключы ад сейфа. Аднак патрэбны быў доказ. І каб яго атрымаць, касір пачаў меціць грошы, а пасля іх шукаць у крамах. Праз некаторы час адну з грашовых купюраў касір прыкмеціў у краме Нюнькі. Для доказу патрэбна было толькі адно, каб гаспадар крамы сказаў на допыце ў паліцыі, хто гэтай купюрай разлічыўся з ім за тавар. Якуб гэтага не зрабіў, чым выклікаў да сябе з боку Канапацкага вялікую непрыемнасць.

Выхадам са склаўшагася становішча стала закрыццё крамы ў Мастах і пераезд на новае месца жыхарства, што і было зроблена ў 1936 годзе. Якуб Нюнька пераехаў у Шчучын і адкрыў там краму пісьмовых і галантарэйных тавараў. Справы і тут пайшлі нядрэнна, хаця крамаў у горадзе было шмат і на працэнтаў восемдзесят яны належалі жыдам. Якубу Нюньку зноў дапамаглі кемлівасць і ўменне падтрымліваць з людзьмі добрыя адносіны. Ён пазнаёміўся і ўвайшоў у давер з аптовымі фірмамі ў Беластоку, Гародні і нават Варшаве. Да верасня 1939 года ў краме налічвалася тавараў на 12 тысяч злотых.

Пераезд у Шчучын - гэта быў наступны крок, які зрабіла сям`я Нюнькаў у далучэнні да гарадскога жыцця. Справа ў тым, што Шчучын, як населены пункт, меў у тыя гады, у параўнанні з мястэчкам Масты, зусім іншы статус. З 1929 года ён лічыўся горадам і стаў цэнтрам павета, які належаў да Навагрудскага ваяводства. Праўда, з прыходам у 1939 годзе савецкай улады Шчучын зноў стаў лічыцца гарадскім пасёлкам. А тады, з пераездам у Шчучын, новае жыццё пачалося і ў Хведара. 1 верасня ён пайшоў у польскую школу. Іншых школаў у горадзе не было. Тагачасныя польскія ўлады, праводзіўшыя на акупаваных тэрыторыях Беларусі і Украіны паланізацыю, мабыць, добра разумелі, што гэта патрэбна пачынаць са школы. Канешне, перавод школаў на польскую мову навучання ажыццяўляўся супраць волі беларускага мясцовага насельніцтва. Як сведчыць Народны паэт Беларусі Максім Танк

(сапраўдныя імя і прозвішча - Яўген Скурко), многія жыхары Заходняй Беларусі нават збіралі подпісы ў абарону беларускіх школаў. Аднак мясцовыя ўлады збіралі подпісы людзей, якія, наадварот, выказвалі жаданне, каб іх дзеці вучыліся ў польскіх школах, бо, маўляў, “куды яны пададуцца ў людзі са сваёй мужыцкай мовай?”. А рабілі гэткія заявы, як падкрэслівае паэт, часцей за ўсё людзі “не па сваёй волі, а пад націскам асаднікаў, солтысаў, паліцыі, ксяндзоў і некаторых настаўнікаў, што прыехалі з Цэнтральнай Польшчы і перакананы, што гэтым робяць паслугу сваёй дзяржаве і свайму народу”.

* * *

Маючы левыя погляды, Якуб Нюнька сустракаў прыход Чырвонай Арміі з задавальненнем, прычым гэтага не хаваў: голасна выказваў прывітанні, абдымаў і цалаваў прыбыўшых у горад чырвонаармейцаў. У той час на плошчы з ім, трымаючы ў руках букет кветак, быў і сын Хведар. Якуб публічна скінуў польскі і павесіў савецкі чырвоны сцяг. Ён хутка распрадаў усе тавары і зліквідаваў краму, што выратавала яго ад высылкі “да белых мядзведзяў”, куды трапілі з устанаўленнем савецкай улады многія прадпрымальнікі.

За гэткую цёплую сустрэчу савецкай улады чырвоны камісар прызначыў Якуба Нюньку старшынём і даручыў яму сфармаваць мясцовыя дзяржаўныя органы. Але ад названай пасады Якуб хутка адмовіўся, мяркуючы, што ён і далей будзе працаваць у краме. Тым больш, што той жа самы камісар паабяцаў: “Усё будзе так, як было і дагэтуль”. Але вельмі хутка стала зразумелым, што сказанае ў той дзень чырвоным камісарам з`яўлялась не болей, чым падманам. Новая ўлада прынесла людзям не вызваленне, а толькі замяніла польскую акупацыю і паланізацыю тутэйшага насельніцтва на савецкую і русіфікацыю. Больш таго, разам з гэтай уладай у Заходнюю Беларусь прыйшлі збядненне, насілле і бяспраўе. У крамах зніклі тавары першай неабходнасці. За соллю, цукрам і нават за запалкамі ствараліся чэргі. Людзей масава арыштоўвалі і вывозілі на Поўнач і ў Сібір, а многіх арыштаваных навогул прападаў след. Выселілі з добрага дому, які належаў брату Язэпу, і сям`ю Якуба Нюнькі, пасля чаго яна пераехала на край горада і аж да вайны пражыла ў адным пакоі памерам 16 квадратных метраў. У лексіконе прыехаўшых з усходу начальнікаў стаў звычайнай з`явай мат.

Працаваць Якуб пачаў у райпатрэбсаюзе, ездзіў па вёсках і вучыў маладых прадаўцоў. Але напачатку 1941 года, у сувязі з даносам жыдоў, старшыня райпатрэбсаюза прапанаваў Нюньку падаць заяву аб звальненні з дадзенай працы па свайму жаданню, што ён і зрабіў. Наступную працу Якуб Нюнька знайшоў на станцыі Ражанка ў леспрамгасе бухгалтарам. Са станцыі адпраўлялі ў Германію лес. Дарэчы, апошнія вагоны з лесам так і засталіся неадпраўленымі. Пачалася вайна.

Вучоба Хведара пры савецкай уладзе праходзіла ў рускай школе, якая замяніла месца польскай. Ён першым з класа стаў піянерам. На савецкіх святах выступаў ад імя піянерскай арганізацыі з прамовамі на трыбуне. Яго лепшымі школьнымі сябрамі сталі вучні-жыды: Міша Марачынскі і Гары-Ісаак Сапір, лёс якіх з прыходам немцаў склаўся трагічна. Адзінаццацігадоваму падлетку тады цяжка было зразумець сапраўдную сутнасць савецкай улады, таму Хведар з энтузіязмам выконваў піянерскія даручэнні, нягледзячы нават на тое, што некаторыя яго недабразычліўцы пагражалі павесіць хлопца на чырвоным гальштуку.

Шчучын пачалі бамбіць ужо раніцай 22 чэрвеня 1941 года. Такая спешка немцаў была звязана з тым, што ў горадзе знаходзіўся вялікі аэрадром, з якога пасля бамбёжкі не падняўся ні адзін савецкі самалёт. Сярод людзей пачаўся перапалох. Сям`я Нюнькаў у гэты час толькі села за стол і пачала снедаць. Але ў сувязі з раздаўшыміся бесперапыннымі выбухамі сняданак кінулі, выбеглі ў двор, а пасля пачалі хавацца ў жыце. Безумоўна, ніякай схавані ў жыце ад наляцеўшых нямецкіх самалётаў не магло быць, бо зверху ўсё відаць. Аднак у час перапалоху людзі не заўсёды адэкватна ацэньваюць тое, што яны робяць. У першыя гадзіны вайны да выступлення Вечаслава Молатава амаль ніхто не ведаў, што здарылася: чаму нямецкія самалёты бамбяць аэрадром. А калі стала вядома, што пачалася вайна, прыехаўшыя з прыходам савецкай улады чыноўнікі сталі ўцякаць на ўсход. Якуб Нюнька з сям`ёю таксама выехаў са Шчучына ў вёску Крышылкі, з якой была родам жонка. Прабылі там больш за тыдзень.

Пачатак вайны Хведар сустрэў у Алешавічах у дзеда. У той дзень ён пасвіў каня і добра бачыў, як над Шчучынам стаяў чорны дым. Над яго галавою тады праляцеў савецкі самалёт-знішчальнік, а за ім гналіся тры нямецкія. Хведар бачыў, як

савецкі самалёт рэзка пайшоў уніз і ўпаў, пасля чаго з яго вылез лётчык з разбітым тварам. У саміх Алешавічаў савецкія салдаты ўзарвалі склад са снарадамі, ад чаго загарэўся маёнтак, а пасля згарэла і амаль уся вёска. Не ўцалела тады і хата Нюнькаў. Калі ўсё заціхла, Хведар таксама дабраўся да Крышылак. Праз дні два ў вёсцы Крышылкі з`явіліся немцы. І ўжо з першых гадзін яны павялі сябе як акупанты і захопнікі: пайшлі па дварах і сталі забіраць скаціну і рэзаць яе на мяса. Тры немцы зайшлі і ў двор Хведаравага дзеда па маці. Тут яны вывелі з хлява цялушку, але ад нажа яе выратаваў Хведар. Ён крыху ведаў нямецкую мову і папрасіў немцаў, каб яны замест цялушкі забралі бычка. Немцы пагадзіліся.

Праз тыдзень Якуб разам з сям`ёю вярнуўся ў Шчучын. Там уладу захапілі палякі, многія з якіх ведалі нямецкую мову. Галоўным чынам з іх складалася і паліцыя. У апошнюю ўступілі пяць чалавек і тых, што служылі ў савецкай міліцыі. Начальнікам паліцыі стаў былы муляр Коцат, а бурмістрам - былы повар Ліневіч, па нацыянальнасці абодва былі палякамі. Апошняга неўзабаве немцы застрэлілі за тое, што браў хабар, чаго яны не цярпелі. А тым часам пастуліў загад здаць усе радыёпрыёмнікі. У горадзе пачаліся расстрэлы камуністаў і іншых савецкіх актывістаў, і перш за ўсё, калі гэта былі жыды. Справа ў тым, што фашысты абвінавачвалі ў стварэнні камуністычнай ідэалогіі менавіта жыдоў. У галоўнай працы Адольфа Гітлера “Мая барацьба” так і сказана: “Марксізм ёсць не што іншае, як палітыка жыдоў, якая заключаецца ў тым, каб дасягнуць сістэматычнага знішчэння ролі асобы ва ўсіх галінах чалавечага жыцця і замяніць яе роллю большасці”. У праграме нацысцкай партыі ўсе жыды абвяшчаліся па-за законам. Ім забаранялася ўдзельнічаць у палітычным жыцці, займаць адказныя пасады, быць выкладчыкамі ўніверсітэтаў, уступаць з немцамі ў шлюб. А пасля прыходу нацыстаў да ўлады і навогул пачаліся пагромы жыдоў, у іх гвалтоўна аднімалі ўласнасць. Нацысцкім кіраўніцтвам быў распрацаваны план перасялення ўсіх жыдоў на востраў Мадагаскар. Але напачатку 1942 года названы план быў заменены праграмай так званага “канчатковага вырашэння” жыдоўскага пытання, згодна якой усе жыды належалі фізічнаму знішчэнню. Аднак смела адчуваць сябе ў час нямецкай акупацыі не мог ніхто. І хаця бурмістар і камендант былі знаёмыя Якубу, але даравяць яму цёплай сустрэчы Чырвонай Арміі і

вывешанага чырвонага сцяга не хацелі. Таму, калі па нейкім даносе Нюньку Якуба арыштавалі, яны не сталі за яго заступацца. У турме ў той час сядзелі многія. Арыштаваных выклікалі на допыт, дзе іх білі, а многіх і стралялі. Загінула шмат нявінных людзей. Выклікалі на допыт і Якуба Нюньку. У допыце прымалі ўдзел два немцы, бурмістр і перакладчык. Якуб не быў ні камуністам, ні актывістам савецкай улады. Ён, дзякуючы сваёй прыроднай кемлівасці, хутка зразумеў сутнасць гэтай улады і проста выконваў свае абавязкі спачатку як работнік райпатрэбкааперацыі, а пасля як бухгалтар леспрамгаса, не заходзячы ў глыбокую палітыку. Таму ў час допыту яму нельга было штосьці паставіць у вялікую віну. Якуба нават не білі, хаця пасля допыту і адвялі назад у турму. Пазбегнуць катаванняў Нюньку дапамагло і тое, што самі немцы, якія праводзілі допыт, ведалі рускую мову, а па гэтай прычыне і бурмістр не мог нагаварыць ім нешта лішняе. Немцы слухалі самога адказчыка. І як вынік - вечарам у турму прыйшоў паліцыянт і адпусціў з яе Якуба Нюньку. Больш таго, пасля здарыўшагася бурмістр нават прапанаваў Якубу адчыніць сваю краму. Але паколькі не было дзе браць тавараў, таму ўжо нават з-за гэтага ў той час нельга было лічыць прапанову бурмістра сур`ёзнай.

А тым часам вайна кацілася ўсё далей і далей на ўсход. І трэба было неяк жыць. Галоўная праблема, якая стала перад сям`ёй Нюнькаў, заключалася ў тым, каб адбудаваць у Алешавічах хату, замест згарэўшай. Законнага шляху атрымаць лес не было. Гэта патрэбна было рабіць ноччу, рызыкуючы жыццём. У Алешавічах ужо ведалі, што паліцыянты з Каменкі аднойчы забралі чалавека за тое, што ён краў лес. Яны вывелі яго за вёску і імітавалі расстрэл. Вясковыя кабеты, пачуўшы стрэл, ужо паднялі гвалт, што забілі чалавека. Але, дзякаваць Богу, чалавек застаўся жывым, а сваімі дзеяннямі паліцыянты палохалі людзей, каб не ездзілі ў лес. Аднак пры тым беззаконні, што панавала ў час нямецкай акупацыі, можна было чакаць усяго. І нягледзячы на гэта, Якуб з Язэпам ездзілі ў лес, пілавалі неабходны для будоўлі хаты матэрыял і прывозілі ў двор. Пасля з дапамогай сякеры з круглага лесу рабілі брусы. У задачу Хведара ўваходзіла здзіраць з бярвенняў кару, з чым ён паспяхова спраўляўся. Да восені дом быў гатовы. Гэткім шляхам адбудавалася і ўся вёска.

Пачатак 1942 года азнаменаваўся новым наступам на жыдоў

- стаў ажыццяўляцца прыняты план “канчатковага вырашэння” жыдоўскай праблемы. У Шчучыне, як і ў іншых гарадах і мястэчках, жыдам забаранілі хадзіць па тратуарах, іх абязалі насіць на плячах і грудзях шасцікутныя жоўтыя зоркі, а пасля і навогул усіх сагналі ў гета, адкуль яны не мелі права выходзіць без дазволу. Пасля жыдоў расстралялі. Гэткія адносіны да жыдоў Якуб і яго сын Хведар успрынялі як жахлівую несправядлівасць, тым больш, што сярод іх сяброў было шмат жыдоў, а Хведар нават мог трохі і гаварыць па-жыдоўску. Але дапамагчы жыдам Нюнькі, на жаль, нічым не маглі.

Немцы стралялі не толькі жыдоў, але і цыганоў. Смяротныя прысуды выносіліся людзям і іншых нацыянальнасцяў за ўкрыццё савецкіх ваеннапалонных, тых жа жыдоў, цыганоў, за хабар і нават за парушэнне загадаў адміністрацыі. Хведару назаўсёды запаматалася сцэна пакарання маладых хлопцаў. У адной вёсцы хтосьці застрэліў солтыса. Немцы з паліцыянтамі злавілі 6 падазроных і прывезлі іх у Шчучын. Пры гэтым заранёў былі развешаныя аб`явы, што на галоўнай плошчы будуць пакараны бандыты. У прызначаны час на плошчу сабраліся амаль усе жыхары Шчучына. Хлопцаў, якія былі зусім маладыя і моцна пабітыя ў час допытаў, падвялі да вісельняў і зачыталі прысуд. Двух з шасці, як малалетніх, пакінулі глядзець, як вешаюць старэйшых іх сяброў. На рыштаваннях, што былі ўжо падрыхтаваныя, адзін з хлопцаў яшчэ паспеў крыкнуць: “Панове, мы невінаватыя!”. Але прагучала каманда і рыштаванне рухнула. Целы загойдаліся на вяроўках. Пачуўся жахлівы крык людзей. Асабліва лямантавалі жанчыны. Трупы родным аддалі толькі праз тры дні. Жах ад убачанага ў Хведара застаўся на ўсё жыццё. Мабыць, той жахлівы выпадак і з`явіўся кропкай адліку ўзнікшай у яго нянавісці да ўсялякага гвалту і прыніжэння чалавека.

У 1942 годзе зноў арыштавалі Якуба Нюньку і яго брата Язэпа. Іх затрымалі ў горадзе і загналі ў парк, дзе праводзіліся чарговыя расстрэлы людзей. Яны прастаялі там гадзіны тры, спадзеючыся толькі на лёс і Бога. І, дзякаваць Богу, і на гэты раз скончылася ўсё тым, што Нюнькаў адпусцілі. Праўда, жонцы Якуба Лідзе прыйшлося занесці бурмістру хабар, а Хведар, ведаючы нямецкую мову, схадзіў у камендатуру і прасіў за бацьку і за дзядзьку.

У вайскоўцаў ёсць такая прымаўка: “Вайна вайною, але

абедаць трэба ў свой час". Дарэчы, яна тычыцца не толькі вайскоўцаў, але і цывільных. У час вайны таксама патрэбна сеяць, жаць, нарыхтоўваць дровы, здабываць вопратку, абутак і гэтак далей, бо без выканання пералічаных работ нельга выжыць. Вось і Якуб Нюнька стаў задумвацца, як і з чаго жыць. Пры гэтым найбольшы вопыт ён меў, як вядома, у гандлі, таму ім і заняўся зноў: пачаў купляць і прадаваць нейкія тавары, якія, калі вайна была далёка на ўсходзе, прывозілі ў Шчучын з Ліды і Гародні. А з часам было вырашана адчыніць усё ж такі і краму. Асартымент тавараў заставаўся бедным. Асаблівым попытам у насельніцтва карысталіся дрожджы, бо без іх нельга выгнаць самагонку, якую выраблялі ў тыя гады і ў горадзе, і ў вёсках, прычым, у вялікай колькасці. На гэта не было афіцыйнай забароны. Побач з Якубавай адчыніў сваю краму і брат яго жонкі Патапчык Юльян, які меў сувязь з партызанамі, за што пасля вайны быў узнагароджаны.

Задачай нумар два, пасля стварэння хаця б нейкіх умоў для жыцця, з`яўляецца выхаванне дзяцей. Таму пры любых уладах людзі імкнуліся, каб працавалі школы. Не выключэннем з гэтага правіла з`яўляліся і ваенныя гады. З прыходам немцаў у Шчучыне пачала працаваць школа, спачатку на польскай мове. Гэта тлумачылася захопам палякамі адміністрацыйных пасадаў. Настаўнікамі ў школе працавалі ў той час у асноўным прыехаўшыя з Польшчы. Але ў наступным годзе школа была пераведзена на беларускую мову. Выкладчыкамі сталі нацыянальна свядомыя, адукаваныя беларусы. Сярод іх Хведар запамятаў Агіцкага, Станкевіча, бацьку і сына Клышэвічаў, Беразоўскага, Гарбацэвіча. У ліку прадметаў у школе стала выкладацца гісторыя Беларусі, дзяцей знаёмілі з дасягненнямі беларускай культуры. На ўроках спеваў вывучаліся беларускія песні. Ставіліся пастаноўкі беларускіх драматургаў. Усё гэта адбывалася ўпершыню за доўгія гады. Людзі маглі свабодна карыстацца сваёю роднай беларускай мовай, а школа, па выразу Хведара Нюнькі, стала кузняй патрыётаў Бацькаўшчыны. Менавіта тады ён упершыню і зразумеў, што з`яўляецца беларусам. А дагэтуль Хведар карыстаўся больш польскай мовай. Былы актыўны піянер уступіў у Беларускую Самапомач. Акрамя шчучынскіх, у школе вучылася многа дзяцей і з навакольных вёсак.

Што ў тыя гады яшчэ добрага зрабіў Хведар, дык гэта тое,

што вывучыў нямецкую мову. Дарэчы, у школах Савецкага Саюза вывучэнню замежных моваў амаль не ўдзялялася ніякай увагі. Гэта тлумачылася ў многім “жалезнай заслонай”, якая існавала ў Краіне Саветаў на працягу ўсёй яе гісторыі. А з прыходам немцаў у Шчучынскай школе была створана нават спецыяльная група дзяцей па вывучэнню нямецкай мовы. Кіраваў групаю настаўнік Імеля, які перад вайною прыехаў недзе з-пад Варшавы. Але вывучаць замежную мову не вельмі проста. Гэта патрабуе пэўнага часу і сістэматычнасці. З усёй групы да канца дайшоў толькі Хведар. Пасля Імелі Хведар удасканальваў свае веды нямецкай мовы яшчэ і ў педагога Навары, які сам быў італьянцам, а жонку меў немку. Гэта быў выдатны спецыяліст сваёй справы. Менавіта дзякуючы навуцы Імелі і Навары, Хведар стаў свабодна размаўляць па-нямецку. Дарэчы, з беларусаў вельмі мала хто валодаў нямецкай мовай. Таму немцы да тых людзей, якія ведалі нямецкую мову, адносіліся, калі і не з павагай, дык і не так, як да іншых. Гэта і зразумела, бо пры ўсёй іх агрэсіўнасці як акупантаў, ім патрэбна было наладжваць з мясцовым насельніцтвам нейкія адносіны, а значыць, і размаўляць, што яны маглі рабіць з дапамогай перакладчыкаў. Бо сярод немцаў таксама было няшмат тых, хто валодаў славянскімі мовамі, а тым больш - беларускай. Таму і Хведару, тады пятнаццацігадоваму хлопцу, як ён узгадвае, з-за добрага ведання нямецкай мовы гаспадарчы начальнік Шчучынскага раёну Эрман выдаў нават паперу, у якой давалася яму добрая характарыстыка і выказвалася просьба, каб нямецкія ўлады не чынілі яго сям`і перашкодаў у сувязі з пераездам яе ў Вільню.

А шукаць іншага месца жыхарства прымушаў сям`ю Нюнькаў той неспакой, які з кожным месяцам стаў усё павялічвацца. Справа ў тым, што ў лесе, акрамя савецкіх партызанаў, з`явіліся і польскія, якія лічылі тэрыторыю Заходняй Беларусі сваёй і праводзілі на ёй усё тую ж палітыку, якую, па словах былога пасла ў Польскім сойме ад Наваградчыны Васіля Рагулі, можна выказаць двумя словамі: дэнацыяналізацыя і паланізацыя. Надзею на хуткую рэалізацыю гэткай палітыкі ў свой час адкрыта выказаў на Устаноўчым Сойме прэм`ер Польшчы Скульскі. У прыватнасці, ён сказаў, што за пяцьдзесят гадоў ніякіх беларусаў у Польшчы не будзе, што ўсіх беларусаў у Польшчы можна будзе пасадзіць на адной канапцы. Вось і ў час

Другой сусветнай вайны з боку польскіх нацыяналістаў працягвала праводзіцца ўсё тая ж палітыка апалячвання беларускіх зямель. Таму польскія “патрыёты” змагаліся не столькі з немцамі, колькі масава забівалі прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. У сваіх “Успамінах” Хведар Нюнька ўзгадвае, што толькі ў Шчучынскім і суседніх з ім раёнах былі па-зверску забітыя такія вядомыя сваёй нацыянальнай свядомасцю беларусы, як бацюшка і матушка Аляхновічы, Язэп і Юры Клышэвічы, Павел Шляхтун (бацька), Пётр Рандаровіч і іншыя. Многіх са знішчаных беларускіх патрыётаў Хведар ведаў асабіста і, як ён піша, гатовы перад людзьмі і Богам за іх паручыцца, што гэтыя людзі былі ні ў чым невінаватыя. Таму, лічыць ён, патрэбна правесці даследаванне гэтых злачынстваў.

У той час сям`і Нюнькаў стала вядома, што лясныя змагары за адраджэнне на тэрыторыі Заходняй Беларусі польскай улады збіраліся забіць і бацьку Хведара. Яны помсцілі Якубу за яго левыя погляды і нацыянальную свядомасць. Ваяры за адраджэнне Польшчы “ад можа да можа” добра ведалі, што беларускія актывісты былі гасцямі ў доме Нюнькаў, а калі-нікалі і мелі ад Нюнькаў матэрыяльную падтрымку, знаходзілі тут часовы прыют. Таму, каб выжыць, Нюнькам патрэбна было зноў, прычым хутка, мяняць месцапражыванне.

У Якуба спачатку з`явілася думка пераехаць у Гародню, бо гэты горад быў бліжэй да Шчучына і больш яму знаёмы: ён ездзіў туды за таварамі. Але Гародня знаходзілася ў межах Рэйха, таму патрапіць у яе было не вельмі проста. У сувязі са сказаным для новага месцажыхарства была абраная Вільня. Задача заключалася толькі ў тым, каб атрымаць дазвол на пераезд. Вось тут зноў спатрэбіліся веды Хведарам нямецкай мовы: было вырашана камандзіраваць яго з гэтай нагоды ў Ліду да нямецкага гебітс-камісара. Задача перад хлопцам ставілася нялёгкая, хоць у сваіх ведах нямецкай мовы ён не сумняваўся. У той жа час Хведар разумеў, якую ганаровую і адказную ролю на яго ўскладае сям`я, лёс якой у многім залежаў ад яго розуму і дзеянняў. У сувязі з гэтым ён адчуў сябе не па гадах дарослым і ўзяўся за справу.

Паклаўшы ў кішэню выдадзеную Эрманам паперу, Хведар паехаў цягніком у Ліду па дазвол. Заехаў туды без здарэнняў. Але, калі атрымаў жаданы дазвол і вяртаўся зноў-такі цягніком з Ліды, яму прыйшлося перажыць не зусім прыемны момант.

Толькі хлопец высунуў праз акно галаву, каб паглядзець на дарогу, як раздаўся выбух, і з-пад калёсаў цягніка палыхнуў вялікі агонь - гэта цягнік наехаў на міну. Праўда, якойсьці шкоды цягніку міна не прычыніла, бо праз нейкую гадзіну ён пайшоў далей. Але дадзены выпадак яшчэ раз сведчыў аб тым, што ў час Другой сусветнай вайны можна было загінуць і без фронту. І людзі гінулі, бо лакальныя баі адбываліся на чыгунках, у населеных пунктах, якія знаходзіліліся, здавалася б, у глыбокім тыле. Небяспека чакала людзей у любым месцы, амаль за кожным кустом.

Развітвацца са Шчучынам Хведару не зусім хацелася. Тут яму было ўсё знаёма, жылі яго сябры, хаця многія з іх, як ужо сказана, у час вайны загінулі. Менавіта тут прайшлі яго апошнія дзіцячыя і падлеткавыя гады і ён адчуў сябе дарослым. І гэта праяўлялася не толькі ў авалоданні ведамі, у тым ліку сваёй роднай беларускай і нямецкай мовамі, але і ва ўменні ажыццяўляць кантроль за сваімі паводзінамі. Напрыклад, гуляючы са шчучынскімі сябрамі, Хведар, як і многія іншыя з іх, стаў пакурваць, безумоўна, хаваючыся ад бацькоў. А вось, калі стаў адчуваць сябе дарослым, зразумеў, што гэта, акрамя непрыемнасці ў роце, нічога не дае, а таму кінуў. Хаця ў той час яму ўжо бацькі і не забаранялі б курыць, бо яны яго таксама пачалі лічыць дарослым.

Такім чынам, у канцы 1943 года сям`я Нюнькаў пераехала таварным вагонам у Вільню, а дакладней - спачатку ў Новую Вільню на вуліцу Жвірблю (Вераб`ёў). Безумоўна, на першых парах прыходзілася нялёгка: не хапала грошай і ежы, часта прыходзілася класціся спаць, не вячэраўшы. А тут яшчэ і мясцовыя нямецкія ўлады палічылі Нюнькаў бежанцамі з Расеі. І хацелі адправіць іх у Нямеччыну, ужо нават далі павесткі. Але зноў-такі дапамагло веданне Хведарам нямецкай мовы і тая папера, што даў Эрман. Таму сям`ю Нюнькаў пакінулі ў спакоі.

У Новай Вільні Хведар сябраваў з сынам афіцэра, які быў з ім аднаго ўзросту, добра ведаў Вільню і яе наваколле. Ён і пазнаёміў Хведара з віленскім жыццём. Але аднойчы з-за гэтага сябра Хведар меў і вялікую непрыемнасць. А справа заключалася ў тым, што ў Нюнькаў быў веласіпед. Хведар даў яго сябру пакатацца. І калі апошні ехаў, яго запыніў нейкі незнаёмец, даў хлопцу па мордзе і адабраў веласіпед. Аб здарыўшайся бядзе Хведару патрэбна было нешта казаць

бацьку. Крыху падумаўшы, ён вырашыў не хлусіць, а сказаць усё, як было на самай справе. Бацька зразумеў Хведара і на яго не сварыўся, што таксама сведчыла аб адносінах бацькі да сына, як да дарослага.

Крыху лягчэй Нюнькам стала ўжо тады, калі Якуб уладкаваўся на працу на тартак, дзе пілавалі лес. Што тычыцца гандлю, дык, жывучы ў Новай Вільні, ён ім не займаўся. Ды і пражылі Нюнькі тут толькі паўгода, а пасля Якуб змог дамовіцца і атрымаць кватэру ў самой Вільні. Зрабіць гэта было не надта цяжка, бо ў горадзе праблемаў з кватэрамі ў той час амаль не было: многія людзі з горада выехалі, шмат жыдоў пабілі, таму некаторыя кватэры нават пуставалі. Нюнькі пасяліліся на вуліцы Завальнай у доме на другім паверсе. Кватэра была дастаткова вялікіх памераў.

* * *

Вільня - горад, дзе ўсё дыхае гісторыяй. З 1323 года і да Трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795г.) Вільня была сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Тут жылі і тварылі многія дзеячы беларускага народа, у тым ліку і Георгій (Францішак) Скарына, які каля 1522 года менавіта ў гэтым горадзе выдаў сваю “Малую падарожную кніжку”. Тут друкаваліся і першыя беларускія газэты “Мужыцкая праўда”, “Наша доля” і “Наша ніва”. У час акупацыі Польшчай Заходняй Беларусі Вільня таксама знаходзілася пад Польшчай. А калі ў другой палове верасня 1939 года, згодна з дамоўленасцю з Гітлерам, савецкія войскі занялі Заходнюю Беларусь, Вільня спачатку была абвешчана сталіцаю гэтага краю, у якім афіцыйнай моваю стала беларуская. У сувязі з гэтым тут пачалі адкрывацца беларускія школы і выходзіць беларускія газэты, засноўвацца беларускія арганізацыі. Аднак доўжылася гэта толькі некалькі тыдняў, пасля чаго ў Маскве вырашылі перадаць Вільню Літоўскай Рэспубліцы, якая з 1919 па 1940 гады існавала як самастойная дзяржава. Абгрунтоўваючы такое рашэнне, тагачасны Старшыня народных камісараў і Камісар замежных спраў СССР Вечаслаў Молатаў у сваёй прамове на паседжанні Вярхоўнага Савета СССР 31 кастрычніка 1939 года заявіў: “Савецкі Саюз пайшоў на перадачу горада Вільні Літоўскай Рэспубліцы не таму, што ў ім пераважае літоўскае насельніцтва. Не, у Вільні большасць насельніцтва не літоўскае. Але савецкі ўрад лічыўся з тым, што горад Вільня… павінен належаць Літве, як горад, з якім, з аднаго

боку, звязана гістарычнае мінулае Літоўскай дзяржавы, а з другога - нацыянальныя спадзяванні літоўскага народа". ("Известия", 1.10.1939г.).

Такім чынам, 22 кастрычніка Вільня адыйшла да Літоўскай Рэспублікі. Рабілася гэта савецкім урадам з той мэтаю, каб лягчэй было захапіць усю Прыбалтыку. Названы крок Савецкага Саюза хутка зразумелі і самі літоўцы, якія склалі нават прымаўку: "Вільня - нашая - Літва - руская". Так яно і здарылася ў наступным 1940 годзе, 15 чэрвеня ўсе тры Прыбалтыйскія дзяржавы былі акупаваныя савецкімі войскамі.

У час нямецкай акупацыі Вільня жыла зусім іншым жыццём, чым, скажам, Менск ці іншыя беларускія гарады. Па-першае, у Вільні акупацыйны нямецкі рэжым не быў гэткім жорсткім, як на Беларусі, дзе амаль усе гарады былі разбураныя, многія вёскі спаленыя, прычым некаторыя з жывымі людзьмі, людзей расстрэльвалі за кожны знойдзены радыёпрыёмнік, ужо не кажучы пра зброю, моладзь павальна вывозілі ў Германію. А, па-другое, у Вільні значна больш адчувалася адраджэнне беларускасці, працавалі беларуская і руская гімназіі, сустракаліся і абмяркоўвалі свае справы вядомыя беларускія патрыёты. Апошняе рабілася звычайна на тэрыторыі праваслаўнага Свята-Духава манастыра. Беларускай мовай у час набажэнства карысталіся і некаторыя ксяндзы. Менавіта тады Хведару пашчасціла пабачыць ксяндза Адама Станкевіча, які служыў у касцёле Святога Міхаіла.

Выдатны беларускі грамадска-палітычны і каталіцкі дзеяч, гісторык і публіцыст Адам Станкевіч нарадзіўся 16 студзеня 1892 года ў вёсцы Арляняты Ашмянскага павета Віленскай губерні (цяпер Смаргонсі раён Гарадзенскай вобласці) у сялянскай сям`і. Пачатковыя веды атрымаў у Барунах. Пасля вучыўся ў Гальшанах і Ашмянах. У 1914 годзе скончыў Віленскую духоўную семінарыю і стаў ксяндзом у вядомым на Смаргоншчыне мястэчку Крэве. А пасля сканчэння ў 1918 годзе Рымска-Каталіцкай Духоўнай Акадэміі вярнуўся ў Вільню. Ужо ў час вучобы ў семінарыі Адам Станкевіч далучыўся да руху за адраджэнне беларускасці. Ён стварыў там гурток і бібліятэку, хадзіў па вёсках і дапамагаў мясцовым жыхарам усвядоміць сваю нацыянальную годнасць. У гады вучобы ў Пецярбургу ён таксама быў актыўным удзельнікам нацыянальнага руху, членам беларускага гуртка, а ў 1916-18 гадах яго і ўзначальваў.

Там жа супрацоўнічаў з беларускімі часопісамі “Светач” і “Дзянніца”. У маі 1917 года Адам Станкевіч прымаў удзел у з`ездзе беларускага каталіцкага духавенства, які праходзіў у Менску і на якім ён выступіў з рэфератам аб беларускім руху і яго дачыненні да касцёла. Пасля Лютаўскай (1918г.) рэвалюцыі актыўна ўключыўся ў дзейнасць Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, злучнасць якой утварылася ў маі 1917 года. Ксёндз Адам Станкевіч адзін з першых пачаў ужываць родную беларускую мову ў багаслужэнні, што, побач з беларускай школай, абуджала ў людзей нацыянальную самасвядомасць.

Але ўсё гэта разыходзілася з праводзімай тагачаснымі польскімі ўладамі шавіністычнай палітыкай. Ксёндз быў сасланы ў Драгічын, дзе прабыў да жніўня 1919 года, пакуль не змяніўся біскуп. Вярнуўшыся ў Вільню, ён адразу ўключыўся ў беларускі грамадскі рух і адначасова з гэтым стаў выкладаць рэлігію ў Віленскай беларускай гімназіі. У 1922 годзе Адам Станкевіч быў абраны паслом у Польскі Сейм і цалкам аддаўся палітычнай дзейнасці. Разам з Браніславам Тарашкевічам, Васілём Рагулем і іншымі свядомымі беларусамі - падламі польскага Сойму - ён стаў актыўным барацьбітом за правы беларускай меншасці ў тагачаснай Польшчы. У сувязі з забаронай у 1928 годзе царкоўнай уладай належаць ксяндзам да палітычных партый і фракцый Адам Станкевіч адыйшоў ад прамога ўдзелу ў палітыцы, але па-ранейшаму заставаўся апекуном і навукова духоўным кансультантам беларускай дэмакратыі. У названым годзе ён узнавіў і выкладчыцкую дзейнасць у Віленскай беларускай гімназіі. Аднак у 1933 годзе быў звольнены адтуль польскімі ўладамі, а ў 1938 годзе і высланы з Вільні ў горад Слонім. З заняццем у верасні 1939 года Вільні савецкімі войскамі Адам Станкевіч зноў вярнуўся ў былую сталіцу Вялікага княства Літоўскага і стаў адпраўляць службу ў касцёле Святога Міхаіла, дзе ў час вайны яго і ўбачыў Хведар Нюнька.

Увайшоўшы ў касцёл і пачуўшы з вуснаў ксяндза малітву на беларускай мове, Хведар стаяў, нібы заварожаны і не мог сабе паверыць, што гэткае адбываецца. Бо да таго часу ў яго, як і ў іншых многіх беларусаў, было ўяўленне, нібыта каталіцызм настолькі цесна звязаны з польскай мовай, што яго нават называлі польскай верай, а не рымска-каталіцкай. А тут вось і казань і самі малітвы - усё гучала на роднай беларускай мове. І службу адпраўляў ўжо шырока вядомы сярод беларусаў ксёндз

Адам Станкевіч, грамадская і дабрачынная праца якога за адраджэнне беларускасці ніколі не перапынялася. Ён узначальваў Камітэт дапамогі ахвярам вайны, у 1924 годзе быў абраны старшынёю Таварыства Беларускай Школы, у 1926 годзе - старшынёю і фактычным кіраўніком Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. З 1927 на працягу адзінаццаці гадоў Адам Станкевіч рэдагаваў і выдаваў штомесячны рэлігійны часопіс для каталікаў-беларусаў "Хрысьціянская думка", супрацоўнічаў з некалькімі савецкімі беларускімі газэтамі і часопісамі. У 1926 годзе стаў адным з заснавальнікаў у Вільні беларускай друкарні імя Ф. Скарыны, а ў 1928 годзе - "Беларускага каталіцкага выдавецтва". У 1930 годзе Адам Станкевіч зрабіў даклад, прысвечаны 500-годзю з дня смерці вялікага князя Вітаўта. Яго кніга "Доктар Скарына - першы друкар Беларусі (1525-1925)" адкрыла шэраг літаратурных партрэтаў беларускай гісторыі і культуры. Ім напісана многа артыкулаў, прысвечаных і іншым беларускім культурна-асветніцкім дзеячам, пісьменнікам, паэтам.

І вось у той раз, прысутнічаючы на набажэнстве ў касцёле Святога Міхаіла, Хведар мог пачуць і пабачыць гэтага знакамітага беларускага духоўнага і грамадска-палітычнага дзеяча, які нават пры адной сустрэчы з ім пакідаў глыбокі след у свядомасці людзей. Адам Станкевіч загінуў у 1949 годзе ў бальшавіцкім канцэнтрацыйным лагеры, у Тайшэце. Безумоўна, што імя гэтага выдатнага дзеяча, як і многіх іншых вядомых беларусаў, якія ўсё сваё жыццё прысвяцілі змаганню за права нашага народа заняць свой пачэсны пасад сярод іншых народаў Еўропы, чакае свайго прыстойнага ўшанавання.

Пражыўшы некалькі месяцаў у Вільні, Нюнькам стала зразумела, што фронт зноў набліжаецца да горада, толькі цяпер ужо з усходу. Пад напорам савецкіх войскаў немцы пачалі адступаць, а разам з імі і многія беларусы, ды прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў, што па тых ці іншых прычынах уцякалі ад бальшавіцкай дыктатуры. Адзін з тых, хто тады таксама пакідаў Вільню, Язэп Малецкі, у сваёй кнізе "Пад знакам Пагоні" піша: "…На дарогах, гасцінцах і шосах, як вокам абняць, бесканечнасць вазоў з людзьмі, коньмі, каровамі. Уся, здавалася, Беларусь адыходзіць на Захад, уцякае ад крывавай бальшавіцка-маскоўскай нявол і". Хведар у той час быў дома і праз акно бачыў, як рухалася калона жаўнераў Беларускай

Краёвой абароны, дарэчы, як высветлілася пазней, у гэтай калоне, сярод іншых жаўнераў, ішоў і стаўшы вядомым беларускім пісьменнікам Кастусь Акула (сапраўднае прозвішча Качан). Дарэчы, Кастусь Акула напачатку свайго рамана "Змагарныя дарогі" дае, хаця і кароткі, але змястоўны гістарычны нарыс "Гітлераўская акупацыя Беларусі ў 1941 - 1944 гадах", у якім паспрабаваў паказаць прычыны, чаму беларусы ў час нямецкай акупацыі аказаліся адным з самых вынішчаных народаў Еўропы і, жывучы на сваёй зямлі, апынуліся на самых нізах. У дадзеным нарысе даецца і існаваўшы ў той час адміністрацыйны падзел Беларусі, паказваецца становішча са школьніцтвам, а таксама характарызуюцца Беларускія збройныя аддзелы таго часу і паказваецца роль, якую тады адыгрывалі Цэнтральная Рада Беларусі і яе кіраўнік Радаслаў Астроўскі. Менавіта праз Вільню адступалі на захад і той жа Радаслаў Астроўскі, і кіраўнік той жа БКА Францішак Кушаль. У тыя дні горад амаль апусцеў. Але пры яго вызваленні ад нямецкіх акупантаў ішлі немалыя баі. Вільню бамбавалі, вынікам чаго стала разбурэнне многіх будынкаў і гібель людзей. У сваіх "Успамінах" Нюнька Хведар узгадвае: "На вуліцах ляжала шмат забітых салдатаў і афіцэраў, немцаў і рускіх. Шмат разбітай і спаленай тэхнікі. Кругом бітая чарапіца з дахаў. Дагаралі дамы, бо не было каму тушыць".

Першымі ў горад увайшлі прадстаўнікі польскай Краёвай Арміі і вывесілі на вежы Гедыміна польскі сцяг, чым яшчэ раз прадэманстравалі сваю шавіністычную палітыку. Але хутка з`явіліся савецкія войскі і пачалі ўстанаўліваць свае бальшавіцкія парадкі. Усім запраўляла Камуністычная партыя Літвы, якая безагаворачна праводзіла палітыку Масквы, ды, згодна Статута УКП(б), яна і правы мела толькі такія, як і любая абласная партыйная арганізацыя на тэрыторыі Расіі. Узначальваў Камуністычную партыю Літвы Антанас Снечкус, які стаў першым сакратаром ЦК КП Літвы яшчэ ў жніўні 1940 года. Пры ўсёй яго камуністычнай заангажаванасці, Антанас Снечкус заўжды заставаўся свядомым літоўцам. Таму ў меру магчымасцей ён абараняў рэспубліку ад дэнацыяналізацыі, якую ажыццяўлялі назначаемыя Масквою кіраўнікі Камуністычнай партыі Беларусі, сярод якіх да 1956 года на першай ролі па сутнасці не было беларусаў. Праўда, і ў Літве ўжо другім сакратаром ЦК кампартыі быў таксама не літовец,

але і не рускі, як гэта звычайна было ў іншых саюзных рэспубліках. Ім доўгія гады працаваў Уладас Нюнька, які паходзіў з тых самых месцаў, што і Хведар Нюнька. Але Уладас добра ведаў літоўскую мову і пры перапісах насельніцтва нават залічваў сябе да літоўцаў. У сувязі са сказаным, у Літве заўжды адчуваўся літоўскі нацыянальны дух, хаця і тут, побач з літоўскімі, працавалі і рускія школы, а у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах ставараліся рускія групы студэнтаў.

Вось у адну з такіх рускіх сярэдніх школаў, якая ў першы час пасля вайны называлася гімназіяй, і пайшоў Хведар Нюнька. Гэта была тыповая савецкая руская школа, дзе з кожным годам усё больш і больш працавала настаўнікаў, прыехаўшых з усходу. Пасля гэтую школу падзялілі на мужчынскую №4 і жаночую № 6. Першую крыху пазней назвалі імем Івана Чарняхоўскага, аднаго з савецкіх палкаводцаў часоў Другой сусветнай вайны. У названай школе, але некалькімі класам вышэй, у тыя гады вучыўся і сын Міхаіла Суслава, які з канца 1944 і па сакавік 1946 года працаваў старшынёю Бюро ЦК УКП(б) па Літоўскай ССР. У задачу гэтага Бюро ўваходзіла дапамога партыйнай арганізацыі рэспублікі ў ліквідацыі вынікаў вайны, ва ўмацаванні савецкага ладу ў Літве. Безумоўна, што стварэннем такога органа выказваўся недавер мясцовым кадрам. Менавіта таму і даручылі ўзначальваць гэты, па сутнасці, паліцэйскі партыйны орган чалавеку, які фанатычна верыў у камуністычныя ідэі і адносіўся да непапраўных дагматыкаў. Дзеля выканання пастаўленых перад ім вышэйшым партыйным кіраўніцтвам задач М. Суслаў не лічыўся ні са сродкамі, і ні з якімі ахвярамі. У той час ім было выказана жахлівае меркаванне аб тым, што Літва можа быць і без літоўцаў, але заўжды будзе савецкай.

Другая сусветная вайна аставіла ў гісторыі вельмі жахлівы след. Яна забрала шмат жыццяў, разбурыла і спаліла многія гарады і вёскі, унесла варожасць паміж людзьмі, падарвала здароўе тым, хто застаўся жывым. Асабліва адмоўны ўплыў яна аказала на здароўе дзяцей. Не мінула гэткая бяда і сям`ю Нюнькаў: першай захварэла старэйшая дачка Аля, а пасля і Хведар. У яго быў спачатку сухі, а пасля і мокры эксудатыўны пляўрыт, які, калі своечасова не прыняць меры, можа выклікаць туберкулёз. Бацькі звярнуліся за дапамогай да знаёмага

савецкага генерала інтэнданцкай службы Пепеля, які прыслаў да Хведара вайсковых урачоў - маёра і капітана. Яны выцягнулі ў хлопца з лёгкіх вадкасць, але стан яго злароўя не паляпшаўся. Хведар па-ранейшаму быў слабы, у яго трымалася высокая тэмпература. Таму бацькі вельмі непакоіліся і пачалі шукаць больш кваліфікаванай медычнай дапамогі. І тут нехта падказаў ім, што, маўляў, ёсць гэткі ўрач - Лігейка, які ў Вільні лічыцца спецыялістам вельмі высокага класу. Звярнуліся і да яго. На іх шчасце, аказалася, што гэта сапраўды быў урач высокай кваліфікацыі. Ён, у адрозненне ад вайсковых урачоў, якія лічылі, што нельга выкачваць з лёгкіх усю вадкасць, палічыў па-іншаму - і выкачаў усю. У дадатак да гэтага, прыпісаў нейкіх парашкоў для апетыту. А бацька пастараўся забяспечыць сына добрай ежай - маслам, яйкамі, тварагом. Звярнуліся за дапамогай знайсці прызначаныя Лігейкам лекі і да Уладаса Нюнькі, які не застаўся ў баку ад бяды сваіх землякаў. У рэшце рэшт хлопец ачуняў, хаця з-за хваробы і прапусціў год школы, бо толькі ў ложку хворым праляжаў чатыры месяцы.

Сярэднюю школу Хведар скончыў у 1948 годзе. Праўда, гэта была гімназія і таму яна мела не 10, а 12 класаў. У тым жа годзе паступіў на лясны факультэт Віленскага дзяржаўнага універсітэта. Разам з ім на гэты факультэт паступілі і ягоныя аднакласнікі: Янка Кірушчанка, Антон Ваяводскі, Віктар Ермаковіч, Павел Трыфанаў і Анатоль Хацяновіч. Але ў наступным годзе лясны факультэт вылучылі з Віленскага ўніверсітэта і далучылі да Літоўскай сельскагаспадарчай акадэміі, якая знаходзіцца ў Каўнасе. Праўда, у дадзеным выпадку можна было перайсці на другі факультэт і застацца студэнтам Віленскага дзяржаўнага універсітэта, але Хведар не стаў гэта рабіць і паехаў вучыцца далей у Каўнас.

Каўнас - гэта па велічыні другі, пасля Вільні, горад Літвы. Знаходзіцца на рацэ Нёман пры ўпадзенні ў яго Вяллі. Першае ўпамінанне аб Каўнасе адносіцца да XI стагоддзя. У XI-XV стагоддзях Каўнас служыў як крэпасць Вялікага княства Літоўскага. Увайшоўшы ў 1795 годзе ў склад Расейскай імперыі, ён стаў у 1842 годзе губернскім цэнтрам. У 1919-1940 гадах Каўнас выконваў ролю сталіцы Літоўскай Рэспублікі. І, у адрозненне ад Вільні, якая на працягу доўгіх гадоў з`яўлялася цэнтрам чатырох культур: беларускай, літоўскай, польскай і жыдоўскай, Каўнас заўжды быў цэнтрам літоўскасці. Тут жылі і

тварылі многія літоўскія грамадскія і асветніцкія дзеячы. У Каўнасе размешчаны цэнтр каталіцкай рэлігіі ў Літве. Такім чынам, пераехаўшы ў гэты горад, Хведар апынуўся ў самой гушчы літоўскага асяроддзя. У акадэміі таксама абсалютная большасць студэнтаў з`яўляліся літоўцамі. Скажам, на тым жа курселяснога факультэта, на якім вучыўся Хведар, з 50-ці чалавек толькі 6 былі не літоўцамі. Але ніякіх міжнацыянальных спрэчак пры гэтым Хведар не заўважаў. Лекцыі чыталіся на літоўскай мове, а экзамены можна было здаваць па выбару: хочаш на літоўскай, а хочаш і на рускай мове. Хведар здаваў іх на рускай мове, у той час для яго гэта было лягчэй. Але, дзякуючы менавіта вось такому літоўскаму асяроддзю, ён без асаблівых намаганняў хутка авалодаў літоўскай мовай, вывучаць якую Хведар пачаў яшчэ ў школе. Праўда, сам Хведар лічыць, што праблемы з веданнем літоўскай мовы ў яго ўсё ж такі засталіся. Для яго гэта была пятая па ліку мова, на якой Хведар стаў размаўляць. Да таго часу ён ужо валодаў польскай, беларускай, нямецкай і рускай мовамі.

Там, у час вучобы ў Літоўскай сельскагаспадарчай акадэміі Хведар прыкмеціў, што адной з рысаў тагачаснай літоўскай моладзі былі яе адносна цывілізаваныя паводзіны. Доказам таму ён лічыць выпадак, які адбыўся ў час адной з вечарынаў, якія ладзіліся ў акадэміі нярэдка. Вечарам у танцавальнай залі патухла святло, і, нягледзячы на гэта, не пачулася ніякіх выкрыкаў, а тым больш - свістаў. Наадварот, у залі ўсталявалася цішыня, а пасля нехта падыйшоў да раяля, заіграў і частка студэнтаў пачала танцаваць, хаця і было цёмна. Безумоўна, святло хутка запалілася і вечарына прадоўжылася. Не чуў Хведар, каб нехта з літоўскіх студэнтаў ужываў і нецэнзурныя словы, ды іх у літоўскай мове і няма. Не памятае ён і ніякіх гвалтаў сярод студэнтаў акадэміі на глебе п`янства. Калі і здаралася так, што нехта залішне выпіў, яго сябры ціха выводзілі з залі і дапамагалі дайсці да таго месца, дзе можна было адпачыць.

Падабаўся Каўнас Хведару сваёй чысцінёю, архітэктурай і нейкай асаблівай еўрапейскасцю. Тут заўжды жыло многа адносна багатых людзей. Па колькасці ўласных легкавых аўтамабіляў у разліку на 1000 чалавек гэты горад займаў у Савецкім Саюзе другое месца, пасля Тбілісі. Але Хведару ў той час не спатрэбілася нават вялікіх намаганняў, каб знайсці ў

Каўнасе жыллё. На дваіх з А. Ваяводскім яны здымалі шыкоўную трохпакаёвую ўмэбляваную кватэру, прычым за здавальняючы кошт. Не адчуваў Хведар вялікіх цяжкасцяў і ў вучобе: экзамены здаваў толькі на “добра” і “выдатна”, хаця і дазваляў сабе нейкія вольнасці пры наведванні лекцый. З прафесаў Літоўскай сельскагаспадарчай акадэміі Хведару найбольш запамятаўся Тадас Іванаўскас - родны брат вядомага беларускага грамадска-палітычнага дзеяча Вацлава Іваноўскага. Паходзілі Іваноўскія з вёскі Лябёдкі, што на Лідчыне. Гэта была вядомая багатая сям`я, якая пры Польшчы мела каля 300 гектараў зямлі і нават свой самалёт. Аб Іваноўскіх Хведар упершыню дачуўся ад сваіх бацькоў. У Лідскай акрузе Іваноўскіх ведалі не толькі як багатых, але і як добрых і не скупых людзей. Гэтым выдзяляўся асабліва Вацлаў. Калі ён кудысьці прыязджаў і аб гэтым даведваліся насільшчыкі, дык кожны з іх імкнуўся дапамагчы Вацлаву Іваноўскаму паднесці чамадан, бо ведаў, што ён добра заплаціць. Выдзяляўся Вацлаў і сваёй адданасцю беларускасці, размаўляў толькі па-беларуску. А вось Тадас Іванаўскас, калі яго стаў ведаць Нюнька, лічыў сябе чамусьці літоўцам і выкладаў лясны жывёльны свет на літоўскай мове. Пры гэтым лекцыі чытаў вельмі цікава, адначасова малюючы на дошцы крэйдай тых звяроў і птушак, аб якіх распавядаў. Прафесар быў заўзятым паляўнічым і меў шмат розных ружжаў. Дзякуючы такой улюбёнасці ў лясны жывёльны свет, захапленню паляўніцтвам, ён стварыў пры акадэміі заалагічны парк, у якім шмат чучалаў выканаў асабіста. Для гэтага Тадас Іваўнаўскас аб`ездзіў нямала краінаў, адкуль і прывозіў гэтыя чучалы. Навогул, прафесар Іванаўскас быў вельмі адукаваным чалавекам, ведаў некалькі замежных моваў, цікавіўся і добра ведаў не толькі жыццё леса, але і садаўніцтва. За ўсё гэта прафесар карыстаўся ў акадэміі вялікай павагай.

Акрамя А. Ваяводскага, з якім Хведар адзін час жыў на кватэры, ён сябраваў яшчэ і з Віктарам Ермаковічам. Віктар быў невысокага росту, але вельмі дужы хлопец. Ён займаўся боксам і меў моцныя ўдары кулакамі. Здарылася нават гэткае, што ў час спаборніцтва на рынзе ён ударыў суперніка так, што той хутка памёр. Пасля гэтага Ермаковіч перастаў займацца боксам. Але калі-нікалі ён выкарыстоўваў свае здольнасці, каб прывесці ў пачуццё тых, хто імкнуўся пакрыўдзіць ці абразліва адносіўся

да іншых. Напрыклад, калі адзін са студэнтаў, стоячы ў кампаніі, паставіў нагу на стул і на заўвагу Віктара хацеў апошняга ўдарыць, Ермаковіч хутка яго "супакоіў". Сувязі з Віктарам Хведар працягвае падтрымліваць і пасля сканчэння вучобы.

Аднак пры ўсёй павазе да Каўнаса Хведара заўжды цягнула наведаць Вільню, дзе жыла большасць яго сяброў. Хацелася ўбачыць і Тамару Чаркасаву - студэнтку-медычку, якой Хведар у той час сімпатызаваў. У Вільню ездзіў летам на матацыкле "Іж-350", а зімою - цягніком. Дарэчы, правы для язды на матацыкле ён атрымаў, будучы яшчэ вучнем у школе, у 1947 годзе. А ў 1949 годзе Хведар меў ужо правы і на кіраванне аўтамабілем, прычым - шафёра-прафесіянала. Больш таго, у час летніх канікулаў Хведар нават ухітраўся ўладкавацца на працу шафёрам ва ўездным фінансавым аддзеле. Ездзіў на машыне "Віліс". А на наступных канікулах працаваў ужо на "Пабедзе" ў выкладчыка акадэміі Навардаўкіса, які выкарыстоўваў легкавы аўтамабіль для заробкаў.

Чатыры гады вучобы ў вышэйшай навучальнай установе праляцелі хутка. Дыпломную працу Хведар падрыхтаваў на тэму аб дубільных рэчывах, якія выкарыстоўваюцца для вырабу скур. Абараніў дыплом на "выдатна", хаця і атрымаў заўвагу за дрэннае афармленне працы. Развітваўся з акадэміяй і Каўнасам Хведар без асаблівага жалю. Бо, па-першае, выхоўваўся ён як віленчук і яго ўвесь час маніла сталіца, а, па-другое, як ён піша: "не знайшоў там сабе ні сапраўднай сімпатыі, ні каханай". Будучая сімпатыя яго чакала ў Вільні, аб чым ён у тую пару яшчэ не ведаў. Ёй стала Ніна Кацары, якую Хведар бачыў, калі вучыўся ў гімназіі, бо ў тыя гады яна таксама вучылася ў жаночай гімназіі №6.

Нарадзілася Ніна ў 1931 годзе. Яе маці была, як казалі, тутэйшай славянкай, а бацька паходзіў з абруселых італьянцаў. Мабыць, у сувязі з гэткім паходжаннем Ніна была вельмі прыгожай, і, як бачна на фатакартках, умела паказаць сваю жаночую годнасць. У гэтым плане ёй маглі пазайздросціць нават многія знакамітыя артысткі. Прычым, прыгожым у яе быў не толькі твар, але і фігура. Яна не была спартсменкай, хаця і мела да гэтага фізічныя здольнасці. І калі нехта спрабаваў яе пакрыўдзіць, Ніна хутка паказвала, што за сябе можа пастаяць, пры гэтым, палічыўшы неабходным, дык і "ўрэзаўшы" аплявуху. Была яна і надзвычайна смелай, магла ноччу адна ісці любой

дарогай. Валодала неардынарнымі аратарскімі здольнасцямі. Як дзяўчына, Ніна слыла недаткнёнай, што аднойчы адчуў на сабе і Хведар. Калі гулялі ў фанцікі, і яму пашчасціла выцягнуць той фанцік, які дазваляў пацалаваць Ніну, апошняя не вельмі падпарадкавалася прынятым правілам названай гульні. Пацалунку Ніны Хведару прыйшлося яшчэ пачакаць. У той жа час сваёй прыгажосцю і добразычлівымі адносінамі яна прыцягвала да сябе людзей, мела падыход да любой жанчыны, нягледзячы на ўзровень яе адукацыі, а тым больш паходжанне. Таму ў кампаніях Ніна заўжды была ў цэнтры ўвагі, да яе хіліліся. Вылучалася яна і сваёй амаль падкрэсьленай акуратнасцю.

Калі Хведар з Нінаю пажаніліся, яна яшчэ вучылася ў педагагічным інстытуце на факультэце рускай мовы і літаратуры, які так і не скончыла. Ніна ніколі не працавала настаўніцай. Яна была інструктарам у прафілактычным дэзінфекцыйным аддзеле санітарнай станцыі горада Вільні: кантралявала крамы і іншыя ўстановы.

З паяўленнем дзяцей усю заботу аб іх выхаванні Ніна ўзяла на сябе, чым садзейнічала стварэнню Хведару адпаведных умоў для працы. Дарэчы, для дзяцей, і асабліва для дачкі Ніны, яна стала вялікім сябрам і імкнулася выхаваць яе ўсебакова развітай, маючай сваю жаночую вартасць. Ёй вельмі хацелася, каб яе дачка стала сапраўднай прынцэсай, таму для яе (Ніны-маці) было вельмі важна бачыць: як яе Ніна зачэсвала валасы, у што апраналася, з кім сябравала. Карацей кажучы, разам з дачкою яна як бы і сама нанава перажыла і гады дзяцінства, калі імкнулася зразумець дзяўчынку і сумесна з ёю гуляла, прыдумляла новыя словы, і на ўвесь голас па-дзіцячы смяялася, і школьныя гады, у якія ёй хацелася даць дачцы грамату не толькі па школьных прадметах, але і па музыцы. Маці радавалася, калі Ніна стала дарослай, і па-ранейшаму дарыла ёй сваё мацярынскае цяпло. А калі Ніне-дачцы стала ўжо 20 гадоў, Ніна-маці, уздыхнуўшы, аднойчы сказала: “Як я шкадую, што раней не мела такой сяброўкі, як ты”.

У той час з дзецьмі Ніна была патрабавальнай, прынцыповай і нават катэгарычнай, часамі аж занадта эмацыйнай. Таму за выхаванне дзяцей Хведар Якубавіч быў заўжды спакойны і мог цалкам аддацца працы.

Гаворачы аб выхаванні Нінай і Хведарам сваіх дзяцей,

нельга не адзначыць і таго, што яны, мабыць, адны з нямногіх бацькоў ужо ў той час разумелі каштоўнасць ведання іх нашчадкамі многіх моваў. Таму ў сям`і Нюнькаў дамашняй мовай некаторы час з`яўлялася польская. А калі дзеці яе вывучылі, гэткай мовай стала нямецкая, пасля - літоўская, руская, беларуская. Ад гэтага дачка Ніна, як і сам Хведар Якубавіч, валодае ўсімі пералічанымі мовамі.

Але, на жаль, Ніне-маці не прыйшлося доўга радавацца сваімі дзецьмі і ўнукамі. Яна памерла на 69-м годзе жыцця, доўга праляжаўшы перад гэтым у ложку цяжка хворай. Дарэчы, будучы яшчэ здаровай, Ніна вельмі часта выказвала жаданне ўзяць усе пакуты на сябе, каб толькі пазбавіць ад іх сям`ю, у чым праяўлялася яе адданасць самым блізкім сваім людзям. Мабыць, гэтая яе малітва сапраўды была пачута Богам. Бо і памерла яна 27 красавіка - у дзень памяці Віленскіх пакутнікаў: Іаана, Антонія і Яўстафія, якія калі былі язычнікамі называліся: Кругляцом, Нежілам і Кумцом.

А ў тым 1953 годзе Хведара Нюньку накіравалі працаваць у Дзяржплан рэспублікі. З усяго курса гэта было адзінае накіраванне ў сталіцу. Але ад працы ў Дзяржплане Хведар адмовіўся, бо яго не цікавіла канторская пасада. Ён быў маладым і яго больш прываблівала праца, звязаная з паездкамі па рэспубліцы. Таму, будучы яшчэ студэнтам, ён пастараўся знайсці сабе працу інжынера хімлясгаса. Названая арганізацыя займалася зборам хваёвай смалы, з якой выпрацоўвалі скіпідар і іншыя хімічныя рэчывы. Работа інжынера была звязана з камандзіроўкамі амаль па ўсёй рэспубліцы і гэта Хведара задавальняла. Задавальнялі яго і заробкі, якія былі зусім нядрэннымі пры выкананні плана, а апошні амаль заўжды выконваўся. У гэтай арганізацыі Хведар прапрацаваў тры гады. За дадзены час сабраў грошы і купіў уласны аўтамабіль “Пабеду”, што па тых часах было вялікай рэдкасцю. Не ўладжаным заставалася толькі пытанне з жыллём, тым больш, што Хведар з Нінаю, стаўшы мужам і жонкай, не маглі жыць ні ў яго бацькоў, ні ў сям`і Ніны. Таму на першых парах ён жыў у сябе дома, а яна - у сябе.

Але ж так доўга працягвацца не магло. А права атрымаць кватэру як малады спецыяліст Хведар страціў, бо адмовіўся ад працы, якую яму прапаноўвалі пасля заканчэння акадэміі. Таму патрэбна было шукаць іншага выйсця. І Хведар узяў пляц

плошчай 0,09 гектара, прычым, у вельмі прэстыжным месцы - на Звярынцы, для будаўніцтва ўласнага дома. У той час дзяржава стала ўжо заахвочваць людзей у будаўніцтве не толькі кааператыўных, але і індывідуальных уласных дамоў. Але для гэтага патрэбны былі адносна вялікія грошы, ды і нямала працы. Таму Хведар не траціў надзею атрымаць жыллё ад арганізацыі, дзе ён працаваў. І спадзяванні гэткія былі абгрунтаванымі, бо Хімлясгас будаваў у той час шасцікватэрны дом на тым жа Звярынцы.

Аднак надзеям Нюнькі было не суджана збыцца. Справа ў тым, што пры размеркаванні ведамственнага жылля вырашальны голас належаў у тыя часы партыйнаму бюро. А Хведар ніколі не быў нават камсамольцам. Таму пры ўсіх яго стараннях на працы, падтрымкі з боку партыйнага органа ён не атрымаў. Гэткія адносіны да яго абурылі Хведара. Ён лічыў, што адну з шасці кватэр павінны былі даць яму, бо адпрацаваў у дадзенай арганізацыі ўжо тры гады, ды і ўвесь час стараўся. Таму Хведар напісаў заяву аб звальненні яго з працы, у якой, згодна свайму меркаванню, назваў адпаведную прычыну.

Пасля звальнення з Хімлясгаса патрэбна было шукаць новую працу, на якой гарантавалі б жыллё. І аб такой працы Нюнька дамовіўся ў Мінлясгасе. Праўда, праца патрабавала пакінуць Вільню. Хведар пагадзіўся і на такое: ён паехаў працаваць ляснічым у Яшуны Шальчынінкайскага раёна за 30 кіламетраў ад Вільні. Там яго папярэдніка звольнілі з працы як не забяспечыўшага даручаны яму ўчастак. І сапраўды, амаль палова ляснікоў і конюх не адпавядалі свайму прызначэнню і працавалі вельмі дрэнна: у лесе былі парубкі, не хапала кармоў. Але Хведар працы не баяўся, праўда, у яго не было вопыту, хаця апошні - справа нажыўная.

Праз месяцаў два былы ляснічы выехаў і з хаты. Зрабіўшы невялікі рамонт, Нюнька перавёз у Яшуны жонку і сына Хведара. Месца, дзе стаяў дом лясніцтва, было вельмі прыгожым. Побач прабягала невялікая крынічка і рос змешаны лес. Ды і сам домік быў утульным: у адным пакоі размяшчалася кантора лясніцтва, два пакоі і кухня складалі кватэру для ляснічага, а адзін пакой, пры якім таксама была асобная кухня, належыў таму, хто працаваў конюхам. Побач з домам стаялі яшчэ хлеў і адрынка для кармоў. Самым блізкім населеным пунктам ад Яшунаў была вёска Гай, дзе жылі галоўным чынам

стараверы, якія ў час расколу Рускай праваслаўнай царквы знаходзілі сабе сховішча ў Вялікім княстве Літоўскім. Ад Яшун да Гая было менш кіламетра. Крыху далей, прыкладна на адлегласці паўтара кіламетра, знаходзілася другая вёска - Лянкішкі.

З жывёлы ў лясніцтве спачатку была адна кабыла, пасля ў яе з`явілася і жарабё, а з цягам часу Нюнькі займелі ўласную карову. Як і амаль на любым хутары, так і на сядзібе лясніцтва, абавязкова ўтрымліваўся сабака. І Хведару і Ніне жывёла падабалася, Ніна калі-нікалі нават спрабавала падымаць жарабё.

Бліжэйшым супрацоўнікам Нюнькі з`яўляўся яго штатны памочнік Стасіс Баварскас, які жыў у Гаі. А паходзіў ён недзе з Цэнтральнай Літвы і працаваў ляснічым яшчэ ў часы прэзідэнцтва Смятоны. У Баварскаса быў багаты вопыт, сваю справу ён ведаў дасканала. Гэта быў сумленны чалавек, мабыць, адзіным недахопам якога, калі гэта можна наогул лічыць недахопам, была нераўнадушнасць да прыгожых маладых жанчын. Адным словам, працаваць з ім Нюньку было прыемна.

Сям`ёю Нюнька сябраваў з дырэктарам спіртавога завода, таксама беларусам па нацыянальнасці, - Александрам Палікшам. Ад лясніцтва да спіртавога заводу было менш кіламетру, што дазваляла часта пяшком хадзіць адной сям`і да другой у госці. Нюнька і Палікша не толькі былі сябрамі, але і дапамагалі адзін другому ў працы, весці ўласную гаспадарку. Напрыклад, Нюнька браў на корм жывёле на спіртзаводзе брагу.

У лясніцтве налічвалася 4 тысячы гектараў лесу. Акрамя ляснічага і яго памочніка, у штаце лічыліся яшчэ аб`ездчык Іван Казакевіч, які, як і памочнік ляснічага, добра ведаў сваю справу, бухгалтар па прозвішчу Аўга і пятнаццаць ляснікоў, палову з якіх Нюньцы прыйшлося замяніць, каб навесці ў лесе парадак. Праўда, нельга сказаць, што новаму ляснічаму ўдалося пазбавіцца ад усіх недахопаў. Сякія-такія парушэнні здараліся, у тым ліку і парубкі. Але ў масавым маштабе апошніх не было. Калі з боку ляснічага, яго памочніка і аб`ездчыка ўзмацніўся попыт, дык пачалі старацца і ляснікі, бо, як ні кажы, але пасада лясніка была на вёсцы прэстыжнай і матэрыяльна выгаднай. Па-першае, ляснік быў сам сабе гаспадаром, у дастатку мог мець дроў і сена, яму дазвалялася трымаць каня, што мела ў

той час вялікае значэнне. Па-другое, да ўсяго гэтага яшчэ крыху нешта плацілі, чаго ў многіх калгасах амаль не рабілі.

Такім чынам, справы ў Яшунскім лясніцтве сталі ісці на лад. Былі нядрэннымі ў Хведара і адносіны з раённымі ўладамі, хаця падыход у апошніх да пасады ляснічага, як і навогул да лесу, быў зусім не дзяржаўным. Калі, напрыклад, Нюнька паспрабаваў аднаго разу сказаць у райкаме партыі аб вялікіх парубках у калгасных лясах, дык партыйны сакратар яго папярэдзіў, што гэткае пытанне падымаць нельга, таму што, маўляў, мы калгасы толькі ўмацоўваем і нельга іх штрафаваць за парубкі ў лесе.

Аднак у сваёй працы ляснічага Хведар Якубавіч не пазбег і памылак. Мабыць, сказалася тут яго гарадское выхаванне і адсутнасць гаспадарчага вопыту. Бо як жа інакш можна зразумець, што пры наладжванні парадку ў лесе, ён зрабіў памылку пры падборы конюха і не ажыццяўляў за яго працай амаль ніякага кантролю. Прозвішча кнюха было Рынкевіч. Конюх, як удалося Нюньку высветліць пазней, краў кармы і вазіў у тую вёску, з якой быў родам. Хведар Якубавіч звольніў Рынкевіча з працы. Але апошні, каб ляснічаму адпомсціць, напісаў у міністэрства скаргу. З Мінлясгаса прыехала камісія і правярала лясніцтва аж на працягу двух тыдняў. За гэткі тэрмін, натуральна, камісія выявіла некалькі недахопаў. Безумоўна, што ляснічаму ў такім выпадку патрэбна было з`ездзіць у міністэрства, патлумачыць, што і да чаго і многія абвінавачванні камісіі маглі быць зняты. Але Нюнька гэтага не зрабіў. Ён пакрыўдзіўся на недаацэнку той працы, якую ўклаў, каб выправіць хібы, што прыняў ад свайго папярэдніка. У выніку сказанага Хведару Якубавічу прыйшлося расквітацца з працай.

Аб тым, што міністр тады аднёсся да Хведара Якубавіча несправядліва, сведчыць тое, што праз некалькі гадоў Нюнька стаў яго суседам па дачы. І каб даць сваю згоду на гэткае, міністр загадаў праверыць нанава ўсе акты той рэвізіі, у выніку чаго яму прыйшлося прызнаць, што паступіў у той час няправільна і даць згоду на ўказанае суседства.

У 1957 годзе Нюнька вярнуўся ў Вільню і праз некаторы час уладкаваўся на працу ў кантору “Лесахімік”, якая, як і Хімлясгас, займалася здабычай смалы, але ўжо з карчоў хвойных дрэў, а не з саміх дрэў, як гэта рабілі прадпрыемствы Хімлясгаса. Кантора мела ў Яшунах і дрэваапрацоўчы завод. Пасада інжынера, на якую ўладкаваўся Хведар Якубавіч, была таксама

звязаная з камандзіроўкамі па ўсёй рэспубліцы, дзе толькі размяшчаліся смалакурні. І гэта зноў задавальняла Нюньку, які меў непаседлівы характар. Але і тут паўстала праблема жылля і нават прыпіскі ў горад. Бо калі Хведар ад`язджаў у Яшуны, ён выпісаўся з Вільні. І каб устанавіць гарадскую прыпіску, спатрэбілася прайсці праз два этапы: спачатку ён прыпісаўся ў адной з прыгарадных вёсак, што дало права ўладакавацца ў Вільні на працу, а пасля ўжо прыпісаўся і ў самім горадзе, і то, дзякуючы толькі таму, што меў пляц пад забудову ўласнага дому. На пляцы быў зроблены фундамент, падведзена вада і гарадская каналізацыя. На болей не хапіла тады грошай. А вось пасля вяртання з Яшунаў у горад патрэбна было штосьці рабіць, бо жыць не было дзе.

І тут выручыў выпадак. Калі Нюнька працаваў яшчэ ляснічым, да яго звярнуўся адзін зубны ўрач з прапановай, каб памяняцца пляцамі: ён хацеў забраць пляц Нюнькі, што знаходзіўся ў прэстыжным месцы, а Нюньку аддадаць свой у іншым раёне горада. Безумоўна, за гэта ўрач пагаджаўся даплаціць пэўную суму грошай. Дык вось пасля вяртання Нюнькі ў Вільню гэткі абмен пляцамі адбыўся. За выручаныя грошы Хведар спачатку збудаваў часовы домік, у які сям`я і перасялілася. Праз нейкі час быў збудаваны асноўны дом, у якім да першай зімы Хведар паспеў закончыць толькі кухню і адзін пакой, а на другі год закончыў будаўніцтва і астатніх пакояў. Каб збудаваць дом поўнасцю, прыйшлося не толькі прадаць "Пабеду", але і эканоміць на ўсім: на адзенні, нікуды не ездзіць і нават не шыкаваць з ядою.

Інжынерам у арцелі "Лесахімік", якая, дарэчы, адносілася да сістэмы кааперацыі, Нюнька прапрацаваў каля двух гадоў, а пасля перакваліфікаваўся са спецыяліста лясной гаспадаркі на будаўніка. Зрабіць гэта было няцяжка, бо на лясным факультэце Літоўскай сельскагаспадарчай акдэміі вывучаўся і прадмет будаўніцтва. Працаваць стаў у праектным інстытуце прамысловага будаўніцтва спачатку тэхнікам, а паля і інжынерам. Названую працу знайшоў па аб`яве. Пасля размовы з дырэктарарм Хведара накіравалі ў аддзел каштарысу, галоўным інжынерам якога працавала Дняпрова Лідзія Іванаўна. Як пасля Хведар Якубавіч пераканаўся, гэта была вельмі таленавітая, з незвычайнымі разумовымі здольнасцямі жанчына. Яна выдатна ведала каштарысную справу і была

добрым арганізатарам. Лідзія Іванаўна імкнулася, каб людзі, якія працавалі ў яе аддзеле, мелі добры заробак, а таксама маглі адпачываць, для чаго арганізоўваліся калектыўныя паходы ў кіно, тэатры, групавыя экскурсіі. І Лідія Іванаўна ўсё гэта паспявала рабіць, будучы маці траіх дзяцей. Яе аддзел амаль на пастаянна прыпісаў да сябе сцяг пераможцаў у сацыялістычным спаборніцтве. У той жа час гэта вельмі сімпатычная, стройная, прыгожая жанчына, на якую не адзін мужчына, праходзячы міма, паварочвае назад галаву. Аддзел каштарысу Дняпрова ўзначаліла з самага пачатку арганізацыі інстытута і працавала на гэтай пасадзе некалькі дзесяцігоддзяў.

Акрамя пералічаных якасцяў, кіраўнік любога рангу павінен быць яшчэ прынцыповым і патрабавальным. І ў Лідзіі Іванаўны Дняпровай не было недахопу і ў гэткіх рысах. Прычым, яна праяўляла іх ужо на стадыі падбору спецыялістаў на працу. Гэта адчуў на сабе і Хведар Якубавіч. Пры першай размове кіраўнік каштарыснага аддзелу пагадзілася ўзяць ягго спачатку толькі часова, на адзін месяц. Пасля месячнай працы пагадзілася выпрабавальны тэрмін працягнуць яшчэ на два месяцы. І толькі пасля гэтага Нюньку залічылі на пастаянную працу. Мабыць, вось гэткая патрабавальнасць Дняпровай, памножаная на прыродныя здольнасці Хведара Якубавіча зрабілі тое, што ўжо праз паўгода ён пачаў выконваць план, а праз дзевяць месяцаў стаў прэтэндаваць і ў перадавікі ў сваім аддзеле, дзе тады працавала сем-восем чалавек.

Але рост спецыялістаў у праектных арганізацыях, як вядома, ідзе марудна - ніхто не хоча сыходзіць са свайго месца. Не выключэннем быў і дадзены праектны інстытут. Авалодаўшы нядрэнна сваёй справай, Хведар Якубавіч змог падняцца па суме месячнага акладу толькі з 60 да 72 рублёў. І таму, калі яму запранавалі ў праектным інстытуце “Літцэнтрсаюза” працу на 90 рублёў у месяц, ён, пры ўсёй павазе да Лідзіі Іванаўны і калектыву ў цэлым, адмовіцца не мог. І тут Дняпрова выступіла супраць яго звальнення, але матэрыяльная зацікаўленасць узяла верх.

Прайшло некалькі месяцаў і Лідзія Іванаўна запрапанавала Хведару Якубавічу папрацаваць у яе аддзеле па сумяшчальніцтву спачатку два месяцы, пасля яшчэ гэткі тэрмін. З гэтага часу іх супрацоўніцтва ўзнавілася і стала пастаянным, хаця на штатнай пасадзе ён так і заставаўся ў “Літцэнтрсаюзе”.

Супрацоўнікі аддзела зноў сталі лічыць яго сваім. І калі дзеля жарту свой каштарысаўскі аддзел яны назвалі Рэспублікай Смятаніяй (ад рускага слова смета) і прэзыдэнтам названай “дзяржавы” абралі, безумоўна, Дняпрову Лідзію Іванаўну, дык яе намеснікам стаў Нюнька Хведар Якубавіч.

Працуючы амаль на двух работах, Хведар Якубавіч стаў мець зусім нядрэнны заробак. Праўда, для гэтага патрэбны былі не толькі веды, якія ўжо ён меў, але і многа працаваць, вельмі часта не звяртаючы ўвагі на позні час і нават выхадныя дні. Але гэткае старанне давала свой плён - заробак Хведара стаў дазваляць яму і жонцы купляць патрэбнае па свайму густу адзенне і пуцёўкі для паездкі на экскурсію па краіне (тады Савецкім Саюзе).

Аднак перашкодай для паездак стаў той аб`ект, якому не так даўно абое радаваліся - уласны дом. Па-першае, для яго ўтрымання ў прыстойным выглядзе патрэбна было кожны год укладваць усё новыя і грошы, а, па-другое, дом нельга было пакінуць на некалькі тыдняў без прыгляду. Таму, параіўшыся, Нюнькі вырашылі дом прадаць і паколькі ў горадзе ўжо стала з жыллём праблема, дык купец знайшоўся хутка. Праўда, дамова была такая, што Нюнькі ў доме будуць займаць пэўны час адзін пакой на правах арэнды. І вось так у адным пакоі ім прыйшлося пражыць тры гады. Затое ў іх з`явілася грошай яшчэ больш і на тыя ж экскурсіі яны сталі ездзіць кожны год. Дзе толькі Якуб з Нінаю не пабылі: і ў Крыме, і ў Малдове, і на Украіне, і ў Грузіі, і ў Арменіі, і ў Латвіі, і ў Эстоніі, і ва Узбекістане і… - ездзілі 17 разоў. Тыя паездкі Хведар Якубавіч і зараз лічыць зорнай старонкай свайго жыцця.

А праз тры гады пасля продажу дому вырашылася праблема і з атрыманнем кватэры - па лініі сваёй працы ў праектным інстытуце “Літпатрэбсаюза”. Дарэчы, кватэру Нюнька атрымаў усё на тым жа Звярынцы, трохпакаёвую “хрушчоўку” на чацвёртым паверсе. Нюнькі пражылі ў ёй каля 25 гадоў. А калі Ніна захварэла і не стала магчы паднімацца на чацверты паверх, у гарадской мэрыі яму пайшлі насустрач і замянілі трохпакаёвую кватэру таксама на трохпакаёвую і ў тым жа раёне, але толькі на першым паверсе. Канешне, і сама па сабе новая кватэра была лепшай, бо ў той час “хрушчовак” ужо не будавалі.

З 1992 года Хведар Якубавіч пайшоў на пенсію і цалкам прысвяціў сябе грамадскай працы па адраджэнню беларускасці.

* * *

Другая палова васьмідзесятых і пачатак дзевяностых гадоў XX стагоддзя азнаменаваліся як перад стварэння дэмакратычных рухаў амаль на ўсёй тэрыторыі былога Савецкага Саюза. Накопленая гадамі колькасць людской нянавісці да дыктатарскага бальшавіцкага рэжыму перарарсла ў новую якасць. Людзі пачалі адкрыта выказваць сваю незадаволенасць сацыяльнай, нацыянальнай і знешняй палітыкай, што праводзіла Палітбюро, якое пасля смерці Юрыя Андропава ўзначаліў Канстанцін Чарненка, фізічна нямоглы і небагаты розумам чалавек. Вярхі сталі разумець, што ўтрымаць уладу старымі метадамі яны ўжо не могуць. Таму з прыходам да ўлады Міхаіла Гарбачова быў высунуты лозунг перабудовы. Новы і ў параўнанні са сваімі папярэднікамі малады Генсек ЦК КПСС М. Гарбачоў, якому ўласцівы дэмагагічны склад розуму, пачаў заклікаць “перабудоўвацца ўсім і ва ўсім”, не ведаючы, што пры гэтым патрэбна рабіць канкрэтна. Яму хацелася нешта зрабіць, каб палепшыць справы ў краіне, але не парушаючы ўстояў створанага камуністычнай партыяй таталітарнага ладу, не кранаючы манаполіі адной партыі, якую ён узначальваў, і дэмакратычнага цэнтралізму, які з`яўляўся галоўным прынцыпам кіравання ва ўсіх сферах грамадства і па сваёй сутнасці быў жорсткім цэнтралізмам, прыпарфумленным для падману людзей крыклівай дэмагогіяй аб дэмакратыі.

Але так доўга цягнуцца не магло. І калі раней людзі спадзяваліся на тое, што перабудова сапраўды прывядзе да карэнных змяненняў у краіне сацыяльнагга ладу і міжнацыянальных адносін, дык з цягам часу стала бачна, што за лозунгамі вярхоў аб перабудове нічога няма. А тут яшчэ і Афганская вайна, якая з кожным месяцам уносіла ўсё новыя і новыя жыцці. У вялікіх гарадах з`явіліся цэлыя могілкі “афганцаў”. Таму ў рух прыйшлі нізы. Краіну захлынулі забастоўкі і мітынгі, ад якіх эканамічны крызіс стаў яшчэ больш паглыбляцца. Усім было бачна, што створаны па бальшавіцкаму ўзору сацыялізм, у параўнанні з цывілізаванай рынкавай эканомікай і шматпартыйнай палітычнай сістэмай, існаваўшымі ў многіх краінах, аказаўся значна слабейшым. Безумоўна, што на паглыбленне крызісу сацыялістычнай эканомікі свой уплыў зрабіла і палітыка тагачаснага прэзідэнта ЗША Рональда Рэйгана, які абвясціў Савецкі Саюз “імперыяй зла” і заклікаў да

яе знішчэння. Злучаныя Штаты Амерыкі задалі такі тэмп спаборніцтва ў гонцы ўзбраення, што эканоміка, якая грунтавалася на адміністрацыйна-камандных метадах кіравання, не вытрымала і стала не падпарадкоўвацца загадам цэнтра. З аслабленнем адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання сталі разыходзіцца і швы, на якіх трымаўся і сам "Саюз нерушымы". Убачыўшы няздольнасць вярхоў рэфармаваць СССР па-новаму, ініцыятыву зноў-такі ўзялі нізы. У саюзных рэспубліках пачаўся ўздым нацыянальна-вызваленчых рухаў, якія ставілі сваёй задачай выйсці са складу Савецкага Саюза, бо па сваёй сутнасці апошні ўяўляў сабою ўсё тую ж Расійскую імперыю. Прыклад у гэтым паказалі Прыбалтыйскія рэспублікі. У прыватнасці, у Літве гэткі рух узначаліў "Саюдзіс", кіраўніком якога стаў прафесар Вітаўтас Ландзбергіс. Да "Саюдзіса" далучыліся і іншыя пласты насельніцтва, у тым ліку і многія камуністы, выхаваныя на нацыянальных традыцыях. У той час бальшыня літоўскіх камуністаў выйшла з КПСС і стала на глебу незалежнасці Літвы. Убачыўшы гэткую сітуацыю, выратоўваць цэласнасць Савецкага Саюза ў Вільню прыехаў сам Міхаіл Гарбачоў, чым яшчэ раз падкрэсліў свае імперскія пазіцыі. І зусім па-іншаму лёс Савецкага Саюза разумеў член Палітбюро КПСС Аляксандр Якаўлеў, які, прыехаўшы таксама ў Вільню, падтрымаў правы літоўскага народа на незалежнасць. Падтрымаць справядлівую барацьбу літоўскіх дэмакратаў за выхад рэспублікі з Саюза прыязджалі і вядомыя беларускія дзеячы: Станіслаў Шушкевіч, Зянон Пазняк, Георгій Таразевіч, Алег Трусаў і некаторыя іншыя.

Вось у гэткіх умовах у Літве пачалі ўзнікаць і беларускія арганізацыі. Першай з іх стаў клуб аматарскай самадзейнасці "Сябрына". Ініцыятарам стварэння "Сябрыны" была вядомая беларуская пісьменніца і грамадская дзяячка Зоська Верас (сапраўднае імя і прозвішча Людвіка Войцік). Узначаліў клуб Валянцін Стэх. Названы клуб стаў арганізоўваць у той час вельмі цікавыя мерапрыемствы: у час памятных у гісторыі Беларусі дат праводзіць імпрэзы, адзначаць юбілеі беларускіх дзеячоў, арганізоўваць беларускія перадачы на каналах літоўскага радыё і тэлебачання. На адным з такіх мерапрыемтсваў у 1988 годзе прысутнічаў і Хведар Якубавіч Нюнька. Яго туды запрасіў знаёмы лясны інжынер Юры Зімніцкі.

Вечарына адбывалася ў палацы прафсаюзаў. На ёй прысутнічалі і госці з Менску. У многіх прысутных на лацканах пінжакоў былі значкі "Пагоня", а ў руках яны трымалі бел-чырвона-белыя сцяжкі. У залі гучалі беларускія песні і вершы. З прамовай выступіў прыехаўшы з Менску ў той час ужо вядомы як актыўны малады Сябра БНФ Вінцук Вячорка. Усё гэта нагадала Хведару Якубавічу яго школьныя гады і раздзьмула тлеўшы ў яго сэрцы агеньчык беларускасці. Ён пазнаёміўся і з кіраўнікам "Сябрыны" Стэхам, а той запрапанаваў пазнаёміць Хведара Якубавіча з Лявонам Антонавічам Луцкевічам. Нюнька прыняў прапанову з удзячнасцю.

Лявон Луцкевіч - гэта сын Антона і пляменнік Івана Луцкевічаў - вядомых беларускіх дзеячоў першай чвэрці XX стагоддзя, якія ўсё сваё жыццё прысвяцілі змаганню за стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы. Сам Лявон нарадзіўся 17 сакавіка 1922 года. Скончыў Віленскую беларускую гімназію і Віленскі электра-тэхнічны ліцэй. У час нямецкай акупацыі працаваў настаўнікам у Баранавічах і з`яўляўся актыўным удзельнікам беларускага руху. У 1944 годзе разам з Усеваладам Родзька прыехаў у нямецкае мястэчка Дальвіц, дзе працавалі курсы па падрыхтоўцы беларускіх дэсантнікаў для высадкі іх у Беларусь з мэтай агітацыі насельніцтва ўключыцца ў барацьбу за выхад рэспублікі са складу СССР і стварэння сваёй нацыянальнай дзяржавы. Але па стану здароўя сам Лявон Антонавіч стаць дэсантнікам не мог. Таму пасля пераехаў на тэрыторыю Польшчы, уладкаваўся на працу і там жыў пад іншым прозвішчам, пакуль яго не выкрылі савецкія спецорганы. Быў асуджаны і зняволенне адбываў на Калыме. У Вільню вярнуўся на пачатку хрушчоўскай адлігі і жаніўся на Галіне Антонаўне Войцік - дачцы Зоські Верас, у доме якой у той час і жыў.

Домік пісьменніцы быў глінабітным, хаця і даволі прасторным. Стаяў ён на ўскраіне Вільні, ў лесе, таму, ды, мабыць, яшчэ і з-за павагі да пісьменніцы яго называлі "Лясной хаткай". "Усё было тут добра: цішыня, якую толькі дапаўняла цвырканне ды шчэбет птушак, наўкола была некранутая прырода, - працуй, думай, а стаміўся - шчыруй у сваім агародчыку, дзе поўна было розных дзівосаў. Аб цывілізацыі нагадваў толькі далёкі водгалас цягнікоў… І цяжка было паверыць, што зусім побач, за гарою, пачынаецца вялікі, старажытны горад - Вільня", - так апісаў мясціну, дзе жыла беларуская пісьменніца, ўзяўшая сабе

псеўданім ад нізкай вечна залёнай куставой расліны з дробным лісцем і лілова-ружовымі кветккамі, беларускі мастак Алег Аблажэй. Вось туды і накіраваліся Нюнька са Стэхам.

Лявон Антонавіч сустрэў гасцей ветліва. Цёплай атрымалася і сама размова. На развітанне гаспадар даў Хведару Якубавічу працу Бэрман Аляксандры, якая адсочвала і аналізавала нацыянальны беларускі рух. Такім чынам, паездкай Хведар Якубавіч застаўся задаволены. У Лявоне Луцкевічы ён убачыў шырока адукаванагга чалавека і гарачага патрыёта Беларусі. Лявон Антонавіч выдатна ведаў беларускую гісторыю і літаратуру, разбіраўся ў архітэктуры, быў аматарам музейнай справы, акрамя сваёй роднай, добра валодаў літоўскай, рускай і польскай мовамі. Ён заўжды меў свае погляды і ўмеў іх абгрунтаваць. І таму ў кіраўніка беларускай рэдакцыіі радыё “Свабода” Вячкі Станкевіча былі ўсе падставы, ацэньваючы дзейнасць Лявона Антонавіча Луцкевіча ў час яго супрацоўніцтва на дадзеным радыё, сказаць: “У гады супрацоўніцтва я заўсёды цаніў ягоныя веды і парады. А перадачы, будзь то “Вандроўкі”, ці “Партрэты”, ці “Весткі з Віленшчыны”, - былі заўжды поўныя жывога зместу, энтузіязму і павагі да Беларушчыны”.

Пасля Лявон Антонавіч, яго жонка Галіна Антонаўна і яе мама пераехалі ў цэнтр горада ў трохпакаёвую кватэру. І тут нельга не падкрэсліць, што Лявон Антонавіч не толькі выдатна ведаў гісторыю Вільні, але тут яму быў знаёмым кожны дом і камень, кожнае дрэўца і кусцік. Ён быў “бясконца” ўлюбёны ў гэты цудоўны горад - “горад своеасаблівага лёсу…”. Дарэчы, сябе Лявон Луцкевіч так і лічыў - старым беларусам-віленчуком і карэнным жыхаром Вільні. Тыя, каму пашчасціла пабыць у Вільні, будуць заўжды ўдзячныя яму за тое, што сваімі “Вандроўкамі па Вільні” ён дапамагае “зірнуць на гэты горад вачыма беларусаў”.

А ў тыя гады сувязі паміж Хведарам Якубавічам і Лявонам Антонавічам станавіліся ўсё больш шчыльнымі. Яны сталі аднадумцамі. А тым часам падзеі развіваліся так хутка, што патрэбна было пашыраць дзейнасць за адраджэнне беларускай культуры і на іншыя сферы, якіх клуб “Сябрына” не ахопліваў. Менавіта таму Лявон Луцкевіч ініцыяваў стварэнне яшчэ адной арганізацыі - Таварыства Беларускай Культуры. Ім быў падрыхтаваны і першы Статут Таварыства. Устаноўчы сход

адбыўся 4 лютага 1989 года. Праходзіў ён у залі музычнай школы імя Міколаса Чурлёніса. Прысутнічала больш за 200 чалавек. З`езд прайшоў паспяхова. Акрамя разгляду іншых пытанняў, на ім было абрана кіраўніцтва новай арганізацыі - Рада ТБК у складзе сямі чалавек.

1 Аблажэй Алег.
2 Анішчык Аляксей.
3 Банайціс Валдас.
4 Войцік Галіна.
5 Кардзіс Людзміла.
6 Кароль Леванід.
7 Нюнька Хведар.

Як бачна, Лявон Луцкевіч не ўвайшоў у склад Рады ТБК, і гэта толькі таму, што па палітычных матывах у той час ён не меў права афіцыйна ўдзельнічаць у палітычных і грамадскіх рухах. У той час членам ТБК быў абраны і літовец - Банайціс Валдас, які выдатна размаўляў па-беларуску, ведаў нашы праблемы і спачуваў беларускаму народу ў яго барацьбе за сваю незалежнасць. Больш таго, ён шмат чаго зрабіў і практычна для станаўлення "Сябрыны" і самога ТБК у Літве.

Старшынёю Рады ТБК абралі Хведара Якубавіча Нюньку, хаця ён і адмаўляўся, матывуючы тым, што, маўляў, арганізацыйнай справай ніколі не займаўся. Але сябры ўгаварылі Хведара Якубавіча папрацаваць пакуль што часова. Аднак атрымалася так, як гаворыцца ў прымаўцы: "Няма нічога больш пастаяннага, чым часовае". Хведар Якубавіч Нюнька так і працуе на гэтай пасадзе і па сённяшні дзень. Ды ўжо, мабыць, ніхто і не можа пакуль што ўявіць сабе на ёй іншага чалавека, які б так аддана на грамадскіх пачатках выконваў у такіх складаных умовах і амаль без фінансавання гэтую работу.

Першыя пяць гадоў ТБК існавала пры Літоўскім фондзе культуры, які ўзначальваў у той час прафесар Віленскага дзяржаўнага універсітэта, доктар геаграфічных навук Чэслаў Кудаба. Ён вельмі прыхільна аднёсся да стварэння названай арганізацыі, бо і сам паходзіў з Беларусі. Чэслаў Кудаба нарадзіўся недалёка ад жамчужыны беларускай зямлі - возера Нарач, у мястэчку Кабыльнік у сям`і селяніна-арандатарара, які не меў сваёй зямлі. У Літву сям`я пераехала, калі Чэславу было шэсць гадоў. Таму далейшае яго выхаванне ішло ў літоўскіх навучальных установах - пасля сканчэння сярэдняй школы ў

Свянцянскай настаўніцкай семінарыі і на геграфічным факультэце Віленскага універсітэта. Ім напісаны як навуковыя, так і некалькі папулярных твораў. Пад кіраўніцтвам Чэслава Кудабы створаны геаграфічны атлас Літвы. Але навуковец ніколі не забываўся пра сваю гістарычную Радзіму, добра ведаў беларускую мову, у якой на ўсё жыццё захаваўся налёт нарачанскага говару. Больш таго, калі аб нечым прафесар распавядаў, дык вельмі часта любіў дадаць: “Так мама мая казала”, нібы ставячы гэтым на сказанае пячатку самай чыстай праўды - матчынай.

Безумоўна, пры ўсёй маральнай і юрыдычнай падтрымцы кіраўніка Літоўскага фонда культуры цяжкасцяў было шмат, усё толькі пачыналася. Як успамінае Хведар Якубавіч, “фінансавых сродкаў ТБК ня мела. Тэлефонная сувязь, друкарскія работы пакрываліся за кошт інстытута, у якім працаваў. Расходы на сустрэчы і прыёмы гасцей, паездкі на Беларусь, паштовыя расходы пакрываліся са сваёй кішэні, балазе зарплаты на ўсё хапала”. А чакаць нейкай значнай дапамогі ад Літоўскага фонда культуры не прыходзілася, бо ён і сам быў арганізацыяй не багатай. Але нягледзячы на цяжкасці, справы пачалі рухацца. І ў гэтым вялікая заслуга належыць энтузіястам, якія, як і старшыня Рады ТБК, на грамадскіх пачатках актыўна ўключыліся ў працу. Сярод іх, за Лявонам Луцкевічам, як ініцыятарам стварэння ТБК, трэба назваць Леваніда Караля.

Леванід Сымонавіч Кароль нарадзіўся ў тым жа годзе, што і Лявон Антонавіч Луцкевіч, - 1922, на Валожыншчыне ў інтэлігентнай сям`і. Яго бацька скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут і выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі. Маці, хаця і не мела грунтоўнай адукацыі і нідзе не працавала, але паходзіла са шляхетнай сям`і - была дачкою ляснічага. У Вільню сям`я Каралёў пераехала, калі Леваніду было дзевяць гадоў. Сам Леванід у 1936-37 навучальным годзе, дарэчы, разам з Лявонам Луцкевічам, Аленай Шырмай, Янкам Станкевічам і іншымі, быў вымушаны спыніць вучобу ў Віленскай беларускай гімназіі па прычыне яе закрыцця. У 1958 годзе Леванід Кароль атрымаў дыплом аб універсітэцкай адукацыі па прафесіі хіміка. Праўда, зрабіць апошняе для яго было няпроста, бо з чацвёртага курса універсітэта Леваніда выключылі як брата “ворага народа”, які ў той час сядзеў у сталінскіх лагерах. Таму апошнюю частку вучобы Леваніду прыйшлося атрымліваць

завочна, працуючы на заводзе рабочым. Пасля атрымання вышэйшай адукацыі Л. Кароль працаваў у інстытуце электраграфіі, дзе за 25 гадоў зрабіў 17 вынаходніцтваў. Навогул, Леванід Сымонавіч быў вельмі адукаваным і духоўна багатым чалавекам: выдатна валодаў беларускай, рускай, польскай, нямецкай і літоўскай мовамі, любіў класічную музыку, асабліва сімфанічную. Пачуўшы сімфанічны твор, Леванід мог беспамылкова назваць яго аўтара. Захапляўся ён і літаратурай беларускіх пісьменнікаў, паэтаў і нават сам спрабаваў пісаць дзіцячыя творы. Праўда, ніводзін з іх не быў надрукаваны. Пры размове заўжды імкнуўся зразумець і не пакрыўдзіць партнёра. Леванід Сымонавіч ствараў вакол сябе нейкую своеасаблівую прыемную аўру, і людзям заўжды хацелася з ім быць.

Са сваёй будучай жонкай Зінаідай Аляксееўнай Кандрашовай, якая родам паходзіць з Твярской вобласці, Леванід спаткаўся ў 1958 годзе ў Маскве на навуковай канферэнцыі, у час правядзення якой Зіна была ўжо масквічкай. Яна на восем гадоў маладзейшая за Леваніда, але, пазнаёміўшыся з ёю, ён вельмі хутка прапанаваў Зіне стаць яго жонкай. Дзяўчыне Леванід таксама спадабаўся як вельмі цікавы чалавек, аб чым яна нават падзялілася з маці. Жонкай і мужам яны сталі ў 1959 годзе. І Леванід Сымонавіч увесь час быў удзячны лёсу, што Зінаіда Аляксееўна зрабіла яго больш адкрытым і навучыла больш даваць нешта людзям, што нашмат прыемней, чым у іх браць. Гаворачы аб Зіне, да іншых станоўчых яе якасцяў неабходна яшчэ дадаць тое, што яна высокаадукаваны майстра мастацкага вышывання, у тым ліку і золатам. Леванід Сымонавіч і Зінаіда Аляксееўна сябравалі з сем`ямі Кастуся Шышэі, Лявона Луцкевіча і Антона Шантыра.

Акрамя працы ў інстытуце Л.Кароль любіў шчыра працаваць і на сваім агародзе, дзе вырошчваў выдатны ўраджай. Адных памідораў сабіраў да 200 кілаграмаў. У той жа час гэта быў вельмі сціплы чалавек, які, як, дарэчы, і многія іншыя беларусы, не імкнуўся высоўвацца ў калектыве на першыя ролі. Але ахвотна дзяліўся сваімі ведамі і ідэямі з іншымі, асабліва, калі гэта тычылася беларускай справы. Больш таго, у ТБК Леванід Сымонавіч быў генератарам многіх ідэй. Ды і пры іх рэалізацыі ён не лічыўся ні з працай, ні з часам.

Аб Леванідзе Сымонавічу Каралю Хведар Якубавіч упершыню пачуў ад свайго стрыечнага брата Лявона Нюнькі, які

ў адной з размоў паміж імі паведаміў, што ў іх інстытуце працуе вялікі патрыёт Беларусі і назваў яго імя і прозвішча. Спаткаліся Нюнька з Каралём на сходзе той жа "Сябрыны", а ўжо больш шчыльна сышліся, калі разам, ды яшчэ Лявон Луцкевіч, сталі выпускаць старонку ў газэце "Эхо Литвы" - "Беларус Віленшчыны". Вось тады яны ўсе ўтраіх і адчулі, што патрэбны адзін аднаму дзеля перамогі беларускай справы.

Рада ТБК і яе кіраўнік Хведар Якубавіч Нюнька разумелі, што ў сваёй дзейнасці яны павінны апірацца на тыя багатыя традыцыі, якія накоплены папярэднімі пакаленнямі беларусаў Віленшчыны. Таму адной з першых сваіх задач лічылі ўшанаванне памяці беларускіх патрыётаў, памерлых і загінуўшых у барацьбе за незалежнасць Радзімы. І першым у гэтым шэрагу беларускіх дзеячоў-патрыётаў стаў Францішак Аляхновіч, які ў 1944 годзе быў забіты ў сваёй уласнай кватэры. Гэта рэжысёр першага спектакля ў першым па ліку беларускім тэатры, адным з арганізатараў якога ён і з`яўляўся (1913 г.). Таму, святкуючы 60-годдзе з дня нараджэння, яго па праву назвалі "бацькам беларускага тэатра". Францішак Аляхновіч аўтар 19 п`есаў, а таксама кнігаў: "Праўда пра Саветы" і "У кіпцюрох ГПУ", у апошняй з якіх ён паказаў, дарэчы, нашмат раней, чым Салжыніцын, усе тыя жахі і здзекі, якія тварыліся над людзьмі ў бальшавіцкіх "Гулагах". І зрабіў гэта Аляхновіч, як і пазней Салжыніцын, апісаўшы перажытыя жудасці ім самім у час знаходжання ў менскай турме, а потым - на Салаўках. Узгадваючы аб допытах вязняў, якія не хацелі прызнавацца ў здзяйсненні выстаўленых ім абвінавачванняў, або не выконвалі нейкіх іншых камандаў следчага, калі нават карцэр не дапамагаў, "разыгрывалі вось якую штуку: выклікалі з камеры, звязвалі рукі, везлі ў Камароўскі лес і тамака, над выкапанай ямай, прылажыўшы рэвальвер да галавы, дамагаліся прызнаньня, дакляруючы тады дараваць жыццё". Седзячы ў турме, піша Аляхновіч, "ніхто з нас не ведаў, што яго чакае. Адзін меў больш шансаў быць расстрэленым, другі менш. Вось і ўся розніца." 18 лістапада 1989 года і адбылося перазахаванне са зліквідаваных лютаранскіх могілкаў на вуліцы Каліноўскага на могілкі Росы астанкаў гэтага знакамітага дзеяча культуры, змагара і пакутніка за беларускую справу. А праз тры гады на новым месцы захавання быў установлены прыгожы помнік.

18 траўня 1991 года на тых жа могілках Росы адбылося

захаванне ўрны з астанкамі яшчэ аднаго беларускага дзеяча-патрыёта Івана Луцкевіча, якую прывезлі з Закапанага (Польшча). Іван Іванавіч Луцкевіч быў адным з самых значных і ўплывовых пачынальнікаў і ідэйных кіраўнікоў беларускага культурна-асветніцкага і грамадска-палітычнага руху напачатку ХХ стагоддзя. Менавіта па яго ініцыятыве пытанне аб нацыянальным самавызначэнні беларускага народа ўпершыню прагучала на міжнародных форумах. Праз два гады на месцы захавання быў пастаўлены помнік Івану і Антону Луцкевічам. Помнік зроблены з белага мармуру. І гэта вельмі сімвалічна, бо ўсе сваё жыццё браты Луцкевічы прысвяцілі самай чыстай і светлай справе - змаганню за вызваленне свайго народу з цемры і няволі. Пасля быў адкрыты помнік вядомаму дзеячу беларускай культуры і былому вязню сталінскіх лагераў Паўлу Карузу, Зоі Коўш, а таксама мемарыяльных дошак выдатным дзеячам і патрыётам беларуска народа Кастусю Каліноўскаму, Вацлаву Ластоўскаму, Браніславу Тарашкевічу, Янку Купалу, Рыгору Шырме і Пятру Сергіевічу.

Думаючы аб перспектыве беларускай справы, рада ТБК пры падтрымцы іншых дзеячоў беларускай культуры прыклала шмат намаганняў, каб адчыніць у Вільні беларускую школу. Пачаткам у гэтым накірунку было заснаванне пры 37 сярэдняй школе беларускай нядзельнай школы, якой кіравала Альдона Папова. І тут нельга не адзначыць з удзячнасцю тую прыхільнасць да беларускай справы, якую праявіў тагачасны дырэктар школы Казімір Машара.

А летам 1993 года было ўзнята пытанне і аб адкрыцці ў Вільні агульнаадукацыйнай беларускай школы. Пытанне разглядалася на самым вышэйшым узроўні ўладаў і ў рэшце рэшт было вырашана станоўча. Спачатку, 1 верасня 1993 года, школу адчынілі пры адной з рускіх школаў, а да 1 верасня 1994 года ёй далі і сваё асабістае памяшканне. Дырэктарам школы стала Галіна Сівалава. Таварыства Беларускай Школы ўзначаліла Лілея Плыгаўка, а пазней яе замяніў Лявон Луцкевіч, у той час гэта ўжо яму дазвалялася. Ён прыклаў нямала намаганняў, каб гэтая школа ў Вільні працавала.

Гаворачы аб адкрыцці і працы школы трэба адзначыць уклад у гэтую справу і Леакадыі Мілаш. Нарадзілася Леакадыя Мілаш у вёсцы Соргаўцы былога Смаргоньскага, а зараз Астравецкага раёну. Яе маці Тэрэза і бацька Баляслаў паходзілі з мнагадзетных

сялянскіх сем`яў і самі таксама заставаліся сялянамі. Праўда, бацька Леакадыі заўжды вылучаўся цягай да кніжак - у яго нават ёсць свая бібліятэка, любіў малюваць і рэзаць па дрэве. Ён меў і нейкія прыроджаныя здольнасці педагога: скажам, нават калі даваў загад дзецям нешта зрабіць, дык заўжды пачынаў са слоў - можа ты зробіш... Але і дзеці разумелі, што калі тата кажа, значыць, патрэбна зрабіць.

Скончыла Леакадыя, пасля сярэдняй школы, Ашмянскі бухгалтарскі тэхнікум і Віленскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці рускай філалогіі. У тыя гады, як і амаль усе дзеці, падлеткі, юнакі і дзяўчаты, была і піянеркай, і камсамолкай. Пасля стала раўніваю каталічкаю. Ды гэта так яно і павінна было стацца, бо і мама і тата Леакадыі таксама веруючыя людзі.

Працаваць Леакадыя пачала на Віленскім заводзе электраканструкцый, спачатку бухгалтарам, а пасля інструктарам аддзела кадраў і інжынерам. Ад названага завода яна атрымала аднапакаёвую кватэру ў прыгарадзе Вільні - Грыдзішках. Працуючы на заводзе, Леакадыя была заўзятай актывісткай у правядзеніі культурных мерапрыемстваў, за што у 1988 годзе ёй было прысуджана ганаровае званне “Выдатнік культуры Літвы”.

На працу ў школу Мілаш перайшла ў 1991 годзе, спачатку ў рускую, а з адкрыццём у Вільні беларускай школы - у беларускую. Вялікі ўклад Леакадыя Балеславаўна зрабіла ў само напаўненне школы вучнямі - разам з ёю ў школу перайшло каля дваццаці хлопчыкаў і дзяўчынак. Гэта былі дзеці, галоўным чынам, яе сябровак і знаёмых. Указаная з`ява гаворыць аб аўтарытэце Леакадыі Мілаш і як чалавека і як настаўніцы, якую паважаюць і вучні, і іх бацькі.

Як настаўніца рускай мовы і літаратуры, Леакадыя Мілаш больш за ўсё захапляецца Аляксандрам Сяргеевічам Пушкіным. У яе ўласнай бібліятэцы налічваецца 110 кніг, звязаных з гэтым геніем рускай літаратуры. Леакадыя Балеслаўна наведала і ўсе месцы, звязаныя з жыццём вялікага паэта. Таму яе можна лічыць сапраўднай пушкіністкай. Ды аб гэтым сведчаць і тыя граматы, якія атрымала Мілаш за прапаганду творчасці Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна.

Аднак захапленне геніем вялікага рускага паэта не перашкаджае ёй быць і раўнівай беларусісткай. Любімымі яе беларускімі пісьменнікамі і паэтамі з`яўляюцца нашы класікі - Янка Купала і Якуб Колас, Канстанцыя Буйло, Максім Багдановіч,

Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў, Пімен Панчанка. Любіць яна паэзію і многіх маладых беларускіх аўтараў. Больш таго, яна нават лічыць, што сучасная беларуская паэзія з`яўляецца самай цудоўнай у свеце з усіх славянскіх паэзій. Мабыць, у гэтым яна і мае рацыю, бо, як вядома, беларуская мова з`яўляецца адной з моваў, якая ў найменшай ступені сапсаваная імперска-таталітарнымі ідэалагемамі, найбольш захавала сваю першапачатковую пяшчотнасць, мілагучнасць і пявучасць.

Да беларускага адраджэнскага руху Леакадыя Балеславаўна далучылася ўжо ў 1986 годзе і вельмі ўдзячна за гэта Валдасу Банайцісу, які, здзейсніўшы ў той час вандроўку па Беларусі, прывёз адтуль многа беларускіх кніжак і стаў сам вывучаць беларускую мову. Ён пайшоў на пошту і пацікавіўся, хто ў Вільні выпісваў беларускі друк. Сярод іншых спадар Банайціс знайшоў прозвішча і Леакадыі, якая ў той час атрымлівала часопісы “Работніца і сялянка”, “Полымя” і газэты “ЛіМ” і “Голас Радзімы”. Вось ён і напісаў Мілаш ліст з запрашэннем яе на вечарыну ў Віленскі ўніверсітэт. Але яна ў той час на вечарыну не пайшла, аб чым шкадуе і сёння. А спаткалася Леакадыя Мілаш з Валдасам Банайцісам, ды адначасова і з Лявонам Луцкевічам, Сяргеям Карабачом і Валянцінам Стэхам ужо на другой вечарыне, прысвечанай 110-годдзю з дня нараджэння Цёткі (сапраўднае імя і прозвішча - Алаіза Пашкевіч). З гэтага часу Леакадыя Баляславаўна пачала сістэматычна наведваць усе мерапрыемствы, што праводзіліся ў Вільні і тычыліся беларускасці. У 1988 годзе яна стала ўдзельніцай хору “Сябрына”, а пасля і аднайменнага згуртавання, прысутнічала на I з`ездзе БНФ, які праходзіў у Вільні. Прымала ўдзел ва Ўстаноўчым сходзе ТБК у Літве, а пасля яго стварэння пачала актыўна дапамагаць старшыні Хведару Нюньку і як бухгалтар, і як актывіст пры падрыхтоўцы тых ці іншых мерапрыемстваў. Гэта, мабыць, і дало падставу Хведару Якубавічу называць яе сваім надзейным памочнікам і аднадумцам.

Важным пытаннем, за вырашэнне якога ўзялося ТБК, была арганізацыя сваёй пастаяннай газэты. За гэта спачатку ўзяўся сябра Рады беларускі паэт Андрэй Чэмер (сапраўднае імя і прозвішча - Аляксей Анішчык). Ён падрыхтаваў нумар беларускай старонкі “Пагоня” у літоўскай газэце “Летувос рытас”. Гэтая старонка “Пагоні” выйшла 18 студзеня 1990 года. А з 5 лістапада 1993 года стала выходзіць штотыднёвая старонка “Беларуса

Віленшчыны”. Але патрэбна была свая асабістая газэта. Для яе выдання была створана ініцыятыўная група і абрана рэдакцыйная калегія на чале з рэдактарам Тацянай Шмід. Назвалі газэту “Рунь”. З яе дзесятага нумара рэдактарам газэты стаў Алег Мінкін.

З першых часоў свайго існавання ТБК імкнецца актыўна рэагаваць на ўсе падзеі ў Беларусі, адзначае юбілейныя даты з дня нараджэння вядомых беларускіх грамадска-палітычных дзеячоў, пісьменнікаў, вучоных, арганізоўвае экскурсіі па памятных гістарычных месцах у Беларусі і Літве, стварыла некалькі філіяў у іншых раёнах Літоўскай Рэспублікі, наладзіла сувязі з блізкім і далёкім беларускім замежжам. Сам Хведар Якубавіч Нюнька абраны сябрам Прэзідыума Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Пры ўсіх цяжкасцях вырашана пытанне з асабістым памяшканнем, у якім некаторы час размяшчаліся і рэдакцыі газэт “Наша ніва” і “Руні”, а таксама знаходзілі сабе часовыя рабочыя месцы многія беларусы, пераехаўшыя па тых ці іншых прычынах у Вільню. Створана і свая ўласная бібліятэчка, у якой безадказна працуе Ніна Рыгораўна Брылеўская.

Актыўнымі сябрамі Рады ТБК зараз з`яўляюцца:

Міхась Іголка, які нарадзіўся ў 1949 годзе ў вёсцы Горна Зельвенскага раёна ў сялянскай сям`і. Бацька Міхася Іван, будучы дванаццацігадовым хлапчуком, разам са сваімі бацькамі, быў вывезены ў 1914 годзе ў Сібір, таму ў падлеткавым узросце ён выхоўваўся ў інтэрнацыянальным асяроддзі. У Сібір былі вывезены і бацькі маці Міхася. І калі вярталіся дамоў, у вагоне поезда ў іх з`явілася будучая маці Міхася. Мабыць, шчырая вера ў Бога і вось гэткае інтэрнацыянальнае выхаванне і сталі тымі фактарамі, якія ў час Другой сусветнай вайны з`явіліся для бацькоў Міхася больш уплывовымі на іх паводзіны, чым страх перад смерцю. Усе ваенныя гады, рызыкуючы быць застрэленымі, яны выхоўвалі ў сваёй сям`і жыдоўскага хлопчыка Хаіма Ротмана. Дарэчы, у вёсцы Горна былі і яшчэ дзве сям`і, якія здзейснілі гэткі ж паступак, як і Іголкі. Калі Хаім вырас, ён стаў вайскоўцам і служыў у Чарняхоўску Калініградскай вобласці. Туды ён запрасіў і Міхася. Апошні ў той час скончыў 9 класаў Зельвенскай школы. У Чарняхоўску Міхаць працягнуў вучобу ў 10 класе, дзе і атрымаў атэстат сталасці. Далей вучыцца паступіў у Ленінградскі інстытут чыгуначнага транспарту, але вучыўся ён не ў горадзе на Няве, а ў Вільні, дзе быў філіял дадзенага інстытута. З тых часоў Міхась Іголка і жыве ў Вільні. Ён добра валодае літоўскай мовай, ды і

жонка Міхася літоўка па нацыянальнасці. У іх растуць дзве дзяўчынкі. Навогул, згодна майго разумення, якое я зрабіў, пазнаёміўшыся з Міхасём, яго прыгожай жонкай і прыветлівымі дачушкамі, - гэта вельмі прыемная сям`я.

А самога Міхася заўжды цягнула да беларускасці. Яму падабаецца беларуская мова, як ён выказаўся, сваёй пявучасцю і мілагучнасцю. Калі Міхась быў вучнем, настаўніца нават адзначала, што ў яго ёсць прыроджаны літаратурны талент. І таму, калі ў Вільні пачаўся дэмакратычны ўздым, Міхася адразу пацягнула і да свабоды, і да беларускага руху. Ён рэгулярна хадзіў на ўсе мерапрыемствы “Сябрыны”, з кіраўніком якой Валянцінам Стэхам у свой час працаваў у адной канторы. Міхась быў удзельнікам Устаноўчага сходу ТБК, на якім сядзеў недалёка ад вядомага беларусазнаўцы Адама Мальдзіса. Быў ён і на могілках Росы ў час захавання ўрны з астанкамі Івана Луцкевіча. Яго тады вельмі ўразіла прамова Міхася Ткачова, сваёй праўдзівасцю і шчырасцю.

Па сваім прыроджаным характары і выхаванню Міхась Іголка адносіцца да людзей спакойных, шчырых і сумленных, але ў той жа час і дзелавых, прынцыповых. Ён увесь час сябе карыць, што як член Рады ТБК, мала чым можа дапамагчы названай арганізацыі, хаця ў тым, што зімою ў памяшканні ТБК печкі цёплыя, вялікая заслуга менавіта Міхася. Нямала дае ён і парадаў у час паседжання Рады ТБК. Але Міхась ужо гэткі чалавек, якому ўвесь час хочацца зрабіць для беларускай справы нешта яшчэ большае;

Вольга Саковіч, дачка вядомага беларускага дзеяча Юльяна Саковіча. Нарадзілася ў ваенным 1942 годзе ў Маладэчне. З`яўленне на свет дачкі бацька ўспрыняў як самае найвялікшае ў сваім жыцці шчасце. Справа ў тым, што Юльян жаніўся даволі ўжо позна, але на вельмі каханай дзяўчыне Волі, якая была за яго маладзейшай на шмат гадоў. Мне давялося з ёю спаткацца, калі ёй было ўжо за восемдзесят. Пры гэтым не магу не адзначыць, што ўяўляе яна сабою самую замілаванасць, якой уласцівы паэтычная жаночая прыгажосць і светлы розум. І можна толькі думаць, якой Воля была, калі яе ўбачыў Юльян... Мабыць, менавіта, таму і нарадзіўшуюся ў той цяжкі час дачку назвалі таксама Воляй. А навогул, гэткае жаночае імя даецца ў гонар вядомай княгіні Вольгі - жонкі кіеўскага князя Ігара, якая прыняла хрысціянскую веру значна раней, чым адбылося хрышчэнне Кіеўскай Русі, - каля 957 года. І абедзве Волі Саковіч гэткага імя

варты, хоць жыццё склалася ў іх зусім не княжацкае.

Калі маленька Волі было толькі сем месяцаў, 13 чэрвеня 1943 года, на Тройцу, загінуў бацька, а хутка стала небяспечным заставацца ў Маладэчне і маці. Па прычыне гэтага прыйшлося пераехаць на тэротырою Літвы да стрыечнага брата Юльяна - Мікалая Саковіча, які меў там свой невялікі фальварак Гелва. Некалькі пазней Воля (старэйшая), якая засталася на сваім дзявочым прозвішчы, пераехала ў Шырвінтай, дзе стала выкладаць у літоўскай школе рускую мову. Пры школе ёй з дачкою далі і невялікі пакойчык. Вось у гэтай школе Воля (меньшая) і скончыла чатыры класы. Пасля пераехалі ў вёску Пакішкі, дзе дзяўчынка вучылася ў пятым-сёмым класах. Пакішкінская школа была таксама літоўскай, але, паколькі ў яе хадзіла многа дзяцей польскіх сем`яў, у ёй вывучалі і польскую мову, дзякуючы чаму ёю авалодала і Воля.

1953 год - год смерці аднаго з самых лютых тыранаў XX стагоддзя Іосіфа Сталіна. Смерць прыйшла на пачатку сакавіка і здавалася, што разам з веснавымі водамі згінуць і тыя жахі і пакуты, якія на працягу доўгіх гадоў цярпелі мільёны людзей ад створанага тыранам таталітарнага рэжыму. Але, на жаль, пацяпленне наступала вельмі марудна. І названы год стаў для абедзвюх Воляў новым выпрабаваннем. Маці Волю арыштавалі і прыцягнулі да допытаў наконт удзелу яе ў антысавецкай дзейнасці. Аднак нічога не знайшоўшы, праз некаторы час адпусцілі. Пасля гэтага Саковічы пераехалі жыць у Пабраддзе, дзе меншая Воля і скончыла дзесяцігодку. Далей была вучоба ў Віленскім педагагічным інстытуце на біялагічным факультэце. Інстытут Воля скончыла ў 1964 годзе і 23 гады настаўнічала ў той жа школе, у якой і сама атрымала атэстат сталасці, - гэта Пабродская 1-ая руская школа. Пасля стала працаваць у дзіцяча-юнацкім інтэрнаце, дзе выхоўваюцца дзеці і моладзь да 29 гадоў з адсталым разумовым развіццём.

Лёс з ТБК у Літве Вользе Юльянаўне Саковіч дапамагла звязаць газэта, у якой яна прачытала артыкул Сяргея Вітушкі і ўбачыла фатакартку дамка з указаным адрасам, па якому размяшчаецца дадзеная арганізацыя. А далей прыйшлося купіць мапу Вільні і ўжо з яе дапамогай знайсці патрэбную арганізацыю. У ТБК Волю сустрэла Ніна Рыгораўна Брылеўская, якая і расказала ёй аб дзейнасці гэтай арганізацыі. У той жа час Брылеўская пацікавілася жыццём Волі, бо прозвішча Саковіч Ніне Рыгораўне

шмат аб чым гаварыла.

Вольга Юльянаўна адразу зразумела, што тая справа, якой займаецца ТБК у Літве, з`яўляецца для яе чымсьці сваім і родным, да чаго цягнулася душа і чаго раней так не хапала. Стаўшы актыўным членам ТБК у Літве, Воля Саковіч, мабыць, сваім нутром адчула, што яна робіць тую справу, якую ёй разам з генамі па спадчыне перадалі бацькі. А таму, нягледзячы на цяжкасці прыязджаць на мерапрыемствы больш як за 50 кіламетраў, адчувае ад удзелу ў іх душэўную асалоду;

Павел Саўчанка, які нарадзіўся ва Усходняй Беларусі - Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут. Працуе ў беларускай школе ў Вільні настаўнікам біялогіі. Гэта ўжо пажылы гадамі чалавек, але настолькі рухавы, што паспявае аператыўна выконваць дадзеныя яму даручэнні. А ў многім і сам праяўляе ініцыятыву. Вялікую працу Павел Пятровіч вядзе ў газэце “Рунь”, дзе не толькі выступае з артыкуламі, але і займаецца рассылкай яе па ўсяму свету. А калі на вечарынах у ТБК Павел Пятровіч Саўчанка зробіць даклад аб нейкім беларускім патрыёце, што бывае нярэдка, дык проста нельга падумаць, што ён не гісторык з вялікім стажам;

Сяргей Карабач нарадзіўся ў вёсцы Яманты Лідскага раёна. У 1944 годзе скончыў Навагрудскую настаўніцкую семінарыю, а ў 1953 годзе - Віленскі ўніверсітэт (медычны факультэт), кандыдат медыцынскіх навук. Удзельнік Другой сусветнай вайны, у час якой быў паранены. У Вільні пабудаваў уласны дом. 28 гадоў працаваў намеснікам Галоўнага ўрача Рэспубліканскага праціватуберкулёзнага дыспансера. Аўтар некалькіх навуковых артыкулаў. Пасля праведзенай у Літве пераатэстацыі навуковых работнікаў Сяргей Сцяпанавіч Карабач стаў доктарам медычных навук. Нягледзячы на тое, што яму ўжо за 75, Сяргей Сцяпанавіч працягвае працаваць. Да беларускага руху далучыўся з часоў стварэння “Сябрыны”. Ён заўсёды цікавіцца і перажывае за тое, як ідуць справы ў Беларусі, добрасумленна адносіцца да выканання даручэнняў па падрыхтоўцы паседжанняў Рады ТБК. Так, як і Павел Саўчанка, Сяргей Сцяпанавіч з задавальненнем рыхтуе даклады і на гістарычныя тэмы;

Валеры Місюк - яшчэ малады, але ўжо добра адукаваны і надзейны актывіст ТБК. Як і старэйшыя гадамі члены Рады ТБК, з задавальненнм і сумленна выконвае ўсе даручэнні;

Андрусь Старавойтаў працуе на радыё “Паленія” і імкнецца

падрабязна інфармаваць слухачоў аб працы ТБК. Выконвае і іншыя даручэнні;

Алесь Трусаў - гэта таксама малады хлопец, які менавіта па сваіх перакананнях стаў займацца беларускай справай. Будучы членам Рады ТБК, выконвае разавыя даручэнні.

Як бачна, члены Рады ТБК у Літве розныя па ўзросту, адукацыі і, канешне, па характарах. Але Хведар Якубавіч умее знайсці да кожнага з іх свой падыход і аптымальна выкарыстаць іх здольнасці для агульнай справы.

У сувязі са склаўшымся становішчам у Беларусі да працы ТБК у Літве сталі падключацца ўсё новыя і новыя людзі. І ў тым зноў-такі вялікая заслуга старшыні Рады ТБК, які сам вельмі заклапочаны лёсам Радзімы, а гэта перадаецца і іншым, хто з ім сутыкаецца.

Безумоўна, што ТБК у Літве не магло б нармальна працаваць без падтрымкі яго дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі Літоўскай Рэспублікі. І тут таксама патрэбна аддаць належнае яго кіраўніку. Хведар Якубавіч умее паразмаўляць з прадстаўнікамі ўладаў, літоўскімі дзеячамі культуры і пераканаць іх у неабходнасці той ці іншай дапамогі ўзначальваемаму ім Таварыству. Асабліва патрэбна адзначыць разуменне праблемаў Таварыства з боку Генеральнага дырэктара Дэпартамента нацыянальных меншасцяў Літвы Р.Мотузаса. А некаторыя кіраўнікі грамадскіх арганізацый аказваюць дапамогу і па сваёй добрай волі. Прыкладам у гэтым можа служыць сям`я Каўшынісаў: Стасіса і яго жонкі Аўрэліі. Сам Стасіс з`яўляецца вядомым у Літве праваабаронцам. І нягледзячы на сваю занятасць, не прапускае амаль ніводнагаг мерапрыемства, якія праводзяца ТБК, а многія і дапамагае арганізоўваць. Як праваабаронца, ён разумее становішча, якое склалася з правамі чалавека ў Беларусі, і таму аказвае таварыству і некаторым грамадзянам Рэспублікі Беларусь значную кансультатыўную дапамогу. Не лічыцца з часам і яго жонка. Аўрэлія добра валодае англельскай мовай і часта дапамагае беларускім актывістам у Літве як перакладчык.

Актыўна дапамагае Таварыству Беларускай Культуры ў Літве і яшчэ адзін вядомы літоўскі дзеяч - Эдурдас Паташынскас. Маючы вельмі сціплыя матэрыяльныя рэсурсы арганізацыі, якую ён узначальвае, спадар Паташынскас імкнецца дапамагчы беларускім актывістам, чым толькі ёсць у яго магчымасць. І робіць ён гэта таксама ў многім з-за павагі да Хведара Якубавіча.

З Хведарам Якубавічам Нюнькам я непасрэдна пазнаёміўся не так даўно. І што я адразу прыкмеціў у яго паводзінах, дык гэта яго мэтанакіраванасць, дакладнасць, учэпістасць і свабодалюбства. Хведар Якубавіч часта хоча пабыць адзін, паразважаць сам на сам, нешта прааналізаваць і абдумаць свае дзеянні на будучае. Безумоўна, у яго, як і ў кожнага з нас, ёсць нейкія недахопы. Мабыць, як кіраўнік ТБК у Літве, ён бывае часамі залішне даверлівы і ў той жа час занадта катэгарычным. Мабыць, у яго не хапае гнуткасці. Але пры ўсім тым, у Хведара Якубавіча ёсць самае галоўнае, што патрэбна для старшыні Таварыства Беларускай Культуры ў Літве, - гэта адчуванне таго, што ў такі цяжкі час у гісторыі нашай Бацькаўшчыны, які яна зараз перажывае, толькі абапіраючыся на вопыт пакаленняў знакамітых беларусаў-патрыётаў, можна не разгубіцца і не сагнуцца, як гэта зрабілі некаторыя іншыя, а працягваць свядома стаяць на нацыянальна-патрыятычных пазіцыях і аб`яднаць вакол сябе падобных.

Але Хведар Якубавіч - не толькі мэтанакіраваны палітык, а яшчэ і вельмі прыемны, і надзейны сябра. У кампаніях - гэта незаменны тамада. Мне прыходзілася бачыць яго, калі ён браў у рукі акардыён і зацягваў свае любімыя беларускія песні. І тады здавалася, што нібыта і не было тых перажытых гадоў, якія з`яўляліся для яго не заўжды спрыяльнымі.

Жывучы ў Вільні і працуючы з Хведарам Якубавічам побач, бачачы яго ў розных месцах і сітуацыях пры рашэнні многіх пытанняў, хачу без усялякага перабольшвання сказаць, што Таварыству Беларускай Культуры ў Літве проста пашанцавала, што ў дадзены перыяд яго ўзначальвае менавіта гэткі чалавек, які разумее сваю адказнасць і жыве лёсам сваёй Бацькаўшчыны, бескарысліва робячы ўсё ад яго залежнае, каб з дапамогай культурна-асветніцкай працы падняць самасвядомасць беларусаў да ўзроўню разумення імі неабходнасці адстойвання незалежнасці і вяртання нашай роднай краіны на дэмакратычны шлях развіцця. Менавіта гэта і дае мне падставу назваць Хведара Якубавіча сапраўдным змагаром за Беларускасць.

# ЖЫЦЦЁ ДЛЯ ДРУГІХ
## (Ніна Брылеўская)

Вядома, што гісторыя чамусьці больш увагі звяртае на разбуральныя падзеі і іх герояў і менш - на станоўчыя і ствапальныя. Напрыклад, імя грэка з горада Эфеса Герастрата, які, каб забяспечыць сабе бессмяротнасць, у 356 годзе да новай эры знішчыў адзін з цудаў свету - спаліў храм Артаміды Эфескай, можна знайсці і ў сённяшніх энцыклапедычных слоўніках, у той жа час аб тым, хто будаваў гэты храм, не гаворыцца. А калі ў гісторыі штосьці і сказана аб стваральных падзеях, дык пры гэтым узгадваюцца імёны толькі выбітных асобаў, хоць матэрыяльныя і духоўныя багацці ствараюць тысячы звычайных людзей, якія з цягам часу пакідаюць жыццё, так і застаўшыся невядомымі. Бо калі яны жывуць і працуюць, іх амаль не бачна на паверхні, але без іх сумленнай працы нельга ўявіць сабе стваральную дзейнасць чалавецтва, тым больш, што многія з іх вельмі адданыя сваёй справе. Сярод гэткіх людзей ёсць нават такія, што ніколі не жылі для сябе, а ўсё аддавалі іншым і ад гэтага атрымлівалі задавальненне. Дзякуючы гэткім людзям і развіваецца прагрэс. Таму іх жыццё, безумоўна, заслугоўвае таксама застацца ў гісторыі, як прыклад сумленнасці, працалюбівасці, сціпласці. Менавіта да гэткіх людзей адносіцца Ніна Рыгораўна Брылеўская, з якою мне таксама пашчасціла спаткацца ў Вільні.

Нарадзілася Ніна Рыгораўна 5 мая 1920 года ў вёсцы Міхневічы, што зусім побач з Залессем, дзе яе бацька тады працаваў дзяком. Гэта вельмі прыгожыя мясціны нашай роднай Беларусі. Стаіць Залессе на чыгуначнай лініі Менск-Вільня ў адным кіламетры ад цудоўнай ракі Вяллі. Праз самое Залессе працякае яе прыток - Драя. Праславіў залескія мясціны род Агінскіх, якія мелі тут вялікі маёнтак. Агінскія паходзілі ад Рурыкавічаў, у прыватнасці, ад Данілы Святаслававіча, унука Кіеўскага князя Уладзіміра і пляменніка Ізяслава, сына Уладзіміра і Рагнеды. У Вялікім княстве Літоўскім гэты род займаў значныя пасады: яго прадстаўнікі былі гетманамі, канцлерамі, ваяводамі, маршалкамі і дыпламатамі. Багдан

Агінскі, які жыў у першай палове XVII стагоддзя, прызначаўся старастам Віленскага праваслаўнага брацтва. Але, перайшоўшы ў другой палове XVII стагоддзя ў каталіцтва, Агінскія паступова апалячыліся. Аднак Рыгор-Антон Агінскі ў 1696 годзе ачоліў канфедэрацыю войска Літоўскага, якая дамагалася зраўнення ў правах літоўска-беларускай шляхты з польскай, і быў аўтарам праекту аддзялення Вялікага княства ад Польшчы.

Найбольш праславілі Залессе, безумоўна, Міхаіл Казімір і Міхаіл Клеафас Агінскія. Першы, ваявода Віленскі, а пазней вялікі гетман Літоўскі змагаўся з расейскай навалай, якая здзяйснялася пад камандаваннем Аляксандра Суворава. Ён пабудаваў вядомы канал, які злучыў раку Шчару з Ясельдай, гэта значыць, Нёман з Прыпяццю і Дняпром. У Слоніме стварыў оперны тэатр, заснаваў друкарню і пабудаваў некалькі прадпрыемстваў. Пісаў музычныя творы, пераважна паланэзы. Ён перадаў Залессе свайму пляменніку Міхаілу Клеафасу, які пераехаў сюды ў 1802 годзе і пабудаваў тут, замест былога драўлянага, цагляны палац у класічным стылі. Пабудова палаца і іншых аб`ектаў вялася па праекту маладога, але, як можна судзіць па гэтых забудовах, таленавітага прафесара архітэктуры Віленскага універсітэта Міхаіла Шульца, які, на жаль, рана памёр. Пасля смерці прафесара будаўнічымі работамі кіраваў другі віленскі архітэктар Юзаф Пусэ. Непасрэдныя будаўнічыя работы выконваліся мясцовымі спецыялістамі, мулярамі, цеслярамі, кавалямі, сярод якіх, згодна захаваўшыхся дакументаў, значацца Юзаф Астроўскі, Франц Высоцкі і іншыя. Быў закладзены і новы парк на ангельскі лад, у якім, акрамя розных дрэў, заўжды расло многа кветак. У парку пастаўлены камень-помнік Тадэвушу Касцюшку і камень з удзячным надпісам гувернёру М. Агінскага фрацузу Жану Рэлею. Частку парка, прылягаючую да ракі Драі, займаў заапарк. Гэта месца і цяпер завецца Звярынцам. Ад палацу ў розных накірунках разыходзяцца алеі, абсаджаныя ліпамі, клёнамі, бярозамі. У канцы адной з іх стаяла старадаўняя, пабудаваная ў XVI стагоддзі драўляная Юр`еўская праваслаўная царква, якую, на жаль, спалілі ўжо пасля Другой сусветнай вайны. Злачынства было здзейснена ноччу на Вялікдзень.

У палацы размяшчаліся не толькі жылыя пакоі, але і розныя гасцінныя салоны, сталовая, більярдная, аранжарэя, дзе раслі

вінаград, лімоны, ананансы, апельсіны і прыгожыя кветкі. Названай аранжарэяй М. Агінскі вельмі ганарыўся, што бачна з пісьма гаспадара свайму аканому: “Мая аранжарэя цудоўная і магла б скласці гонар Пецярбургу”. М. Агінскі часта любіў бываць і ў сваёй бібліятэцы. Згодна захаваўшыхся архіўных матэрыялаў, у гэтым пакоі былі “…паркет з ясеню, сцены пафарбаваныя, столь пабеленая. Вокнаў падвойных пяць і ва ўсіх шторы паркалёвыя белыя. Печ з кафлі, з дзверцамі чугуннымі. У бібліятэцы мэбля: фартэп`яна з чырвонага дрэва, венскае, столь з ясеню, сукном пунцовым выклеены, столік з чырвонага дрэва, раскладны,… крэслаў з чырвонага дрэва - шэсць. Шафікі з чырвонага дрэва, шафа вялікая берасцяная, чатыры шафы з ясеню”. За сваю прыгажосць Залессе атрымала назву “Паўночныя Афіны”.

Як вядома, князь Міхаіл Клеафас Агінскі ўвайшоў у гісторыю як вялікі кампазітар - аўтар оперы “Зэліс і Валькур, або Банапарт у Каіры” і папулярных, надзвычай меладычных паланэзаў, у тым ліку “Развітанне з Бацькаўшчынай”, які быў напісаны ў год Трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1895г.) і здабыў сабе бессмяротную славу. Агінскім напісаны таксама “Марш паўстанцаў” і некалькі іншых маршаў, патрыятычных вайсковых песняў, мазурак, рамансаў і вальсаў. Але Міхаіл Клеафас быў яшчэ і вялікім патрыётам сваёй Бацькаўшчыны. Ён таксама, як і яго дзядзька Міхаіл Клеафас, змагаўся з наступам Расеі. Пад час паўстання 1794 года, кіраўніком якога быў Тадэвуш Касцюшка, Міхаіл Агінскі камандаваў сфармаваным і ўзброеным за свой кошт конным аддзелам. Ён уваходзіў і ў склад ураду паўстанцаў - Нацыянальную Раду. Крыху пазней, а дакладней у 1811 годзе, Міхаіл Клеафас Агінскі падаў цару Аляксандру І праект арганізацыі Вялікага герцагства Літоўскага на правах аўтаноміі са сталіцай у Вільні. Безумоўна, цар адхіліў гэты праект. З 1822 года знакаміты кампазітар і патрыёт вымушаны быў пакінуць Залессе і апошнія гады свайго жыцця правёў у Фларэнцыі (Італія).

Пасля Першай сусветнай вайны маёнтак Залессе аказаўся без гаспадара. Акупацыйныя польскія ўлады падзялілі яго на часткі. Цэнтр маёнтка разам з палацам, паркам і фруктовым садам купіла пані Жаброўская, жонка прафесара Варшаўскага універсітэта. Новая гаспадыня жыла з сялянамі навакольных вёсак у згодзе.

У суседняй з Залессем вёсцы Зарудзічы нарадзіўся і жыў беларускі паэт Алесь Салагуб, які, паверыўшы бальшавіцкай хлусні, перайшоў у 1928 годзе польска-савецкую граніцу. Пазней, як і дзесяткі іншых, ашуканых бальшавікамі, паэт быў загублены.

У былым палацы Агінскіх савецкая ўлада зрабіла дом адпачынку. На жаль, само памяшканне з гадамі разбураецца і чакае капітальнага рамонту і рэстаўрацыі, як помнік архітэктуры і памяць аб вялікім кампазітары.

Хата, у якой жыў дзяк Рыгор Маркавіч Брылеўскі, з`яўлялася маёмасцю царквы і стаяла на хутары. Сядзіба з двух бакоў абвівалася ўсё той жа ракой Драяй. Таму маленькай Ніне, як і яе тром брацікам (Валодзі, Колі, Лёні), прыходзілася мець зносіны больш з дзецьмі бацюшкі Дзмітрыя Цімкіна, хата якога знаходзілася на другім беразе ракі. Праўда, у адрозненне ад сям`і Брылеўскіх, дзе ўсё дыхала беларускасцю і хатняй мовай заўжды з`яўлялася толькі беларуская, у бацюшкі ўсё рабілася на расейскі лад, што не магло не сказацца адмоўна і на адносінах паміж дзецьмі. Хаця, калі дзеці выраслі, яны сталі падтрымліваць паміж сабою сувязі і ў меру магчымасцяў нават адны другім дапамагалі.

А паходзілі Брылеўскія з вёскі, правільная назва якой Лоска. Але чамусьці палякі, а пасля і расейцы, сталі называць яе Лоск, як, скажам, замест Менск - Мінск, Наваградак - Навагрудак, Гародня - Гродна, Бярэсце - Брэст, Ашмяна - Ашмяны, Алёхнавічы - Аляхновічы, Валожына - Валожын, Маладэчна - Маладзечна. Лоска першы раз узгадваецца ў гісторыі ў XIV стагоддзі. Тут знаходзілася сядзіба князёў Лоскіх. Пазней яна стала належыць беларускаму магнацкаму роду Кішкаў. У XVI стагоддзі ў Лоскім замку была заснавана друкарня. Восенню 1573 года па прапанове Яна Кішкі ў Лоску пасяліўся Сымон Будны, дзе яму ў распараджэнне была аддадзена названая друкарня. Праз год тут друкар выдаў “Новы запавет” з прадмовай і каментарамі. У 1576 годзе ў Лоску свет убачыў і галоўны рэлігійна-філасофскі твор Буднага “Аб найважнейшых палажэннях хрысціянскай веры”. Тут былі выдадзены і некаторыя іншыя творы знакамітага друкара.

У вёсцы Лоска Брылеўскія мелі па тых часах даволі дастатковую колькасць зямлі, бо, калі падзяліліся, бацьку Ніны Рыгору Маркавічу дастаўся хутар у 10 гектараў. Але гэтую

зямлю Рыгор Брылеўскі спачатку аддаваў у арэнду свайму пляменніку, і толькі, калі выраслі дзеці (а было гэта ўжо ў другой палове трыццатых гадоў XX стагоддзя), зямлю пачалі засяваць самі Брылеўскія. Ды і то, паколькі сям`я не жыла на хутары, дык галоўнымі культурамі, якімі гаспадары засявалі зямлю, з`яўляліся жыта і лубін. Уся справа заключалася ў тым, што Рыгор Маркавіч Брылеўскі меў па тых часах дастатковую грамату, каб атрымаць права працаваць народным настаўнікам. Вось тады, яшчэ ў царскія часы, ён і хадзіў па бліжэйшых вёсках ды вучыў дзяцей, а пасля навогул выехаў у Петраград (так у той час называўся сённяшні Санкт-Пецярбург), дзе працаваў на адным з заводаў. Аднак праз некаторы час Рыгор Брылеўскі вымушаны быў вярнуцца ў Беларусь. Прычынай вяртання з`явілася тое, што ў горадзе адчуваўся подых блізкага Балтыйскага мора і магутнай, хоць і кароткай ракі Нявы, з-а чаго паветра ў горадзе было ўвесь час праз меру насычана вадою. Гэта кепска пераносіла жонка Рыгора Маркавіча Юстына Казіміраўна, па дзявочаму прозвішчу Чарнецкая.

Вярнуўшыся дамоў, Рыгор Маркавіч здаў у Вільні экзамены на дзяка і першыя гады працаваў на гэтай пасадзе ў сваёй вёсцы, а пасля быў пераведзены ў Залессе, дзе і пражыў аж да лета 1944 года. Але прыезд у Беларусь, на жаль, не дапамог Юстыне Казіміраўне. Яна мела слабое здароўе і калі Ніне было яшчэ толькі 9 гадоў і дзяўчынка хадзіла ў другі клас, маці памерла. Праз некаторы час бацька ажаніўся і ўзяў сабе жонку ўсё з таго ж Лоска - Лукеру Фёдараўну Сліж, якая яму нарадзіла яшчэ адну дачку. Нараджэнне дзяўчынкі астатнія дзеці ўспрынялі з задавальненнем. Для іх яна стала нейкай лялькай. Сама мачыха была жанчынай акуратнай, умела шыць, валодала прыгожым голасам і яшчэ да замужа пела ў царкоўным хоры. Але замяніць роднай маці дзецям не магла.

Святар і дзяк былі ў тыя часы самымі паважанымі людзьмі ў вёсцы. Яны не толькі адпраўлялі царкоўную службу, але і з`яўляліся свайго роду дарадчыкамі для сваіх прыхажан амаль па ўсіх пытаннях. Ніна рыгораўна памятае, што не было таго дня, каб да бацькі хтосьці не прыходзіў з нечым параіцца, у тым ліку нават па гаспадарчых пытаннях ці з просьбай напісаць нейкі ліст, бо сярод сялян было вельмі мала граматных.

Такім чынам, вось у гэтых гістарычных і цудоўных мясцінах Беларусі і прайшлі дзіцячыя гады Ніны Рыгораўны Брылеўскай.

Тут яна пайшла ў школу і скончыла сем класаў. Ужо ў школе яна праявіла вялікую цікавасць да навукі, аб чым заўжды адзначалі настаўнікі. Але сама школа ў той час была ўжо апалячанай, дзе беларуская мова вывучалася толькі як прадмет, ды і то аднаго разу ў вучняў запыталі, хто б з іх хацеў ад вывучэння беларускай мовы адмовіцца. Праўда, такіх знайшлося толькі дзве вучаніцы з класа, дзеці чыгуначнікаў, а астатнія нават не маглі сабе ўявіць, як гэта можна не вывучаць сваю родную мову. Кіраўніком (загадчыкам) Залесскай школы, калі Ніна хадзіла ў пяты-сёмы класы, працавала Вікторыя Анзэлевечуўна. Гэта была вельмі інтэлігентная настаўніца, прыгожа малявала, нават партрэты. У яе не было сям`і. Сціпла, але ў той жа час з густам, апраналася. Хадзіла з маленькай палачкай з кутасом, што таксама адрознівала яе ад іншых жанчынаў. І аднойчы амаль усе дзяўчынкі сёмага класа таксама зрабілі сабе падобныя падачкі, што сведчыла аб іх павазе да настаўніцы - кожная з дзяўчынак хацела быць падобнай на яе. Вікторыя Анзэлевечуўна вельмі цікава прымала экзамены па сваім прадмеце - Польска Вспулчэсна (сучасная ПОльшча). Настаўніца слухала кожнага вучня толькі адзін на адзін, без прысутных. Ніне Брылеўскай давялося адказваць на пытанні: межы Польшчы з іншымі дзяржавамі і Адміністрацыйны вертыкальны падзел Польшчы. Ніна атрымала “выдатна”, пры гэтым кіраўнік школы падзякавала ёй за грунтоўныя веды. Запамяталася Вікторыя Анзэлевічуўна Ніне яшчэ і тым, што стварыла ў Залескай школе бібліятэку дапамгала ёй выдаваць кнігі вучням. Каб вучні лепш ведалі свой край, Вікторыя Анзэлевечуўна арганізоўвала з імі экскурсіі ў Вільню і іншыя вядомыя месцы.

Далей вучыцца Ніне ў той час не прыйшлося: не было сродкаў, бо ўжо вучыўся ў Варшаве старэйшы брат Валодзя, якому і трэба было дапамагаць. Таму, скончыўшы сем класаў, Ніна пайшла і год вучылася за швачку, што ў вёсцы з`яўляецца таксама нядрэннай спецыяльнасцю і давала магчымасць зарабіць нейкі злот (так пры Польшчы называліся грошы). Восем злотых у месяц Ніна запрацоўвала і ў мясцовага аптэкара Блуся - паляка, жонкай у якога была эстонка. Ніна хадзіла да Блуся дамоў і дапамагала там на некалькі гадоў меншай за сябе аптэкарскай дачцы Зэльме адрабляць хатняе заданне, а заадно і пасябравала з яе старэйшаю сястрою Іраю.

З іншымі залескімі дзяўчынкамі і хлопцамі Ніна сустракалася ў царкве, дзе Рыгор Маркавіч стварыў і кіраваў хорам, у якім

удзельнічала ўся сям`я Брылеўскіх, акрамя Валодзі, бо ў апошняга не было да гэтага ні цягі, ні здольнасцяў. Сам бацька іграў на скрыпцы. Навучыліся іграць на розных інструментах і два браты Ніны - Коля і Лёня. Ніна іграць не вучылася, але ў хор пець хадзіла з задавальненнем. Удзельнікамі хору былі многія залескія дзяўчаты і хлопцы, а таксама мужчыны і жанчыны. Прыходзілі ў яго некаторыя жыхары і навакольных вёсак.

Да вучобы Ніна вярнулася толькі ўвосень 1939 года, калі з прыходам бальшавікоў у Маладэчне адкрылася педагагічнае вучылішча. У ім Ніна правучылася два гады, прычым зсумаваўшыся па навуцы, яна аддавалася ёй поўнасцю. За гэтыя два гады толькі адзін раз пабыла на танцах. Але затое, калі была на другім курсе, дык аб яе ведах рускай мовы, якія яна паказала на экзаменах, нават пісала раённая газэта. Аднак скончыць педвучылішча Ніне перашкодзіла вайна, з пачаткам якой яна вярнулася дамоў.

У час нямецкай акупацыі на тэрыторыі Беларусі пачатковыя школы былі нацыянальнымі. А з адраджэннем беларускай школы ў насельніцтва стала абуджацца і нацыянальная свядомасць. Людзі не сталі саромецца гаварыць на сваёй роднай мове, больш таго, яны адчулі яе хараство. А частка беларускай інтэлігенцыі стала думаць і аб адраджэнні сваёй нацыянальнай дзяржавы. Бо толькі нацыянальная дзяржава можа стварыць неабходныя ўмовы для развіцця асобы. Але, на жаль, такую неабходнасць разумелі не ўсе. Ніна Рыгораўна памятае, як адна з жанчын і ў іх Залессі з прыходам немцаў у Ніны запытала: “Ну невядома, пад кім мы цяпер ужо будзем?”. На што Брылеўская адказала: “А чаму мы павінны быць пад некім? Мы ж беларусы. І ў нас павінна быць свая дзяржава - Беларусь”.

З адкрыццём беларускіх школаў спатрэбілася і шмат настаўнікаў, якія ведалі б беларускую мову. І паколькі гэткіх настаўнікаў не хапала, дык імі сталі працаваць і з такой адукацыяй, якая была ў Ніны. Ніна таксама стала настаўніцай у вёсцы Лебедзева. Гэта прыгожая вялікая вёска (мястэчка) паміж Маладэчнам і чыгуначнай станцыяй Пруды. Вось у гэтай прыгожай вёсцы з першых дзён прыходу немцаў Валодзя Брылеўскі стаў працаваць войтам. І калі тут немцы арганізавалі гета для жыдоў, Брылеўскі даў загад натапіць лазню і памыць няшчасных, бо больш дапамагчы ім ён нічым не мог. Нават і гэткі свой пастунак вымушаны быў абгрунтаваць немцам, што гэта неабходна было

зрабіць, каб не дапусціць з`яўлення тыфу, якога немцы паталагічна баяліся. Праўда, аднаго разу Брылеўскі паспрабаваў зрабіць і большае, калі да яго звярнуўся з просьбай знаёмы жыд з Залесся. Валодзя прапанаваў свайму бацьку забраць гэтага жыда з гета і завезьці ў сваю вёску. На жаль, жыд чамусьці пазьней зноў апынуўся ў гета.

Людзі ў Лебедзеве жылі нядрэнна, па веравызнанню былі галоўным чынам праваслаўнымі. Таму вёску ўпрыгожваў каменны будынак праваслаўнай царквы, якая працавала і ў час нямецкай акупацыі. У царкве быў прыгожы хор, у якім калі-нікалі стала прымаць удзел і Ніна Рыгораўна. Пры Польшчы тут пабудавалі новую школу, якая насіла за польскім часам імя Юзафа Пілсудскага. Калі ў ёй стала працаваць Ніна Брылеўская, школай кіраваў Пётра Станіслававіч Зяновіч, чалавек адданы беларускай справе, за што і стаў пазней ахвярай бальшавіцкага разбою. У свой час, калі Ніна была яшчэ вучаніцай, ён працаваў кіраўнікам Залескай школы. Пётра Зяновіч прыгожа іграў на скрыпцы і вучыў, акрамя матэматыкі, яшчэ і спевы. Настаўніцай працавала і яго жонка Марыя Харытонаўна, дарэчы, першая настаўніца Ніны Брылеўскай. Пасля разам з іншымі беларусамі Зяновічы вымушаны былі пераехаць на тэрыторыю этнічнай Польшчы, дзе таксама працавалі настаўнікамі. І вось у лебедзеве яны сустрэліся з Нінаю Брылеўскай ужо як калегі.

Тут, у Лебедзеве, Ніне Рыгораўне пашчасціла спаткацца з актыўным удзельнікам беларускага адраджэння, прафесарам Вацлавам Івaноўскім. Гэта здарылася ў першыя месяцы яе працы. Іваноўскі ў той час быў ужо бурмістрам Менску. І аднойчы, едучы з Вільні ў Менск, ён заехаў па дарозе ў Лебедзева да Брылеўскіх пераначаваць, таму што кіраўніцтву ў Маладэчне ён не давяраў. А аб Уладзіміру Брылеўскім ён чуў як аб сумленным беларусе. І як узгадвае сам Уладзімір Брылеўскі, ён тады “убачыў перад сабой вельмі сімпатычнага, старэйшага векам чалавека, у якім не было і ценю напышлівай важнасці. Гутарыць з ім, чалавекам высокай культуры, было лёгка, свабодна, і я пранікнуўся да яго вялікай павагай. Ягоным шафёрам быў ягоны студэнт… Вечарам гэтага ж дня прафесар Іваноўскі выступіў перад жыхарамі мястэчка ў залі валаснoй управы з дакладам пра тагачасную сітуацыю на Беларусі і перспектывах на будучыню.

Вечарам пілі гарбату з сахарынам і працягвалі ўсё тую ж размову аб перспектывах Беларусі, якія прафесар Вацлаў

Іваноўскі закрануў у сваім дакладзе. Пасля размовы Ніна Рыгораўна падрыхтавала прафесару пасцель і ён лёг адпачываць. А раніцою, пакуль прафесар падняўся і памыўся, яго чакаў ужо сняданак - напечаныя Нінаю аладкі. Мабыць, яны настолькі Іваноўскаму спадабаліся і паднялі ў яго настрой, што ён нават сказаў прымаўку:

Кожны дзень бліны,
А ў нядзелю таюны.

У канцы 1943 года, будучы з жонкаю ў Менску, Уладзімір Брылеўскі атрымаў вестку, якая яго ўзбударажыла і прывяла ў сум: калі прафесар Вацлаў Іваноўскі ехаў вечарам фурманкай з гарадской управы дамоў, ён быў забіты. Вось так трагічна абарвалася жыццё яшчэ аднаго вядомага беларускага дзеяча за незалежнасць Беларусі.

Пасля Лебедзева Ніна Рыгораўна стала працаваць настаўніцай у Смургонях, куды яе паклікаў брат Валодзя. Уладзімір Рыгоравіч Брылеўскі працаваў у той час бурмістрам Смургонскага павету. На названую пасаду яго запрасіў вядомы ў той час лекар Васіль Катовіч. Сам Катовіч быў сынам праваслаўнага святара, за польскім часам скончыў Віленскі універсітэт і працаваў спачатку ў Залессі, а пасля, ужо ў час нямецкай акупацыі галоўным доктарам у Вілейцы, якая з`яўлялася акруговым цэнтрам. Будучы сумленным беларусам, Васіль Якаўлевіч Катовіч не мог абыякава глядзець на тое, як польскія крайнія нацыяналісты, уладкаваўшыся ў нямецкіх акупацыйных структурах, знішчалі беларускую інтэлігенцыю. Справа ў тым, што да Падсдамскай канферэнцыі 1945 года змену граніцы пасля 17 верасня 1939 года палякі не прызнавалі і быў аддадзены загад польскага ўрада ў эміграцыі аб стварэнні ваенных структураў для барацьбы за незалежнасць Польшчы ў межах даваенных граніцаў Другой Рэчы Паспалітай (1920-1939г.г.). У сувязі з гэтым ужо з першых дзён акупацыі Заходняй Беларусі немцамі польскія элементы, як ужо было сказана, імкнуліся захапіць адміністрацыю самаўпраўлення рэгіёнамі ў свае рукі, стваралі сваю паліцыю, а пасля гэтага на Смургоншчыне, як і на Лідчыне, у Шчучынскім і іншых паветах заходняй беларусі, разгарнулі пад выглядам барацьбы з камуністамі дзікі тэрор супраць беларускага нацыянальнага актыву. Напрыклад, у тым жа Смургонскім павеце ў вёсцы

Шутавічы іхняй паліцыяй быў арыштаваны Войцэх Шутовіч. Ёй жа былі арыштаваны і Юстын Мурашка, а на Лідчыне быў забіты Юльян Саковіч, які таксама паходзіў са Смургонскага павета. Ахвярамі гэтага нацыяналістычнага разбою сталі і многія іншыя сумленныя беларусы. У Смургонях яны спрабавалі арыштаваць нават Аляксандра Калодку, арганізатара беларускай паліцыі ў Вілейскай акрузе, але, у адрозненне ад першых, знішчыць яго польскім нацыяналістам не ўдалося. Больш таго, прыезд Аляксандра Калодкі ў Смургоні паскорыў стварэнне тут беларускай адміністрацыі.

Смургоні былі вядомы вядомы як мястэчка Ашмянскага павету Вілейскага ваяводства ўжо ў XV стагоддзі. У наступным стагоддзі кальвіністы пабудавалі тут свой сабор, які пазней стаў каталіцкім касцёлам, потым - праваслаўнай царквою, а пасля 1920 года зноў касцёлам. З XVII стагоддзя Смургоні былі ўласнасцю Радзівілаў, а пасля графаў Пшэздзецкіх. У гэтым жа стагоддзі Радзівілы заснавалі тут "Смургонскую акадэмію", у якой дрэсіравалі мядзведзяў, пасля чаго вазілі апошніх па кірмашах спачатку ў межах Рэчы Паспалітай, а пазней Расійскай імперыі і нават у іншыя краіны. Менавіта таму перад уездам у Смургоні аж да Другой сусветнай вайны стаяла табліца з намаляваным на ёй стаячым на задніх лапах мядзведзем, трымаючым у пярэдніх лапах меч, - гербам горада. Славіліся Смургоні і сваімі кірмашамі, на якія з`язджалася шмат народу з блізкіх і далёкіх вёсак, і амаль кожны лічыў неабходным прывезьці з кірмашу смургонскіх баранак, якія лічыліся самымі смачнымі ва ўсёй Віленскай акрузе.

Працуючы ў Смургонях, Ніне Рыгораўне таксама давялося спаткацца з многімі сумленнымі беларусамі, якія прыязджалі да брата. Сярод іх яна асабліва запамятала ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага, з якім не толькі размаўляла, але і частавала яго ўсё тымі ж беларускімі аладкамі. З выгляду гэта быў высокай імпазантнай фігуры чалавек, у якім удала спалучаліся мужнаць і інтэлігентнасць. Аб яго адданасці беларускай справе Уладзімір Брылеўскі чуў яшчэ тады, калі за польскім часам Гадлеўскі працаваў ксяндзом у Жодзішках. У тыя часы, калі амаль усе ксяндзы ў Заходняй Беларусі - палякі або апалячаныя беларусы - гаварылі казанні і адпраўлялі багаслужбу толькі па-польску, ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі сярод нямногіх іншых усё гэта рабіў па-беларуску. Ён нават выдаваў газэту з вельмі смелай для часоў польскай акупацыі назвай - "Беларускі фронт".

Безумоўна, што тагачасныя польскія ўлады ксяндзу гэтага не даравалі. Вінцэнта Гадлеўскага арыштавалі і пасадзілі ў турму. А з прыходам немцаў ён стаў Галоўным Інспектарам беларускіх школаў у Генеральным камісарыяце Беларусі і на пачатку 1942 года прыязджаў па справах у Смургоні. А летам таго ж года, ужо будучы бурмістрам Жодзішскага павету, Уладзімір Брылеўскі наладзіў Дзень Беларускай Культуры, на які запрасіў і Вінцэнта Гадлеўскага. У прызначаны дзень Гадлеўскі прыехаў у Жодзішкі разам з немцам Сівіцам. У той дзень Вінцэнт Гадлеўскі выступіў з прамовай і на беларускай мове адслужыў у касцёле імшу. А ў Жодзішках у той час ксяндзом быў нехта Чаплоўскі, які, на погляд У. Брылеўскага, з`яўляўся, мабыць, апалячаным беларусам. Чапоўскі праводзіў у адносінах да беларусаў яскрава выражаную шавіністычную палітыку. Пасля прыходу немцаў у 1941 годзе ён нават у касцёле гаварыў: “Дзякаваць Богу, што скончылася беларуская ўлада”, хоць і добра ведаў аб тым, што савецкая ўлада ніякай беларускай не была. У рапарце Віленскаму біскупу Райнісу Чапоўскі Уладзіміра Брылеўскага і яго намесніка Альфонса Шутовіча таксама называў “камуністымі”. Менавіта гэткай была тактыка польскіх шавіністаў у барацьбе з беларускім нацыянальным актывам. Ну, а самога Вінцэнта Гадлеўскага арыштавала і замардавала нямецкае СД.

Са Смургоняў Ніну Брылеўскую перавялі працаваць настаўніцай у Жодзішкі, куды, як ужо сказана раней, пераехаў бурмістрам са Смургоняў у арганізаваны новы павет яе брат Уладзімір. Жодзішкі таксама размяшчаліся ў вельмі прыгожым месцы ў 25 кіламетрах ад Смургоняў. Стаіць мястэчка на высокім правым беразе Вяльлі. Побач у тыя часы тут рос прыгожы, пераважна хваёвы лес. Таму ў Жодзішках заўжды было чыстае, з прыемным пахам смалы паветра. З вялікіх будынкаў у Жодзішках стаяў прыгожы касцёл барочнага стылю і вялікі палац з тоўстымі сценамі, дзе і размяшчалася ўправа (раней тут быў кляштар і езуіцкая школа рыторыкі, у якой рыхтаваліся змагары супраць Рэфармацыі на Беларусі).

У Жодзішках Уладзімір Брылеўскі і ажаніўся на дзяўчыне, з якой пазнаёміўся ў час працы пры савецкай уладзе аграномам непадалёку ад Маладэчна. Вянчаўся ў праваслаўнай царкве. Вяселле адбывалася ў тым жа доме, дзе і жыў. На вяселле да свайго старэйшага сына прыехаў з Залесся і бацька з меншай дачкою Галяю. Ніна ў той час ужо жыла ў Жодзішках, таму, як гэта

і належыць сястры, прымала ў вяселлі самы актыўны ўдзел: пры запісу шлюбу была сведкай, а ў час вянчання разам з бацькам і сваёй каляжанкай - дачкою бацюшкі Цімкіна з Залесся спявала ў царкоўным хоры.

Вайна… Гэта жахі і забойствы, разбурэнні і пажары. Жыццё чалавека становіцца роўным жыццю мухі. Яго на кожным кроку чакае бяда. Гэта адчула і добра зразумела Ніна Рыгораўна, калі аднойчы разам са сваёй сяброўкай Іраю (дачкой бацюшкі Цімкіна) ехала з Жодзішкаў у Залессе. У той вечар па названай дарозе ехала шмат падводаў. І патрэбна было ім толькі заехаць у лес, як адкуль ні вазьміcь выскачылі ўзброеныя партызаны і хутка акружылі ўсіх людзей. Ад здарыўшагася людзі атарапянелі. Сама Ніна за адну хвіліну стала з твару белай як снег, у роце ўсё перасохла. Партызаны запыталі ў кожнага прозвішча і высветлілі месца працы. Пры адказе на пытанні Ніна Рыгораўна не ілгала. Ды і рабіць гэтага яна не магла па стану свайго самаадчування, якое прыкмецілі і партызаны. Адзін з іх нават запытаўся: “А што вы так збялелі?”.

Але на шчасце, на гэты раз ехаўшых людзей затрымалі сапраўдныя партызаны, для якіх галоўным з`яўлялася барацьба з фашыстамі, а не разбой і грабёж, чым займаліся ў той час многія пад выглядам партызанаў. Таму, пачуўшы адказы людзей на зададзенае пытанне і ўбачыўшы іх разгубленасць, партызаны супакоілі ехаўшых і з Богам адпусцілі дамоў.

А летам 1943 года на Жодзішкі напалі польскія партызаны. У час нападу было забіта двое немцаў, а таксама Тамаш Трызна, які працаваў пры ксяндзу Гадлеўскім арганістам. Тады загінулі і некаторыя іншыя беларусы, у тым ліку мясцовая жанчына з дзецьмі. Быў спалены мост праз раку, што прымусіла пасля мясцовых жыхароў перавозіць з палёў дабро (зерне, бульбу) на чоўнах. Дарэчы, немцам знішчэнне маста не прынесла ніякай шкоды, бо яны ездзілі зусім іншай дарогай. Пасля названага здарэння павятовую ўправу перанеслі ў Смургоні.

У час гэтага нападу Ніна Рыгораўна спала ў стадоле на сене. Прачнулася ад выстралаў і хутка пабегла ў хату паглядзець, што здарылася з братам, хоць і сама ў той час яшчэ не разумела, што адбываецца. Дзверы ў сенях і хаце былі адчынены і нікога не было бачна. Але, калі яна апынулася ў сенях, пачула голас брата, які з гарышча ціха ёй паведамляў, што на вёску напалі партызаны, але ён таксама ў той час не мог ведаць, чые гэта былі партызаны.

Далей Ніна хутка пабегла зноў у стадолу. І тут магла б здарыцца бяда, бо непадалёку ад іх сядзібы знаходзіліся ўсё тыя ж акоўцы, якія і напалі на вёску. Яны заўважылі бягучага чалавека і адкрылі агонь, аднак, на шчасце, кулі праляцелі міма Ніны.

З ліквідацыяй павету, у Жодзішках перастала працаваць і школа. Ніну Рыгораўну перавялі настаўніцай у роднае для яе Залессе. Вучыць стала ў пятых-сёмых класах. Кіраўніком школы ў той час быў таксама сумленны і з выгляду прыгожы, хоць ужо ў тую пару і пажылы, беларус - Янка Дудка, які працаваў у названай школе і за польскім часам, але пасля разам з іншымі настаўнікамі-беларусамі, як і Пятро Зяновін, быў адпраўлены ў этнічную Польшчу. З прыходам немцаў ён зноў вярнуўся ў Залессе. У Залескай школе тады працаваў і яшчэ адзін шчыры беларус, брат лекара Катовіча - Ян Катовін. Гэта быў сярэдняга росту, высока адукаваны і добры па характару чалавек. Ён ніколі не павышаў голасу, любіў пасьмяяцца, пажартаваць. З павагай адносіўся і да вучняў, і калі ўжо ставіў камусьці дрэнную адзнаку, дык гэта азначала, што вучань сапраўды нічога не ведаў. Пры Польшчы Ян Катовін працаваў у Віленскай беларускай гімназіі, у якой выкладаў біялогію. Тут ён арганізаваў куток жывой прыроды, дзе пад шклом знаходзіліся рыбы, жабы, вужы, гадзюкі і іншыя жывёліны. У час акупацыі немцамі Беларусі па прапанове брата-лекара Ян Катовіч пераехаў у Залессе.

Як вядома, у чэрвені 1944 года немцы пачалі адступаць. У гэткі пераломны момант, безумоўна, кожны чалавек думае, як яму паступіць. Многія пачалі рухацца на Захад, бо амаль за два гады (верасень1939 - чэрвень 1941) добра пазналі савецкія парадкі і адносіны бальшавікоў да людзей. Ніна Рыгораўна таксама задумалася, што рабіць далей. Да гэтага часу яе сяброўка Іра - дачка бацюшкі Цімкіна, якая ўжо сама была матушкай, - жыла ў Вільні. Іх сям`я мела свой дом. Вось Ніна Рыгораўна і вырашыла паехаць у Вільні да Цімкіных. У горадзе яна застала самую разруху, яшчэ не было ніякай улады, ішла страляніна. Таму ўсе яны (Ніна Рыгораўна, Ірына Дзмітрыеўна, яе маці, брат, сястра і маленькі сын), знайшоўшы нейкі склеп, схаваліся ад куляў. А калі баі скончыліся і горад занялі савецкія войскі, яны вылезлі са сховішча. Малюнак, які яны ўбачылі ў горадзе, быў жудасны: на вуліцах і на плошчах валялася многа трупаў нямецкіх салдат, было многа свежых магіл, у якіх савецкія салдаты паспелі пахаваць сваіх таварышаў.

Усе разам, параіўшыся, вырашылі не пакідаць Радзіму, але і ў горадзе было заставацца пакуль што небяспечна. Таму, зноў-такі ўсе разам, паехалі ў Залессе, дзе і прабылі некалькі дзён у бацькі Ніны. Пагасціўшы, Ірына Дзмітрыеўна са сваёй сям`ёй зноў накіравалася ў Вільню. Ніна Рыгораўна вырашыла ехаць у родную вёску бацькі - Лоска. Вось тады яна і развіталася з бацькам аж на дзесяць гадоў, бо пасля гэтага яго хутка арыштавалі, а затым і выслалі ў Карагандзінскія стэпы.

У Лоску Ніна Рыгораўны жыла ў стрыечнага брата, да якога яна і прыехала. А паколькі настаўнікаў пасля вайны зноў не хапала, дык Ніне Рыгораўне прапанавалі працу ў школе. Тут яна, як і заўжды, праявіла сваю шчырасць, вучыла галоўным чынам чацвёртыя класы, а калі школа пачала паступова пераўтварацца ў сямігодку, дык стала весці яшчэ ў пятым і шостым класах рускую мову і біялогію. Аб яе сумленных адносінах да працы ў школе пісала нават раённая газэта, на раённых канферэнцыях яе абіралі ў прэзідыум. А калі ў школу прыязджаў інспектар аблана і пабыў на ўроках Брылеўскай, дык сказаў дырэктару, што гэтай настаўніцы можна даваць урокі і ў сёмым класе. І, безумоўна, сумленнасць і сціпласць Ніны Рыгораўны хутка прыкмеціла дырэктар школы Таццяна Міхайлаўна Марынец, у якой таксама лёс быў нялёгкі: памёр муж, сын-медык і нявестка загінулі на фронце. Жыла Таццяна Міхайлаўна ў школьным доме, які ў свой час (пры Польшчы) пабудавалі для кіроўніка. У доме было два невялікіх пакоі і кухня, але ў адным з пакояў размяшчаўся клас. Так што Таццяна Міхайлаўна займала кухню і адзін пакой, куды і запрасіла жыць Ніну Рыгораўну. Апошняя з удзячнасцю пагадзілася і перайшла вось у гэты пакой да дырэктара школы. Дырэктар школы сама вяла матэматыку.

Але, у адрозненне ад Таццяны Міхайлаўны Марынец, якая была прыезджай, у Заходнюю Беларусь у той час з усходу зноў панаехала нямала і такіх, што не мелі адукацыі, ды і розуму было ў іх небагата. Менавіта гэткім быў і старшыня сельскага савета Ерын, былы партызан, па нацыянальнасці рускі. Ён лічыў нават за гонар тое, што меў толькі два класы адукацыі ды займаў гэткую пасаду. Збіраючы актыў сельскага савета і аддаючы нейкія загады, у яго з пяці слоў тры было мацерных, пры гэтым нягледзячы на тое, што большасцю актыва з`яўляліся жанчыны. Жыць Ерын пачаў у свайго намесніка - мясцовага жыхара, у якога была ў той час яшчэ зусім маладая дачка Надзя. І маючы нахабны характар,

Ерын адразу вырашыў скарыстацца гэткай нагодай. Праз некалькі часу Надзя стала ахвярай лёсу: нарадзіла дачку. Але ў самога старшыні сельскага савета, які быў за Надзю нашмат старэйшы, розуму ад таго, што ён стаў бацькам, не прыбавілася. Яго неадпаведнасць займаемай пасадзе ў рэшце рэшт зразумелі і ў раёне, а таму і знялі з работы. Ерын застаўся без справы. І цяжка сказаць, у чым заключалася галоўная прычына, што аднойчы былы старшыня сельскага савета ўхапіў сякеру і стукнуў яе вастрыём Надзі па галаве, ад чаго маладая жанчына хутка сканала, пакінуўшы круглай сіратою малую дачушку. Бо, вядома, за гэткі ўчынак Ерына пасадзілі ў турму.

Памятае Ніна Рыгораўна і прысланага ў школу ваенрука, які праз некаторы час напіўся самагонкі і “сеў на белага каня”, пасля чаго разагнаў вучняў і кінуўся ў канцылярыю з намерам пабіць дырэктара школы, якая ў той час прылягла там адпачыць, бо была хворая. І Ніна Рыгораўна зрабіла ўсё магчымае, каб не дапусціць азвярэлага хулігана да дырэктара школы, якая, дарэчы, яшчэ не так даўно прыехала, а таму і начавала пакуль што ў канцылярыі. Праўда, за сваю сумленнасць і смеласць Брылеўская паплацілася моцнымі ўдарамі ў твар і па руцэ. На шчасце, у гэты час у школу прыйшоў медыцынскі фельчар рабіць дзецям уколы. Ён і дапамог Ніне Рыгораўне на нейкі час суняць п`янага хулігана. Праз некалькі хвілін у школу прыйшлі і дзве настаўніцы, якія аб здарыўшымся хутка паведамілі ў сельскі савет. Адтуль прыбег сакратар, пасля чаго ўсе разам звязалі незадачлівага ваенрука, якому дадзены выпадак каштаваў зняццем з працы.

Не лепшымі паводзінамі выдзяляліся і так званыя “ястрабкі”, у задачу якіх уваходзіла барацьба з блукаўшымі ў той час па лесе і вёсках рознымі людзьмі, сярод якіх былі і сапраўдныя бандыты. Але многа сярод іх было і такіх, якія проста туляліся ад савецкай улады. Вось аднаго разу гэткі “ястрабок” у п`яным выглядзе і ў суправаджэнні мясцовага актывіста забрыў у хату да стрыечнага брата Ніны Рыгораўны, у якога яна тады жыла. Мэтай прыходу быў пошук маладой настаўніцы. А свае хуліганскія дзеянні “ястрабок” пачаў з таго, што запатрабаваў у Ніны Рыгораўны дакументы. І калі яму нешта не спадабалася, пачаў страляць у столь. Брат Ніны Рыгораўны, будучы параненым на фронце, да гэтага часу ўжо вярнуўся дамоў, стаў крычаць, учынілі гвалт і яго малыя дзеці, жонка, але “ястрабок” не сунімаўся. А таму самой Ніне Рыгораўне, нягледзячы на тое, што яна тады хварэла на

запаленне лёгкіх, прыйшлося выратоўвацца уцёкамі праз акно. Да сказанага трэба дадаць, што ўсё гэта адбывалася ўжо позняй цёмнаю ноччу.

А Ніна Рыгораўна, адначасова з працай у школе паступіла і стала вучыцца ў Лідскім педвучылішчы. Але, як вядома яшчэ з ленінскіх часоў, для бальшавікоў галоўным заўжды была адданасць уладзе, а не прафесіяналізм і адданасць справе, якой чалавек займаецца. Ды чаго ж іншага можна было чакаць ад улады, прадстаўнікамі якой былі ўзгаданыя старшыня сельсавета, "ястрабок" ды ваенрук. Таму і ў дадзеным выпадку, даведаўшыся аб тым, што бацька Ніны Рыгораўны знаходзіцца ў ссылцы, а старэйшы брат недзе за мяжою, сталі яе ўспрымаць як "члена сям`і ворага народа". Нават на настаўніцкай канферэнцыі, на якой прысутнічала і сама Ніна Рыгораўна, і дырэктар школы Таццяна Міхайлаўна, загадчык раяна Пужэвіч стаў папракаць апошнюю за тое, што яна "зжылася" з Брылеўскай, нібыта і не было ў Ніны Рыгораўны той сумленнасці і прафесійнага майстэрства, аб якім некалькі месяцаў таму назад пісала раённая газэта.

У хуткім часе пасля гэтага Ніну Рыгораўну Брылеўскую знялі з працы, запісаўшы ў загадзе, як гэта тады і вадзілася, зусім іншую фармулёўку, у тым ліку і што яна нібыта метадычна няправільна праводзіла заняткі з вучнямі, паказаўшы тым самым крывадушнасць самой улады. Больш таго, адлічылі яе і з педагагічнага вучылішча, хоць і была яна ўжо на апошнім курсе, заставалася толькі здаць дзяржаўныя экзамены. Усё гэта цяжка зразумець чалавеку з непакалечаным розумам, але, на жаль, вось гэткі час прыйшлося перажыць людзям.

Пры дапамозе знаёмых Ніна Рыгораўна знайшла сабе прытулак, а пасля і прыпісалася на пастаяннае месца жыхарства ў Вільні. Працаваць стала ў масавай бібліятэцы. Але ў хуткім часе ў сямігадовай школе №11 спатрэбіўся настаўнік, які ведаў бы рускую і польскую мовы. Вось у гэтую школу і ўладкавалася настаўніцай Ніна Рыгораўна, дзе і працавала, пакуль не захварэла.

Вайна і ўсё перажытае далі аб сабе знаць. А тым больш, што ў гэты час Брылеўскай прыйшлося перанесці і вялікія перагрузкі. Справа ў тым, што да Ніны Рыгораўны ў 1950 годзе дайшлі чуткі, што яе могуць зняць з працы і ў гэтай школе. Таму, каб не застацца без працы навогул, яна вырашыла адначасова паступіць на бухгалатарскія курсы, якія знаходзіліся на пэўнай адлегласці, а таму патрабавалі і часу, і напругі. І як вынік - арганізм аслабеў і

пры першай прастудзе ў Ніны Рыгораўны паявіўся туберкулёз. Праўда, курсы яна скончыла, прычым з добрымі адзнакамі, але працу ў хуткім часе прыйшлося пакінуць. Трэба было лячыцца, і лячыцца інтэнсіўна, бо спадзявацца на матэрыяльную дапамогу не было ад каго. Пенсія па інваліднасці была зусім малая.

Дзякаваць Богу, у гэты цяжкі для Ніны Рыгораўны час знайшліся добрыя людзі, і перш за ўсё сярод лекараў. Іх высокая кваліфікацыя і чалавечыя адносіны да Ніны Рыгораўны запамяталіся ёй на ўсё жыццё. Яны і дапамаглі Ніне Рыгораўне вярнуцца зноў на працу. А вярнулася яна ў тую ж самую школу, якая за гэты час была перафармавана ў сярэднюю пад нумарам 14. Працаваць стала ў бібліятэцы, бо праца настаўніка яе палохала як сваімі нагрузкамі, так і тым (а, мабыць, гэта і было галоўным), што ў яе не было адпаведнага дыплома. Школа была з трымя мовамі навучання: рускай, літоўскай і польскай. І ўсімі імі бібліятэкар валодала. А што тычыцца працы, дык Ніна Рыгораўна зноў стала адносіцца да яе ўсё з той жа беларускай шчырасцю, аб чым сведчаць адзнакі ў працоўнай кніжцы: у 1956 годзе за добрую працу ёй аб`яўлена падзяка, у 1970 годзе яна ўзнагароджана Ганаровай граматай гарана, у 1981 годзе - медалём “Ветэран працы”, у 1985 годзе ёй зноў аб`яўлена падзяка. Некалькі разоў Ніна Рыгораўна атрымлівала і грашовую прэмію. А ў 1959 годзе яе фатакартку, як сумленнага працаўніка народнай асветы Літвы, памясцілі ў цэнтральнай рэспубліканскай газеце, дзе быў змешчаны і невялікі артыкул. У ім адзначалася, што бібліятэкар сярэдняй школы № 14 Ніна Рыгораўна Брылеўская ведае ўсіх сваіх чытачоў па прозвішчу і арыентуецца ў іх схільнасці да той ці іншай літаратуры. У гэтым праяўляўся яе педагагічны падыход да сваёй працы. Яна прыкмеціла нават тое, што меншыя дзеці патрабуюць кніжак не толькі згодна іх узросту і ведаў, але і больш тонкіх, чаго ў той час выдаўцы не ўлічвалі. Сам прыход у бібліятэку абмяняць кнігу для маленькага чытача - гэта падзея. Таму ён хоча бываць тут часцей.

Узгадваючы працу ў школе, Ніна Рыгораўна Брылеўская заўжды не забывае сказаць добрае слова аб сваім дырэктары - працалюбівым і сумленным беларусе - Шостаку Уладзіміру Сямёнавічу, які не толькі трымаў школу ў прыстойным выглядзе, але і пасадзіў каля яе даволі вялікі сад, правёў у будынак школы ваду, на пляцы пабудаваў цяпліцу. І, безумоўна, ён пільна сачыў за выкананнем вучэбнага плану і дысцыплінай у школе. Умеў

падабраць кадры і як педагог спалучаў патрабаванні з тактычнасцю. Пры гэтым зазначым, што ў шматмоўнай школе рабіць гэта было няпроста.

Паколькі ў Ніны Рыгораўны не было ніякай дапамогі збоку, а шанцаў на атрыманне кватэры ад дзяржавы было таксама мала, дык ёй прыйшлося падпрацоўваць яшчэ і на іншых работах, у тым ліку і ў самой школе: сакратаром, часта замяняць адсутных настаўнікаў. Усё гэта дапамагло ёй зарабіць грошай і пабудаваць кааператыўную кватэру. Узяла яна для сябе і невялікі зямельны ўчастак, які таксама даваў нейкі прыбытак. Тым больш, ёй, як выхаванай у гаспадарлівай сям`і, было вельмі цікава самой вырошчваць бульбу, гародніну ды прыгожыя кветкі.

У 1954 годзе з лагероў вярнуўся і бацька Ніны. Як чалавека набожнага і адукаванага яго запрасілі на былую працу - дзяком у вёску Гарадзілава, дзе службу адпраўляў сам Благачынны айцец Маеўскі. Прабыўшы ў лагерах цэлых дзесяць гадоў, Рыгор Маркавіч Брылеўскі меў магчымасць убачыць самае дно савецкай улады і таму ўяўляў яе сутнасць і тупіковасць. Рыгор Маркавіч у прыватнасці сказаў: “Бальшавікі яшчэ будуць шукаць Бога”. Дзяком ён праслужыў да глыбокай старасці і памёр, калі яму было ўжо без двух месяцаў 92 гады. Мабыць, за ўсе тыя пакуты, якія Рыгору Маркавічу давялося перанесці ў турме і канцлагерах, Бог даў яму такое доўгае жыццё.

Пасля выхаду на пенсію Ніна Рыгораўна стала актыўнай супрацоўніцай Таварыства Беларускай Культуры ў Літве, дзе галоўным яе заняткам стала таксама бібліятэчная справа. Да гэтага тут ужо працавала Яўгення Георгіеўна Навумчык (дзявочае прозвішча Троцкая). Гэта таксама сапраўдная беларуская патрыётка, адсядзеўшая за свае ідэалагічныя перакананні дзесяць гадоў у сталінскіх лагерах. У тыя гады, калі Ніна Рыгораўна стала працаваць у ТБК, наведвальнікаў бібліятэкі было нямала, але ў памяці Брылеўскай застаўся як самы заўзяты чытач Міхаіл Фёдаравіч Петрыкевіч.

Міхаіл Фёдаравіч родам паходзіў з вёскі Падкасоўе, што на Наваградчыне. Гэта таксама быў патрыёт Беларусі, але, як і многія іншыя, у пошуках дарогі да нацыянальнай свядомасці ён доўга блукаў. За польскім часам у барацьбе за незалежнасць Беларусі Петрыкевіч прымыкаў да левага крыла падпольшчыкаў. У 1931 годзе, калі Міхась быў у апошнім класе Наваградскай гімназіі, яго, як члена камасмола Заходняй Беларусі, арыштавалі і прысудзілі

да трох гадоў зняволення і пазбавілі на дзесяць гадоў грамадзянскіх правоў. З далучэннем Заходняй Беларусі да Савецкага Саюза Петрыкевіч актыўна ўключыўся ў станаўленне новай улады ў сваёй мясцовасці і дапускаў тыя ж памылкі, якія былі характэрны для гэтай улады ў тыя гады. Пасля Другой сусветнай вайны Міхась Петрыкевіч атрымаў вышэйшую адукацыю філолага і працаваў настаўнікам, а разам з тым і захапляўся краязнаўствам. Ім створаны невялікі краязнаўчы музей пры Валеўскай сярэдняй школе Навагрудскага раёна, а пасля і вядомы ў рэспубліцы Дзятлаўскі музей народнай славы. У 1985 годзе Міхаіл Фёдаравіч Петрыкевіч пераехаў у Вільню, дзе жыве яго дачка Святлана. З арганізацыяй Таварыства Беларускай Культуры ў Літве ён стаў прыходзіць на арганізоўваемыя Таварыствам мерапрыемствы. МІхась Петрыкевіч быў шырока адукаваным чалавекам, які ведаў некалькі моваў. Але асабліва яго прываблівалі мовы славянскіх народаў, хоць ён добра ведаў і нямецкую мову і нават меў пазнанні ў жыдоўскай мове. І вельмі цяжка сказаць, ці ёсць у бібліятэцы ТБК у Літве гэткая кніга, якую Міхась Петрыкевіч не прачытаў бы. Аднак Міхасю Петрыкевічу асабліва падабаліся кнігі па гісторыі Беларусі, аб чым ён заяўляў і ў сваім выступе па літоўскаму радыё.

Але, будучы сумленным і руплівым чалавекам, Ніна Рыгораўна не абмяжоўваецца толькі бібліятэчнай справай. Усе, каму давялося хоць адзін раз пабыць у віленскіх дамках па адрасу Жыгіманту 12, 3, той ніколі не забудзе тую непаседлівасць і заклапочанасць Ніны Рыгораўны, якую яна праяўляе аб беларускай справе наогул і, безумоўна, аб кожным наведвальніку, каб ён мог атрымаць тое, за чым прыйшоў. Пры гэтым яна абавязкова кожнаму прапануе выпіць цёплай кавы або гарбаты, якія яна купляе за сваю небагатую пенсію. Ніна Рыгораўна актыўна ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах ТБК у Літве, у тым ліку і ў праводзімых пікетах. Мабыць, у гэтым і праяўляецца тая адна з галоўных рысаў характару, якая ў яе выпрацавана на працягу ўсяго жыццёвага шляху, -жыць для другіх.

## АРОЛ І ЧАЙКА
## (Кастусь і Лёдзя Шышэі)

Людзі, як і птушкі, жывуць ва ўсіх кутках зямлі, незалежна ад кліматычных і іншых умоў. І ў тых і ў другіх ёсць радзіма, дзе яны адчуваюць сябе найлепш. Таму месца жыхарства яны мяняюць толькі па прычыне таго, што з родных краёў іх гоніць рэзкае змяненне ўмоў: птушак - кліматычных, а людзей - эканамічных і палітычных. Пры гэтым людзі ўжо даўно прыкмецілі, што розныя віды птушак адрозніваюцца паміж сабою не толькі сваім знешнім выглядам, але і паводзінамі. Адны, як, напрыклад, арлы і сокалы, - моцныя і гордыя, другія (скажам, вераб`і) - увесь час скачуць, нечага шукаючы. Вароны непрыемна каркаюць, у той час, як трэлі салаўя падымаюць у чалавека настрой. Прыемнае і кіліканне чаек. Дарэчы, як арлы, так і чайкі адрозніваюцца вельмі прыгожым палётам, у час якога амаль не махаюць крыламі, а парaць над зямлёю.

Адрозніваюцца паміж сабою сваімі паводзінамі і людзі. Прычым прыкмечана, што ў іх паводзінах ёсць нешта агульнае з паводзінамі птушак. Мабыць, таму, калі людзі хочуць прааналізаваць паводзіны некага незнаёмага, дык кажуць:"паглядзім, што ты за птушка". А псіхолагі нават стварылі тэорыю, згодна якой, карыстаючыся спецыяльнымі тэстамі, спрабуюць усіх людзей падзяліць на тры групы: галубоў, страусаў і ястрабаў. Да першых яны адносяць людзей больш слабых і мяккіх па характару, якія гатовыя зрабіць усё для іншых, але часцей за ўсё тое, што ім хочацца, каб іншыя зрабілі для іх, бо самі папрасіць, а тым больш дабіцца гэтага яны або баяцца, або не ўмеюць. Гэткія людзі жывуць марамі знайсці такога чалавека, які б іх зразумеў і дапамог уладкавацца ў жыцці. Не знайшоўшы свайго шчасця, яны расчароўваюцца, моцна перажываюць, замест таго, каб сур`ёзна заняцца справай. Людзі-галубы не хочуць браць на сябе ініцыятыву і адказнасць, таму выконваюць, як правіла, другасныя ролі і садзейнічаюць павышэнню іншых. А калі выпадкова і аказваюцца ў ролі лідэра, дык адчуваюць сябе няўпэўнена, залежаць ад прадаў свайго атачэння.

Да страусаў адносяцца людзі халодныя і асцярожныя. Яны ўвесь час нечага баяцца, таму імкнуцца быць адны. Ім для добрага самаадчування патрэбны спакой і прастора. Людзі-страусы бываюць халоднымі нават у сямейным жыцці. Свае няўдачы яны перажываюць звычайна моўчкі, праўда, робяць гэта не надта беручы да сэрца. У іх няма ніякіх вялікіх задумак. Яны імкнуцца быць у баку ад бурлівых падзей.

І зусім іншыя людзі - ястрабы, для якіх характэрнымі рысамі з`яўляюцца славалюбівасць, рашучасць, смеласць. Таму яны амаль заўжды імкнуцца быць наверсе. Пры дасягненні сваіх мэтаў гэтыя людзі бываюць апантанымі і агрэсіўнымі, прымушаюць іншых ім падпарадкоўвацца і дрэнна ўспрымаюць пярэчанні падначаленых. Жыццё для іх - гэта бесперапынная барацьба. У сувязі з уласцівымі ім рысамі характару гэткія людзі з`яўляюцца вельмі складанымі спадарожнікамі для іншых. Таму імі больш захапляюцца, чым іх любяць.

Але гэткі падыход да падзелу людзей на тры катэгорыі, на наш погляд, мае вельмі многа недахопаў. Ён вельмі спрошчаны. Па-першае, ён больш тычыцца людзей толькі мужчынскага полу. Па-другое, не ўсе мужчыны могуць падысці пад гэткія характарыстыкі. Напрыклад, ёсць мужчыны, якія сваімі паводзінамі больш падобныя на вераб`ёў, чым на пералічаных псіхолагамі птушак. Яны, як і вераб`і, ўвесь час скачуць з месца на месца. Мабыць, з-за гэткіх паводзінаў некаторыя і атрымалі ў свой час прозвішча Верабей. Не ўкладваюцца ў такі падзел людзей і тыя, каму ўласцівая такая рыса характару як вясёласць. Гэткія людзі ніколі не сумуюць, яны не разлучаюцца з песнямі. Іх у народзе называюць салаўямі. Дарэчы, і прозвішчы гэткія ёсць - Салавей. Ды і тых, скажам, якіх можна аднесці да ястрабаў, таксама трэба, на нашу думку, падзяліць на больш дробныя катэгорыі, бо сямейства ястрабаў налічвае аж 217 розных відаў птушак. Нават сам род ястрабаў і той мае 50 відаў. І ўсе яны розныя. Гэтак і людзі. Скажам, не ўсім смелым і рашучым уласціва агрэсіўнасць, таму іх нельга падводзіць пад агульную назву ястрабаў. Вядома, што гэткіх хлопцаў і мужчын завуць у народзе арламі, а не ястрабамі. А для параўнання жанчын, у залежнасці ад іх паводзін, выкарыстоўваюцца звычайна гэткія віды птушак, як , акрамя ўзгаданай чайкі, сарока, ластаўка, тая ж варона і іншыя.

На маё задавальненне ў Вільні я пазнаёміўся з беларускай

сям`ёю, у якой муж меў мянушку “Арол”, а жонка ў свой час актыўна ўдзельнічала ў маладзёвай патрыятычнай арганізацыі пад назвай “Чайка”. Гэта вельмі прыгожыя, добрыя душою і нацыянальна свядомыя людзі, з якімі я адразу пасябраваў, тым больш, што Арол і Чайка - гэта мае землякі.

Сапраўднае імя Арла Кастусь, што па латыні азначае цвёрды, пастаянны. Нарадзіўся ён у вёсцы Краскоўскія Горы 17 верасня 1922 года. Гэтая дата - 17 верасня - стала нейкай асаблівай у жыцці Косці, а чаму - гэта ён і сам не ведае.

Вёска Краскоўскія Горы складаецца з двух Гор (Першай і Другой) і з`яўляецца як бы працягам шырока вядомага сяла Шчорсы. А вядома названае сяло сваім лепшым на навагradчыне паркавым ансамблем, які калісьці тут заклаў Іяхім Ігнацый Літавор Храптовіч - Буцянёў. Менавіта ён і пабудаваў у Шчосах цагляны палац на французкі густ, мураваную ўніяцкую царкву і школу, заклаў пейзажны парк на плошчы ў 24 гектары. Будучы высокаадукаваным чалавекам І. Храптовіч-Буцянёў стварыў у сваім маёнтку бібліятэку, якая ў свой час лічылася адной з буйнейшых у Еўропе. Бібліятэкарам у Шчорсах на працягу некалькіх гадоў працаваў вядомы беларускі асветнік і паэт Ян Чачот. У 1819 і 1820 гадах у Шчорсах жыў і карыстаўся паслугамі бібліятэкі Адам Міцкевіч. Тут ён напісаў санет “Да Нёмана”, дзе ёсць такія радкі:

Рака маленства, дзе ты, Нёман мой,
Чые струменні браў калісьці я ў ладоні?
Тут юнаком праз даль - што віры і тоні!
Я ўслед за марай жыў тваёю сінізной.

Адзначаючы прыгажосць паркавага ансамблю ў Шчорсах, беларускі этнограф, публіцыст і тэатральны крытык Павел Шпілеўскі ў 1853 годзе пісаў: “Шчорсы... Прыкметныя сваім цудоўным каменным палацам, раскошным садам і багацейшай бібліятэкай у палацы”.

У XIX стагоддзі ў Шчорсах нарадзіўся і шмат гадоў жыў пісьменнік і фальклярыст Антон Глінскі, які з`яўляецца аўтарам чатырох тамоў літаратурна апрацаваных казак. Гэтыя казкі А. Глінскі сабраў у саміх Шчорсах, а таксама ў другім вядомым на навагрaдчыне сяле - Нягневічах.

З гэтымі мясцінамі звязана жыццё і яшчэ аднаго таленавітага

чалавека - Івана Андрэевіча Пятровіча (псеўданім Нёманскі). Іван Пятровіч, як і Кастусь Шышэя, нарадзіўся ў вёсцы Краскоўскія Горы. Пасля сканчэння Шчорсаўскай школы атрымаў адукацыю настаўніка ў Нясвіжскай семінарыі, вучыўся ў Петраградскім універсітэце. Выступаў у друку па пытаннях гісторыі, эканомікі і культуры Беларусі. Некаторы час працаваў намеснікам старшыні Дзяржплана БССР, прымаў удзел у працы Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта). Быў абраны акадэмікам АН Беларусі. Але ў 1937 годзе арыштаваны і растраляны. Сям`я Пятровічаў сярод мясцовых жыхароў вядома як "Табальцы".

У Краскоўскіх Горах па суседству з Шышэямі жыў Аляксандр Геранімавіч Смаль. Ён быў прыкладна на гадоў дзесяць старэйшы за Косцю. Спачатку скончыў Беларускую гімназію ў Наваградку, а пасля вучыўся ў Віленскім універсітэце. Гэта быў вельмі здольны да навукі хлопец, таму яго вучобу аплочвала Шчорсаўская гміна. Палітыкі ён стараніўся, але ў рэшце рэшт добра зразумеў, што з бальшавікамі ў яго няма агульнага шляху. І калі Чырвоная армія пачала наступаць летам 1944 года, ён, як і тысячы іншых адукаваных і неўспрымаўшых камуністычнага рэжыму беларусаў, рушыў на захад. Там, у Нямеччыне, настаўнічаў у Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы, а ў 1948 годзе эміграваў у Аўстралію, дзе стаў адным з заснавальнікаў Аб`яднання Беларусаў Новай Паўднёвай Валіі, першым рэдактарам часопісу аўстралійскіх беларусаў "Новае жыццё".

Як у Шчорсах, так і ў Краскоўскіх Горах у тыя часы было па дзве вуліцы: Верхняя і Ніжняя. За агародамі ніжніх вуліц пачынаецца пойма Нёмана, які вёснамі тады разліваўся так, што станавіўся падобным на мора. Тады вада дасягала нават і саміх агародаў ніжніх вуліц абедзвюх вёсак. Затое з боку верхніх вуліц і Шчорсаў і Краскоўскіх Гор размяшчалася ворная зямля, якая па сваёй якасці з`яўляецца амаль самай лепшай у Беларусі. Таму ў названых вёсках жыло многа людзей заможных. Да гэткіх адносіўся і бацька Косці Шышэі - Іван Карпавіч. Жаніўся ён на дзяўчыне з мнагадзетнай сям`і са сваёй вёскі - Алене Емельянаўне Цішук. Алена і Іван нарадзілі чацвёра дзяцей, з якіх адзін Мікалай памёр яшчэ малым у 1919 годзе з голаду.

Косця з`явіўся на свет апошнім, калі яму споўнілася сем гадоў, пайшоў у першы клас Шчорсаўскай школы. Кіроўцам

школы ў той час працавала Мар`я Грабоўска, па нацыянальнасці полька. Сваіх дзяцей у яе не было, але яна вельмі прыветліва адносілася да вучняў; жыла ў маёнтку Храптовіча-Буцянёва. Запамятаў Косця і прозвішчы іншых настаўнікаў: Пашкевіча, Сянкевіча, Яноўскага, Бузука, а апошняга памятае і імя - Аркадзь. Выкладаў Аркадзь Бузук беларускую мову, словы якой пісалі тады лацінскімі літарамі. Багаслоўе выкладалася на рускай мове, рабіў гэта святар мясцовай Шчорсаўскай царквы.

Акрамя вучобы , з дзяцінства чалавек выносіць яшчэ і ўспаміны аб нейкіх неардынарных выпадках. Вось і Косця запамятаў, як ён дастаўляў ліманад самому прэзідэнту Польшчы Ігнацыю Масціцкаму, які быў доктарам хімічных навук і працаваў у галіне штучных угнаенняў. Як яго ўзгадвае Косця, гэта быў высокі, стройны, у той час ужо дастаткова пажылы чалавек, яму падабалася возера Кромань. Ды і сапраўды, названае возера адносіцца да жачунаў беларускай прыроды. Ляжыць яно ў вянку дрэў у цэнтры Налібоцкай пушчы. Вада ў ім вельмі чыстая, бо ў возера не ўпадае ні адна рэчка, а жывіцца яно крыніцамі. Асабліва прыгожым з`яўляецца заходні бераг Кромані. Ён сухі і палогі, таму можна зайсці ў ваду на дастаткова працяглую адлегласць. Кромань апета многімі паэтамі, у тым ліку і тым, сапраўднае прозвішча якога застаецца пакуль што невядомым. Падпісваў паэт свае вершы псеўданімам Янка Палонны. Вось радкі з яго верша “Шуміць Кромань”:

Шумяць дубы над Кроманем сівыя,
Шуміць і пушча ўся за крыўду-здзек,
Якую нёс наш Кромань бела-сіні
Праз не адзін пакутны доўгі век.

Сюды і прыязджаў Ігнацый Масціцкі на паляванне, звычайна на качак. Дапамагаў яму ў гэтым мясцовы ляснік Фарботка, які выганяў качак з затонаў Кромані. Але Косця памятае, як І. Масціцкі толькі стаяў і любаваўся гэтымі птушкамі, нават не ўздымаючы ўверх ружжа. Ляснік пачынаў злавацца, што прэзідэнт не стараляе. А апошні на папрокі Фарботкі адказваў: “Ці ж застрэленая качка можа замяніць тое хараство, якое я бачу, калі качкі вылятаюць з аеру і падымаюцца ўверх, а пасля чарадою ляцяць”.

Цікава было паглядзець на гэтую карціну і дзецям, тым больш, што Масціцкі ў кожны свой прыезд падклікаў іх да сябе, даваў некалькі злотых, каб яны збегалі ў Шчорсы і купілі яму ліманаду. Ад Кромані да Шчорсаў адлегласць немалая - кіламетраў пятнаццаць, але тая колькасць грошай, што заставалася ад ліманада, была вартай таго, каб гэткі шлях адолець. Таму Косця ў ліку іншых хлопцаў імкнуўся не прапусціць ніводнага кроманьскага палявання Ігнацыя Масціцкага.

Сем класаў Косця скончыў у 1936 годзе, пасля чаго паўгода вучыўся ў Наваградку за токара. Праўда, бацька быў супраць, каб малодшы сын ішоў назусім з дому, бо Саша, які быў на дзевяць гадоў старэйшы за Косцю, ужо вучыўся ў нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Таму бацька хацеў, каб Косця скончыў Кашалеўскую ральнічую школу ды вярнуўся працаваць на гаспадарцы. Аднак хлопец разумеў, што, будучы земляробам у вёсцы, пры той эканамічнай палітыцы, якая ў тыя гады праводзілася польскімі ўладамі, можна было застацца нават самому без хлеба. Падаткі на зямлю былі вялікімі, а цана на сельскагаспадарчую прадукцыю - мізэрнай. Вось Косця і вырашыў шукаць іншага занятку: працы ў лесе ці падавацца ў горад. І паколькі ў лесе ён не бачыў для сябе работы, Косця, узяўшы акраец хлеба і кавалак сала, рушыў супраць волі бацькі ў Навагрradak. Уладкавацца на вучобу за токара да пана Арлоўскага яму дапамог Павел Радзецкі, які паходзіў родам са Шчорсаў і ўжо працаваў вучнем токара ў Дубовіка. Але паколькі Дубовік ужо не мог больш прыняць ніводнага вучня, дык Радзецкі параіў Косці звярнуцца да Арлоўскага.

Наваградак уразіў вясковага хлопца шырынёю сваіх вуліц і гмахамі многіх дамоў. Пры Польшчы гэта быў цэнтр не толькі павету, але і ваяводства. Чынавенства ва ўстановах было польскім. Палякамі па нацыянальнасці з`яўляліся і амаль усе прадпрымальнікі. Не быў выключэннем і пан Арлоўскі. Косцю ён памясціў у падвальным памяшканні, з якога толькі адна трэць вокан выходзіла на паверхню. Для прыгатавання ежы ў падвале служыла збудаваная цагляная плітка. Але купіць прадуктаў у хлопца не было за што. Узятых з дому сала і хлеба хапіла толькі на некалькі дзён, хаця Косця і імкнуўся іх эканоміць. Таму трэба было шукаць нейкага выйсця, бо голад, як кажуць, не цётка. Тым больш, што і работа на першых парах была цяжкая:

прыходзілася цягаць жалеза.

Пакумекаўшы сваёй маладой галавою, Косця хутка знайшоў выхад: побач у агародзе гаспадара расла бульба, у якой завязаліся і былі ўжо дастаткова вялікімі клубні. Трэба было толькі нейкую гадзіну ў начы не паспаць, пры гэтым Косця разумеў, што здабываць бульбу патрэбна так, каб не прыкмецілі гаспадары, бо калі прыкмецяць, дык на гэтым вучоба за токара будзе скончанай. Таму, вырваўшы каліва бульбы з зямлі і абарваўшы з яго клубні, Косця зноў садзіў яго на тое самае месца, дзе яно расло і акуратна асыпаў зямлёю. Пры дадзенай маскіроўцы сам Арлоўскі, які кожны дзень не прачынаўся ад гарэлкі, безумоўна, не мог нічога прыкмеціць. Нічога не заўважала і жонка Арлоўскага. Мабыць, прыкмячала Косціны выхадкі толькі хатняя служанка Арлоўскага, але пакуль што і яна маўчала. Ды і навогул, цяжка ўгадаць, што думала дзяўчына аб паявіўшымся маладым хлопцы, за якога яна была можа толькі на нейкі год старэйшай.

На першых парах у Косці нядрэнна склаліся адносіны і з самой пані Арлоўскай. Для яе хлопец быў проста находкаю. Ён часта дапамагаў ёй дастаўляць дамоў п`яніцу-мужа, які напіваўся так, што сам не мог нават перастаўляць ног. Амаль кожны вечар Косця запрагаў каня ў брычку і разам з пані ехаў да рэстарана “Чарны”, дзе любіў п`янстваваць Арлоўскі. Косця пагружаў гаспадара, нібы нейкае бервяно, на плечы, клаў у брычку і ў першыя хвіліны пасля гэтага садзіўся на яго вярхом, пакуль раз`юшаны п`яніца не супакойваўся. Канём кіравала гаспадыня. Прыехаўшы дамоў, Косця зноў браў гаспадара на плечы і разам з пані ўкладваў яго спаць.

Але праз некаторы час з Косцем здарылася бяда. А было гэта так. Яму загадалі прывезці каменне. Для гэтага ён запрог таго ж каня і паехаў у поле збіраць каменне. Дапамагала служанка. І калі нагрузілі іх поўны воз, дык конь знараві́ўся і стаў на месцы, як укопаны. Косця паспрабаваў прастымуляваць затонлівую жывёлу пугаю, але конь ад гэтага стаў падавацца ўзад, а не ўперад. І тут Косця здагадаўся, што падобныя выпадкі з затонлівымі коньмі (іх у Шчорсах завуць менавіта так) ён бачыў, калі дапамагаў бацьку вазіць з лесу дрэвы. Бачыў ён і тыя “лекі”, якія прымянялі мужыкі для гэткіх коней. Яны бралі вяроўкі і прывязвалі ёю хвост каня да дугі. Пасля гэтага, калі затонлівы конь спрабуе падацца ўзад, у яго пачынае ламацца

хвост, ад чаго яму робіцца балюча, і конь цягне воз уперад. Узгаданыя “лекі” Косця вырашыў прымяніць і ў дадзеным выпадку, але пры гэтым, мабыць, перастараўся і хвост вельмі моцна задраў да дугі. Бо калі Косця ўдарыў каня пугай, дык той, падаўшыся ўзад, раптам рвануў уперад, ды так, што зламаў хамут і аглоблю. Служанка спалохалася і падняла лямант, паклікала гаспадыню, якая ад убачанага таксама прыйшла ў жах. Хутка паклікалі і майстра, які адрамантаваў хамут і аглоблю.

Безумоўна, пасля гэткай недарэчнасці Косця стаў адчуваць сябе не вельмі ёмка, але гаспадыня на яго нават моцна не сварылася, мабыць, падумала, што вечарам зноў прыйдзецца прасіць хлопца, каб дапамог даставіць дамоў мужа. А праз некалькі дзён усё стала і неяк забывацца.

Аднак, як кажуць, адна бяда не ходзіць: яе суправаджае другая. Так адбылося і з Косцем. Праўда, бяду хлопец пашукаў сам. Справа ў тым, што, каб памыць пасля дзённай працы брудныя рукі, Косця стаў карыстацца вадою, якая стаяла ў драўляных бочках у тым жа падвале, дзе ён жыў, толькі ў суседнім пакоі. Гэта было зручна. Але праз некалькі дзён вада стала бруднай і гэта прыкмеціла служанка. Яна падняла лямант, бо карысталася вадою з бочкі для гаспадарчых патрэбаў. Аб дадзеным учынку Косці дзяўчына паскардзілася гаспадыні, а заадно даклала ёй і аб Косціных вылазках у агарод па бульбу. Пасля непрыемнай размовы з гаспадыняю хлопцу нічога іншага не заставалася, як замяніць ваду ва ўсіх сямі бочках. А зрабіць гэта было няпроста: ваду трэба было браць на гары ў калодзежы за метраў трыста ад сядзібы Арлоўскіх. І тут Косця зноў пачаў меркаваць, у дадзеным выпадку, як аблегчыць сабе работу.

Пасля некалькіх хвілін галаваломкі выйсце было знойдзена. Косця ў майстэрні ўзяў каляску, паставіў на яе бочку, зліўшы перад гэтым з апошняй брудную ваду, і пацягнуў каляску да калодзежа. Наліў там у бочку вады і стаў рухацца. І калі ён толькі пачаў спускацца з гары, каляска з бочкаю ператалі яго слухацца і па закону інерцыі, якога, нягледзячы на свае сем класаў адукацыі, відаць, Косця не ведаў, на вялікай хуткасці паімчаліся ўніз. Хлопец пабег за імі, як толькі меў сілы, спрабуючы спыніць каляску, але зрабіць гэта быў не ў сілах. Літаральна праз некалькі хвілін каляска з бочкаю вады

ўрэзалася ў вугал цаглянага дома, ад чаго бочка рассыпалася на клёпкі, а сам кіровец апынуўся ляжачым у лужыне вады. Каляска не пабілася, бо была жалезнай. Яна толькі перавярнулася і лягла коламі ўверх.

І ўсё гэта зноў не абыйшлося без вачэй служанкі. Убачыўшы ляцеўшую з гары каляску з бочкаю вады, яна зразумела, што вось-вось адбудзецца, таму на ўсю моц закрычала: “О людзі!”. Менавіта ў гэтую хвіліну і раздаўся стук. Пачуўшы крык служанкі, перамяшаўшыся са стукам і грукатам ад удару каляскі і бочкі аб цагляную сцяну, з хаты выбегла гаспадыня, выйшлі з майстэрні і рабочыя. Зразумеўшы, што здарылася, яны адразу прыклеілі Косці мянушку - “салавей-разбойнік”.

Безумоўна, пасля гэткага выпадку Косці патрэбна было шукаць новае месца, хаця гаспадыня і на гэты раз была гатовая яму ўсё прабачыць. І вось тут на шчасце “Салаўю-разбойніку” сустрэўся Траміфчык, які паходзіў з суседняй вёскі Воўстухава, і працаваў у той час шафёрам у павятовага старасты. Трафімчык запытаў у Косці, як справы і чым ён займаецца. І калі Косця расказаў аб сваёй рабоце, дык Трафімчык, пашкадаваўшы земляка, паабяцаў яму дапамагчы ўладкавацца ў павятовы гараж да пана Пятроўскага. Пятроўскі вазіў самога ваяводу, а заадно і быў начальнікам гаража. Косцю прапанова зацікавіла. Тым больш, што сам Трафімчык меў шыкоўны выгляд, які яму надавала прыгожая шафёрская форма. На гэтым Косця і пакінуў вучобу за токара.

У гаражы на першых парах прыйшлося пачынаць таксама з падсобнага рабочага: падмятаць памяшканне, мыць і змазваць машыны, чысціць на іх шкло, ды дзяжурыць пры тэлефоне. Усяго ў гаражы было шэсць легкавых машын, але часова тут памяшчаліся і машыны чыноўнікаў, якія прыязджалі ў Навагрудак з Варшавы ці іншых гарадоў. Самога заробку Косця не меў, акрамя 20 злотых у месяц, што атрымліваў за выдачу на станцыі бензіну, на што трацілася чатыры гадзіны ў дзень. Астатнія даходы - гэта былі, як бы сказаць, “чаявыя” ад прыязджаючых шафёраў. Нешта ён атрымліваў і за дапамогу мясцовым шафёрам, але тут “чаявыя” выплочваліся галоўным чынам натураю - скажам, яму давалі булачку, ці нешта іншае з ежы. І толькі калі-нікалі давалі некалькі грошай на кіно. Жыў Косця ў той час на вуліцы Ваяводскай у пані Зосі, якой плаціў у дзень 35 грошай. Акрамя платы, дапамагаў гаспадыні прынесці

вады, насекчы дроў, за што яна ўзнагароджавала хлопца добрым абедам. Так што ўсё складвалася нядрэнна. Праз некалькі месяцаў Косця ўжо змог нават бацькам даць 100 злотых. Па тых часах гэта былі немалыя грошы, калі ўлічыць, што пуд жыта каштаваў два злотых.

Але і тут у Косці без прыгодаў не адбылося. Аднаго разу, калі ён дзяжурыў у гаражы, туды зайшоў незнаёмы прыгожа апрануты пан і пачаў аглядаць памяшканне. Косці гэта не спадабалася, бо пры ўваходзе ў гараж над варотамі вісела шыльда, на якой па-польску было напісана, што ход староннім сюды забаронены. Таму Косця і запытаў у незнаёмага: “Ці пан чытаць умее?”. На што ўвайшоўшы адказаў: “Не ўмею”. Пасля гэткага адказу хлопец запрасіў пана выйсці ў двор і паказаў яму шыльду. У гэты час у гараж прыбег і Пятроўскі, які, убачыўшы пана, прывітаўся з апошнім, назваўшы яго “панам гаспадаром”. Тут Косця адразу здагадаўся, што ён зноў уліп, бо “панам гаспадаром” звалі толькі ваяводу. Таму хлопец хутка выбег з гаражнага двара і схаваўся ў росшы побач маліннік. Сэрца трапятала, як у барана хвосцік. Косця думаў, што яго зараз жа выганяць за нетактоўныя паводзіны да “гаспадара” ўсяго Наваградскага ваяводства.

Калі “пан гаспадар” пайшоў, Косці, хочаш-не хочаш, а трэба было вылазіць са сваёй схованкі і ісці ў гараж, дзе яго чакаў Пятроўскі. Трэба ісці, але ногі не ішлі, яны зрабіліся нейкімі ватнымі. Не пераставала біцца і сэрца. Але, калі Косця падыйшоў да начальніка гаража, дык той нават не стаў яго лаяць. Ён паведаміў Косці, што хлопца хоча бачыць гаспадар. Таму ў бліжэйшую нядзелю паабяцаў на машыне адвезці яго на спатканне да ваяводы. Прапанова Пятроўскага хлопца азадачыла. У галаву палезлі розныя думкі. Але пры ўсім тым ён быў упэўнены, што з працы яго не выганяць. Бо гэта мог бы зрабіць і начальнік гаража, які браў яго сюды. Навошта самому ваяводзе ўмешвацца ў гэткія дробязі. Ваявода - гэта ж па чыну палкоўнік польскага войска.

Прыехаўшы ў двор “пана гаспадара”, які быў побач з ваяводствам, Косця прыкмеціў, як з ганка выйшлі сам ваявода і яго жонка. У той час яму падалося, што гэта былі стройныя і прыгожыя людзі. Пасля Косця пераканаецца, што яны былі яшчэ і добрымі. Бо хто ён для іх? Проста чарнарабочы, ды яшчэ і “крэс усходні”. Справа іншая Пятроўскі. Няхай сабе гэта і

шафёр, але ж ён быў з ваяводам і аднаго веравызнання і нават адной нацыянальнасці. А тым часам ваявода запрасіў хлопца сесці ў машыну і ехаць разам з імі на возера Свіцязь.

Свіцязь - гэта яшчэ адна жамчужына беларускай прыроды, якую па прыгажосці можна параўнаць з грузінскім возерам Рыца. У Свіцязі вада была вельмі чыстай, бела-сіняга колеру. У гэтае возера, як і ў Кромань, таксама не ўпадала ніводная рэчка. Але, у адрозненне ад Кромані, Свіцязь нашмат большая і берагі яе сухія. Возера можна абыйсці вакол, што, скажам, я і рабіў, калі адпачываў тут на працягу тыдня. Вядома, што ў свой час на возеры любіў бываць і любавацца яго прыгажосцю наш з Косцем вялікі зямляк - Адам Міцкевіч. Ён прысвяціў гэтай пярліне прыроды не адзін вершаваны радок. Так напрыклад, у вершы "Свіцязь" паэт піша:

Калі ты ў Наваградак трапіш, бывае,
Скіруй - не забудзь - на Плужыны.
У пушчы, дзе сцежка гушчар расхінае,
Ты коней спыні ля альшыны.

Між дрэў, бы ў вяночку, адкрыецца воку
Там возера Свіцязь, як дзіва.
Бы хтосьці чысьцюткую шыбу звысоку
Сюды апусціў беражліва.

А здарыцца быць тут начною парою,
Застынеш, аддаўшыся чарам:
Рой зор над табою, рой зор над табою,
І месяцы два перад тварам.

У той дзень Косця ўбачыў Свіцязь упершыню. Ён не паэт, але, будучы ад прыроды эмацыйным, таксама ўразіўся яе прыгажосцю. А тым часам праз некалькі хвілін "пан-гаспадар" паклікаў хлопца да сябе і пачаў яго распытваць, хто ён, адкуль і што робіць у гаражы, якую мае адукацыю. Аба ўсім гэтым Косця падрабязна расказаў, пасля чаго ваявода запытаў у хлопца аб яго далейшых планах. І калі Косця сказаў, што хоча зарабіць грошай і падацца ў навуку, у размову ўмяшалася жонка ваяводы. Звярнуўшыся да мужа, яна сказала: "Хлопцу трэба дапамагчы". На што сам ваявода адказаў: "Падумаем". Пасля

адбыўшайся размовы з Косцем “пан-гаспадар” яшчэ спытаў і ў Пятроўскага, якой ён думкі аб Шышэі. Пятроўскі даў хлопцу вельмі добрую характарыстыку, падкрэсліўшы, што гэта дысцыплінаваны і паслухмяны работнік, якому з-за яго сумленнасці даручылі выдаваць бензіну. У падцвярджэнне сваіх слоў Пятроўскі паведаміў ваяводзе, што нездарма ў гаражы Косцю празвалі Ожэлам (Арлом).

І ад размовы з ваяводам, і ад характарыстыкі свайго непасрэднага начальніка ў Косці стала цяплей на душы і падняўся настрой. Пакуль ваявода з жонкай адпачывалі і любаваліся прыгажосцю Свіцязі, ён пайшоў, назбіраў палявых кветак і ўручыў іх жонцы ваяводы.

Праз некаторы час Пятроўскі зноў запрасіў Косцю да пана-гаспадара, праўда, на гэты раз у яго працоўны кабінет. Прывітаўшыся з хлопцам, ваявода сказаў, што ён дапаможа Косці ўладкавацца ў рамесны тэхнікум, які даваў сярэднюю адукацыю. Практыку ён будзе праходзіць у майстэрні ізбы скарбовай (фінансавага аддзелу ваяводства). Такая прапанова высокага дзяржаўнага чыноўніка гаварыла аб тым, што хлопец яму спадабаўся, мабыць, сваёй прынцыповасцю.

А крыху раней перад гэтым сын ваяводы, які ў той час вучыўся ў Вільні, едучы на веласіпедзе, зламаў нагу. Яго лячылі самыя лепшыя дактары Польшчы, але пры ўсім гэтым паламаную нагу саставілі так, што яна стала карацейшай. Сын вельмі перажываў. Перажывалі і бацькі. Сам ваявода са злосці аддаў веласіпед таму ж Косці, мабыць, каб гэтая рэч не траплялася яму на вочы. Косця падзякаваў высокаму начальніку і адначасова расказаў яму аб нягневіцкім кастаправе Сакольніку, якога ён сам не ведаў, але аб ім чуў ад тамашніх жыхароў. Пры гэтым Косця паведаміў і аб тым, што дадзены чалавек лечыць, але не мае на гэта афіцыйнага дазволу.

Цяжка сказаць, ці пранікся ваявода нейкім даверам да лекара, аб якім яму распавядаў Косця, але дома ён расказаў аб гэтым жонцы і самому сыну. Жонка ўспрыняла невядомага кастаправа проста як шамана, зрабіўшы пры гэтым папрок мужу, што ён схільны верыць усялякім казкам і забабонам. А сын, наадварот, стаў настойліва прасіць бацькоў адвезці яго да нягневіцкага лекара. І яго можна было зразумець: у свае дваццаць з невялікім хвосцікам гадоў панічу не хацелася заставацца калекам. Просьба сына была такой настойлівай, што

бацька таксама вырашыў паспрабаваць шчасця. Ён паклікаў Косцю і папрасіў яго адвезці да таго казачнага лекара.

Я не памятаю таго Сакольніка, якога Кастусь Шышэя параіў у якасці добрага лекара ваяводзе, але добра ведаў яго сына Івана, а таксама другую жонку Івана Вару. Мне прыходзілася два разы звяртацца да Івана Сакольніка, калі ў маёй маці быў пералом рукі. Тады я пераканаўся, што гэта сапраўды той майстра сваёй справы, якіх ёсць няшмат. Праўда, Іван, у адрозненне ад бацькі і больш ранніх сваіх папярэднікаў-лекараў, меў яшчэ і сярэднюю медыцынскую адукацыю. Больш таго, з расказаў старэйшых людзей я ведаю, што першы лекар у родзе Сакольнікаў набыў сваё майстэрства ў галіне кастапраўства ў Францыі, будучы там у палоне, куды ён трапіў у час вайны 1812 года. Пасля гэтае майстэрства перадавалася па спадчыне ад бацькі да сына. На жаль, у Івана сына не было і ўсё гэта на ім і скончылася. Але ў дадзеным выпадку гаворка ішла аб бацьку Івана, хаця і Іван у тыя гады ўжо пачынаў асвойваць майстэрства кастаправа.

Ну а тады, прыехаўшы ў Старыя Нягневічы, Косця прапанаваў пакінуць машыну на дарозе, не даехаўшы да самой сядзібы Сакольніка, а сам пайшоў дамаўляцца з лекарам. На Косціна шчасце лекар быў у двары. Даведаўшыся аб тым, што да яго завітаў сам ваявода, Сакольнік спачатку стаў адмаўляцца. І гэта зразумела: ён быў самавучкам і баяўся, што, не дай Бог, штосьці дрэнна атрымаецца, дык яму можа за гэткія лекі не мала ўляцець. Але Косця ахарактыразаваў ваяводу як выдатнага чалавека, якому настойліва прасіў дапамагчы. У рэшце рэшт Сакольнік вырашыў паверыць шчорсаўскаму хлопцу, пасля чаго спытаў: “А дзе ж твой ваявода з сынам?”. Косця адказаў: “Вось тут недалёка сядзіць у машыне”. На што Сакольнік заўважыў: “А ты не толькі настойлівы, але яшчэ і хітры”.

Хутка машына пад`ехала да сядзібы. Вылезшы з яе, і ваявода, і сын, і шафёр Пятроўскі, убачылі прыгожую сядзібу, на якой хата, хлявы і гумно сведчылі аб тым, што тут жыве заможны чалавек. І ўжо само гэта выклікала давер да гаспадара. А калі ўвайшлі ў хату, дык першае, што кінулася ў вочы, - гэта спецыяльная шырокая лава, на якой і лячыў Сакольнік сваіх пацыентаў. Паразмаўляўшы некалькі хвілін, лекар прапанаваў паглядзець нагу. Сын хутка лёг на лаву і

паказаў свой перазлом. Глянуўшы на нагу, Сакольнік зразумеў, у чым справа. Але, каб не было памылкі, некалькі разоў нагу павярнуў, пасля дэталёва абмацаў месца пераломy і цвёрдым голасам сказаў, што памылку прафесійных дактароў можна выправіць, папярэдне зламаўшы нагу ў месцы былога пералому і нанава яе саставіўшы. Сын адразу пагадзіўся. Аднак вырашылі, што ўсё ж такі неабходна ўзгадніць з маці, хаця пасля размовы і агляду нагі, надзея на станоўчы вынік ад лячэння з`явілася і ў ваяводы. Больш таго, ён нават Сакольніку паабяцаў, што, калі, дасць Бог, ды ўсё будзе добра, дык ён дапаможа лекару-самавучку атрымаць афіцыйны дазвол на яго справу. На гэтым пакуль што і развіталіся.

Праз некалькі дзён прыехалі ўжо большым складам, узяўшы і маці. Прычым, на гэты раз каля сядзібы кастаправа стаяла некалькі падводаў, на кожнай з якіх нехта чакаў ад Сакольніка дапамогі. Сярод хворых пераважалі дзеці. З хаты хутка выйшаў і сам лекар. Прывітаўшыся з высокімі гасцямі, ён загадаў ім пачакаць, а сам узяўся за справу. Аказаўшы дапамогу хворым, у прысутнасці ваяводы нават не ўзяў ні з кога грошай. А перамовы наконт лячэння сына ваяводы скончыліся тым, што Сакольнік прызначыў дзень, калі патрэбна хвораму прыехаць і паабяцаў пасля аказанай дапамогі пакінуць сына ваяводы ў сябе дома, пакуль не стане ясна, што нага зрастаецца як трэба. Разышліся ваявода з Сакольнікам як прыстойныя людзі: адзін дапамог сыну пазбегнуць у маладыя гады калецтва, а другі - атрымаць лекару-самавучку пасведчанне, якое давала яму афіцыйны дазвол на яго справу.

Не ў накладзе застаўся і Косця. Па-першае, яшчэ больш падняўся яго аўтарытэт і ў вачах ваяводы, і сярод работнікаў гаража, якія цяпер зусім упэўніліся, што Косці далі правільную мянушку -Арол. Па-другое, у Косці быў веласіпед, ды яшчэ і з трашчоткай, які каштаваў прыкладна столькі, колькі каштуюць пяць кароў. Таму, прыехаўшы на ім у сваю вёску, ці ў Шчорсы, ён сапраўды стаў адчуваць сябе арлом, бо гэткага веласіпеда сярод яго вясковых аднагодкаў нават ніхто не бачыў у вочы. І па-трэцяе, а гэта, мабыць, самае галоўнае, ваявода, як і абяцаў, дапамог хлопцу ўладкавацца на вучобу.

Стаўшы навучэнцам тэхнікума, Косця атрымаў і жыллё: інтэрнат, або, як тады называлі, бурсу. Вучыцца патрэбна было чатыры гады. У час летніх канікул навучэнцы выязджалі ў лагер,

што размяшчаўся ў лесе ў 20 кіламетрах ад Бярэсця. У лагеры праводзілася фізічная падрыхтоўка хлопцаў да службы ў войску. Камандаваў лагерам капітан Мышкоўскі. Інструктарамі, якія праводзілі заняткі з навучэнцамі, былі спецыялісты па фізічнай падрыхтоўцы. Лагер быў дастаткова вялікім. Кожнае лета ў яго сабіралі 500 юнакоў узростам ад 14 да 19 гадоў.

Але скончыць тэхнікум Косці не давялося. Калі хлопец пасля другога курса зноў быў у лагеры, 28 жніўня 1939 года туды з`явіўся генерал Савіцкі і абвясціў, што навучэнцы могуць раз`язджацца па дамах, бо Германія і Савецкі Саюз заключылі паміж сабою дамову і Польшча апынулася ў вялікай небяспецы. Назаўтра Косця быў ужо дома. А 1 верасня нападам на Польшчу немцы развязалі Другую сусветную вайну. 17 верасня, згодна дамовы з фашысцкай клікай Гітлера, савецкія войскі занялі Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну.

* * *

Той восеньскі дзень быў хмурым. Мабыць, сама прырода папярэджвала людзей, што з прыходам чырвонай арміі іх не чакае нічога добрага. У Шчорсах савецкія жаўнеры з`явіліся ў апоўдзень таго ж 17 верасня. Выгляд у іх быў жудасны: чорныя да калена абвёрткі на стоптаных чаравіках, самі худыя, у дарожным пыле, у адрозненне ад польскіх жаўнераў, без пагонаў. Усё гэта міжволі прывяло да параўнання так званых вызвольнікаў з войскам польскім, якое вылучалася сваёй чысцінёю і падцягнутасцю, прыгожым адзеннем.

Але ў той час большасць мясцовага насельніцтва верыла агітацыі, якая праводзілася членамі камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і па радыё з Масквы і Менска. Бо як ні кажы, але ў час польскай акупацыі заходняй Беларусі над беларусамі, асабліва праваслаўнага веравызнання здзяйсняўся моцны нацыянальны ўціск. Настаўнікамі ў школах былі, лічы, што адны палякі, ва ўсіх дзяржаўных установах і судах гучала толькі польская мова. Селянін працаваў амаль задарма, не мог разлічыцца з падаткамі, з-за чаго ў некаторых сталі апісваць маёмасць. Незадаволенасць людзей палітыкай, якую праводзілі польскія акупацыйныя ўлады і выкарысталі камуністы пры агітацыі за далучэнне Заходняй Беларусі да Усходняй у складзе СССР. І агітацыя спрацавала: чырвонаармейцаў сустракалі мноствам кветак.

Амаль у той жа дзень на будынку былой шчорсаўскай гміны з`явілася шыльда, якая паведамляла, што ў дадзеным памяшканні пачаў працаваць рэвалюцыйны рабоча-сялянскі камітэт. Старшынёй яго стаў Мікалай Радзецкі, які раней прыйшоў у прымакі на Краскоўскія Горы недзе з Усходу. Казалі, што раней ён працаваў каля Стоўбцаў у Негарэлым, а пасля па нейкай прычыне перайшоў савецка-польскую мяжу і прыблукаў у шчорсаўскія мясціны. Часова затрымаўся ў Шчорсах і палкоўнік чырвонай арміі Місюроў. У першыя дні пасля так званага вызвалення былі арганізаваны і штурмавыя атрады, у якія ўліліся і некаторыя заангажаваныя мясцовыя члены КПЗБ, або і проста вясковыя латругі, што хацелі выкарыстаць момант, каб паграбіць графа і больш багатых аднавяскоўцаў. Пачаліся арышты і самасуд над надуманымі “ворагамі савецкай улады”. Галоўным суддзём быў усё той жа Радзецкі. Людзей выводзілі за бліжэйшы ад былой гміны дом і там забівалі.

Арыштавалі і прывялі ў памяшканне створанага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага камітэту і Шышэяў: бацьку, Косцю і брата Сашу. Да таго часу памяшканне ўжо было поўна набіта людзьмі. На суд выклікалі па дваіх. Сярод затрыманых папаўзлі чуткі, што забіваюць. Бо з тых, каго выклікалі на суд, ніхто не вяртаўся, ды і былі чутны глухія выбухі. Сярод забойцаў асаблівай бязлітаснасцю выдзяляўся Мікалай Кумец, які жыў побач з Шышэямі. Пасля гэткіх зверстваў ён з`ехаў з глузду і праз дзён дзесяць пакутаў памёр. Ці гэта здарылася ад бязмернай колькасці выпітай у тыя дні гарэлкі, ці то ад той жудаснай карціны, якую ён сам тварыў, - цяжка сказаць. Але так, ці інакш, а ў вёсцы сталі гаварыць, што людская кроў яму не прайшла дарма.

Ад недахопу паветра і адсутнасці ежы некаторым затрыманым стала рабіцца дрэнна. Тады на суд іх цягнулі поцягам. Косця бачыў, як менавіта такім шляхам з памяшкання выцягвалі Мікалая Ляканта, які быццам бы ў свой час не захацеў даць на дапамогу палітычным вязням авечку, бо больш у яго нічога і не было, хіба мог аддаць яшчэ апошнюю карову. Падыходзіла чарга і да Косці. Але ў гэты час у памяшканне заглянуў Ціхан Малы з суседняй вёскі Навашыное, які ўжо паспеў вярнуцца з Картуз-Бярозы. Ён і прыпыніў далейшы разбой. Але адпускаць затрыманых дамоў не сталі.

Прыйшоў сюды і дзядзька Косці, Пятро Шышэя, які таксама

толькі што вярнуўся з Картуз-Бярозы. Убачыўшы сярод арыштаваных Косцю, ён запытаў у Радзецкага, за што арыштавалі яго пляменніка. Больш таго, Радзецкаму ён папулярна патлумачыў, што, калі ён вёў падпольную палітычную работу, дык яго брат Шышэя Іван Карпавіч са сваімі сынамі кармілі і хавалі яго ад польскай паліцыі. Патлумачыўшы, загадаў, каб Косцю неадкладна выпусцілі. Радзецкаму і яго паплечнікам нічога не заставалася рабіць, як выканаць загад, бо ў дадзеным выпадку можна было самім напаткацца на непрыемнасці. Ды і навогул, гэткія палітыканы як Радзецкі і яму падобныя, бываюць смелымі толькі з безабароннымі людзьмі, якімі зараз і былі затрыманыя імі аднавяскоўцы. А побач з валявымі і моцнымі палітыкамі яны самі ператвараюцца ў паслухмяных авечак.

Выйшаўшы з “душагубкі”, Косця сеў на сходах ганку, бо прастаяўшы доўга на нагах, апошнія не хацелі трымаць хлопца ў вертыкальным становішчы, а тым больш ісці. Хвілінку адпачыўшы, ён пайшоў дамоў, не ведаючы пра лёс ні бацькі, ні брата. Толькі пасля ён даведаўся, адзін з тых глухіх выбухаў, якія ён чуў, знаходзячыся пад арыштам, і абарваў жыццё бацькі. Брат Саша застаўся жывым. Яго выратавала тое, што ён умеў працаваць на тэлеграфе. Таму на дзень яго забіраў да сябе палкоўнік Місюроў. Пасля Сашу перавезлі ў Наваградак, куды Косця з сястрою Ганнай вазілі яму перадачы, з Наваградка завезлі ў Менск і там судзілі - далі чатыры гады. Свой тэрмін Саша адбываў на Поўначы, адкуль трапіў у польскае войска Сікорскага, затым Андэрса, а пасля была Англія і нарэшце ЗША.

А ў той дзень, прыйшоўшы дамоў, Косця ўбачыў пустую хату з адчыненымі дзвярамі, у якой усё было разрабавана. Не засталося нават кавалачка хлеба, як кажуць, мышы падавіцца. Убачыўшы гэткую жудасную карціну, Косця знайшоў бульбяны кош і пачаў побач з домам у канаве лавіць уюноў. Цяжка сказаць, рабіў ён гэта, каб наталіць голад, ці проста ад нервовай напругі. Вечарам, як сцямнела, Косця пайшоў да другога дзядзькі, ужо па маці, Мікалая Цішука, папрасіў хлеба. Дзядзька даў не толькі хлеба, але і мукі, крупы і нават сала. Косця ў сваю чаргу расказаў дзядзьку аб тых пакутах, якія яму давялося перажыць. Пасля гэтага пайшоў у сваю хату і прыгатаваў вячэру. У гэты час дамоў вярнуліся і маці з сястрою.

Нараніцы людзі параілі Шышэям напісаць просьбу, каб

выпусцілі бацьку і брата. Просьбу падпісалі ўсе суседзі, акрамя Радзецкага, які на просьбу, не падняўшы галавы, сказаў: "Масква слязам ня верыць". Але ў час разгулу дыктатуры ніхто з думкамі людзей не лічыўся, таму і гэтую просьбу праігнаравалі.

Праз некалькі дзён Шчорсы пакінуў Місюроў, распусцілі штурмавыя атрады, а затрыманых перавезлі ў Наваградак, адкуль частку адпусцілі. Усе гэтыя жахі спатрэбіліся новай уладзе, каб запалохаць людзей, і зрабіць іх паслухмянымі, нават бязмоўнымі.

Але на гэтым бясчынствы савецкай улады не скончыліся. Пасля разрабавання ў першыя дні графскай маёмасці і знішчэння з дапамогай агню часткі яго бібліятэкі, пачаўся вываз больш заможных людзей, які суправаджаўся ўсё тым жа разграбленнем маёмасці. А ў Шчорсах на плошчы амаль кожны дзень праходзілі мітынгі, на якія Косці ісці не хацелася. І зразумела чаму - па-першае, ужо высветлілася, што не было ў жывых бацькі, брата пасадзілі, а па-другое, ён з маці і сястрою ўвесь час чакалі, што і іх вось-вось вывезуць. З гэтай нагоды яны пачалі нават сушыць сухары. Але напярэдадні 7 лістапада Косцю папярэдзілі, што ён павінен быць на мітынгу. Больш таго, калі ён прыйшоў на мітынг у лапцях і дрэнна апрануты, бо ўсё лепшае было разрабавана, яго прымусілі пераабуцца і пераапрануцца, даўшы яму іншы абутак і адзенне. На мітынгу яго здзівіла прамова Валодзі Ерамея, які быў Косціным аднакласнікам. Прамову яму, як гэта тады і вадзілася, напісалі "раёншчыкі", а ён толькі агучыў, прачытаўшы папярэдне некалькі разоў. Таму прамова і атрымалася гэткай хлёсткай.

А тым часам людзей абклалі не меншымі, чым за польскім часам, падаткамі, прычым, акрамя грошай, яшчэ і натураю: збожжам, бульбаю, мясам, малаком, яйкамі. Падаткамі абкладвалася ўся маёмасць, у тым ліку і садовыя дрэвы. Таму людзі сталі збываць кароў, прыдумоўваць, як засушыць яблыні, грушы, дзе схавацца пры забоі свінчаці, бо патрэбна было з яго здзіраць і здаваць дзяржаве скуру.

У вёсцы Краскоўскія Горы арганізавалі калгас, у які ад Шышэяў, хаця яны і не былі калгаснікамі, забралі бліжэйшую зямлю, аднаго каня, карову, калёсы на жалезным ходу, плуг і іншы гаспадарчы інвентар. А зімою гаспадарку Шышэяў абклалі яшчэ і нормай вывазкі леса ў памеры 30 кубаметраў. Прычым, калі Косця пастараўся і вывез сваю норму, дык яму прыбавілі

яшчэ 18 кубаметраў.

Дарэчы, з зямлёю ў Шчорсах атрымалася цэлая недарэчнасць: амаль у першыя дні сталі дзяліць паміж малазямельнымі сялянамі графскую зямлю. Ужо памерылі, падзялілі і нават паставілі колікі з надпісамі прозвішчаў тых, каму яе раздалі. На радасцях некаторыя адразу засеялі свае кавалкі жытам або пшаніцай, хоць, безумоўна, лепшыя тэрміны для пасеву названых культур да гэтага часу скончыліся. Але вясною з`явіўся ў полі трактар і, нягледзячы на забітыя ў зямлю колікі і нават узышоўшыя пасевы азімых культур пачаў араць. Людзі абурыліся, прыбеглі на "свае" кавалкі зямлі, а адзін - Міхась Кавэліч - жыхар Балотца - кінуўся пад трактар, мяркуючы, што гэтым можа спыніць здзекі над людзьмі. І трактарыст не стаў ехаць на ляжачага чалавека. Ён сышоў са свайго "жалезнага каня", зайшоў у сельскі савет і патэлефанаваў куды трэба. Неўзабаве на полі з`явілася машына; выйшаўшыя з яе начальнікі патлумачылі сабраўшымся людзям, што зямля ніякая не іхняя, а дзяржаўная, і што на базе графскага маёнтка арганізоўваецца саўгас, які і будзе карыстацца вось гэтай зямлёй. Пасля кароткай, але папулярна прачытанай абманутым людзям лекцыі ў машыну пасадзілі Мікалая Кавэліча і паехалі ў Любча, якое стала цэнтрам раёна. Павезлі і на гэтым канцы ў ваду. Быў чалавек і не стала чалавека. На гэтым праблема з зямлёю была вырашана, прычым так, каб зноў-такі было непавадна і іншым чагосьці патрабаваць ад улады. Савецкай уладзе патрэбна было даваць, а не ад яе браць. Яна сама стала ў людзей забіраць усё, што толькі было магчыма.

А сям`я Шышэяў патрапіла ў няласку да савецкай улады па прычыне таго, што, па-першае, дзякуючы наяўнасці шасці маргоў ворнай зямлі, шасці маргоў сенажаці і шчырай працы, жыла па мерках таго часу сапраўды нядрэнна, а, па-другое, Саша аказаўся непаслядоўным змагаром за аб`яднанне Заходняй Беларусі з Усходняй. Справа ў тым, што ён быў членам Грамады. Больш таго, яго нават абралі сакратаром арганізацыі (старшынёю быў Андрэй Цярэшка), але, калі Саша даведаўся, што Цярэшка збег у Савецкі Саюз, ён, каб польская паліцыя ў час магчымага вобыску не забрала дакументацыю іх арганізацыі, спаліў паперы ў печы. І сапраўды, паліцыя з гэткім вобыскам прыходзіла і нават забірала Сашу. Праўда, нічога не

знайшоўшы, і не маючы якіхсьці грунтоўных доказаў, Сашу сфатаграфавалі і адпусцілі. Аднак самі былыя грамадоўцы гэткага ўчынку Сашы не даравалі, прычым, як кажуць, уз`еліся на ўсю яго сям`ю.

Навогул, калі да ўлады прыходзіць галота і цемра, іх дзеянні непрадказальныя і вельмі часта агрэсіўныя. Падняўшыся высока, яны пачынаюць весці сябе так, што іх можна назваць толькі ястрабамі, а не арламі. Яны ствараюць такую машыну падаўлення іншадумства і непакорлівасці, якая працуе, ламаючы чалавечыя лёсы і жывіцца крывёю сваіх ахвяр. Скажам, Косці Шышэі і сёння не ўкладваецца ў галаву, як мог паступіць жыхар Шчорсаў Базар Філарэт, які за польскім часам працаваў механікам у млыне, што ў свой час будаваў на рацэ Сэрвеч Дзядзюшка. Калі прыйшлі саветы, Базар арыштаваў свайго гаспадара і здаў яго органам НКВД. Дарэчы, сам Базар быў гэткім механікам, што, застаўшыся без Дзядзюшкі, добра і не ведаў, што рабіць з гэтым млыном. А тым больш, гэтага не ведалі на першых парах раённыя чыноўнікі, у якіх на ўсіх адукацыі было, мабыць, класаў восем-дзевяць разам з калідорам, а мабыць, і не было. Калі млын сапсаваўся, дык, каб яго адрамантаваць, прыйшлося Дзядзюшку прывозіць пад канвоем аж з Баранавіцкай турмы.

Адно, што добрае рабіла савецкая ўлада, дык гэта адчыняла школы, сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Праўда, працавалі яны цяпер ужо галоўным чынам на рускай мове. У навуку стала падавацца і вясковая моладзь. Паспрабаваў паступіць у Наваградскае педвучылішча і Косця, але як палітычна ненадзейны атрымаў адмову. Прыйшлося супакоіцца і спадзявацца толькі на Бога, бо Косця, як і іншыя члены яго сям`і, быў заўжды чалавекам веруючым.

Бязбожная ўлада не прабыла і два гады. Кліка Гітлера абхітрыла дыктатара Сталіна і яго атачэнне. 22 чэрвеня Германія без афіцыйнага абвяшчэння вайны напала на Савецкі Саюз. І ўжо ў першыя дні стала ясна, што ўся тая прапаганда аб мудрасці Сталіна і непераможнасці чырвонай арміі, якая вялася ў канцы трыццатых і ў самым пачатку саракавых гадоў, аказалася не болей як хлуснёю і беспадстаўным усхваленнем дыктатара. Літаральна праз некалькі дзён немцы былі ўжо ў Шчорсах, прычым зайшлі яны ў вёску з усходу, а не з захаду, што сведчыла аб тым, што яны ўжо былі і ў Менску.

Немцы павялі сябе на Беларусі так, як вялі сябе і бальшавікі, бо і тыя і другія ў адносінах да беларусаў былі акупантамі. І гэта Косця паспытаў зноў на сваёй скуры ў дакладным сэнсе гэтага слова. А было гэта так. Аднойчы ўначы нехта стукнуў у дзверы, а пасля і ў акно. Маці і сястра Ганна выбеглі ў двор. У гэты час пачулася аўтаматная чарга. Косця хутка вытрас з сянніка салому і запаліў яе, каб даць людзям нейкі знак, а пасля гэтага сам выбег з хаты. У двары стаяла некалькі немцаў і паліцыянт Станіслаў Гірка, паляк па нацыянальнасці, якога ён добра ведаў. Немец ударыў Косцю нагайкай па плячах, абвінаваціўшы ў прыналежнасці да камсамолу. Хлопец адчуў не толькі пякучы боль, але і кроў, якая палілася з рассечанай нагайкай раны. Нягледзячы ні на якія апраўданні, Шышэю арыштавалі і загналі ў маёнтак, куды сабралі ўжо чалавек дваццаць. У гэты ж час прыгналі туды і Радзецкага, які каля двух гадоў таму назад сам адпраўляў невінаватых людзей на той свет.

Сагнаўшы ў маёнтак, арыштаваных пастроілі ў два шэрагі. Вынеслі стол, дзве табурэткі, на стол паставілі друкавальную машынку. З`явіўся камендант паліцыі Макусей, які родам паходзіў з тых жа Краскоўскіх Гор і быў вядомы як п`яніца. Калі прыйшлі немцы, дабраахвотна пайшоў у паліцыю. А паколькі яшчэ і ўмеў крыху гаварыць па-нямецку, дык адразу і атрымаў гэткую пасаду. Убачыўшы ў шэрагу Косцю, Макусей звярнуўся да яго і запытаў: “А ты чаго тут?”. Адзін з немцаў умеў гаварыць па-руску. Ён умяшаўся ў размову і стаў сам высвятляць, у чым тут справа. Косця адказаў: “Я не ведаю. Запытайце ў Гіркі, чаму ён да нас прывёў немцаў. Ды, мабыць, ужо няма ў жывых маці і сястры”. Немец, які пісаў, хутка зразумеў, што Гірка навёў немцаў на Шышэяў не па палітычнаму ўмыслу, а па нейкаму іншаму. Ён падняўся і так ударыў паліцыянта ў морду, што той упаў. Косцю адпусцілі. Як ён кажа, і на гэты раз ад смерці яго выратаваў Бог. А ў Шчорсах тады адбылося тое самае, што і ў верасні 1939 года. Зноў загінула многа ні ў чым невінаватых людзей. І ўсё гэта нельга спісваць толькі на вайну і акупацыю. Вінаватыя і многія мясцовыя жыхары, якія выкарыстоўвалі змену ўладаў, каб камусьці за нешта адпомсціць або “пагрэць рукі” каля агню вайны.

Ну а Косця, прыйшоўшы дамоў, пачаў шукаць маці і сястру. Дом заставаўся адчыненым, салома была патушана, але і попел і недагарэўшая салома ляжалі пасярэдзіне хаты. Суседзі

паведамілі, што маці і сястра жывыя і пабеглі недзе ў поле. Каб іх хутчэй знайсці, Косця вырашыў залезці на стаяўшы непадалёку маяк і глянуць з вышыні ў поле. Бо з зямлі можна было ўбачыць нешта толькі побач: на палях расло збожжа, якое з`яўляецца някепскай схованкай для людзей. Але ў гэты час, нібы з той жа збажыны, да маяка падбеглі немцы і хутка прымусілі Косцю злезці, прыняўшы на гэты раз, мабыць, за савецкага лазутчыка. Зноў арыштавалі і павялі ў маёнтак, дзе яго ўбачыў той жа самы немец-пісар і адпусціў дамоў.

А тым часам людзі падказалі Косці, што маці і сястра ўцяклі ў недалёкую ад Краскоўскіх Гор вёску - Пагора. Хлопец адразу туды і накіраваўся. А маці і сястра ўжо самі ішлі дамоў. І можна сабе толькі ўявіць, колькі было ва ўсіх траіх радасці і колькі было ад той жа радасці слёз, калі яны сустрэліся на дарозе. Усе ўтраіх, лічы што, нарадзіліся нанава або ўваскрэслі пасля амаль немінучай смерці.

Вярнуўшыся дамоў і крыху адыйшоўшы ад перапалоху, сталі прыводзіць да нейкага толку гаспадарчыя справы, тым больш, што калгас распаўся і трэба было штосьці рабіць і на вярнуўшайся зямлі. Праўда, ні каня ні каровы, якіх калісьці забралі ў калгас, Шышэям ніхто не вярнуў. Але добра, што пасля гэткіх новых палітычных пертрусаў засталіся самі жывымі. Але час быў неспакойны. Хаця вайна і пакацілася далёка на усход, аднак трывога не пакідала людзей і тут.

І вось вясною 1942 года да Шышэяў завітаў Васіль Рамановіч, жыхар таксама недалёкай ад Шчорсаў вёскі - Ляхова. Васіль Рамановіч быў больш вядомы па мянушцы "Вася-Ханцюк". Цяжка сказаць, ад каго Вася атрымаў такія паўнамоцтвы, але ён прапанаваў Косці Шышэі ўзначаліць Шчорсаўскую паліцыю, бо Макусея да гэтага часу ўжо выгналі і камендантам паліцыі ў Шчорсах стаў паляк па нацыянальнасці Ядкоўскі, які быў чалавекам прыезджым і вылучаўся сваёй лютасцю да мясцовага насельніцтва. З размовы з Ханцюком Косці стала ясна, што да яго будуць прыставаць з падобнымі прапановамі і далей. Ды і ў час прапановы Ханцюк сказаў, што мы, маўляў, да гэтага пытання яшчэ вернемся. Таму Косця вырашыў звярнуцца за парадай да свайго былога настаўніка беларускай мовы, якога ён вельмі паважаў, - Аркадзя Бузука. У той час апошні працаваў старастам Шчорсаўскай воласці. Былы настаўнік не параіў ісці ў паліцыю і прапанаваў, каб некалькі

часу ён мог перасядзець, пайсці ў Любчу на трохмесячныя бухгалтарскія курсы, што хлопец і зрабіў.

Але тры месяцы праляцелі хутка. Да Шышэі зноў прыехаў той жа Рамановіч. Праўда, на гэты раз ён пагадзіўся, каб Шышэя пайшоў працаваць па спецыяльнасці, якую толькі што здабыў. Моцна не ўпіраўся і сам Косця. Таму пасля нядоўгіх перамоў Рамановіч адвёз Косцю ў Нягневічы да Путрыча Пятра, які працаваў тады старастам Нягневіцкай воласці.

Путрыч Пятро быў родам з вёскі Новыя Лычыцы, што знаходзіца прыкладна ў кіламетрах пяці ад Шчорсаў і кіламетраў трох з паловай ад Нягневічаў. Невысокага росту, з твару прыгожы, па тых часах дастаткова адукаваны і вельмі прыстойны чалавек. Жаніўся на дачцы сваёй мачыхі, да якой яго бацька пайшоў у прымакі. Кажуць, што такі “абмен” жанчынамі адбыўся па прычыне, каб нікому іншаму не засталося золата, якое, як частка, апынулася ў іх сям`і ад таго, што Напалеон нарабаваў у Маскве. Усё гэта не даказана, але аб названым золаце і магчымых яго ўладальніках у свой час пісалі нават у часопісе. Ды і жыў Путрыч, а калі самога Пятра пасадзілі ў турму, дык і яго жонка Надзя зусім нядрэнна, што таксама ўскосна сведчыла аб нейкіх дадатковых даходах названай сям`і. Але той, хто ведаў Пятра Путрыча, паважаў яго, безумоўна, не за багацце, а за яго сумленнасць і прыстойнасць у адносінах да людзей. Вось і Кастуся Шышэю ён сустрэў ветліва і як старэйшы і па пасадзе і па гадах адносіўся да яго беражліва. Перш-наперш ён даручыў хлопцу перапісваць на беларускай мове ўсю маёмасць маёнтка, што лічыўся пад нумарам 206. Да ўказанага маёнтку, акрамя Нягневічаў, адносіўся яшчэ і Косы Двор. Так што працы ў Косці хапала, а ў выхадныя дні ён ехаў дамоў, каб дапамагчы маці і сястры па гаспадарцы.

У гэты час з Нягневіч пачалі вывозіць габрэяў. Карціна была жудасная. Да знішчэння прысуджаўся цэлы народ. І трэба аддаць належнае многім мясцовым жыхарам-беларусам, што яны ацанілі гэткі падыход фашыстаў да габрэяў як злачынства. А таму многія хацелі габрэям дапамагчы выратавацца, асабліва тым, каго добра ведалі. Вось і ў Нягневічах і навакольных з імі вёсках людзі ведалі як выдатную лекарку Марыям Шац. І калі немцы з паліцыянтамі прыйшлі яе забіраць, сабралася многа людзей, а некаторыя нават ляглі на ганак яе дома, каб не даць у рукі катаў чалавека, якому яны былі ўдзячны за медычную

дапамогу. Мясцовых жыхароў-беларусаў немцы страляць не сталі. Але дачакаўшыся ночы, прыйшлі зноў і адвялі лекарку ў гета.

Дарэчы, многія габрэі лічылі, што гэткія здзекі над іх народам наканаваныя Богам і таму трэба падпарадкоўвацца напаткаўшаму іх лёсу. Вось і Косця Шышэя памятае, як ён хацеў дапамагчы выратавацца ад смерці адной габрэйскай дзяўчыне - Міры Калмановіч. Бацька Міры працаваў мельнікам у вёсцы Баярскае, што знаходзіцца па дарозе з Нягневіч у Наваградак. Сама Міра была, можна сказаць, небяспечна прыгожай, перад якой мала які хлопец мог устаяць. Уздзеянне яе прыгажосці адчуў і Косця. Калі ён, займаючыся сваімі справамі, сядзеў за сталом і ў пакой зайшла Міра, хлопец літаральна анямеў і не мог адарваць ад дзяўчыны вачэй. Гэта прыкмеціў сядзеўшы за другім сталом стараста воласці і запытаў: “Кастусь, што з табой здарылася?”. Таму, безумоўна, Шышэі хацелася дапамагчы Міры Калмановіч застацца жывою. З гэтай мэтай ён знайшоў у Наваградку чалавека, які пагаджаўся адправіць Міру ў Беласток як беларускую дзяўчыну, тым больш, што ў яе не было выразных габрэйскіх рысаў. Але, калі Косця з гэтай прапановай звярнуўся да бацькі Міры, той адказаў: “Не. Калі нам наканавана загінуць, значыць мы загінем усе”. Цяжка зразумець гэткія паводзіны Калмановіча, але яны былі ўласцівы ў той час і многім іншым габрэям. Я таксама памятаю роспаведы некаторых сваіх аднавяскоўцаў, якія прапанавалі знаёмым габрэям дапамагчы выратавацца, але тыя адмаўляліся і гаварылі: “Намі расчыняць, а вамі замесяць. Сёння страляюць нас, а заўтра будуць страляць вас - беларусаў”.

Праз месяцаў чатыры працы Шышэі ў Нягневічы з`явіўся пан Тамашэўскі, паляк, родам з Сербіі, якога прызначылі дырэктарам маёнтку. Ён выгнаў з кіраўніцтва маёнтакам усіх беларусаў і адклаў у бок усе паперы, напісаныя на беларускай мове, у былым доме ксяндза зрабіў кантору і акружыў сябе прыезджымі палякамі. Шышэя застаўся дапамагаць Путрычу весці ўлік людзей, якія жылі на тэрыторыі воласці. Але хутка Тамашэўскага арыштавалі, абвінаваціўшы ў тым, што ён нібыта адпраўляў прадукты для Арміі Краёвай. Не стала і бухгалтара маёнтка, якога паставіў Тамашэўскі, - яго за нешта застрэліў начальнік Нягневіцкай паліцыі Міснікевіч Уладзімір, за што апошняга кудысьці звезлі.

Дырэктарам маёнтку прызначылі мясцовага жыхара Лукашэвіча Івана, а бухгалтарам вярнулі Шышэю Кастуся. Працуючы ў Нягневічах, на выхадныя дні ён працягваў ездзіць дамоў, у Краскоўскія Горы. Рабіў гэта на веласіпедзе. І вось аднойчы яму зноў прыйшлося перажыць, мякка кажучы, вельмі непрыемныя хвіліны. Ды і навогул, у час вайны гэткіх хвілін, калі жыццё чалавека застаецца вісець толькі на адным валаску, бывае многа. Напрыклад, і ў той травеньскі вечар 1943 года Кастусь у чарговы раз ехаў на веласіпедзе дамоў. Але калі ён даехаў да Шчорсаў, пайшоў вялікі дождж. Кастусь забег на ганак Шчорсаўскай воласці, дзе ўжо стаяла некалькі жанчын, гэткіх як і ён, схаваўшыхся ад дажджу. І тут хутка адна з іх прыкмеціла, што ў стадзе кароў, якіх ўжо гналі з пашы на ноч у хлявы, ідуць сагнуўшыяся людзі. І калі стада кароў параўнялася з будынкам воласці, людзі падняліся ва ўвесь рост і кінуліся ў памяшканне воласці. Стала бачна, што гэта былі партызаны, безумоўна, узброеныя. Усіх людзей, што былі на ганку, загналі ў адзін пакой воласці, а ў астатніх пакоях парвалі ўсе паперы, паламалі мэблю і толькі пасля гэтага жанчын адпусцілі, а Косцю затрымалі. Запыталі, з якой ён вёскі і дзе ходзіць, бо веласіпеда ў яго не было. Перад гэтым яго папрасіла адна з жанчын, якой нягледзячы на вялікі дождж патрэбна было хутка дабрацца дамоў. І Косця, мабыць, на сваё шчасце, аддаў веласіпед жанчыне з умовай, што вечарам яна прывядзе яго Косці дамоў. А на пытанне адкуль ён, Косця адказаў партызанам, што з Вірышчаў. Бо праўды партызанам сказаць было нельга. Службы бухгалтарам у маёнтку, які належаў немцам, партызаны яму не даравалі б. Не звяртаючы ўвагі на сутнасць адказу, партызанскі камандзір загадаў Шышэі ісці з імі. І калі партызаны сталі рухацца ў напрамку названай вёскі, у Косці ўсё перасохла ў роце, здавалася, адказвалі ногі, бо ён у гэты час падумаў: “А што будзе, калі прыйшоўшы ў Вірышча, партызаны загадаюць паказаць ім сваю хату?”. Але патрэбна было трымацца і зноў спадзявацца на Божую волю.

Партызаны спыніліся насупраць Другой Гары. Камандзір паставіў варту, а астатнія пайшлі па хатах па здабычу. Гэта была ўжо амаль ноч - сцямнела. Астаўшыся з Косцем у якасці вартаўніка партызан звярнуўся да хлопца і паведаміў, што ён штосьці не спадабаўся камандзіру. Але ў гэты момант у адной з бліжэйшых хатаў пачуўся моцны крык. Вартаўнік на хвіліну

адхіліўся, каб паглядзець, што там адбываецца. І тут у Косці зноў імгненна спрацавала інтуіцыя самазахавання - ён хутка сігануў у бліжні роў і як мага сілы пабег. Спыніўся толькі ў невялікім гайку, адчуўшы, што пагроза жыццю мінула. Перавёўшы на працягу некалькіх хвілін дух, Косця пайшоў дамоў. А дома ўжо хваляваліся і бедавалі, што з ім сталася, бо прыкаціўшы веласіпед, жанчына паведаміла маці і сястры аб затрыманні Косці партызанамі.

Пасля здарыўшагася Кастусь вырашыў зноў параіцца са сваім былым настаўнікам Аркадзем Бузуком, які працаваў у той час ужо ў Навагрaдку. І калі ён расказаў настаўніку аб усім, што робіцца ў Шчорсах, Нягневічах і іншых навакольных вёсках, ды яшчэ і запытаў, што няўжо нам, беларусам, наканавана лёсам увесь век так пакутаваць, Бузук, крыху памаўчаўшы, адказаў: “пацярпі трошкі. Але сапраўды нам патрэбна штосьці рабіць, бо нас пакуль што ўсе б`юць: б`юць немцы, б`юць партызаны, камандзірамі ў якіх з`яўляюцца галоўным чынам расейцы, б`юць акоўцы, ды што там казаць, б`юць і свае здраднікі, якім усёроўна каму служыць - немцам ці бальшавікам”. Адказаў на пытанне Косці,  а пасля зноў замоўк, зірнуў у неба, нібы яшчэ раз папрасіўшы ў Бога дапамогі, потым глянуў на Косцю і працягнуў яму нейкія паперы, сказаўшы: “Прачытай. І калі спадабаецца, дык падбяры сабе мянушку і пашукай яшчэ надзейных хлопцаў. Створым арганізацыю, дык, мабыць, што і атрымаецца”.

Прыйшоўшы дамоў і разгарнуўшы паперы, Кастусь убачыў, што былы настаўнік даў яму “Бюлетэнь БНП”. Беларуская Незалежніцкая Партыя ставіла перад сабою задачу на першых парах актывізаваць барацьбу за шырокае адраджэнне беларускасці(школы, мовы, царквы, войска…), а пасля і нацыянальнай дзяржавы - Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Ідэя Кастусю спадабалася і ён стаў “Верасам”. А падабраў Шышэя гэткую мянушку таму, што яму заўжды падабалася гэтая восеньская расліна, якая з`яўляецца нейкай своеасаблівай прыкметай Беларусі, хаця па свайму характару і дзеянням ён працягваў заставацца Арлом.

А тым часам ужо не было спакою і на службе. Узброеныя людзі, якіх у гады вайны кішмя кішэла і ў беларускіх лясах і ў гэткіх буйных, як Нягневічы, населеных пунктах, не жадалі падпарадкоўвацца ніякім законам. Яны прызнавалі толькі сілу, якую выкарыстоўвалі і для здабычы ежы. Скажам, задумалася

літоўцам, батальён якіх у той час размясціўся побач з Нягневічамі ў вёсцы Сланеўская Воля, здабыць свежага мяса, і яны паехалі ў Косы Двор і ні ў кога не пытаючыся, забілі племяннога быка і двое свіней. Косця зразумеў, што яму патрэбна штосьці рабіць, бо ўся маёмасць маёнтка ўлічана. Параіўшыся з дырэктарам, ён паехаў за парадай у Любчу, дзе знаходзілася больш высокае кіраўніцтва маёнткамі, галоўным у якім быў немец Фюрст. Шышэя і даклаў яму аб здарыўшымся. Немец паслухаў, паслухаў маладога бухгалтара, а пасля і кажа: "Вайна. Нічога не зробіш". Потым кудысьці патэлефанаваў, а пасля гэтага бухгалтару параіў: "Каб табе было апраўданне, ты ў гэткіх выпадках у спецыяльнай графе адзначай - чаго і колькі хто забраў: літоўцы, паліцыянты, партызаны". На гэтым і развіталіся. Косця зразумеў, што і Фюрст таксама не мае вялікай сілы, а, мабыць, не хоча рызыкаваць жыццём, таму і не ўступае ў спрэчкі з узброенымі людзьмі.

А тым часам людзей узброеных усё большала і большала. Днём у вёсках гаспадарылі немцы, паліцыянты, літоўцы, украінцы, латышы, а ў начы партызаны розных катэгорый, у тым ліку і польскія. Але на тэрыторыі Любчанскага і Карэліцкага паветаў самай моцнай сілай сярод партызан лічыўся атрад, якім камандаваў Дзмітрый Дзенісенка, або як яго называлі яшчэ - "Міцькін атрад". На ўзбраенні ў яго была нават пушка. У чэрвені 1943 года названы атрад завітаў і ў Нягневічы. Прычым гэта здарылася вечарам, калі моладзь яшчэ гуляла на вуліцы. Быў з моладдзю і Кастусь Шышэя. Вечар быў цёплы і прыгожы, што таксама станоўча ўплывала на настрой дзяўчат і хлопцаў. Але раптам нехта крыкнуў: "партызаны!". Пасля гэтага ўсе пабеглі, хто куды. Косця забег у агарод да ксяндза і лёг у бульбу, якая ў той час была ўжо дастакова вялікай, каб схавацца. Партызанаў было многа. А каб яшчэ больш запалохаць стаяўшых у Нягневічах паліцыянтаў, ды розных начальнікаў, мясцовае насельніцтва, яны бабахнулі адзін раз і з пушкі, ад выбуху якой, здавалася, задрыжала зямля. Гаспадарылі партызаны ў той вечар у Нягневічах, як хацел, бо паліцыя пахавалася і не давала аб сабе ведаць, пакуль "лясныя госці", паламаўшы мэблю ў воласці, у канторы маёнтка і награбіўшы ў людзей усялякага дабра, не паехалі з Нягневіч. Раніцаю высветлілася, што шмат людзей было і забіта.

Гэткая смелая выхадка партызан у Нягневічах сведчыла аб

тым, што сілаю яны пачалі перавышаць паліцыю. Бо раней, у тыя вёскі, дзе знаходзіліся паліцэйскія камендатуры, партызаны амаль не заходзілі, а калі і заходзілі, дык імкнуліся хутка ўцячы. Менавіта таму, што тут было, як кажуць, зацішней, у Нягневічах размяшчалася не толькі Нягневіцкая, але і Лаўрышоўская і Харосіцкая воласці. А вось гэты выпадак паказаў, што і тут таксама пратызаны могуць дастаць.

Пасля разбою партызанаў у Нягневічах Шышэя зноў пайшоў да Фюрста. Сустрэўшыся са сваім гаспадарчым начальнікам, ён сказаў, што больш заставацца ў Нягневічах не можа, таму, мабыць, патрэбна ісці ў нейкае войска. Але выслухаўшы бухгалтара, Фюрст адказаў, што, маўляў, іх задача займацца гаспадарчымі справамі, бо без моцных гаспадарак, без прадуктаў, і войска існаваць не можа, а калі заставацца ў Нягневічах вельмі небяспечна, дык бухгалтэрыю можна весці і пераехаўшы ў Любчу, што і прапанаваў яму зрабіць.

Шышэя з прапановай Фюрста пагадзіўся. Пераехаўшы ў Любчу, уладкаваўся на кватэры, а харчавацца стаў у грамадскай сталовай, дзе давалі нішчымны суп з бручкі і 200 грамаў хлеба, таму ўжо праз тыдзень у вачах “залёталі матылі” і ўвесь час стала цягнуць на сон. Змены ў знешнім выглядзе і паводзінах Шышэі заўважылі і Фюрст і гаспадыня, дзе ён жыў на кватэры. Фюрст нават запрапанаваў Кастусю, што калі з Любча ў Нягневічы будзе ехаць паліцыя, дык ты, маўляў, паедзь з ёю і набяры ў маёнтку харчоў. Спытала ў кватаранта і гаспадыня, чаму ён увесь час спіць, і калі Кастусь сказаў, што ён галодны, яна пасварылася на хлопца, чаму ён маўчыць, а сама пры гэтым ад жалю нават заплакала і, безумоўна, пакарміла.

Цяжка сказаць, як было б далей у Кастуся з харчаваннем, але на яго шчасце ў Любчу прыехаў дырэктар маёнтку №206 Лукашэвіч, ды прывёз бухгалтару хлеба, сала, паляндзвіцу, два сыры і нават літр гарэлкі. І тут Косця ажыў. Праўда, на першых парах шмат есці баяўся, бо вельмі згаладаўся і таму асцерагаўся, каб не стала дрэнна. Выпіўшы чарку гарэлкі, сяго-таго адрэзаў, астатняе перадаў гаспадыні і папрасіў, каб дзе-небудзь схавала. А паколькі харчы сталі нядрэннымі, дык і час пабег хутчэй. Не паспеў Кастусь аглянуцца, як прыйшла і восень.

У кастрычніку Шышэя атрымаў павестку явіцца ў Нягневічы на камісію, бо хоць ён і жыў у Любчы, але ўсёроўна ў спісах

лічыўся жыхаром Нягневіцкай воласці. Прыехаўшы ў Нягневічы, Кастусь даведаўся, што немцы набіраюць хлопцаў у арганізацыю для будаўніцтва мастоў і дарог. Калі ён зайшоў у сам пакой, дзе сядзела медычная камісія, убачыў, што там сядзеў адзін з павятовых начальнікаў. Пазнаўшы Шышэю, чыноўнік з Любчы запытаў: "А ты тут чаго? Ты ж працуеш?". Але ў гэты час да Шышэі падыйшоў малады, стройны, прыгожа апрануты чалавек і на чыстай беларускай мове паведаміў, што ствараецца беларускае войска, а для гэтага патрэбныя адукаваныя хлопцы і запрапанаваў Кастусю Шышэю ўключыцца ў дадзеную справу. Гэтым маладым чалавекам быў Барыс Рагуля.

Шышэя Рагулі адказаў, што ён згодзен. А зарыентавацца яму ў прапанове Рагулі дапамог той бюлетэнь, які яму раней даў яго настаўнік Аркадзь Бузук. Бо пасля размовы з настаўнікам і азнаямлення з матэрыяламі бюлетэня ён па-іншаму пачаў глядзець на навакольныя падзеі. Кастусь зразумеў, што прыказка: "Выратаванне тых, хто топіцца, з`яўляецца справаю рук іх саміх", - амаль дакладна адлюстроўвае склаўшаеся становішча ў свеце, і ніхто бараніць беларусаў не будзе, калі яны самі сябе не бароняць. А каб бараніцца, патрэбна мець сваё беларускае войска. Але даўшы згоду, Шышэя расказаў Рагулі, хто ён і паведаміў аб тым, што ў яго ў Любчы ёсць начальнік-немец, які не зацікаўлены яго нікуды адпускаць. У такім выпадку Рагуля паразмаўляў з прыехаўшымі ў Нягневічы і ўдзельнікамі камісіі - немцамі, а пасля гэтага ўзяў у Шышэі павестку, зрабіў на ёй адзнаку і сказаў: "пакажаш свайму Фюрсту". Развітаўшыся з Шышэям, апошняму Рагуля загадаў праз некалькі дзён з`явіцца ў Наваградак.

* * *

Атрымаўшы надзею ўдзельнічаць, як ён тады думаў, у вялікай патрыятычнай справе па фармаванню свайго беларускага войска, Шышэя вярнуўся ў Любчу, здаў справы, потым з`ездзіў дамоў, развітаўся з маці із сястрою, паведаміўшы апошнім, што ён будзе служыць у жо ў Наваградку на вуліцы 25 Сакавіка. І тут патрэбна падкрэсліць, што хлопца падбадзёрвала і сама назва вуліцы. 25 Сакавіка 1918 года, як вядома, была абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі і Косця таксама аб гэтым ведаў ад свайго настаўніка

Аркадзя Бузука. Напачатку другой паловы кастрычніка 1943 года Шышэя паехаў у Наваградак. Штаб, а пасля і само фармаванне беларускага войска размяшчалася ў драўляным двухпавярховым будынку. Да прыезду Кастуся там ужо знаходзілася чалавек дзесяць. Хутка прыйшоў і сам Барыс Рагуля, якому і было даручана стварыць гэтае фармаванне. Ён здаў кожнаму кніжачкі з ваеннай тэрміналогіяй на беларускай мове. У лістападзе пачалі з`яўляцца і будучыя жаўнеры. У канцы названага месяца пачаліся заняткі, хаця ўсе пакуль што заставаліся ў сваім адзенні. Акрамя чыста вайсковай падрыхтоўкі, заняткі праводзіліся яшчэ і па іншых прадметах. Асаблівая ўвага ўдзялялася вывучэнню гісторыі Беларусі. Выкладчыкамі былі Пятро Срабец, Аляксандр Орса, Васіль Пляскач. Тактычныя заняткі праводзіў сам Барыс Рагуля. За заняткамі ажыццяўляўся кантроль і з боку немцаў, якія, мабыць, на першых парах не вельмі верылі ў сур`ёзнасць намераў беларускіх хлопцаў. Але пераканаўшыся ў сумленных адносінах да справы, у лютым 1944 года беларускіх жаўнераў апранулі ў вайсковую форму, а 25 сакавіка яны прынялі прысягу наступнага зместу: “Я, жаўнер Першага Беларускага эскадрону, прысягаю на ўсямернага Бога і на жаўнерскі гонар, што буду верна служыць свайму беларускаму народу, сумленна і прыкладна выконваць усе загады сваіх камандзіраў і начальнікаў. Я прысягаю, што не выпушчу з рук сваіх зброі да тых пор, пакуль не будуць устаноўлены поўны спакой і бяспека ў нашых сёлах і гарадах, пакуль не будзе знішчаны на нашай зямлі апошні вораг Беларуска народу. Так мне паможа Божа!”.

Барыс Рагуля чытаў тэкст Прысягі, а ўсе жаўнеры за ім паўтаралі. Адбывалася гэта на плошчы, напоўненай народам, у тым ліку ў прысутнасці акруговай і павятоввай адміністрацыі, немцаў і паліцыі, настаўнікаў і навучэнцаў школ, гімназістаў. Беларускае войска асвяцілі праваслаўныя святары.

Гэта было сапраўднае свята для ўсіх, хто ў той час прысутнічаў на плошчы. Бо яшчэ год таму назад ніхто не мог і падумаць аб тым, што на акупаванай немцамі тэрыторыі пачнецца адраджэнне Беларускага войска, якое 25 сакавіка 1944 года прысягала “верна служыць свайму Беларускаму народу”, а не фюрэру, аб якім у Прысязе нават не ўзгадвалася. Аб нацыянальным характары войска гаварылі атрыбуты беларускай сімволікі на адзенні жаўнераў: на шапках беларускі

герб “Пагоня”, а на каўнярах мундзіраў бел-чырвона-белыя палоскі. Аб нацыянальным беларускім характары войска сведчылі і беларускія песні, з якімі эскадронаўцы маршыравалі па вуліцах Наваградка.

Безумоўна, усё гэта адбылося толькі тады, калі немцы адчулі, што яны адныя не маюць сілы для перамогі ў вайне з Савецкім Саюзам і Заходнімі дзяржавамі. У канцы красавіка 1944 года на мітынгу ў мястэчку Мір камандзір Першага Беларускага эскадрону Барыс Рагуля ўжо дазволіў сабе сказаць нават наступныя словы: “Кажуць, што мы немцам служым. Мана! Няважна, што мундзіры аднаго колеру, але пад мундзірамі іншыя сэрцы б`юцца… Вораг наш кожны, хто супраць нашага ідэалу - незалежнай Беларусі. Сёння мы павінны выкарыстаць нагоду, каб давесці нашаму народу, што ён мае яшчэ верных сыноў. Наша заданне вярнуць веру народу ў свайго жаўнера, пераканаць стэрарызаванага селяніна, што стрэльба ў руках беларускага жаўнера не дзеля тэрору, а дзеля абароны Беларусі перад тэрорам чужынцаў. Гэта першая мэта нашага змагання. Дасягнем яе, дасягнем і іншых…”

Праўда, немцы, выдаўшы эскадронаўцам адзенне, хацелі выкарыстаць створанае беларускае войска ў сваіх мэтах, і перш за ўсё для аховы дарогаў, дзе яны перамяшчаліся. Шышэя са сваёй дружынай (аддзяленнем) у 15 чалавек ахоўваў дарогу Навагрудак-Карэлічы каля вёскі Рутка. Безумоўна, што не ўсе 15 чалавек стаялі на дарозе, частка жаўнераў ішла ў вёску ў якую-небудзь хату, куды збіралася вясковая моладзь, а другая частка заставалася на дарозе. Праз некаторы час жаўнеры мяняліся. І вось аднойчы, калі ў вёску з групай жаўнераў пайшоў і Шышэя, туды прыехаў партызан. Прывязаўшы да плоту асадланага каня, партызан зайшоў у адну з хатаў. Усё гэта бачылі эскадронаўцы. Шышэя даў каманду злавіць “лесавіка”. З гэтай мэтай адвязалі ад плоту каня і акружылі сядзібу дзядзькі, у хату якога зайшоў партызан. Убачыўшы небяспеку, нязваны госць выбег з хаты і хутка схаваўся ў побач стаяўшы стажок саломы. Шышэя папярэдзіў партызана, каб вылазіў, а ў адваротным выпадку эскадронаўцы пачнуць страляць. Але тут умяшаўся і гаспадар сядзібы. Ён пачаў прасіць, каб не стралялі, бо ад куляў можа загарэцца салома, а там глядзіш і іншыя будынкі. Эскадронаўцы страляць не сталі, але не вылазіў з саломы і партызан, у якога таксама былі аўтамат і граната. Таму

падыйсці да стога вельмі блізка эскадронаўцы не рызыкавалі. Бачачы, што ў некага нервы могуць не вытрымаць, і ён адкрые агонь, гаспадар паабяцаў прынесці вяроўку, якой можна акружыць стог, зачапіць канцы вяроўкі за хамут каня і такім чынам зрушыць стог з месца. Аднак толькі паспелі акружыць вяроўкай стог, як у саломе раздаўся выбух. Стала зразумела, што, каб не здацца жывым, партызан падарваўся з дапамогай гранаты. Яго звалі Мікалай. Аб гэтым эскадронаўцам паведаміў усё той жа гаспадар сядзібы, на якой і адбыўся гэты выпадак. Дарэчы, тое, што мясцовы жыхар ведаў імя партызана, сведчыла аб частых паходах “лясных насельнікаў” у названую вёску.

Аб здарыўшымся ў Рутцы стала вядома камандаванню эскадрона. Да ахоўнікаў дарогі прыехаў Рагуля і насварыўся на жаўнераў за тое, што яны ў час дзяжурства на дарозе ходзяць у вёску, а Кастусю Шышэю, як камандзіру дружыны, нават аб`явіў вымову. У апраўданне сваіх дзеянняў эскадронаўцы гаварылі, што нельга ж, каб яны стаялі на дарозе, а побач з імі партызаны рабавалі мясцовае насельніцтва. У гэткім выпадку, маўляў, іх засмяюць нават вясковыя куры.

У час дзяжурства эскадронаўцаў на дарозе Наваградак-Карэлічы адбываліся і іншыя, на першы погляд, адзінкавыя і дробныя гісторыі. Але, паколькі жыццё складаецца амаль з гэткіх адзінкавых дробязяў, дык пра іх таксама патрэбна паведаміць, тым больш, што на падставе некаторых з іх можна зрабіць значныя высновы. Вось, напрыклад, якая гісторыя адбылася з Валодзем Нагулевічам. Раней ён працаваў у школе выкладчыкам гісторыі Беларусі. Партызаны яго папярэдзілі, каб ён пакінуў настаўніцкую працу. Але Валодзя не паслухаў партызанаў, за што апошнія па-зверску забілі яго маці. Пасля гэткага жудаснага выпадку настаўнік пайшоў у эскадрон, безумоўна, каб адпомсціць партызанам за злачынства над маці. Увесь час хлопец хадзіў у нярвовым напружанні і шукаў моманту, каб здзейсніць задуманае. І вось аднойчы, стаяўшы ў ахове дарогі, Валодзі падалося, што гэткі момант надыйшоў. Ён убачыў, што ў Рутку накіравалася некалькі ўзброеных людзей у цывільным адзенні. Нагулевіч прыняў іх за партызанаў і выпусціў у іх кулямётную чаргу. Ехаўшыя ў Рутку ўзброеныя людзі разбегліся. Пачуўшы кулямётную чаргу, з хаты выбеглі і тыя эскадронаўцы, што былі ў вёсцы, успалашыліся і мясцовыя

жыхары. Выбегшы з хаты і зарыентаваўшыся, што ехаўшыя рухаліся не з боку лесу, а па дарозе з Карэліч, Шышэя адразу зразумеў, што гэта не партызаны. На самай справе гэта была карэліцкая паліцыя, якой нехта паведаміў, што ў Рутцы нібыта знаходзяцца партызаны. Менавіта таму ў сваім адзенні паліцыянты і ехалі ў названую вёску, бо так, лічылі яны, можна быць больш ці менш прыкмечанымі. Безумоўна, аб сваіх планах яны павінны былі паведаміць камандаванню эскадрона, бо аб ахове дарогі беларускімі жаўнерамі ведалі. А калі гэтага не зрабілі, дык за памылку прыйшлося заплаціць выпушчанай па іх кулямётнай чаргой.

Але так яно, то так, а скандал падняўся ўжо праз некалькі хвілін. У Рутку прыехалі і Рагуля і немцы, сталі дапытвацца, у чым справа. Шышэя паспрабаваў патлумачыць, што яны, маўляў, падумалі, што ў Рутку едуць партызаны і таму адкрылі агонь. Аднак яго абгрунтаванне здарыўшамуся ніхто не хацеў слухаць. Яго і Нагулевіча забралі і павезлі ў Наваградак у жандармерыю. А там немец па-руску запытаў, у чым справа і як гэта магло здарыцца. Нагулевіч зразумеў, чым усё можа скончыцца, і таму ў час допыту ўвесь дрыжэў, нібы стаяў не ў кабінеце нямецкага следчага, а на двары на саракаградусным марозе. Заклапочаны здарыўшымся быў і Шышэя. Але, як камандзір дружыны, ён павінен быў дакладна растлумачыць, што адбылося каля Руткі, чаму эскадронаўцы абстралялі карэліцкую паліцыю і чаму навогул без каманды Нагулевіч адкрыў агонь. Таму Шышэя і пачаў расказваць усё па парадку: спачатку аб Нагулевічы - хто ён такі і чаму гэткі нервовы, а пасля аб тым, што іх ніхто не папярэдзіў аб дзеяннях карэліцкай паліцыі і таму яны не маглі не рэагаваць на прыезд невядомых узброеных людзей, якія па знешняму выгляду, безумоўна, былі больш падобныя на партызанаў і нішто ў іх не паказвала, што гэта паліцыя. Уважліва выслухаўшы роспавед камандзіра дружыны эскадронаўцаў, немец усё зразумеў і адпусціў затрыманых. Праз некаторы час і Шышэя і Нагулевіч былі ўжо зноў на дарозе каля Руткі.

Гэткі загад, як у Навагрудку Барысу Рагулі, у Лідзе далі Чэславу Заянчкоўскаму (па мянушцы “Рагнер”) - арганізаваць для барацьбы з партызанамі ўзброены атрад палякаў. Выканаўшы загад, Заянчкоўскі таксама пачаў гуляць у сваю нацыянальную польскую ідэю, што ў планы немцаў зусім не

ўваходзіла. Але, звязаўшыся з Арміяй Краёвай, польскі атрад працягваў сваю гульню. Прыйшоўшы аднойчы ў Бярозаўку, палякі вывесілі польскі сцяг нібы паказваючы немцам, хто гаспадар на гэтай тэрыторыі. Але, паколькі немцы ў той час ужо не хацелі рабіць нейкіх рэзкіх крокаў паміж сабою і створанымі (або дазволенымі стварыць) імі фармаваннямі, яны, каб супакоіць нацыянальныя амбіцыі палякаў, вырашылі гэта зрабіць, выкарыстаўшы беларускія вайсковыя фармаванні, якія, безумоўна, мелі ўсе падставы лічыць, што гэта тэрыторыя беларуская і нічыя больш. Вось і ў дадзеным выпадку яны загадалі эскадронаўцам Рагулі ўзяць Бярозаўку пад сваю апеку. Для выканання задання нямецкага камандавання Рагуля сфармаваў невялікі атрад на чале з Валодзем Сіўко, які, як і сам Рагуля, добра ведаў усе гэтыя мясціны, бо родам паходзіў з Любчы.

І тут зноў трэба аддаць належнае камандаванню Першага беларускага эскадрону, што яно імкнулася выконваць свае задачы па магчымасці без крыві. Гавораць, што ў гэтым вялікая заслуга належала роднаму дзядзьку дваццацітрохгадовага камандзіра эскадронаўцаў Васілю Рагулі, які ў адрозненне ад свайго пляменніка Барыса Рагулі, меў багаты жыццёвы вопыт, а таму часта падказваў апошняму, як сябе паводзіць у тых ці іншых сітуацыях. У дадзеным выпадку таксама патрэбна было абысціся без крыві. Таму, перш чым ісці і займаць Бярозаўку, напісалі "Рагнеру" пісьмо, у якім папярэдзілі апошняга, каб да 2 гадзін поўдня яго жаўнеры пакінулі Бярозаўку, зняўшы пры гэтым і польскі нацыянальны сцяг. Пасля адсылкі пісьма Рагнеру з дапамогай ехаўшага ў Бярозаўку аднаго яе жыхара атрад рушыў у дарогу і, падыйшоўшы да названага населенага пункту, стаў чакаць указанага ў пісьме часу.

Палякам, мабыць, не хацелася ў дадзеным выпадку траціць свой гонар. Але яны не маглі і не разумець, чым усё скончыцца, калі не выканаюць пастаўленай перад імі задачы, тым больш, што палякі не маглі не бачыць стаяўшага на подступах да Бярозаўкі коннага атрада беларускіх жаўнераў. На населены пункт была наведзена і гармата, што знаходзілася на ўзбраенні эскадронаўцаў. Таму без некалькіх хвілін у дзве гадзіны дня польскі сцяг быў спушчаны. У гэты ж час з`явіўся да эскадронаўцаў той самы жыхар Бярозаўкі, якім яны перасылалі пісьмо Рагнеру, і паведаміў, што палякі пакінулі Бярозаўку. Але,

калі конны атрад беларускіх жаўнераў зайшоў у Бярозаўку, у ёй не было амаль ніводнага жыхара, бо, пакідаючы населены пункт, палякі пусцілі слых, што нібыта прыехаў карны атрад і будзе ўсіх забіваць. Таму людзі вярнуліся дамоў толькі тады, калі па даручэнню эскадронаўцаў адна з мясцовых жыхарак іх заклікала.

У названай аперацыі, як і ў многіх іншых, непасрэдным удзельнікам быў і Кастусь Шышэя, які расказваў, што можа, паклаўшы руку на сэрца, пасведчыць аб тым, што дзе бы эскадронаўцы ні былі, яны заўжды ставілі перад сабою задачу абараняць мясцовае насельніцтва, беларускія сёлы і вёскі, мястэчкі і гарады ад здзекаў і разбурэнняў, прычым заўжды імкнуліся рабіць гэта па магчымасці без прымянення зброі.

А гаворачы пра польскі ўзброены атрад пад камандаваннем Чэслава Заянчкоўскага, трэба адзначыць, што ён, як і Армія Краёва, актыўна змагаўся і з партызанамі, якіх яны лічылі ўсіх рускімі, бальшавікамі. Але, у адрозненне ад Рагнера, камандаванне Арміі Краёвай не хацела выконваць ніякіх задач немцаў. Таму Рагнера яно лічыла чужым. І, калі яго атрад разбіў у Кабыльніках партызанаў, дык камандаванне АК передало яго пад суд. Гэта, як лічыць Кастусь Шышэя, была дэманстрацыя акоўцаў перад “чырвонымі партызанамі”, а на самай справе, Армія Краёва, на яго думку, уяўляла сабой нацыяналістычна скіраваным вайсковым фармаваннем, якое ставіла перад сабой задачу дапамагчы адраджэнню Польшчы ў межах, якой яна была да верасня 1939 года. Названая армія знішчыла сотні беларускіх нацыянальных патрыётаў, у тым ліку і гэткіх вядомых, як палітычна-грамадскага дзеяча Юльяна Саковіча, Леаніда Маракова, настаўніка Паўла Шляхтуна.

6 сакавіка 1944 года пачалася масавая мабілізацыя ў Беларускую краёвую абарону. Каб дапамагчы людзям зразумець неабходнасць і мэту ствараемых беларускіх нацыянальных вайсковых фармаванняў, эскадронаўцы ўзялі на сябе гэткую прапаганду, а разам з тым хацелі паказаць і сваю сілу, асабліва пасля прыняцця прысягі. З гэтай нагоды яны сталі здзяйсняць маршы ў Карэлічы, у Любчу, у Валеўку. Хаця, наколькі я ведаю, гэткай прапаганды было яўна недастаткова. Скажам, у нашай вёсцы Лаўрышава, калі праходзіла гэткая мабілізацыя, аб яе сапраўднай мэце ведалі, мабыць, адзінкі. Большасць жа мясцовых жыхароў ствараемые вайсковыя

фармавані называлі проста батальёнам, не маючы пры гэтым уяўлення аб яго мэтах.

А тым часам сам Першы Беларускі эскадрон сапраўды імкнуўся абараняць мясцовае насельніцтва як ад грабяжоў партызанаў, якія з кожным месяцам узмацняліся, так і ад так званых казакаў, што вясною 1944 года панаехалі на Наваградчыну і таксама заняліся грабяжамі мясцовага насельніцтва. Вось аднойчы эскадронаўцам і даклалаі, што з Наваградка казакі паехалі ў адну з лясных вёсак пад назвай Каменка, каб у чарговы раз запасціся дабром. Даведаўшыся аб гэтым, Рагуля неадкладна прыняў рашэнне абараніць жыхароў названай вёскі ад злачынства з боку панаехаўшых чужынцаў. Уехаўшы ў Каменку, эскадронаўцы ўбачылі ўжо поўныя вазы нарабаванага дабра, якое казакі пакінулі, прыкмеціўшы рагулёўцаў. Апошнія пачалі акружаць вёску, але казакі паспелі адысці ў лес і самі сталі акружаць абыходзіўшыя вакол вёску асобныя дружыны беларускага войска. У гэткае акружэнне трапіла і дружына Кастуся Шышэі. Шышэя ўжо нават даў каманду сваім падначаленым падрыхтавацца да абароны. Аб навісшай пагрозе сваіх асобных дружын стала вядома Рагулі, які пасля гэтага выкінуў ракету. Убачыўшы ракету, казакі зразумелі, што пакуль жывыя, патрэбна ўцякаць далей у лес. Гэта яны хутка і зрабілі. Пасля іх адыходу кожны з мясцовых жыхароў забраў сваю маёмасць і адзін перад другім паскардзіліся рагулёўцам аб сваім цяжкім жыцці: ноччу грабяць партызаны, днём няма жыцця ад казакаў ды іншых чужынцаў, панаехаўшых на беларускую зямлю.

Аднак, як бы камандаванне Першага беларускага эскадрона не імкнулася здзяйсняць свае аперацыі без ахвяр і крыві, так не атрымалася. Вайна заўжды нясе з сабою кроў і смерць, пакуты і разбурэнні. Вынікам прымянення зброі з`яўляюцца чалавечыя ахвяры і пажары. Так здарылася і тады, калі, здзяйсняючы свой чарговы паход па населеных пунктах наваградскай акругі, эскадронаўцы падыходзілі да вёскі Краснае, што знаходзіцца паблізу ад Карэліч. Эскадрон быў не ў поўным складзе, але камандаваў атрадам у чалавек 60 сам Рагуля. Нічога не гаварыла аб бядзе. І вось, адкуль ні вазьміся, раздаўся стрэл. Гэта выстраліў з далёкай адлегласці партызан, пасля чаго сам паспеў уцякчы ў лес. Выстрал быў меткім і куля смяротна параніла аднаго з эскадронаўцаў, імя якога было Даніла. Гэты

паважаны сябрамі па зброі чалавек, пры Польшчы скончыў тры курсы Віленскага універсітэту. Але куля не глядзіць ні на адукацыю, ні на прыстойнасць. Даніла ад раны памёр, стаўшы першай ахвярай у эскадроне, якую ён паклаў на алтар абароны незалежнасці сваёй Бацькаўшчыны. Пахавалі Данілу на могілках у Навагрудку з усімі вайсковымі ўшанаваннямі. На могілках сабралася вельмі многа народу. Была тут і моцна аплаквала смерць Данілы дзяўчына, з якой ён збіраўся хутка стварыць сям`ю.

З пачаткам мабілізацыі мясцовага насельніцтва і стварэння беларускіх вайсковых батальёнаў ва ўсіх павятовых цэнтрах перад Першым Беларускім эскадронам паўстала задача дапамагчы ўказаным фармаванням авалодаць патрэбнымі ведамі, каб стаць сапраўднымі абаронцамі сваіх вёсак і сем`яў. З гэтай мэтаю Кастуся Шышэю з яго дружынай накіравалі ў Карэлічы, хтосьці паехаў у Любчу, нехта - у Дзятлава. Прыехаўшы ў Карэлічы, Шышэя як і патрэбна ў гэткіх выпадках, звярнуўся ў адміністрацыю павета, дзе яму ўказалі месца знаходжання штаба фармуемага Беларускага батальёна. Камандзірам батальёна быў штабс-капітан Кулеш, якога Шышэя застаў у штабе за чаркай гарэлкі. З ім сядзелі і выпівалі яшчэ чалавекі чатыры. Шышэя даклаў, хто ён і з якой мэтай накіраваны з цэнтра акругі ў Карэлічы. Кулеш, у сваю чаргу, запытаў адкуль інструктар родам і запрасіў яго сесці пакуль што разам па чарцы выпіць. Безумоўна, што Шышэя не мог пачынаць сваю працу з п`янкі. Ён сказаў Куляшу, што не п`е, наконт чаго апошні зрабіў парок: маўляў, няп`ючыя ў салдатах не гадзяцца. Перамовы скончыліся тым, што Кулеш накіраваў прыехаўшага “зверху” інстуктара да камеданта карэліцкай паліцыі Сцяпуры. Па знешняму выгляду было бачна, што Сцяпура, у адрозненне ад Куляша, з`яўляецца чалавекам справы. Прычым, як паказалася Шышэі, больш бандыцкай. Таму Шышэя адразу паказаў яму сваё пасведчанне, пасля чаго Сцяпура паклікаў начальніка ўжо нямецкай жандармерыі Цымермана, які валодаў польскай мовай. Немец запытаў у Шышэі, што ён збіраецца рабіць і таксама адкуль ён родам. І калі Шышэя назваў сваю вёску, дык Цымерман задаў яму яшчэ адно пытанне: ці ведае ён, што такое “партызанка”. Пры гэтым, не дачакаўшыся адказу, выказаў на гэты конт сваё меркаванне, з якога выцякала, што ствараемае беларускае войска - гэта і

ёсць патэнцыяльныя партызаны. Але Шышэя сказаў, што ён павінен выконваць загад начальства. Цымерман, як чалавек вайсковы, гэта таксама добра разумеў. Таму не стаў далей задаваць пытанні, а загадаў Сцяпуры адвесці прыехаўшага з цэнтра акругі інструктара ў казарму, дзе размясціліся будучыя беларускія ваяры, хаця, як ужо сказана, у эфектыўнасць дадзенага мерапрыемства сам слаба верыў.

Казармай служыла памяшканне школы, якое Сцяпура зачыняў і ключ насіў з сабою. Ідучы ў памяшканне, дзе размяшчалася 187 чалавек-батальёнаўцаў, камендант узяў з сабою бізун і браўнінг, а калі з Шышэям зайшоў у памяшканне, дык усе будучыя беларускія ваяры сталі разбягацца па вуглах. Шышэя зразумеў, што прызваныя на службу ўжо ведалі каменданта і яго паводзіны. Яны нават не адказалі на прывітанне. І наогул карціна ў "казарме" была жахлівая. Па ўсёй падлозе ляжала салома і толькі ў куце стаялі груды школьных партаў. Сцяпура прапанаваў пералічыць прысутных, на што Шышэя адказаў, што ён гэта зробіць сам і, звярнуўшыся да навабранцаў, паведаміў: "З сённяшняга дня вы становіцеся жаўнерамі беларускага войска". Але і на гэты раз хлопцы працягвалі маўчаць. Тады Шышэя загадаў усім выйсці ў двор і стаць у два шэрагі. Калі яны выканалі загад, Шышэя патлумачыў ім, дзеля чаго іх паклікалі на службу. Больш таго, ён прапанаваў ім звярнуцца да сваіх знаёмых, што пайшлі ў партызаны і паклікаць іх з лесу да сябе, у беларускае войска. Пасля гэтага ўсіх перапісаў, разбіў па дружынах і звеннях (аддзяленнях і ўзводах), і прапанаваў тым, хто жыве недалёка, пайсці дамоў, памыцца і праз дзень раніцай вярнуцца на службу. А таму, каму дамоў далёка, загадаў вынесці і спаліць салому, падлогу заслаць аерам, каб выгнаць з памяшкання насякомых, а пасля нанесці чыстай саломы ды слаць не на падлогу, а на нары, якія патрэбна зрабіць, выкарыстаўшы для гэтага і школьныя парты. Астаўшыеся ў Карэлічах памыліся ў рэчцы, балазе вада была цёплая.

Убачыўшы, што добрую частку людзей Шышэя адпусціў дамоў, Сцяпура даклаў аб гэтым Цымерману, а апошні, пасля дакладу каменданта паліцыі, выклікаў Шышэю. Па знешняму выгляду Шышэя заўважыў, што Цымерман быў злосны, убачыўшы Шышэю, ён стаў папракаць апошняга за самавольства, сказаўшы пры гэтым, што тыя, каго Шышэя

адпусціў дамоў, больш на службу не вернуцца. Цымерман закончыў размову з Шышэям пытаннем: “І калі не вернуцца, дык падумаў, што будзе з табою?”.

Аднак Кастусь лічыў, што ён робіць усё правільна. А таму ў адказ на папрокі Цымермана ўпэўнена сказаў: “Мы рыхтуем войска, а не вязняў”. Праўда, пасля размовы з Цымерманам задумаўся і сам. А сапраўды, калі не вернуцца, што рабіць? Пры гэтым масла ў агонь падлілі і астаўшыеся хлопцы, якія таксама лічылі, што назад вернуцца не ўсе. Ды і повар запытаў у Шышэі: “На колькі чалавек рыхтаваць заўтрашні абед?”. Гэткае пытанне гаварыла аб тым, што і повар думае: “Не ўсе вернуцца на службу”. Так што сну ў Шышэі не было. Усю ноч думкі не выходзілі з галавы: што будзе заўтра?

Прыйшла раніца. Шышэя не зводзіў вачэй з усіх дарог. І вось у палове дзевятай паказалася першая група ў колькасці чалавек 20. Праз некалькі хвілін падыйшлі яшчэ некалькі чалавек, далей з`явілася болей. У 10 гадзін Шышэя ўсіх пастроіў у два шэрагі і загадаў пералічыцца. І калі пералік скончыўся, ён з палёгкай уздыхнуў - усе 187 чалавек былі на месцы. У час пастраення і пераліку падыйшлі Цымерман і Сцяпура. Прычым, калі стала бачна, што ўсе разыйшоўшыеся па дамах вярнуліся на службу, Цымерман абазваў Шышэю шалёным, махнуў рукою і накіраваўся адыходзіць. Але Шышэя яго запыніў і папрасіў дапамагчы на першых часах з аховай уначы, бо ў батальёнаўцаў пакуль што не было нават зброі.

Высветліўшы наяўнасць будучых беларускіх ваяроў, Шышэя паразмаўляў з іх жонкамі, многія з якіх суправаджалі сваіх мужоў. Ён і ім распавядаў таксама аб тым, што ніхто за нас, беларусаў, не будзе змагацца, не будзе нас ахоўваць і абараняць. Менавіта, маўляў, для гэтага і пачало фармавацца беларускае войска. Пасля размовы жанчыны, развітаўшыся з мужамі, пайшлі дамоў, а Шышэя са сваёй дружынаю прыступіў да заняткаў, якія праводзіў на працягу двух тыдняў. Праз два тыдні Шышэю з яго дружынаю адклікалі ў Наваградак, замяніўшы іх новаю дружынаю Янкі Вялёнды.

У Наваградку эскадрон стаў рыхтавацца да новага, больш працяглага рэйду. Але разам з тым пэўная частка хлопцаў па-ранейшаму хадзіла на заданне па ахове дарогаў. І вось, аднойчы, вяртаючыся з задання, Шышэя ўбачыў, што ў яме, дзе бралі жвір, трое чалавек капаюць яму, а над імі стаяць двое

казакаў. Ужо маючы пэўны вопыт, Шышэя зразумеў, што капаўшых яму казакі хутка растраляюць. Больш таго, калі ён стаў уважліва ўглядацца на капаўшых яму, сярод іх ён пазнаў двух шчорсаўскіх хлопцаў, прычым адзін - гэта той самы Павел Радзецкі, які дапамог Кастусю ўладкавацца на вучобу за токара. Патрэбна было хутна нешта рабіць, каб выратаваць ад смерці людзей. Шышэя падыйшоў бліжэй і стаў клікаць хлопцаў да сябе. Казакі абурыліся і пачалі пярэчыць. Але Шышэя настойваў на сваім, патлумачыўшы казакам, што ў Беларусі гаспадарамі з`яўляецца беларускае войска. Цяжка сказаць, чым гэтыя спрэчкі скончыліся б, каб на шчасце Шышэі ў гэты момант да іх не падыйшло яшчэ трое эскадронаўцаў. Убачыўшы, што эскадронаўцаў стала пяць, казакі зразумелі: сілы сталі няроўнымі і не на іх карысць. А Шышэя са сваім саслужыўцам Жэнем Свігачом адразу пасмялелі. Казакі пагадзіліся пайсці да іх камендванта і высвятліць, хто тут каго і за што збіраецца страляць. З гэтым пагадзіліся і эскадронаўцы, але адзін з іх, Свігач, пабег да Рагулі. Калі прыйшлі ў штаб казакоў, да камандавання прапусцілі толькі Шышэю, астатнія эскадронаўцы засталіся ў двары. Шышэя патлумачыў сядзеўшаму ў штабе камандзіру казакоў, што гаспадарамі ў Беларусі з`яўляецца адміністрацыя і беларускае войска. “Галоўнаму казаку” гэта не спадабалася, але праз нейкую хвіліну да штаба пад`ехаў на кані Рагуля. Яго перамовы з камандзірам казакоў скончыліся загадам Рагулі адвезці гэтых траіх хлопцаў у казарму, дзе іх пакармілі і прапанавалі пакуль што адпачыць.

Дадзены выпадак выразна сведчыць аб тым, што ў час вайны жыццё чалавека практычна не мае кошту. Людзі гінуць нібы мухі з наступленнем халадоў. Разам з тым Шышэі сталі яшчэ больш зразумелымі паводзіны тых, каму зроблена дабро, у дадзеным выпадку выратавана жыццё. Мала хто з іх пасля думае аб лёсе свайго выратавальніка. Так здарылася і ў той раз. Раніцай хлопцы “Дрэнулі”, не падумаўшы, што за гэта будзе Шышэі. Больш таго, праз некаторы час, калі пасля лагернай ссылкі Кастусь Шышэя вярнуўся ў Шчорсы і сустрэў таго ж Паўла Радзецкага, апошні, безумоўна, узгадаў той самы дзень, калі ён ужо амаль па калені стаяў у магіле, з якой яго выратаваў Шышэя. Таму прапанаваў апошняму зайсці да яго і адзначыць сустрэчу. Але пры гэтым папрасіў Шышэю зайсці да яго як прыцямнее і не з вуліцы, а з агародаў, каб ніхто з суседзяў не

бачыў, што ў яго хаце быў “рызыкоўны” госць. Убачыўшы перад сабою скалечанага былым сталінскім рэжымам чалавека, якіх, на жаль, у саюзе было мільёны, Шышэя на запрашэнне Радзецкага адказаў: “Дзякуй, Павел. Я рады, што ты застаўся ў той час жывым. А піць з табою я не буду. Мне гэта зусім не патрэбна. Ты ж тады не падумаў, калі моўчкі ўцёк з казармы, а што будзе са мною. Ну, а цяпер Бог з табою. Бывай!”.

Але ў той час Рагуля нават не сварыўся на Шышэю. Ён, мабыць, разумеў, што ў гэткіх выпадках па-іншаму не бывае. Таму, нягледзячы на ўцёкі выратаваных ад смерці хлопцаў, нават пахваліў Шышэю за смеласць, сказаўшы пры гэтым: “Няхай мясцовыя жыхары ведаюць, што рагулёўцы сваіх людзей нават з ямы дастаюць”.

У канцы красавіка 1944 года эскадрон рабіў рэйд Наваградак-Валеўка-Гарадзішча- Мір- Турэц-Карэлічы-Наваградак.
Прыбыўшы ў Турэц, Барыс Рагуля нагадаў сваім сябрам, што ў гэтым мястэчку калісьці працаваў яго бацька лекарам. Тут нарадзіліся і ён і яго брацік. Але, на жаль, калі Барысу было паўтара годзіка, бацька памёр, а праз два тыдні памёр і брацік. Маці засталася “на бабах” паміж чужых людзей і без грошай. На працу па прафесіі настаўніцы ўладкавацца не магла, бо была праваслаўнай. Таму цяжка сказаць, як прыйшлося бы жыць і чым харчавацца будучаму камандзіру эскадрона, каб у той цяжкі час не дапамаглі дзядзькі Кастусь Бітус і Васіль Рагуля. Апошні пэўны час быў паслом польскага Сэйму ад Наваградчыны, апасля сенатарам. Маці з малым Барысом дзядзькі забралі тады ў Любчу.

У час Рагулі даклалалі, што партызаны разбілі той карэліцкі батальён беларускага войска, які не так даўно абучаў Кастусь Шышэя са сваёй дружынай. У баі загінуў і адзін эскадронавец - інструктар, які быў у ліку тых, хто замяніў дружыну Шышэі. Таму прыйшлося выканаць непрыемную місію - пахаваць яшчэ аднаго свайго сябра. Пахавалі на могілках у вёсцы Заполле з усімі вайсковымі ўшанаваннямі. Рагуля выступіў на магіле з прамовай. І што характэрна , дык гэта тое, што бацькі і аднавяскоўцы аднесліся да страты сына і свайго блізкага з паразуменнем. Не ўстрайвалі лямант і нікога не абвінавачвалі ў здарыўшымся, што яшчэ раз сведчыць аб жорсткасці вайны і яе ўплыве на сэрцы і розум людзей.

І вось пасля гэткага здарэння і панесенай страты вырашылі

адпомсціць і калі не разбіць, дык хаця б напалохаць камандзіра і ўвесь партызанскі атрад Дзмітрыя Дзенісенкі (Міцькі), які ў той час стаяў у вёсцы Забалоцце. З гэтай мэтай раніцай рушылі на Руткавічы, ад якіх у двух кіламетрах знаходзіцца Забалоцце. Мясціны гэтыя гарыстыя і лясныя і таму вельмі зручныя для знаходжання партызан. Самі Руткавічы размешчаны ў нізіне. Дружына Шышэі ішла першай. Падыйшоўшы да Руткавіч, Кастусь прыкмеціў, што ў вёсцы спакойна і ўсё гатова, каб адзначыць 1 травеня як савецкае свята, былі нават развешаныя партрэты членаў палітбюро ВКБ. Вытрымліваючы адлегласць адзін ад другога ў 30-35 крокаў, дружына Шышэі ўвайшла ў вёску, асцярожна прайшла яе, пасля чаго некалькі эскадронаўцаў зноў вярнуліся ў вёску і пачалі ламаць транспаранты. Убачыўшы гэта, з некаторых хатаў павыходзілі людзі, якія папярэдзілі эскадронаўцаў, што побач вельмі шмат партызанаў. Дарэчы, гэткі ўчынак жыхароў Руткавіч яскрава сведчыць аб тым, што нават у сваіх зонах партызаны не мелі агульнай падтрымкі мясцовага насельніцтва. А тым часам Кастусь Шышэя і Валодзя Нагулевіч, якія схаваўшы сваіх коней, увесь час наглядалі за дарогай на Забалоцце, заўважылі двух конных партызан. Партызаны ехалі з вінтоўкамі за плячыма, нічога не падазраючы. Падпусціўшы коннікаў бліжэй, Шышэя выйшаў на дарогу. Убачыўшы рагулёўцаў (аб прыналежнасці да Першага Беларускага эскадрона выдавалі адзнакі на вопратцы), партызаны хутка павярнулі назад. І праз некаторы час з боку Забалоцця ў абыход Руткавіч выйшаў цэлы конны атрад партызанаў, у якіх на ўзбраенні былі і кулямёты і артылерыя. Шышэі патрэбна было хутка папярэдзіць сваіх, але партызан прыкмецілі і іншыя дружыны эскадронаўцаў і далі аб гэтым ведаць Рагулі. Рагуля даў знаць аб адыходзе, бо сілы былі няроўныя.

Калі дружына Шышэі таксама пачала адыходзіць, дарогу ёй перарэзалі партызаны. З коней прыйшлося сысці і ўзяць павады ў рукі. Але стральба з рова па дружыне не спынялася. Таму ў роў кінулі некалькі гранат, пасля чаго там усё заціхла. Прайшоўшы яшчэ некалькі крокаў, у роў прыйшлося спусціцца і самім, каб укрыцца ў ім і дабрацца да дарогі. Дайшоўшы да ракі, Шышэя прыкрыў аўтаматным агнём сваіх, а пасля па рацэ выбраўся з-пад агню і сам. Дабегшы да Карэліч, зайшоў у хату да аднаго са сваіх эскадронаўцаў Колі Друцка, дзе і выкруціў ад

вады сваё адзенне. А тым часам у завязаўшымся баі аднаму эскадронаўцу параніла нагу, каню Рагулі куля трапіла ў лапатку, партызаны забралі кухню, а разам у палон і чатырох эскадронаўцаў. Праўда, у час самога бою Рагуля зарыентаваўся і не даў партызанам перарэзаць дарогу, эскадронаўцы адступалі больш-менш арганізавана. Але, не даходзячы да Карэліч, партызаны маглі б замкнуць кола і нанесці эскадронаўцам вялікія страты, калі не знішчыць або забраць усіх у палон. Гэтага не здарылася толькі таму, што падыходзячых да Карэліч партызанаў прыкмеціла карэліцкая паліцыя і завязала з імі бой. Менавіта яна, маючы вялікую колькасць людзей і добрую зброю, і выратавала эскадронаўцаў ад бяды.

Для эскадронаўцаў і самога Рагулі гэта стала вялікай навукай, што ў час вайны вельмі дрэнным арыентырам з`яўляюцца эмоцыі і занадта лішняя смеласць. Эскадронаўцаў было толькі 93 чалавекі, а партызанаў, якіх яны хацелі папалохаць, знаходзілася ў навакольных з Руткавічамі і Забалоццем лясах у некалькі разоў больш. Адмоўна сказалася на дзеяннях эскадронаўцаў і іх камандаванне, недастатковая ваенная падрыхтоўка, адсутнасць вопыту вядзення бою, чаго нельга сказаць аб партызанах-“міцькаўцах”, многія з якіх былі былымі чырвонаармейцамі, трапіўшымі ў акружэнне і пайшоўшымі ў лес.

Сабраўшыся ў Карэлічах, эскадронаўцы накіраваліся на Нягневічы, дзе і заначавалі. На заўтрашні дзень -1 травеня - паснедаўшы, эскадронаўцы рушылі ў Навагрудак. А гэтым часам у горадзе ўжо пайшла чутка, што рагулёўцы разбітыя, а сам Барыс Рагуля і яшчэ многія ўзяты ў палон. У сувязі з гэтым было шмат перажыванняў і нават слёз, бо ў многіх эскадронаўцаў у Навагрудку жылі бацькі, іншыя сваякі, некаторыя з хлопцаў мелі нявестаў. І таму, калі эскадронаўцы з песнямі ўвайшлі ў горад, перажыванні і слёзы змяніліся на вялікую радасць, моцныя шчырыя абдымкі і пацалункі. У Навагрудку 1 травеня адзначалася як дзень вясны. У апоўдзень на Замкавай гары сабралася ўся акружная і павятовая адміністрацыя, семінарысты, школьнікі, многа гараджанаў. Таму прыезд у гэты час эскадронаўцаў дапоўніў свята асаблівымі радасцямі і эмоцыямі многіх прысутных. Ім была выказана сапраўдная любоў як да вельмі блізкіх людзей. Пасля

арганізаваных святочных мерапрыемстваў усіх хлопцаў разабралі па кватэрах родныя і знаёмыя. Не застаўся без увагі і Косця.

А на фронце тым часам складвалася сітуацыя не на карысць немцаў. Убачыўшы гэта, яны пачалі “хапацца за саломінку”. Калі раней паводзілі сябе ўпэўнена і адносіліся да палонных і мясцовага насельніцтва толькі як заваёўнікі, дык, пачынаючы з паловы 1943 года, а тым больш у 1944 годзе яны пачалі вербаваць на службу ўсіх. Вось і на тэрыторыі Лепельшчыны немцы даручылі былому падпалкоўніку чырвонай арміі Уладзіміру Гілю-Радзівонаву арганізаваць з палонных вайсковае фармаванне Рускай Нацыянальнай народнай арміі. У названую армію агітавалі і мясцовае насельніцтва, некаторых хлопцаў і забралі. Але ўсё ў рэшце рэшт, як і трэба было чакаць ужо ў той час, скончылася тым, што, атрымаўшы ад немцаў зброю, Гіль-Радзівонаў са сваім фармаваннем падняў паўстанне супраць нямецкіх акупантаў. Яго вайскоўцы перайшлі на бок партызанаў, для барацьбы з якімі фармаванне было створана. Такі крок Гіля-Радзівонава і яго падначаленых яшчэ больш узмацніў партызанаў, якія і да гэтага на Лепельшчыне не давалі немцам супакою. І каб неяк у тым раёне партызанаў падавіць, немцы вырашылі прыцягнуць на дапамогу Першы Беларускі эскадрон. З гэтай мэтаю эскадрон папоўнілі зброяй і накіравалі ў Наваельню. Там эскадрон пагрузіўся ў чыгуначныя вагоны і праз пэўны час быў на станцыі Парафіянава. Але па дарозе эскадронаўцы ўжо бачылі жудасную карціну: ляжалі непахаваныя трупы людзей, многа забітых коней, разбітых машын, дыміліся пажары. Усё сведчыла аб тым, што тут нядаўна ішлі баі. Выгрузіўшыся з вагонаў, эскадронаўцы накіраваліся праз Докшыцы на раку Поню, на беразе якой пачалі рыць акопы і рыхтавацца да абароны. За ракою пачынаўся цёмны лес, які, безумоўна, быў напоўнены партызанамі. Праз некаторы час Рагуля загадаў Шышэі ўстанавіць сувязь з нямецкім штабам, які знаходзіўся прыкладна ў 15 кіламетрах ад таго месца, дзе рагулёўцы акапаліся. Патрэбна было ісці толькі лесам, бо ўсе дарогі былі замініраваныя. Коней вялі за павады ў руках. Прайшоўшы пэўную адлегласць, убачылі нейкія кучы яловых лапаў. Здалёк цяжка было зразумець, што пад гэтымі кучамі схавана, а, мабыць, у іх навогул, заляглі партызаны. Таму, пакінуўшы коней у лесе, сталі асцярожна набліжацца да

ўбачаных кучаў. Падыйшоўшы да кучаў, заўважылі, што пад імі ў скрынях і бочках схавана зерне і многа іншых прадуктаў. І што здзівіла эскадронаўцаў, дык гэта тое, што пасярэдзіне кучаў стаяў хлопец гадоў 16, які на пытанні хто ён і што тут робіць, адказаў: завуць яго Мішам, і тут яго пакінулі партызаны, якія абяцалі хлопцу хутка вярнуцца і забраць. Убачыўшы ўзброеных людзей, Міша папрасіў, каб яны яго не пакідалі ў лесе, а ўзялі з сабою. Але ідучы на спецзаданне, эскадронаўцы не маглі гэтага зрабіць. Таму прыйшлося таксама сказаць хлопцу, каб пачакаў, калі яны будуць ісці назад. Прайшоўшы яшчэ некалькі кіламетраў, Шышэю з яго дружынаю спынілі немцы, штаб якіх і знаходзіўся ў бліжэйшай вёсцы Несцеравічы. У вёсцы Шышэя перадаў канверт ад Рагулі старшаму начальніку, крыху паразмаўляў з мясцовымі жыхарамі, якім распавядаў аб беларускім войску і яго задачах. За гэты час нямецкі камандзір напісаў свой ліст, паклаў яго ў канверт і папрасіў эскадронаўцаў перадаць камандаванню Латышскага гарнізона, што размяшчаўся побач пазіцыі рагулёўцаў.

Прабіраючыся лесам назад, зноў спаткалі Мішу, давялі яго да бліжэйшай вёскі Янковічы і там пакінулі. Зайшоўшы ў вёску, знайшлі Солтыса, паведамілі яму аб сваёй прадуктовай знаходцы і прапанавалі забраць зерне і іншыя прадукты ды раздаць мясцовым жыхарам.

Але зноў-такі на дзіва эскадронаўцаў на заўтрашні дзень Міша прыйшоў да іх і стаў прасіць забраць яго з сабою. Рагуля вырашыў задаволіць просьбу хлопца. Так у Першым Беларускім эскадроне з`явіўся свой “сын палка”, праўда, ужо ўмеўшы трымаць у руках зброю. А тым часам станавілася ўсё больш ясным, што фронт з кожным днём набліжаўся да гэтых мясцінаў. Зведаўшы ў верасні 1939 года, што нясуць з сабой бальшавікі, Кастусь падумаў аб маці і сястры і напісаў ім з Лепельшчыны пісьмо, у якім параіў запрагаць каня ды падавацца, пакуль жывыя, на захад. І эскадронаўцам стаяць далей на гэтым месцы не было ніякага сэнсу. Дарэчы тут знаходзіўся не толькі Першы Беларускі эскадрон, але і батальён з Баранавічаў пад камандаваннем капітана Ўсевалада Родзькі, які родам, як і капітан Барыс Рагуля, быў з Наваградчыны - вёскі Вераскава. Атрымаўшы каманду, эскадронаўцы пагрузіліся на той жа станцыі Парафіянава і вярнуліся ў Наваельню, а пасля і ў Наваградак.

Прыехаўшы ў Навагрaдак, эскадронаўцы ўбачылі, што іх казарму абрабавалі казакі. Кастусь Шышэя спаткаў тут маці і сястру Ганну, якія ўжо два дні чакалі яго каля казармы. Ён параіў ім хутчэй уцякаць на захад. Пры гэтым Кастусь і ім нагадаў аб жахлівай восені 1939 года. І пасля кароткай размовы маці і сястра рушылі ў дарогу на Ліду. Больш іх Косця ніколі не бачыў. Але тады яны заехалі на кані аж у Нямеччыну, адкуль іх брат Саша забраў у Англію.

А Рагуля пасля вяртання з-пад Докшыцаў сабраў увесь эскадрон на Замкавай гары і заявіў: “Хто не баіцца бальшавікоў, можа заставацца, а хто згодзен і далей змагацца за вольную Бацькаўшчыну, паедзем са мною”. У Шышэі выбару не было - ён яго ўжо даўно зрабіў.

6 ліпеня 1944 года рагулёўцы пакінулі Навагрaдак: Барыс Рагуля, яго дзядзька, цяпер ужо былы стараста Дзятлаўскага павету Васіль Рагуля і будучая жонка Люда Гутар на машыне, а астатнія на конях - чалавек 150-200. Дамовіліся сабрацца за Лідай на рацэ Дзітва для прыняцця рашэння, як рухацца далей. Але толькі эскадронаўцы падыйшлі ў Агароднікі і прыпыніліся на начлег , як наляцелі самалёты і, асвяціўшы зямлю, пачалі бамбіць. Тая ноч для многіх стала выпрабаваннем, пасля якога частка эскадронаўцаў уцякла разам з коньмі. Ну а застаўшыеся чалавек сто працягвалі маршрут. Сярод іх, безумоўна, быў і Кастусь Шышэя. Даехаўшы да Дзітвы, зрабілі перапынак. Сюды з`явіўся і Рагуля, пакінуўшы машыну ў кювеце. Дарэчы, па дарозе ён падабраў у машыну яшчэ і Міколу Рулінскага. Пасля кароткага перапынку вырашылі ехаць далей і спаткацца ўжо ў Гародні каля царквы Архірэя. Шышэя і яшчэ тры эскадронаўцы паехалі першымі. Рагуля застаўся, дачакаўся ўсіх астатніх і скіраваў апошніх на Ломжу. Прыехаўшую ў Гародню групу эскадронаўцаў, як і дамаўляліся, спаткаў Рагуля, даў ім хлеба, кавалак сала і параіў пераначаваць недалёка ад горада ў полі. У 11 гадзін раніцы наступнага дня ўсе зноў спаткаліся ў дамоўленым месцы. Пасля гэтага здалі сваіх коней і селі на грузавую машыну, шафёрам на якой быў Чэслаў Трухан. На ёй знаходзіўся і снабжэнец прадуктамі Кастусь Мярляк. Павячэраўшы ў сталовай і пераначаваўшы на гэты раз у нейкім інтэрнаце, раніцай пайшлі ў горад. Там убачылі, як разрабоўваюць тытунёвую фабрыку, пры гэтым і самі прыхапілі некалькі пачкаў цыгарэт.

Прабыўшы ў Гародні два дні, усе, што сабраліся (каля 12 хлопцаў і 4 дзяўчыны), рушылі далей, дамовіўшыся аб наступнай сустрэчы ў Беластоку. У Беластоку зноў з`явіўся Рагуля, аб усім паклапаціўся і праз два дні загадаў ехаць у Варшаву і спаткацца там у Беларускім нацыянальным камітэце на вуліцы Свентаерскай. У памяшканні Беларускага нацыянальнага камітэту іх спаткаў сам загадчык названай установы Мікалай Шчорс, які зноў-такі родам паходзіў з Наваградчыны - вёскі Сялец. Гэта быў чалавек дастаткова прыветлівы і адукаваны: ён скончыў Віленскі універсітэт. Ён арганізаваў для прыехаўшых сталовую і памяшканне для начлегу. У Варшаве эскадронаўцы прабылі дзён дзесяць, а 1 жніўня Рагуля загадаў ехаць далей у Дальвіц, але зноў-такі па добрай волі. Таму тут група падзялілася: некаторыя накіраваліся ў Прагу з надзеяй паступіць там на вучобу. Але, як і трэба было чакаць, мары іх не здзейсніліся - ішла вайна і праз некаторы час яны таксама прыехалі ў Дальвіц. Другая група, у якой быў і Кастусь Шышэя, паехала ў Дальвіц адразу з Варшавы. Калі ад`ехалі ад горада некалькі кіламетраў, убачылі, што Варшава пылае ў агні. У ёй пачалося вядомае паўстанне супраць немцаў, своечасова не падтрыманае знешнімі сіламі, а таму скончыўшаеся трагічна для паўстанцаў, ды і горад амаль увесь згарэў.

* * *

У Дальвіц прыехала каля 20 чалавек рагулёўцаў і многа беларусаў з іншых месцаў. Сам Дальвіц - гэта звычайная вёска Ўсходняй Прусіі, у якую ўваходзіла некалькі дзесяткаў хутароў. Вось тут і размяшчаўся лагер па падрыхтоўцы дэсанту. Тут стаяла некалькі баракаў, у якіх і размясціліся прыехаўшыя беларусы. Прыехаў сюды і Рагуля. Шышэю ён прызначыў старшыною. Менавіта на яго лёг увесь цяжар па матэрыяльнаму забеспячэнню будучых дэсантнікаў. Начальнікам лагеру быў нямецкі маёр Геруліс. Загадчыкам складу, з якім і прыходзілася Шышэю ўвесь час мець справу, таксама быў немец па прозвішчу Вульф. Рагуля камандаваў толькі сваімі былымі эскадронаўцамі. Праз тыдняў два ў Дальвіц з`явіўся і Ўсевалад Родзька са сваёй групай людзей да 30 чалавек. Прыехаў у Дальвіц і маёр Міхась Вітушка, а таксама маёр медыцынскай службы Глеб Багдановіч. Затое Кастусь Мярляк і Юрка Мазура

з`ехалі з Дальвіца, сказаўшы пры гэтым, што яны ваяваць за немцаў не збіраюцца.

Галоўным выкладчыкам пры падрыхтоўцы дэсанту быў маёр Энгельгард. Тактычныя заняткі вёў Барыс Рагуля. Падрыхтоўкай былі ахоплены ўсе, у тым ліку і дзяўчаты, якія вывучалі азбуку Морзе і рыхтаваліся стаць радысткамі. З імі азбуку Морзе вывучаў і Лявон Луцкевіч, бо іншыя функцыі, акрамя радыста, ён па стану здароўя (меў дрэнны зрок) выконваць не мог. Родзька паводзіў сябе ў Дальвіцы падкрэслена ганарыста, пры гэтым чамусьці гледзячы ўвесь час у зямлю, наконт чаго Васіль Рагуля, які таксама застаўся ў Дальвіцы, зазначыў, што калі чалавек глядзіць у зямлю, ад яго дабра чакаць нельга.

Але, нягледзячы на вайну і ўсе цяжкасці, якія прыходзілася перажываць у той час людзям, жыццё працягвалася: людзі не толькі пакутавалі і гінулі, але спрабавалі нават весяліцца, кахалі, жаніліся, былі і гэткія, што ў каханні здраджвалі. Не выключэннем быў і Дальвіц. Напрыклад, Барыс Рагуля з Людай Гутар, а Філіп Давідчык з Верай Краскоўскай менавіта ў Дальвіцы вырашылі ўступіць у шлюб. А паколькі блізка праваслаўнай царквы не было, дык вянчацца яны паехалі аж у Данцыг (Гданьск). У той час у іншай пары, якая таксама ехала з Наваградка як жаніх і нявеста, справа да шлюбу не дайшла. Дзяўчына, калі ўбачыла ў Дальвіцы на яе думку, больш прыгожых і спрытных хлопцаў, дык узяла і адмовіла свайму кавалеру, пасля чаго ён спрабаваў пакончыць жыццё самагубствам. Але, дзякаваць Богу, у гэты час надыйшлі сябры і ўгаварылі хлопца перастаць здзяйсняць над сабою злачынства.

У час прэбывання ў Дальвіцы стала вядома, што недалёка выкінуты дэсант савецкіх войскаў. Паступіла каманда аб неабходнасці прачэсвання лесу. У лесе нельга было не звярнуць увагі на той нямецкі парадак, які можна было бачыць і на прыкладзе хутароў у Дальвіцы, а цяпер і на прыкладзе лесу. Лес быў увесь пабіты на просекі, якія яго падзялялі на асобныя кавалкі памерам 1000 на 400 метраў, лясныя дарогі былі ўкладзены драўлянымі чуркамі. У лесе расло многа маліны.

У гэткі адказны момант, калі ў любы час цябе можа спаткаць бяда, у кожнага чалавека нервы становяцца напружанымі, а дзеянні часам непрадказальнымі. Вось і тады, прыкмеціўшы ў маліне нешта рухомае, Валодзя Нагулевіч выпусціў у той бок кулямётную чаргу. На шчасце нікога не забіў, але там у маліне

быў немец, які таксама ўдзельнічаў у аперацыі і трэба адзначыць, што ён не стаў з Нагулевічам зводзіць рахункі, а прызнаўся, што сам вінаваты ў здарыўшымся. Адзначыўся там сваёй ганарыстасцю і Ўсевалад Родзька, які спрабаваў узысці на прастрэльваемы кавалак лесу. І калі яго Шышэя папярэдзіў, што там могуць застрэліць, прыняўшы за савецкага дэсантніка, ён абвінаваціў Кастуся ў баязлівасці.

Аперацыя па вылоўліванню савецкага дэсанта працягвалася каля трох сутак, але злавіць дэсантнікаў жывымі не ўдалося. За ўвесь час змаглі знайсці ў дарожнай трубе толькі скінутую радыстку Валю, якая паведаміла, што з ёю быў яшчэ і маёр, які сам застрэліўся, а астатніх, маўляў, у час прачэсвання лесу забілі. Усё гаварыла за тое, што Валя не хлусіла. У час аперацыі смяротна паранілі і аднаго дальвіцкага дэсантніка. Гэта быў зусім малады хлопец, таму яго смерць сябры ўспрынялі яшчэ з большым болем.

І вось пасля пахавання свайго маладога таварыша да Косці, як да старшыны, падыйшлі некалькі курсантаў і з абурэннем паведамілі, што, маўляў, нас забіваюць, мы амаль галодныя, а немцы ў той самы час сядзяць у сталовай, пякуць яйкі ды аб`ядаюцца, а з імі разам і рускія, якія перайшлі на бок немцаў і сталі з апошнімі супрацоўнічаць. Будучы па прыродзе эмацыйным чалавекам, Шышэя ўспрыняў гэткую навіну як глумленне над тымі, хто, рызыкуючы жыццём, хутка будзе скінуты з парашута для працягу барацьбы. Ён узяў з сабою чатырох чалавек, пайшоў на кухню, забраў там напечаныя яйкі і аднёс у свой барак.

Убачыўшы гэткае свавольства беларускага ваяра, загадчык складу Вульф пабег і даклаў начальніку лагера Гірулісу. Апошні ўвесь зчырванеў ад злосці - Шышэя закрануў яго нямецкае самалюбства. Шышэю выклікалі і Гіруліс пачаў крычаць: “Гэта што яшчэ за мяцеж!”. Але Шышэя стаў даказваць сваё: “Дзе ж тая справядлівасць? Мы сёння пахавалі нашага сябра, а вашы ў той час пякуць яйкі!”. Гіруліс не стаў слухаць ніякага тлумачэння і загадаў зняць рэмень. Аднак Шышэя не супакойваўся. Тады Гіруліс загадаў пасадзіць бунтаўшчыка ў каталажку, на што дэсантнікі адказалі абурэннем. Неадкладна выклікалі Рагулю. Апошні адразу пайшоў да Гіруліса, а пасля прыйшоў і да Шышэі. Кастусь патлумачыў і Рагулі, што ён не дазволіць крыўдзіць сваіх сяброў. Мы, маўляў, ідзём амаль на смерць, а нехта нас

яшчэ і аб`ядае. Рагуля, безумоўна, быў на баку сваіх беларусаў, але гаспадаром з`яўляўся тут не ён.

Праз дзень ноччу Шышэю выклікалі да Гіруліса. Там сядзеў і Рагуля. На зададзеныя яму пытанні Шышэя зноў стаў тлумачыць сваё, задаўшы пры гэтым, у сваю чаргу, пытанне: “Хто мы ёсць?”. Відаць, Гіруліс таксама ўсё разумеў правільна, бо на гэты раз, звярнуўшыся да Шышэі, зусім спакойным голасам сказаў: “Ты нічога не разумееш. Вульф партыйны, а я не. Таму, хаця я і начальнік, але ён мае большы ўплыў на вышэйшае камандаванне, чым я. І калі ў дадзеным выпадку Вульф разгневаўся, я абавязаны быў рэагаваць”. А нарэшце дадаў: “Ты не гневайся”. Пасля размовы Шышэю пакармілі і зноў адвялі ў каталажку, сказаўшы, што патрэбна прабыць там трое сутак. Седзячы пад арыштам, у Шышэі быў час узгадаць, як рабілася і ў Савецкім Саюзе. Калі нехта быў членам Камуністычнай партыі, дык яму дазвалялася вельмі многа, яго без дазволу райкома партыі не маглі арыштаваць нават за самы вялікі праступак. А калі хто быў і на нейкай значнай пасадзе, але з`яўляўся беспартыйным, яму мог даваць загады любы інструктар таго ж райкама партыі. Так, падумаў Шышэя, і ў фашысцкай Германіі: хто належыць да правячай партыі, у таго і ўплыву больш.

А з Вульфам сутычкі ў Шышэі на тых печаных яйках не скончыліся. Скажам, прыязджае ў лагер папаўненне - людзей трэба апрануць, абуць, а Вульф выкіне з гэтай нагоды адзенне, не ўлічваючы пры гэтым ні росту, ні памеру прыехаўшых. Вось тут Шышэя і даходзіць аж да Гіруліса, каб загадчык складу даў магчымасць мераць адзенне і падбіраць яго, улічваючы рост і памеры кожнага чалавека. І Вульф быў вымушаны падпарадкоўвацца патрабаванням Шышэі, хаця і рабіў гэта са злосцю.

Былі ў жыцці лагера ў Дальвіцы і прыемныя дні. Адным з гэткіх дзён стаў прылёт сюды Радаслава Астроўскага, прэзідэнта БЦР. Астроўскі запамятаўся Шышэі як адукаваны чалавек і нядрэнны аратар. У сваёй прамове перад дэсантнікамі ён некалькі разоў падкрэсліваў, што імі ганарыцца. У час прэбывання сваім загадам Астроўскі павысіў у чыне: Філіпа Давідчыка, Мікалая Рулінскага і Юрку Луцкевіча.

Шышэя запамятаў і той дзень, калі іх, блізкіх сяброў, аднойчы сабраў Барыс Рагуля і сказаў, што мы паляцім у Беларусь для

таго, каб весці агітацыю за незалежнасць нашай Бацькаўшчыны. І калі на міжнародных форумах будзе пастаўлена пытанне аб лёсе Беларусі, наш народ павінен выказацца за незалежнасць. А для таго, каб гэта здарылася, патрэбна народ падрыхтаваць. На Беларусь, мабыць, будзе прэтэндаваць не толькі Расея, але і Польшча.

Такім чынам, з тых слоў Рагулі можна было зразумець, што ён і сам збіраўся ляцець у Беларусь. Тым больш, быў нечаканым яго ад`езд з Дальвіца, калі Рагуля нават не развітаўся са сваімі падначаленымі і сябрамі. Яго замяніў Усевалад Родзька, які стаў адзіным начальнікам курса.

Першая група дэсантнікаў у складзе Андрэя Вайтовіча, Караля і двух расейцаў паляцела ў Беларусь у першай палове верасня 1944 года. А ў канцы верасня сталі рыхтаваць для адпраўкі і другую групу. Шышэю аб гэтым паведаміў Гіруліс. Пры гэтым начальнік лагера прапанаваў Кастусю застацца ў Дальвіцы, каб і далей удзельнічаць у якасці старшыны ў падрыхтоўцы наступных груп дэсантнікаў. Але Шышэя адмовіўся ад прапановы. Для адлёту ў складзе другой групы прызначылі 26 хлопцаў і дзве дзяўчыны-радысткі. Камандзірам групы стаў маёр Міхась Вітушка, палітруком - Янка Гінько. У склад групы ўвайшоў і маёр медыцынскай службы Глеб Багдановіч. Адабраных для адпраўкі перавезлі з Дальвіца ў Заходнюю Прусію ў маёнтак Вальбуш. Тут былі таксама вельмі прыгожыя і дагледжаныя мясціны. Вакол маёнтка рос лес, на тэрыторыі самога маёнтка ўсе дарожкі былі абсаджаныя. Недалёка ад маёнтка працаваў завод, сыравінай для якога з`яўляліся цукровыя буракі. Там Шышэя пазнаёміўся з гаспадыняй завода. Аднойчы ў яе бібліятэцы ён знайшоў кнігу генерала Краснова “От двуглавого орла к красному знамени”. Косця папрасіў у гаспадыні пачытаць зацікавіўшую яго кнігу. Просьба была задаволена.

А праз тыдняў тры Вітушка даў загад спаліць усе дакументы і кожнаму падабраць сабе мянушку. Шышэя выбраў - Хмара, мабыць, узгадаўшы, што калісьці яго звалі Арлом. І арлы і хмары параць высока над зямлёю і недасягальны для простых людзей. 17 кастрычніка групу адвезлі машынамі на аэрадром. Перад пасадкай у самалёт кожнаму адзелі парашут, якога да таго часу ніхто не бачыў у вочы, што сведчыла аб недастатковай падрыхтоўцы адлятаўшых. У самалёце шнур

парашута прымацавалі да працягнутага дроту для таго, каб калі чалавек будзе падаць, шнур выцягнуў спачатку малы парашут, а потым і вялікі - асноўны. Пасля раскрыцця асноўнага парашута малы ўцягвалі ў самалёт, мабыць, для справаздачы, колькі людзей скінута на зямлю. І тут у Міколы Рулінскага здарылася недарэчнасць - малы парашут выцягнуўся яшчэ ў самалёце, таму ён застаўся ў самалёце і вярнуўся назад. Такім чынам, у Беларусі выкінулі ў той раз 27 дэсантнікаў.

Калі ляцелі над тэрыторыяй, ужо занятай савецкімі войскамі, самалёт пачалі абстрэльваць з зянітак. І, каб паспяхова прадоўжыць палёт, лётчык падняў машыну высока за хмары. З гэткай вышыні і скідалі дэсантнікаў. Таму, калі Кастусь выскачыў з самалёта, ён пэўны час бачыў унізе толькі хмары. Але праляцеўшы іх, сталі бачны і агні, спусціўшыся яшчэ ніжэй - паказалася родная беларуская зямля. На жаль, парашут завіс на дрэве, пасля чаго з дапамогай нажа Кастусь змог саскочыць уніз, пакінуўшы парашут вісячым на дрэве. Адчэпліваць яго з дрэва не было часу, патрэбна было хутка ўцякаць, бо месца, дзе ён прызямляўся, усё асвятлялася пражэктарамі. Балазе побач быў лес, у які Косця і ўцёк. Першага, каго ён напаткаў, быў Янка Гінько, які працягваў вісець на дрэве, бо і яго парашут павіс. Кастусь дапамог сябру спусціцца на зямлю, пасля чаго яны пачалі шукаць іншых. Праз некаторы час спаткалі Васю Конюха і Сашу Мацука, пасля - Філіпа Давідчыка з жонкай Верай. Прыйшоў да іх і Міша Бычок, той самы хлопец, якога яны знайшлі ў лесе каля Докшыц. Знайшліся яшчэ Шляхтун і Федаровіч. Група стала з дзевяці чалавек. Больш нікога не спаткалі.

Крыху аглянуўшыся, патрэбна было нешта хутка вырашаць, бо было бачна, што скінулі іх зусім не ў тым месцы, дзе планавалася. Ім належала спусціцца ў раёне возера Кромань у знаёмых для многіх мясцінах. А прызямліліся яны непадалёку ад мястэчка Воранава. Ды і застаўшыеся на дрэвах парашуты былі арыентырам для існаваўшай на зямлі ўлады, якая, знайшоўшы іх, не магла не здагадацца, што недзе побач хаваюцца дэсантнікі. Гэта таксама патрабавала хутчэй пакінуць дадзенае месца.

Вырашылі ісці лесам, каб напаткаць нейкі хутар ці вёску. І прайшоўшы пэўную адлегласць, пачулі брэх сабакаў, што сведчыла аб блізасці жылля. Таму далей не пайшлі, а наламалі

яловых лапак і селі адпачываць да раніцы. Раніцай заўважылі, што месца для адпачынку было някепскім - адносна далёка ад дарогі. Але трэба было здабыць недзе ежы, бо ў іх былі толькі савецкія грошы. Аднак днём ісці не рашаліся, сталі чакаць да вечара.

Вечарам, з пачаткам цемнаты, Шышэя прапанаваў ісці ў бок, дзе брэшуць сабакі, але не ўсім, каб не згубіць абранага для адпачынку месца. Ды ісці ўсім было і небяспечна, тым больш, што мясцовасці ніхто не ведаў. Пайшлі Шышэя, Конюх і Мацук. Але ў вёску зайшоў толькі Шышэя, а двое засталіся чакаць. Са зброі ў Шышэі быў ППС і нож, быў яшчэ і фанарык. Не даходзячы да самой вёскі, Шышэя заўважыў воддаль стаяўшую хатку. Ён прыпыніўся і стаў уважліва сачыць, каб убачыць кагосьці жывога. На яго шчасце ў двор выйшла бабуля. Калі яна накіравалася з двара ў хлеў, Шышэя вырашыў наблізіцца да хаты. Убачыўшы бабулю, ён прывітаўся з ёю па-польску: “Нех бэндзе пахвалёны Езус Хрыстус!”, на што бабуля адказала: “На векі вякоў!”. Пры размове з незнаёмай кабетай Шышэя выдаў сябе за ўцекача з савецкага войска, дарэчы, якіх у тых краях хадзіла па лесе нямала. Ды апрануты дэсантнікі былі сапраўды ў вайсковую форму, толькі без пагонаў, якія да таго часу ўжо паявіліся ў Чырвонай Арміі.

Жанчына спытала, ці адзін ён, на што Шышэя адказаў, што адзін. Бабуля таксама жыла адна, таму, мабыць, не вельмі смела сябе і адчувала. Але ў хату незнаёмца запрасіла і нават прапанавала павячэраць. Кастусь для прылікі стаў адмаўляцца. Але бабуля разумела, што хлопца трэба пакарміць. А тым часам Кастусь пачаў расказваць, чаму ён не хоча служыць савецкай уладзе, а пасля папрасіў і даць яму нешта з сабою. А для гэтага вымушаны быў прызнацца і ў тым, што ён у лесе не адзін. Бабуля задаволіла просьбу “ўцекача з савецкага войска” і паведаміла, што іх вёска завецца Лаўрынкі і знаходзіцца непадалёку з аднаго боку ад Воранава, а з другога - Юрацішак. Пры развітанні Шышэя прапанаваў бабулі грошы і папрасіў яе купіць якіх-небудзь харчоў. А яшчэ ў бабулі ён пацікавіўся, ці можна знайсці паблізу нейкіх партызанаў.

Апошняе пытанне бабулі, відаць, спадабалася. Няхай сабе і за кароткі час размовы, але яна адчула і дабрадушнасць незнаёмца. Таму дала Шышэі сала, хлеба, цыбулі і нават наліла крыху гарэлкі. Дамовіліся сустрэцца ў наступны вечар.

Падзякаваўшы, Кастусь развітаўся з бабуляй і разам з чакаўшымі яго сябрамі пайшоў у сваё лясное логава. Аб усім даклаў сваім, пасля чаго разгарнулі карту і ўбачылі, што іх Кромань знаходзіцца ад тых месцаў за паўтары сотні кіламетраў. А пажыткі хлопцы падзялілі і выкарыстаўшы іх, крыху перавялі голад. Пасля скінуліся грашыма, каб заўтра Кастусь прынёс больш.

На наступны вечар Шышэя зноў быў цяпер ужо нібыта ў знаёмай бабулі. Бабуля нагрэла кіпятку, дала дужы кавалак сала, цыбулі, круглы бохан хлеба і наліла літр гарэлкі. Але ў гэты час нечакана для Кастуся з-за печкі выйшла “мадам” - гадоў 40-45 у гарадскім адзенні. Кастуся гэта насцярожыла. Аднак “мадам”, прывітаўшыся па-польску, у хлопца запытала, хто ён. Кастусь запытаў насустрач, а хто будзе пані. І тут “мадам” без нейкіх асаблівых падыходаў сказала: “Я магу вас пазнаёміць з партызанамі”. Шышэя падзякаваў. Але “мадам” сказала, што яна хацела б пабачыць камандзіра, бо ты ж, маўляў, не адзін, калі набіраеш столькі ежы.

Шышэя хацеў выдаць сябе за камандзіра, каб даведацца ад “мадам” нешта яшчэ, але пані, відаць, была вопытнай у “партызанскіх справах” і сказала: “Не, ты разведчык. Ты на камандзіра замалады”. Пасля чаго Шышэя адказаў: “Ну, калі патрэбны старэйшы, дык мы знойдзем і старэйшага”. “Вось давай заўтра вечарам і вядзі яго”, - прапанавала “мадам”. На тым і развіталіся. Такім чынам, на думку Шышэі, пакуль што ўсё ішло нядрэнна. Хлопцы пакрысе выпілі, добра закусілі. Але, калі Шышэя распавядаў аб дамоўленасці з незнаёмай жанчынай, Гінько сказаў: “Гэта ўжо канец. Бо колькіх нашых польскія партызаны забілі”. Пасля гэткага выказвання палітрука здавалася стала яшчэ больш холадна: пачыналіся замаразкі. Ды і лес стаў здавацца больш цёмным і хмурым. Аднак іншага выйсця не было. Разумеў гэта і Гінько, таму, крыху падумаўшы, махнуў рукою і сваёй любімай прыказкай падвёў у размове рысу: “Чаму быць, таму не мінаваць”. Пасля гэтага звярнуўся да сваіх сяброў і дабавіў: “Калі мы не вернемся, вы ўцякайце, куды вочы глядзяць”.

У чарговы вечар да бабулі ў хату пайшлі ўжо ўдвух: Шышэя і Гінько, безумоўна, паставіўшы паблізу хаты варту, але зноў-такі больш для таго, каб не заблудзіць, калі выйдуць назад з хаты. Праўда, адразу і Гінько ў хату не ўваходзіў. Ды і ў Шышэі

таксама не выходзілі думкі з галавы: “А калі “мадам” падаслана бальшавікамі?”. Аднак ісці ў хату было патрэбна. І Кастусь пайшоў. Зайшоўшы, папрасіў у бабулі кіпятку, але ўжо на дваіх, чым даў ведаць, што ён не адзін. Пачуўшы гэта, з-за печкі выйшла “мадам” і адразу запытала: “А дзе ж другі?”.

Шышэя паклікаў Гінько, які таксама прывітаўся з кабетамі па-польску. Адказаўшы на прывітанне, “мадам” сказала: “Вось гэта камандзір: у акулярах, высокі, больш пажылы”. Далей “мадам” прадоўжыла: “Вы ж доўга не затрымлівайцесь са сваім кіпятком, бо вас ужо чакаюць”. Кастусь даў гаспадыні яшчэ 200 рублёў і папрасіў, каб зноў купіла харчоў і на гэтым выйшлі з хаты. Ішлі доўга, таму думкі лезлі ў галаву адна за другою. Але трэба было ісці.

Выйшаўшы на паляну, “мадам” загадала чакаць, а сама пайшла ў лес. Агляўнуўшыся вакол, Шышэя прыкмеціў, што побач з імі з усіх бакоў кусты шавеляцца. Гэта сведчыла аб тым, што ў іх сядзяць людзі. На душы стала яшчэ больш неспакойна і Шышэя шэптам паведаміў Гінько: “Мы акружаны”. На што апошні адказаў усё той жа прыказкай: “Чаму быць, таму не мінаваць”.

Праз доўгі час (а можа гэта падалося ад чакання нечага невядомага) з`явіўся польскі афіцэр і падыйшоў да Шышэі і Гінько. Па пагонах афіцэра было бачна, што ён з`яўляўся капітанам. Прывітаўшыся, капітан запытаў: “Дзе вы, хлопцы, блудзіце?”. Адказаў Шышэя: “Мы рады з вамі спаткацца”. Пасля гэтага капітан працягнуў задаваць пытанні: “У чым справа? Чаго вы хацелі б ад нас?”.

У размову ўступіў Гінько і выклаў усё па парадку. Больш таго, ён сказаў, што мы чакаем яшчэ больш сваіх таварышаў і просім нам дапамагчы, бо нам мясцовасць зусім незнаёмая. А нам, маўляў, патрэбна выйсці ў Налібоцкую пушчу. Таму мы праз два тыдні пакінем гэтыя месцы.

Уважліва выслухаўшы, капітан цвёрдым і дастаткова моцным голасам сказаў: “Паклікаць вэнжа! (важака)”. Праз некалькі хвілін з кустоў выйшаў сярэдняга росту, у вясковай вопратцы, гадоў на 50, рыжы дзядзька. Капітан, звярнуўшыся да выйшаўшага, даў загад: “Памоч жаўнерам ва ўсім, што запросяць!”. І далей вэнжу сказаў трымаць з шукаўшымі дапамогі сувязь. На гэтым капітан развітаўся, а партызанскі важак паклікаў з кустоў сваіх (іх было чалавек 20) і ўсе

накіраваліся ў тую ж самую вёску Лаўрынкі.

Ідучы па дарозе, вэнж стаў дэталёва дапытвацца, хто яны. Адказваў на пытанні галоўным чынам Шышэя і першае, аб чым патлумачыў Кастусь вэнжу было тое, што яны беларускія жаўнеры і скінуты сюды як дэсантнікі. Гэткае паведамленне Шышэі ўразіла вэнжа і таму ён задаў яшчэ адно пытанне: "А што вы думаеце - тут будзе нейкая Беларусь? Тут жа была Польшча". Але ў Шышэі на зададзенае пытанне быў адказ гатовы, таксама ў выглядзе пытання: "А якія людзі жывуць на гэтай тэрыторыі? Яны гавораць па-польску ці па-тутэйшаму, па-беларуску? У наступны раз аб гісторыі Беларусі я раскажу табе больш дэталёва. А пакуль што ты дапамажы нам".

Гінько ўвесь час маўчаў і адчуваў сябе неяк падаўлена. Мабыць, як старэйшы па гадах, дастаткова адукаваны (ён скончыў Віленскі універсітэт) і больш вопытны, Гінько разумеў тую сітуацыю, у якой яны апынуліся і ўсю тую небяспеку, якая іх чакала наперадзе. Ды, мабыць, зноў-такі і адчуваў, што з іх старанняў мала што атрымаецца і ўсе пакуты будуць дарэмнымі.

Калі прыйшлі ў вёску, Шышэя папрасіў у вэнжа абагрэць людзей, на што апошні адказаў прапанавай прыйсці заўтра з людзьмі ў Лаўрынкі і сустрэцца на выгане.

Прыйшоўшы да сваіх і крыху адпачыўшы, загаварыў і Гінько. У прыватнасці, ён унёс прапанову падзяліцца на дзве часткі, каб адна з іх пайшла ў Налібоцкую пушчу. У Гінько было ўсё яшчэ нейкае спадзяванне, што там можна знайсці Вайтовіча з яго групай, якая паляцела на некалькі дзён раней і таксама павінна была дэсантавацца ў раёне Налібоцкай пушчы. І калі гэткая сустрэча адбудзецца, дык нехта павінен вярнуцца назад і паведаміць бабулі. Прычым, для канспірацыі, да бабулі павінна зайсці жанчына і сказаць пароль: "Чы пані мае на пшэдаж прасякі?" (Ці мае пані на продаж парасят?), а бабуля, у сваю чаргу, павінна адказаць: "Я не мам, але зараз запытам у санседа". (У мяне няма, але я зараз запытаю ў суседа). Далей Гінько сказаў, што Кастусь Шышэя павінен застацца на месцы, бо ён мае кантакт з бабуляй і некаторымі іншымі мясцовымі людзьмі. Сябе ён таксама прызначыў у групу, якая застанецца пакуль што на месцы. На месцы пажадалі застацца яшчэ Мацук і Конюх, астатнія 5 чалавек на чале з лейтэнантам Давідчыкам павінны былі ісці ў пушчу.

А пакуль што на заўтрашні дзень усе 9 чалавек пайшлі да мясцовага партызанскага важака. Па дарозе Шышэя паказаў тую хату, дзе жыла бабуля і куды патрэбна будзе зайсці жанчыне з паведамленнем аб сітуацыі ў Налібоцкай пушчы. Прыйшоўшы ў Лаўрынкі, на выгане спаткаліся з вэнжам. Па прапанове апошняга зайшлі ў адну з хатаў. Прычым з важаком было яшчэ чалавек восем яго людзей, якія таксама зайшлі ў хату. Праўда, два беларусы і чатыры мясцовыя партызаны засталіся ў двары для аховы. У хату сабраліся і мясцовыя дзяўчаты. У Лаўрынках моладзь збіралася па чарзе: сёння ў адну хату, заўтра ў другую і гэтак далей. Безумоўна, за дадзенай чаргой сачылі мясцовыя партызаны і яны ведалі заранёй, у які вечар у якую хату ісці. Гаспадыня хаты таксама падрыхтавала заранёў вячэру. З печы злез і дзед. А калі выпілі па чарцы гарэлкі, дык і запелі. Пелі галоўным чынам польскія песні, хаця размаўлялі паміж сабою па-тутэйшаму. Гінько і Шышэя польскую мову ведалі, таму апошні актыўна ўключыўся ў спевы, тым больш, што Бог яго не абдзяліў і прыгожым голасам. Польскіх песень ён таксама ведаў нямала. Праз некаторы час замянілі варту, пасля чаго вечарынку працягнулі далей. Разышліся позна. Астатнюю частку ночы беларускія жаўнеры правялі ў чыімсьці гумне, якое ім паказалі таксама мясцовыя партызаны. Там жа перасядзелі і дзень, папярэдне аб гэтым даклаўшы гаспадару. Гэта зноў-такі зрабіў Шышэя.

Прычыкаўшы вечара, Гінько, Шышэя, Конюх і Мацук правялі сваіх таварышаў у дарогу, пажадаўшы ім поспехаў. І пасля таго Кастусь Шышэя іх больш не бачыў. Прыйшлося ўбачыць у Гомелі толькі Веру Краскоўскую і тое мелькам. Спаткаўся ён і з Мішам Бычком, але таксама толькі на некалькі хвілін.

Давідчык Філіп быў родам з вёскі Галынь, што, як і рагуліны Ачукевічы, знаходзяцца каля самай Любчы. Ён добра ведаў нямецкую мову. Усё гэта і зрабіла яго блізкім чалавекам да Барыса Рагулі, які многа чаго яму давяраў і даручаў. Але вось у дадзенай сітуацыі Давідчык аказаўся не на ўзроўні пастаўленых перад ім задач. Замест таго, каб пайсці з групай у Налібоцкую пушчу, ён з жонкаю скіраваў дамоў. Там яго бацькі Веры не прынялі і яна вымушана была ісці да свайго дому - у вёску Краснае. Мабыць, там яе і арыштавалі. А самога Давідчыка яго ж бацькі здалі органам НКВД. Больш таго, трапіўшы ў НКВД, Давідчык дапамагаў пераправіць учарашніх сваіх сяброў. Мала

лепшым у гэтым сэнсе аказаўся і Федаровіч. Следам за Давідчыкам па дамах разышліся і астатнія трое з яго групы.

Астаўшыеся на месцы, працягвалі падтрымліваць сувязі з вэнжам. І вось аднойчы, зайшоўшы раніцай на адзін з хутароў, Гінько і яшчэ двое жаўнераў увайшлі ў хату, адзін застаўся ў двары вартавым. Гаспадыня пякла аладкі. Жаўнеры папрасілі спячы некалькі аладак і ім, за што далі ёй 100 рублёў. Жанчына пагадзілася. Але не паспелі жаўнеры паснедаць, як у хату ўбег вартавы і паведаміў: “Аблава!”.

У такім выпадку ўжо нічога нельга было зрабіць, як толькі заставацца ў хаце. Праўда, усе імгненна падрыхтавалі зброю. Шышэя нібыта стаў дапамагаць гаспадыні. У гэты час у хату зайшоў сяржант, а салдат, які ішоў з ім, застаўся ў сенцах. Каб прыдаць сабе ўпэўненасці, Шышэя паклікаў у хату і салдата. Сяржант запытаў дакументы, на што Шышэя, паказаўшы на зброю, сказаў: “Вось яны ў салдата і ўсе дакументы”. Пасля гэтага сяржант запрапанаваў: “Тады пойдзем у наш штаб”.

З хаты выйшлі ўсе: сяржант, салдат і чатыры беларускія жаўнеры. Убачыўшы, што затрыманыя не аказваюць ніякага супраціву, усе тыя салдаты, што былі ў аблаве, пайшлі наперадзе, а сяржант і той салдат, які заходзіў з ім у хату, ішлі ззаду. Прайшоўшы метраў 30, Шышэя ўбачыў на дарозе вялізны камень. І тут у яго спрацавала сапраўды арліная кемлівасць. Звярнуўшыся да сяржанта, салдата і сваіх сяброў, ён сказаў: “А цяпер зробім так - нашы пойдукць у свой штаб, а ты, сяржант з салдатам ідзіце ў свой штаб”. Ад сказаных Шышэям слоў сяржант проста атарапеў, але, хутка апомніўшыся, запытаў: “Як?”. Але Шышэя не даўшы яму да канца зразумець, што адбываецца, цвёрдым голасам сказаў: “Ты чаго хочаш? Гэта ж вайна!”. І, звярнуўшыся да сваіх, крыкнуў: “Бягом!”. Хлопцы рынуліся і як мага пабеглі ў напрамку леса, які быў зусім недалёка. А Гінько чамусьці пабег не ў лес, а ў поле. Сяржант і салдат сталі падавацца ўзад, але па твары першага было бачна, што ён вось-вось пачне страляць. Таму Шышэя імгненна ўпаў за камень. Праз нейкіх секундаў пяць раздаўся выстрал, але камень аказаўся надзейным сховішчам. Пачуўшы аўтаматную чаргу, сюды павярнулі і ўсе тыя, што ішлі наперадзе. Але Шышэя за гэты час ужо паспеў падхапіцца і дабегчы да лесу, у якім каля нейкага возера дагнаў сваіх.

Калі аб усім гэтым Косця мне расказваў, у яго міжволі

выр валіся словы з вядомай песні, сааўтарам якой з`яўляецца Расул Гамзатаў: “Повезло нам, повезло нам, повезло…”.

Такім чынам, у лесе ўжо было толькі трое: Шышэя, Конюх і Мацук. Пачалі ўзгадваць, як усё адбылося. Жыццё вісела на валаску. У Конюха нават была прастрэлена пілотка. Сталі думаць і аб тым, што ж здарылася з Гінько, тым больш, што Конюх, ужо апынуўшыся ў лесе, і аглянуўшыся назад, бачыў, як палітрук упаў. Па ўказанай прычыне сышліся на тым, што іх камандзіра няма больш у жывых.

Але і Янка Гінько таксама застаўся жывым. Яго тады ўзялі ў палон. Аб гэтым Шышэя даведаўся ўжо тады, калі сустрэўся са сваім былым палітруком далёка на Поўначы, у Інце.

Застаўшыся ўтраіх, дэсантнікі сталі шукаць якога-небудзь гумна, каб адпачыць ды крыху адысці ад пражытага. Зайшоўшы ў гэткае гумно, Шышэя зноў і зноў пачаў аналізаваць усё па парадку, як гэта адбылося. Міжволі паўстала пытанне, чаму партызанскі важак не папярэдзіў аб магчымай небяспецы. І на дадзенае пытанне адразу не знаходзіў адказу. Не спалі Конюх і Мацук, якім падалося, што Шышэя заснуў. Таму яны пачалі паміж сабою шэптам размаўляць аб тым, што Косця, відаць, пойдзе шляхам барацьбы да канца. А нам, маўляў, патрэбна ісці і здавацца, пакуль тут не забілі. Пры гэтым адзін і другі гаварыў, што яны нібыта мелі сувязь з партызанамі. Таму, пачуўшы гэткія размовы сваіх калегаў (сябрамі назваць ён іх ужо не мог), у Шышэі пачалі падымацца на галаве валасы. Стала неяк крыўдна за тых, каго яшчэ гадзіну назад лічыў сваімі сябрамі і адданымі барацьбітамі за незалежнасць Радзімы. У той час Кастусь разумеў, што гэта ж прадстаўнікі свайго народу, у якога на працягу стагоддзяў знішчалі ўсіх, хто праяўляў нацыянальную свядомасць, смеласць і быў адукаваным, народу, які ўвесь час шавіністычныя колы заходняга і ўсходняга суседзяў імкнуліся сагнуць то ў адзін, то ў другі бок. Мабыць, вось такое хістанне, гэткая гнуткасць то ў адзін, то ў другі бок сталі ўжо адной з рысаў нашага беларускага народу.

Шышэя ляжаў моўчкі, слухаў гэтыя непрыстойныя для беларускага жаўнера размовы ды чакаў, калі Конюх і Мацук, якіх ён пэўны час лічыў больш цвёрдымі барацьбітамі, заснуць. Ён не злаваў на іх, бо ў цяжкія хвіліны жыцця кожны становіцца самім сабою, але лічыў, што ад іх патрэбна быць як мага далей. Таму Кастусь пачакаў, калі яны заснуць, ціха падняўся і пайшоў

у кусты, што былі амаль побач з гумном і стаў чакаць, што будзе далей. Ад думак стала расколвацца галава, бо ён разумеў, што застаецца цяпер у малазнаёмым месцы адзін на адзін з савецкай уладай, якая з кожным днём умацоўвалася. Узгадаў ён і стаў больш разумець паводзіны Гінько, які часта, калі на яго находзіла хандра, станавіўся сумным і амаль упадаў у роспач.

Але патрэбна было жыць, жыць нават у гэты час, калі жыць не хацелася. Кастусь не мог дазволіць сабе самому спыніць сваё жыццё, бо не ён яго даваў сабе. Яго яму даў Бог, а што божае, тое святое.

Раніцаю Шышэя ўбачыў, як Мацук і Конюх зайшлі ў хату, а пасля выйшлі з гаспадаром; апошні запрог каня, усе ўтраіх селі на воз і паехалі ў бок раённага цэнтру. Для Кастуся стала зразумелым - куды і з якой мэтаю.

Пачуўшы ўначы размовы і ўбачыўшы раніцаю дзеянні сваіў учарашніх калегаў, патрэбна было самому хутка ўцякаць з дадзенага месца, бо не было сумневу, што яны ўсё раскажуць, а калі будзе трэба, дык і пакажаць сваё апошняе месцазнаходжанне. Таму Шышэя падаўся ў глыбіню лесу, дзе прабадзяўся без усялякай мэты на працягу некалькіх дзён. Ходзячы па лесе, больш за ўсё думаў аб маці, сястры, брату, некалькі разоў узгадваў бацьку. Але пры ўсім тым не-не ды ізноў узнікала пытанне: “Што рабіць далей?”. І ў рэшце рэшт было вырашана ісці бліжэй дому.

Дайшоўшы да нейкай вёскі побач і Ліпнішкамі, Шышэя зайшоў у гумно і лёг у сена адпачыць. А ўжо быў канец лістапада - вось-вось надыходзіла зіма. Кастусь адчуў, што ён прастыў і ў яго стала падымацца тэмпература, мабыць, у сне і кашляў. Але раніцай прачнуўся ад таго, што нехта хапіў за горла і стаў душыць. У гэты час хтосьці другі ўзяў за ногі і сцягнуў на ток. Безумоўна, ад яго адабралі аўтамат, нож і ліхтарык. Праўда, грошай не забралі, бо яны былі схаваныя ў распораным галенішчы ботаў. Разбойнікаў налічвалася чалавек восем. Шышэю вывелі ў двор у адной гімнасцёрцы: шынель застаўся ў гумне. І тут да Косці прыйшла думка: “Уцякаць!”. Безумоўна, што гэта было вельмі рызыкоўна, але іншага выйсця ў Шышэі не было. І ён пабег у бок рэчкі. Бандыты крыкнулі: “Стой!” і выстралілі з аўтамата, мабыць, уверх. Праз нейкую хвіліну стралялі ўжо і з кулямёта, але зноў-такі, мабыць, не ў той бок, куды бег Кастусь. Пасля Шышэя даведаўся, што з кулямётаў і

аўтаматаў стралялі салдаты, якія, пачуўшы першую аўтаматную чаргу, пачалі акружаць і лавіць бандытаў, што напалі на яго.

Рэчку Гаўя пераадолеў уплаў, пасля чаго быў увесь мокры. Зразумеў, што трэба спяшацца і неадкладна зайсці ў любую першую натрапіўшуюся хату. Але ісці было цяжка: у ботах хлюпала вада, вада цякла з вопраткі, а цела проста качанела ад холаду. Таму ўвайшоў у лес, выліў ваду з ботаў, крыху выкруціў нагавіцы і гімнасцёрку, пасля чаго хуткімі крокамі пайшоў наперад. І вось на шчасце тут у лесе стаяла хата. Думаць было нельга, патрэбна шукаць ратунку. Зайшоўшы ў хату, убачыў, што маці з трымя дочкамі навівалі кросны. Усе яны звярнулі ўвагу, што зайшоўшы ў хату хлопец увесь мокры. І тут маці запытала: "Дык гэта ты плыў праз раку?". Кастусь адказаў: "Я!". Далей гаспадыня спытала: "А цябе ніхто не бачыў, як ты зайшоў у нашу хату?". На што Кастусь адказаў: "Не, не бачыў". Пасля гэтага гаспадыня дала хлопцу сухое адзенне, усяго нацёрла моцнаю самагонкаю, наліла яшчэ паўшклянкі самагонкі і прапанавала выпіць, а затым паклала на ложак і ўкрыла коўдраю.

Праляжаўшы ў ложку тры дні, Кастусь ачуняў, але прабыў у гэтай хаце яшчэ з нейкі тыдзень, дапамагаўшы дзяўчатам малаціць цэпам збожжа. А калі ішоў з хаты ў гумно, дык для маскіроўкі ад вачэй выпадковых прахожых апранаў спадніцу і завязаў хустку. Дапамагаў ён маці і навіваць кросны. Гаспадыня пацікавілася ў хлопца, а ці ўмее ён выконваць палявыя работы, на што Кастусь адказаў станоўча. Больш таго, Шышэя нават паабяцаў гаспадыні схадзіць дамоў, а пасля, мабыць, зноў вярнуцца да іх, калі яны не супраць. За клопаты аб ім Кастусь даў гаспадыні 500 рублёў, хаця апошняя спачатку адмаўлялася ад такой удзячнасці. Гаспадыня дала хлопцу і нейкую старую, з падраным падбіццем верхнюю вопратку, каб не адпраўляўся на холад у адной гімнасцёрцы.

У дарогу Шышэя выйшаў вечарам. Прайшоўшы ўсю ноч, раніцай зноў зайшоў на хутар. Увайшоўшы ў хату, папрасіў есці, паабяцаўшы за гэта заплаціць. Гаспадыняй аказалася маладая жанчына, якая накарміла зайшоўшага падарожніка густым куляшом са шкваркамі. Але ў час снедання Кастусь звярнуў увагу на фотакарткі, што віселі на сцяне, сярод якіх ён прыкмеціў знаёмую сям`ю, дзе толькі што гасцяваў. Ён паказаў гаспадыні на фотакартку і стаў называць дзяўчат па імёнах.

Безумоўна, гаспадыню гэта здзівіла і яна запытала ў хлопца, адкуль ён ведае гэтую сям`ю. Пасля таго, як Кастусь аб усім расказаў, жанчына выйшла з хаты і паклікала мужа, які быў за Шышэю старэйшы, але яшчэ дастаткова маладым. Звалі яго Колем. Ён распытаў Кастуся аб маці, сёстрах, сказаўшы пры гэтым, што сам ужо даўно іх не бачыў. Далей Кастусь паведаміў, што ён уцякач з фронту і абгрунтаваў сваю версію, чаму ён не хоча ваяваць за савецкую ўладу. Потым дастаў сторублёвую купюру, падаў яе Мікалаю і прапанаваў за знаёмства выпіць. Пры ўсім тым сваіх сапраўдных ні імя, ні прозвішча, ні месца нараджэння, ні нацыянальнасць Кастусь Шышэя нікому не гаварыў. Ён распрацаваў версію, згодна якой завуць яго Чэславам, па прозвішчу Чарняўскі, родам з Трокаў, па нацыянальнасці паляк. Пераканаць іншых у тым, што ён нібыта не хлусіць, дапамагалі веды польскай мовы. Лёгка пераіначваліся і імёны бацькоў: Іван - Ян, Алена - Гелена.

У адказ на прапанову выпадковага госця Мікалай дастаў бутэльку, яго жонка паставіла закуску, пачалі піць. А выпіўшы, разгаварыліся, бо гарэлка, як вядома, не толькі сагравае душу, але і развязвае язык, робіць людзей больш блізкімі і даверлівымі. Вось і тады Мікалай прызнаўся, што ён таксама хаваецца ад войска і стаў вырабляць дакументы, каб выехаць з жонкай у Польшчу. Зрабіць гэта было не вельмі цяжка, бо ў той час мяжу паміж СССР і адроджанай Польшчай перанеслі на гэты бок Беластоку і ўстанавілі яе па лініі Керзона, а таму ішоў інтэнсіўны абмен насельніцтвам: палякі ехалі з Беларусі ў Польшчу і засялялі так званыя новыя польскія землі, што адыйшлі ад Германіі, а беларусы, хто пажадаў, выязджалі з арганізаванага Беластоцкага ваяводства ў Беларусь. Мікалай сказаў, што ён таксама лічыць сябе палякам, таму яму дапамагаюць нелегальна зрабіць неабходныя паперы для выезду ў Польшчу, але ў яго, маўляў, для гэтага не хапае грошай. Тады Кастусь запытаў: “А колькі такія дакументы каштуюць?”. На што Мікалай адказаў: “1000 рублёў”. Па тых часах для шараговага селяніна названая сума грошай была немалой. Аднак у Шышэі гэткія грошы былі і ён адразу прапанаваў: “Мікалай, на вазьмі 2000 рублёў, але зрабі дакументы і на мяне”. Пры гэтым дамовіліся, калі да Новага года Чэслаў не з`явіцца, дык Мікалай паедзе ў Польшчу без яго.

Пагасцяваўшы ўжо амаль у сваіх знаёмых яшчэ дзён два,

Кастусь Шышэя зноў рушыў у дарогу. У той час ён усё яшчэ спадзяваўся заняцца ў Налібоцкай пушчы карыснай справай. Там яму была знаёма кожная не толькі дарога, але і сцежка. Не выключаў ён магчымасці знайсці ў пушчы такіх, як і сам, - дэсантнікаў. Пайшоў на Іўе. Дайшоў да Нёмана, перабрацца праз які дапамагла жанчына, перавёзшы на чоўне. За гэта таксама прыйшлося заплаціць соценную. Далей накіраваўся на Любчу. Само мястэчка абыйшоў бокам, тое самае рабіў і з сустрэчнымі вёскамі. Нарэшце выйшаў у вёску Лозкі. Тут Кастусю здавалася, што ён ведае не толькі кожную хату, кожнае дрэўца, але нават і кожную пясчынку на дарозе. Там было ўсё знаёмым і родным да слёз. У Лозках была замужам за Пятром Сап`янікам, па-вясковаму “рамушком”, цётка Вера, сястра маці. У іх сваіх дзяцей не было, таму яны ўзялі за вырашчонку дачку яшчэ адной сястры Косцінай маці. Звалі тую сястру Ганнай і была замужам у панямонні за Фёдарам Маркевічам. Дачку Ганны, якая гадавалася ў Сап`янікаў, звалі Фаняй.

Да хаты цёткі Веры Косця падыйшоў вечарам, калі ўжо прыцямнела і Фаня лягла спаць. Самі цётка і дзядзька сядзелі на кухні. Увайшоўшы ў хату, Косця прывітаўся. Убачыўшы пляменніка, цётка Вера расплакалася, кінулася цалавацца і залямантавала, як гэта і бывае ў такіх выпадках. Дзядзька Пятрусь адразу спалохаўся. Ён добра ведаў норавы бальшавіцкай улады яшчэ, як кажуць, ад тых Саветаў, у тым ліку і па лёсе яго швагра - Косцінага бацькі. Ды нямала дала аб сабе ведаць савецкая ўлада і ў саміх Лозках, таму дзядзька адразу ў Косці запытаў: “Што ты думаеш рабіць?”. А Косця, у сваю чаргу, запытаў, ці ведаюць яны што-небудзь аб яго маці і сястры, на што атрымаў адказ: “Не, нічога не ведаем. Іх няма дома, а дзе яны, не ведаем”. Ды яно сапраўды так і было. Адкуль ім ведаць, куды паехала Алена з дачкою Ганнай. Далей Косця запытаў у дзядзькі, можа ён чуў ад панямонскіх мужчын, ці ёсць у лесе якія-небудзь групы людзей. На што дзядзька адказаў, што толькі ўчора бачыўся з бацькам Фані, які яму гаварыў, што ў лесе ўжо спакойна і ніякіх чужых людзей там няма. А вось вашу, маўляў, групу, ужо пасадзілі ў турму і аб гэтым гавораць усе ў навакольных вёсках. Далей дзядзька паведаміў і аб тым, што Давідчыка з Галыні, які прыбыў дамоў, самі бацькі адвезлі ў Любчу і здалі туды, куды трэба. Больш таго, дзядзька стаў папракаць Косцю, што, маўляў, нарабілі вы

дзялоў са сваім Рагулем. А пасля гэтага параіў пляменніку ісці здавацца, каб неяк захаваць жыццё. На гэта Косця адказаў, што рабіць ён так не будзе. Свой маналог дзядзька скончыў пытаннем: “Не дай Бог, хтосьці прыкмеціў цябе ў нас, ты разумееш, што тады з намі будзе?”.

Але нягледзячы на гэткі перапалох дзядзькі, Косця папрасіў даць яму магчымасць гадзіны дзве адпачыць, пасля чаго паабяцаў пакінуць іх хату. Перш, чым ісці адпачываць, цётка дала пляменніку павячэраць. А пасля вячэры дзядзька дазволіў Косці пабыць некалькі гадзін на хляве ў саломе, даўшы пры гэтым яму нейкую лахаміду. Сам дзядзька ўсю ноч прастаяў у двары за вуглом хлява.

Паспаўшы гадзіны тры, Кастусь прачнуўся. Больш спаць ён не мог: не хацеў выпрабоўваць ні дзядзькавых нерваў, ды і свае ў гэткай сітуацыі былі ў вялікай напрузе. Злезшы з хлява, развітаўся з дзядзькам, і не заходзячы ў хату, рушыў у бок Нягневічаў. Там ён зайшоў да сястры паліцыянта Шарэйкі Марыі, якая, убачыўшы Косцю, проста атарапела. А праз нейкую хвіліну запытала: “Косця, гэта ты? Адкуль жа ты?”. І падумаўшы яшчэ хвіліну, сказала, што праз дарогу знаходзіцца савецкая міліцыя.

Косця папрасіў у Марыі паесці, выпіць і адпачыць, даўшы за ўсё гэта грошы. Ён моцна перажываў пасля размовы з дзядзькам Петрусём. Дзядзька ўвесь час стаяў перад вачыма. А Косця думаў, што ж трэба было зрабіць з людзьмі, каб нагнаць на іх гэткі паталагічны страх. Але і адказ на дадзенае пытанне яму быў вядомы: два самых страшных у свеце дыктатарскіх рэжымы пераехалі па лёсах беларускага народа. Вось гэткі страх - гэта вынік іх дзеянняў, прычым адзін з названых рэжымаў у той час яшчэ ўсё ўмацоўваўся. А тым часам дзяўчына дала Косці хлеба, каўбасы, паставіла гарэлкі. У час яды яшчэ аб тым-аб сім запытала, а пасля дала коўдру і адправіла на гарышча адпачываць, сказаўшы пры гэтым, што там ёсць невялікае акно, праз якое бачны ўвесь рух міліцыянтаў. У Марыі Косця пераначаваў, прадняваў, ды як сцямнела, рушыў у дарогу, назад да Мікалая., пакуль яшчэ быў час да Новага года. Гэта ў яго была адна дарога, бо з размовы з дзядзькам ды і з Марыяй стала зразумела, што ісці на Кромань няма сэнсу.

Абыйшоўшы зноў полем вёскі і Любчу, Косця ўзяў накірунак

на Іўе. Дні былі кароткімі, таму хутка цямнела. У гэты час Косця падыходзіў да нейкай вёскі, у якой адна з хатаў стаяла крыху воддаль. У яе Косця і зайшоў, дзе даведаўся назву вёскі - Опіта. У хаце сядзелі два мужчыны, тры жанчыны і невялікая дзяўчынка. Косця прывітаўся, зноў-такі па-польску. Але па ўсяму было бачна, што ў хату ўвайшоў чалавек не тутэйшы. Праўда, на прывітанне Косці адказалі таксама па-польску. Пасля гэтага Шышэя паўтарыў усё тую ж версію і аб сабе і аб прычыне яго блуканняў. Паслухаўшы яго роспавед, гаспадыня запытала: “Ты мусіць і галодны?”. Косця адказаў, што так, але адразу і дадаў, што ён гатовы за вячэру заплаціць. Навогул, у яго стала ўжо праілам: ні ў кога нічога не браць дарма. На гэтым яго папрасілі распрануцца, пакармілі. А калі ён дастаў соценную, каб аддзячыць за вячэру, адзін з мужчынаў прапанаваў зрабіць і па чарцы. Косця з прапановай пагадзіўся і дастаў яшчэ адну соценную. Вячэра пачалася нанова. Ужо з гарэлкай, салам і цыбуляю, якую Косця вельмі любіў.

Гаспадар, убачыўшы падраны каптан, прапанаваў Косці свой, цэлы, прычым суконны. Косця зноў заплаціў, на гэты раз 200 рублёў, хаця даваў 300, але гаспадар адну соценную купюру вярнуў назад. На дарогу гаспадар хаты прапанаваў Косці пavаражыць на картах. Шышэя пагадзіўся. І вось праз нейкую хвіліну варажбіт паведаміў: “Цябе, хлопча, чакае турма, але жыць будзеш”. Шышэя падзякаваў за ўсё, запытаў патрэбную яму дарогу і пайшоў далей.

На жаль, варажбіт сказаў праўду. Толькі Шышэя выйшаў на палявую дарогу і падняўся пад гару, як прыкмеціў, што насустрач яму на возе едуць тры салдаты.Убачыўшы іх, Косця паспрабаваў павярнуць у бліжэйшую вёску, але салдаты загадалі спыніцца. Косця стаў уцякаць. Аднак салдаты яго хутка дагналі. У гэтым ім дапамагло і балота, да якога Шышэя дабег, але, па непралазнай гразі бегчы не мог. Затрымаўшы, яго адвезлі ў Юрацішкі, якія тады былі раённым цэнтрам. Завялі ў нейкую ўстанову, у якой сядзеў узбуджаны капітан. Ён на кагосьці крычаў. І калі ўбачыў усяго ў гразі ўвайшоўшага, таксама закрычаў: “У рэчку яго! Няма ў мяне часу з ім займацца!”. Гэта азначала, што затрыманы асуджаны на смерць. Атрымаўшы такую каманду ад крыклівага капітана, Косцю вывелі ўсё тыя ж салдаты, што і прывялі, і ў другім пакоі пачалі рыхтаваць да растрэлу: знялі з яго боты, вопратку. Пасля

гэтага вывялі ў калідор, мабыць, каб далей везці ў тую ж рэчку.

Але ў гэты час пад`ехала грузавая машына. З яе выскачыў таксама капітан. Убачыўшы босага і амаль распранутага чалавека, якога кудысьці вялі салдаты, капітан запытаў: “Што такое? Хто гэта?”. На пытанне капітана салдаты адказалі: “Да мы яго вот у рэчку…”. Толькі што прыехаўшы капітан загадаў вярнуць незнаёмага ў памяшканне і стаў дэтальна высвятляць, хто гэта, адкуль ён, дзе яго затрымалі. А ўбачыўшы знятае з незнаёмага адзенне, капітан зразумеў, што перад ім стаіць якаясьці загадкавая асоба. Яго ўвагу прыцягнулі асабліва чэшскія штаны. Капітан адразу даў каманду адзець і абуць затрыманага. Разам з тым ён паклікаў салдат, якія з ім прыехалі. Салдаты звязалі Косці рукі, укінулі яго ў кузаў машыны, дзе ляжала поўна хлеба, і павезлі ў Ліду. А там памясцілі ў КПЗ, дзе ўжо знаходзілася чалавек 20. Праз сцяну быў чутны і жаночы голас, крык, плач.

У пакоі, у які памясцілі Шышэю, не было ніякіх вокан, што сведчыла аб прыстасаванасці памяшкання для гэткіх мэтаў. Праз дзён два Косцю вывелі ў двор, далі загад памыцца, пасля чаго зноў звязалі рукі і павялі ўжо ў іншы будынак, на другі паверх. Там сядзеў палкоўнік і яшчэ два афіцэры. Палкоўнік задаў стандартнае пытанне: “Хто ты?”. Косця маўчаў. У гэты час у пакой увайшоў і капітан, які прывёз Косцю з Юрацішак. Палкоўнік звярнуўся да ўвайшоўшага капітана і запытаў, чаму ён так апрануты і быў гэткі ўвесь у гразі. Капітан адказаў, што ён, маўляў, гэткага забраў, калі яго хацелі растраляць. Пасля чаго палкоўнік загадаў знайсці тых салдат, якія затрымалі незнаёмага, а самога затрыманага пакуль што адвесці ў КПЗ. Калі Шышэя зайшоў у КПЗ, да яго падыйшоў адзін з сядзеўшых там і сказаў: “Я ведаю, хто ты”. Далей незнаёмы паведаміў, што ў Лідзе ваш адзін ужо вісіць. Яго прозвішча Куімаў.

Прозвішча Куімаў Шышэі было знаёма - гэта шафёр Рагулі. Аляксандр Куімаў выхоўваўся ў дзіцячым доме, стаў лейтэнантам савецкай арміі, у вайну застаўся на акупаванай тэрыторыі, а пасля ўступіў у беларускае войска і разам з іншымі апынуўся ў Дальвіцы, дзе прайшоў дэсанцкую падрыхтоўку і ў ліку 27 чалавек быў скінуты з парашута. Праўда, дзе ён прызямліўся, Шышэя не ведаў. Паведамляўшаму незнаёмаму гэткую трагічную вестку Шышэя адказаў, што хто такі Куімаў ён не ведае.

Праз дзён два Шышэю зноў выклікаў палкоўнік, перад якім стаялі тыя тры салдаты, што затрымалі Кастуся. Палкоўнік у іх запытаў: “Што вы ў яго забралі?”. І ўбачыўшы на адным з салдатаў боты, якія, як зразумеў палкоўнік, належалі затрыманаму, загадаў іх зняць і абуць тыя, у якіх быў абуты Шышэя, - старыя і вялізныя па памеру. Адразу ж даў загад капітану прынесці для Шышэі іншыя боты, а належаўшыя яму раней стаў круціць і абмацваць рукамі. Прыкмеціўшы ў ботах надрэзы, зноў запытаў: “Што там было?”. Шышэя маўчаў, а адзін з салдатаў адказаў: “Грошы”. Палкоўнік загадаў салдатам вярнуць грошы, што яны і зрабілі. Далей справа дайшла да адзення Косці, якое палкоўнік таксама ўсё перамацаў. Акрамя грошай і ботаў, ён вярнуў усё затрыманаму. Пасля дэталёвага агляду рэчаў палкоўнік звярнуўся да Шышэі і запытаў: “Будзем гаварыць, ці не?”. Шышэя па-ранейшаму маўчаў, а перад вачыма стаяў ужо Куімаў. У галаву зноў прыходзіла думка аб смерці. Здавалася, няхай бы лепш застрэлілі каля той рэчкі ў Юрацішках, чым будуць вешаць у Лідзе.

У гэты час у пакой увялі двух незнаёмых Шышэю чалавек, папярэдне адправіўшы салдат. Але незнаёмыя, калі ім паказалі на затрыманага, сказалі, што яны яго не ведаюць. Пасля гэтага Шышэю зноў адправілі ў КПЗ. І тут Косці прыйшла думка, што чалавек, які яму паведаміў аб Куімаве, напэўна быў адным з тых польскіх партызанаў, з якімі ён правёў некалькі дзён. Бо інакш, адкуль ён мог ведаць Косцю.

А тым часам той самы чалавек зноў падыйшоў да Шышэі і паведаміў яму, што на пазнанне да цябе будуць прыводзіць многіх. Але калі прывядуць Зузанну, дык яна абавязкова скажа, што цябе пазнала. І далей шэптам паведаміў і аб прычынах паводзін названай жанчыны. Зузанна працавала ў свой час сакратаром у штабе камандуючага Арміі Краёвай. У яе ёсць сын. Вось яна і баіцца, каб надоўга не застацца ў турме, пакінуўшы адно дзіця. Таму і пагадзілася дапамагаць энкавэдзістам абвінавачваць арыштаваных. Сама Зузанна выглядала знешне прыгожай і паходзіла на саракагадовую жанчыну.

Калі Шышэю прывялі на чарговы допыт да палкоўніка, Зузанна ўжо была там. Палкоўнік, звярнуўшыся да яе, запытаў: “Пазнаеш?”. І Шышэю прымусілі прайсціся сюды-туды па пакоі, павярнуцца налева-направа, каб прыведзеная на вочную стаўку

сведка магла яго добра разглядзець. Пасля гэткага цэрыманіялу Зузанна сказала: “Так, я пазнала. Ён у нас бываў”. Пасля гэтага Шышэя загаварыў па-польску: “Каб ты бачыла так свайго сына, як ты бачыла мяне. Прадажная ты скура. Як цябе толькі носіць зямля, гэткую падлу!”. У гэты час адзін з прысутных афіцэраў ударыў Шышэю ў вуха, ды так моцна, што зазвінела ў галаве, а Зузанна стала плакаць і яе вывелі. Шышэю зноў адправілі ў КПЗ. Пасядзеўшы там некалькі дзён нямытым, на яго напалі вошы. Вошы поўзалі не толькі па галаве, целе, але нават у вушах. Так нічога і не дабіўшыся, Шышэю адправілі ў Менск.

У Менск везлі звязаным вяроўкамі ў агульным вагоне, у якім ехала многа іншых людзей. І Косця адчуў на сабе ўсю лютасць натоўпу, які часта гатовы знішчыць любога, нават не высвятляючы яго вінаватасці. Натоўп амаль заўжды імкнецца знайсці ворагаў яго дрэннага становішча і хоча іх пакараць. І ўжо зусім раз`юшваецца, калі нехта гэткіх ворагаў яму пакажа. Менавіта пад пахвальныя крыкі натоўпу ў V стагоддзі да нашай эры быў смяротна пакараны адзін з найвялікшых філосафаў старажытнасці Сакрат, са згоды натоўпу былі знішчаны тысячы невінаватых інквізіцыяй у гады сярэднявечча, псіхалогію натоўпу выкарыстоўвалі самыя лютыя дыктатары XX стагоддзя Сталін і Гітлер. Вось і ў час перавозкі Шышэі з Ліды ў Менск некаторыя прадстаўнікі ўсё таго ж натоўпу, нават не ведаючы, з каго і за што так здзекуюцца энкавэдзісты, давалі свае парады - павесіць, выкалаць вочы і гэтак далей. Для гэтага толькі патрэбна было аднаму з суправаджаючых Шышэю энкавэдзістаў назваць яго фашыстам.

У Менску Шышэю памясцілі ў так званую “амерыканку”, якой звалі круглую турму, што знаходзіцца недалёка ад галоўнага праспекта. Але перш, чым адводзіць у камеру, завялі ў баню, дзе было нейкае нібы з рыбы мыла і гарачая вада, а адзенне забралі і прапяклі ў спецыяльнай печы. Пасля бані астрыглі нажніцамі галаву і потым зноў далі магчымасць яе памыць. І хаця адзенне вярнулі ўжо без гузікаў і штаны патрэбна было трымаць у руках, але, скінуўшы ўвесь бруд, які накапіўся за доўгі час, Косці здавалася, нібыта ён пабыў не ў бані, а сапраўды ў нейкім чысцілішчы, бо нават дыхаць і то стала лягчэй.

Прызначылі Шышэю ў восьмую камеру, дзе быў яшчэ адзін чалавек - палкоўнік Арміі Краёвай Валіцкі. Камера і была разлічана на двух чалавек. У ёй знаходзіліся два прывінчаныя

да сцяны ложкі, два адкінутых ад сцяны сядзенні, прымацаваны стол. Усё гэта было жалезным. У вуглу стаяла "параша". Уверсе віднелася невялікае з "яжовым брылём" акенца. У дзвярах, каб можна было наглядаць за паводзінамі вязняў, быў "ваўчок" і маленькія дзверцы, або, як іх называлі вязні, кармушка, праз якую падавалі яду і розныя загады. Спаць вязням дазвалялі з 9 вечара і да 6 раніцы, у астатні час можна было ў лепшым выпадку сядзець, павярнуўшыся тварам да ваўчка і не апускаючы ўніз галаву.

А Косці пасля зняцця бруду хацелася спаць. Таму, седзячы на адкінутым стуле, ён не мог утрымацца і засынаў. Яго два разы папярэдзілі, што гэтага рабіць нельга. Але ён не мог нічога з сабою зрабіць. Тады ў камеру зайшлі двое наглядальнікаў і іх начальнік, Косцю забралі і адвялі ў бокс - круглую камеру, якая была падобна на калодзеж, дзе няма ні вокан, ні на чым нават сесці, ёсць толькі ваўчок. Косця скруціўся на цэментовым дне гэтага калодзежа і так заснуў. У боксе ён прабыў прыкладна двое сутак, увесь замёрз.

Выпусціўшы з бокса, яго зноў завезлі ў баню, а пасля, каб цела прагрэлася, прадулі цёплым паветрам, і адвялі ў тую самую восьмую камеру, у якой за гэты час паявіліся яшчэ два чалавекі: архімандрыт праваслаўнай царквы Шахмуць і беларускі ксёндз Шутовіч, які да турмы служыў у Менскім касцёле. Ксёндз Віктар Шутовіч карыстаўся ў прыхажан вялікай павагай, таму яны прыносілі яму ў турму падаянкі, якімі ён дзяліўся з аднакамернікамі. І ў гэтым сэнсэ Кастусю, безумоўна, пашанцавала.

Гаварыць у камеры можна было толькі ціхім голасам. Але ксёндз увесь час распавядаў аб Хрысце, прычым так цікава, што нават наглядальнік адкрываў кармушку і прасіў ксяндза расказваць крыху мацней. За тое праваслаўны архімандрыт увесь час сядзеў і маўчаў. Па ім было бачна, што гэта мала дасведчаны чалавек, які нават не ведаў, што такое азбука Морзе.

Пасля прыкладна трох тыдняў Шышэю выклікалі на першы допыт. Усе допыты вяліся звычайна ноччу. Не было выключэння і на гэты раз. Допыт праводзіў маёр ВКК-ГПУ. Аб гэтым сведчылі яго пагоны і надпіс на мундзіры. У пакоі сядзелі і два яго памагатых, а таксама стэнаграфістка. Гэта быў ужо пажылы, з белаю галавою, высокага росту чалавек. Калі Шышэя ўвайшоў

моўчкі ў пакой, маёр запытаў: “А дзе ж прывітанне?”. Але Косця і на гэта нічога не адказаў. Пасля чаго маёр падняўся, абышоў вакол і стаў глядзець Шышэі ў вочы, а Шышэя пазіраў на яго ордэн. Маёр запытаў: “Ну што ўтупіўся на мой ордэн?”. На што Шышэя адказаў па-польску: “Я разумею, хто пан ест”.

Маёр амаль па-хамску запытаў: “А ты по-человечески можешь разговаривать?”. І далей дадаў: “У меня даже камни разговаривают, а не только такие как ты!”. Але ў Косці ўжо быў абдуманы план, як сябе паводзіць і што і на якой мове гаварыць. Таму ён працягваў размаўляць па-польску і ў дадзеным выпадку сказаў: “Калі вам цікава ведаць, хто я, дык я Чэслаў Чарняўскі з мястэчка Трокі Віленскага ваяводства”. Маёр задаў наступнае пытанне “А куда ты шёл?”, на якое Косця адказаў: “Дамоў”. Далей зноў запытаў маёр: “А где был?”, на што Косця адказаў: “На лесараспрацоўках у Налібоцкай пушчы”. Пасля гэткіх дакладных адказаў Шышэі маёр паглядзеў на яго і сказаў: “Пока что достаточно. А потом мы разберемся, правду ли ты говорил. Нас ты не проведешь”. Пасля гэткага папярэджання следчага Шышэя сказаў: “Я зразумеў”.

Далей Шышэю не чапалі прыкладна цэлы месяц. Потым зноў выклікалі да таго ж маёра, які паведаміў, што яны ездзілі ў Тракай і там на вуліцы Мельнікайтэ, якую Чэслаў Чарняўскі называў як сваю, ніхто, маўляў, цябе не ведае. А далей маёр самаўпэўнена сказаў: “Сейчас командовать буду я”. І пачаў выкладаць сваю версію, згодна якой, нібыта яго падследны служыў у карным атрадзе і ў Кобрыне растраляў 93 савецкіх ваеннапалонных. Стэнаграфістка ўсё гэта запісала, пасля надрукавалі на машынцы і праз нейкі тыдзень Шышэю зноў выклікалі да маёра, які паклаў перад падследным ручку і прапанаваў яму падпісаць гэтую энкавэдзісцкую бязглуздзіцу. Зрабіць гэта Шышэя, безумоўна, не мог. Дарэчы, аб недобрасумленнасці следчага гаварыла і тое, што ён без усялякага пагадзіўся з тым, нібыта перад ім падследны Чэслаў Чарняўскі. Для яго было важным хутчэй і з большым абвінавачваннем скончыць справу. А каго дапытваць, каго судзіць, каго і якой мерай пакараць - усё гэта для яго было без розніцы. Па паводзінах маёра было бачна, што для яго было самым важным скончыць справу ў адпаведны тэрмін і выбіць у вязня як мага большыя на сябе паклёпы. І гэта ўкладвалася ў існуючы тады прынцып вядзення следства, пры якім, згодна

“тэорыі” тагачаснага Генеральнага пракурора СССР А. Вышынскага царыцай доказаў лічылася прызнанне самога абвінавачваемага.

Вось маёр і дзейнічаў згодна гэтага прынцыпу, але перад ім на гэты раз аказаўся цвёрды і смелы чалавек, аб чым гаварылі яго сапраўднае імя Кастусь і ў свой час дадзеная яму мянушка - Арол. На заведамую хлусню і пагрозы Шышэя адказваў абвінавачваннем самога следчага. У прыватнасці Косця сказаў: “Вы сівы чалавек, веруючы ў Бога. Як вы так можаце? Я ніколі не быў у Кобрыне”. Гэткая смеласць вязня збянтэжыла маёра і ён закрычаў: “Не каркай здесь, а подписывай! Ты знаешь, где ты находишься!”. У гэты час падскочылі два памагатых маёра і ўдарылі Шышэю па галаве, ад чаго ён упаў і страціў прытомнасць. Пасля гэтага яго адлілі халоднай вадою і маёр зноў закрычаў: “Подписывай!”. Але не тут-то было. Маёр сцвярджаў, што ў яго камяні і тыя гаварылі, а тут ён сустрэўся з чалавекам, які аказаўся, значыць, цвярдзейшым за камень. Вось і на новыя пагрозы Косця адказаў новым абвінавачваннем энкавэдзісцкага служакі: “Вы не маёр. Вы шарлатан!”. Што маёра прывяло яшчэ ў большую злосць і ён зноў закрычаў: “Одеть наручники!”. Каманда была выканана, пасля чаго маёр зноў закрычаў: “Ну что, будешь подписывать?”. А Косця ў адказ: “Вы дэспат. Я з вамі не буду гаварыць”. Маёр ударыў Шышэю па наручніках, ад чаго яны ўрэзаліся ў рукі, потым ударыў яшчэ два разы і Косця зноў страціў прытомнасць. Ачнуўся ўвесь мокры. У такім выглядзе яго і адвялі ў камеру. Убачыўшы замучанага да паўсмерці чалавека, ксёндз запытаў: “А ў чым справа? Завошта гэта вас?”.

Крыху адыйшоўшы ад амаль невыносных пакутаў, Шышэя расказаў ксяндзу, як з яго выбівалі подпіс, што ён нібыта ў Кобрыне растраляў 93 савецкіх ваеннапалонных. Пры гэтым Косця зазначыў, што няхай лепш заб`юць да смерці, чым ён будзе падпісваць на сябе гэткі паклёп. А пасля дадаў: “Пройдуць гады і нехта некалі ўсе гэтыя паперы прачытае. І калі я падпішу, дык хто я тады ...?”.

Выслухаўшы свайго аднакамерніка, ксёндз стаў чытаць малітву, у час якой сказаў: “Мы церпім не толькі за свае грахі, але і за грахі сваіх продкаў. Таму трэба цярпець”. А сам Шышэя ў гэты час думаў аб тым, каб толькі не даведаліся маці і сястра, што адбываецца з ім. Менавіта з-за іх ён і змяніў сваё імя,

прозвішча, нацыянальнасць і месца нараджэння. Таму вырашыў цярпець любыя пакуты, але не паказаць праўды, а тым больш не падпісваць на сябе паклёп, чаго так дабіваўся маёр. І калі гэты злачынец выклікаў яго ў чарговы раз, Косця зноў сказаў тое, што ён думаў і аб ім і аб яго органах, у якіх маёр служыў: “Што вы з людзей здзекуецесь? Наколькі нямецкія гестапаўцы былі больш гуманнымі, чым вашыя морды. Тыя выводзілі і стралялі чалавека, а вы адчуваеце асалоду ад людскіх пакутаў. У вас няма чалавечага сумлення”.

Гэткія словы вывелі маёра з сябе і ён закрычаў: “Мачыць яго!”. Пасля чаго яго падхапілі ўдваіх і пацягнулі ў баню. У бані сарвалі адзенне, на падлозе расклалі моцна варсісты дыванок з рамянямі. У гэты час у баню прыйшоў і сам маёр, а тыя двое, што выконвалі каманду маёра, закруцілі Шышэю ў дыванок і звязалі рамянямі так моцна, што ледзь можна было дыхаць. У гэты час маёр запытаў: “Ну что, одумался? Ты знаешь, что с тобой сейчас будет?”. Шышэя адказаў: “Варвары і забойцы”. І тут з крана палілася гарачая вада, якой сталі абліваць дыван. Мокрая шэрсць ад дывана пачала ўлазіць у цела, яшчэ мацней сталі душыць рамяні грудзі. Косця адчуў нечалавечую боль усяго цела і страціў прытомнасць.

Па тых пагрозах Пуціна, якія ён выказаў у адрас чачэнцаў, відаць, што гэты звярыны прыём допытаў вязняў вядомы і сённяшнім чэкістам Расеі. А тады Косця ачнуўся ўжо развязаным і ўвесь аблітым халоднаю вадою. Маёр сядзеў на сваім месцы і зноў задаў пытанне: “Ну что, подпишешь?”. На што Косця адказаў: “Іуда. Сколькі ты будзеш мучыць!”. Пасля чаго маёр крыкнуў: “Повторить!”. Шышэя толькі паспеў сказаць: “Давай”. І ўсё паўтарылася нанава. Але адчуўшы, што невядомы для яго вязень аказаўся духам сапраўды цвярдзее каменя, маёр даў каманду: “Пад душ!”. Пасля чаго дыван знялі і ледзь дыхаючае цела абмылі цёплаю вадою і абдалі цёплым паветрам, ад чаго Косця перастаў калаціцца і стаў прыходзіць да сябе. Яго завялі ў тую ж самую камеру, дзе, убачыўшы абяссіленага чалавека, ксёндз зноў пачаў маліцца.

Пасля гэткай жахлівай экзекуцыі амаль месяц Шышэю ніхто нікуды не клікаў. А пасля яго вывелі ў двор, паказалі турэмнаму лекару, які агледзеў і даў загад узяць у вязня кроў. Па прыёмах агляду Косця зразумеў, што гэта быў, мабыць, лекар-псіхіятр. І вось калі Косцю вярталі ў памяшканне турмы і ён стаяў у

калідоры тварам да сцяны, як гэта звычайна рабілася ў такіх выпадках, праходзячы каля яго высокага росту лейтэнанат шапнуў: "Косця, так трымайся". На жаль, Косця не ўбачыў яго твару і таму і сёння не ведае гэтага чалавека, які паказаў сваім шэптам, што не ўсе былі злачынцы і сярод чэкістаў. А ў той час Косця доўга думаў, перажываў, каб яго не апазналі і не даведаліся адкуль ён. Баяўся зноў-такі з-за маці і сястры.

Калі Шышэю выклікалі на чарговы допыт, у пакоі ўжо сядзеў іншы следчы - старшы лейтэнант, які адразу паведаміў: "Я азнаёміўся з тваёй справай. Ездзіў у Тракай. Там гэткага чалавека, якім ты называеш сябе, ніхто не ведае. Што будзем рабіць? Калі ты кажаш, што быў у Налібоцкай пушчы на лесараспрацоўках, дык скажы: хто там быў яшчэ? Хто ў вас быў начальнікам? Хто табе выплочваў заробак? Усё гэта высветлім, а пасля будзем бачыць, што з табою рабіць далей".

Шышэя паўтарыў усё тое, аб чым распавядаў і маёру, толькі на гэты раз назваў прозвішча жыда, які за польскім часам купляў лес на пні, а пасля арганізоўваў яго нарыхтоўку і кудысьці сплаўляў, - гэта быў Саламянскі, якога Косця ведаў у твар. У час разводдзяў Косця насіў са Шчорсаў у панямонне Саламянскаму тэлеграму, за што жыд заплаціў хлопцу аж два злотых, праўда, пасля торгу. А ў той час допыт прайшоў спакойна, пасля чаго Шышэю зноў адвялі ў камеру. Дарэчы, у камеру па-ранейшаму працягвалі прыносіць ксяндзу падаянкі, таму, калі не было допытаў са здзекамі, дык можна было жыць. Бо на казённых 450 грамах няякаснага хлеба і той пахлёбцы, што давалі вязням, чалавек мог толькі цягаць ногі. Але іх камеру выручалі добрыя прыхаджане ксяндза.

Зноў прайшло месяцаў са два, пакуль Шышэю выклікалі на чарговы допыт. На гэты раз следчым быў ужо капітан. Ён паклікаў Кастуся бліжэй і сказаў: "Хлопча, ты змарнеў тут начыста. У чым справа?". На што Кастусь адказаў: "Не ведаю Пры немцах даўно застрэлілі б, а тут мучаюць". Пачуўшы ад вязня гэткія словы, капітан сказаў: "Ну што ты, застрэлілі б. Ты ж малады. Давай будзем пісаць усё нанава". Пасля чаго Шышэя сказаў: "Ну колькі можна пісаць і ўсё нанава? Вазьміце і перапішыце тое, што я казаў. Я ж новага нічога не скажу". Капітан патлумачыў, што так рабіць нельга, таму, маўляў, пачнем нанава, хаця Шышэя, як і казаў, паўтарыў усё па-старому. Адно, што ён сказаў на гэты раз новае, гэта назваў

прозвішча Саламянскага, у якога ён нібыта быў на лесаапрацоўках і адтуль ішоў дамоў у Трокі. На раставанне капітан паведаміў: “Я вяду допыт усіх беларусаў і палякаў, таму мы павінны неяк дамовіцца”.

Пасля допыту ў капітана зноў было чаканне ў камеры. А на чарговым допыце капітан прапанаваў зрабіць вочную стаўку, бо, маўляў, мы тут з гэтым Чэславам Чарняўскім штосьці путаем. І далей сказаў: “Я знайшоў твайго сябра”. Патэлефанаваў і загадаў прывесці таго сябра. Неўзабаве дзверы адчыніліся і ў пакой увайшоў Саша Мацук, а з ім і яго следчы - старшы лейтэнант. Саша і кажа: “Здароў, Косця”. Пасля чаго капітан спакойным голасам сказаў: “Вось і Косця, якога мы шукаем. Мы яго шукаем, а ён вось”. Пасля звярнуўся да Шышэі і гаворыць: “Ну дык што ж ты ашукваеш? Які ж ты Чарняўскі?”

А Мацук у гэты час кажа: “Гэта мой камандзір, Кастусь Шышэя”. Пасля чаго працягнуў капітан: “Вось як. Дык вось якая ты шэльма. Мучыў тут нас. Дык ты быў у БНП?”.

Кастусь зразумеў, што са склаўшагася становішча неяк трэба выходзіць, пры гэтым ён здагадаўся, што Мацук яго імя і прозвішча ведае, але адкуль ён родам і хто па нацыянальнасці, Мацук не ведаў. Таму Шышэя хуценька стаў браць ініцыятыву, бо ў адваротным выпадку Мацук мог сказаць нешта і яшчэ, што пашкодзіла б Косці. Звярнуўшыся да нядаўняга сябра, Кастусь сказаў: “Саша, якое БНП? Ты ж ведаеш, што я паляк. Мы з табою былі разам у беларускім войску, а не ў БНП. І наогул, што такое БНП?”.

Тут зноў загаварыў Мацук: “А ты ж нам даваў загад пісаць аб тым, якой мы бачым Беларусь у будучым”. Але Шышэя і тут патлумачыў: “Я камандзір, а таму і гаварыў гэта ўсяму курсу, а не толькі табе. І пры чым тут БНП?”. І далей Шышэя звярнуўся да Мацука асабіста: “Саша, навошта ты наводзіш на мяне паклёп? Ты ж смелы хлопец”.

Пасля гэткай перамоўкі паміж былымі сябрамі капітан запытаў у Мацука: “Так ён быў у вашай БНПоўскай пяцёрцы, ці не?”. На што Мацук адказаў: “Дык калі ён паляк, дык вядома, што не быў”. І тут закрычаў старшы лейтэнант: “А ты ж гаварыў, штот ён быў, а цяпер ужо адмаўляешся?”. На гэтым Мацука павялі, а Шышэя застаўся ў пакоі з капітанам, які сказаў, што цябе цяпер адвядуць у камеру, дзе ты добра абдумай свае версіі, а я падумаю, што рабіць з табою далей.

Для Косці было ясна, што сваіх сапраўдных прозвішча і імя цяпер ужо не схаваеш. А што тычыцца месца нараджэння, дык, пэўна, мяняць Трокі не трэба. І стаў чакаць новага выкліку на допыт. Гэта адбылося крыху больш як праз тыдзень. Калі Косця ўвайшоў у пакой, капітан сказаў: “Я ўсё прадумаў. Я не хачу быць зверам. Давай мы прыдумаем такую версію. Ты ведаеш, што цябе абвінавачваюць ў забойстве і касмапалітызме?”. Тут Шышэя задаў сустрэчнае пытанне: “А што такое касмапалітызм?” На што капітан адказаў: “Ну вось бачыш, табе нават невядома, у чым цябе абвінавачваюць”. Пасля гэтага прапанаваў Шышэі гаварыць сумленна, каб хутчэй скончыць допыт, бо, маўляў, ужо прайшлі ўсе тэрміны, а калі мы не ўкладземся ў адведзены час, дык з нас пачнуць здымаць зорачкі. Пасля выклікаў стэнаграфістку і пачалі пісаць: “Я, капітан Труноў, - старшы следчы КДБ СССР…”. І калі дайшлі да дня затрымання Шышэі, капітан прапанаваў напісаць замест 11 снежня, 26 снежня, супраць чаго Кастусь не пярэчыў. Бацьку свайго, як і на папярэдніх допытах, назваў Янам , а маці Геленай, з чым ужо не спрачаўся капітан. Так і не стаў высвятляць сапраўдную нацыянальнасць падследнага, а пагадзіўся з тым, якую назваў Шышэя. Але калі дайшла справа да месца нараджэння і Кастусь назваў Трокі Троцкага раёна, тут капітан успалашыўся, што такога не можа быць, бо ён, мабыць, падумаў, што назва раёна паходзіць ад прозвішча вядомага Льва Троцкага. Таму неадкладна кагосьці паклікаў і запытаў. Але ўвайшоўшы патлумачыў капітану, што такі павет быў за польскім часам, а цяпер Трокі называюцца Тракаем. Гэткі паварот з месцам нараджэння Шышэі, безумоўна, падзейнічаў на капітана станоўча і ён не стаў далей прыдзірацца да Косцінага роспаведу. На гэты раз Кастусь казаў, што яго бацька працаваў ляснікам каля вёскі Дзераўная, а сам ён вучыўся ў Наваградку, адкуль і трапіў служыць у эскадрон. Далей распавядаў усё, як было: апынуўся ў нямеччыне, быў скінуты дэсантам, ішоў дамоў у Трокі, у час чаго і злавілі. Усё гэта запісаўшы, капітан запытаў: “А чаму ты не страляў у савецкіх салдатаў, калі яны вас злавілі ў хаце?”. На што Кастусь адказаў: “А які быў сэнс? Навошта забіваць людзей, тым больш, што мяне ўсяроўна злавілі б”.

Гэткі адказ, відаць, капітану спадабаўся і ён сказаў: “Правільна”. А далей працягнуў: “А ты ведаеш, як я натрапіў на

твой след? У галянішчах у цябе былі грошы - сторублёўкі. Вось і ў Конюха і ў Давідчыка, якіх я дапытваў раней, таксама былі гэткія купюры. Тут я і падумаў, што значыць і Чарняўскі не Чарняўскі, а ты”.

Па роспаведу Косці навогул трэба аддаць належнае капітану як прафесіяналу сваёй справы. У адрозненне ад тупога служакі і “дубалома” маёра, якіх у той час у органах ЧК была большасць, капітан не гарачыўся, не крычаў, тым больш не пагражаў якімісьці нечалавечымі метадамі выбівання прызнанняў. На думку Шышэі, каб капітан захацеў, ён мог бы высветліць усё: і сапраўднае месца нараджэння, і нацыянальнасць, і што-небудзь яшчэ. Але ўжо ўсе дэсантнікі, скінутыя разам з Шышэям, былі да таго часу асуджаны і таму следчы паскорыў допыт. Капітан Шышэі казаў: “Дарма ты столькі мучыўся. Ужо даўно мог бы паехаць у лагер ды і жыць як іншыя. Усяроўна табе яго не мінаваць. Мы сачынілі з табою версію на дзесяць гадоў. Больш табе не дадуць, бо ты ніякі не дзеяч. Перапішам усё на чыстае, а пасля гэтага я выклічу цябе і падпішам з табою на 206 артыкул”.

Праз два тыдні Шышэю выклікалі. Капітан прапанаваў падпісаць пратакол допыту, але Кастусь сказаў: “Я не хачу падпісваць”, на гэта капітан зазначыў: “ А дарма”. І не стаў прымушаць Шышэю падпісваць, а ўзяў пратакол і ў канцы сам напісаў: “Ад подпісу адмовіўся”. А пасля, звярнуўшыся да Кастуся, сказаў: “Ідзі адпачывай. Мы справу скончылі”. Але праз нейкую хвіліну дадаў: “Ну вось, разыходзімся мы з табою мірна. Таму на раставанне скажы, чаму ты так ненавідзіш савецкую ўладу?”. На што Шышэя адказаў: “Я ж не дубіна. Ужо нешта ў жыцці бачыў, ды і шмат чаго чытаў, у тым ліку і кнігу генерала Краснова. А цяпер, калі сутыкнуўся вось з маёрам, які вёў следства да вас, дык за што ж яе любіць, калі ў яе гэткія прадстаўнікі?”. На тым Кастусь і растаўся з капітанам, аб якім захаваў зусім нядрэннае ўражанне.

Праз нейкі тыдзень Шышэі загадалі збіраць рэчы і выходзіць у двор. Развітаўшыся з аднакамернікамі, ён выканаў загад. У двары яго чакаў “варанок”, які прывёз Косцю ў гарадскую турму. Памясцілі ў камеру № 3, у якой ужо знаходзілася 6 чалавек, хаця камера была невялікай. Адзін з тых шасці сядзеў з забінтаванымі рукамі, увесь бледны. Добра прыгледзеўшыся, Косця пазнаў у ім Колю Вырко з Заполля - вёскі, што амаль

побач з Карэлічамі. Пры немцах Вырко працаваў у Наваградку школьным інспектарам. Пасля допытаў ён парэзаў сабе рукі, каб хутчэй памерці, але яго выратавалі. А пасадзілі Вырко па даносу адной настаўніцы, па нацыянальнасці полькі з прозвішчам Майснер. Яна працавала ў Адампалі, але акрамя польскай і нямецкай, больш не ведала ніякай мовы. А школы ў той час працавалі на беларускай мове, таму Вырко прыйшлося звольніць Майснер з працы. Вось яна і данесла на Вырко органам ЧК. Косця чуў пра гэта ў час допыту праз прычыненыя крыху дзверы. Пасля ён быў удзячны лёсу, што сам бачыў Міраславу Майснер, а яна яго не бачыла. У час нагавору на Колю Вырко ён добра чуў і яе голас.

З камеры Косцю перавялі ў былую турэмную царкву на другі паверх, дзе ўжо ляжала на падлозе каля двухсот чалавек, што сведчыла аб тых нечалавечых адносінах да людзей. Да людзей адносіліся як да быдла. Сярод ляжаўшых знаходзіўся і вядомы кампазітар Аляксей Туранкоў, якому ў той час было ўжо амаль 60 гадоў. Але, на жаль, сярод вязняў былі і такія, што не лічыліся ні з адукацыяй, ні з узростам людзей. Менавіта на гэткіх і апіраліся энкавэдзісты, каб падтрымліваць у турмах і лагерах свае парадкі. Іх прызначалі старастамі камераў, рознымі майстрамі і іншымі сваімі прыслужнікамі. Вось і там быў такі староста, які закрычаў на гэтага пажылога і паважанага чалавека: “Гэй ты, фашысцкі музыкант, іграў немцам, дык цяпер ідзі і вынось парашу!”. І тут Шышэя не стрымаўся, падняўся з падлогі і на ўвесь голас сказаў: “Па-першае, гэта не музыкант, а вядомы кампазітар, а, па-другое, перад табою ўжо чалавек угадах. Што ты на яго крычыш! Мы ж усе людзі і не трэба траціць прыстойнасці, дзе б мы ні знаходзіліся”. Сказанае толькі што папоўнішым камеру навічком задзела старасту і ён, пакінуўшы ў спакоі Туранкова, перакінуўся на Шышэю: “А твая якая справа? Шкадуеш яго, дык нясі сам!” На што Кастусь адказаў: “Так, я маладзейшы, я і вынесу”. Пасля чаго ўзяў гэтую пераносную турэмную прыбіральню і вынес.

Убачыўшы падняўшагася на ўвесь рост і пачуўшы голас таго, хто яго калісьці знайшоў у Докшыцкім лесе і з кім пасля прыйшлося служыць у беларускім войску і дэсантавацца, да Шышэі стаў праціскацца яшчэ зусім малады чалавек. Калі ён падыйшоў бліжэй, Кастусь адразу пазнаў - гэта быў Міша Бычок, які і паведаміў, што выдаў яго Федаровіч. Больш спаткацца з

Мішам Косці не давялося.

Праз нейкіх месяцаў два Шышэю перавезлі ў Гомель, у новую турму, якую тады толькі што пабудавалі палонныя немцы. Дарэчы, гэта вельмі паказальна, што ў Савецкім Саюзе пры адбудове разбураных у час вайны гарадоў і вёсак сярод першачарговых аб`ектаў былі і турмы. Там, у Гомельскай турме, у той час знаходзілася і ўзгаданая раней Вера Краскоўская, якая, убачыўшы Косцю, памахала яму рукою. А самога Шышэю прызначылі ў 44 камеру. Там ён сустрэўся з вядомым дзеячом беларускай культуры, працаваўшым у свой час рэдактарам часопісаў “Калосьсе” і “Студэнцкая думка”, дырэктарам Віленскага беларускага музэю Янкам Шутовічам. Да таго часу Кастусь асабіста не ведаў, як Аляксея Туранкова, так і Янку Шутовіча, але калі на пераклічцы назвалі знаёмае прозвішча, ён у апошняга запытаў: “А скажыце, Віктар Шутовіч - гэта не ваш брат?”. Янка Шутовіч здзівіўся і таксама запытаў: “А вы адкуль яго ведаеце? Так, гэта мой стрыечны брат”. Шышэя адказаў, што ён сядзеў з Віктарам Шутовічам у адной камеры ў “амерыканцы”. Усяго ў 44 камеры сядзела 12 чалавек. Але найлепш адчуваў сябе Шутовіч, бо яго жонка Она Міцютэ дастаўляла яму падаянкі. Гэтая жанчына вельмі любіла свайго мужа і 12 гадоў верна яго чакала, пакуль ён не вярнуўся дамоў.

І вось на пачатку жніўня Шышэю судзілі, калі тую цырымонію, якая адбылася ў 46 камеры турмы, навогул можна лічыць судом. У камеры, куды прывялі Шышэю, сядзеў старшы следчы ўсё таго ж КДБ старшы лейтэнант Цюрын і начальнік рэжыму турмы Серада. Удакладніўшы прозвішча, імя і імя па бацьку, год і месца нараджэння вязня, Цюрын зачытаў пастанову Маскоўскай Асобай нарады, згодна якой Шышэя Канстанцін Іванавіч асуджаўся на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Пасля зачыткі пастановы Цюрын прапанаваў Шышэю падпісаць дадзеную паперу, на што Косця адказаў: “Я не буду падпісваць. Я не разумею вашага суда. Тут няма ні суддзі, ні абвінаваўцы, ні абаронцы. Сядзяць двое і ўсё. Гэта ж не суд, а нейкі фокус”.

Старшы лейтэнант засмяяўся і сказаў: “Вось табе і фокус. Накуралесіў у жыцці, вось і атрымлівай”. А пасля спытаў:”Дык будзеш падпісваць?”. На што Шышэя зноў адказаў: “Не буду”. Тады старшы лейтэнант сваёю рукою на пастанове дапісаў, што абвінавачаны ад подпісу адмовіўся. Пасля гэтага Шышэю адвялі ў камеру, але ўжо ў іншую, дзе было чалавек 7-8. Прабыўшы

там больш двух тыдняў, 28 жніўня Шышэю і яшчэ 6 асуджаных вывялі з турмы і адвялі ў калонію. Гэта быў дзень, калі Праваслаўная царква адзначае Дзень смерці Божай Маці. Ва ўсіх храмах праходзіць служба. Менавіта ў гэты дзень Косця апынуўся ў царстве ГУЛАГа, у задачу якога ўваходзіла перавыхоўваць звычайных прыстойных людзей у савецкіх. На практыцы гэта азначала падавіць у тых, хто трапляў у гэтае ізаляванае ад знешняга свету царства, волю і здольнасць самастойна думаць. Насельнікам названага царства пакідалі толькі адно права - пакорліва падпарадкоўвацца пастаўленым над імі наглядальнікам з сабакамі. Пры гэтым цяжка сказаць, у каго было больш літасці да трапіўшых туды людзей: у першых ці ў другіх.

Ужо калі гналі ў калонію, у Шышэі адказалі ногі. Прасядзеўшы 9 месяцаў без прагулак, ён амаль страціў здольнасць хадзіць. Таму, прайшоўшы некалькі метраў, Косця сеў і, нягледзячы на пагрозы канваіраў, пакуль крыху не адпачыў, не мог прайсці тых трох кіламетраў, якія аддзялялі турму ад калоніі. На прахадной яшчэ раз кожнаму ўзгадалі, хто ён і наколькі трапляе за высокую двайную сцяну калючага дроту. Калі пасля абвяшчэння яго прозвішча, імя, імя па бацьку і тэрміну адсідкі Шышэя зайшоў за прахадную, да яго падбег маладзейшы за яго хлопец - Лапіцкі Алег, які паходзіў родам з Дзісненскага павету і апынуўся ў царстве ГУЛАГа за членства ў Саюзе вызвалення Беларусі і сказаў: “Вы таварыш Сашы Мацука, з якім я сядзеў. Ён мне аб вас расказваў”. Падыйшоў да Шышэі і Пеця Яблонскі, родам з Лідскага павету, а таксама дзяўчына Мядзель Раіса, аб паходжанні якой гаварыла само прозвішча - яна была з Мядзелю. Усё гэта была моладзь, па лёсах якой пераехаў каток пралетарскай дыктатуры і зламаў ёй жыццё. Многія з маладых людзей былі вінаваты толькі ў тым, што, як патрыёты свайго народу, змагаліся за права мець свой дом - сваю незалежную дзяржаву. Але яны і тут, у царстве амаль са звярынымі парадкамі, не страцілі свайго чалавечага аблічча і прыстойнасці. Убачыўшы Косцю зусім абяссіленым, яны пастараліся знайсці яму хлеба, кавалачак сала, падзяліліся цяплом сваёй душы, сказаўшы добрае слова.

А тым часам Косця ўбачыў каля прахадной калоніі, мабыць, самую жахлівую, якую толькі прыходзілася бачыць у сваім жыцці, карціну. Сюды прыехалі двое ваенных: жанчына-

палкоўнік і яе брат - маёр. У калоніі за калючым дротам знаходзіўся іх бацька. Старшыя афіцэры Савецкай арміі прыехалі, каб публічна яго зняважыць і тым самым выслужыцца перад існуючым у тыя гады сталінскім рэжымам. З-за павагі да чытачоў нельга назваць тых слоў, якімі яны абзывалі пажылога чалавека, даўшага ім жыццё. Бацька пры гэтым не прагаварыў нават слова, стаяў моўчкі і слухаў сваіх, родных па крыві, нашчадкаў. Убачыўшы гэтую жахлівую карціну, Косця яшчэ раз узгадаў прачытаную ім у Дальвіцы кнігу Краснова, у якой генерал, характэрызуючы бальшавіцкі рэжым, папярэджваў, што ад безбожнай улады лепшага чакаць нельга. Менавіта ў гэты момант у Косці і ўзнікла думка - што б там ні было, трэба ўцякаць.

А калі мне Кастусь Шышэя расказваў аб гэтым нечалавечым паступку тых афіцэраў, я падумаў: "Які ўсё ж малайчына мой стрыечны брат з маёй роднай вёскі Лаўрышава - Васіл Чэрнік. Ён з 1927 года нараджэння і служыў у арміі аж сем гадоў. Па тых часах ён меў нейкую адукацыю, а самае галоўнае, па свайму выхаванню быў сумленным і дысцыплінаваным чалавекам. Таму праз некаторы час Васіль стаў старшыною роты. За прыкладныя паводзіны ён два разы ўзнагароджваўся паездкай дамоў на дзесяць дзён, а бацька яго ў той час адбываў сямігадовы тэрмін зняволення за тое, што ў час немцаў пагадзіўся з абраннем на сельскім сходзе яго старастам. Сядзеў бацька ў Магілёве і працаваў на шаўковаў фабрыцы. І калі Вася прыехаў дамоў у адпачынак, ён узяў з сабою маці і наведаў бацьку. Думаю, што пасля гэтага стала цяплей на душы ва ўсіх траіх".

Ну а Шышэя, крыху падужэўшы, стаў з іншымі насельнікамі калоніі хадзіць спачатку на будоўлі, а ў верасні месяцы на выгрузку яблыкаў, прывезеных у Гомель баржы, і на копку бульбы. Апошняе, канешне, гаварыла аб вельмі дрэннай эфектыўнасці вырашэння існуючай уладай харчовай праблемы, калі да гэтага патрэбна было прыцягваць нават вязняў. Але, нясучы ў карзіне яблыкі, ад слабасці Косця ўпаў, пасля чаго яго прызначылі грузчыкам на склад, дзе патрэбна было грузіць грэчку і іншыя прадукты, а ўсім, у тым ліку і канваірам, хацелася есці, таму разводзілі касцёр, насыпаўшы грэчкі ў вёдры, варылі кашу. На полі пяклі бульбу. Усё гэта было вялікай падтрымкай да тых казённых харчоў, што давалі ў калоніі.

Ходзячы на працу, Косця даведаўся, што побач ёсць цэх, дзе робяць цвікі. Тут у яго адразу з`явілася думка: "Значыць, там можна зрабіць і нож, без якога нельга было думаць аб уцёках". Але хто будзе рабіць нож дарма? Таму Касутсь папрасіў у Лапіцкага кавалачак сала, знайшоў у названым цэху чалавека, які і пагадзіўся яму за сала зрабіць нож. Нават дамовіліся аб памерах нажа (20 сантыметраў) і аб тым, што калі нож будзе гатовы, Косця знойдзе яшчэ кавалачак сала. Таму, капаючы бульбу, Кастусь ужо прыцэліўся, што амаль побач з полем пачынаецца лес, а там і рака, прайшоўшы якую па вадзе, ніякі сабака не возьме следу.

Але радасці ў Косці хутка скончыліся. Праз нейкіх дзён два копкі бульбы на поле пад`ехаў "варанок" і вылезшыя з машыны канваіры запыталі, хто тут Шышэя? У Косці нешта ўнутры ёкнула - ён зразумеў: дзядзьку злавілі з нажом. Каманду прыехаўшых узброеных людзей прыйшлося выконваць і садзіцца ў машыну. Шышэю прывезлі ў Гомель у тую ж самую турму, адразу завялі ў падвал, дзе сядзела тры канваіры і ўжо знаёмы Серада. На стале перад імі ляжала абточаная, але яшчэ не зусім вострая жалязяка. Паказаўшы на яе, сядзеўшы за сталом капітан спытаў: "Пазнаеш жалязяку?". На што Шышэя адказаў: "Не маю паняцця". Але ў гэты момант адчыніліся дзверы і ў пакой увялі таго чалавека, якому Кастусь заказаў нож. Пераступіўшы парог, дзядзька дрыжачым голасам сказаў: "Так, гэта ён. Пасля чаго Кастусь зразумеў, што ў дадзеным выпадку пярэчыць ужо няма чаго, таму, крыху падумаўшы, распавёў: "Раз дзядзька вам сказаў, дык чаго ж у мяне пытацца? А навогул, што тут дрэннага, мець нож. Можа, калі прывязуць сала, дык трэба ж нечым яго рэзаць"

Аднак капітан быў вопытны і ён усё разумеў. Таму засмяяўся і сказаў: "Ты не прыдурвайся. Нябось, рыхтуешся ўцякаць". Пасля гэткіх слоў вырашыў адкрыта гаварыць і Шышэя: "Ваша справа мяне сцерагчы, а я хачу жыць. Я не хачу сядзець задарма". І пачаў далей расказваць аб тым жахлівым выпадку, пасля якога ў яго і ўзнікла думка ўцякаць. Капітан зразумеў і гэты роспавед Шышэі, на які цяжка што-небудзь сказаць, акрамя як пагадзіцца з абурэннем Кастуся. Таму і капітан, паглядзеўшы на сваіх калегаў, вырашыў таксама сказаць адкрыта: "А ён па вялікаму рахунку гаворыць праўду. Наша задача яго сцерагчы і лавіць, а ён хоча ўцячы". А пасля гэтага яшчэ запытаў у Шышэі:

“А куды пабяжыш?”. На што адказ быў таксама адкрытым: “А куды вочы глядзяць”. І тут не вытрымаў Серада: “Во, дае!”. Але Шышэя працягваў: “Я бачыў польскую дыфензыву, нямецкае гестапа і вашае савецкае ЧК. Таму магу параўноўваць. Гэткай пакуты людзям ніхто не прычыняў, як вы на допытах”. Але на гэтым Шышэю зноў прыпыніў Серада: “Мы цябе зашлем туды, дзе Макар цялят не пасе. Ты чуў гэткую прымаўку?”. На што Шышэя адказаў: “Чуў. Шліце, ваша воля”. На гэтым Кастуся адвялі ў камеру, а потым з Гомеля перавезлі ў Оршу, дзе дзейнічала перасыльная турма. Сюды прыязджалі “купцы” за “таварам” з усіх рэгіёнаў Саюзу.

Вядома, што ў свой час Карл Маркс лічыў: “Пры таварна-грашовых адносінах капіталістычнага грамадства таварам з`яўляецца і рабочая сіла (здольнасць чалавека да працы). А пры сацыялізме, пабудаваным па бальшавіцкаму ўзору, таварам станавіўся і сам чалавек, калі ён патрапляў у турму ці папраўча-працоўныя лагеры. Як у свой час пры феадальным ладзе прадавалі прыгонных, так і пры бальшавіцкім сацыялізме прадавалі вязняў, толькі з той розніцай, што за прыгонных плацілі яшчэ і нейкую цану, а тавара-вязні не мелі кошту - іх проста распарцылёўвалі, куды лічылі патрэбным. Пры гэтым амаль не ўлічваліся здольнасці чалавека, бо ўсе вязні выкарыстоўваліся галоўным чынам на цяжкіх фізічных работах. Таму было важна, каб чалавек быў здольны рухацца. А гэта пры адпраўках новых партый вязняў з турмаў у папраўча-працоўныя лагеры вызначалі толькі па “попе” чалавека. У сувязі з гэтым перад адпраўкай на камісіі толькі здымалі нагавіцы і глядзелі: калі ў вязня там ужо тарчалі адны косці, абцягнутыя скураю, не бралі, а калі прыкмячалі яшчэ і крыху нейкага мяса, прызначалі на любую фізічную работу, а якое там у вязня сэрца, ціск і гэтак далей, усё гэта мала каго цікавіла: памрэ - другога дадуць; машына ж па набору ўсё новых і новых вязняў, як дарэмнай рабочай сілы, працавала бесперапынна.

А ў Аршанскай турме, як у свой час і ў Менску ў былой турэмнай царкве, Шышэя сядзеў у вялікай залі. Тут ён сутыкнуўся з новымі прынцыпамі турэмнага жыцця. У залі знаходзілася некалькі так званых “шасцёрак”, якія супрацоўнічалі з наглядальнікамі. Калі, скажам, нехта з новых вязняў прыходзіў у добрых ботах, яны яго адразу разувалі і боты перадавалі наглядальнікам. Гэткае рабілі і з вопраткай,

калі яна мела добры кошт. Затое яны ляжалі на нарах, курылі, маглі ў любога адняць харчы і ўсё беспакарана. Вось і ў той час у залі з`явіўся "навічок", па прозвішчу Бусел, з мяшком, поўным сухароў, каўбасы, сала. Але не паспеў ён і агляну цца, як ужо нехта з "шасцёрак" брытвай пацягнуў па мяшку і з яго ўсе харчы паляцелі на падлогу. Бусел схапіў вечка ад парашы і пачаў з яго дапамогай разбірацца з "шасцёркамі". Але тыя паднялі лямант, што, маўляў, у турму прывезлі бандыта. Бусла хутка забралі. І вярнуўся ён у тую ж самую залю недзе праз тыдзень. Але гэта быў ужо зусім іншы чалавек схуднелы, аброслы, ціхі.

Праз некаторы час Кастуся Шышэю і яшчэ больш 20-ці чалавек прызначылі на "этап" і перавезлі з Оршы ў Ярцова Архангельскай вобласці. Гэта таксама была перасыльная турма. Тут былі і тыя ж "шасцёркі", якія ў новенькіх нават вытрасалі кішэні і ўсё забіралі. Паспрабавалі яны зрабіць гэта і ў зайшоўшага нізкага росту, але каранастага чалавека, які на іх дамаганні сказаў: "Я з Волагды". Але "шасцёркі" не звярталі на яго адказ увагі. Тады ён паўтарыў яшчэ раз: "Я з Волагды". І калі і на гэты раз "шасцёркі" не супакоіліся, новенькі выхапіў з галяншча ботаў нож і праз імгненне пяць шасцёрак ляжалі на падлозе зарэзанымі. Безумоўна, пасля гэтага яго наглядальнікі забралі і кудысьці павезлі.

Гэта быў так званы "медзвежатнік" - разбойнік, як кажуць, у законе. Гэткіх лепш не чапаць і быць ад іх далей. Але і сярод іх таксама ёсць завярбаваныя органамі - тых завуць "сукамі". І калі "медзвежатнікаў" і "сукаў" збіраецца так многа, з імі становіцца ўжо цяжка суваладаць і ахове лагеру. Тады, скажам, у лагеры Аляксееўка, што поблізу Ярцова, іх сабралі і зачынілі ў адной камеры. І праз некалькі часу яны адны другіх знішчылі.

24 снежня 1945 года з Ярцова адабралі ўжо аж 300 чалавек і павезлі далей. Пад канец шляху перад цягніком ішла спецыяльная машына і чысціла снег, каб першы мог рухацца. Прывезлі ў нейкі тупік, дзе не было жывой душы, толькі стаяў пусты лагер. Прывезеным далі лапаты і загадалі чысціць снег, без чаго нельга было нават адкрыць варотаў. Калі снег абчысцілі і зайшлі ў баракі, стала бачна, што ў іх ужо даўно ніхто не жыў, у сценах былі нават дзіркі. Вось тут патрэбна было прыехаўшым жыць. Таму, узяўшы пілы і сякеры, вязні пайшлі за кіламетраў тры па цаліку, каб здабыць нейкіх дроў і крыху абагрэцца. А калі распалілі печы, у бараках усё пацякло.

Праз нейкі час знайшлі старую кухню, падвезлі два мяшкі магары і пачалі варыць на гэтым забытым Богам і людзьмі месцы першы свой суп. Аднак, не паспелі яшчэ добра абагрэцца і крыху адпачыць, як з`явіўся стараста па прозвішчу Чарнарот, які сам таксама быў вязнем, але, мабыць, за сваё нахабства патрапіў у "начальнікі". Вось ён і падняў крык, чаго, маўляў, паразлягаліся, нам патрэбна даваць план, пачысціць усе сцежкі, каб начальства бачыла, што тут жывуць людзі, якія прыехалі працаваць. Шышэя гэтага не вытрымаў і хацеў супакоіць услужлівага "таварыша", але яму гэтага не даў зрабіць побач стаяўшы з ім чалавек, які быў на гадоў 10 старэйшым за Косцю. Прозвішча гэтага чалавека Шамрай. Ён і сказаў Кастусю: "Навошта ён табе? Ты кажаш, што гэтага чалавека патрэбна забіць, каб ён не мучыў іншых. Яно так, ты правільна кажаш, але заб`еш Чарнарота, з`явіцца Чарнаморда. І што далей? Трэба пакуль што цярпець, ды рыхтавацца да ўцёкаў". А далей паведаміў, што ён ужо адзін раз уцякаў, калі яго везлі на Салаўкі. Ён будзе імкнуцца ўцячы і адгэтуль. Таму Шышэі прапанаваў далучыцца да яго, ды пашукаць, мабыць, яшчэ каго і ціха рыхтавацца да уцёкаў. Свой роспавед ён скончыў словамі: "А гэты няхай крычыць, бо хоча, каб чула начальства". Праз некалькі дзён з`явіўся і трэці, які таксама лічыў, што трэба ўцякаць, бо тут можна аддаць Богу душу. Ім быў па нацыянальнасці латыш. Але пакуль што ўсім траім прыйшлося затаіцца.

Гэты жудасны лагер меў ня менш жахлівую назву - Чорнае Возера. І гэткіх прыстанішчаў для патрапіўшых у няміласць да савецкай улады тут было некалькі. Усе яны размяшчаліся ў лесе вакол горада Каргаполь і былі аб`яднаны ў адно упраўленне. Дадзенаму упраўленню "зверху" даводзіўся план - кожны дзень нарыхтаваць 1200 кубаметраў лесу, з якіх 700 кубаметраў ішло на варку, у выніку чаго атрымлівалася сыравіна для цэлюлозы. 500 кубаметраў выкарыстоўвалася як дровы, што спальваліся ў печах. У лагеры "Чорнае Возера" дняўная норма лесанарыхтоўкі складала 250 кубаметраў.

Праважалі на працу ў лес кожны дзень пад гармонік, што само па сабе ўжо было здзекам над вязнямі, паколькі лагер "Чорнае Возера" быў ужо старым, дык паблізу яго лес выразалі раней, з-за чаго на працу трэба бало ісці за кіламетраў восем. Калі за працоўны дзень (за 10, а пасля 9 гадзін) не паспявалі

выканаць норму, заставаліся пазней і працавалі пры святле пражэктараў. Так што з працы ў лагер некаторыя самі ўжо не маглі ісці. У такім выпадку іх падвозілі, лежачы на санях. Праз некалькі часу гэткай цяжкай працы і сістэматычнага недаядання людзі пачалі слабець і паміраць.

У лесе заўжды гарэў касцёр, каля якога сядзеў пілапраў і ўвесь час вастрыў інстумент. Сякеры выкарыстоўвалі шведскія з доўгімі тапарышчамі і іх навострывалі так, што можна было брыцца. Калі-нікалі да кастра падыходзілі пагрэцца і тыя, каму рабілася дрэнна. Аднойчы прыхварэў і Шышэя. Ён падыйшоў да агню, каб крыху адвесці душу. Але гэта прыкмеціў наглядальнік Мамед, які таксама быў вязнем, але, як начальнік, жыў за зонай. Гэта быў вельмі грубы чалавек, які ўвесь час крычаў на вязняў і нават іх біў. Падбег ён і да Шышэі, калі ўбачыў, што той прысеў каля кастра і крыху задрамаў. Загнуўшы свой чарговы мат, Мамед ударыў Косцю так, што той апынуўся амаль у кастры. І не паспеў падняцца, як Мамед зноў паўтарыў свой бандыцкі выхад і пачаў крычаць: “Хто табе дазволіў адпачываць?”. І калі Шышэя ўбачыў, што Мамед хоча ўдарыць яго і ў трэці раз, ён схапіў побач ляжаўшую шведскую сякеру і з усёй моцы сам ударыў раз`юшанага наглядальніка так, што той зароў і ўпаў на зямлю. Пілапраў усё гэта бачыў і напалохаўся да паўсмерці. Убачылі гэта і салдаты, якія стаялі на вышках, таму пачалі страляць. Падбегла ахова, якая забрала Шышэю ў лагер і пасадзіла ў бур - асобную камеру, прывязаўшы за руку да сцяны. Мамеда завезлі ў бальніцу.

На заўтрашні дзень з упраўлення прыехалі паверань і лекар. Першы ў Шышэі запытаў: “Што будзем рабіць?”, на што Шышэя адказаў: “А вы запытайцеся ў пілапрапва”. Але ніхто не стаў шукаць ніякай справядлівасці. Так прывязаным за руку да сцяны Кастусь сядзеў два дні без ежы. І толькі на трэці дзень далі 300 грамаў хлеба і паўлітра кіпятку. У наступныя дні гэткую норму ежы захавалі. Таму праз тыдзень Косця аслабеў, у яго паднялася тэмпература, што прымусіла кіраўніцтва лагеру вярнуць хлопца ў барак - там было крыху цяплей. Аднак праз два тыдні ў Кастуся паявілася цынга і з лытак ног пацякла жоўтая вадкасць. А пасля і навогул ахапіла абыякавасць, арганізм не стаў ні на што рэагаваць і так абяссілеў, што Косця не мог без дапамогі нават сцягнуць з сябе нагавіцы. І тут з`явіўся той лекар, які прыехаў з упраўлення, агледзеў Шышэю і

сказаў: “Паедзем”.

Завезлі ў сельскагаспадарчы лагер, дзе вырошчвалі бульбу, капусту, турмус і іншыя расліны. У гэтым лагеры працавала палова мужчын, а палова жанчын. Там была і бальніца, куды і памясцілі Шышэю. Лекарам, якога замацавалі за Шышэям, з`яўлялася Зінаіда Аляксандраўна Крукава, якая да гэтага сама адбыла дзесяцігадовы тэрмін зняволення на Беламор-канале, а цяпер знаходзілася тут на вольным пасяленні. Зінаіда Аляксандраўна аказалася не толькі высока кваліфікаваным лекарам, але і добрым чалавекам. Адпакутаваўшы сама 10 гадоў, яна разумела і іншых, хто апынуўся ў гэткай жа бядзе. Крукава ўгаворвала Косцю не апускаць носа, бо ўнутры ён здаровы, а ўсё астатняе, маўляў, вылечым. Прыпісала яму лепшае харчаванне, а каб менш думаў аб сваіх балячках, дала сшытак, аловак і папрасіла разлінаваць лісты на графы. Але Косця настолькі быў слабым, што ў першыя часы засынаў за гэтай работай.

А тым часам яго чакалі, калі ён ачуняе, каб судзіць за той учынак з Мамедам. Таму ў палаце Шышэя ляжаў адзін і над ім увесь час стаяла ахова. У курсе гэтай справы была і лекар. Зінаіда Аляксандраўна і ў гэтым яго разважала: “Не бойся. Ты ж яго не забіў. Ён таксама лечыцца ў нас і ідзе на папраўку”. Суд адбыўся праз 2 месяцы пасля таго, калі Шышэю забралі ў бальніцу. У час суда заля была поўнай народу. Пракурору хацелася паказаць сваю строгасць, каб запалохаць іншых. З гэтай нагоды і суд быў адкрытым. Зачытваючы сваё патрабаванне, пракурор асабліва падкрэсліваў, што ўдар сякерай быў нанесены службовай асобе наўмысна, каб сарваць выкананне плана лесанарыхтовак і гэтак далей. А ў канцы патрабаваў ад суда вынесці Шышэю Кастусю смяротнае пакаранне. Але калі далі слова самому Мамеду, дык той сказаў: “Я сам вінаваты. Я ўдарыў яго першым. На яго месцы я паступіў бы так, як паступіў ён”. Пасля гэткага выступу пацярпеўшага слова ўзяў суддзя: “Калі гэтак, я справу закрываю. Усе свабодныя”.

Шышэя пайшоў далечвацца. У бальніцы з яго знялі ахову. У палату зайшла лекар і ад радасці аж заплакала. Яна таксама была на судзе і перажывала за яго вынік. А тут гэткае. “Як я рада за цябе”, - сказала Зінаіда Аляксандраўна, якая і далей працягвала адносіцца да Косці з павагай.

Сельскагаспадарчы лагер размяшчаўся над возерам Пукста, на другім баку якога стаяў вось той завод, дзе з дрэва варылі сыравіну для цэлюлозы і адпраўлялі ў Анеглагер для вырабу з яе пораху. Возера было вялікім, але Косцю яно не радавала. Больш таго, названае возера з`яўлялася агрэсіўным. На яго берагах расла вельмі ядавітая расліна - цыкута, у якой былі доўгія белыя карані. Цыкута знешне была падобнай на рускую рэпку, ад якой адрознівалася толькі афарбоўкай каранёў: апошняя мела чорныя карані. Патрэбна было толькі адзін раз укусіць цыкуты і глынуць, і чалавек паміраў. Таму ў лагеры віселі плакаты з папярэджаннем, каб вязні, хацеўшыя ўвесь час есці, не спакусіліся на цыкуту. Аднак некаторыя людзі голаду не вытрымлівалі і спрабавалі наталіць яго смяротнай цыкутай.

Гледзячы на возера Пукста, Косця заўжды думаў аб сваіх, беларускіх - Кромані і Свіцязі. Ды і сам паўночны лес быў не такім, як у Беларусі. Каб усё гэта ўбачыць зноў, трэба было неяк выжыць. І Косця спадзяваўся, стаў жыць надзеяй, і ў гэтым немалую ролю сыграла цёплае, жаночае слова Зінаіды Аляксандраўны.

Перажыўшы столькі, Шышэя думаў і аб тым, а чаму ў трыццатыя гады падпісвалі на сябе паклёп тысячы адукаваных і на яго думку, вельмі моцных духам людзей. Сярод іх былі вядомыя вайсковыя начальнікі, палітычныя дзеячы, вучоныя. Ён жа ніякі не дзеяч, аб чым яму гаварыў і капітан на допыце, але ж вытрымаў усе пакуты і не падпісаў на сябе паклёп, як бы гэтага не дабіваўся той маёр. Пры гэтым, Божа сахрані, ён не лічыў сябе героем. Дарэчы, Косця аб гэтым некалькі разоў гаварыў у час размовы са мною. І казаў ён гэта шчыра. Косця не той чалавек, які будзе нешта гаварыць, каб прыцягнуць да сваіх паводзін больш увагі.

Але як чалавек, які сам перажыў усе гэтыя кэдэбісцкія “Мачыць!”, пры адказе на дадзенае пытанне ён і прыйшоў, на наш погляд, да правільнай высновы. Паводзіны тых людзей, якія ў час допытаў падпісвалі на сябе паклёп, на яго думку, тлумачыцца тым, што ў іх былі маці, жонкі, дзеці. Косця лічыць, што каб і яму пасля “мачэння” сказалі, калі не падпішаш, што ты растраляў 93 савецкіх ваеннапалонных, на тваіх вачах будзем “мачыць” тваю маці, ён падпісаў бы, каб толькі пазбавіць самага блізкага свайго чалавека ад тых цяжкіх пакутаў, якія давялося перажыць самому. І таму, Косця не-не ды і думаў, што яму

гэтым не маглі пагражаць, а сам ён будзе трымацца колькі ёсць сілы, але не пойдзе на паклёп на сябе.

А тым часам прыйшла вясна. Пачаліся палявыя работы. Косці з кожным тыднем станавілася ўсё лепш і лепш. Ён стаў адчуваць сілу. І калі ўлічыць, што яму ў той час яшчэ не было і трыццаці, дык вядома, не-не ды і хацелася паглядзець у бок маладых дзяўчат, якіх, дарэчы, у лагеры было шмат. Прычым многія з іх хацелі стаць цяжарнымі, бо гэткіх, згодна ўказу Вярхоўнага Савета СССР, вызвалялі з лагеру датэрмінова. Праўда, указ не тычыўся палітычных вязняў. Некаторыя дзяўчаты наладжвалі на мужчын амаль паляванне. Таму ноччу мужчыны баяліся выходзіць у двор нават па сваіх патрэбах. Бо ўсё гэта было небяспечна: можна было падхапіць сіфіліс ці нейкую іншую брыдкую хваробу. А лекаў не было, таму хворых адпраўлялі ў спецыяльны лагер, дзе яны ў страшэнных пакутах дажывалі свае апошнія дні, аб усім гэтым Косці распавядала ўсё тая ж Зінаіда Аляксандраўна, за што ён ёй таксама застаўся ўдзячны.

Аднак сімпатыя з`явілася і ў Косці. Праўда сымпатызавала больш яна яму, чым ён ёй. Імя яе - Ванда. Ростам была невялікай, але з твару прывабнай. Да таго ж была нядрэннай швачкай і шыла неабходныя рэчы жонкам начальнікаў. За тое заўжды мела добрае харчаванне і добрае адзенне, ды і адчувала сябе смела. Вось Ванда і прыкмеціла маладога, чарнявага хлопца, падыйшла да Косці да і кажа: “Вось гэта будзе мой”. Некалькі разоў заходзіў да яе ў майстэрню і Кастусь. Там Ванда яго частавала ўсялякімі прысмакамі, але заадно і папярэдзіла: калі ты, маўляў, будзеш мець справу і з іншымі, дык глядзі… А што такое “глядзі”, Косці патлумачыла дзяўчына з Латвіі, якая працавала ў пральні. Яна і папярэдзіла Кастуся, што гэтая ведзьма на той свет адправіла ўжо 6 чалавек, з якімі раней вадзіла “шуры-муры”. Ды аднаго разу Косця і сам бачыў, як паводзіла сябе Ванда ў час злосці: яна тады сапраўды паходзіла на ведзьму. Гэта было ў сталовай, дзе, кажуць, яе нехта пакрыўдзіў, пасля чаго яна паднялася і пайшла ў ботах па сталах, а лаялася на чым толькі стаіць свет.

Праз некаторы час гнеў Ванды і яе хуліганскія ўчынкі Косці прыйшлося паспрабаваць і на сабе. Аднойчы ён спыніўся і стаў размаўляць з іншай дзяўчынай. Адкуль ні вазьміся, прыбегла Ванда і схапіла гэтую дзяўчыну за валасы. Каб супыніць

раз`юшаную бандытку, Косця ўдарыў ёй па шыі рукою так, што яна ўпала і з яе носу пайшла кроў. У выніку гэтага падняўся гвалт. Але Косця працягваў стаяць на месцы, у той час як Ванда дастала нож і хацела кінуцца на хлопца. Кастусь гэта зразумеў і хутка адабраў нож, а самую хуліганку скруціў і стаў трымаць. У гэты час прыбеглі наглядальнікі і Ванду забралі, пры гэтым забралі і нож, ды Косця тут і не супярэчыў. Праўда, нож хутка вярнулі Вандзе. А Шышэю выклікаў начальнік лагера старшы лейтэнант Кушняроў і стаў яго як бы папракаць: “Ну што ты думаеш? Ты ж ведаеш, з кім завёўся?”. Але Косця вырашыў не маўчаць і тут. ”Гэта не я з ёю завёўся, а вы яе распусцілі. Я яе заб`ю”, - сказаў Шышэя. Адчуўшы гэткую смеласць у хлопца, начальнік лагера яшчэ раз запытаў: “Дык што, будзеш забіваць?”. На што Шышэя адказаў пытаннем: “А што, трэба каб яна мяне забіла?”. Зразумеўшы, што справа можа скончыцца вельмі дрэнна, Кушняроў пастараўся, каб Ванду вывезлі ў другі лагер. Праўда, праз дзён 10 яна ўцякла з таго лагера і, каб адпомсціць Косці, зноў з`явілася на прахадной сельгаслагеру. Аднак наглядальнікі хутка схапілі яе і кудысьці адправілі зноў, пасля чаго яна больш не з`яўлялася.

У сельскагаспадарчым лагеры Шышэя прабыў прыкладна паўгода. Зінаіда Аляксандраўна Крукава знаходзіла прычыны і сколькі магла, столькі яго там і трымала. Але ў лагер прыехаў з упраўлення ўпаўнаважаны і хлопца адгэтуль выгнаў, пасля чаго Косцю адправілі ў лагер Паўлуш Возера. Гэта быў новы і вельмі вялікі лагер, разлічаны на 3000 вязняў. Тут, акрамя баракаў, у той час будавалася бальніца і конны двор. Лес быў побач. Там Шышэя застаў яшчэ палонных японцаў, якія і будавалі баракі, што зноў-такі сведчыла аб тым, што сярод першачарговых будоўляў у Савецкім Саюзе лічыліся не толькі турмы, аб чым Косця зразумеў яшчэ ў Гомелі, але і канцэнтрацыйныя лагеры. Умовы будоўлі лагеру былі настолькі цяжкімі, што з 10000 чалавек, прыехаўшых на будоўлю, да таго часу засталося толькі каля 2000 ваеннапалонных. Прыехаўшыя насельнікі лагеру адабралі ў японцаў адзенне, на што тыя, безумоўна, паскардзіліся начальству. Прыехаўшая камісія скаргу праверыла і вярнула японцам вопратку. Але, каб не здарылася пасля гэтага нейкага непажаданага інцыдэнту, японцаў адтуль адправілі.

Начальнікам лагеру быў капітан Шылаў. Праз некалькі дзён

началася распрацоўка лесу. Для гэтага квартал лесу агароджавалі і па вуглах ставілі вышкі для аховы. Усіх вязняў падзялілі на звенні, у якія ўваходзіла звычайна 12 чалавек. Звеннявым прызначаўся той, хто валіў лес. І калі ён перавыконваў план, дык яго залічвалі ў перадавікі, за што лепш кармілі, а вечарам давалі цёплы кажух і везлі ў барак. Больш таго, калі ён быў перадавіком на працягу ўсяго часу прабывання ў лагеры, яму нават змяншалі на два гады тэрмін зняволення. Вось менавіта ў гэткіх перадавіках і хадзіў звеннявы Мацкевіч, дарэчы, беларус па нацыянальнасці, у падначаленне да якога і трапіў Шышэя.

Папрацаваўшы ў лесе нейкі тыдзень, Косця зразумеў, што калі працаваць гэткім тэмпам, які задае Мацкевіч, дык доўга так не працягнеш. Таму патрэбна было штосьці рабіць. І першае, што Косця вырашыў, дык гэта сказаць Мацкевічу. Але апошні кіраваўся ўжо не чалавечымі, а няпісанымі лагернымі законамі: ты памры сёння, а я заўтра. Таму на заўвагу Косці, што з-за сваіх двух гадоў звеннявы давядзе да магілы астатніх людзей звяна, ён і адказаў словамі названага лагернага закону, дадаўшы пры гэтым: ты працуй, а не камандуй! Пачуўшы гэткі адказ, Косця сказаў: “Хочаш, дык працуй, а я ад цябе адыходжу”.

Раніцай наступнага дня Шышэя і сапраўды не пайшоў у звяно, а спіліў тры хваіны і пачаў іх апрацоўваць. Але тут да яго прыйшоў майстар і стаў у Косці высвятляць, у чым справа. Больш таго, майстар прыгразіў Шышэі не прыняць у яго лесаматэрыял. Безумоўна, спачатку Косця тут нічога не зразумеў: ён жа працуе і чаму майстар пагражае не прыняць лес. А тым часам яму яшчэ і норму хлеба знізілі да 450 грамаў.

Зразумець усю гэтую сістэму Косці дапамог Пецін, які меў лагернага стажу каля 17 гадоў і ў дадзены момант працаваў на сушылцы, дзе вязні сушылі вопратку. Вось ён і сказаў: “Ты бачыш, што робяць гэтая большая пайка хлеба і змяншэнне двух гадоў зняволення? Гэта патагонная сістэма працы, якая людзям скарачае жыццё. Наша ж задача заключаецца ў тым, каб выжыць, а не спіліваць больш лесу”. Далей Пецін распавядаў Косці і аб сабе: некалі ён быў камуністам, меў эканамічную адукацыю, а таму выступаў супраць арганізацыі калгасаў, як неэфектыўнай формы гаспадарання, за што і быў асуджаны. Крыху пазней Пецін навучыў Косцю, як з дапамогай

смалы, калі яе ўвесь час жаваць, можна пазбавіцца ад цынгі. Праўда, гэтая навука далася Косці нялёгка, бо, калі ён узяў смалу ў рот і пачаў жаваць, дык у першыя некалькі гадзін разам са смалою пачалі выцягвацца і зубы. У Косці нават з`явілася думка, што Пецін з ім так дрэнна пажартаваў. Але вечарам зубы сапраўды сталі мацнейшымі. А ў той дзень, калі Пецін распавядаў Косці аб лагернай сістэме, дык ён яго і папярэдзіў, што табе, маўляў, гэтага сваявольства тут ніхто не даруе.

Так яно і здарылася. Шышэю выклікалі да начальніка лагеру Шылава. Там ужо сядзелі прараб і майстар. Звярнуўшыся да Шышэі, Шылаў запытаў: "У чым справа? Хто ты такі ? Што ты партызаніш?". На што Косця адказаў: "Ніхто". Пасля гэткага адказу Шылаў зноў запытаў: "Чаму не працуеш?". І тут Косця вырашыў трымацца на сваім і сказаў: "Я буду працаваць на сябе, а не на безглуздых". А тым часам да размовы падключыўся і майстар. Павярнуўшыся да начальніка лагеру, ён стаў тлумачыць, што Шышэя бунтуе іншых, якія, маўляў, таксама хочуць працаваць, як і ён, - толькі на сябе. Але прычыну сваіх паводзін патлумачыў і Шышэя: "Я хачу перажыць гэтыя дзесяць гадоў, якія мне далі ні за што. Я прыехаў сюды не грошы зарабляць". Пасля гэткіх слоў Шышэі, Шылаў вырашыў супакоіць упартага вязня і крыкнуў: "У бур яго! Мы прымусім цябе працаваць!".

Бур - гэта халоднае і цёмнае памяшканне, з якім Косця ўжо быў знаёмы. Патрапіўшым туды двое сутак зусім не давалі есці, а пачынаючы з трэціх, давалі 300 грамаў хлеба і адзін раз у суткі нейкай баланды. І вось, калі ў бур прывялі Шышэю, сядзеўшым у ім сямі вязням паведамілі, што гэта, маўляў, фашысцкі партызан. Безумоўна, сядзеўшых у буры вязняў гэткае паведамленне зацікавіла. І таму "галоўны", па мянушцы "Мішанька", запытаў: "Ты адкуль тут з`явіўся?". На што Косця адказаў: "З Чорнага возера". Пачуўшы ад навенькага гэткі адказ, Мішанька яшчэ больш зацікавіўся: "Дык гэта ты рубануў Мамеда?". Шышэя зноў спакойным голасам адказаў: "Я не рубануў, а ўдарыў". Тады пытанне зноў задаў Мішанька: "А чаму ж яны цябе завуць фашыстам?", на што Косця патлумачыў: "Яны ўлада, як хочуць, так і абзываюць".

Седзячы ў буры, Шышэя ў першы дзень даведаўся яшчэ аб адным новым, на гэты раз зусім нечалавечым, баку лагернага жыцця. Тут сядзеў нехта Іван Падапрыгара. Сюды яго прывезлі

з лагера Возера Кочка і змясцілі ў бур за тое, што ён, у ліку іншых, зварыў з повара студзень. Для яго канцэнтрацыйны лагер быў родным домам. У ім Падапрыгара адчуваў сябе зусім нядрэнна, кожную раніцу нават скакаў. У яго паводзінах не было ніякіх межаў. Вось і тут ён запрапанаваў "галоўнаму": "Мішанька, давай зварым партызана!". Але Шышэя не разгубіўся і адказаў: "Я сам любому галаву адсяку!". Такі адказ Мішаньку спадабаўся. "Дык ты ж маладзец, ты пайшоў на Мамеда", - пахваліў ён Шышэю за смелы пастулак на Чорным Возеры.

Вечарам дзверы бура адчыніліся і сюды падалі поўнае вядро прыгаркаў, што наскрэблі з бакоў і дна катла. На вячэру Мішанька паклікаў і Шышэю, пасля чаго Косця зразумеў, што сядзеўшая ў буры кампанія не галадала, хаця і не хадзіла на працу.

На пятыя суткі Шышэю выклікаў Шылаў. І калі Косця толькі пераступіў парог кабінета начальніка лагеру, апошні ў яго запытаў: "Ну, дык ты адумаўся?". На што Шышэя адказаў: "Я заўжды думаю. Толькі мала што з маіх думак атрымліваецца". І пачакаўшы нейкую хвіліну, дадаў: "Ці ж так патрэбна? Звеннявы навальвае дрэва на дрэва, а пасля гэтага людзі мучаюцца. Таму гэтая яго спешка толькі шкодзіць і замаруджвае, а не паскарае справу". Выслухаўшы роспавед Шышэі, начальнік лагеру запытаў: "Ну, а як ты думаеш жыць далей? Падохнеш жа!". На пытанне Шылава Косця адказаў зноў упэўненым голасам: "Мяне выручае Бог. У лагер мяне адправілі, каб я падох, але я жыву. І ні на кога ні за лагер, ні нават за тое, што пасадзілі ў бур, не крыўджуся, бо ва ўсім гэтым вінаватая існуючая сістэма, а не вы". У адказе Косці адчувалася навука Пецiна.

Шылаў зразумеў, што мае справу з дасведчаным чалавекам, якога патрэбна паважаць як асобу, хоць ён і з`яўляецца вязнем. Таму дастаў з шафы кавалак хлеба, масла, паклаў мармелад і паставіў на стол гарбату. А пасля зноў запытаў: "Ты малады, у СССР не жыў, дык як ты можаш яго ненавідзець?". Пачуўшы гэткае пытанне, Косця яшчэ больш упэўніўся, што і ён мае справу з разумным чалавекам, і таму вырашыў сказаць усё, што ён думаў аб краіне Саветаў: "Так, я вучыўся ў польскай школе. Вы тады ў СССР будавалі Днепрагэс і капалі Беламорканал. Але ж мы ведалі, што ўсё гэта рабілася на людскіх касцях. У вашай краіне людзі галадалі; каб не памерці з голаду, елі каніну, ды і той не хапала". Далей Шышэя расказаў начальніку лагеру

аб кнізе Краснова.

Пасля размовы Шылаў адправіў Шышэю ў бур, але на заўтрашні дзень зноў выклікаў да сябе ў кабінет на працяг размовы. На гэты раз ён пачаставаў Косцю вяндлінай і чаем, а пасля гэтага папрасіў не баяцца і гаварыць усё, што ён думае. Шышэі гэта спадабалася, аднак ён добра разумеў, што начальнік лагеру, няхай сабе і разумны, але ж таксама не больш як "вінцік" у сістэме. Таму ад яго мала што залежала. І ўсё ж Косця вырашыў быць з Шылавым і далей адкрытым наконт сваіх думак аб савецкай уладзе. Размову Косця пачаў з таго, што ён не збіраецца нікога баяцца, бо і так сядзіць у буры. Пасля гэтага зноў пачаў распавядаць аб кнізе генерала Краснова. А ў канцы сваёй размовы сказаў: "Савецкія выхаванцы жывуць самі дрэнна і не даюць добра жыць іншым. Таму гэта бандыты, хаця, мабыць, і не зусім. Але больш усё-такі бандыты. Ды іншымі яны і не могуць быць, калі не прызнаюць Бога". Далей выказаў свае думкі і аб камуністычнай партыі, якая давяла да торбы Расію, а цяпер хоча гэта зрабіць і з іншымі краінамі. Размова дайшла і да таго, што Косця расказаў начальніку лагера і пра сябе: чым займаўся да прыходу савецкай улады і наогул, як жылі заходнія беларусы, калі мелі сваю гаспадарку.

Выслухаўшы роспавед Косці, Шылаў папярэдзіў вязня, каб ён аб усім гэтым не гаварыў у бараку. Але і тут Кастусь быў адкрытым. "У бараку ёсць шмат разумнейшых за мяне, - сказаў Косця, - яны ўсё гэта добра ведаюць, але вымушаны працаваць з намі, а "сукі" сядзяць ды грэюцца каля агню, або нават цэлымі днямі ляжаць у бараку. Дык якая ж гэта ўлада, калі дазваляе гэткае?".

Ідучы ад Шылава зноў у бур, Косця падумаў, што начальнік лагеру, мабыць, і ведаў аб тым, што ім носяць прыгаркі, але, будучы па прыродзе чалавечным, на гэта заплюшчваў вочы. А калі прыйшоў у бур, дык паспеўшыя з ім пазнаёміцца вязні, зацікавіліся, чаго гэта начальнік лагеру да яго прычапіўся, на што Косця адказаў, што на тое ён і начальнік, каб нас муштраваць ды ўсё ведаць.

Праз дзень Шышэя зноў быў у кабінеце начальніка лагеру. На гэты раз там сядзеў і начальнік коннага двара. Размову Шылаў пачаў з таго, што ўзгадаў аб роспаведзе Косці, як ён з бацькам вазіў лес. А пасля прапанаваў начальніку коннага двара ўладкаваць Шышэю на працу, дадаўшы пры гэтым, што "ён табе

падыходзіць".

Першым пытаннем, якое Шышэі задаў начальнік коннага двара, было аб тым, ці сапраўды ён любіць коней. На гэта Шышэя адказаў пытаннем: "А хто іх не любіць?". Тады начальнік кондвара патлумачыў, што ёсць коні, якія кусаюцца. Вось і ў нас, маўляў, ёсць такая кабыла па мянушцы Ваза, шэрая, на выгляд прыгожая, але ж працаваць на ёй ніхто не можа. А далей сказаў аб тым, што начальнік лагеру прапануе яму даць гэтую кабылу, каб Шышэя вазіў на ёй лес. Прычым яму не будзе даводзіцца ніякая норма: колькі за дзень вывезе, столькі і добра.

Шышэі, як возчыку лесу, прызначылі 850 грамаў хлеба, што было на цэлых 200 грамаў больш, чым ён атрымліваў, калі працаваў з сякерай і абсякаў галлё. Але самай галоўнай у той час была цікавасць: ён не мог паверыць у тое, што конь не слухае чалавека. Таму з прапановай абодвух начальнікаў адразу пагадзіўся. Але перш чым пайсці ўжо ў барак, зайшоў яшчэ ў бур, развітаўся з яго насельнікамі і пажадаў ім усяго добрага. Пераначаваўшы, раніцай пайшоў на конны двор, дзе яму і паказалі непаслухмяную Вазу.

Перш чым кабылу пачаць запрагаць, Косця папрасіў, каб яму далі крыху аўса. Просьбу яго задаволілі і ён накіраваўся да ганарыстай незнаёмкі. Пакарміўшы аўсом, Косця пагладзіў Вазу па шыі, надзеў на яе аброць і, узяўшы за павадкі, вывеў у двор; пасля зноў пагладзіў, надзеў хамут і запрог кабылу ў сані. Далей, узяўшы зноў аўса, пайшоў наперадзе, а Ваза - за ім. Пасля сеў у сані, і тут кабыла стала. Тады Косця ўстаў і зноў пайшоў наперад, Ваза пайшла следам. І вось тут Косця здагадаўся, што далей рабіць. Прыйшоўшы на конны двор, ён папрасіў прышыць да аброці скуркі, каб Ваза не магла пазіраць убакі, а тым больш, глядзець назад.

На заўтрашні дзень Косця паўтарыў усё тое, што рабіў к папярэдні дзень. А далей усё адбылося так, як ён і меркаваў: кабыла ішла і тады, калі ён сеў у сані. І гэткія трэніроўкі пачалі паўтарацца кожны дзень, але праз нейкі тыдзень Косця зноў патрапіў у непрыемнасць. У іх барак ноччу ўварваліся пяць чалавек з іншага бараку і пачалі па чарзе будзіць і трэсці ўсіх 70 чалавек. Людзей сцягвалі з нараў і адбіралі ў іх усё, што ў каго было. Убачыўшы гэткі ўчынак бандытаў, Косця памацаў, ці ляжыць у яго пад падушкаю палена, якое ён кожны вечар клаў, каб было вышэй галаве. Спаў Кастусь на верхніх нарах, а пад ім

размяшчаўся прафесійны баксёр. І калі апошняга бандыты ўжо сцягнулі і пачалі крычаць на Косцю, чаму ён не злазіць з нараў, ён не вытрымаў: схапіў палена і “ахнуў” ім аднаму з бандытаў па галаве, ад чаго той упаў. Убачыўшы, што і бандыты таксама баяцца сілы, свае кулакі ў ход пусціў баксёр, а за ім пасмялелі і іншыя. Адчуўшы сілу, бандыты паднялі гвалт і сталі крычаць, што іх б`юць. Прыбеглі наглядальнікі. Усіх вязняў вывелі ў двор, паставілі ў шэраг. Дзяжурны паказаў, што паленам біў Шышэя, за што апошняга выклікалі да начальніка лагеру. Але самога начальніка не было на месцы, а яго намеснік, не стаўшы глыбока ўнікаць у справу, адправіў Косцю ў бур. Там яго спаткалі ўжо як добрага знаёмага.

Аднак хутка з`явіўся на працы і Шылаў. Даведаўшыся аб здарыўшымся, ён выклікаў Шышэю да сябе ў кабінет. Запытаўшыся аб тым, як ён зноў трапіў у бур, начальнік лагеру пацікавіўся, ці праўда, што Косця знайшоў узаемапаразуменне з Вазай. У сваю чаргу Косця распавядаў начальніку аб тым, як ён разлічыўся з бандытамі, а пасля расказаў і аб сваім метадзе авалодання наравістай жывёлай. Размова скончылася тым, што Шылаў сказаў: “Ладна, ідзі і займайся Вазаю”. І Косця зноў узяўся за справу.

У тыя дні Шышэя пазнаёміўся яшчэ з адным таварышам па няшчасцю. Гэта быў латыш па нацыянальнасці - Санды Упатнік. Апошні выклікаў Косцю ў двор і сказаў: “У мяне ёсць крупа і сала, але я не магу нічога сабе зварыць. Бо калі толькі пайду і пастаўлю свой кацялок на агульную пліту, дык прыходзяць гэтыя зладзеі і ўсё забіраюць”. А далей папрасіў у Шышэі, каб той пагадзіўся неяк дапамагчы яму ў гэтай справе. Шышэя пагадзіўся, толькі пры гэтым папрасіў кавалачак сала, каб было з чым падыйсці да “галоўнага злодзея”. Апошнім быў Чуб, які лічыўся “мядзвяжатнікам” і амаль увесь час ляжаў у бараку. У яго хапала і яды, бо ёю Чуба забяспечвалі меншыя зладзеі. Не чапала яго і начальства. Вось Шышэя і пайшоў да гэтага “блатнога ў законе”. Да гэтага часу ў Косці ўжо быў вопыт, як сябе паводзіць з такімі “камандзірамі”. Таму, увайшоўшы ў барак, дзе праводзіў свой час Чуб, Шышэя звярнуўся да яго, як да самага паважанага чалавека: “Многапаважаны Чуб! У мяне да вас ёсць пытанне. А распавядаў мне аб вас Мішанька”. Пачуўшы аб тым, хто пра яго распавядаў, Чуб адразу зразумеў, з кім ён мае справу: лагерная пошта працавала безадказна.

Таму Чуб аж усклікнуў: “Дык гэта ты з Чорнага возера?!”. А далей паведаміў аб тым, што Чорнае Возера расфармавалі і запытаў: “А якая справа ў цябе да мяне?”. Косця патлумачыў і падаў Чубу кавалак сала. Але Чуб, адмовіўшыся ад сала, важна сказаў: “Забяры сваё сала і ідзі вары кашу. Ніхто цябе не закране”. Далей Чуб запытаў у Шышэі пра Мамеда, а таксама аб тым, чым Косця займаўся. Пры гэтым дамовіліся, што Кастусь пракоціць яго на Вазе. Размова зайшла і аб тым, як людзі жылі за польскім часам, як жывуць латышы.

Але калі Шышэя пачаў варыць сваю кашу і на нейкую хвілінку адхіліўся ад пліты, яго кацялок знік. Прыйшлося зноў ісці да Чуба. На гэты раз апошні сказаў: “Ідзі. Пакуль прыйдзеш, усё будзе стаяць на пліце”. І сапраўды, кацялок стаяў на месцы, праўда, пусты. Таму Косця яшчэ раз папрасіў крупы і зноў заняўся варывам вячэры. Зварыўшы кашу, ён даў яе па нейкай лыжцы і тым, хто зноў стаялі побач з плітой і чакалі новай ежы, хаця на гэты раз ужо не асмельваліся “гаспадарыць” самі ў чужым кацялку. Так было і ў наступныя дні, пакуль з самім Сандам Упатнікам не здарылася бяда: 19-гадовы хлопец рассек яму галаву за тое, што ён не даў яму самасаду, які курыў сам. Шышэя яшчэ наведаў Санда ў бальніцы, але той хутка памёр. У такіх выпадках апісвалі маёмасць памерлага, апошняга хавалі і на яго магіле, замест крыжа ставілі палку, на якой быў пазначаны лагерны нумар вязня.

А тым часам Шышэя працягваў працаваць на вывазцы лесу. Справа дайшла ўжо да таго, што Ваза стала вывозіць у дзень па 12 кубаметраў лесу, пры норме 18. Але Косця хутка захварэў, яго паклалі ў бальніцу, дзе і праляжаў два тыдні. У гэты час начальнік кондвара даручыў Вазу іншаму чалавеку. А той нагрузіў на сані столькі лесу, што Ваза знаравілася і не пайшла. Новы фурман пачаў яе біць. Кабыла ўпала і аб лёд выбіла сабе зубы, пасля чаго, як гэта і бывае ў такіх выпадках, Вазу забілі і зварылі на мяса. Даведаўшы аб здарыўшымся, Шылаў назваў начальніка кондвара дурнем, калі ён не мог убачыць, каму даручае наравістую кабылу. А майстру лесараспрацовак прапанаваў узяць Шышэю да сябе памочнікам - прымаць лес на біржы. Раней гэтым займаўся амерыканскі жыд - Леў Зільбершац. І калі кантралёры знайшлі недахоп лесу, дык суд прымовіў яго да смяротнай меры пакарання. Праўда, яго не растралялі і Косця з ім пасля спаткаўся ў Інце. Гэты вападак

палохаў і Косцю. Але яго выклікаў да сябе Шылаў і прапанаваў пачаць улік лесу нанава, не тычачыся да таго, які быў вывезены на біржу раней. І ў такім выпадку Косці нельга было адмовіцца ад прапановы начальніка лагера.

Стварылі новы склад лесу. Косця сустракаў сані з лесам, калі яны яшчэ пад`язджалі да біржы, а не сядзеў каля кастра з пілаправам, як гэта рабіў яго папярэднік. Гэткі падыход новага прыёмшчыка падабаўся і возчыкам. Дарэчы, пілаправам тады працаваў той жа башкір Татлыбаеў, якога Косця ведаў па Чорнаму Возеру. Татлыбаеў паведаміў Косці, што ў былым іх лагеры вязні паспрабавалі арганізаваць уцёкі. Для гэтага яны падпалілі лес і, скарыстаўшыся паднятым гвалтам, змаглі ўцячы. Але іх дагналі сабакі. Самы смелы з уцёкшых аказаўся знаёмы Косці Шамрай. Ён забіў дагнаўшага яго сабаку нажом. Але і яго самога застрэлілі. Другога ўцякаўшага Лацыса сабакі дагналі і загрызлі да смерці. Сярод уцякаўшых быў і сам Татлыбаеў. Яго сабакі не дагналі. Ён прабыў у лесе каля трох тыдняў, харчуючыся ягадамі і грыбамі. А адзін раз яму навогул пашанцавала: ён убачыў кабылу з жарабём. Жарабё ён забіў і частку зварыў на мяса, а астаняе вырашыў забраць з сабою, каб засталося на наступны раз. Але пад`еўшы на галодны страўнік жарабяціны, яго адолеў сон і ён заснуў. А калі прачнуўся, над ім ужо стаялі чатыры мясцовыя мужыкі і спрачаліся паміж сабою, хто з іх злавіў злачынца. Справа ў тым, што мясцоваму насельніцтву за гэта плацілі: за аднаго злоўленага вязня - адзін пуд мукі, адну бутэлькі гарэлкі і дзве пачкі яраслаўскай махоркі. Вось да чаго савецкая ўлада давяла людзей.

Вось і ў той дзень мужыкі звязалі Татлыбаева і здалі яго органам улады, а тыя вярнулі вязня ў лагер Чорнае Возера. Пры расфармаванні лагера Татлыбаева накіравалі ў Паўлуш-Возера, дзе яны і зноў спаткаліся з Шышэям.

У Паўлуш-Возеры Косці давялося ўбачыць і як гуляе па Паўночным лесе буран. Аднойчы ён пайшоў у лес сабраць на касцёр сухіх галінаў. І раптам бачыць, як ні з сяго ні з таго ўверх паднялася елка з каранямі, а за ёй другая, трэцяя… Убачыўшы гэткі цуд, Косця крыкнуў сядзеўшаму каля кастра Татлыбаеву: “Глядзі, глядзі!”. Але той ужо ведаў, чым гэткі цуд можа скончыцца і ў сваю чаргу крыкнуў Косці: “Уцякаем! Бяжы за мною! Гэта буран! Гэта лафа!”. І сапраўды, лес падаў, нібы яго

валіла нячыстая сіла. Пры гэтым было забіта некалькі коней, але людзі, дзякаваць Богу, змаглі ўцячы. Калі буран скончыўся, Татлыбаеў узяў сякеру і пачаў сячы ўжо нежывога каня, мяса схаваў у лесе. А тым часам у лагеры паднялася паніка. Трэба было хутка штосьці рабіць, каб расчысціць завалы на дарозе ды і прыбраць з дарогі забітых коней, сані.

Да гэтага выпадку Косця ніколі не еў каніны. А тут Татлыбаеў на заўтрашні дзень пасля бурану дастаў свае запасы і пачаў рыхтаваць з каніны пачастунак. У час варкі мяса ён некалькі разоў зліў ваду і давёў ежу да патрэбнага гатунку. Калі мяса было звараным, ён паклікаў і Косцю, патлумачыўшы апошняму, што каніна з`яўляецца самым чыстым мясам, бо коні, у адрозненне ад свіней, карыстаюцца таксама самай чыстай ежай. Калі Косця пакаштаваў, дык яму таксама каніна спадабалася, але, мабыць, перш за ўсё таму, што ў страўніку заўсёды адчуваўся голад. І некаторыя, каб наталіць голад, закручвалі ў анучку хлеб і бралі яго на ноч у рот. Але гэта самаабман. Ад гэтага яшчэ больш хацелася есці. Таму той жа Пецін сярод іншых парадаў выказаў Косці і гэтую.

Вядома, што наяўнасць хлеба заўжды сведчыла аб тым, галодны чалавек ці не. Вось і тут, у лагеры, да яго адносіліся з вялікай павагай, тым больш, што хлеба заўжды не хапала. Калі нарэзаны хлеб адносілі на абед у брыгаду, дык для гэтага падбіралі больш чэснага чалавека, прычым нават яго не адпраўлялі аднаго, каб не спакусіўся. А гэткі выпадак у Паўлуш-Возеры адбыўся. Сядзеўшы там архітэктар з Кіева Пралыгін, нясучы хлеб, не вытрымаў і крыху адшчыпнуў. Вязні сталі яго біць. Убачыўшы гэта, Косця падбег і стаў ратаваць Пралыгіна, крыкнуўшы: “Што вы робіце?”. На што пачуў адказ: “Ты глянь, ён усе давескі паеў”. А Пралыгін у той час, ледзь стрымліваючы боль, сказаў: “Я хачу есці”. І тут Косця зразумеў, у чым справа і таксама ўмяшаўся ў спрэчку: “Ты ж адукаваны чалавек і разумееш, што іншыя таксама хочуць есці. Таму нельга кіравацца звярыным інстынктам: ты памры сёння, а я заўтра. Я ж умею цярпець. Павінен навучыцца цярпець і ты”. І абараніў Пралыгіна. А сам падумаў: да чаго ж давялі людзей?

І такіх выпадкаў, калі Косця праяўляў сваю высакароднасць, было нямала. Аднойчы, сядзеўшы каля кастра, ён заўважыў, як звеннявы Ціханаў, рэжучы лес, зваліў ёлку на ёлку. І таму дзяўчаты, якія церабілі галлё, не маглі гэтым дрэвам даць рады.

Тады Ціханаў узяў палку і пачаў адну з іх біць. Косця не вытрымаў гэткага здзеку над дзяўчынай. Ён узяў сякеру, падыйшоў да Ціханава і запытаў: “Што ты здзекуешся з дзяўчыны?”. Ціханаў, мабыць, ведаў пра здарэнне з Мамедам, і таму ўбачыўшы ў руках Косці сякеру, падняў гвалт і пабег да начальства. А Косця тым часам падыйшоў да паваленых ёлак і дапамог дзяўчатам з імі справіцца. Але ў гэты час ужо прымчаліся наглядальнікі і абвінавацілі Косцю, што ён хацеў засекчы Ціханава. Шышэю і на гэты раз выклікаў Шылаў і спытаў: “Ну што там у цябе зноў?”. Шышэя расказаў начальніку лагера аб паводзінах Ціханава. Пры гэтым зазначыў, што сярод жанчын вельмі шмат прыстойных, якія маюць жаночы гонар. Вось таму Ціханаў і б`е адну з іх, што яна яму не паддаецца. Дарэчы, да арышту гэтая дзяўчына вучылася ў медінстытуце. Таму Шылаў, каб пагасіць канфлікт, адправіў яе ў бальніцу працаваць медсястрой. Пасля гэтага выпадку прайшоў пэўны час і калі Косця зайшоў у бальніцу, дык тая дзяўчына, якую ён некалі бараніў ад Ціханава, адразу яго прыкмеціла, падыйшла да Косці і яшчэ раз падзякавала, сказаўшы пры гэтым: “Вы мой спаситель”.

Ішоў час… Зверху паступіла каманда, згодна якой большасць палітычных вязняў пераводзілі ў Інту. Гэта тычылася і Косці. Шылаў не хацеў раставацца з такім скандальным, але разумным хлопцам. На жаль, не ўсё ад яго залежала, таму, паклікаўшы Шышэю апошні раз у свой кабінет, ён сказаў: “Прыйдзецца нам раставацца. Мне б не хацелася гэтага, але твой артыкул падыходзіць да вывазу ў Інту”.

* * *

Інта ў канцы 1948 года была яшчэ рабочым пасёлкам Комі АССР. Горадам яна стала толькі з 1954 года. Але Шышэя спачатку патрапіў у перасыльны лагер, які знаходзіўся побач з чыгуначнай станцыяй, што мела аналагічную назву і адлегласць ад якой да цэнтральнага пасёлку складала каля 12 кіламетраў. Гэта было так званае пятае лагернае аддзяленне Міністэрства унутраных спраў СССР. Тут знаходзілася каля 7 тысяч вязняў. Пры гэтым лагеры была і бальніца, куды пападалі атрымаўшыя ў шахтах траўмы. Самі баракі былі гэткага тыпу, як і ў іншых лагерах: пасярэдзіне сушылка, а па баках два вялізных памяшканні на 70 чалавек кожнае. Вязняў пятага лагаддзялення

выкарыстоўвалі на пагрузках і разгрузках вагонаў, а таксама ў кар`еры па здабычы друзу. Кармілі вязняў усё той жа баландой, давалі 650 грамаў хлеба і кіпяток.

Шышэя аднойчы ўбачыў там знаёмага яму ксяндза Віктара Шутовіча. Зацікавіўшыся яго лёсам, Косця прыкмеціў і барак, у якім ксёндз знаходзіўся. А калі зайшоў у барак, дык адразу яны і спаткаліся. Шутовіч паведаміў Косці, што ён таксама атрымаў “дзесятку”, згодна ўсё той жа Маскоўскай асабістай рады.

Праз два месяцы Шышэю перавялі ўжо ў трэцяе лагернае аддзяленне, якое знаходзілася бліжэй да цэнтральнага пасёлку. Калі Косця разам з іншымі вязнямі падыйшоў да вахты, дзе іх перадавалі новай лагернай ахове, ён убачыў, як вязняў вялі з вугальнай шахты. Карціна была жудасная: людзі ішлі калонаю па пяць чалавек у шэрагу, усе чорныя, у вугальным пыле. Убачыўшы гэткую карціну, Шышэю ахапіў проста жах і ён адразу стаў думаць аб тым, што трэба зрабіць, каб яго ў дадзены лагер не прынялі. Для гэтага ён скінуў ватоўку, кашулю, зняў з ног чуні і застаўся ў адных панчохах. Безумоўна, у такім выглядзе, у якім Шышэя падыйшоў да камісіі, апошняя сама не магла вынесці ніякага рашэння. Але Шышэю і не адправілі назад, а выклікалі аператыўніка, які, нягледзячы на адзенне, сказаў: “Трэба прымаць. Ён будзе даваць тут тоны вугля”.

Прыняўшы папаўненне ўсіх новенькіх завялі ў барак, дзе на працягу двух тыдняў яны прайшлі каранцін. Пасля гэтага ім выдалі вопратку, чаравікі і зноў павялі на камісію, якую ўзначальваў начальнік калоны, таксама вязень нехта Галакціёнаў. Членам камісіі была і лекар Зінаіда Гарбачова. І калі Шышэя прыйшоў на камісію, Галакціёнаў, якога Косця тады яшчэ добра не ведаў, сказаў: “Вось гэта дабытчык”. Але, даведаўшыся, што Галакціёнаў з`яўляецца таксама вязнем, Шышэя яму запрапанаваў: “Пойдзем дабытчыкамі разам, бо я адзін баюся”. Галакціёнаў прапановай абурыўся і таму са злосцю запытаў: “А гэта што за тып?”. Пасля знайшлі Шышэін фармуляр і сталі вывучаць, адкуль узяўся гэткі смелы. І калі даведаліся, што Шышэя быў на Чорным Возеры, Галакціёнаў сказаў: “Дык там жа адны бандыты! У Гражданстрой яго”. Прызначылі Шышэі і барак, які быў таксама стандартным.

Раніцай усе вязні, за выключэннем хворых, падняліся і пайшлі на працу. А Косця працягваў ляжаць на нарах. Увайшоўшы ў барак брыгадзір, ўбачыўшы Шышэю на нарах,

запытаў: “А ты чаго ляжыш?”. На што Косця адказаў: “Дык я ж толькі сюды прыбыў”. Такі адказ брыгадзіра не задаволіў і таму ён сказаў: “Тады будзеш гаварыць з Богам”. Косця, безумоўна, зразумеў, што гэта была пагроза, але як ні ў чым ні бывала адказаў: “Я кожны дзень размаўляю з Богам”.

Хутка ў барак увайшлі і наглядальнікі. Пералічыўшы ўсіх застаўшыхся, яны ў кожнага высветлілі прычыну, па якой ён не пайшоў на працу. Усе адказы вязняў запісваў нарадчык, які кожна дзень рабіў справаздачу аб іх удзеле ў працы. Дайшла чарга і да Шышэі. У яго, як і ў іншых, запыталі: “Ну а ты што застаўся?”. На што Косця паўтарыў адказ, які ён ужо даваў брыгадзіру: “Я толькі ўчора сюды прыбыў. І каб кудысьці ісці, я павінен ведаць - куды ісці і што там рабіць”. Пачуўшы гэткі адказ, нарадчык засмяяўся. А Шышэі ў гэты час падалося, што ён гэтага чалавека ўжо недзе бачыў. Але нарадчык рабіў сваю справу: прапанаваў паклікаць Куцыка, які і лічыўся тут Богам, а Шышэі загадаў ісці ў сушылку.

Увайшоўшы ў сушылку, Косця ўбачыў у руках Куцыка Бога палку. Таму адразу запытаў у нарадчыка: “Дык вы што, збіраецеся мяне біць?”. На што нарадчык адказаў: “А што, будзем з табою цацкацца?.” Але Косця пагрозаў не спалохаўся і працягваў трымацца арлом. Сурова глянуўшы на нарадчыка, ён папярэдзіў: “А вы падумайце!”. А сам стаў яшчэ больш прыглядацца да твару нарадчыка. У гэты час ён узяў у рукі скручаны з дроту крук, на якім сушылі вопратку ці валёнкі. І далей сказаў: “Мяне можна толькі забіць. А калі я буду стаяць на нагах, дык няхай толькі Куцык мяне закране, дык яго не пазнаеш - я разарву яму ўсю морду. Ты ж, пахан з Паўлуш-Возера, адкарміў мяне там прыгаркамі, таму я цяпер дужы”. І тут нарадчык здагадаўся, з кім ён мае справу, і запытаў: “Дык гэта ты, партызан?”. На што Косця адказаў ужо больш спакойна: “Вось бачыш і пазнаў. Дык ты б сустрэў мяне як сябра, а ты з Куцыкам збіраешся мяне біць. Як жа гэта атрымліваецца?”.

Пасля высвятлення хто ёсць хто, нарадчык, глянуўшы на Куцыка, сказаў: “Ідзі, адпачывай. А мы тут самі разбяромся”. Звалі нарадчыка Аляксандр Багатыроў. Адправіўшы Куцыка, ён заклікаў Шышэю ў сваю канторку, дастаў кавалак сала і хлеба, на што Косця заўважыў: “Вось гэта ўжо іншая справа”. Пасядзелі, пагаманілі, узгадалі аб сваім былым лагеры. І ў рэшце рэшт Багатыроў сказаў: “У мяне самога для цябе

блатнога месца няма, але я папрашу старшага нарадчыка Апалона Румянцава, каб ён прызначыў цябе ў штабную калону”. І вечарам Косця ўжо быў у падначаленні нарадчыка Стральцова, а начальнікам штабной калоны з`яўляўся Губін, таксама зняволены, але, казалі, раней меў вялікі ваенны чын і гадамі быў ужо пажылы. Усім трэцім лагаддзяленнем камандаваў палкоўнік Новікаў. Гэта быў адносна ўраўнаважаны чалавек і не заводзіў занадта жорсткіх парадкаў. Але хутка яго замяніў падпалкоўнік Барадулін. Гаварылі, што Барадулін раней працаваў міністрам КДБ Літвы. І недзе каля Тракая яго машыну абстралялі, у выніку чаго загінулі жонка міністра і некалькі яго ахоўнікаў. А за тое, што сам Барадулін застаўся жывым, дык пасля гэтага выпадку яго накіравалі на Поўнач, у Інту.

Высветліўшы ў Багатырова некаторыя дадзеныя аб Шышэі, Стральцоў апошняму сказаў: “Ведаеш, нешта ж трэба рабіць. Каб ты ўмеў шыць ці рамантаваць абутак, я накіраваў бы цябе ў адпаведную майстэрню. А так куды цябе накіраваць?”. І сам жа адказаў на дадзенае пытанне: “Давай, я табе дам напарніка і будзеце ўдвух увесь час грэбсці ў зоне, каб там не расла трава і не было слядоў. Вось так і будзеш кантавацца, пакуль за цябе не возьмецца аператыўнік”. На тым і пагадзіліся.

Аднойчы грабучы ў зоне, Шышэя прыкмеціў прымацаваную на слупе дошчачку з надпісам: “Адказны за забароненую зону - зняволены Мірскі”. Шышэю гэта зацікавіла і пры першай нагодзе ён запытаў у Старльцова: “Мірскі - гэта князь?”. Косціна пытанне зацікавіла і Стральцова, і ён, у сваю чаргу запытаў: “А што, ты яго ведаеш?”. На што Косця патлумачыў, што мястэчка МІр знаходзіцца блізка ад яго Радзімы. Даведаўшы аб такім земляку Шышэі, Стральцоў далей расказаў, што так, князь Мірскі не так даўно адбываў тут свой тэрмін зняволення, але некалькі часу таму назад яго адправілі ў Варкуту. А вось гэтая дошчачка ўсё яшчэ нагадвае аб гэтым неардынарным чалавеку.

А ў дзень 1 Мая 1949 года Косця спаткаўся і з адным са сваіх эскадронаўцаў - Казікам Гінцам. У час адзначэння гэтага савецкага свята ў лагеры была зроблена сцэна, на якой выступалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці. Вось сярод іх Косця і пазнаў Казіка, які спяваў папулярную ў тыя гады песню “Хороша страна Болгария”, а таксама “Хотят ли русские войны”. На спеваку была чыстая вопратка і меў ён гладкі твар, што сведчыла аб тым, што ўладкаваўся, мабыць, не зусім дрэнна.

Казік быў прыкладна аднаго ўзросту з Косцем, але ўжо тады, калі служылі ў Першым Беларускім эскадроне, быў жанатым. Праўда, жонка яго пакінула, і таму сябры калі-нікалі збіраліся ў яго наваградскай кватэры. А Краскоўская Вера і Чэрамшаніна Тамара нават кватаравалі ў Гінца. І калі Казік сышоў са сцэны, Косця падыйшоў і з ім прывітаўся, сказаўшы: “Казік, салют!”. Безумоўна, нечаканаму спатканню абрадаваўся і Гінц, а таму, пачуўшы знаёмы голас, адразу ўсклікнуў: “А брат ты мой! Адкуль жа ты ўзяўся? Дзе ты знаходзішся?”. На што Косця адказаў: “Як відаць, у тваёй жа калоне”. Гінц працаваў у абутковай майстэрні. Убачыўшы Косціну вопратку, ён заўважыў: “Я гляджу, ты дрэнна апрануты. Мабыць, ты і галодны? Дзе ж ты працуеш?”. Шышэя адказаў, што ён працуе ў Стральцова, падграбае ў зоне, і засмяяўшыся дабавіў: “Каб ты не ўцёк дамоў”. Пасля гэткай вельмі кароткай размовы Гінц запрасіў Косцю да сябе ў майстэрню і прапанаваў яго пакарміць, даць лепшы абутак. Шышэя падзякаваў сябру, але пры гэтым сказаў, што ён ужо прывык жыць у бядноце, хаця зайсці ў майстэрню пагадзіўся. У майстэрні Казік даў Косці грамаў 300 хлеба і паабяцаў пазнаёміць яго яшчэ з адным земляком - настаўнікам з Нясвіжа Янкам Новікам, які меў пісьменніцкія здольнасці.

З Гінцам Косця падтрымліваў сувязі аж пакуль той не звольніўся і не пакінуў лагер, бо яго шасцігадовы тэрмін ужо скончыўся. Менавіта Гінц паведаміў Шышэі і аб тым, што ў чацвёртым жаночым лагаддзяленні знаходзіцца беларуская паэтка Ларыса Геніюш. Ён паказаў яму яе фотакартку, даў пачытаць вершы, якімі Косця адразу захапіўся. Больш таго, Гінц абяцаў пазнаёміць Косцю і з ваеннымі, якія лічылі, што патрэбна нешта рабіць, каб пазбавіцца ад гэткай пакуты. Косці спадабалася і гэтая прапанова, бо ён ніколі не адносіўся абыякава да свайго лёсу. Нездарма ж у Наваградку, калі ён быў яшчэ амаль падлеткам, яго празвалі Арлом.

Паколькі вязні пятага лагаддзялення лічыліся палітычнымі, дык ім была абмежавана нават перапіска - два пісьмы ў год. А вось Янка Новік паспрабаваў адправіць з адной малдаванкай трэцяе пісьмо, прычым без цэнзуры. Але малдаванку застукалі, таму Янку хутка прыйшлося пакінуць штабную калону і адправіцца ў шахту. А тым часам замянілі і начальніка лагера - Новікава на Барадуліна. Барадулін быў чалавекам значна больш жорсткім. Ён аддаў загад на кожным бараку павесіць

замкі, каб без дазволу ніхто з вязняў не мог выйсці ў двор. Нават у прыбіральню сталі вадзіць вязняў па пяць чалавек пад канвоем.

Аднак, нягледзячы на гэткую жорсткасць рэжыму, Гінц, як і абяцаў, даў Косці ведаць аб неабходнасці спаткання з былымі вайскоўцамі. Зрабіць гэта можна было ўжо толькі ў прыбіральні, ды і то з вялікай асцярожнасцю. І калі ў дамоўлены час Косця падыйшоў да прыбіральні, адтуль яму насустрач выйшаў высокі стройны чалавек, які адразу запытаў: “Вы Канстанцін Іванавіч?”. На што Косця адказаў: “Так, я”. Пачуўшы станоўчы адказ, незнаёмец працягнуў: “Я ведаю, вы чалавек вайсковы. Даю вам роту салдатаў”. Гэта Шышэю вельмі насцярожыла. І ён на прапанову незнаёмца адказаў: “Прабачце, я не ведаю, з кім размаўляю”. Незнаёмец назваў сваё імя, прозвішча і вайсковае званне: “Я - Баляслаў Руткоўскі, палкоўнік”. Але Шышэю гэта не задаволіла і ён працягваў высвятляць далей: “Гэта мне мала аб чым гаворыць. Трэба ведаць дакладней, з кім я буду мецць справу. Я вас, па-мойму, бачыў у КВЧ (культурна-выхаваўчай часці) лагера”. Тут незнаёмец ужо абурыўся і, звярнуўшыся да Шышэі, сказаў: “Дык ты мне што - робіш допыт? Я не буду даваць справаздачу кожнаму гаўнюку”. Але Косця таксама не жадаў цярпець абразы і таму адказаў: “Ад гаўнюка чую”. На гэтым і развіталіся.

Адбыўшаеся ў прыбіральні спатканне, на думку Косці, вельмі нагадвала нейкую правакацыю. Пры гэтым Кастусь дрэнна падумаў і аб Гінцы, які ніколі не быў сапраўдным вайскоўцам, а займаўся ў эскадроне культурнай справай. Але хутка Гінц зноў прапанаваў Косці сустрэчу, на гэты раз ужо з сабою. І калі сустрэліся, Гінц стаў абвінавачваць Шышэю, што ён, маўляў, абразіў вялікага чалавека. На што Косця адказаў: “Трэба высветліць, хто гэта такі”. Гінц, мабыць, думаў, што Шышэя адразу даверыцца і яму, і таму, хто прадставіўся як палкоўнік. Так ці інакш, але гэткай насцярожанасці ад Косці ён не чакаў, а таму апошняга нават папракнуў: “Бачыш, які ты асцярожны”. На што Косця ў адказ сказаў: “А як ты думаў? Нельга ж усоўваць галаву туды, куды ты не ведаеш. Нельга давярацца чалавеку, калі ты яго не ведаеш”. Аднак Гінц паспрабаваў на Косцю наступаць, сказаўшы пры гэтым: “Ён і на мяне з-за цябе зазлаваў”. На што Косця патлумачыў: “Няхай злуе. Ён працуе ў бібліятэцы. Дык што, ён не дасць мне кнігу? Няхай не дае. Мне

гэткія кнігі, як Астроўскага “Как закалялась сталь”, зусім не патрэбныя. А іншых у яго няма”. А сам Шышэя зноў пачаў думаць, на гэты раз ужо аб лёсе паэткі, бо Гінц мог паказаць вершы Геніюш і гэтаму невядомаму палкоўніку, што было для яе зусім не небяспечна: вершы былі патрыятычнымі. Таму Шышэя тут жа ўзяў ліст паперы і стаў пісаць Маме - такую мянушку вязні далі Ларысе Геніюш. У лісце Косця, у прыватнасці, пісаў: “Вашы вершы чытаюцца аператыўнымі ўпаўнаважанымі. Таму прашу вас быць больш асцярожнай і не высылаць вершы Гінцу і яму падобным. Думаю, што прычына маёй засцярогі хутка высветліцца. Баюсь, што вас хутка выдадуць”.

Пісьмо Шышэі Л. Геніюш атрымала. Але, на жаль, засцярога Косці запазнілася. Хутка адбылося судзілішча, на якое з пятага лагаддзялення выклікалі Лукашэвіча, Раманчука, Вялёнду. А ўсіх на судзілішча сабралі каля 60 чалавек. Паклікалі на суд і самую паэтку. На справакаваным судзілішчы Вялёндзе да 8 гадоў прыбавілі яшчэ 12, а Раманчука навогул прысудзілі да растрэлу. Ён быў польскім афіцэрам і асабіста ведаў Геніюш. Самой паэтцы нічога прыбавіць не маглі, бо ў яе ўжо былі поўных 25. Але, калі раней яна працавала ў КВЧ, дык пасля судзілішча яе накіравалі на агульныя работы. Ларысу Геніюш абвінавацілі ў антысавецкай прапагандзе.

Ларыса Геніюш… калі Шышэя распавядаў мне аб гэтай таленавітай і моцнай духам жанчыне, я заўважыў, што ў яго не хапала слоў, каб выказаць свае ўражанні ад яе вершаў. Крыху падумаўшы, Косця сказаў: “Паэзія Геніюш ідэйная і запальваючая. Яна кліча трымацца за жыццё, кліча на барацьбу за яго”. Таму ў лагеры Косця перапісваў вершы паэткі і хаваў іх, як нешта самае дарагое, што дапамагала яму адчуваць сябе чалавекам у гэтых нечалавечых умовах савецкіх канцэнтрацыйных лагераў, якія пачалі ствараца, згодна дэкрэту Уладзіміра Леніна, ужо з 1919 года. Вершы Геніюш Косця хаваў у замасленай бутэльцы пад чорнай столлю. Гэтыя вершы па яго словах, яму і іншым вязням, каму ён даваў іх чытаць, “падтрымлівалі агеньчык жыцця і жаданне выжыць”. Ларысу Геніюш Косця заўжды прыводзіў у прыклад іншым, як мужнага чалавека і сапраўдную патрыётку. І вось пасля таго судзілішча гэтую выхаваную ў інтэлентным дусе жанчыну разам з брыгадай сталі выганяць секчы на сцежках лёд, каб тыя, хто яе і тысячы ёй падобных, прымушаў пакутаваць, маглі хадзіць і

не ўпасці, паслізнуўшыся на лёдзе.

Пракантаваўшыся паўгода ў Стральцова, Косцю зноў выклікалі на камісію і прызначылі ў шахту № 9. Як шахцёру, яму выдалі карбідную лямпу, спецвопратку, а таксама лямпу Вольфа, з дапамогай якой можна высветліць, ці ёсць у лаве газ метан. Начальнікам участка лавы быў нехта Абасаў. Ён прызначыў Шышэю "таўкачом". Што гэта такое, Косця не разумеў, ды і само слова ён чуў толькі ў сваёй вёсцы, дзе таўкачом звалі спецыяльную кароткую, звычайна драўляную прыладу, з дапамогай якой нешта таўкуць, скажам, куццю, ком (бульбяную кашу) і гэтак далей. Таўкачом звалі ў вёсцы і някемлівых людзей, якія таўкліся пад рукамі, перашкаджаючы працаваць іншым. А тут аказалася, што ў шахце ёсць гэткая спецыяльнасць - таўкач.

Калі Шышэя разам з іншымі шахцёрамі апусціўся ў штрэк і зайшоў у лаву, звеннявы паказаў яму яго месца працы і прызначыў задачу: наглядаць за гарлавінай, па якой зверху сыплецца вугаль, каб яна не забілася вялікім кавалкам. А калі гэткае здарыцца, кавалак вугля патрэбна хутка разбіць сякерай, каб у гарлавіне не атрымаўся затор.

На першы погляд, было ўсё зразумелым. Ды і першы дзень прайшоў без прыгодаў. Толькі ад вентылятараў было надта холадна. Таму Косця вырашыў, што, каб не дубець, патрэбна заўтра ўзяць яшчэ адну ватоўку. Але тыя, хто прабыў у шахце ўжо не адзін дзень, у канцы працоўнага дня сказалі: "Ну, сёння табе пашанцавала". І далей расказалі, што работа "таўкача" вельмі небяспечная, на ёй можа нават забіць. Над гэтым папярэджаннем вопытных шахцёраў Косця задумаўся і стаў больш уважліва прыглядацца да тэхналогіі праходу вуглю і асабліва ўнік у свае задачы.

Так, без усялякіх прыгодаў, прайшло дзён тры-чатыры. А пасля адкуль ні вазьміся, у гарлавіну ўляцеў велізарны кавалак вугля і перагарадзіў праход іншай вугальнай масе. Косця падаў сігнал, каб прыпынілі сыпаць зверху вугаль. Але на яго сігнал ніхто не рэагаваў. І толькі калі ўсю гарлавіну забіла вуглём, паднялі гвалт: у чым справа? Каля гарлавіны сабраліся шуроўшчыкі, што падавалі вугаль зверху, і давай, хто кіркаю, а хто і лапатай разбіваць глыбу вугля, каб неяк хоць самім выйсці на свабоду. А тым часам не сталі пастунаць і ваганеткі з вуглём. Прыбег Абасаў і пагражальна запытаў: "У чым справа?". Схапіў

лапату і стаў крычаць яшчэ мацней: “Та сарваў план!”. І ў гэты момант хацеў ударыць лапатай Шышэю. Але апошні, як заўжды, быў гатовы за сябе пастаяць: узяў у рукі сякеру і раз`юшанаму начальніку настойліва патлумачыў: “Я адбываю тэрмін, прычым задарма”. Абасаў зразумеў, што сякера - гэта не лапата і кінуўся клікаць вышэйшае начальства. А ў гэты момант шуроўшчыкі больш спакойным голасам, чым Абасаў, таксама працягвалі тлумачыць: “Ты ведаеш, што ты натварыў?”. Але Косця і ім паўтарыў сваё: “Мы адбываем тэрмін, а не выконваем плану”.

Вечарам Шышэю адправілі ў бур, прычым у адной нацельнай бялізне. А адзін з наглядальнікаў не ўстрымаўся і запытаў: “Ты што, праўда хацеў Абасава засекчы?”. На што Шышэя адказаў: “Так, хацеў пасекчы на кавалкі”.

На заўтрашні дзень у гадзін 11 Шышэю выклікаў сам начальнік лагера Барадулін. Дзверы кабінета начальніка адчыніў яго ад`ютант і сказаў: “Заходзь!”. Сам начальнік быў невысокага росту, адносна тоўстым, са злым тварам. Такім ён падаўся тады Косці. Убачыўшы Шышэю, Барадулін спытаў: “Адкуль ты сюды прыбыў?”. Шышэя адказаў: “З карлага”. Пасля гэтага, як і трэба было чакаць, наступным пытаннем, якое задаў Барадулін, было: “Што ў цябе атрымалася з Абасавым? Чаму ты кінуўся на яго з сякерай?”.

Шышэя трымаўся спакойна. І таму яго адказ на зададзенае пытанне атрымаўся грунтоўным. “Апраўдання ў мяне няма, - сказаў Косця. - Бо ўсяроўна праўдай вы палічыце даклад Абасава, але, калі будзеце слухаць, дык паслухайце. Першае, над чым я задумваўся тры дні, - гэта пытанне: чаму на шахце № 9 так многа траўмаў? І ў гэтым вінаваты Абасаў. Калі яго не будзе, траўматызм будзе значна меншым”.

На гэтым Барадулін перапыніў Шышэю і спытаў: “Як?”. На што Шышэя стаў зноў-такі вельмі разважліва і пераканаўча адказваць: “Дайце мне пражэктар. І ў выпадку пападання ў гарлавіну вялізнага кавалка вугля я даю сігнал спыніць яго падачу, разбіваю кавалак і зноў даю сігнал - ужо падаваць вугаль далей”. Уважліва выслухаўшы прапанову Шышэі, Барадулін спытаў: ”Ты доўга над гэтым думаў?”. На што Шышэя адказаў: “Я ж вам сказаў, што дзён тры, пакуль не здарылася тое, што здарылася. Абасаў жа, не разбіраючыся ў прычыне, бег на мяне з лапатай. Таму я вымушаны быў бараніцца. А цяпер мой лёс у вашых руках”.

Выслухаўшы Шышэю да канца, Барадулін усё ж такі паспрабаваў апраўдаць Абасава і, звярнуўшыся да Шышэі, стаў апошняму тлумачыць: “Ты ведаеш, хто такі Абасаў? Гэта перадавік вытворчасці”. Але ўжо амаль асвоіўшыся з кабінетам начальніка лагера, Шышэя тут жа выказаў сваю нязгоду з Барадуліным. “Гэта не чалавек, - сказаў Косця, - для яго не існуе людзей, а толькі планы”.

Начальнік лагера, мабыць, у душы падзяляў думку вязня і таму перавёў гаворку зусім на іншую тэму. “Ну што - замёрз?” - амаль па-бацькоўску спытаў ён Шышэю. А далей і навогул пацікавіўся, хто ў хлопца ёсць з бацькоў і дзе яны. На што Шышэя адказаў, што яго бацькі загінулі ў час вайны і ён застаўся адзін. А далей сказаў: “Вось цяпер Абасавы ды іншыя пачвары і здзекуюцца. Але ж я не гэткі чалавек, каб на мне ехалі”.

Барадулін яшчэ раз абвёў хлопца вачыма і сказаў: “Ідзі ў барак. Грэйся. А заўтра выходзь на працу. Я патэлефаную начальніку шахты і ён цябе прыме”.

На заўтрашні дзень раніцай, як і трэба, Шышэя прыйшоў на шахту і стаў чакаць начальніка шахты. А тым часам усе ўжо разышліся па рабочых месцах. Да Шышэі падыйшоў намеснік галоўнага інжынера шахты Калашнікаў і звярнуўшыся да яго, спытаў: “Дык гэта ты там не паладзіў з Абасавым?”. І не дачакаўшыся адказу, загадаў Шышэі пайсці ў кабінет галоўнага інжынера шахты. Інжынерам быў па нацыянальнасці грэк, які, як камуніст, уцёк са сваёй краіны і паспрабаваў знайсці палітычны прытулак у Савецкім Саюзе. Але, як гэта звычайна і было ў тыя гады, грэка з сям`ёю адправілі на Поўнач, мабыць, каб лепш змог зразумець, да чаго прыводзіць практычная рэалізацыя авантурыстычных ідэй.

Галоўны інжынер запрасіў Шышэю сесці і сказаў: “Пакуль няма начальніка шахты, давай з табою пагаворым - што ты за чалавек. Барадуліну ты спадабаўся”. Падзякаваўшы за запрашэнне сесці і выслухаўшы пытанне, Шышэя амаль слова ў слова расказаў галоўнаму інжынеру пра ўсё тое, што ён распавядаў начальніку лагера. А скончыўшы роспавед, дадаў: “Абасаў - гэта злачынец, які з-за плана калечыць і нават забівае людзей”, пасля чаго галоўны інжынер запытаў: “Дык яго хацеў засекчы?”. А далей зноў патлумачыў Шышэя: “Можа, я яго і не засек бы, але сякерай то ўваліў бы, каб ён толькі закрануў мяне

лапатай”. І тут сваё слова сказаў Калашнікаў: “А ён праўду кажа: з траўмамі на гэтым участку сапраўды адбываецца злачынства”. Адчуўшы ўзаемапаразуменне, Шышэя працягнуў далей тлумачыць прычыну злачынства. “Я ўпэўнены, - сказаў Косця, - калі там не будзе Абасава, дык будзе выконвацца і той самы план і не будзе столькі траўмаў”. У гэты час у кабінет галоўнага інжынера зайшоў і сам начальнік шахты Сямён Штыпельман. Галоўны інжынер даклаў яму аб званку Барадуліна, пасля чаго Штыпельман заклікаў Шышэю ў свой кабінет.

Разам са Штыпельманам у яго кабінет зайшлі галоўны інжынер шахты і галоўны інжынер шахтбуда Накрышаў. Паклікалі сюды і Абасава, які адразу ж абвінаваціў Шышэю ў бандытызме і сказаў, што яго трэба трымаць у буры. Пасля гэткай характарыстыкі Абасава Штыпельман, звярнуўшыся да Шышэі, запытаў: “Ты што, праўда, блатны? Ты даўно ў нас працуеш? Ты што, хацеў засекчы Абасава?”.

Выслухаўшы ўсе пытанні, Шышэя адказаў толькі на апошняе: “Так, хацеў”. Пасля чаго Штыпельман запытаў зноў: “Дык як жа гэта зразумець?”. На што Косця патлумачыў: “Калі я прыйшоў на шахту “таўкачом”, дык тыя, хто там працаваў, мне сказалі: Ты - чарговая ахвяра. Таму вы можаце мне верыць ці не верыць, але калі там будзе працаваць Абасаў, ахвяр не мінаваць. Які ж дурань будзе стаяць з сякерай, калі на яго ляціць цэлая скала вугля? Яна ж абавязкова, калі не заб`е чалавека, дык пакалечыць. А навошта гэта, калі можна і план выконваць і людзей не пасылаць на той свет і нават не калечыць”. І далей пачаў расказваць усё тое, аб чым ён распавядаў начальніку лагера. А скончыўшы расказваць аб сваёй прапанове яшчэ раз дадаў: “Тады не будзе ахвяраў і будзе план. Бо калі чалавека забівае ці параніць, праца ўсё роўна спыняецца і вугаль у ваганеткі не падаецца. Дык навошта рабіць усё наадварот, прычым з людскімі ахвярамі. Я працаваць на гэтай рабоце згодзен, але толькі па свайму метаду. А што тычыцца Абасава, дык ён наогул не можа быць начальнікам. Гэта проста мацершчыннік”.

Уважліва выслухаўшы роспавед Шышэі, першым загаварыў Накрышаў: “Дык ён жа ўсё правільна гаворыць”. Пасля чаго зноў пачаў, прычым яшчэ больш узбуджана, крычаць Абасаў: “Ты хочаш, каб цябе паставілі на маё месца?”. На што Шышэя спакойна адказаў таксама пытаннем: “А што, я горшы за цябе?”.

Рысу ў размове падвёў Штыпельман. “Мы ўсё высветлілі”. І звярнуўшыся да Шышэі, дадаў: “Можаш ісці дамоў”.

Пры гэтым Штыпельман сказаў праўду: за многія гады прабывання ў лагерах барак сапраўды становіцца нейкім домам, хаця ён больш падобны на хлеў, чым на чалавечае жыллё. Таму ў цывілізаваным свеце домам называюць памяшканне, у якім заўжды можна знайсці ўтульнасць і цяпло. Але ў Савецкім Саюзе амаль усе рабочыя жылі не ва ўласных дамах. Многія з іх не мелі кватэры, а жылі ў рабочых інтэрнатах. А каму і выпадала шчасце атрымаць прымітыўную кватэру, дык гэта здаралася ўжо тады, калі чалавек амаль падыходзіў да пенсіі і таму нездарма людзі прыдумалі, што пры камунізме ўсе будуць жыць у інтэрнатах, прычым мужчыны ў адным памяшканні, а жанчыны ў другім. І пакоі і тых і другіх будуць такімі вялікімі, што коўдру прыйдзецца нацягваць з дапамогай трактараў.

А ў той дзень Косця прабадзяўся ў шахце без усялякай справы аж да вечара, бо з зоны вытворчасці ў зону лагерную можна было перайсці толькі разам з усімі ў калоне, пад канвоем. Вечарам нарадчык паведаміў, што заўтра Шышэі патрэбна ісці на працу ў брыгаду Джафарава, што ў Грамадзянбудзе.

Брыгада Джафарава займалася, у тым ліку і выраўніваннем тэрыторыі зоны. Таму і Шышэі адразу далі тачку для перавозкі шахтнай пароды па тэрыторыі, чым ён і займаўся тыдняў два. Але, калі іх працу прыйшоў прымаць прараб шахтбуда Якаўлеў Аляксей, ён спыніў Косцю і запытаў: “Дык гэта ты хацеў забіць Абасава?”. На што Кастусь адказаў, што ён не збіраўся яго забіваць і далей хацеў патлумачыць, як і што было. Аднак Якаўлеў не стаў слухаць яго тлумачэнняў, бо, мабыць, і так усё ведаў, а задаў наступнае пытанне: “Ты ведаеш, што твой метад ужо працуе? Пры гэтым Абасава папярэдзілі, што калі на яго ўчастку траўмы будуць і далей, дык яго звольняць з гэтай пасады”. А пасля гэтага прапанаваў Шышэі пакінуць тачку і ісці ў іх кантору.

У канторы сядзелі эканаміст Усейнаў і кіраўнік электраабсталявання Сахно. Увайшоўшы ў кантору, Шышэя даклаў, што яго сюды накіраваў Якаўлеў, на што сядзеўшыя адказалі: “Калі накіраваў, дык і чакай яго”. А крыху счакаўшы, у Шышэі спыталі: “Якая ў цябе спецыяльнасць?”. Косця адказаў, што няма ў яго ніякай спецыяльнасці, а далей пажартаваў: “А

навогул я чалавек вялікі - дыверсант, шпіён і мабыць яшчэ хто". Пасля чаго ўсе засмяяліся, бо ўсе былі вязнямі і добра зразумелі гэты жарт. Далей працягнулі размову на вольныя тэмы, пакуль не прыйшоў Якаўлеў.

Убачыўшы Шышэю, Якаўлеў сказаў: "У мяне для цябе ёсць адказная праца. Я табе яе зараз пакажу і мы нешта з табою прыдумаем, як яе выканаць. Ты ж хлопец рызыкоўны". І загадаў Шышэі ісці за ім на аб`ект пад назвай "Вентбойка". Калі прыйшлі, Шышэя ўбачыў страху, а пад ёю замёрзлую яму, якая мела назву вентыляцыйнага штрэка. Патрэбна было лёд разбіць і дастаць яго з гэтай ямы, каб устанавіць вентыляцыю. Сходы ў яме ішлі ўніз пад нахілам. Якаўлеў паабяцаў для выканання працы даць неабходны інструмент і любую колькасць людзей, толькі б хутчэй вызваліць вентыляцыйны штрэк ад лёду.

Уважліва агледзеўшы вентбойку, Шышэя зразумеў, чаму Якаўлеў заўважыў, што ён рызыкоўны хлопец: былі невядомы ні глыбіня штрэка, ні таўшчыня лёду, таму можна было праваліцца пад гэты лёд і тады "капут". Зразумеў Косця і што патрэбна зрабіць, каб вентштрэк вызваліць ад лёду.

Спланаваўшы ўсё ў галаве, Шышэя звярнуўся да прараба: "Аляксей Васільевіч, паколькі гэтая праца, лічы падземная, дык, каб людзей зацікавіць у яе выкананні, патрэбна прыраўняць будучую работу да працы шахцёра і даць тым, хто будзе яе выконваць, шахцёрскую пайку хлеба - 1,1 кілаграма. Якаўлеў пагадзіўся, бо яму абавязкова патрэбна было выканаць гэтую працу хутка. Пагадзіўся з прапановай Шышэі і эканаміст Усейнаў. Больш таго, апошні Шышэі сказаў: "Якаўлеў гэта выб`е". На тым і пакончылі, дамовіўшыся, што і Якаўлеў і Шышэя будуць думаць аб самой тэхналогіі выканання працы, а заўтра спаткаюцца і абмяняюцца думкамі.

Такім чынам, быў час і Косця сапраўды яшчэ раз стаў думаць, каб не прапусціць ніякіх дробязяў. Тут было важна ўсё: і зацікавіць людзей, што ўжо было амаль зроблена, і не загубіць ім жыцця і нават не пакалечыць, і не застудзіць іх, бо патрэбна было мець справу з лёдам і ледзяной вадой. На заўтрашні дзень ён выклаў свой план Сахно: зверху патрэбна паставіць рухавічок, каб з яго дапамогай можна было спускаць у штрэк людзей па два чалавекі і бочку для збору лёду, прычым людзей патрэбна прывязаць пад рукі моцнай вяроўкаю, каб, калі лёд праломіцца, яны не праваліліся ў яму. Для біцця лёду

неабходна выкарыстаць адбойныя малаткі. Пад страхою патрэбна паставіць печку, каб людзі, папрацаваўшы гадзіны дзве, маглі абагрэцца. І апошняе, аб чым папрасіў Шышэя, дык гэта даць яму 16 чалавек, бо стоячы ў ледзяной вадзе і колючы лёд, чалавек не зможа вытрываць больш, як дзве гадзіны, а працоўны дзень у шахцёраў працягваўся 8 гадзін. З усім гэтым Сахно пагадзіўся, і калі сваю згоду выказаў прарабу, дык, паказаўшы на Шышэю, яшчэ і зазначыў, што хлопец ён разумны і ўсё ў яго атрымаецца. Ухваліў план Шышэі і Якаўлеў, пры гэтым ужо і паведаміў, што шахцёрскую пайку хлеба ён узгадніў з начальствам.

Калі пачалі працаваць, Шышэя першым узяўся за адбойны малаток, каб яшчэ раз пераканацца ў правільнасці сваіх меркаванняў і паказаць прыклад іншым, што пры выкананні цяжкай і рызыкоўнай працы з`яўляецца вельмі важным.

Праз некалькі дзён прыйшоў Якаўлеў, каб паглядзець, як атрымалася іх задумка на практыцы, а заадно і папрасіць паскорыць працу, пры гэтым ён сказаў, што хоча заклікаць сюды і больш высокае начальства. Але Косця не параіў яму гэтага рабіць, пакуль не будзе бачным нейкі вынік іх працы. Больш таго, ён паведаміў прарабу, што хутка яны не будуць прывязвацца вяроўкамі, а зробяць лаўку са спінкаю і паступова будуць яе апускаць у штрэк, безумоўна, таксама прывязаўшы вяроўкаю. Седзячы на лаўцы, будзе зручней працаваць. І гэтая прапанова Якаўлеву таксама спадабалася.

Калі апусціліся на глыбіню метраў шасці, убачылі, што там знаходзіцца пляцоўка, а ніжэй зноў ідуць сходы, але ўжо ў другі бок, што ўскладняла працу, але выйсце знайшлі і тут: трэба было паставіць рухавік на пляцоўку і падымаць адколаты лёд у два этапы - спачатку на пляцоўку,  а пасля на паверхню.

Праз некалькі дзён паглядзець працу брыгады Шышэі прыйшлі не толькі Якаўлеў і Сахно, але і галоўны інжынер шахты, а таксама іншыя. І тут Якаўлеў, як гэта, карыстаючыся сацыялістычным калектывізмам, часта рабілі савецкія начальнікі, стаў выдаваць усё гэта за сваё: маўляў, я даў каманду, я прапанаваў… і ўсё атрымалася, як я і меркаваў.

Безумоўна, інжынер шахты пахваліў прараба за кемлівасць. А сам Якаўлеў, убачыўшы, што праца тут ужо наладжана і хутка будзе станоўчы вынік, даў Шышэі новае заданне: зрабіць у шахце дзверы, каб, калі не дай Бог, здарыцца выбух метана, газ

і пажар не маглі распаўсюджвацца на іншыя ўчасткі. Для гэтага яны спусціліся ў шахту, пахадзілі па штрэку, замералі яго параметры і зноў пачалі меркаваць, як гэта практычна зрабіць.

Абмеркаваўшы план дзеянняў і самую канструкцыю дзвярэй, у шахту апусцілі неабходны матэрыял: цэмент, жвір, вадкае шкло, швелер для рамы, а таксама складныя дзверы, якія патрэбна было збіраць ужо ў самой шахце. У брыгадзе, якая выконвала названую працу, было 12 чалавек. Але Шышэі з усіх іх найбольш запамятаўся Ваўрынюк з Украіны. Па-першае, у яго былі ўсе артыкулы, якія толькі мог даць суд, бо калі пры допытах да яго, як і да соцень тысяч іншых, прымянялі фізічную сілу, ён адразу "ламаўся" і падпісваў на сябе любыя паклёпы, што прыдумлялі энкавэдзісты. Па-другое, Ваўрынюк вельмі баяўся лезці ў шахту, тлумачачы гэта тым, што ў яго ёсць сям`я: жонка, дзеці, і што, маўляў, будзе, калі ён адтуль не вернецца. Таму таварышы па працы, у тым ліку і Косця, вырашылі ўсё ж такі апусціць яго ў шахту. І калі ён з Шышэям укацілі ваганетку з грузам у клець, апошні падміргнуў ліфцёру: апускай. Ваўрынюк падняў у клеці гвалт, пачаў хрысціцца. Але праз некалькі хвілін ён быў ужо ў падзямеллі. Гэта прывяло яго ў нейкі шок: як толькі клець адчынілася, ён выскачыў і пабег па штрэку то ў адзін то ў другі бок. Бачачы гэткую разгубленасць Ваўрынюка, Косця пачаў яго ўгаворваць, што нічога з ім не здарыцца, што людзі працуюць тут гадамі. І спатрэбілася нямала слоў, каб баязлівец неяк прыйшоў у сябе. Назад з шахты Ваўрынюк хацеў выйсці пешшу, але не хапіла сілы і таму быў вымушаны, папярэдне перахрысціўшыся, зноў садзіцца ў клець.

Дзверы ў шахце рабілі каля месяца. І паколькі гэта адносілася да вентыляцыі, дык паглядзець на працу вязняў прыходзіла і начальнік вентыляцыі Ліна, па нацыянальнасці камячка і з выгляду прыгожая дзяўчына. І каб у шахце ёй не хадзіць па штрэку адной, яна брала з сабою ў якасці суправаджаючага Косцю. Убачыўшы гэткую гісторыю, некаму здалося, што Шышэя завёў з начальнікам вентыляцыі "шуры-муры". І на Косцю настукалі оперу. А апошняму толькі дай, яму ж патрэбна было паказаць адданасць працы. Таму калі фактаў не было, іх прыходзілася выдумляць. А тут гэткае!...

Гнеў оперупаўнаважанага скончыўся тым, што Шышэю і ад дадзенай працы адхілілі і адправілі на лесасховішча пілаваць лес. Але праз некаторы час Якаўлеў знайшоў яго і там.

Запытаўшы ў Косці, што ў яго з гэтай Лінай, паведаміў, што яго кліча нарміроўшчыца шахты Вольга Аляксееўна. Пры сустрэчы нарміроўшчыца прапанавала Шышэі пайсці да яе памочнікам - праводзіць хранаметраж. Пры гэтым дадала, што ўзяць яго на гэткую працу ёй параіла Ліна. Косця , канешне, пагадзіўся. І тут жа прыступіў да справы.

Праца ёсць праца, усюды патрэбны прафесіяналізм і сумленне. Безумоўна, што для Косці праводзіць хранаметраж была справа новая, але ён у яе хутка ўнікнуў і яна яму спадабалася, тым больш, што гэтая праца патрабавала не фізічных намаганняў, а творчасці і зносін з рознымі начальнікамі. Адзін раз дайшла справа і да сустрэчы з Абасавым: патрэбна было ўзгадніць з ім вынікі праведзенага хранаметражу на яго ўчастку. Пры спатканні з Шышэям Абасаў запытаў у апошняга: “Ну ты ж на мяне не крыўдзішся?”. На што Косця адказаў: “Я ні на кога не крыўджуся. У мяне гэткі лёс”. А што тычыцца самой справы, дык тут і навогул паміж імі не было ніякіх недарэчнасцяў.

Стаяла лета. Прыгравала сонца. Таму, правёўшы замеры часу на выкананне аперацый, Косця выходзіў з шахты, садіўся на сонца і працягваў працу ўжо на паперы. Ды і пайка хлеба на ўказанай пасадзе была нядрэннай - 850 грамаў. Аднак і тут некаму не цярпелася і на яго зноў настукалі ўсё ж таму оперупаўнаважанаму Сакольнікаву.

На гэты раз Шышэю выклікаў старшы нарадчык Румянцаў і кажа: “Што гэта зноў ты нешта не дагадзіў Сакольнікаву. Таму я вымушаны цябе перавесці на іншую працу. Пойдзеш у брыгаду Парашчанкі будаваць масты”.

Безумоўна, гэта была ўжо іншая праца - цяжкая. А тым часам і скончылася кароткае паўночнае лета, надыйшлі халады. А будаваць масты патрэбна было на адкрытых месцах, дзе маразы дапаўняліся яшчэ і вятрамі. У гэткіх жорсткіх умовах ад брыгадзіра патрабаваўся не толькі прафесіяналізм, але і кемлівасць, арганізатарскія здольнасці, чаго ў Парашчанкі не хапала. Ён больш крычаў, прычым амаль заўжды без толку. А таму план брыгада не выконвала, за што людзям пайкі хлеба змяншалі некаторыя дні аж да 450 грамаў.

Паглядзеўшы на гэткую карціну, Косця і тут убачыў хібы і ў тэхналогіі і ў арганізацыі працы, і ў афармленні нарадаў. Хібы можна было хутка выправіць. І паколькі ён не мог заставацца ў

такіх выпадках абыякавым, таму вырашыў умяшацца ў справу, каб яе палепшыць. Першае, што ён зрабіў з гэтай мэтаю, дык гэта прапанаваў Парашчанку пачаць афармляць за яго нарады, папрасіўшы перад тым прабачэння, што ўмешваецца нібыта не ў сваю справу. Брыгадзір спачатку сапраўды ўспрыняў дадзеную прапанову як пасягненне на яго пасаду, але пасля Шышэіных прапаноў, што патрэбна зрабіць, каб усе атрымлівалі па 850 грамаў хлеба, пагадзіўся. Ды ў прапановах Шышэі была рацыя. На яго думку, паколькі так холадна, дык патрэбна мець часовыя збудаванні, каб людзі маглі перыядычна неяк схавацца ад ветру. А гэткія збудаванні можна зрабіць нават з лёду, як гэта рабілі эскімосы. І калі вязні збудавалі гэткія ледзяныя хаты, дзе можна было ў зацішку пасядзець на драўляных калодках, дык названых памяшканняў для сябе запатрабавалі і ахоўнікі, якія дагэтуль таксама гібелі на марозе і ветры. Далей Косця запрапанаваў не ашкурваць мёрзлыя паленні, а спачатку іх адаграваць, развёўшы для гэтага кастры.

Пачуўшы ўсё гэта з вуснаў Шышэі, Парашчанка пацікавіўся, адкуль ён аб гэтым усім ведае, на што Косця адказаў: “З кніжак. І калі мы так будзем рабіць, ды яшчэ і правільна ўлічваць працу, дык будзе і план, і будуць задаволены людзі”. А тым часам для афармлення нарадаў Косця зрабіў сабе ў ледзяной хаце драўляны столік. Аднак і тут нехта даклаў на яго ўсё таму ж Сакольнікаву, які з ахоўнікамі прыехаў пракантраляваць падазронага вязня. І калі ўбачыў усе тыя навінкі, якія з`явіліся тут за час працы ў брыгадзе Шышэі, махнуў рукою і сказаў: “Усё зразумела”.

Неўзабаве пасля прыезду Сакольнікава Шышэю забралі з брыгады мастабудаўнікоў і разам з яшчэ двумя вязнямі паставілі калоць лёд каля ўправы, бані і крамы.

А тым часа начальнікам штабной калоны прызначылі беларуса па нацыянальнасці - Рабышка. Даведаўшыся, што беларусам з`яўляецца і Шышэя, начальнік калоны прапанаваў апошняму стаць у яго памочнікам. Работа “памхоза” была нядрэннай. Хто займаў гэтую пасаду, ужо насіў на рукаве павязку, якая дазваляла хадзіць па зоне. Ды і самой працы фактычна не было: у задачу “памхоза” ўваходзіла рэгуляваць чаргу кармлення вязняў у сталовай, дакладней - сказаць дзяжурнаму, калі які адчыніць барак, каб людзі змаглі без суталакі тры разы на дзень схадзіць у сталовую. Але тут у

справу ўмяшаўся яшчэ і культарганізатар, які загадаў Шышэі, калі ў яго быў вольны час і ў бараках нікога не было, правяраць тумбачкі, і, знайшоўшы ў каго-небудзь кавалак хлеба ці нешта іншае з ежы, збіраць гэта ў мяшок, а пасля выкідаць. Безумоўна, на такое Косця не пагадзіўся, сказаўшы, што гэта не яго функцыя. А сам паскардзіўся Рабышку, што яму загады пачаў даваць і культорг, на што начальнік штабной калоны адрэагаваў па-свойму: "Ну дык табе ж не цяжка". Пачуўшы ад Рабышкі гэткі адказ, Косця сказаў, што ён гэтага рабіць не будзе з-за прынцыпу. Пасля чаго Рабышка яшчэ больш паказаў сябе чалавекам баязлівым і нават выслужлівым перад аховай, сказаўшы: "Тады ў цябе нічога не атрымаецца, бо культорг дакладзе Сакольнікаву".

Так яно і здарылася: павязку ад Шышэі забралі. Але ў гэты час прапанову яму зрабіў Румянцаў - пайсці да яго ў падначаленне, нарадчыкам у грамадзянбуд. Шышэя пагадзіўся. Прыйшоўшы ў кантору, дзе сабраліся ўсе брыгадзіры, ён перапісаў колькасць усіх людзей, з улікам спецыяльнасцяў. Пасля гэтага запытаў у прарабаў, якія жылі ў асобным бараку, праўда, такім жа стандартным, і высветліў, каму і колькі якіх спецыялістаў патрэбна на заўтрашні дзень. І з улікам гэтага даў нарад брыгадзірам, куды і да якога прараба ісці са сваёй брыгадай на працу. Раніцай, як нарадчык, ён прывёў брыгады да прахадной, здаў канвой і вярнуўся ў зону рыхтаваць пісьмовую справаздачу, у якой паказвалася, колькі людзей і куды пайшло на працу, колькі і па якой прычыне засталося ў бараках. Пры гэтым у кожнага не выйшаўшага на працу павінна было быць пісьмовае абгрунтаванне. І калі нехта гаварыў, што ён захварэў, неабходна было звадзіць яго да лекара, каб апошні даў на гэта падцвярджэнне. Справаздачу Косця здаваў старшаму нарадчыку Румянцаву, а той, у сваю чаргу, рабіў справаздачу перад больш высокімі начальнікамі.

Але людзі заўжды застаюцца людзьмі. Яны ўсе розныя: па характару, узроўню адукацыі, сумленнасці, нацыянальнай свядомасці і гэтак далей. Вось і тут, сярод людзей, з якімі прыйшлося Шышэі мець справу, быў нехта Аляксей Крук, які валодаў некалькімі замежнымі мовамі, а таксама сцэнаграфічным пісьмом. Але на працу хадзіць Крук не хацеў і не жадаў ісці да лекара. Косці прыходзілася затрачваць вялікія намаганні, каб усё ж такі неяк угаманіць яго і звадзіць да лекара.

Прыйшоўшы ў паліклініку, Крук і там працягваў сваё: “Я здаровы і не ведаю, чаго ён да мяне прычапіўся”. Гэтым самым ён ставіў нарадчыка ў дрэннае становішча: прыходзілася або выпрашваць у дактароў яму даведку, што Крук нібыта хворы, або дакладаць на яго аператыўнікам, што ён сімулянт. Лекары некалькі разоў уважылі просьбу Шышэі і далі даведку Круку, але ж доўга працягвацца так не магло - патрэбна было з названым чалавекам рабіць нешта іншае.

У гэты перыяд Шышэю выклікалі ў АЧА (Асобная часць аддзела Мінлага). Да дадзенага часу Косця нават і не ведаў, што ёсць гэткая ўстанова. Але ў лагеры кожны чалавек быў нявольнік і абавязаны хадзіць туды, куды яго патрабуюць. Таму і Косця, падумаўшы, чаго яго клічуць у гэтую невядомую яму арганізацыю, без усялякай адмовы пайшоў. Калі ўвайшоў у пакой, там сядзеў палкоўнік, які ветліва яго запытаў: “Канстанцін Іванавіч?”. На што Косця адказаў: “Так”. Атрымаўшы станоўчы адказ, палкоўнік працягнуў: “Я ўвесь час за вамі наглядаю. У вас лічыцца пяць класаў адукацыі, але ж вы спраўляецеся на ўсіх участках, куды б вас не накіроўвалі. Гэта вельмі цікава. Вы пішаце пісьмы іншым, а самі нікому не пішаце. Патрэбна з вамі разабрацца”.

Гэткая размова Косці не спадабалася. Ён нават задумаўся, а што будзе, калі палкоўнік пачне капацца ў яго паходжанні і высветліць, што ён ні з якіх не Трокаў, а са Шчорсаў? Але на пастаўленыя палкоўнікам пытанні патрэбна было адказваць хутка. І Косця пачаў: “У мяне нікога няма. Але ж мне патрэбна жыць, вось я і стараюся на ўсялякай рабоце. А пісьмы пішу іншым, бо мне за гэта кожны нешта дасць, калі атрымае пасылку, скажам, хоць зубок часнаку. Мне ж ніхто не дапамагае”. Пачуўшы гэткі грунтоўны адказ, палкоўнік працягнуў разважаць уголас далей: ”Мы аналізуем паводзіны кожнага. І ты чалавек незвычайны. Як ты думаеш, цябе правільна судзілі ці не?”. І стаў чакаць адказу.

Шышэя яшчэ больш задумаўся і вырашыў гаварыць, што думае, як гэта ён рабіў і раней. “Калі гаварыць, як я думаю, дык пасадзілі мяне няправільна. Я выхоўваўся за польскім часам і савецкіх законаў не ведаю. Але ў Польшчы, калі каго садзілі ў турму, дык было вядома: або ён некага забіў ці пакалечыў, або ён нешта значнае ўкраў, або адкрыта выступаў супраць улады. Я гэтага нічога не рабіў”.

Палкоўнік паслухаў адказ Шышэі і сказаў: “Дык можа напісаць просьбу аб рэабілітацыі?”. На што Косця адказаў: “А каму пісаць? Я ўжо хацеў ад несправядлівасці накласці на сябе рукі, але ж я чалавек веруючы і лічу, што так паступіць з дадзеным Богам мне жыццём - вялікі грэх. Таму і пакутую”. Такі адказ, відаць, уразіў палкоўніка яшчэ больш. Таму ён паглядзеў на Шышэю, дастаў з кішэні цыгарэты і прапанаваў Косці за першае знаёмства разам пакурыць. Косця з удзячнасцю ўзяў цыгарэту і з задавальненнем пачаў зацягвацца прыемным яму дымком. На развітанне палкоўнік пажадаў Шышэі поспехаў і паабяцаў спаткацца яшчэ раз.

Косця пайшоў у сваю канторку, але думкі не выходзілі з галавы, што будзе далей… Ён добра разумеў, што мае справу з высокапрафесійным і вопытным чэкістам, які пры жаданні можа дакапацца да каранёў амаль кожнага. Аднак патрэбна было жыць, а значыць і працаваць. І ён далей заняўся сваёй справай нарадчыка. А тут праз некаторы час яго выклікаў ужо Сакольнікаў і кажа: “Ну што, работа твая нядрэнная. Сядзіш у цяпле, фізічна не працуеш. Так што патрэбна, каб ты працаваў і з намі, тым больш, што ты ходзіш па бараках, усё бачыш, шмат чаго чуеш”.

Шышэя зразумеў адразу, чаго оперупаўнаважаны спецорганаў ад яго хоча. Але пачаў “касіць пад дурня” і сказаў: “А хіба ж я з вамі не працую?”. Пачуўшы гэткі не зусім зразумелы адказ, Сакольнікаў вырашыў гаварыць яшчэ больш адкрыта: “Ты павінен мець вочы і вушы: бачыць і чуць, каму тут што не падабаецца”. Гэткая пастаноўка пытання прадстаўніком спецорганаў патрабавала адкрытасці і ад Шышэі. Таму ён сказаў: “Грамадзянін начальнік! Калі тут пачнуць вастрыць шаблі ці пікі, або нават сякеры ці нажы, дык так, я , мабыць, прыйду і дакладу вам. А хадзіць па бараках і падслухоўваць, хто што кажа, я не буду. Ды і наогул, - глупства гэта. Каму тут што падабаецца: мне падабаецца? Або вам падабаецца?”.

Сакольнікаву стала ўсё ясна, таму ён сказаў: “Размова паміж намі скончана. Можаш ісці!”. А праз тыдзень Шышэю знялі з ягонай пасады і замест яго нарадчыкам стаў прысланы з іншага лагеру нехта Аўгулевіч. Шышэю накіравалі рабочым на будоўлю шаснаццаціпакаёвага інтэрнату. Інтэрнат будаваўся з дрэва. Ды і ўся Інта таксама была драўлянай, хоць многа дамоў і з`яўляліся двухпавярховымі. У цэнтральным пасёлку Інты ў той

час было дзве вуліцы: Палярная і імя Кірава. Апошняя лічылася больш цэнтральнай, на ёй размяшчаліся ўсе ўстановы.

Прабыўшы на будоўлі інтэрнату некалькі дзён, да Шышэі нечакана завітала прыемная госця. Яе ўбачыў нехта з хлопцаў і паклікаў Косцю, сказаўшы пры гэтым: “Вунь, за агароджай цябе чакае нейкая бабуля!”. Калі Косця падыйшоў да агароджы і добра прыгледзеўся, ён пазнаў у гэтай бабулі Ларысу Геніюш, якую раней бачыў у Гінца на фотакартцы. Косця прывітаўся. Адказала на прывітанне і Ларыса Антонаўна і пасля гэтага паспрабавала падыйсці да хлопца як мага бліжэй. Але ж у гэты час салдат, які сядзеў на вышцы, закрычаў: “Ты куды, старая карга, лезеш?”. Косці стала неяк крыўдна і за вядомую паэтку і за сябе, і за гэтага салдата - выхаванца савецкай сістэмы. Але ж зноў-такі і Косця, і Ларыса Антонаўна былі зняволенымі і таму часта прыходзілася чуць усялякія абразы.

А на вуліцы стаяў вялікі мароз, ляжалі курганы снегу. I каб не замерзнуць, Ларыса Антонаўна ўся захуталася і сапраўды была больш падобная на бабулю, чым на зусім яшчэ не старую жанчыну, якой яна ў той час з`яўлялася. Косця яшчэ раз глянуў на блізкага яго душы чалавека і сказаў салдату: “Гэта мая цёця, сястра маёй маці. Будзь чалавекам, дай пагаварыць”. На што салдат адказаў: “Толькі хутчэй, а то нехта прыкмеціць”. У час таго спаткання Шышэя паведаміў Ларысе Антонаўне, што ён ёй пісаў і папярэджваў яе, каб была асцярожнай і так рэзка не выступала. Але Геніюш заставалася сама сабою і на папярэджанне Косці адказала: “А што маўчаць?”. Пасля чаго Кастусь працягнуў папярэджваць гэтую мужную, таленавітую і надзвычайна смелую жанчыну: “Нам патрэбна не даць сябе знішчыць. Трэба выжыць”. На тым і развіталіся, пажадаўшы адзін другому здароўя і цярпення.

Прарабам на будаўніцтве інтэрната быў таксама беларус Міша Бачышча, але вельмі, як выказаўся Косця, “дубовы” : у яго заўжды не выконваўся план, а значыць і людзі атрымлівалі малыя пайкі хлеба, за што прараба не паважалі. Больш таго, аднойчы кінулі на яго бэльку, але здарыўся цуд - яна ўпала, праляцеўшы ў нейкім сантыметры каля яго носа, пасля чаго Міша ўвесь збялеў і ўбег у цяплушку, дзе ў той час знаходзіўся Шышэя. Убачыўшы Косцю, Бачышча ледзь прамовіў: “Хочуць забіць”. Шышэя адразу пакінуў цяплушку і падыйшоў да хлопцаў. А тыя пытаюць: “Ну як ён там сябе адчувае?”. I давай

падымаць упаўшую бэльку. Ім стаў дапамагаць і Косця. Тады ён вылічыў і таго, хто быў ініцыятарам злачынства.

Праз некаторы час, калі Міша крыху прыйшоў да сябе, Косця вырашыў пагаварыць з земляком наконт яго працы прарабам. Шышэя расказаў, як яны з Парашчанкам будавалі масты і пры гэтым падкрэсліў, што прараб павінен клапаціцца аб людзях, каб яны маглі зімою абагрэцца, мелі нармальную пайку хлеба. А для гэтага патрэбна разводзіць кастры, чысціць снег і ўсё гэта ўключаць у нарад. Тады будзе і план, а значыць, будзе і хлеб, ды і людзям лягчэй, калі хоць крыху абагрэюцца бярвенні. А далей Шышэя патлумачыў, што ўсяму гэтаму ён навучыўся, калі працаваў хранаметражыстам.

Але хутка Шышэю выклікаў Румянцаў і сказаў: “Пайдзі ты, навучы гэтага аболтуса. Барадулін даў загад, каб ты папрацаваў побач з Аўгулевічам нарадчыкам, ды павучыў яго”. Косця адпірацца не стаў. І яны адразу пайшлі ў канторку, дзе сядзеў Аўгулевіч. Першым загаварыў Румянцаў: “Ты сядзі і вучыся, як патрэбна працаваць”. Аўгулевіч гэтым абразіўся і, глянуўшы на Шышэю, запытаў: “Дык гэта што - я буду ў яго вучыцца?”. На што Румянцаў адказаў: “А як ты думаў, калі сам нічога не кумекаеш”. Адчуўшы ў Аўгулевіча гэткае зазнайства і самаўпэўненасць, Шышэя, звярнуўшыся да Румянцава, сказаў тое, што ён думае наконт іх прапановы вучыць Аўгулевіча. “Ён не можа працаваць нарадчыкам. І з усіх вашых намаганняў навучыць яго чамусьці нічога не атрымаецца”, - сказаў Косця. І ён меў рацыю. Бо, відаць, сваю галоўную працу, дзеля якой яго сюды накіравалі аператыўнікі, Аўгулевіч добра ведаў і выконваў, а астатняе яго мала цікавіла. Больш таго, ён ведаў і сабе цану. Таму, калі Косці даручылі яго вучыць, Аўгулевіч запытаў: “А чым ты будзеш мяне карміць?”. На што Шышэя адказаў: “Я ж не повар. Ты не чудзі, а жыві так, як жывуць усе”. Пасля гэтага Аўгулевіч пацікавіўся: “А ты што, ходзіш у сталовую?”. Шышэю гэткае пытанне здзівіла, бо Аўгулевіч ведаў, дзе ўсе вязні атрымліваюць ежу. Праўда, Косця прыкмячаў, што Аўгулевіч не ходзіць у агульную залу сталовай, а на кухню, дзе яму па заказу смажаць бульбу, пякуць яйкі і рыхтуюць іншыя стравы. Больш таго, калі Аўгулевіч даведваўся, што некаму прыйшла пасылка, ён абавязкова ў чалавека нешта выпрошваў і за гэта даваў яму, скажам, дзень адпачынку. Затое, ходзячы па зоне, увесь час азіраўся, нібы сапраўды той сабака, за якім хтосьці гоніцца. А ў

баракі навогул баяўся заходзіць. Ну а ў тую хвіліну Шышэя падумаў: “Вось што значыць служыць “сабакам” і на пытанне Аўгулевіча адказаў: “А куды ж”.

А прыходзячы на працу, Шышэя не звяртаў на гэтага кэдэбісцкага служаку ніякай увагі, а проста рабіў сваю справу - і ўсё. Не звяртаў увагі на Шышэю і Аўгулевіч, а чытаў сабе “Швейка” ды рабіў сваю злачынную справу. Але ж, выконваючы ролю нарадчыка, Шышэя зноў сутыкнуўся з усё тым жа Крукам. Прыходзіць Шышэя ў барак, а Крук сядзіць вясёлы і паказвае, што ён напісаў на паперы з цэментнага мяшка ліст у Арганізацыю Аб`яднаных Нацый, які туды, маўляў, перададуць па тэлеграфу. А Шышэі, як нарадчыку, ён кажа: “На гэты раз вядзі мяне не да лекара, а да самага вялікага начальніка і я адкрыюся, хто я на самай справе ёсць”.

Шышэя выйшаў з бараку і вырашыў з`ездзіць да начальніка АЧА - таго самага палкоўніка, які не так даўно яго выклікаў. Угаварыў і Крука паехаць разам. Палкоўнік быў на месцы. Ахоўнік даклаў аб прыходзе Шышэі і начальнік АЧА даў дазвол зайсці. Выслухаўшы Шышэю, у чым справа, палкоўнік сказаў: “Ну, давай яго сюды”. Шышэя заклікаў Крука. А той, як толькі пераступіў парог кабінета палкоўніка, адразу па-вайсковаму запытаў: “З кім маю гонар размаўляць?”. Пасля такога запыту падняўся са свайго крэсла і палкоўнік і таксама па-вайсковаму адказаў: “Начальнік АЧА Мінлага палкоўнік Памеранцаў!”. Дзякуючы гэткім абменам дакладамі паміж Крукам і палкоўнікам, Шышэя даведаўся прозвішча апошняга, а так хадзіў і не зусім ведаў, да каго.

Пасля Крук пачаў дакладаць далей, што ён нібыта член сям`і Раманавых і хоча напісаць пісьмо ў ААН, у якім паведаміць, дзе ён знаходзіцца, каб яго больш не шукалі. Паслухаўшы роспавед Крука, палкоўнік запрасіў Шышэю сесці, а сам стаў нешта запісваць. Але Крук працягваў далей выкладаць свае просьбы: “Дайце мне чыстую паперу і я перапішу на яе ўсё тое, што ўжо напісаў, а вы ўсё гэта перадайце ў ААН. Самога мяне больш не клапаціце са сваімі загадамі, бо ў мяне ёсць праца, ад якой мяне нельга адрываць. Мне патрэбна пісаць далей”.

Праз нейкі месяц размовы з начальнікам АЧА Крука адправілі ў шостае лагернае аддзяленне, а там, гаварылі, яго ўкінулі ў прыбіральную яму. Вось так і скончыўся лёс гэтага адукаванага, але так і застаўшагася для Косці незразумелым чалавека. А

самога Шышэю зноў перавялі на будоўлю, цяпер ужо паліклінікі, пад якою толькі пачыналі закладваць фундамент. На двары стаяла зіма. Марозы трымаліся моцныя і зямля прамерзла глыбока. Каб яе адагрэць, разводзілі кастры, і толькі пасля гэтага капалі катлаваны і залівалі ў іх бетон. Усе названыя аперацыі выконваліся ўручную. На гэтай будоўлі Косця прабыў роўна месяц. А пасля прараб Караль Ламбург, які будаваў два цагляныя васьмікватэрныя дамы, папрасіў Шышэю перадаць яму ў памочнікі, на што начальства пагадзілася. Бо сапраўды, у тых умовах ды калі ўсе работы выконваліся ўручную, ды глядзець за двумя аб`ектамі аднаму прарабу было цяжкавата.

Расказваўшы аб усім гэтым, Шышэя паспрабаваў і абгрунтаваць, чаму амаль кожны з прарабаў ці іншых адказных работнікаў хацеў з ім працаваць. У той час у лагеры сядзелі людзі і значна больш адукаваныя, чым Косця, скажам, былыя архітэктары, інжынеры і гэтак далей. А працавалі яны на простых фізічных работах. Справа, на яго думку, заключалася ў тым, што гэтыя людзі былі страшна падаўленыя і дэмаралізаваныя. Многія з іх у свой час верылі савецкай уладзе, камуністычнай партыі і нават актыўна змагаліся за яе ідэалы. І калі іх ні за што, па нейкіх даносах, арыштоўвалі і над імі здзекаваліся, яны не маглі сабе ўявіць, што адбываецца і ўпадалі ў роспач. А падаўлены і разгублены чалавек не мог сканцэнтравацца на выкананні той ці іншай адказнай творчай працы. Гэтыя людзі ўвесь час не маглі прыйсці да сябе, без чаго чалавек не можа рэалізаваць сваіх ведаў. А для Шышэі ўсе гэтыя выпрабаванні, хаця і былі таксама цяжкімі, але ж пераносіў ён іх шмат лягчэй, чым інтэлігенты. Ён правёў сваё дзяцінства ў вёсцы, і як толькі вясною сыходзіў снег і амаль да новага разам з іншымі дзецьмі бегаў босым і ўбіраў у сябе частку той сілы зямлі, якая корміць і трымае ўсё жывое; вясною і летам не вылазіў з Нёмана - гэтай цудоўнай беларускай ракі, з дапамогай яе вады змываў з сябе ўвесь бруд, пасля чаго, здавалася, не толькі цела, але і душа станавілася чыстай; пачынаючы з ранняй вясны і да позняй восені ў ежу ўжываў самыя чыстыя і свежыя прадукты, якія тады вырошчваліся на сялянскіх сядзібах без усялякіх штучных угнаенняў і ядахімікатаў; з ранняга дзяцінства пачаў працаваць на розных работах, якія патрабавалі не толькі фізічнай сілы, але і кемлівасці. Ды не былі гэтыя выпрабаванні для яго і нечаканымі.

Ён сутыкнуўся з нечалавечымі метадамі адносін савецкай улады да людзей ужо восенню 1939 года шаснаццацігадовым хлопцам, калі забілі бацьку, арыштавалі яго і брата, пры арганізацыі ў іх вёсцы калгаса, у час чаго сялян па сутнасці рассяляньвалі, пазбавіўшы іх самага галоўнага - сродкаў вытворчасці ў сельскай гаспадарцы - зямлі, коней, вазоў, саней, якія ў свае часы нажываліся людзьмі мазалямі і потам. Ён перажыў зверствы нямецкіх акупантаў і іх прыслужнікаў, разгул многіх лясных бандытаў, якія, побач з сапраўднымі змагарамі за вызваленне Радзімы ад замежнай брыдоты, рабавалі і ні за што забівалі людзей. Менавіта таму ён і адклікнуўся на заклік стварыць сваё беларускае войска, для якога наша Радзіма-Беларусь была роднай зямлёю - Маці, а калі прапанавалі, дык сеў у самалёт і спусціўся з парашутам, каб усё ж такі паспрабаваць падняць сваіх землякоў на барацьбу за стварэнне Беларускай Дзяржавы, у якой дзеці вучыліся б на сваёй роднай мове, дзе паважалі б людзей, як самую дарагую каштоўнасць і размаўлялі б з імі на зразумелай для іх гаворцы. Таму ён, як і яму падобныя, перанёсшы страшныя пакуты ў час допытаў і пераносіўшы здзекі ў лагеры, змог не страціць сваёй чалавечай годнасці, не разгубіцца, калі нават застаўся адзін, без сям`і. Больш таго, Косця верыў, што прыйдзе час, калі ён зможа вярнуцца на Радзіму і сустрэцца са сваімі роднымі і блізкімі, убачыць Беларусь вольнай і незалежнай дзяржаваю. Безумоўна, дадатковага натхнення яму ў гэтым плане надалі і вершы Ларысы Генію ш, з якой яму давялося нядаўна спаткацца. У сувязі з усім гэтым ён імкнуўся выжыць, браўся амаль за любую справу і ніколі не адносіўся да выканання яе абыякава.

На будоўлі цагляных дамоў Косця прабыў каля года, а пасля гэтага яго забраў ужо прараб Георгій Дылеўскі на будаўніцтва 68-кватэрнага дома. Георгій Мікалаевіч Дылеўскі быў будаўніком з вялікім вопытам - калісьці будаваў у Піцундзе санаторыі, у якіх адпачывалі тыя, хто трымаў у сваіх руках уладу і па загаду каго ствараліся ўсё новыя і новыя канцэнтрацыйныя лагеры, у адным з якіх апынуўся і Дылеўскі. Георгій Мікалаевіч быў добрым і як чалавек. Ён клапаціўся аб тых, хто з ім працаваў, заўжды непакоіўся, каб людзі былі больш ці менш пад`еўшымі, маглі абагрэцца і адчувалі сябе хоць крышачку вальней.

Пасля Дылеўскаму даручылі рамонт цэнтральнага клубу Інты. І самай цяжкай праблемай пры выканані гэтага задання была

арганізацыйная: усяго не хапала, а асабліва машын для перавозкі грузаў. Бывала так, што замест заказаных васьмі прыходзіла толькі тры машыны. Шафёрамі на машынах працавалі былыя вязні, якіх ужо выпусцілі на волю, але не давалі магчымасці раз`язджацца па дамах. Сярод іх асабліва многа было так званых уласаўцаў, родам з Украіны. І тут Косця зразумеў, што трэба рабіць так, каб шафёры хацелі ехаць на працу менавіта да іх. Шафёрам патрэбна было дапамагаць выканаць план, бо зрабіць гэта па справядлівасці было практычна нельга, асабліва зімою, калі ўсе дарогі завальвала снегам і машыны часта буксавалі. Але права подпісу дарожных лістоў шафёрам належала толькі прарабу Дылеўскаму, які быў сумленным чалавекам і які на прыпіску рэйсаў ці грузаў не ішоў. І тут Шышэя знайшоў выхад - навучыўся падводзіць подпіс Дылеўскага. І ўжо праз нейкі тыдзень машыны стаялі ў чарзе, каб толькі працаваць на аб`екце, на якім прарабам быў Дылеўскі. Паклапаціўся Шышэя і аб жанчынах, якія ў кар`еры грузілі на будоўлю жвір. Ён папрасіў хлопцаў нарэзаць для іх дроў, адправіў машынамі рэзаныя дровы ў кар`ер, каб у час вялікага марозу жанчыны маглі крыху абагрэцца.

Дылеўскі быў задаволены арганізацыяй працы на аб`екце, але стаў задумвацца, як гэта ўсё складна робіцца, нібы ў нейкай казцы: машын хапае, дзяўчаты з задавальненнем грузяць жвір... Але Косця хутка адкрыў Георгію Мікалаевічу і сам сакрэт. А повадам для гэтага стала васьмікілаграмовая банка згушчонага малака, якую шафёры далі Шышэі, каб аддзячыць яму за дапамогу ў выкананні плана. Безумоўна, Косця не мог карыстацца гэтым пачастункам адзін, без прараба - ён ніколі не быў індывідуалістам, а тым больш скрагай. Але калі Дылеўскі ўбачыў банку са згушчонкай, ён проста атарапеў і тут жа ў Шышэі запытаў: "Дзе ты гэта ўзяў?". І Косці прыйшлося ўсё выкласці, як кажуць, на чыстую ваду. Пры гэтым ён запэўніў прараба, якога лічыў "галавою" і вельмі паважаў, што, не дай Бог, стане вядома вышэйшаму начальству, ён усю віну возьме на сябе. Бо і сапраўды Дылеўскі тут быў зусім не вінаватым. Але Георгій Мікалаевіч не мог супакоіцца і стаў перажываць аб тым, што калі гэта ўсё выкрыецца, дык Шышэю замарозяць або і зусім згнояць у буры. А Косця ўсё яму працягваў сцвярджаць: "Не мы ў гэтым вінаватыя, а сістэма з яе планамі. Менавіта таму людзі прымушаны хлусіць, што з імі ніхто не лічыцца. А нам

трэба выжыць, а таму і патрэбна рызыкаваць”. Для рамонту клуба адпускалі, згодна ўсё тых жа планаў, многа розных матэрыялаў, у якіх мелі патрэбу і жыхары Інты. Бо ў крамах, мабыць, згодна ўсё той жа планавай сістэме, не было ні белай фарбы, ні іншых патрэбных людзям для рамонту жылля матэрыялаў. Таму людзі прыходзілі да клуба і прасілі ў будаўнікоў ім дапамагчы. За белай фарбай звярталася і лекар Людміла і капітан КДБ Макараў і іншыя. І канешне, некаторыя з іх, каб аддзячыць будаўнікоў за паслугу, нешта і прыносілі. Вось той самы і Макараў, калі прыйшоў прасіць белай фарбы ў другі раз ужо для суседа, дык прынёс кола каўбасы і чыкушку гарэлкі. Прычым ён жа кэдэбіст і добра ведаў, што вязням піць гарэлкку не дазваляецца, таму разам з чыкушкаю і каўбасою прынёс яшчэ і нейцкі арэх, які нейтралізуе пах гарэлкі.

І каўбасою і гарэлкай Шышэя вырашыў таксама падзяліцца з Дылеўскім. Праз нейкі дзень пасля “здзелкі” з капітанам Макаравым раніцай Косця паклікаў георгія Мікалаевіча і кажа: “Я вас нечым смачным пачастую”. А пасля гэтага спачатку нарэзаў каўбачы, а потым дастаў і чыкушку. Убачыўшы гарэлку, Дылеўскі проста закрычаў: “Ты што рпобіш? Я не буду піць сам і катэгарычна забараняю табе!”. Дылеўскаму падалося, што гэкэбіст зрабіў правакацыю і цяпер чакае, калі Шышэя вып`е, каб злавіць яго і тым самым паказаць сваю адданасць справе, якой служыць. Але Косця патлумачыў, што і сярод кэгэбістаў ёсць таксама прыстойныя людзі. І ў якасуці доказу, што Макараў ніякай правакацыі не рабіў, паказаў Дылеўскаму арэх і задаў пытанне: “Калі гэта правакацыя, дык навошта ж ён тады даў мне гэты арэх, з дапамогай якога можна нейтралізаваць пах гарэлкі? Яму ж тады наадварот, патрэбна было б, каб быў чутны пах гарэлкі”. Спрачацца з Шышэям Дылеўскі не стаў, але чыкушку забраў і кудысьці панёс.

Праз два дні Дылеўскі прынёс чыкушку назад і пранаваў Косці выпіць, пры гэтым сказаўшы: “І закусі сваім арэхам”. Косця не адмаўляўхся: пацягнуў гарэлкі, закусіў застаўшымся яшчэ кавалкам каўбасы і нарэшце пажаваў арэха, ды прыступіў да сваёй справы. Праз нейкіх гадзін дзве зноў прыйшоў Дылеўскі і прапанаваў Косці дыхнуць, каб пераканацца, ці праўда, што гэты арэх дапамагае пазбавіцца ад паху гаржлкі. І калі Косця дыхнуў і Дылеўскі ўпэўніўся ў цудадзецйгнасці арэха, ён завёў ужо іншую пласцінку. У прыватнасці, пачаў гаварыць аб тым,

што другія прарабы навораць пра тое, што ўсе шафёры хочуць працаваць толькі на рамонце клуба і неахвотна едуць на ігншыя аб`екты, таму, маўляў, ён вельмі перажывае і не можа спаць начамі, увесь час думае, чым скончацца авантуры Шышэі. Але Косця зноў сказаў сваё: “Я страціў у жыцці ўжо ўсё: маладосць ды і само жыццё. Дык чаго мне яшчэ баяцца? Я нічога не баюся”.

А тым часам працававць сталі ў дзве змены, бо рамонт аб`екта патрэбна было скончыць да савецкіх кастрычніцкіх святаў. Таму і Дылеўскі і Шышэя нават начавалі ў клубе. На аб`екце працавала каля 800 чалавек і ўсім патрэьбна было своечасова даць і прыняць ад іх работу.

Але кожны глядзеў свайго: кіраўніцтву пасёлка патрэбен быў да кастрчніцкіх святаў клуб, не хацеў падводзіць пасялковых начальнікаў і начальнік лагера Барадулін, Дылеўскі і Шышэя клапаціліся аб тым, каб людзі маглі зарабіць пайку хлеба, а тыя, хто правяраў нарады і дарожныя лісты шафёраў, кантралявалі, каб не было прыпісак. І таму, калі ім падалося, што з дадзенага аб`екита вельмі шмат вывезліш смецця, прыехала камісія, каб зверыць падпісаныя аб`ёмы з фактычнымі. Паглядзець, як на рамонце клуба ідуць справы раізам з кантрольнай камісіяй прыехаў і начальнік лагера Барадулін. Камісія доўга лічыла, мерала, але так нічога і не знайшла. Ды пры рамонце клуба і сапраўды было шмат смецця: бо недзе нешта ламалі, абдзралі і гэтак далей. Убачыўшы, што справы з рамонтам клуба ідуць нядрэнна і што ў камісіі няма ніякіх прэтэнзій да аб`ёмаў выкананых работ Барадулін застаўся задаволнным. Праз нейкі дзень пасля камісіі ён прыйшоў на аб`ект нават ноччу, каб яшчэ раз пацікавіцца справамі і падбадзёрыць прараба і ігшых, хто тут працаваў. КАалі барадуолін прыйшоў, Дылеўскі адпачываў, а за сталом у канторцы сядзеў Шышэя, асатанія рабочыя знаходзіліся таксама на сваіх працоўных месцяах. Такім чынам, і на гэты раз барадуліна ўсё задавальняла. Таму ён усміхнуўся і, звярнуўшыся да Шышэі, запытаў: “ну дык колькі ты навазіў там гэтага смецця?”. І не чакаючы адказу, дадаў: “маладзец!”. А далей запытаў зноў: “мабыць, хочаш спаць?”. На што Косця адказаў: “пасплю крыху пазней”.

Аднак без нейкіх прыгодаў у Косці доўга не атрымлівалася. Не абыйшлося без іх і пры рамонце клуба. Убачыўшы ў аркестровай яме шаблі, кулямёты, вінтоўкі іншыя прылады, якімі

карысталіся артысты ў час пастиановак, шышэя ўзяў і ўсё гэта развесіў у клубе на сценах. Але не спалі ў шапку і аператыўнікі6 яны прынялі ўсё гэта за правакацыю ворагаў і, даведаўшыся, што гэта зрабіў Шышэя, адразу кінулі яго ў бур. У іх таксама было сваё - як мага больш выкрыць ворагаў.

Аб здарыўшымся стала вядома Барадуліну. Ён выклікаў Шышэю да сябе ў кабінет, дзе Косця патлумачыў, у чым справа. Размова скончылася тым, што начальнік лагера адправіў Шышэю на працу. І вось тут спатрэбілася тая чыкушка, якую калісьці даў капітан макараў. Убачыўшы, што Косця, знаходзяычыся ў буры, увесь прамёрз, дылеўскі прапанваў яму пагрэцца. А ўжо пасля стала вядома, што за той выпадак барадулін пакараў аперытыўніка Арлова і сказаў, каб без яго дазволу Шышэю не чапалі.

Пасля заканчэння рамонту клуба Дылеўскаму даручылі кіраваць рамонтам Дома фізкультуры. З сабою ён забраў і Шышэю. Гэта быў таксама вялікі аб`ект і патрабаваў шмат часу і працы. Яны ўдваіх толькі замяралі аб`ём работы тыдняў два. А пры яе планаванні ўдзельнічалі архітэктары, мастакі і іншыя спецыялісты.

А жыццё ішло сваёй чаргою і брала сваё. Дзяўчаты і хлопцы пісалі адны другім пісьмы. Ідучы на працу ў кар`ер каля клуба, дзяўчаты перакідвалі пісьмы праз агароджу, а хлопцы адказвалі ім тым жа. Можна было зняволіць цела, але думкі зняволіць нельга, яны заўжды вольныя. І дзяўчатам і хлопцам хацелася дапамагчы адзін аднаму. І Косця напісаў пісьмо ларысе Геніюш, у якім прапанаваў падзяліцца з жанчынамі тканінай, што ішла на абмотку трубаў. З названай тканіны можна было штосьці пашыць: спадніцу, коўдру ці нешта іншае. Перавезці тканіну да жанчын дапамаглі тыя ж шафёры-уласаўцы. А іх сябры, якія займаліся ізаляцыяй і ўкладкай трубаў, прыдумалі і чым замяніць ададзеную жанчынам тканіну. У Доме фізкультуры стаяў вялізны партрэт Сталіна, намаляваны на гэткай жа тканіне. Вось яны яе парэзалі ды абматалі трубы.

Але ж за партрэты быў адказны - сам дырэктар Дома фізкультуры Блудаў. І калі ён прыкмеціў, што знік “Сталін”, ён падняў гвалт і даклаў оперупаўнаважаным. А тыя ўзяліся шукаць прапажу. Шышэя зразумеў, што, калі знойдуць партрэт, - гэта дабром не скончыцца. Ён сабраў надзейных хлопцаў і запытаў: “Ці ведаюць яны, куды знік партрэт Сталіна”. Ведаючы

думкі Косці ў адносінах да праўадарыра і яго сумленнасць, хлопцы сказалі: “А мы ім абкруцілі трубы”. Дамовіліся маўчаць. А тым часа аператыўнікі, шукаючы партрэт, кожнага вязня распранулі і разулі, усё думалі, што прапажу знойдуць. Але ча ішоў, а пошукі не прыносілі вынікаў. Патрэбна было зніклы партрэт правадыра замяніць такім жа. Партрэт Сталіна заказалі мастаку, пры гэтым далі і тую фатакартку, гледзячы на якую, малявалі прапаўшы. А ў гэты час з праверкай у лагер прыехаў з упраўлення Мінлага палкоўнік Бэрман. І калі Бэрман глянуў на партрэт Сталіна, які яшчэ быў не тгатовы, адразу крыкнуў на матстака: “Злазь з лесвіцы! Ты чаму малюеш Сталіна гэткім злосным?”. На што мастак Ахвярдзееў адказаў: “Які ёсць, такі і ёсць. Я яго гэткім і малюю”. Такі адказ абурыў палкоўніка і ён зноў закрычаў: “маўчаць!”. Мастака арыштавалі і пасадзлі ў бур, дзе ён прасядзеў, пакуль з Масквы не прыехала камісія і не падцвердзіла падабенства партрэта на фатакартку Сталіна. Дарэчы, аб гэтым раней гаварыў і начальнік праектнага аддзела Інты Хаменка. Але ўзроўню пасады Хаменкі для Бэрмана было недастакова. І сцявярджэнне галоўнага праектанта пасёлка ён не прыняў да ведама.

Вядома, што пры савецкай уладзе галоўным заўжды былі абяцанні і шум вакол справы, а не сама справа. Таму вельмі шмат энергіі і часу трацілася на прыняцце абавязацельстваў, пры гэтым вельмі важным было абяцаць выканаць не адзін, а некалькі планаў. А пасля прыняцця гэткіх абавязацельстваў уся ўвага пераносілася ўжо на паказуху, таму ўвесь час адзін штучна створаны рух за перавыкананне планаў змяняўся другім: ізотаўшчына стаханаўцамі, якія, як грыбы пасля цёплага дажджу, сталі з`яўляцца ў кожнай галіне народнай гаспадаркі, скажам, на транспарце - Пётр Крыванос, у сельскай гаспадарцы - паша Ангеліна і гэтак далей. Асбліва многа шуму на гэты конт стваралася перад сваецкімі святамі, сустракаць якія абавязкова патрэбна было “працоўнымі падарункамі”. Вось таму і скончыць рамонт дадзенага Дома фізкультуры, як перад гэтым рамонт клуба, начальства загадала зноў-такі да наступных кастрычніцкіх святаў. І каб выканаць гэткія пажаданні партыйнага і савецкага кіраўніцтва Інты, начальнік будаўніцтва гарадскога пасёлка Пётр Васюта вырашыў прымяніць на рамонце названагаг аб`екта акордную аплату, прычым самую суму грошай назначаў без усялякіх папярэдніх разлікаў, на вока,

і, як правіла, заўжды ў два-тры разы большую,чым паказвалі разлікі.

Але ж камусьці за гэта патрэбна было ў рэшце і рэшт і адказваць. Бо ў той час вязням ужо пачалі налічваць заробак. Праўда, на рукі кожнаму выдавалі толькі так званыя боны на суму 100 рублёў у месяц, за якія можна было нешта купіць з ежы, а астатнія грошы ішлі ў “фонд вызвалення”, які чалавек атрымліваў, калі выходзіў на волю. Таму кожнаму ўжо хацелася не толькі адбываць тэрмін зняволення, але і зарабіць грошай. У гэтай сувязі са сказаным падманам, безумоўна, ніхто не змірыўся б. І тут Шышэя мог бы быць крайнім. Таму Косці патрэбна было шукаць са склаўшагася становішча нейкае выйсце і ён пайшоў да Дылеўскага, але, на жаль, ніякага канкрэтнага адказу ў прараба не атрымаў. Тады Шышэя вырашыў звярнуцца за парадай да эканаміста Усейнава, якога, як і Дылеўскага, ён паважаў за іх прафесійнасць. І Усейнаў даў параду: спачатку пісаць нарады на выканнне аб`ёмаў працы і не ставіць суму грошай для аплаты за выкананую работу, а паставіць потым тую суму грошай, якую прызначае Васюта, але даць гэта яму на подпіс. І калі ён падпіша, дык патрэбна зняць з нарадаў копіі і апошнія здаць у бухгалтэоыю, пакінуўшы ў сябе арыгінал.

Так Шышэя і зрабіў: склаў нарады, у якіх былі толькі заданні на выкананне аб`ёмаў працы, і пайшоў да Васюты, які Шышэю чамусьці называў старастам. Начальнік БНК (будаўніча-мантажнай камісіі) Інты без усялякіх спрэчак паставіў тыя сумы грошай, які ён абяцаў рабочым і ўчыніў свой подпіс. Але калі Шышэя здаў нарады нарміроўшчыцы марыі Каржавінай і яна ўбачыла ў іх апісанае наваўвядзенне, нарміроўшчыца паглядзела на Шышэю і сказала: “так справа не пойдзе”. А пасля гэтага ўзяла нарады і панесла іх да Васюты. А той, як ні ў чым ні бывала, прачытаў нарады і адразу знайшоў выйсце, узваліўшы ўсю віну на Шышэю, сказаўшы, што нібыта гэта ён прыдумаў гэткае наваўвядзенне. А самі нарады парваў і выкінуў у кош, мабыць, не падумаўшы пры гэтым, што праваў ён толькі копіі, а арыгіналы засталіся ў Шышэі. І тым часам апошні зноў зрабіў копіі тых жа нарадаў і аддаў іх ужо начальніку тэхнічна-навуковага бюро Капеіставу, камяку па нацыянальнасці і вельмі прынцыповаму чалавеку. Капеістаў паглядзеў копіі нарадаў, зверыў іх з арыгіналам, уважліва выслухаў тлумачэнне на гэты

конт Шышэі і парасіў апошняга пакінуць яму і копіі і арыгіналы. Але Косця з гэтым не пагадзіўся, пасля чаго яны пайшлі да Дылеўскага, які, убачыўшы на нарадах подпіс Васюты, таксама іх падпісаў. Падпісаныя нарады зноў Косця зноў здаў у бухгалтэрыю, дзе рабочым і налічылі грошы.

Аднак на гэтым усё скончыцца не магло, бо пераплата заробку склала больш 2 тысячаў рублёў. І каб у гэтай справе неяк паставіць кропку, Васюта вырашыў адправіць Шышэю зусім у іншае 6 лагернае аддзяленне, на будаўніцтва новай шахты № 6, рабочых для якога ў гэты час ён падбіраў. Вось ён і уключыў у спіс Шышэю кастуся. Але, даведаўшыся аб гэтым, Дылеўскі пайшоў з просьбай да старшага нарадчыка Румянцава пакінуць Шышэю нам есцы. Румянцаў даклаў вышэй і так справа дайшла аж да самога начальніка 5 лагаддзялення Барадуліна. Начальнік лагаддзяленяя, як заўжды, вырашыў разабрацца, учым справа, і для гэтага выклікаў Шышэю да сябе ў кабінет. Выслухаў яго тлумачэнне наконт "хіміі" з нарадамі, пасля чаго ўзяў спіс вязняў, якіх адпраўлялі ў 66 лагаддзяленне, выкрасліў з яго прозвішча Шышэі і патэлефанаваў начальніку планава-вытворчай часці ПВЧ Татаркіну, які адначасова з`яўляўся і парторгам, і загадаў апошняму падабраць Шышэі іншую работу, бо ўступаць у нейкія спрэчкі з Васютам барадулін, мабыць не хацеў. Справа ў тым, што Васюту сюды саслалі з Украіны як кулака, сярод якіх лодыраў не было. Ды і будаўніком ён быў заўзятым, які забяспечваў даручаную яму справу, можна сказаць, на выдатна. І калі некалькі разоў спрабавалі яго звольніць з названай пасады, каб даць нейкаму партыйцу, дык заўжды справа пагаршалася, і таму вымушаны былі зноў вяртаць Васюту на "сваё месца".

Татаркін , перш чым прапанваць Шышэі новую працу, таксама вырашыў выклікаць яго на размову. Косці прыйшлося яшчэ раз расказаць аб тых недарэчнасцях, якія ў яго атрымаліся са складаннем нарадаў пры рамонце Дома фзікультуры. Зразумеўшы кемлівасць стаяўшага пера ім хлопца, татаркін прапанаваў яму везці падлік кожнадзённых выпрацаваных нормаў будаўнічай калоны, у якой налічавалася каля 800 чалавек. Справа ў тым, што, згодна з новымі пастановамі, залік тэрміну знеяволення стаў залежаць ад выканання вязнямі нормаў, што, як і налічванне ім заробку, было ўвогуле прагрэсіўнай з`явай. Косця адразу зразумеў, што без

авалодання тэхнікай падліку з дапамогай лагарыфмічнай лінейкі справіцца з гэтай работай вельмі цяжка. Але адмаўляцца ад прапановы не стаў і пачаў рабіць падлікі спачатку на паперы. Безумоўна, працаваць прыходзілася і днём і ноччу.

Гэткімі ж падлікамі штабной калоны займаўся Вавілаў; калоны, якая працавала ў шахце, - Казлюк. Але ў першага было нашмат менш людзей (усяго каля 300 чалавек), а ў другога - хаця людзей было і шмат, але мала катэгорый рабочых. Таму аб`ём працы ў іх быў значна меншым, чым у Шышэі. Усё гэта прымушала Косцю як сага хутчэй асвоіць тэхніку падліку з дапамогаю лагарыфмічнай лінейкі, бо працаваць і днём і ноччу можна было на працягу тыдня, ну няхай сабе і двух, але і не болей. І Косця з гэтай задачай справіўся, што Вавілава прывяло ў здзіўленне. САм ён меў вышэйшую адукацыю і працаваў раней гандлёвым прадстаўніком СССР у Англіі. Косця дакладна не ведаў, за што гэты былы чыноўнік угадзіў у канцэнтрацыйны лагер аж на поўных 25 гадоў, але аб тым, што гэта чалавек нехарошы, пераканаўся. Вавілаў напісаў пісьмо палкоўніку памеранцаву, у якім даносіў, што сярод вязняў, маўляў, працуе шпіён, які хавае сваю адуукацыю, а значыць, і сапраўдную сваю біяграфію.

Палкоўнік выклікаў Шышэю ў кабінет і як у “старога знаёмага”, запытаў: “Ну што ты там не можаш паладзіць з Вавілавым?”. На што Кастусь адказаў, што Вавілаў абзываў яго і дыверсантам і шпіёнам, пасля чаго ён (Шышэя) не сцярпеў і адкаў паклёпніку: “А хто ты? Табе савецкая ўлада дала вышэйшую адукацыю, накіравала ў Англію, а ты там натварыў штосьці такое, што табе далі аж 25 гадоў. А мне ж толькі 10. Вось ён за гэта і злуе”. Выслухаўшы роспавед Шышэі аб іх адносінах з Вавілавым, памеранцаў сказаў: “Ну навошта табе гэты стары чалавек?” (Вавілаву ў той час было ўжо 65 гадоў). Пасля гэтага палкоўніу крыху памаўчаў… І працягнуў гаворку далей: “Але мяне таксама цікавіць усё тваё жыццё. Я быў у Ухце і падняў у архівах тваю справу. У сувязі з гэтым у мяне з`явілася шмат пытанняў”. Тут Шышэя\ насцярожыўся і стаў чакаць, што скажа палкоўнік далей. Яму на розум зноў прыйшла думка аб версіі свайго паходжання з Трокаў, бо калі высветліцца, што гэта не так, можа быць бяда. Але Памеранцаў стаў узгадваць, хто і як у Шышэі вёў допыт. Ён успомніў таго “азіята”-маёра, які быў здольны толькі да здзекаў над вязнямі і ўчынення гвалту, далей сказаў

аб допыце, які праводзіў старшы лейтэнанат і больш падрабязна спыніўся на тым, як допыт вёў капітан Трошын і чым ён, на яго думку, пры гэтым кіраваўся: “Маўляў, справа зацягвалася, а таму і даручылі яе гэтаму дасведчанаму і вопытнаму спецыялісту, які цябе хутка падвёў пад “Асобую раду” і пад 10-гадовы тэрмін зняволення. А ў канцы палкоўнік сказаў: “Цяпер табе ўжо засталося быць зняволеным толькі паўтара года. Пасля гэтага ты выйдзеш на воолю. І мне цікава, што ты скажаш аб гэтым тваім перавыхаванні ў перавыхаваўча-працоўных лагерах. Толькі не лыжы”.

Шышэя ўжо ведаў, што ён мае справу, безумоўна, з разумным, адукаваным і вопытным чэкістам, які быў здольным зазірнуць у душу чалавека. Таму і на гэты раз ён быў з палкоўнікам адкрыты і на цікавіўшае Памеранцава пытанне адказаў: “Не ведаю, што вам, грамадзянін начальнік, казаць? Вы ж палкоўнік КГБ. Таму гаварыць вам праўду - гэта зноў аддаць сябе на пакуту яшчэ на некалькі гадоў”. Перапыніўшы Шышэю, палкоўнік пацікавіўся: “Чаму?”. На што Шышэя адказаў: “Бо буду казаць праўду”. Пачуўшы такі, нездавальняючы яго адказ, памеранцаў стаў пераконваць Шышэю далей, каб пачуць ад яго хоць бы прыблізную праўду. “Ты хлопец смелы, - сказаў палкоўнік, - таму я і выбраў цябе, каб пачуць праўду, якой бы яна не была. Я хачу яе ведаць. А табе я абяцаю, што наша размова застанецца ў гэтых сценах”. Косця зразумеў, што ў гэткіх выпадках хлусіць нельга, тым больш, што і да самога палкоўніка ў Косці ўжо быў якісьці давер. Таму ён і пачаў гаварыць тое, што думаў. “Я вам веру. Таму я вам скажу праўду, калі яна вас цікавіць”. Пасля гэтага глыбока ўздыхнуў і пачаў свой роспавед: “Я ўжо не чалавек, а нейкая машына, як, скажам, аўтамабіль ЗІЛ, - з нумарам 296. Вы ведаеце, што 3 гады я быў навогул у лагеры з бандытамі, дзе нават елі людзей. І той лагер таксама называўся выхаваўча-працоўным. А на самай справе лагер быў акружаны вышкамі, на якіх знаходзіліся ўзброеныя салдаты, а ў сярэдзіне навядзенне парадку было аддадзена на водкуп бандытам - “мядзвежатнікам”, “сукам”, якія там і камандуюць. У тым лагеры знаходзілася група падлеткаў ад 14 да 18 гадоў, колькасцю 147 чалавек. Іхвыхаванне было даручана нейкаму Васілю Уласаву, якому хлопцы далі мянушку “Дзядзька Штык”. І як жа ён выхоўваў падлеткаў? Паставіць хлопцаў у два шэрагі тварамі адзін да лругога, а сам ідзе паміж

імі. І вось патрэбна было на хаду выняць у яго з кішэні кісет з кутасом, прычым выняць так, каб ён не прыкмеціў. І калі гэта нехта зробіць, таму ён абяцаў у якасці ўзнагароды даць дзень адпачынку. А калі “Дзядзка Штык” заўважаў, як нехта з хлопцаў спрабаваў дастаць з яго кішэні кісет, дык ён збіваў адным ударам хлопца да крыві. Вось якое выхаванне атрымлівалі падлеткі ў тым лагеры. Больш таго, калі Уласаў захварэў, на яго месца прыслалі Філіна ВІталя, які раней, каб не хадзіць на фзізічную працу, адсек сабе пальцы. Філін таксама пачаў біць падлеткаў вось сваёй кульцёй. Але сам ён нешта не дагадзіў тым, хто ахоўваў Уласава. І яны яго зарэзалі, нанёсшы пры гэтым 47 нажавых ранаў. І ўсё гэта рабілася на вачах у астатніх падлеткаў”.

А далей Шышэя перайшоў да роспаведу аб тым лагеры, дзе ён знаходзіўся ў той час. У прыватнасці Кастусь сказаў: “Зараз я жыву ў палітычным лагеры. Зноў-такі, што гэта за лагер? Над намі стаяць мала адукваныя наглядальнікі. Вось, напрыклад, узяць хаця б таго старшага лейтэнанта Сакольнікава - колькі з-за яго я напакутаваўся. А за што? Толькі за тое, што не захацеў стаць “стукачом””. І тут Шышэя падрабязна расказаў памеранцаву аб сваёй размове з Сакольнікавым і далей працягнуў роспавед: “А людзі ў лагеры сядзяць разумныя, нават вялікія, сярод якіх шмат замежнікаў. Якія ўспаміны ў іх застануцца аб гэтым выхаванні? Безумоўна, дрэнныя. Ды і што навогул нас чакае далей? Вось вы, грамадзянін палкоўнік, гаворыце, што я канчаю адбываць свой тэрмін зняволення. Ці ж гэта так? Далей мяне чакае Кірта - пасёлак шахцёраў, куды мяне, хутчэй за ўсё накіруюць на вольнае пасяленне. Для мяне там мае сябры ўжо рыхтуюць і месца. Бо вы ж ведаеце, ніхто мяне дамоў не адпусціць. Дык якая ж гэта воля? І што я магу думаць аб сваім жыцці? Яно прайшло ўпустую”. А потым Косця зноў патлумачыў палкоўніку, чаму ён не наклаў на сябе рукі.

Выслухаўшы ўважліва Шышэю, палкоўніук рашыхў удакладніць: “ты што, праўда, верыш у БОга?”. На што Кастусь супёзным тонам адказаў: “Я не толькі веру, я ўпэўнены, што Бог ёсць. Таму, калі мяне маёр катаваў, я яму сказаў, няхай ён робіць, што хоча - б`е, “мочыць”, але перад Богам ён усяроўна слабак. І калі Бог захоча, каб я застаўся жыць, дык я і застануся жвывм. Вось так яно і здарылася”.

Палкоўнік выслухаў уважліва і развражанні шышэі аб існаванні

Бога. Але пасля сказаў: “Мне дзіўна, што ты так верыш у Бога. Але калі верыш, дык што будзе далей з гэтым светам?”. Шышэя паведаміў, што і на гэтае пытанне ёсць адказ: “Вось калі ў двлёкім мінулым насельніцтва \зямлі дайшло да таго, што перастала верыцьу Бога і ў дабро, Бог паслаў на яго патоп і ўсё, што было жывым, змыў з Зямлі. І жыццё зарадзілася нанава. А цяпер, як сказана ў Святым Пісанні, калі свет зноў дойдзе да гэткага стану, што не будзе ні ўвошта верыць, Бог зробіць так, што Зямля прагарыць на вялікую глыбіню, каб на ёй зноў нічога не засталося жывога”. Пачуўшы гэткае, палкоўнік, як падалося Шышэі, здалей з нейкім жахама прагаварыў: “Ты так запалохваеш, што выходзіць, і няма ратунку”. Шышэя рашыў выказаць сваё меркаванне і на гэты конт: “Ёсць. Я таксама грэшны. Вось таму і пакутую, каб знайсці пасля выратаванне”. Пасля ячаго памеранцаў падзякаваў Косці за адкрытасць. А што тычыцца Вавілава, дык палкоўнік яшчэ раз параіў Шышэі не чапаць гэтага чалавека, каб не браць на сябе лішнш грэх.

Размова ў памеранцава доўжылася гадзіны тры. І калі Вавілаў убачыў шышэю, дык аж не сцярпеў і як бы з нейкай заклапочанасцю сказаў: “А во, зноў, не пасадзлі. Апраўдаўся”. Але Шышэя не звярнуў на яго ўвагі і працягваў сваю працу. А тым часам жыццё ішло ў лагеры па сваіх законах. Падыходзіць аднойчы да Косці знаёмы хлопец - павел Санацкі і кажа: “заўтра ў шахце заб`юць начальніка ўчастка, беларуса па нацыянальнасці, Анатоля Гурко”. І хаця Косця асабіста з гурко не быў знаёмы, але вырашыў высветліць, у чым справа. Пры гэтым Косця ведаў, што нарадчыкам на той шахце, дзе працуе Гурко, быў Васіль Дземчанка, якога ён ужо ведаў асабіста. Вось пасля работы Косця і знайшоў Васю, ды расказаў яму аб гэтай сваёй жахлівай даведцы. Больш таго, Косця сказаў і абсваім намеры дапамагчы Гурко, але ён не ведаў, з кім аб гэтым патрэбна весці размову. Выслухаўшы Косцін роспавед, Дземчанка пагадзіўся, што сапраўды патрэбна не дапусціцьб гэтай смерці. Таму параіў Косці пайсці і пачакаць каля прыбіральняў іх шахтаў, пакуль да яго не падыйдзе гарбаценькі чалавек, з якім і можна гаварыць аб выратавванні Гурко ад смерці, да якой яго прымовілі шахцёры-украінцы. Прымова была вынененсена, безумоўна, не падставе розных нацыянальнасцяў, а Гурко чымсьці іх не задаволіў на працы.

Шышэя пайшоў і сапраўды праз нейкай паўгадзіны да яго

падыйшоў гарабаценькі чалавек. Павітаўшыся з ім, Шышэя расказаў, у чым справа, і ў канцы роспаведу запытаў: “А чаму патрэбна Гурко забіваць?”. Гарбаты, відаць, ведаў, з кім гаворыць, таму спачатку, чым гаварыць аб Гурко, удакладнгіў: “Ты ж нарадчык. Ці ж можна табе верыць?”. На што Шышэя адказаў: “Перш за ўсё я гэткі, як і вы. Вы ваююце за вольную Украіну, а мы змагаемся за вольную Беларусь. І калі Гурко ёсць за што забіваць, дык мы, беларусы, зробім гэта самі. А навошта, каб вашы рукі былі ў беларускай крыві?”. Пасля такога адказу Гарбаты зразумеў, што сапраўды тут можна гаварыць адкрыта. І ён далей сказаў: “Нукалі так, дык і я буду адкрытым: у нас ёсць там два чалавекі, якія нічога не робяць, але іх патрэбна ўпісваць у нарады, а Гурко гэтага не хоча рабіць”. На што Шышэя патлумачыў: “Гэта ж нейкае дзікунства. А чаму яны нічога не хочуць рабіць? Вы ж падумайце… так справа цягнуцца доўга не можа. Ну, не будзе Гурко, а гэтыя, што не працуюць, і далей не будуць нічога рабіць? Вы ж усіх начальнікаў не заб`яце”. Выслухаўшы Косціна тлумачэннеі, мабыць, пагадзіўшыся з ім у душы, Гарбаты запытаў: “Ну дык над чым мы дамовімся?”. І тут Шышэя зразумеў, што галоўнае зроблена - рука, якая трымала сякеру над галавой Гурко, была затрымана. Але пасля гэтага сапраўды патрэбна былі канкрэтныя крокі, бо “сякера” ўжо раніцай магла апусцііца на запланаваны аб`ект - гэткае заданне было ўжо атрымана. Таму крыху падумаўшы, Шышэя сказаў: “па-першае, заўтра Гурко не павінен быць на працы, бо загад забіць яго, напэўна, ужо дадзены. Па-другое, патрэбна вызначыцца з тэрмінам, колькі Гурко павінен ім налічваць дарма заробак. А пасля няхай яны ідуць з гэтага ўчастка ў іншае месца. Гэткіх блатных месцаў, дзе можна толькі рабіць прыліку, а не працаваць, у лагеры хапае”. Гарбаты з довадамі Косці пагадзіўся даць гэтым “беспрацоўным” два тыдні, паккуль яны знойдуць сабе іншае месца.

Развітаўшыся з гарбатым, Шышэя пайшоў шукаць Гурко. Дарэчы, гэта быў адукаваны хлопец, скончыўшы настаўніцкую семінарыю; родам паходзіў з нясвіжа. Вось, знайшоўшы яго, Косця паведаміў, што, маўляў, заўтра цябе клікаць у АЧА, але ты ідзі ў ПВЧ, дзе папабяцаў яго чакаць. А далей Косця патлумачыў, чаму патрэбна так рабіць.

Раніцай Косця пайшоў да старшага нарадчыка Румянцава і сказаў, што Гурко выцклікаюць у АЧА. І праз некалькі хвілін

гурко быў ужо ў Шышэі, пасля чаго для выгляду яны схадзлі да дзвярэй АЧА, пастаялі там і папланавалі, што і як рабіць далей, ды на тым і разышліся, дамовіўшыся вечарам спаткацца зноў. У рэшце рэшт усё скончылася нармальна.

Сам Шышэя працягваў працаваць у ПВЧ. А праз некаторы час стала вядома, што памёр Іосіф Сталін. У лагеры кожны з вязняў уздыхнуў з надзеяй на хоць якія-небудзь перамены ў лепшы бок. Дзень пахавання правадыра-тырана абвясцілі непрацоўным; усіх паставілі ў калону і перад вязнямі з прамовай выступіў прыехаўшы з упраўлення палкоўнік Казлоў. У прамове пасля некалькіх стандартных слоў аб заслугах і вялікасці памерлага палкоўнік сказаў, што для вязняў будзе палягчэнне. Але ў той жа час і падкрэсліў, што яны (чэкісты) па-ранейшаму могуць карыстацца наручнікамі і ўсмірытельнай рубашкай. Пачуўшы гэткае, калона загудзела. Казлоў нахмурыў бровы і запытаў: “Хто гудзеў?”. Вядома, вязні маўчалі. Безумоўна, што і ніхто не сказаў: “Я”. Таму забегалі і начальнік лагера Барадулін, і яго намеснік і іншае мясцовае начальства. А Казлоў у сваёй прамове пачаў папракаць вязняў тым, што яны, маўляў, не ўдзячныя за тое, што на іх утрыманне і перавыхаванне затрачваецца шмат сродкаў. Гэта яшчэ больш абурыла вязняў, бо кожны з іх ведаў, што ўся здабываючая і некаторыя іншыя галіны прамысловасці, будоўля трымаюцца на Поўначы, Сібіры і на Далёкім Усходзе за кошт бясплатнай працы вязняў. А тут у Казлова яшчэ хапіла нахабства і абвінавачваць іх у няўдзячнасці. Але ўсё скончылася без прыняцця якіхсьці надзвычайных мераў.

Праз некалькі часу адносіны да вязняў сапраўды некалькі змяніліся: з баракаў знялі замкі, у лагеры дазволілі сустрэчы са знаёмымі. Гэта дало магчымасць і Шышэі бліжэй пазнаёміцца з былым дырыжорам Менскай філармоніі, кампазітарам Клаусам Мікалаем Парфір`евічам. Клаус калі-нікалі іграў на гармоніку. У той час Косця пазнаёміўся і з Феактіставым, які кантраляваў сталовую, дзе можна было нешта купіць за боны. Ён папрасіў Косцю, каб апошні дапамог яму ўстанавіць сувязь з жонкаю і дачкою, якія знаходзіліся ў чацвертым жаночым лагеры, а заадно папрасіў і дапамагаць яму пісаць меню, за што паабяцаў даць бясплатныя абеды. Безумоўна, Косця пагадзіўся, тым больш, што, калі асвоіў лагарыфмічную лінейку, часу ў яго хапала.

А дзень вызвалення станавіўся ўсё бліжэй і бліжэй. Косця вылічыў, што ён прыпадаў на чэрвень 1954 года. Але яму хацелася выйсці на волю ў кастрычніку, каб атрымаць цёплае адзенне, тым больш, што ехаць пасля вызвалення хутчэй за ўсё патрэбна было ў Кірту, якая знаходзілася таксама на Поўначы, але, у адрозненне ад Інты, трыста кіламетраў ад чыгункі. Аднак да вызвалення патрэбна было яшчэ працаваць.

У гэты час Татаркін хацеў даць Шышэі пропуск, які дазваляў без аховы выходзіць за межы лагера. Справа ў тым, што спатрэбіўся чалавек, які адносіў бы з лагера ў кантору, што знаходзілася за лагернай зонай, даведкі аб тых жа падліках выпрацаваных вязнямі нормаў, а заадно і адвозіў бы дадзеныя камандаванню вайсковага дывізіёна аб колькасці накіроўваемых рабочых на аб`екты, каб яно ведала, куды і колькі выдзяляць салдатаў-ахоўнікаў. І паколькі вайсковы дывізіён знаходзіўся прыкладна ў трох кіламетрах ад лагера, дык для названых метаў давалі каня, якога патрэбна было ўмець запрагаць. Менавіта таму, палічыў Татаркін, Шышэя і быў найбольш прымальнай кандыдатурай для гэтай работы. Але, калі аб рашэнні Татаркіна даведаўся Сакольнікаў, ён не пагадзіўся с прапановай начальніка ПВЧ і запрапанаваў на указаную работу Казлюка. Пры гэтым оперупаўнаважаны даклаў аб прапанове Татаркіна, як нібыта аб нейкім злачынстве, нават Барадуліну. Але апошні меў аб Шышэі сваю думку, і каб не спрачацца і з Сакольнікавым даў каманду выдаць пропуск і Шышэі і Казлюку, тым больш, што Казлюк адмовіўся выконваць названую работу, бо не ўмеў запрагаць каня. У такім выпадку прыйшлося пагадзіцца і Сакольнікаву, таму на інструктаж ён выклікаў і аднаго і другога. У час інструктажа оперупаўнаважаны жорстка папярэдзіў, што за межамі лагернай зоны вязні не маюць права ўступаць у размову з цывільнымі людзьмі, нават калі апошнія і з`яўляюцца знаёмымі; з імі можна было толькі прывітацца.

Атрымаўшы пропускі і інструктаж, Шышэя і Казлюк выйшлі за прахадную і перш наперш зайшлі ў хлеў, дзе стаяла трое коней. Коней даглядаў ужо пажылы чалавек, які і сам начаваў у гэтым жа хляве, бо раней ён таксама быў вязнем, але ў той момант знаходзіўся ўжо на спецпасяленні. Таму вось так ён і праводзіў астатнія дні свайго жыцця. Конюх узрадваўся прыходу Шышэі і Казлюка, бо ўжо было каму аб`язджаць коней, якія застаяліся ў хляве. Увайшоўшы ў хлеў, Косця адчуў сябе ў сваёй стыхіі: ён

сумаваў па конях, якіх так любіў. Коні былі сытымі, што сведчыла аб добрасумленнасці конюха. Косця выбраў лепшага з іх, запрог, а двух другіх прывязаў ззаду да саней, каб таксама прабегліся. Казлюк у гэты час выконваў ролю проста наглядальніка, да коней ён нават не падыходзіў. Калі конь быў ужо запрэжаны, а два другіх прывязаны да саней, тады Казлюк, нібы пан, сеў поруч з Косцем на сані і пачаў паглядаць на дарогу.

Але Сакольнікаву не цярпелася, што Шышэя знаходзіцца за межамі лагера. Таму ён вырашыў на ўсялякі выпадак пракантраляваць, куды Шышэя паедзе. І таму, калі Шышэя і Казлюк вярнуліся на санях да хлява, тут іх чакалі і Татаркін і Сакольнікаў. Прычым апошні адразу закрычаў: "Хто дазваляў катацца?". І тут Шышэя не вытрымаў і, звярнуўшыся да Татаркіна, сказаў: "У гэткіх умовах я не буду працаваць. Забірайце свой пропуск і я буду выконваць толькі сваю старую работу. Ды навогул, навошта гэта нас двое? Што - Казлюк сторож нада мною? Калі мне не давераюць, дык няхай ездзіць ён."

Аднак Татаркін папрасіў Шышэю не хвалявацца. Але апошні не супакойваўся: "Я што - заехаў за мяжу? Конюх папрасіў праехацца, каб коні не застайваліся ў хляве. Дык які ж гэта праступак?" Татаркін зноў прапанаваў Шышэі супакоіцца і зайсці да яго ў кабінет. У той час не супакойваўся і Сакольнікаў. Ён працягваў абвінавачваць Шышэю, што той нібыта хоча ездзіць без усялякага кантролю. Справа скончылася тым, што Шышэю зноў выклікаў Барадулін і запытаў, чаму ён адмаўляецца ад дадзенага яму загаду. На што Шышэя патлумачыў прычыну, і канчаючы роспавед, сказаў: "Вось я сустрэў, скажам, працоўнікаў нашай бухгалтэрыі, якія могуць у мяне аб чымсьці запытаць, дык што - я павінен прыкінуцца глухім і нямым? Гэта ж брыдка і нават не па-чалавечы." Выслухаўшы Шышэю, Барадулін сказаў: "Ідзі працуй. Я патэлефаную Сакольнікаву. Але калі ён так хоча, дык няхай разам з табою будзе і Казлюк."

Канешне, адвозіць даведкі ў вайсковы дывізіён і кантору - гэта былі дадатковыя абавязкі і патрабавалі пэўнага часу, да таго ж у час зімы і не вельмі прыемныя, бо там, на Поўначы, зімы снежныя і з вялікімі вятрамі; у лютым амаль не бывае таго дня, каб не дзьмула пурга. Але так усё дацягнулася аж да 16 верасня 1954 года, пакульКосцю не выклікаў Татаркін і не

запытаў: “Ну а ты што сабе думаеш? Сядзіш на заліках нарадаў, а сабе нічога не пішаш. Ты што - лічыш, што табе за гэтыя дні, якія ты пераседжваеш у лагеры, заплацяць?” І тут Шышэі нічога не заставалася, як прызнацца, у чым справа. Татаркін уважліва выслухаў яго і працягнуў размову: “Мы з табою столькі працуем, дык чаму ж ты мне аб гэтым нічога не сказаў, а збіраешся сядзець лішніх паўгода ў няволі?” Пасля чаго сваё абгрунтаванне прадоўжыў Шышэя: “Я ж адзін, і мяне на волі ніхто не чакае.”

Размова скончылася тым, што Татаркін напісаў загад кладаўшчыку выдаць Шышэі цёплую вопратку, валёнкі і нават коўдру, што ўжо і не прадугледжвалася нормамі. І пасля гэтага зноў сказаў: “Ніхто не паверыць, што ёсць чалавек, якому спадабалася няволя.” А Шышэя ў той час узгадаў пра Сакольнікава, які “даўся яму ў косці” так, што яму здавалася: ня можа быць, каб гэты кэдэбіст не нашкоднічаў яму яшчэ і ўканцы. Таму, каб было ўсё добра, Косця вырашыў звярнуцца за дапамогай да Татаркіна: “Мяне ж з цёплым адзеннем Сакольнікаў не выпусціць праз прахадную.” Татаркін таксама разумеў, што на прахадной у Шышэі сапраўды могуць быць непрыемнасці, і таму, каб іх пазбегнуць, вырашыў сам падысці і выпусціць яго з лагера. “Ідзі, - сказаў Татаркін, - атрымлівай вопратку і адразу прыходзь да прахадной, а я буду цябе там чакаць.”

Косця пайшоў і перш за ўсё развітаўся з сябрамі: Федзем Клімцом, Славай Краскоўскім, Паўлам Шляхтуном, Клаусам, Бакуном і іншымі, а пасля атрымаў на складзе вопратку, коўдру і накіраваўся на прахадную. Там яго чакаў усё той жа абрыдлы Сакольнікаў, які паклікаў цырульніка і ператрос усе Косціны рэчы. Але ў гэты час падыйшоў і Татаркін. А што тычыцца паслуг цырульніка, дык Косці яны не спатрэбіліся - ён ужо быў астрыжаны. Хутка пад`ехаў аўтамабіль, у якім знаходзіліся старшы лейтэнант Трусаў і два салдаты, якія пасадзілі Шышэю ў аўтамабіль і павезлі ў камендатуру, дзе патрэбна было зрабіць адзнаку аб вызваленні з лагеры. У камендатуры паведамлялі былым вязням і аб іх месцы спецпасялення. Нечакана для Косці гэткім месцам для яго аказалася тая ж Інта.

Такім чынам, Шышэя быў фармальна ўжо на волі. Але менавіта толькі фармальна. Бо сапраўдным вольным ён па-ранейшаму лічыць сябе не мог, бо выезжаць з Інты ён не меў

права, за адно толькі з`яўленне на чыгуначнай станцыі Інта без дазволу камендатуры, пагражала новых 15 гадоў зняволення. Больш таго, кожны дзень патрэбна было заходзіць у тую ж камендатуру і адзначацца, што ты знаходзішся на месцы. Але нікуды не дзенешся, прыходзілася пагаджацца з такімі парадкамі, якія існавалі ў той краіне, дзе амаль кожны дзень гучала песня "Широка страна моя родная", у якой былі словы: "Я другой такой страны не знаю, где так вольно дышит человек." Вось адным з такіх чалавекаў, якіх на Поўначы, на Далёкім Усходзе і Сібіры жыло мільёны. Ды што там казаць аб тых, хто жыў на спецпасяленні? Ад іх мала чым адлічаліся і калгаснікі, якія ў тыя гады таксама не мелі пашпартаў і без даведкі старшыні калгаса не маглі нікуды выехаць. Але як там не было, а ў тыя хвіліны Косця быў задаволены. Па-першае, не трэба было ехаць у Кірту, ён заставаўся ў знаёмым горадзе, а па-другое, калі выйшаў з камендатуры, яго чакалі сябры: Жэня Ярмоленка і Грыша Якушонак, якія, даведаўшыся аб дні вызвалення Косці, прыехалі за ім на машыне. І першае, што ён ад іх пачуў, дык усё ж такі віншаванне з воляю. "Вітаем на волі!", - крыкнулі яны амаль у адзін голас.

* * *

І Ярмоленка і Якушонак былі беларусамі, якія, як і Кастусь апынуліся

ў гэтых мясцінах, згодна сталінскай волі і яго законаў, аб галоўным з якіх у той жа песні "Широка стран моя родная" гаварылася, як аб "всенародным", які людзі нібыта пішуць "золотыми буквами". Таму за прывітаннем з воляй сябры прапанавалі адзначыць сустрэчу. Безумоўна, што ў параўнанні з Косцям яны ўжо былі на волі знатакамі і таму на яго пытанне: "А дзе ж будзем адзначаць?", адказалі: "Ты сядзі! Ты сёння герой дня."

Сябры прывезлі Косцю ў невялікі прыгарад Інты, хоць яна і сама была ў той час невялікай і галоўным чынам драўлянай. Але і ў тым прыгарадзе, куды прывезлі Косцю, акрамя некалькіх дамоў, была ўжо і сталовая. Аднак адзначаць Косцін выхад на волю ў ей не сталі, а паехалі да Ярмоленкі ў хату, дзе кватараваліся той жа Якушонак і Белянкоў, які таксама нядаўна вызваліўся з таго ж самага лагеру, што і Косця. Сам Ярмоленка ўжо быў жанатым на Клаве, якой Якушонак даў 100 рублёў і

папрасіў яе прынесці дзве бутэлькі гарэлкі і што-небудзь закусіць. Клава з задавальненнем пагадзілася выканаць просьбу, бо і сама любіла пагуляць.

Калі гаспадыня дома выйшла, Белянкоў папярэдзіў Косцю, што, як будзеш тут заставацца, дык Клава запатрабуе з цябе 550 рублёў у месяц, пагадзіўшыся пры гэтым забяспечваць і ежай, але ты, маўляў, давай ёй толькі 300 - хопіць. Але неўзабаве з`явілася і Клава, паставіла падаграваць катлеты, а пасля гэтага дастала пацефон - як не кажы, але кожны адчуваў нейкі душэўны ўздым ад сустрэчы. Выпілі па чарцы, завялі пацефон і пайшлі танцаваць. Косця, як госць, танцаваў з Клавай.

Хата, якую збудаваў Ярмоленка, мела, акрамя кухні, два пакоі: у адным жылі гаспадары, а ў другім кватараваліся хлопцы, у якім застаўся і Косця. На раніцы Клава сапраўды абвясціла яму свае ўмовы. Але Косця, як яго івучыў Белянкоў, даў Клаве 300 рублёў, сказаўшы пры гэтым, што больш у яго пакуль што няма. Пасля гэтага пайшоў у магазін, купіў раскладушку, цюфяк, коўдра ў яго была, а падушку зрабіў сам. Заставалася самае галоўнае і цяжкае - знайсці працу. Бо ўсё перавыхаванне савецкай улады заключалася ў выцісканні з вязняў усіх сілаў, пасля чаго іх выпускалі за прахадную лагера, не забяспечваючы пры гэтым ні жыллём, ні працай - як хочаш, так і жыві, прычым жыві толькі там, дзе табе прызначылі ў камендатуры.

Адаптавацца на волі пасля дзесяцігадовага прабывання ў турэмным і лагерным мяшку было не так проста. Выйшаўшы на волю, чалавек не ведаў, куды падацца, што рабіць, нават дзе начаваць у першую ноч, калі ў цябе няма знаёмых. Добра што гэтыя цяжкасці разумелі і ў меру магчамасці імкнуліся адзін другому дапамагчы самі былыя вязні. І ў гэтым яны былі нашмат больш чалавечныя, чым іх лагерныя “выхаваўцы”, якія выкідалі чалавека з лагера проста на вуліцу. Вырашыць пытанне з працай было цяжка яшчэ і таму, што ў большасці былых вязняў не было ніякай спецыяльнасці. І, безумоўна, калі ўжо гаварыць аб нейкім перавыхаванні, дык перш за ўсё патрэбна было ўсім вязням даць спецыяльнасць, каб на волі яны маглі без цяжкасцяў уладкавацца на працу, больш таго, у гэтым павінны былі і ім дапамагчы. Бо чалавек, прабыўшы дзесяць гадоў ва ўмовах, дзе ён па сваёй волі не мог ступіць і кроку, быў на першых парах не прыстасаваны да самастойнага жыцця - яму

патрэбна была дапамога як здабыць жыллё, так і ўладкавацца на працу. Але нічога гэтага не было.

Шышэя вырашыў пайсці ў ОРС і звярнуцца да начальніка гэтай установы Лаўрэнцева, які калісьці запрашаў Косцю на працу, калі ён выйдзе на волю. На шчасце Лаўрэнцеў быў на месцы. Прывітаўшыся з Шышэям, ён прапанаваў апошняму стаць кантралёрам і расказаў аб задачах, якія павінен выконваць чалавек на гэтай пасадзе: па-першае, увайшоўшы ў краму, неабходна праверыць вагу, паглядзець пад прылавак, каб прадаўцы не хавалі там для сябе кавалкі мяса, ці іншыя тавары, і, калі гэткае здараецца, патрэбна, маўляў, прымусіць іх дастаць тавары на паверхню і прадаць людзям. Як бачна, работа была не цяжкая, тым больш, што ў падначаленні ОРСа знаходзілася толькі пяць аб`ектаў. Але справа ўскладнялася тым, што крамы былі амаль заўжды пустымі, а калі ў іх завозілі мяса, дык пры яго прадажы без гвалта не абыходзілася.

Аднак у Косці іншага выбару не было, як пагадзіцца з прапановай Лаўрэнцева. Апошні выпісаў Шышэі пасведчанне кантралёра і назваў заробак - 750 рублёў, пры гэтым, лічы, што ежа можа быць бясплатнай. Свой абход гандлёвых аб`ектаў Шышэя пачаў з крамы №1. Увайшоўшы ў памяшканне, адразу пачаў правяраць вагу, якая, канешне, была збіта на карысць прадаўца. Убачыўшы залішнюю, як ёй падалося, цікавасць увайшоўшага чалавека, прадавец запытала ў Косці: “Хто вы? І што вам тут трэба?” Замест адказу, Шышэя паказаў пасведчанне кантралёра. Прадавец зразумела, што пярэчыць кантралёру нельга, таму папрасіла прабачэння за недарэчнасць з вагою, сказаўшы пры гэтым, што так раней ніколі не было, а далей на ўсялякі выпадак паабяцала, што і не будзе. Да палудня Косця наведаў яшчэ чатыры крамы і пазнаёміўся з іх прадаўцамі. Агляд, што патрэбна рабіць пад прылаўкамі, пакінуў на другі раз.

Пад вечар абход крамаў Косця паўтарыў, прычым зноў пачаў усё ж с той крамы пад нумарам 1. На гэты раз ён заглянуў і пад прылавак: там ляжалі кавалкі мяса, якога ў продажы не было. Косця прымусіў прадаўцоў дастаць мяса з пад прылаўкаў і прадаць прыйшоўшым пакупнікам. Прадаўцы, якіх у першай краме было чатыры, выклікалі загадчыцу. Апошняя запытала ў кантралёра: “Што ёсць нейкія парушэнні?”. На што Шышэя патлумачыў, што так рабіць нельга. Ну, маўляў, узялі бы ўжо

сабе, а то ж схавалі шмат, каб яшчэ хапіла і для нейкага. Загадчыца ўважліва выслухала кантралёра, пасварылася на прадаўцоў, пасля чаго першага запрасіла да сябе ў кабінет для размовы. Шышэя пагадзіўся. І калі зайшоў у кабінет, загадчыца паставіла чайнік, нарэзала каўбасы, наліла чарку і прапанавала выпіць за знаёмства… Выпілі, пасля чаго пачалася размова, у час якой Косця расказаў загадчыцы аб сваім жыцці, а загадчыца аб сваіх бедах. Адно другога яны нават і зразумелі, бо загадчыца крамы раней таксама была зняволенай. На развітанне яна загарнула кантралёру кавалак мяса, якое браць задарма ён адмовіўся і заплаціў, бо грошы ў яго былі: выходзячы з лагера, ён атрымаў свой “фонд вызвалення”, у якім было больш 800 рублёў.

Зайшоў Шышэя і ў краму за нумарам тры. Гэта была самая вялікая крама і размяшчалася на першым паверсе 68-кватэрнага цаглянага дома. Крам ўражвала сваім афармленнем вітрыны, на якой можна было ўбачыць усё: і розныя гатункі каўбас, шынкі, сыры, масла і гэтак далей. Але, на жаль, усё гэта было драўляным. Калі Косця зайшоў у мясны адзел, ён раптам здзівіўся - загадчыкам яго працаваў Мікалай Савулаў. Нечаканай сустрэчы здзівіўся і Мікалай, які раней таксама быў вязнем таго ж самага лагеру, што і Косця. І калі Косця сказаў, што ён працуе кантралёрам ОРСа, Савулаў паглядзеў на яго і сказаў: “Кідай ты гэтую дурную работу, ды прыходзь да мяне ў адзел і будзем разам працаваць, бо адзел вялікі і я ўсяроўна буду кагосьці да сябе ў напарнікі браць.” Але Косця, будучы чалавекам разважлівым і нават крыху асцярлжным, нічога на прапанову Савулаву не адказаў, а пачаў уважліва прыглядацца да яго працы. Сам Савулаў у гэты час працягваў секчы мясную тушу на кавалкі, прычым, як прыкмеціў Косця, у адных кавалках Мікалай не астаўляў касцей зусім, у другіх астаўляў маленькія костачкі, а ў трэціх кавалках было касцей больш, чым самога мяса. І на пытанне Кастуся, чаму загадчык мяснога адзела так робіць, Савулаў патлымачыў: “Бачыш Косця, людзі не роўныя, а таму патрэбна аднаму даць лепшы кавалак - аднаго мяса, другому, мабыць, з маленькай костачкай, а астатнім - што ўжо прыдзецца: яны і гэтым будуць задаволены, бо ёсць жа мяса ў продажы.”

Праз некалькі хвілін за мясам стала станавіцца чарга. Адмовіўшыся ад прапановы Савулава ўзяць сабе кавалак мяса

ў кладовай, Косця таксама стаў у чаргу, дзе ён змог паглядзець, як Мікалай важыў мяса: ён не клаў, а кідаў кавалак мяса на вагу, і апошняе не паспявала яшчэ стаць на месца, як прадавец браў мяса з вагі і адразу называў яго кошт, нібы ў галаве яго была нейкая машына, якая так хутка дапамагала яму лічыць. І ўсе бачылі гэтае махлярства, але, калі нехта спрабаваў сказаць: “Пачакай, няхай вага стане на месца,” або спрабаваў падлічыць праўдзівы кошт мяса, якое яму ўжо падаў са сваіх рук прадавец, дык тыя, што стаялі ў чарзе, крычалі: “Хутчэй! Дай узяць іншым!”

Убачыўшы гэткую карціну, калі сярод белага дня пакупнікоў так бессаромна “надуваюць”, Косця вырашыў, што гэтая работа не па ім. І дачакаўшыся сваёй чаргі, ён узяў кавалак мяса (праўда, Мікалай выбраў яму ўсё ж такі з меншай костачкай), разлічыўся і пайшоў дамоў, калі домам можна было называць хату Ярмоленкі.

А праз нядзелю Шыіэю выклікаў Лаўрэнцеў і, калі Косця ўвайшоў у кабінет запытаў: “Ну як жывецца?” На што Косця адказаў: “Дзякуй.” Але начальнік ОРСа тут жа працягнуў: “Што дзякуй? Як там у цябе з Валянцінай (так звалі загадчыцу крамы нумар адзін)? Мне сказалі, што ты з ею ў кабінеце ўжо п`еш гарэлку? Калі гэта так, дык гэтая работа не па табе. Тут патрэбен такі чалавек, хто прыціснуў бы іх усіх, як след.” На папрокі начальніка Шышэя адказаў: “Я вас зразумеў.” Пасля чаго дастаў пасведчанне кантралёра і падаў яго Лаўрэнцеву. Начальнік ОРСа моўчкі забраў пасведчанне, паглядзеў на яго, а пасля на ўжо былога кантралёра і сказаў: “Ідзі ў касу і атрымай свой заробак за гэтыя дні.” У касе Косцю выдалі 27 рублёў.

Такім чынам Шышэя зноў апынуўся беспрацоўным. А “дома” не было нават кавалачка хлеба. Балазе ў гэты час прыбавілі норму хлеба зняволеным-будаўнікам, і яны ўвесь хлеб не з`ядалі. Вось і накіраваўся Кастусь на будоўлю сабіраць гэтыя кавалачкі. А назбіраўшы хлеба, пайшоў да старожа ў цяплушку; удваіх заварылі там кіпятку, пагрэлі мёрзлы хлеб і так Косця павячэраў. На заўтрашні дзень пацярпеў да поўдня, а пасля пайшоў у сталовую, дзе заказаў два супа, бо палічыў, што брацъ другое для яго дорага. Ну а вячэра была ўсё той жа: назбіраныя на будоўлі кавалачкі хлеба і завараны кіпяток.

І так ішлі дні… Калі Косця заходзіў у сталовую афіцыянткі адна другой казалі: “Прыйшоў два супа.” Бачачы, што Косця з дня ў дзень бадзяецца без працы, Клава пачала з яго смяяцца.

“Харошы ты хлопец, а вось гэткі бесталковы. У цябе нават спецыяльнасці няма,” - сказала гаспадыня дому. А далей дадала: “Мабыць, жаніць цябе патрэбна.” І праз нейкіх дзён два пасля гэткай размовы, прыйшоўшы дамоў, Косця ўбачыў накрыты абрусам стол, на ім стаялі дзве бутэлькі гарэлкі, катлеты і яшчэ сякая-такая закуска. Не паспеў Кастусь распрануцца, як Клава громка сказала: “Ну дзе гэта ты ўсё ходзіш?” На што Косця, у сваю чаргу, запытаў: “А што?” А Клава ўсё тым жа моцным голасам працягнула: “Ну як што? Жаніць цябе будзем.” У гэты час прысутныя ў хаце хлопцы засмяяліся, а з імі засмяялася і сядзеўшая ў хаце не знаёмая Косці жанчына. Косця яшчэ раз глянуў на стол, а Клава ўжо ставіла на яго і пацефон. Убачыўшы ўсё гэта Косця сказаў: “Але ж ніхто не пытаўся ў мяне.” На што Клава, будучы ўпэўненай, што Косця з яе прапановай пагадзіцца, адказала: “А што тут пытаць. Ты вот сядай каля дзяўчыны за стол, ды знаёмся.” У гэты час сядзеўшая ў хаце жанчына падала Косці руку і сказала: “ А я вас ведаю.” Косці таксама падалося, што ён нейдзе бачыў гэтую жанчыну. Таму, падаўшы руку, ён адказаў: “Мабыць, і я вас ведаю.” Пасля гэткіх першых слоў жанчына працягнула размову далей: “Вы прабачце, але нашы дзяўчаты клічаць вас “два супа”.” У гэты момант свой пятак уставіла Клава: “Гэта ж шэф-повар сталовай, у якую ты ходзіш. Так што цяпер галодным ужо не будзеш.” Прычым сказала гэта яшчэ больш упэўнена нібыта хлопец ужо даў згоду.

А Косця тым часам засмяяўся і сказаў: “Мне прыемна пазнаёміцца з шэф-поварам.” Пасля гэтага сеў побач з жанчынай. Выпілі гарэлку, завялі пацефон, патанцавалі і Косця правёў шэф-повара дамоў. Па дарозе паразмаўлялі: жанчына аказалася былой жонкай аднаго з лагерных наглядальнікаў, якога яна пакінула за п`янства. У яе быў і дзевяцігадовы сын. А самую жанчыну звалі Надзей. Але, калі падыйшлі да кватэры, у Надзі Косця запытаў колькі ў яе кватэры пакояў. Надзя адказала, што адзін і стала Косцю запрашаць зайсці ў кватэру. На што ён адказаў: “Там спіць хлопец. Як жа я пайду яго будзіць?” Аднак Надзі, безумоўна, хацелася займець сабе мужа, прычым гэткага, як Косця. Яна, мабыць, разлічвала, што і ён не будзе адказвацца, а таму яшчэ раз запрапанавала яму зайсці ў кватэру, пры гэтым сказаўшы: “Месца хопіць, будзем жыць.” Пасля чаго Косця вырашыў, што патрэбна ўсё сказаць, што ён

думае. І пачаў: “Надзя, ты толькі не гневайся. Ты сімпатычная і, мабыць, да таго ж яшчэ і добрая жанчына. Ты шукаеш сабе мужыка, які быў бы для цябе апорай у жыцці. А хто я? Вось пакуль я не зараблю грошай і не пабудую сабе вугал, я жаніцца не буду. Яшчэ раз, прабач, Надзя, але я вось гэткі чалавек.” Пасля чаго Надзя зразумела, што яе надзеі не збыліся, але вырешыла яшчэ раз паспрабаваць выказаць сваю думку: “А дарма ты так, Косця. Знойдзеш ты сабе працу. І ўсё было бы ў нас добра.”

Косці патрэбна было ў гэтай размове неяк паставіць кропку, і ён сказаў: “Надзя, у нас нічога не атрымаецца.” На тым і развіталіся. Але калі Косця прыйшоў на кватэру, Клава прыбегла ў пакой, дзе ўжо адпачывалі хлопцы, і пачала Косцю папракаць: “Чаго ж ты вярнуўся? Ці яна цябе прагнала?” Косця не стаў Клаве тлумачыць пра сваю размову з Надзей, а лёг і пачаў думаць, бо сон да яго не прыходзіў. Косця разумеў сваю бездапаможнасць і не ведаў, як з гэтага становішча выйсці.

Прапакутаваўшы ноч, на заўтрашні дзень Косця пайшоў да рэчкі, якая мела гэткую ж назву, што і горад - Інта. Дзень быў прыгожы, свяціла сонца, хаця на двары і стаяла ўжо позняя восень. На выспе каля ракі сабралася шмат людзей, але Косцю цягнула пабыць аднаму, бо не людзі, ні нават сонца яму ў той дзень быля нямілыя. Ён разумеў сваё становішча, калі з яго бездапаможнасці стала смяяцца нават Клава, якая, не пытаючыся ў яго згоды, збіралася яго жаніць. Думкі лезлі ў галаву адна за другой так, што здавалася застаецца толькі адзін выхад, каб прыпыніць свае пакуты, - кінуцца ў гэтую паўночную восеньскую халодную раку. Ён не хацеў так жыць, як жыў Мікалай Савулаў, а, мабыць, дакладней - не мог - не мог даваць лепшыя кавалкі мяса таму, хто яго яшчэ ўчора мучыў. А для іншага жыцця патрэбна было па крайняй меры, мець спецыяльнасць, чаго ў яго не было. Ён мог шмат у чым разабрацца, шмат што рабіць, але бумажкі аб тым, што ён умее рабіць нешта канкрэтнае ў яго не было. А без гэткай бумажкі ён не ведаў, куды далей ісці. Косця першы раз у сваім жыцці тады заплакаў. Упершыню яму стала сябе шкада: шкада, што задарма дзесяць гадоў пакутаваў, шкада, што застаўся адзін без родных, шкада, што ва ўзросце Ісуса Хрыста ён апынуўся гэткім бездапаможным.

Але ўсе гэтыя думкі Косця паспрабаваў ад сяба адагнаць і

ўзгадваць тыя моманты ў сваім жыцці, калі ён адчуваў у сябе сілу, прычым і фізічную, і сілу духа. Гэта ж яго, тады яшчэ амаль падлетка, называлі Арлом. Гэта ж ён прывёў у свой час у пачуццё Мамеда, пасля чаго яму далі мянушку Леў. Дык ці ж мае права ён “скісаць” цяпер?

Вось з гэткімі думкамі Косця і пайшоў на кватэру, а было ўжо цёмна. Ён замёрз, бо вечарам, як схавалася сонца, стала холадна. Але лёгшы на раскладушку, ён яшчэ доўга не мог заснуць, прыйшлося нават устаць і сесці, бо ад паваротаў з аднаго бока на другі раскладушка скрыпела і не давала спаць іншым. І ў гэты час Косця канчаткова вырашыў, што цярпеў жа ён дагэтуль, патрэбна цярпець і яшчэ, ды не проста цярпець, а патрэбна паспрабаваць змяніць сваё становішча. Ад гэткіх, ужо новых думак, у яго душы з`явілася нейкая ўпэўненасць, што ён можа сапраўды змяніць сваё становішча, бо дзесяць гадоў таму назад увосень ён ляцеў з парашута, каб разам з іншымі змагарамі-рамантыкамі таксама змяніць становішча, прычым для многіх, цэлага беларускага народу. Няхай гэта і не ўдалося, але ж у дадзеным выпадку справа тычылася толькі яго ўласнага становішча, што ва многім і залежала ад яго самога. На тым Косця і лёг спаць.

Раніцай пайшоў у сталовую, праўда, не ў тую, дзе Надзя працавала шэф-поварам. Паеўшы, выйшаў у горад і пачаў блукаць па вуліцах. Зайшоў ва ўніверсальную краму і стаў прыглядацца да паліто з бобрыка, якое каштавала 860 рублёў. І калі аглянуўся, дык убачыў, што побач з ім стаіць Ася Гераськіна - былая Косціна начальніца, якой ён здаваў нарады. Ася запытала: “Ну што, падабаецца?” На што Косця адказаў: “Падабаецца, але ж у мяне няма гэткіх грошай.” Ася была вельмі прыстойным і добрай душы чалавекам. Менавіта гэткай яна аказалася і на гэты раз. Таму нават не задумоўваючыся, сказала: “Дык я пазычу.” Але ж Косця прыняць паслугу Асі не мог, таму, падзякаваўшы жанчыне, ён сказаў: “Я ж не працую, тыму як жа я вам аддам.” Ася аб гэтым не ведала. Наадварот, яна чула, што Косця працуе ў ОРСе. Але Косця ей патлумачыў, што Лаўрэнцева ён не задаволіў і той яго звольніў. Пасля гэтага Ася запытала ў Косці - дзе ён жыве. І калі Косця расказаў аб тым, дзе і як жыве, Ася запрапанавала яму перайсці жыць да яе. Больш таго, яна сказала, што і плаціць за жыллё ёй не трэба. У Асі з сынам былі два пакоі і кухня, кватэра размяшчалася на

другім паверсе. За прапанову Косця падзякаваў, але прыняць яе адмовіўся, зноў такі па прычыне, каб заставацца ні ад кога незалежным. На адмову Косці Ася сказала: “Я цябе не разумею.”

Але пакуль што Косця і сам сябе ўсё яшчэ не разумеў. Выйшаўшы з універмага ён пайшоў далей па горадзе. А тым часам ужо стала вечарэць. І вось у гэты час ён сустрэўся з Кузняцовым Пятром, які раней працаваў у тым жа лагеры, што і Косця, у культурна-выхаваўчай часці. Кузняцову Косця расказаў, што ён без працы. А сам Пётр Кузняцоў працаваў да зняволення ў Ленінградзе на заводзе “Арсенал” токарам. Там была ў яго жонка, кватэра. Але ў час вайны заводу паступіў заказ, вытачыць восем ствалоў для пісталета ТТ. Заказ даручылі выканаць Кузняцову. Пры выкананні заказа адзін са ствалоў аказаўся, на жаль, з бракам, таму прыйшлося вытачыць яшчэ адзін - дзевятый. Усё гэта бачыў другі токар, што працаваў побач з Кузняцовым, і, мабыць, з зайздрасці, што заказ даручылі выканаць не яму, даклаў у Першае аддзяленне завода. Кузняцова абвінавацілі ў падрыхтоўцы тэрыторыі для ворага, за што токар атрымаў восем гадоў тых жа выхаваўча-працоўных лагероў. І калі ён адбыў свой тэрмін і вярнуўся ў Ленінград, які ён называў па-старому Піцерам, у жонкі ўжо нарадзілася дзіцё ад другога мужыка. Таму ад прапановы застацца і працягваць далей з ею жыццё Кузняцоў адказаўся і прыехаў назад у Інту. Праўда, у той час яго ўжо нават рэабілітавалі, як няправільна асуджанага. На працу ён уладкаваўся па сваёй старой спецыяльнасці - токарам. І спаткаўшыся з Косцем расказаў апошняму, што гэта за прафесія і параіў яму пайсці да Васюты і папрасіць яго ўзяць у механічную майстэрню на першых парах, канешне, вучнем, але, маўляў, праз некалькі месяцаў будзеш мець ужо добрую прафесію.

У час спаткання Пятро і Косця вырашылі зайсці і ў сталовую, ды выпіць за сустрэчу на волі па шклянцы віна. У час выпіўкі Косця ўзгадаў і расказаў Кузняцову, што Васюта, напэўна, не забыўся аб тым, што ён у свой час наказаў яго больш як на две тысячы рублёў. Але Кузняцоў патлумачыў Косці, што Васюта ўжо зусім не той чалаве, якім быў раней. Пасля смерці Сталіна яго прадставілі да ўзнагароды ордэнам Леніна за будаўніцтва горада і далей Кузняцоў дадаў, што ён Шышэ і дапаможа. А пасля гэткай размовы Кузняцоў заклікаў Косцю да сябе на

кватэру, ідучы ў якую па дарозе ўзялі яшчэ бутэльку, на гэты раз ужо гарэлкі, баначку кабачковай ікры і баначкуількі, хлеба ў краме не было. Таму Косця хуценька збегаў усё на тую ж будоўлю і назбіраў там хлебных кускоў, якія пакінулі працаваўшыя днём вязні. І калі Косця паказаў іх колькасць Кузняцову, той здзівіўся, бо ён памятаў, калі знаходзіўся ў лагеры, дык у галаве была толькі адна думка - як уталіць голад. Але Косця яму патлумачыў, што не так даўно вязням-будаўнікам павялічылі норму хлеба, і яны цяпер ужо так не галадаюць, як раней. Седзячы за бутэлькай, Кузняцоў яшчэ раз паагітаваў Косцю ісці вучыцца за токара. З прапановай Кузняцова Кастусь пагадзіўся і на заўтрашні дзень пайшоў у канторку БМК.

У калідоры памяшкання БМК Шышэя сустрэў яшчэ аднаго занёмага - Барыса Раманавіча Холаставa, які знаходзіўся ў Інце на спецпасяленні і працаваў прарабам. Косця ведаў яго як добрага спецыяліста і чалавека, а таму і вырашыў расказаць Холаставу ў чым справа. А пасля роспаведу дадаў: “Вот іду і ўвесь калачуся.” Яшчэ раз паглядзеўшы на Шышэю, Холастаў сказаў: “Ты пасядзі, а я гляну, у якім настроі Васюта.” Але зайшоўшы ў кабінет Васюты, Холастаў не толькі паглядзеў, у якім начальнік настроі, а і сказаў апошняму, што да яго хоча зайсці Шышэя, ды, маўляў, нешта вельмі хвалюецца. На што Васюта неадкладна адрэагаваў: адчыніў дзверы і сказаў: “Ну заходзь. Дзе гэта ты ходзіш? Ты ж даўно вызваліўся.” Пасля чаго, як заўжды - не ілгаўшы, Косця расказаў аб сваіх паходжаннях. Васюта не перабіваў яго, але, калі Косця скончыў свой роспавед, адзначыў: “А я раней думаў - ты проста нейкая цемната. А ты маладзец. Тады нават мяне правучыў. Я на цябе не злую і ведаю, што цяпер табе патрэбна праца.” І запрапанаваў ісці да галоўнага бухгалтара будаўніча-мантажнай канторы Зільбершаца. Галоўны бухгалтар - гэта быў той самы чалавек, якога калісьці прысудзілі да вышэйшай меры пакарання, але вось неяк застаўся жывым.

Падзякаваўшы за прапанову, Косця патлумачыў Васюце: “Пётр Андрэіч, мне не быць “белым каўнерыкам”. Я там буду заўжды пакрыўджаным на падставе палітычных матываў. Вы мяне накіруйце ў механічную майстэрню і дазвольце навучыцца за токара, каб я мог мець кавалак хлеба на працягу ўсяго жыцця.” Выслухаўшы выснову і просьбу Косці, Васюта зноў паўтарыў: “Вось табе і цямната! Глянь, што ён прыдумаў!” У

гэты момант у размову ўмяшаўся і Холастаў, сказаўшы: “А ён, Пётр Андрэіч, кажа праўду. У яго ніякай дапамогі няма. Ды ён жа не бухгалтар.”

З Косціным абгрунтаваннем і просьбай пагадзіўся і Васюта. Але пры гэтым сказаў: “Табе там не вельмі што свеціць, бо загадчык майстэрні ў ёй Ефман можа цябе адтуль прагнаць. Праўда, цяпер яго няма - паехаў у Маскву. Таму, калі хочаш, дык ідзі, вучыся.” Справа ў тым, што Ефман ведаў Шышэю, бо апошні адзін час працаваў рахункаводам мехмайстэрні і аслухаўся загадчыка. І аб гэтым Васюта ведаў. У той час у майстэрні працавала 27 чалавек, у тым ліку 6 жыдоў. І калі майстэрня не выканала сваёй месячнай нормы, Ефман даў Шышэі каманду: паставіць жыдам выкананне нормы на 103-105 працэнтаў, а астатнім, маўляў, што атрымаецца. Безумоўна, Косця так не паступіў. Больш таго, ён зрабіў наадварот: жыдам налічыў толькі па 16-17 працэнтаў нормы і яны ў такім выпадку атрымалі па 25 рублёў за месяц, а іншым прыйшлося па 60-70 рублёў. І гэтага Шышэі Ефман не мог дараваць. Сам ён у той час быў рэабілітаваны і таму ездзіў і клапатаў, каб яму выплацілі кампенсацыю за праведзеныя ў лагеры гады. Як загадчыка майстэрні Ефмана замяшчаў Трошын. На развітанне Васюта нават выказаў думку, якая Косцю абнадзеяла - Ефман, мабыць, на працу ўжо і не будзе вяртацца.

На заўтрашні дзень Трошын прыняў Шышэю і сказаў, што першыя тры месяцы, як вучань токара, ён будзе атрымліваць 300 рублёў у месяц, але, калі пагодзіцца яшчэ і прыбіраць пасля работы ў майстэрні, дык за гэта ён можа атрымаць яшчэ 450 рублёў у месяц. Косця з усім гэтым пагадзіўся і пайшоў вучнем да свайго знаёмага - Кузняцова. А калі прыйшоў на кватэру, дык пажартаваў, што ўладкаваўся прыбіраць майстэрню, на што Клава сказала: “Вось - гэта твая работа.” Аднак пасля гэтага Косця гаспадыню расчараваў, расказаўшы праўду.

Зайшоўшы ў кантору БМК, Шышэя аднойчы спаткаў там Валодзю Шышко са Слоніма, якога да гэтага ўжо добра ведаў. Пры размове Валодзя паведаміў,што ён будуе сабе хату і запрасіў Косцю паглядзець. А пад канец размовы запытаў, дзе жыве ён. І калі ў Косці даведаўся аб умовах, у якіх ён жыве на кватэры ў Ярмоленкі, запрапанаваў перайсці да яго. А заадно дапамагчы яму ў будоўлі. Косця падзякаваў за прапанову, пайшоў у краму, узяў дзве бутэлькі гарэлкі з мэтай аддзячыць

Клаве і сябрам за прытулак, чым і жанчына і сябры засталіся задаволены. Пасля выпіўкі развітаўся, забраў свае рэчы і пайшоў на новую кватэру.

Дом, які Шышко назваў сваім, быў на два канцы - другі канец належыў Валодзі Давыдзенку, таксама беларусу па нацыянальнасці. Але Давыдзенка, у адрозненне ад Косці і свайго суседа-цёзкі, быў ужо жанаты. Ну а для Шышко Косця стаў находкаю, бо апошняму былі знаёмыя прарабы і маглі чымсьці дапамагчы ў будоўлі. Ішлі справы ў Косці і ў майстэрні. Але горш за ўсё для халасцякоў было з ежай, бо ў краме можна было купіць толькі кабачковую ікру, кансерваваныя соевыя бабы, ды яшчэ нейкую банку填 кількі. А тым часам на кватэру да Шышко пачаліісці ўсё новыя знаёмыя, прычым галоўным чынам Косціны. У былых вязняў быў няпісаны закон: дапамагаць адзін другому, бо без гэтага цяжка было выжыць у тых умовах, у якія траплялі яны пасля вызвалення.

Але нечакана для сяброў Валодзя ўлюбіўся. І вось аднойчы ён вырашыў запрасіць “сваю” Наташу да сябе дамоў у госці. З гэтай мэтаю купіў дзве бутэлькі гарэлкі, закускі, накрыў стол, і ўсе сталі чакаць Наташу. Чакалі, чакалі, а дзеўка ўсё не ідзе… А пасля, падыйшоўшы да Валодзінай хаты, стала хадзіць уперад-узад па дарозе ў атачэнні пяці сваіх сябровак. Але ў хату не заходзіла. Убачыўшы гэткую карціну, Валодзя стаў хвалявацца і ў рэшце рэшт папрасіў Косцю пайсці паразмаўляць з Наташай - у чым справа. Перш чым выканаць даручэнне, Косця запатрабаваў у Валодзі расказаць аб сваіх адносінах з Наташай. І тут у хлопца не было іншага выйсця, як прызнацца, што яны ўжо цалаваліся. Пасля гэтага Косця пажартаваў: “Ну калі так, дык, мабыць, і сапраўды патрэбна ісці за дзяўчынай.” І пайшоў…

Падыйшоўшы да шпацыраваўшых дзяўчат, Косця прывітаўся з імі, а пасля папрасіў Наташу пагаварыць з ім адзін на адзін. Дзяўчына пагадзілася. І калі яны адышліся ад Наташыных сябровак, Косця прадставіўся сватам і стаў запрашаць дзяўчыну ў хату. На што Наташа адказала: “Цікавы Валодзя хлопец. Нам жа, дзяўчатам, хочацца прыцягнуць да сябе як мага больш хлопцаў, каб пасля можна было абраць сабе аднаго. Кіруючыся гэтым, вось я з ім і пашуткавала. А ён прыняў ужо гэта за праўду. Але ж ён для мяне нецікавы партнёр.” Пасля гэткага роспаведу Наташы, Косця ўсё зразумеў і пайшоў у хату, а

дзяўчаты засталіся далей хадзіць па дарозе.

Безумоўна, гэткія паводзіны Наташы, на якую Валодзя паклаў сваё вока, пакрыўдзілі хлопца, хоць у тым, што здарылася, ён быў сам вінаваты. Але ж якому хлопцу хочацца ў гэтым прызнацца? Таму і Валодзя палічыў вінаватай Наташу, і, каб неяк, як яму здавалася, не ўпасці перад сябрамі тварам у гразь, стаў паграджаць, што ён за здарыўшаеся дзяўчыне адпомсціць. А тым часам з лагера пачало выходзіць усё больш і больш былых вязняў. І былі гэта ў асноўным маладыя хлопцы і дзяўчаты, якія трапілі ў зняволенне ў свае 18-25 гадоў. Адбыўшы ў лагеры па 8-10 гадоў, усім ім было да 35, і амаль усе яны былі нежанатымі і незамужнімі, хоць многія дзяўчаты ў надзеі, што іх датэрмінова адпусцяць на волю, паспелі радзіць.

На волю выйшла і беларуская дзяўчына Валя Салагуб з Маладэчна, а разам з ею і некалькі яе сябровак - украінак. Дзяўчатам не было дзе жыць і хлопцам прыйшлося аддаць ім адзін пакой у кватэры Валодзі. І вось тут Валодзя зноў улюбляецца - ужо ў Валю, якая таксама радзіла ў лагеры і аддала дзіцё маці. Безумоўна, Косця здзівіўся гэткай наіўнасці ўлюблёных, бо ведаў, што з гэтага нічога пуцёвага не атрымаецца. І аб гэтым сваім сумневе ён вырашыў сказаць Валі, якая Косці адказала: “А я і не думаю жыць з ім увесь час. Пажыву толькі тут. А там у Маладэчне ў мяне ёсць Барыс.” І гэтым яна яшчэ больш здзівіла Косцю. Ды і Валодзя - усё ж такі меў сярэднюю адукацыю - скончыў гімназію, а погляды на стварэнне сям`і, на думку Косці, засталіся ў яго дзіцячымі.

Мабыць, і ў гэтым было вінаватым дзесяцігадовае зняволенне. Трапіўшы на волю, чалавек не мог зарыентавацца пры вырашэнні ў тым ліку і вельмі важнага для жыцця пытання - стварэння сям`і. Вось і Ларыса Геніюш прыслала Косці пісьмо, у якім паведамляла аб вызваленні Жэні Пазьняк і прасіла яго дапамагчы ей знайсці “апекуна”. А праз два дні пасля пісьма Геніюш Косця атрымаў яшчэ і “цыдульку” ад Анатоля Канявегі з Гродзеншчыны, які сам быў яшчэ ў няволі, але таксама клапаціўся аб Жэні і прасіў Косцю дапамагчы ей, як яго каханай. Маючы добрую душу і кіруючыся склаўшыміся сяброўскімі адносінамі паміж вязнямі-землякамі, Косця вырашыў перш за ўсё наведаць Жэню. У тым, што гэта трэба зрабіць, ён пераканаў яшчэ і Валодзю, які таксама пагадзіўся наведаць Жэню. Валодзя не быў глухім да чалавечай бяды.

Стаяла зіма, на дварэ быў моцны мароз. Ляжала многа снегу. Але не гледзячы на гэта хлопцы вырашылі з наведваннем Жэні доўга не цягнуць, бо ведалі, што дапамога бывае эфектыўнай толькі тады, калі яна аказваецца своечасова. А Жэня жыла ў тым шаснаццаціпакакёвым інтэрнаце, які калісьці Косця будаваў. Ісці патрэбна было ў другі пасёлак. Хлопцы пайшлі. І калі адчынілі пакой Жэні, у ім было поўна пару, які густым патокам хлынуў праз адчыненыя дзверы ў калідор. У пакоі стала крыху святлей. Нейдзе ў вугле заплакала дзіцё. А перад імі стаяла прыгожая, чарнявая, падобная на армянку жанчына. У той час яна паласкала бялізну, таму ў пакоі і было так многа пару. Прывітаўшыся, Косця расказаў ей аб пісьме паэткі і паведамленні Канявегі. А пасля дадаў, што вось, маўляў, мы і прыйшлі пагля дзець, чым табе можна дапамагчы, пакуль на волю выйдзе Толік. На што Жэня ім адказала: “А калі Толік не захоча мяне з дзіцём, дык што тады? Хто тады будзе мяне глядзець? Ды Толіка і бачыла я толькі праз дрот. А сёння я жыву з чалавекам, які мне і дапамагае.”

Пачуўшы роспавед Жэні, Косця павесялеў - гора звалілася з плеч. А тым больш, што праз некалькі хвілін у пакой зайшоў высокага росту, плячысты грузін, які і быў тым чалавекам, што дапамагаў Жэні. Зразумеўшы, што ім тут няма чаго рабіць, хлопцы пачалі хуценька развітвацца і з Жэняй і з яе “апекуном”. Выйшлі ў двор, пераглянуліся і не маглі зразумець ні Толіка, ні паэтку, якая, дарэчы, яшчэ і пасля папракала хлопцаў за тое, што, маўляў, не знайшлося ніводнага беларуса, які ўзяўся бы стаць “апекуном” Жэні, а гэта прыйшлося рабіць грузіну.

А час ішоў. Хутка праляцелі і тры месяцы працы Косці ў механічнай майстэрні. Ён атрымаў пасведчанне токара. Гэта была спецыяльнасць, якая патрэбная ў кожным горадзе, таму ён стаў адчуваць сябе больш упэўнена. Аднак у гэты час больш неспакойна стала ў самой Інце. Бо прайшла амнісція і з турмаў і лагераў на волю выпусцілі шмат бандытаў. У горадзе пачаўся грабёж, які нярэдка суправаджаўся разбоем. А ісці з майстэрні да кватэры Косці патрэбна бало часткова тундрай, дзя як раз бандыты і нападалі на прахожых. Было так небяспечна, што нават пракурор даў дазвол людзям забіваць бандытаў, калі гэтага патрабуе самаабарона. А тут на бяду Косці працаваць токарам стаў нехта Сакалоў, які аднойчы паламаў усе разцы і яго і Кузняцова, ды яшчэ інструмент двух немцаў, якія працавалі

побач з Шышэям і Кузняцовым. Больш таго, ён кудысьці ўзяў і іх пропускі, што значна ўскладніла ўваход у майстэрню: кожны дзень патрэбна было выпісваць разавы пропуск. І так доўжылася тры месяцы, пакуль не стаў раставаць снег, што дапамагло знайсці вокладкі ад пропускаў паміж двумя жалезінамі, куды іх закінуў Сакалоў. Сам Сакалоў кудысьці знік.

Для барацьбы з бандытамі ў горадзе стварылі спецыяльныя атрады, якія пачалі вылоўліваць усіх падазроных, асабліва ўвечары і ўначы. Пасля гэтага крыху пацішэла. І калі раней Шышэя начаваў у майстэрні, дык пасля паяўлення спецатрадаў пачаў хадзіць на сваю кватэру. Праўда, на ўсялякі выпадак насіў у боце зроблены з напільніка штык. І вось аднойчы, калі ён ішоў з работы дамоў, насустрач ясу выйшаў адзін з прадстаўнікоў спецатрада і, дастаўшы пісталет, даў загад: “Рукі ўверх!” Косця кінуў штык у бок і пачаў уцякаць. Але адкуль не вазміся, з`явіўся другі. Адвезлі Косцю з яго штыком у адзел міліцыі, а на раніцы зрабілі допыт. Канешне, Косці не было патрэбы ілгаць, але цяжка было і знайсці аргументы, каб абгрунтаваць прысутнасць у яго штыка. Ён пачаў гаварыць, што нядаўна хуліганы пабілі яго суседа, што не супакойваюцца чуткі аб бандытах, але ўсё гэта не пераконвала следчых, якія западозрылі бандыта і ў ім. І тут на яго шчасце ў той пакой, дзе яго дапытвалі, зайшоў знаёмы капітан і, убачыўшы Шышэю, запытаў: “А ты што тут робіш?” І Косці прыйшлося яшчэ раз патлумачыць аб тым, што яго, маўляў, памылкова прынялі за бандыта. Капітан вызваліў Шышэю ад далейшых допытаў, але штык прыйшлося ўсё ж такі пакінуць у адзеле міліцыі.

Прыйшоў Косця дамоў, а тут яго ўжо чакала другая бяда: у хаце стаяў міліцыянер, які прыйшоў высветліць, чаму Шышэя не ходзіць кожны дзень адзначацца ў міліцыю. Косця спрабаваў прывесці на гэты конт свае аргументы, але міліцыянер не стаў яго слухаць і запрапанаваў ісці да старшага лейтэнанта, які і назіраў за тым, каб усе, хто знаходзіўся на спецпасяленні, своечасова прыходзіў адзначацца. І як толькі Шышэя зайшоў у міліцэйскі пакой, старшы лейтэнант адразу звярнуўся да яго з прэтэнзіямі: “Ты не падпарадкоўваешся правілам, за што можаш зноў патрапіць пад суд!” На што Шышэя адказаў таксама груба: “Я восем гадзін працую, пасля стаю ў чэргах, каб нешта купіць з яды, бо крамы амаль пустыя. А тут яшчэ патрэбна кожны дзень паспець да дваццаці гадзін прыйсці да вас на адзнаку. Дык якая

ж гэта воля? Гэта ж горш, чым у лагеры. Я не магу хадзіць кожны дзень адзначацца, бо нельга паспець. Будзе час - буду хадзіць, а калі не будзе, дык і не буду. А вы што хочаце, тое і рабіце.” Выслухаўшы роспавед Шышэі старшы лейтэнант кудысьці патэлефанаваў і ўжо зусім іншым голасам сказаў: “Добра, прыходзь раз у квартал, але ўжо абавязкова.” На тым і развіталіся.

Праз некалькі дзён пасля размовы аб неабходнасці адзнак у міліцыі, Косця спаткаў свайго знаёмага па лагеру - Сяргея, які быў добра падвыпіўшы. Прывітаўшыся з сябрам па лёсу, Кастусь спытаў у яго, у чым справа, чаму ён у рабочы час ходзіць па горадзе ў такім стане. А той расказаў аб сваёй бядзе - Сяргей ажаніўся на Зіне, якая яму раней гаварыла, што не была замужам. Але, калі зарэгістравалі шлюб, маці прывезла ёй двое яе дзяцей. І на пытанне Сяргея, як гэта зразумець, Зіна адказала, што вось так, маўляў, і разумей ды не рыпайся, а не, дык я пайду і дакладу на цябе куды патрэбна, і пойдзеш зноў у лагер. Вядома, што Сяргея гэта пакрыўдзіла не толькі як мужчыну, але і як чалавека, якога ашукалі ў самым галоўным - у сямейным пытанні. І ён не мог гэтага дараваць, а што рабіць - не ведаў. Таму вось з гэткага гора і выпіў.

Шышэя зразумеў, што хлопцу трэба дапамагчы, бо ў адваротным выпадку сапраўды можа зноў апынуцца ў лагеры, або нават і горш - пачаць піць, што дабром не скончыцца. І Косця прапанаваў Сяргею з`ехаць ад Зіны ў Кірту, з чым ён адразу пагадзіўся. Пасля атрыманай ад Сяргея згоды Косця параіў хлопцу схадзіць да старшага лейтынанта (цяпер Косця ўжо ведаў яго прозвішча) Шышова за парадай, бо, як Косці падалося, названы міліцыянер не быў сляпым службістам, а імкнуўся зразумець кожнага чалавека. І Шышэя не памыліўся. Калі яны прыйшлі, старшы лейтэнант запытаў: “Што, Шышэя, пасля нашай размовы табе захацелася адразу прыйсці на адзнаку?” І далей, жартуючы, сказаў: “Яшчэ ж рана. Ці ты хочаш гэта зрабіць наперад?” Але Косця расказаў старшаму лейтэнанту ў чым справа і папрасіў яго дапамагчы добраму чалавеку, якога абкруціла недобрасумленная жанчына.

Шышоў выслухаў Косцю, уважліва паглядзеў на твар Сяргея і пасля гэтага параіў: “Глядзі, не пі, ідзі дамоў і ціхенька жыві далей, быццам бы нічога не здарылася. А я табе дапамагу пераехаць у Кірту, калі ты так хочаш. Праз некаторы час за

табой прыйдзе міліцыянер, ты не палохайся. Ён цябе забярэ з тваімі рэчамі і павядзе з дому. Дамоў ты больш не вернешся, таму забірай усю сваю вопратку, абутак і штосьці іншае, што можна панесці. Гэты міліцыянер і адвядзе цябе на вакзал, пасадзіць на цягнік і адправіць у Кірту. Там аб гэтым будуць ведаць і дапамогуць табе ўладкавацца." Хлопцы падзякавалі Шышову і Сяргей пачаў чакаць, калі за ім прыдуць, што здарылася зусім незадоўга.

Праз некалькі дзён Косця спаткаў яшчэ аднаго свайго знаёмага па лагеру, які паведаміў, што перад яго выхадам на волю вызвалілі і палкоўніка Смірнова, што ўвесь час сядзеў у буры. Гэта быў ад`ютант маршала Георгія Жукава. А трапіў ён у Інту за тое, што стаў на абарону жаночай годнасці сваёй жонкі, якая была прыгожай і спадабалася Лаўрэнцію Берыю. І калі аднойчы Смірноў прыйшоў дамоў і ўбачыў жонку плачучай па прычыне таго, што яе выклікаў Берыя, Смірноў сеў у машыну КДБ і паехаў сам, каб запытаць у Берыі - у чым справа. З КДБ палкоўнік не вярнуўся і праз некаторы час быў ужо ў Інце і сядзеў у буры. Паслы вызвалення палкоўніку прывезлі на прахадную вайсковую форму, якую ён адразу надзеў на сябе. Правесці яго прыйшоў сам Барадулін, але Смірноў не пажадаў нават падаць яму рукі і пры адыходзе сказаў: "Спаткаемся ў Маскве!" Пасля палкоўнік Смірноў узначальваў камісію па рэабілітацыі палітычных вязняў.

У канцы 1955 года ў Косці на карку села скула. І каб хутчэй ад яе пазбавіцца, Кузняцоў прапанаваў прыкласці на тое месца, дзе яна сядзела, мыла, што Косця і зрабіў. Але ад гэткіх "лекаў" у Шышэі паднялася тэмпература, таму прыйшлося ісці да сапраўднага доктара, які, агледзеўшы гнойны нарыў, запытаў: "Што ты прыкладываў?" Косця адказаў: "Мыла." Пачуўшы гэткі адказ, доктар патлумачыў: "Ты разумееш, што ты натварыў? Ты сябе скалечыў: скула можа пайсці ўнутр і пашкодзіць пазваночнік." Але, дзякаваць Богу, са здароўем абыйшлося ў рэшце ршт усё нядрэнна: Косця вылечыўся, хоць і прыйшлося два тыдні не працаваць. І Косці, каб выжыць, зноў прыйшлося збіраць кавалачкі хлеба, бо ён не быў членам прафсаюза і таму атрымліваў у час хваробы па бальнічнаму лісту толькі 20 працэнтаў ад заробка. Гэта прыкмеціў майстар Пятрэнка, які прапанаваў Косці ўступіць у прафсаюз.

Аднак Кастусь разумеў, што з гэткай біяграфіяй, як у яго, у

прафсаюз не прымаюць. А таму стаў Пятрэнку тлумачыць: “Іван, ты ж паглядзі, што напісана ў прафсаюзным білеце: “Прафсаюзы - гэта школа камунізма”. Дык хто ж нас у такую школу прыме?” На што Пятрэнка адказаў: “А ты паглядзі. І калі цябе прымуць, дык і я падам заяву.”

І вось сабраўся прафсаюзны сход, на які выклікалі і Шышэю. Старшынстваваў на сходзе Вінакур, які і запрапанаваў Косці расказаць сваю аўтабіяграфію. Але Косця маўчаў. Таму праз нейкую хвіліну Вінакур запытаў: “Шышэя! Дык што ты маўчыш?” Косця зразумеў, што патрэбна нешта гаварыць. “Грамадзяне! - сказаў Шышэя, звярнуўшыся да прысутных на сходзе членаў прафсаюза. - Калі вы прымушаеце мяне сказаць, дык я скажу, што дзесяць гадоў я прабыў у зняволенні, прычым незашто - без усялякай на тое віны.” Гэткая размова членам прафсаюза не спадабалася, яны загудзелі, а пасля хтосьці з іх у Шышэі запытаў: “А за што цябе арыштавалі?” У сваім адказе на зададзенае пытанне Шышэя сказаў: “Калі прыйшла Чырвоная Армія, усіх нас пачалі ў яе мабілізоўваць, а мы сталі ўцякаць у лес. Вось там мяне злавілі і пасадзілі ў турму, а пасля адправілі ў лагер.” Аднак у гэты час у справу ўмяшаўся сакратар парткома, які запрапанаваў звярнуцца за дадзенымі аб Шышэі ў спецорганы, і пакуль адтуль не прыйдзе адказ, пытанне аб прыёме яго ў члены прафсаюза не трэба разглядаць. На тым і парашылі.

Праз нейкі месяц Шышэю зноў паклікалі на прафсаюзны сход, на якім старшынстваваў усё той жа Вінакур. Ён дастаў са стала ліст, які прыйшоў з органаў, і зачытаў, а пасля яшчэ і запытаў: “Ну што ты скажаш цяпер?” Тут Косця зразумеў, што трэба гаварыць аб тым, што ён думае наконт адбываючагася на сходзе. А таму, узяўшы слова, сказаў: “Дык гэта ж не прафсаюз, а нейкая палітычная арганізацыя, якая мала чым адлічаецца ад самой камуністычнай партыі. Я рабочы, і прычым тут тое, чым я займаўся раней. Цяпер я працую. І калі гэта арганізацыя працоўных, дык я ж і ёсць працоўны. А калі гэта арганізацыя палітычная, дык я не хачу ў яе ўступаць.”

Пасля выступу Шышэі слова ўзяў Капеістаў, які сказаў: “Дык як жа мы трымаем у сваім асяроддзі гэткага чалавека?” А пасля, звярнуўшыся да Шышэі, запрапанаваў: “Давай, раскажы, як ты стаў на злачынную дарогу супраць савецкай улады.” Пасля выступу Капеістава роспавед працягнуў зноў Шышэя: “Калі так,

дык я вам скажу ад сотняў тысяч гэткіх, як я. Вы палічыце, колькі было мне гадоў, калі да нас у Заходнюю Беларусь прыйшла савецкая ўлада? Сямнаццаць. Значыць, я не мог быць у тую пару грамадзянінам СССР. Дык каму ж я тады здрадзіў, што мяне пачалі лічыць здраднікам. Я нашу дзесяць гадоў гэтую пляму. Вось і вы пачынаеце варушыць гэтую брудную справу. Больш таго, мяне судзіла асобная рада, старшынёй якой быў Румянцаў. А яго разам з Берыем застрэлілі, як ворага народа. Дык як жа гэта ўсё зразумець? І што вы ў гэтым разумееце? Таму, пры ўсёй да вас павазе я не буду з вамі далей размаўляць на гэтую тэму.” Косця стукнуў дзвярыма і пайшоў з залі. На тым тады размова і скончылася.

А пазней, ужо на пачатку 1956 года, Косцю выклікаў Васюта і паведаміў аб тым, што яго прынялі ў прафсаюз, прычым, падкрэсліў ён пытанне аб прыёме Шышэі ў прафсаюз вырашалася нават на партыйным сходзе. Пасля гэтага Васюта ўзгадаў той прафсаюзны сход, на якім выступаў Шышэя і сказаў: “Ну ты задаў тады ім задачу. Калі прафсаюзы - гэта школа камунізму, дык, сапраўды, няхай прымаюць і выхоўваюць у гэтай школе. А навошта ж толькі дэклараваць?”

Косця працягваў працаваць у механічнай майстэрні токарам. Але праз некаторы час Васюце спатрэбіўся чалавек для перавозкі металічных трубаў спачатку з базы ў тую ж майстэрню, а пасля і на іншыя аб`екты. Васюта вырашыў даручыць гэтую справу Шышэі, для чаго далі апошняму пропуск ва ўсе вытворчыя зоны. Даведаўшыся аб гэтым, загадчык майстэрні Ефман, які не супярэчыў супраць таго, што Шышэя працаваў токарам, сказаў: “Ну я так і думаў, што ты тут доўга не натакарыш.” Праўда сам Васюта пры размове з Шышэям сказаў, што яго забіраюць з майстэрні толькі часова. Косці далі каня, воз і паказалі, дзе і якія трубы браць і куды іх везці. Вазіўшы трубы, Кастусь прыкмеціў, што на многіх з іх былі муфты, якія ён вырашыў паскручваць і на ўсялякі выпадак захаваць. У гэтым яму дапамагаў і вартаўнік, якому за працу Косця даў бутэльку. А муфты Косця паклаў у складзіку знаёмага прараба Фёдара Сіраты. Навазіўшы патрэбную колькасць трубаў у механічную майстэрню, Косця пераключыўся вазіць іх на той аб`ект, дзе працавала многа яго сяброў, у тым ліку Янка Гінько, Мікола Яцкевіч, Пятро Палігошка, Слава Прыстаўка і іншыя, якія яшчэ працягвалі быць вязнямі. Прывёзшы на аб`ект трубы першы раз,

Косця коратка спаткаўся толькі з двумя з іх, але дамовіўся, што ў наступны раз ён прыедзе і пабудзе з сябрамі доўга.

Так ён і зрабіў. Сабраліся і ўсе знаёмыя хлопцы. Косці асабліва прыемна было спаткацца з Янкам Гінько, якога ён не бачыў больш як дзесяць гадоў. Былы Косцін камандзір быў вельмі худы. І на пытанне Кастуся, чаму так, за Гінько адказаў Яцкевіч, які пры гэтым паведаміў, што каб не бухгалтар, дык Янка ўжо напэўна б і ногі працягнуў. Справа ў тым, што для Гінько не хапала ежы, а працаваць патрэбна было цяжка. Але, на яго шчасце, ён меў нядрэнны почарк і бухгалтар забраў Гінько да сябе. А пасля і немец, які працаваў на шахце маркшэйдэрам і якому быў патрэбен памочнік, убачыўшы почарк Гінько, таксама зацікавіўся ім. І калі даведаўся, што ў Янкі яшчэ і адукацыя ўніверсітэцкая, дык забраў яго да сябе. А калі немец ад`язджаў дамоў у Германію, дык ён наогул запрапанаваў паставіць маркшэйдарам Гінько. Але ў час той сустрэчы Янка працаваў яшчэ ў бухгалтэрыі. Гінько расказаў Косці аб тым, як у 1948 годзе яго прывозілі з Інты ў Менск на вочную стаўку з Усеваладам Родзькам, якога затрымалі ў Беластоку. Вочная стаўка адбылася ў памяшканні КДБ, літаральна побач з кабінетам Цанавы. Калі Гінько ўвялі ў пакой, Родзька ужо знаходзіўся там, прычым сядзеў за сталом і нешта пісаў. І наогул па яго выгляду нельга было сказаць, што гэта быў зняволены. Убачыўшы Гінько, Родзька сказаў: “Янка, гавары і падпісвай усё, аб чым у цябе запытаюць, бо я ўжо паведаміў аб усім.” Тая сустрэча каштавала Янку Гінько прыбаўкі ў пяць гадоў зняволення да тых пятнаццаці, якія яму далі ўжо раней. Самога Ўсевалада Родзьку прысудзілі да растрэлу.

Цікавая размова ў Косці атрымалася і з Пятром Палігошкам, які, не глядзячы на тое, што быў яшчэ зняволеным, ужо збудаваў сабе зруб памерам 4,5 на 6 мэтраў, каб, калі выйдзе на волю, было дзе жыць.Але яму патрэбна было гэты зруб вывезці кудысьці з лагернай зоны. Сам ён зрабіць гэтага не мог, бо быў зняволены і ў тую пару не меў права выходзіць за межы лагера. Таму ён папрасіў аб гэтым Косцю - падабраць месца ў адным з пасёлкаў побач Інты і перавезці туды зруб. Больш таго, ён параіў і Косці заняцца будоўлей свайго дому і нават паказаў, дзе ўзяць для гэтага матэрыял, балазе ён быў зусім побач з лагерам. Справа ў тым, што калісьці, пры будаўніцтве шахты, каб падвезці для яе абсталяванне, праклалі з дрэва дарогу. І

гэтае дрэва так і засталося ляжаць на былой дарозе цяпер ужо нікому не патрэбным. З просьбай і з прапановай Косця пагадзіўся. Ды з выкананнем просьбы доўга і не цягнуў: падабраў месца, знайшоў трактар і з яго дапамогай, паставіўшы зруб на палазы, дабавіў яго ў Нова-бальнічны пасёлак, дзе, дарэчы, жыў на кватэры і сам.

Не выкідаў Косця з галавы і парады сябра аб будаўніцтве сваёй хаты, бо не мог жа ён увесь час жыць на кватэры ў Валодзі, які з кожным днём усё актыўней шукаў сабе сяброўку ў жыцці. А тым часам лагерны рэжым яшчэ паслабеў - вязням дазволілі выходзіць у выхадныя дні за межы лагера. І Косця вырашыў гэтым скарыстацца. Ён пайшоў, агледзеў бярвенні, што ляжалі на дорозе, ды і папрасіў сяброў дапамагчы яму ў выхадныя дні з будоўляй хаты. Сябры пагадзіліся. Ды інакш быць і не магло, бо кожны з іх ведаў, што калі прыйдзе той дзень волі, дык патрэбна ж будзе нейдзе прытуліцца. І самым надзейным у гэтым быў, безумоўна, Кастусь Шышэя, якога яны ведалі, як чалавека, што не толькі не пакіне сябра ў бядзе, але і наогул быў з`яўляецца па сваёй прыродзе кампанейскім. Дарэчы, што сябры ў Косці не памыляліся, можа пасведчыць і аўтар дадзеных радкоў.

Косця дамовіўся і з намеснікам начальніка шахты Цыганковым, каб яму дазволілі праз тэрыторыю вытворчай зоны вывезці бярвенні. Пасля гэтага патрэбна было дамовіцца яшчэ і з кіраўніцтвам вайсковай часці, што ахоўвала зону, аб дазволе адчыніць на некалькі гадзін драцяны плот, каб бярвенні зацягнуць у зону. Але і гэта Косця зрабіў без цяжкасцяў, бо ў вайсковай часці яго памяталі як нядаўняга кур`ера. Знайшоў Косця і машыну з прычэпам для перавозкі бярвенняў з зоны на пляц. А будаваць хату Косця вырашыў у прытык з Палігошкінай. Карацей кажучы, праз некалькі тыдняў зруб быў гатовы, прычым памеры яго былі большымі, чым памеры зруба Пятра Палігошкі, - 6 на 6 мэтраў. Праўда, на першых парах была некаторая непрыемнасць з будучым суседам, які не хацеў, каб хтосьці побач з ім будаваўся. Але пасля ўсё ўладкавалася. Затое, калі хата была ўжо пакрыта толю, паштукатурана зверху і знутры, былі закладзены вокны і дзверы, здарылася і прыемнае - яго гасцямі сталі начальнік 9-ай шахты Штыпельман і начальнік першага адзялення Бэрман са сваімі жонкамі. А адбылося гэта ў адну з нядзель, у якую таксама прыйшлі хлопцы, каб дапамагчы

Косці хутчэй давесці хату да парадку. І вось у гэты дзень у Нова-бальнічны пасёлак нечакана завіталі названыя госці. Убачыўшы, што госці накіроўваюцца да хаты Шышэі сябры хутка збеглі; ну а Косця, як гаспадар, пайшоў іх сустракаць. Прывітаўшыся, хтосьці з мужчын запрапанаваў: "Ну пакажы, што ты тут набудаваў?" Заклікаўшы начальнікаў і іх жонак у хату, Косця сказаў: "Хацеў бы вас пачаставаць…" На што Штыпельман адказаў пытаннем: "Ну дык у чым справа?" І тут Косці прыйшлося скончыць перапыненую начальнікам шахты сваю фразу: "Але ж у мяне ггарэлка толькі тмінная." Пасля гэтага размову зноў працягнуў Штыпельман: "Ну што ты начальнікаў будзеш частаваць тміннай. Вось табе сто рублёў і паедзь купі для жанчын каньяку, ну а для нас, мужчынаў, бутэльку добрай гарэлкі. Аднак тут усамніўся Бэрман: "А дзе ж гэта ён таго каньяку знойдзе?" Але Штыпельман, які Косцю ведаў больш дакладна, патлумачыў: "Я яго ведаю - ён табе што ты хочаш дастане." Пасля чаго, дастаўшы з кішэні сторублёўку, Бэрман сказаў: "Калі так, дык вазьмі і яшчэ 100 рублёў." А ў гэты час Штыпельман ужо пісаў ліст шоферу, каб той падвёз Шышэю ў горад.

Узяўшы з удзячнасцю грошы і ў Бэрмана, Косця накіраваўся да машыны, а Штыпельман, Бэрман і іх жонкі пайшлі пахадзіць і агледзець ваколіцы пасёлка. Праўда, перад тым, як паехаць у краму, Косця забег у суседнюю хату, у якой схаваліся хлопцы, і папрасіў іх хутчэй змайстраваць нейкі стол ды пару лавак, каб можна было прыняць гасцей. Калі Косця вярнуўся, хлопцы зноў сышлі да суседа. А Бэрман, убачыўшы пакупкі, аж ахнуў: "Ты глянь, сапраўды каньяк, ды яшчэ і армянскі! А гарэлка якая добрая - руская, пяцідзесяціградусная!" Прывёз Косця і закускі, прычым таксама нядрэннай: кілаграм вянгерскай карэйкі, дзве банкі гавяжай тушонкі, баханку хлеба.

Селі за стол. Косця ўсім наліў. Выпілі адзін раз. Закусілі. Выпілі і яшчэ раз. Зноў закусілі. Пасля Косця пабег у хату да Валодзі, дзе яшчэ працягваў жыць і сам, наварыў гарачай кавы, за што госці асабліва падзякавалі. На развітанне з гаспадаром Штыпельман сказаў: "Ты ж не саромейся, а заходзь. Ты будуешся, таму табе ўсё патрэбна і чым можам, тым дапаможам." Не ўзялі начальнікі і 50 рублёў рэшты, што засталіся ад пакупак.

Як толькі вялікія госці паехалі, іх месца занялі сябры, якія

таксама з задавальненнем пасядзелі за сталом, на якім, праўда, стаяла ўжо “тмінная”. Вось гэткім чынам і адбылося першае наваселле ў Косцінай хаце, да якой патрэбна было прыкласці яшчэ шмат працы. А тым часам жыццё падавала Косці ўсё новыя здарэнні. Вось калі ён аднойчы ішоў па горадзе і ўбачыў, што прадаюць піва, вырашыў таксама стаць у чаргу. Піва ў горадзе прадавалі вельмі рэдка , і таму людзі за ім прыходзілі нават з вёдрамі. Але чарга ішла хутка і калі ўжо сталі наліваць піва і яму, дык да яго падыйшоў нейкі незнаёмец з выглядам амаль жабрака і папрасіў Косцю пачаставаць яго півам. Маючы добрую душу, Кастусь папрасіў прадаўца наліць яму яшчэ адзін бакал піва і стаў аддаваць яго незнаёмцу. І тут у гэты час падбеглі яшчэ трое незнаёмых, ды так ударылі першага, што той ледзь утрымаўся на нагах, выпусціўшы пры гэтым бакал з півам на зямлю. А пасля гэтага і Косцю так хапілі за грудзіну, што піва таксама вылілася з бакала. А незнаёмцы запыталі: “Ты ведаеш, каго частуеш півам?” На што Косця адказаў: “Не, не ведаю. Ён мяне проста папрасіў.” А ў гэты час падышоў і чацверты ды і кажа: “Дык ты не ведаеш, каго частуеш? Гэта ж капітан КДБ Кобец - спецыяліст па выяўленню лагерных актывістаў. Ён распальваў у лагерах міжнацыянальную варожасць. А вось цяпер яго з органаў за нешта выгналі, дык ён ходзіць па горадзе і папрашайнічае.” Пачуўшы такое, Косця папрасіў прабачэння ў падыйшоўшых, ды і пайшоў дамоў так і не адведаўшы піва.

А вось і другое здарэнне - ужо іншага плана. Калі Косця прыйшоў ноччу дамоў, дык убачыў, што на тэлеграфным слупе сядзеў чалавек. Кастусь запыніўся і стаў глядзець, што ж будзе рабіць далей гэты чалавек. А ён тым часам злез са слупа і пайшоў да акна суседняй хаты, у якой жыў немец Унраў і дзе збіраліся ў выхадныя дні людзі, каб разам памаліцца. На раніцу Шышэя разам з немцам - гаспадаром той хаты, дзе незнаёмы чалавек нешта прымайстроўваў спачатку на слупе, а пасля да вакна, знайшлі прычэпленыя і там і там карабкі: каля вакна - для падслухоўвання, а на слупе - для запісу. Косця прапанаваў Унраву разбурыць гэтыя прыстасаванні, але той, будучы веруючым евангелістам, не пагадзіўся з прапановай, сказаўшы пры гэтым: “Калі ўлада паставіла - не трэба чапаць.” Гэта гаварыла аб сумленні немца, які шчыра верыў у Бога. Але ж улада, у адрозненне ад яго, была бязбожнай і злачыннай, якая ў

кожным чалавеку шукала ворага, а таму і займалася падслухоўваннем і падглядваннем.

Што тычыцца працы, дык там у Шышэі было ўсё ў парадку: галоўнай заставалася праца токара, а калі-нікалі і праца экспедытыра. Працягваў ён і дабудоўваць дом. Прычым вырашыў жыць адзін, без жанчыны, бо лічыў, калі ты нежанаты, дык ты - сокал, у цябе няма ніякай перашкоды: дзе жыць? чым займацца? што купляць? А жанчына заўжды спрабуе навесці свае парадкі, таму, мабыць, яе і называюць шыяю, што яна хоча варочаць галавою мужыка.

Але гэта так думаў ён. А жанчыны і дзяўчаты, бачачы гэткага хлопца, як Кастусь, думалі па-іншаму. Ды не толькі думалі, але і рабілі практычныя крокі, каб неяк завалодаць хлопцам. Вызваліўшыся з лагера, шмат хто з іх накіроўваўся да Косці ў хату, у якую ён ужо перайшоў жыць, і прасіў дапамогі. Першай з`явілася зямлячка з Ліды Маруся са сваёй сяброўкай з Украіны, якая прыйшла нават з гітараю. Косця дапамог ім знайсці кватэру і за першы месяц заплаціў за іх 250 рублёў. Дапамог ён ім уладкавацца і на працу, на дзевятай шахце. Але, калі праз тры месяцы спаткаў гаспадара кватэры, дзе жылі дзяўчаты, той запытаў у Косці, чаму ён не прыходзіць разлічвацца за кватэру за наступныя месяцы. Бо самі дзяўчаты так нічога і не плацілі гаспадару. Пачуўшы такое, Косці нічога не заставалася рабіць, як ісці і несці сваіх 500 рублёў. Аднак пры гэтым ён папярэдзіў і дзяўчат, што больш так не будзе, ды і гаспадару сказаў: “Не будуць плаціць - высяляй!”

Аднак Косці не цярпелася паглядзець, чым у дзяўчат усё скончылася. І калі ён прыйшоў яшчэ праз два месяцы, на кватэры ўжо засталася толькі адна - украінка. Яна сядзела і нешта дрынкала на гітары. На пытанне Косці - дзе Маруся, украінка адказала: “Маруся выйшла замуж. Дарэчы, яна мне казала, што вы яе возьмеце, вось я ёй і паверыла, а таму разам і прыйшла да вас.”

А праз некаторы час да Косці прыстала ўжо Жэня. Гэта зусім маладая дзяўчына з Заходняй Украіны, якая прыехала ў Інту да брата - Казака Васі, што сядзеў з Шышэям у адным лагеры, а ў гэты час ужо таксама меў сваю хату. Жэня пачала праследаваць Косцю амаль на кожным кроку: прыходзіла да яго на працу, стала хадзіць дамоў і весці сябе так, нібыта яна ўжо гаспадыня. На ўсе папярэджанні Кастуся аб тым, што ён нашмат

за Жэню старэйшы і што зусім не будзе жаніцца, Жэня ніяк не рэагавала і працягвала сваю справу - нахабным чынам набівацца да Косці ў жонкі.
Бачачы, што справа можа зайсці занадта далёка, Косця ўзяў бутэлбку і пайшоў да Васі Казака ў хату, прычым зрабіў гэта ў нядзелю і раніцай, каб усе былі дома. На шчасце так і атрымалася: дома былі Вася, яго жонка і сама віноўніца Косцінага прыходу - Жэня. З усімі прывітаўшыся, ККосця выняў з кішэні бутэльку і паставіў на стол. Пры гэтым ён не паспеў яшчэ сказаць і слова, як пачаў гаварыць Вася: “Ну вось, Косця, і цябе жэнім.” На што Кастусь адказаў: “Ды не. Вось я і прыйшоў паразмаўляць наконт гэтай жаніцьбы.” І далей паведаміў Васі аб прычыне свайго прыходу. А заканчваючы свой роспавед, сказаў: “Я жаніцца не збіраюся. І калі яна не адчэпіцца ад мяне, дык прыйдзецца кудысьці з`язджаць.”
Вася быў хлопцам разумным і, убачыўшы Косціну заклапочанасць, зразумеў яго. А жонка Васі навогул не вытрывала і амаль крыкнула: “Ты што - здурэў?” На што Косця адказаў пытаннем: “А што рабіць?” І тут сваё слова сказаў Вася: “Косця, я цябе разумею. Дзякуў, што прыйшоў і аба ўсім мне расказаў. А яе я адпраўлю дамоў, на Ўкраіну. А то чаго добраг - здурэе, ды наробіць тут дзяцей.” Жэня ў гэты час маўчала і сядзела, апусціўшы вочы ўніз. Праз некалькі дзён у Інце яе ўжо не было.
І Косця быў такі не адзін, хто адбівайся ад нашэсця жанчын і дзяўчат. Былі нашмат і больш пацярпеўшыя ад гэткага нашэсця. Напрыклад, выйшаўшы з лагера на волю абясінец, які быў вельмі адукаваным і здольным да камерцыі чалавекам, без акцэнта размаўляў па-руску, па-нямецку, па-французску і па-ангельску, знайшоў нейкі склеп і змайстраваў у ім абсталяванне для вырабу газіраванай вады. Косця яго ведаў таму, што абясінец прыходзіў да іх у майстэрню за паслугамі. І больш за ўсіх яму дапамагаў менавіта Косця, канешне, не ў рабочы час і з дазволу начальства. Абясінец і плаціў Косці нядрэнна. А калі ўсё абсталяванне было ўжо на месцы, ён здабыў розных відаў эсэнсіі: слівовую, грушовую, яблычную. І заводзік запрацаваў, у яго гаспадара паявіліся немалыя грошы. З паяўленнем грошай, вакол яго сталі круціцца жанчыны, адна з якіх - Маруся яму спадабалася. Ён стаў купляць ёй абутак, вопратку. Справа дайшла нават да пакупкі шубы за 18 тысяч рублёў. Больш таго,

Маруся хадзіла да знаёмых свайго сябра і пазычала ў іх грошы. Прыходзіла яна ў пазыкі і да Шышэі, бо ведала, што Косця знаёмы з яе кавалерам. Праўда Косця нічога ёй не пазычыў, спаслаўшыся пры гэтым, што ў яго самога не хапае грошай, каб купіць паліто. А праз некаторы час Марусі не стала: яна кудысьці з`ехала, нават не назваўшы кавалеру свайго прозвішча. Таму даверліваму абясінцу прыйшлося разлічвацца яшчэ і з даўгамі Марусі.

А тым часам кватэрантаў у Косцінай хаце стала прыбаўляцца. Адным з першых да яго прыйшоў Павел Багель, які родам быў з Баярскай, што знаходзіцца прыкладна ў 15 кіламетрах ад Косцінай вёскі. Павел адбываў свой тэрмін у іншым, чым Косцін, лагеры, але вызваліўшыся, прыйшоў да яго як да земляка. Багелю можна было ехаць дамоў, але ён застаўся на некаторы час на Поўначы, каб зарабіць грошай. З лагеру вызваліліся Янка Гінько і Пятро Рашэтнік, якія таксама памясціліся ў Косці на кватэры. Да Косці кватэру прыйшоў і Міша, які родам паходзіў з Віцебска. Пры гэтым усе сталі жыць "кагалам". Кожны купляў усё, што ўдавалася знайсці, і прыносіў у кватэру. Вёўся запіс выдаткаў на адведзенай яму старонцы ў агульным сшытку. І так рабілі на працягу месяца. У канцы месяца ўсё падлічвалася і ішоў разлік. Ежу рыхтавалі і мылі посуд па чарзе. І толькі Міша нічога і не купляў і не хацеў удзельнічаць у працы на кухні. Хлопцы маўчалі на працягу месяца, а пасля Косця ўзяў ініцыятыву на сябе і сказаў: "Міша! А ты што сабе думаеш?" А Міша ў адказ: "Я вам не служанка мыць посуд." Безумоўна, гэткі адказ Мішы хлопцы ўспрынялі як нахабства з яго боку. А Косця нават запытаў: "А мы што, табе слугі?" Ад чаго Міша стаў яшчэ больш нахабным і, у сваю чаргу, у Косці запытаў: "А ты што тут раскамандаваўся?" Але Косця, як заўжды, заставаўся знешне спакойным і зноў звярнуўся да Мішы:" Так жа жыць нельга. Збірайся і ідзі - куды хочаш. Я нават дапамагу табе знайсці кватэру." У гэты час Міша глянуў на іншых хлопцаў і ўбачыў, што, пакуль не позна, патрэбна "уносіць ногі". А Косця хутка апрануўся і адвёў Мішу зусім у іншы пасёлак каб больш з ім нават не спатыкацца.

Сам Косця, як гаспадар, імкнуўся быць прыкладам у адносінах паміж сябрамі. Ён не толькі ўвіхаўся на кухні, але, калі бачыў, што ў краме нешта "даюць" і, ніколі не ленаваўся пастаяць у чарзе. Так было і ў той раз, калі ён ішоў каля крамы,

у якой загадчыцай працавала знаёмая яму Валянціна Іванаўна, што ў час праверкі крамы пачаставала яго гарэлкай. З крамы неслі мяса. Косця таксама зайшоў у краму і стаў у чаргу. Але прадаўцы хутка прыкмецілі былога кантралёра і паклікалі загадчыцу. Убачыўшы Шышэю, Валянціна Іванаўна запрасіла яго і на гэты раз да сябе ў кабінет. А калі Косця зайшоў і сталі гаварыць, загадчыца пацікавілася, як ён жыве, дзе працуе. Пачуўшы на ўсе пытанні адказы, Валянціна Іванаўна сказала: "Ну і навошта табе гэткія цяжкасці? У мяне такі вялікі дом, прыходзь, ды будзем разам жыць." На прапанову Валянціны Іванаўны Косця адказаў усё тымі ж амаль завучанымі напамяць словамі: "Валянціна Іванаўна, дзякуй. Але жаніцца я не буду і таму не хачу нікога ашукваць. А што тычыцца жаніцьбы з вамі, дык у мяне ёсць някепскія кандыдаты." Пры гэтым Косця меў на ўвазе Івана Пятрэнку. І на заўтрашні дзень паведаміў аб размове з загадчыцай крамы і яму. Пятрэнка пагадзіўся схадзіць да Валі на аглядзіны. Але Косця ведаў і так, што знешне яны адзін другому спадабаюцца. Валя была рослай і здаровай, прыгожай жанчынай. Праўда, у яе расла дачка ад першага шлюбу, але ж яна гэтага і не хавала. Таму, атрымаўшы ад Івана згоду, Косця пайшоў да Валі і запытаў, калі прыйсці ў сваты. Дамовіліся на чарговую нядзелю ў 6 гадзінаў вечара. Зразумела, што да прызначанага спаткання Валя падрыхтавалася, балазе сама была загадчыцай крамы, і таму шукаць прадуктаў было не патрэбна. А калі хлопцы прыйшлі, пасядзелі, пачаставаліся і пагаманілі, Косця падняўся з-за стала і стаў збірацца дамоў. За ім падняўся і Іван. Аднак не тут-то было - Валя ўгаварыла хлопца застацца. Праўда, пражылі яны толькі некалькі месяцаў і да яе прыехаў былы мужык з дачкою. Валя папрасіла ў Івана прабачэння і адправіла яго з дому. Такім чынам Пятрэнка зноў застаўся нежанатым.

Ну а Косця па-ранейшаму не заставаўся без увагі жанчын. За справу яго сватаўства на гэты раз узяўся прараб Фёдар Сірата. Ён прыйшоў да Косці і гаворыць: "Нешта цябе мая Ліда кліча."(Так звалі яго жонку). Косця, які не пазбаўлены здольнасці да жарту, на запрашэнне Фёдара адказаў: "Ну калі кліча жанчына, дык нельга не слухацца." І пайшоў дамоў да Сіраты. Сам гаспадар пашукаў у гэты час нейкай прычыны, каб затрымацца і даць магчымасць Косці пабыць у хаце без яго. Але Косця не звяртаў на гэта увагі: можа і сапраўды чалавеку

патрэбна было нейдзе затрымацца. Ды і калі зайшоў у хату, дык таксама не ўсё стала адразу зразумела, бо, акрамя гаспадыні нікога ў хаце не было. І пакуль у хату не зайшоў сам гаспадар, Ліда пачала размову: “Косця, я вырашыла цябе жаніць.” На што Кастусь адказаў пытаннем: “А хто ж будзе маёй жонкай?” У гэты час з суседняга пакою выйшла высокая стройная жанчына і, падаўшы Косцю руку, назвала сваё імя - Аня. І тут Косця вырашыў пажартаваць і сказаў: “Ну дык як я - падыходжу ў кавалеры?” На што Аня адказала таксама жартам: “Вось яшчэ і смешны гэткі!” А далей распавяла аб тым, што яна ўжо была замужам і што ў яе ёсць дачка, якую росцяць бацькі. І тут Косця ўсё зразумеў і вырашыў, замест жаніха, зноў стаць сватам, а таму, звярнуўшыся да Ліды, сказаў: “Ліда, ты сваха нядрэнная, але я сват лепшы. Ты ж ведаеш, што я жаніцца не буду, але для Ані жаніха я пасватаю.”

У гэты час у хату зайшоў і Фёдар. Пачакаўшы нейкую хвіліну, пакуль гаспадар сядзе, Косця працягнуў свой роспавед. “Я думаю пазнаёміць Аню з Пятрэнкам, які, як вы, Фёдар Захаравіч, ведаеце зноў застаўся адзін.” У гэтым Косцю падтрымаў і Фёдар: “А што? Зусім прымальная прапанова.” І тут трэба адзначыць, што Косця аказаўся на гэты раз сапраўды нядрэнным сватам: прайшло некалькі дзён, і Аня з Іванам аформілі шлюб. А хутка Івана Пятрэнку, як інжынера па металаапрацоўцы, павысілі і па працы - забралі ў праўленне АКБ. Майстарм мехмайстэрні стаў Івашкін, які ў той час быў яшчэ маладым, любіў выпіць і насіў у галянішчы бота нож. Ён хутка падабраў сабе і сяброў, якія таксама выпівалі. І як вынік - у майстэрні сталі зусім іншыя парадкі, чым былі прв Пятрэнку. У сумленных рабочых стаў змяншацца заробак, затое ў сяброў Івашкіна ён павялічыўся. Паглядзеўшы на гэткую карціны, Косця не вытрымаў і пайшоў да начальніка майстэрні Ефмана і паведаміў, што з Івашкіным ён працаваць больш не будзе. Але Ефман супакоіў Косцю і паабяцаў, што Івашкіна хутка выганяць. Аднак пасля размовы Шышэі і Ефмана прайшоў і месяц, а Івашкін працягваў працаваць. Таму Косця вырашыў дзейнічаць сам: прыйшоўшы аднойчы на працу, ён запытаў у майстра: “Івашкін, ты чаму ўвесь час даеш мне гэткую працу, што я не магу нічога зарабіць?” На што Івашкін адказаў: “А што - ты мяне будзеш вучыць, якую каму даваць працу?” Але Косця з уласцівай яму арлінай хваткаю не змаўчаў і сказаў: “Ты

паглядзіш, што будзеш яшчэ ў мяне прасіцца!" І пасля гэтага пайшоў на сваё працоўнае месца.

Хутка высветлілася, што наконт Івашкіна Ефман казаў праўду. У майстэрню прыехала камісія. На працы Івашкіна яна не застала, а ў яго на стале стаяла бутэлька гарэлкі. Праз некаторы час у майстэрню з`явіўся і Івашкін. Больш таго, нібы па нейкаму загаду ў майстэрню зайшлі бацькі Івашкіна, а з імі і Тур - начальнік планава-фінансавага аддзела ўпраўлення "Інтавугаль" Пячорскага вугальнага басейна. Бацькі Івашкіна сталі прасіць Косцю, якога камісія ўключыла ў лік панятых не падпісваць пратакола. Ім стаў дапамагаць і Тур, які казаў Косці: "Ты ж беларус, павінен быць чалавекам добрай душы..." І Косця пратакол не падпісаў, пашкадаваў Івашкіна, каб не звольнілі з парцы. Канешне, гэта Ефмана абурыла, і ён у Косці запытаў: "І чым ты матывуеш, што не падпісваеш пратакол?" Безумоўна, што Шышэя гэткую матывацыю знайшоў: "Ну калі бутэльку паставіў на стол, дык ён жа на працы быў." І ў гэтым паструпку яшчэ раз праявілася адна з галоўных рысаў характару Косці - не рабіць чалавеку зла. Камісія паехала, а літаральна праз некалькі дзён Івашкіна ўсё ж такі вызвалілі з працы.

Названая дабрата ў характары Косці праявілася там у Інце і ў наступным паструпку. Калі аднойчы ён вяртаўся вечарам з працы, дык убачыў, што ўся іх вуліца была асветлена пражэктарамі. Там бегалі і кінааператары з камерамі, стаяла міліцыя. З хлява суседа выпусцілі свіней і пачалі іх здымаць кінакамерай. Паглядзець на гэткі цуд сабраліся людзі, прычым да некаторых з іх падыходзілі з мікрафонам і бралі інтэрв`ю. І калі Косця наблізіўся, дык і яму таксама прапанавалі выказаць свае думкі наконт суседавых свіней - дзе ён бярэ для іх кармы. Пры гэтым спачаику ўдакладнілі, ці жыхар ён той вуліцы. А псля запыталі і аб тым, ці купляў ён у свайго суседа мяса, а калі купляў, дык па чым плаціў за адзін кілаграм. На што Косця адказаў: "Так, калі ссусед рэзаў кабана, я купляў у яго мяса, прчым з задавальненнем, і плаціў яму па 21 рублю за адзін кілаграм. І я яму за гэта ўдзячны, бо ў краме ж паліцы пакуль што пустыя. І каб у пасёлку было больш гэткіх людзей як мой сусед Юсіф, дык, мабыць, мяса ляжала бы і ў краме." І тут міліцыянты не зусім зразумелі Шышэю і таму запыталі: "Дык ты што - гэта вітаеш?" А Косця ўдакладніў: "І заахвочваю."Зразумеўшы, што Косця прытрымліваецца зусім

іншай думкі, чым праводзімая ў той час хрушчоўская палітыка на пабудову жабрацкага камунізму, адзін з міліцыянтаў крыкнуў: “Ты што? Замоўкні!” І тут Косця не сцярпеў і вырашыў актыўна стаць на абарону працалюбівага і добрасумленнага суседа. Таму ў адказ на крык міліцыянта ён, таксама павысіўшы голас, сказаў: “А ты гэта што разінуў сваю пастку? Гэты ж чалавек стараецца і для сябе і для ўсіх нас, а вось гэткія як ты, не даяце працалюбівым і кемлівым людзям штосьці зрабіць. Таму ў нас у краме і пустыя паліцы.” А людзі, як гэта, нажаль, бывае амаль заўжды, пачуўшы спрэчкі паміж Косцем і прадстаўнікамі ўлады, пачалі ціхонечка знікаць, каб, у выпадку чаго, не быць сведкай. Хутка раз`ехаліся і прадстаўнікі ўлады, пасля чаго Косця параіў Юсіфу забіць большага кабана, ды схаваць кудысьці сала і мяса, бо, маўляў, гэтыя анціхрасты зноў прыедуць і забяруць. Але ў гэткі разбой уладаў Юсіф не паверыў і не паслухаў Косцінай парады. Аднак здарылася ўсё так, як Косця і прадбачыў: праз нейкі дзень да сядзібы Юсіфа пад`ехала машына, у якую пагрузілі большага кабана, і павезлі, не заплаціўшы гаспадару ні капейкі.

Калі Шышэя пабудаваўся, наведаць яго прыйшла і Ларыса Геніюш са сваімі сяброўкамі. Усе яны знаходзіліся тады яшчэ ў зняволенні і для спаткання з Косцем і іншымі беларускімі хлопцамі скарысталіся сваім выхадным днём. Хлопцы таксама былі вельмі задаволены і чым маглі, частавалі пажаданых гасцей. Косціну забудову прыходзілі праведаць і хлопцы: Адольф Клімовіч - па прафесіі аграном, Аляксандр Кратовіч, які пазней стаў мужам Зоі Коўш, Віталь Губарэвіч - беларускі паэт, родам з Наваельні, Сяргей Кажан - Косцін сябра яшчэ па Дальвіцу, Васіль Шастаковіч - настаўнік і іншыя. Апынуўшыся ў бядзе, людзі, як маглі, так і імкнуліся адзін другому дапамагчы, адзін другога падтрымаць. І той Міша з Віцебску, аб якім раней ішла рэч, аказаўся проста выключэннем з усіх іншых беларусаў, якія там, у Інце, стварылі нават сваю касу ўзаемадапамогі. Бо разлічваць на дзяржаву, якая адносіла да ізгоеў не толькі вязняў, але і тых, хто быў на спецпасяленні, яны не маглі. Іх сяброўства і ўзаемадапамога дапамагалі ім выжыць у тых складаных умовах далёкай Поўначы, у якіх яны апынуліся. У канкрэтнай матэрыяльнай дапамозе сяброў патрэбу адчувалі асабліва тыя, хто страчваў здароўе і пачынаў хварэць. Гэткая дапамога аказвалася, напрыклад, Дзікаму, які захварэў на

туберкулёз, Калюце і іншым.

З цягам часу ў лепшы бок працягвалі змяняцца адносіны і дзяржавы да спецпасяленцаў. Косця даведаўся, што і таму ж Сяргею Кажану ўжо ўдалося нават атрымаць пашпарт. Гэта вырашыла камісія, што працавала ў міліцыі Інты. З`явілася надзея атрымаць пашпарт і ў Косці, бо, у адрозненне ад Кажана, якога судзіў трыбунал, ён быў асуджаны спецыяльнай нарадай. Таму перад тым, як ісці ў тую камісію, Косця вырашыў запытаць у Сяргея дазволу, ці можа ён на гэты факт спасылацца і такую згоду сябра даў.

Спецыяльную камісію ўзначальваў сам генерал, па прозвішчу Ручкін, а ў канцэлярыі, у якой рыхтавалі для камісіі дакументы, галоўным быў маёр Малафееў. Вось да апошняга Косця і накіраваўся. Але маёр не стаў размаўляць з Шышэям, спаслаўшыся пры гэтым на тое, што ў яго і так шмат працы. Пасля чаго Косця вырашыў звярнуцца з просьбай да самога генерала. Аднак ён добра разумеў, што дайсці да генерала не так проста, ды, мабыць, звычайным шляхам праз яго прыёмную і зусім немагчыма. Таму патрэбна было шукаць якогасьці іншага шляху, выкарыстаўшы хітрасць, і Косця такі шлях знайшоў. Назіраючы некалькі дзён за паводзінамі генерала, калі апошні выходзіў з памяшкання міліцыі, Косця прыкмеціў, што на абед генерал ходзіць у сталовую, прычым адначасова з усімі членамі камісіі. І тут на розум Косці прыйшла думка: а што, калі да іх па-ціху далучыцца і сумесна з імі ўвайсці ў памяшканне міліцыі, а там ужо будзе лягчэй патрапіць і ў прыёмную генерала. Вось на тым ён і парашыў. А пасля гэтага пайшоў у краму і купіў сабе зялёную шляпу, бо амаль усе члены камісіі хадзілі ў цывільным адзенні і ў шляпах.Таму на заўтрашні дзень і ён апрануў сваё новае бобракавае паліто, якое не так даўно купіў, надзеў шляпу і бліжэй да абеда пайшоў у бок сталовай, у якой абедала тая генеральская камісія. І калі члены камісіі вярталіся са сталовай, Косця пастараўся да іх непрыкметна прымкнуць і разам з імі ўвайшоў спачатку ў памяшканне, а пасля падняўся і на другі паверх. Пры гэтым яму нават узгадалася прымаўка аб тым, што людзей сустракаюць па вопратцы. І гэта падцвердзілася: калі ён апрануўся так, як члены камісіі, дык і яго прынялі за гэткага члена. Але тут вось устала пытанне - як дзейнічаць далей? І Косця вырашыў, што, як толькі генерал зайдзе ў свой кабінет і зачыніць за сабою дзверы, ён павінен хутка ўбегчы ў прыёмную

і, пакуль генерал будзе яшчэ каля дзвярэй, падняць шум, каб ён мог пачуць і пацікавіцца, што здарылася. Вось у гэты час Кастусь да яго і звернецца.

Да дэталяў прадуманы Косцін план спрацаваў. Як толькі генерал пераступіў парог свайго кабінета, Косця быў ужо ў прыёмнай і накіраваўся да толькі што зачыненых дзвярэй кабінета. Натуральна, што сакратар, якая сядзела ў прыёмнай, паднялася і хутка стала на яго дарозе, запытаўшы: “Ты куды?” На што Косця моцным голасам, каб яго пачуў гаспадар кабінета, сказаў: “Да генерала.” Пасля гэтага сакратар амадб закрычала: “Ты што? А ён цябе выклікаў?” Як Косця і разлічваў, усё гэта пачуў генерал і, адчыніўшы дзверы свайго кабінета, запытаў: “У чым справа?” І тут ужо зусім спакойна, але ўпэўнена Косця сказаў: “Ды вось, хачу да вас зайсці, а мяне ўсё не пускаюць.”Убачыўшы перад сабою маладога, хараша апранутага чалавека, генерал запрасіў яго зайсці ў кабінет, калі ён так хоча. І калі Косця зайшоў у генеральскі кабінет, дык першым пытаннем, якое яму задаў генерал, было: “А як ты зайшоў у прыёмную?” Пасля чыстасардэчнага роспаведу Косці аб сваёй маленькай хітрасці генерал запытаў у яго, у чым справа, якая прымусіла яго пайсці на гэткую хітрасць. Косця расказаў і аб гэтым, пасля чаго генерал завёў яго ў канцэлярыю і даў загад Малафееву паслаць запыт у Маскву наконт справы Шв шэі, каб высветліць - ці можна яму выдаваць пашпарт. А самому Косці сказаў: “Ідзі працуй. Табе аба ўсім паведамяць.” За што Кастусь падзякаваў генералу і пайшоў на працу ўжо з нейкай надзеяй.

Прайшло некалькі часу і Косцю сапраўды паведамілі, што на яго імя прыйшла даведка, у якой сказана літаральна наступнае: “У адпаведнасці з указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 верасня 1955 года ад высылкі на пасяленне вызвалены са зняццем судзімасці і паражэння у правах.” Пасля гэтага Косці выдалі і пашпарт, ён стаў мець права выезду з Інты.

А незадоўга пасля гэтага ў Інту прыехала Лёдзя Кавальчук, якая ўжо таксама выйшла на волю і ёй патрэбна было аформіць неабходныя дакументы. Па рэкамендацыі Ларысы Геніюш за дапамогай Лёдзя звярнулася да Косці, для чаго зайшла ў адзел капітальнага будаўніцтва і даведалася месца яго працы. Косці патэлефанаў прараб Холастаў і сказаў: “Прыходзь у кантору. Цябе шукае жонка.”

Зайшоўшы ў кантору і пазнаёміўшыся з прыехаўшай з Абезі дзяўчынай, Косця запрасіў яе дамоў. Даведаўшыся, што Лёдзі патрэбна, ён запрапанаваў ёй пераначаваць, а на заўтрашні дзень з раніцы заняцца справай. Лёдзя з прапановай пагадзілася. А раніцай, выпісаўшы дакументы, Косця параіў Лёдзі навогул не вяртацца ў Абезь, якая знаходзілася ад Інты на адлегласці ў 100 кіламетраў на поўнач і ўяўляла сабой невялікі пасёлак. У гэты час у Інце ўжо было куды схадзіць і ў кіно, ды нешта можна было і купіць, хаця таксама з цяжкасцю. Аднак з гэтай прапановай Косці Лёдзя не пагадзілася і папрасіла яго адправіць яе назад, што ён і зрабіў. Але ў Інце было некалькі чалавек, якія праходзілі з Лёдзей Кавальчук па адной справе, і, даведаўшыся, што дзяўчына прыязджала ў Інту, яны пачалі на Косцю сварыцца, чаму ён не паведаміў ім аб гэтым. Хлопцам хацелася спаткацца з ею. І каб выправіць сваю віну, Косця рашыў напісаць Лёдзі ліст, у якім запрасіў яе прыехаць на сустрэчу са знаёмымі ёй хлопцамі. Аднак Лёдзя зрабіла наадварот - запрасіла Косцю прыехаць у Абезь.

Косця паехаў: цікава было паглядзець на тую Абезь, з якой Лёдзя не жадала развітвацца. І калі прыехаў на чыгуначную станцыю, дык убачыў вялікую раку Ўса і на ёй высокі мост, што гаварыла аб вялікіх разлівах ракі. А за ракой было бачна некалькі хатаў, да якіх Косця і накіраваўся. Падышоўшы да пасёлка, ён пачаў шукаць Базарную вуліцу, а на ёй дом пад нумарам 30. Але калі запытаўся аб такім адрасе ў аднаго дзядзькі, дык той адказаў: “Не ведаю, у нас ва ўсім пасёлку столькі дамоў няма.” Пасля гэтага Косці прыйшлося проста заходзіць у хаты, ды пытацца. Вось такім чынам ён і знайшоў патрэбную хату. Дарэчы, заходзіўшы ў хаты, Косця прыкмеціў, што палова іх знаходзіцца ў зямлі. Гэта рабілася для таго, каб хаты менш прадуваліся зімой халоднымі ветрамі - нават у гэтым адчувалася сапраўдная халодная Поўнач.

Спусціўшыся ўніз, Косця адчуў, што нейдзе побач зарохкала парасё. Ён адчыніў дзверы і ўбачыў гаспадара свінчаці, якое падавала свой голас. Пасля гэтага Косця адчыніў другія дзверы і перад ім з`явілася Лёдзя, якая чысціла чаравікі. Убачыўшы Косцю, Лёдзя ўзрадавана сказала: “А вось - і госць!” На што Косця, у сваю чаргу, адказаў: “Як бачыш. А ты і не думала?” А далей Лёдзя паведаміла, што яна чакае яшчэ больш гасцей. І, безумоўна, з гэткай нагоды яны абое пайшлі ў краму, у якой

спажывецкіх тавараў было яшчэ меньш, чым у крамах Інты: ляжала кабачковая ікра, некалькі пачкаў пячэння і цукерак, ды стаяла гарэлка - адзіны прадукт, аб якім клапацілася савецкая ўлада, каб яго хапала і ў Цэнтры, і ў Сібіры, і на Далёкім Усходзе, і на Поўдні, і тут, на Поўначы. У свой час бальшавікам спатрэбіліся грошы на індустрыялізацыю. Вось тады яны, акрамя іншых мераў для здабычы грошаў, і выдалі дэкрэт аб масавым вырабе гарэлкі. У сувязі з тым, што дэкрэт падпісаў тагачасны Старшыня Савета Народных Камісараў СССР Аляксей Рыкаў, першую гарэлку называлі “рыкаўкай”.

Такім чынам Косці з Лёдзяю доўга выбіраць ежу не прыйшлося: што было, тое і купілі, ды і пайшлі на яе кватэру. А хутка прыйшлі і госці, якіх Лёдзя чакала. Гэта былі жанчыны-вязні, якія ў той дзень мелі выхадны і прыйшлі да Лёдзі падзяліцца навінамі, а заадно і крыху падыхаць вольным паветрам. Дзве з жанчанаў былі маладзейшымі і зваліся Ірамі, а чатыры жанчыны былі ўжо ў гадах. Паколькі Косця быў сярод іх адным мужчынаю, ды і прыехаў з шахцёрскага горада, дык жанчыны і сталі яго велічаць “шахцёрам”. Жанчынам хацелася даведацца ад Косці аб Інце, а самі яны распавядалі аб мясцінах вакол Абезі. У тым ліку і паведамілі, што за тры кіламетры ад іх пасёлка ёсць камяцкая вёска Петруны, дзе можна “дастаць” аленіны, ды купіць нешта і з мануфактуры. Гэта Косцю зацікавіла: яму патрэбен быў матэр`ял, каб абшыць кажух. І паколькі ў яго было тры выхадных дні, ён вырашыў застацца яшчэ на адзін дзень і з`ездзіць у тыя Петруны.

Пагасцяваўшы ў Лёдзі, жанчыны зноў пайшлі ў “свой вязенскі дом” - лагер. А Косця, пераначаваўшы, зайшоў у краму, купіў тры бутэлькі “савецкай вадкай валюты”, без якой ужо ў тыя гады на Поўначы нельга было ступіць амаль кроку і ніякай справы без яе нельга было вырашыць, а пасля гэтага пайшоў на базар, каб знайсці кагосьці, хто б падвёз да Петруноў. І такі чалавек хутка знайшоўся. Гэта быў мясцовы камяк, які перад тым, як ехаць у Петруны, узяў даную яму Косцем бутэльку, раскруціў яе ў руцэ і ў адно імгненне пераліў гарэлку з бутэлькі ў свой посуд, што называецца горлам. Убачыўшы гэткае, Косця думаў, што камяк хутка зваліцца з ног. Але гэтага не здарылася - ён нарадзіўся і вырас ужо пры савецкай уладзе і да гарэлкі прывык. На сваіх сабаках, нібы на аўтамабілі, ён хутка даімчаў Косцю да Петруноў і, калі яму Косця паабяцаў даць яшчэ адну бутэльку,

дык пагадзіўся пачакаць і адвезці пасажыра назад у Абезь.

У краме Косця таксама паказаў бутэльку, пасля чаго размова адразу атрымалася. Дзяўчаты-прадаўцы знайшлі Косці патрэбны матэрыял, а пасля дасталі сёмгу, напяклі аленіны і ўсе разам смачна паабедалі. Яшчэ адну чарку выпіў і камяк. У час размовы ў краме Косця даведаўся, што мясцовыя жыхары ядуць рыбу тады, калі яна ўжо крыху запахне, а аленіну яшчэ з царскіх часоў адсылаюць з гэтых краёў у Англію, апошняя дае за гэта порах, ружжа, матэрыялы для адзення. Калі вярнуліся ў Абезь, Косця разлічыўся з камяком, як і абяцаў, яшчэ адной бутэлькай. Сам зноў застаўся ў Лёдзі на начлег. А ад`язджаючы, запрапанаваў дзяўчыне ўсё такі пераехаць у Інту, з чым яна зноў не пагадзілася. Аднак дамовіліся, што на Вялікдзень Лёдзя прыедзе ў Інту пагасцяваць.

Калі Косця вярнуўся ў Інту, дык раўнівыя дзяўчаты і жанчыны, намалявалі плакат, на якім з едлівай насмешкай быў намаляваны Косця,едучы на падножках цягніка ў Абезь шукаць сабе каханую. Ды гэта і зразумела: пасля доўгаг прыгонна-лагернага жыцця кожнай з іх хацелася сямейнай утульнасці і цеплаты, якую і мог даць адной з іх Косця. А ён вазьмі, ды і паехаў у Абезь…

Ну а сам Косця выпашыў афіцыйна адзначыць уходзіны ў сваю новую хату, на якія запрасіў каля васьмідзесяці чалавек сваіх знаёмых, у тым ліку, канешне, і Лёдзю. Дарэчы, тыя беларусы, з якімі ён не быў знаёмы, даведаўшыся аб уходзінах, таксама прыйшлі. Сярод іх быў і Вася Павідайло з-пад Клецка. У свой час ён каб не пайсці ў польскае войска ўцёк у СССР, а там атрымаў 15 гадоў. Таму да гэтага лічыў, што яму не зусім ёмка быць у кампаніі тых, хто не шукаў у СССР прытулку, а змагаўся за незалежную Беларусь. Але, прыйшоўшы да Косці на ўваходзіны, Вася хутка пераканаўся, што ўсе яны беларусы і іх цяпер аб`ядноўвае адна бяда - праз іх лёсы пераехаў каток сталінскай дыктатуры і зламаў ім далейшае жыццё. На жаль, на вечарыне не магала прысутнічаць Ларыса Геніюш, бо яе перавезлі ўжо ў новы лагер, які знаходзіўся ў Мардоўскай АССР. А тыя, хто прысутнічаў, выпілі па кіліху, пасля па другому, ды і запелі свае родныя беларускія песні: “Пад гоман вясёлы”, “Падняты родны сцяг дзяржавы”, “Мы бойкая моладзь - арлы маладыя”, “У гушчарах” і іншыя. І ўсе адчулі сябе, нібы дома: на берагах Нёмана і Дзвіны, Дняпра і Сожа, Беразіны і Буга,

Прыпяці і Віллі, Нарачы і Браслаўскіх азёраў… А пасля агульнай вечарыны знаёмыя Лёдзі, што праходзілі па адной з ёю справе, запрапанавалі дзяўчыне спаткацца асабіста. Гэта былі Міша Ракевіч, Міша Чыгрын, Федзя Даўгач, Лёва Бялевіч. І гэткае спатканне таксама адбылося. Такім чынам, у Абезь Лёдзя паехала поўная ўражанняў ад праведзенага ў беларускім асяродзі часу, ад спаткання са сваімі даўнімі сябрамі і ад новых знаёмстваў.

А неяк хутка пасля гэтага Косці запрапанавалі стаць нарміроўшчыкам майстэрні. Ён пагадзіўся, але з умовай, што на першых парах яму дапамогуць. Больш таго, Косця нават звярнуўся за парадай да рабочых і запытаў: ці згодны яны з гэтым. Рабочыя такі крок начальства віталі. Пасля гэтага Косця паклікаў яшчэ і Разумава, на ліку якога было тры забойствы, і ў яго таксама запытаў: “Колькі ты хацеў бы ў месяц атрымліваць, каб быць задаволеным?” І сам на гэтае ж пытанне адказаў: “Вось, калі ты будзеш атрымліваць 2,5 тысячы рублёў, але з умовай, што кожны дзень будзеш выходзіць на працу - ці задаволіць цябе гэта?” Разумаў пагадзіўся. Пасля чаго Косця запрапанаваў яму пасядзець і разам выклікаць для гэткай жа размовы ўсіх астатніх рабочых, з чым Разумаў таксама пагадзіўся. Самому Косці паабяцалі плаціць 1750 рублёў - столькі прыкладна складаў сярэднемесячны заробак па майстэрні.

Пасля праведзенай размовы ўсе рабочыя пачалі старацца, каб выканаць норму і атрымаць дамоўленую суму. Але ў канцы месяца ў майстэрню прыйшла старшы нарміроўшчык Марыя Аляксандраўна і паведаміла Косці, што Капеістаў пераглядзеў нормы і, маўляў, закрываць нарады патрэбна ўжо па новых нормах. Для Косці гэткае паведамленне з`явілася нечаканым і ён палічыў яго зусім няправільным. Таму Марыі Аляксандраўне ён сказаў: “Так жа нельга рабіць. Людзі працавалі месяц, разлічваючы на адны нормы, дык як жа я магу налічыць ім заробак па другіх? Я не магу ашукваць людзей і таму пакідаю працу.” Пры гэтым ён хутка сабраў рабочых і ў прысутнасці старшага нарміроўшчыка паведаміў ім “навіну”. Безумоўна, рабочыя паднялі гвалт. Прыйшлі начальнік майстэрні і бухгалтар, якім Косця таксама расказаў аб дзеяннях Капеістава і паведаміў, што ён не будзе закрываць нарады па новых нормах, а лепш зноў пойдзе працаваць токарам. А тым часам рабочыя

не супакойваліся. Зваршчык Анатоль Гусакоў запрапанаваў: “Давайце паразмаўляем з гэтым царком Капеіставым!” На тым і парашылі: Анатоль Гусакоў, як падаўшы ініцыятыву, Ганц Салумец і, канешне, Шышэя, а з імі і Марыя Аляксандраўна пойдуць да Капеістава высвятляць - у чым справа. Пры гэтым хацелася б падкрэсліць, чаму для пахода да Капеістава рабочыя назвалі прозвішча Салунца. Справа ў тым, што Ганцу вельмі патрэбны былі грошы. Да яго толькі што прыехалі жонка з дачкой, якія да гэтага адбывалі свой тэрмін у Казахстане. Спаткаўшы іх, ён ад радасці плакаў горкімі слязамі. Прыехалі яны амаль голыя і босыя. Таму патрэбна было купіць ім нейкую вопратку і абутак.

Зайшоўшы да Капеістава ў кабінет, прывіталіся і размову першай пачала Марыя Аляксандраўна, якая паведаміла, што рабочыя не згодны са змяненнямі нормаў выпрацоўкі. Пасля чаго Капеістаў запытаў: “А ў чым справа?” На што Шышэя адказаў: “Вы ж мяне паставілі пад удар: я ім называў адны нормы, а вы іх змянілі, прычым у канцы месяца.” І паклаў у гэты час на стол Капеіставу нарады, што апошняга вельмі раззлавала і ён закрычаў: “Ты што тут камандуеш?” А гэта ўжо вывела з раўнавагі Гусакова, які, хапіўшы Капеістава за горла, таксама закрычаў: “Не магу паразіта слухаць!” У гэты час стол перавярнуўся, усе бумагі ўпалі на падлогу, чарніла вылілася на штаны Капеістава. І апошні, звярнуўшыся да Марыі Аляксандраўны, прасіпеў: “Заві міліцыю.” А хлопцы хутка выйшлі з кабінета і пайшлі на працу. Аб здарыўшымся яны расказалі начальніку майстэрні Ефману, які ўвесь час чакаў іх звароту ад Капеістава. Даведаўшыся аб тым, што адбылося ў кабінеце Капеістава, Ефман перапалоханым голасам сказаў: “Ну натварылі вы…” А ў гэты час ужо пад`ехала і міліцыя, якая забрала Ефмана і Шышэю і павезла іх да Капеістава складаць пратакол.

Калі зайшлі да Капеістава ў кабінет, Косця заўважыў, што ўжо ўсё было на месцы, а сам гаспадар кабінета сядзеў у крэсле з аблітымі чарнiламі штанамі. На гэты раз размову пачаў Ефман, які цвёрдым голасам сказаў: “Калі вы так будзеце працаваць, дык вам патрэбна з`язджаць з Інты, бо рабочыя вам гэткай работы не даруюць.” Сваё слова вырашыў зноў сказаць і Шышэя: “Вы не мелі права мяняць нормы ў канцы месяца. Крок Гусакова я лічу, безумоўна, праступкам. Але не правы і вы. Гэта

ж 57 чалавек рабочых. Ці ж можна так да іх адносіцца?" А ў гэты час да Капеістава ў кабінет увайшоў і Васюта, які, мабыць, ужо чуў аб тым, што тут адбылося. Бо зайшоўшы адразу пажартаваў: "Дзе паяўляецца "стараста", там заўжды гвалт." Косця зразумеў, што начальнік АКБ сказаў гэта без злосці, і рашыў на жарт Васюты адказаць: "Ну выходзіць так. А што рабіць? Жыццё - гэта змаганне. Кожны хоча жыць." Міліцыя таксама зразумела, што ніякага пратакола пісаць не трэба, але ж яе выклікалі, таму адзін з міліцыянтаў запытаў: "Дык будзем пісаць пратакол?" На што ўжо адказаў Васюта: "Яшчэ чаго не хапала. Які пратакол?" А далей, звярнуўшыся да Капеістава, працягнуў: "Папрасіце ў міліцыі прабачэння." А пасля даў загад Шышэі: "Забірай свае нарады і налічвай так, каб людзі былі задаволены. А на подпіс прынясі да мяне." А далей зноў звярнуўся да Капеістава і запытаў: "Як гэта вы маглі гэткае ўтварыць, не запытаўшыся ў мяне?" У гэты час Капеістаў, папрасіўшы прабачэння ў міліцыі, апусціў галаву ўніз і маўчаў, слухаючы справядлівыя папрокі начальніка. Выказаўшы сваё незадавальненне паводзінамі Капеістава, Васюта зноў звярнуўся да Шышэі: "А як гэта ты адважыўся такога вялікага і здаровага чалавека хапаць за горла? Патрэбна ж было прыйсці да мяне." На што Шышэя адказаў, што гэта не ён хапаў Капеістава за горла. А што тычыцца ісці да вас, дык я, маўляў, думаў, што гэты крок з вамі ўзгоднены.

Пасля ўсіх названых недарэчнасцяў і разборак Косця забраў нарады і накіраваўся ў майстэрню, дзе да яго падыйшлі рабочыя, якім ён паведаміў, што за гэты месяц ён налічыць ім заробак так, як і абяцаў, а далей пойдзе працаваць токарам. Дарэчы, так і адбылося: на пасадзе нарміроўшчыка Шышэю змяніў чалавек, які толькі што скончыў інстытут. Ён быў ужо жанатым на настаўніцы.

Акрамя працы Косці ўвесь час прыходзілася займацца і гаспадарчымі справамі. А тут яшчэ і Лёдзя перадала кавалерам сваёй сяброўкі 900 рублёў і просьбу купіць ёй паліто. Канешне, Лёдзя правільна меркавала, што ў Інце зрабіць гэта лягчэй, чым у "яе" Абезі. Але і тут было таксама не ўсё проста: у крамах добрыя паліто не віселі. Таму Косці прыйшлося пайсці да старшыні сельпо Мікалая, які раней вучыўся ў іх майстэрні за токара. Мікалай быў хлопцам сяброўскім і без усялякай адмовы пагадзіўся Косці дапамагчы, праўда, пры гэтым пажартаваў: "А

што - ты думаеш жаніцца? Спачатку купіш паліто, а пасля будзеш падбіраць для яго жонку.” На што Косця адказаў таксама жартам: “Дык ужо пара.” А праз два тыдні, як і дамовіліся, Мікалай патэлефанаваў, каб Косця падышоў за заказам. Падзякаваўшы старшыні сельпо за добрую памяць Косця ўзяў грошы і накіраваўся ў дамоўленае месца, дзе ўбачыў нават некалькі, у тым ліку і прыгожых, хоць і дарагіх, паліто. Адно з іх Косці спадабалася. Коштам яно было 1270 рублёў. Але Косцю гэта не палохала, бо грошы ў яго былі. Справа заставалася толькі за тым, каб хтосьці, прыкладна гэткай фігуры, як Лёдзя, памераў. І тут яму падалося, што для гэтага можа падыйсці адна з прадаўцоў. Памераўшы паліто на сябе, дзяўчына пахваліла яго і таксама пажартавала, што будучая жонка будзе вельмі задаволена. Такім чынам, паліто было куплена, праўда, да яго кошту Косці прыйшлося яшчэ ўнесці ў сельпо і сто рублёў паявых узносаў. Але Косця зрабіў і гэтае, ды, падзякаваўшы Мікалаю і прадаўцам, задаволеным пайшоў дамоў пісаць пісьмо Лёдзі.

Аднак з прыездам Лёдзі ў Косці з`явіліся новыя клопаты. Справа ў тым, што ёй паліто не падыйшло па памерах. І Косці патрэбна было думаць, куды яго дзеваць, каб вярнуць назад грошы. А зрабіць гэта было яшчэ цяжэй, чым яго купіць, бо ярлычкі з надпісам кошту ён пазрываў і з паліто і з каўнера, а гэта азначала, што вярнуць пакупку ў сельпо было ўжо нельга. Таму, дачакаўшыся нядзелі, Косця напісаў сваею рукою на звычайнай паперы новыя ярлыкі і панёс паліто на базар. Знайшоў там, як яму падалося, шчаслівае месца, павесіў паліто, побач сеў і закурыў. Але не паспеў ён яшчэ і выкурыць папяросу, як да паліто падыйшлі два міліцыянты і запыталі: “Чыё паліто?” Косця падняўся і адказаў: “Маё.” Больш слухаць Косцю міліцыянты не сталі, а, забраўшы і паліто і яго ў машыну, завезлі ў міліцыю і адразу пачалі пісаць пратакол як на спекулянта. Нават цяжка сказаць, чым бы ўсё гэта скончылася, каб у час допыту Косці ў пакой следчага не зайшоў маёр, які калісьці ў механічнай майстэрні заказваў дыскі. Маёр пазнаў Косцю і запытаў: “А ты што тут робіш?” Пакуль Косця паспеў сказаць слова, як капітан, які вёў допыт, ужо абазваў яго спекулянтам, які, маўляў, на базары гандлюе жаночымі паліто. Але маёр, не звяртаючы ўвагі на словы капітана, зноў звярнуўся да Косці з пытаннем: “Ты з АКБ і працуеш у майстэрні, так?”

Косця адказаў: “Так.” Пачуўшы станоўчы адказ Косці, маёр звярнуўся да капітана: “Ніякі ён не спекулянт. Гэта харошы токар, які выконваў нам заказ для ДАСААФ, тачыў дыскі.” А пасля, глянуўшы на Косцю, загадаў: “Бяры сваё паліто і пайшлі са мною.” А выйшаўшы на вуліцу, маёр распавёў: “Знаеш, пойдзем да мяне дамоў. У мяне ёсць дарослая дачка, якой патрэбна паліто, прычым, як я бачу, гэтае павінна па памерах ёй падыйсці. І калі гэта так здарыцца, дык я табе вярну гэтыя грошы, ды яшчэ пастаўлю бутэльку каньяку.”

Усё так і здарылася: паліто дзяўчыне падыйшло. Таму маёр ад радасці сказаў: “Ну сам Бог цябе нам паслаў.” На што Косця жартам адказаў: “Не Бог паслаў, а міліцыя прывяла.” А ў гэты час ужо засцілаўся абрусам стол, на апанві шыпелі яйкі і адчынялася бутэлька каньяку. Такім чынам, усё скончылася так, як у казцы. Праўда, Лёдзя засталася без паліто.

А Косця, збудаваўшы ўласную хату і атрымаўшы пашпарт, вырашыў тым часам узяць вотпуск і паехаць дамоў. Усё-такі, як не кажы, а дома не быў ужо цэлых дванаццаць гадоў. Ды і ўвесь час не пераставалі турбаваць пытанні: дзе маці, сястра, брат? што з сядзібай - стаіць яна, ці не? а калі стаіць, дык ці жыве ў ёй хто, ці стаіць пустая? Таму адкладваць сваю паездку на Радзіму Косця не хацеў, тым больш, што тэрмін вотпуску ўжо накапіўся больш за два месяцы. У гэтай сувязі ён патэлефанаваў Лёдзі, каб прыехала і забрала свае грошы, але даведаўшыся ад Косці, што ён збіраецца ехаць на Радзіму, Лёдзя вырашыла выкарыстаць гэткую нагоду і паехаць у Беларусь разам. Дазвол выязджаць з Поўначы яна таксама ўжо мела. Ініцыятыву зямлячкі Косця вітаў. Праўда, праз некалькі дзён Лёдзя паведаміла, што яе не хочуць атпускаць у вотпуск, таму што на працы яе няма кім замяніць. І тут Косця падумаў, што патрэбна дзяўчыне дапамагчы, а таму саюраўся і паехаў у Абезь. Там зайшоў у адміністрацыю і, убачыўшы, што сваімі размовамі аб чалавечнасці, ён не пераканае бюракратаў ні ў чым, прыдумаў версію аб жаніцьбе на Лёдзі. У такім выпадку яе начальству нічога не заставалася рабіць як падпісаць заяву Лёдзі аб яе звальненні з працы па свайму жаданню. Такім чынам, у Інту паехалі Косця і Лёдзя ўжо ўдваіх, а далей, пераначаваўшы, пайшлі, купілі білеты і ўзялі накірунак на Радзіму. Прыехаўшы ў Слонім, Косця ўзяў таксі і, давёзшы Лёдзю дамоў, хацеў адразу паехаць на сваю Навагрудчыну, для чаго нават затрымаў таксі.

Але выбегшыя з хаты Лёдзіны бацькі ад радасці і не ведалі як аддзячыць Косці за дапамогу іх дачцы. І, безумоўна, не аб якой паездцы дамоў у той дзень яны не давалі хлопцу нават і гаварыць. Усё адбывалася так, як у той беларускай песні: адно схапіла за руку, другое - за другую і павялі ў хату. Хутка прыйшлі і дзве Лёдзіных сястры, брат, маці накрыла стол. Гарэлкі хапала, ды і запівалі самым прыемным напоем, які толькі ёсць у Беларусі, - бярозавым сокам. А калі крыху выпілі, дык язык кожнага пачаў гаварыць тое, што ён думае. Бацькі ніяк не маглі наглядзецца на дачку, якая адсутнічала гадоў дзесяць, і працягвалі ад задавальнення спатканнем з ею плакаць. Ды гэта і вядома, калі яе забіралі, яна была амаль падлеткам, а цяпер перад імі сядзела дарослая, прыгожая дзяўчына, якая для іх па-ранейшаму заставалася дзіцём, якое яны ў гэты час шкадавалі яшчэ больш, чым раней. І гэтага не хавалі. Але зусім па-іншаму ацэньвала адбываўшаеся адна з сясцёр Лёдзі, якая таксама не хавала сваіх думак. Пасля нейкіх двух келіхаў выпітай гарэлкі яна, звярнуўшыся да Лёдзі, сказала: “Ну што - хацела быць міністрам, за што і атрымала.” Безумоўна, Лёдзі, сцярпеўшай столькі пакутаў за самую чыстую справу - незалежнасць Радзімы, было крыўдна гэткае чуць ад роднай сястры. А Косця, пачуўшы такія словы, наогул падумаў, што заставацца тут Лёдзі ніяк нельга. Бо большасць людзей, якія знаходзіліся пад уплывам бальшавісцкай прапаганды не маглі яе зразумець. І ў той вечар Косця ад шчырага сэрца нейкім своеасаблівым чынам пашкадаваў дзяўчыну, якая падзяліла лёс з гэткімі, як ён. І на раніцы ў час прагулкі ён параіў Лёдзі вяртацца ў Інту і нават, прызнаўшыся ёй аб тым, што хоча выехаць у Польшчу, паабяцаў аддаць ёй сваю хату. Але Лёдзя, мабыць, і сама разумела тое, аб чым ёй гаварыў Косця. Бо нечакана для яго яна сказала: “Дык і я таксама хацела бы выехаць у Польшчу.” І Косця, у той час не вельмі яшчэ разумеючы, чаго ў яго душы было болей: ці спачування дзяўчыне, ці ўжо з`явіўшыхся да яе пачуццяў, на выказанае ею пажаданне адказаў: “Дык што будзем рабіць? Жаніцца? Дык жаніцца я не збіраюся, бо не ведаю, што будзе ў той Польшчы. А сям`я, калі яе стварыць, павінна быць забяспечана. У мяне ж пакуль што нічога няма.” А далей яны ўжо гаварылі адно другому, нібы чытаючы напісанае некім зверху. І гаварылі яны таму толькі тое, што іншага гаварыць не маглі. Дакладней, ужо гаварылі не яны, а гаварылі

іх душы. Бо адчуўшы сваім сэрцам, што сэрца ідучага побач з ею хлопца жадае пачуць ад дзяўчыны згоду, Лёдзя сказала: “Дык неяк будзе.” На што Косця яшчэ ўсё працягваў адказваць пытаннем: “Дык што - пойдзем распісвацца?” І тут Лёдзя паставіла апошнюю кропку: “Я згодна.”

На тым былі зняты ўсё недамоўкі. Косця і Лёдзя адчулі сябе так, нібы ўсё пражытае заставалася нейдзе далёка ззаду, а яны апынуліся на нейкім іншым свеце. Іх душы і сэрцы былі ўжо разам. Заставалася ўсё гэта толькі аформіць у сельскім савеце, ды, як прынята, адзначыць пачатак іх сумеснага жыцця за святочным вясельным сталом у атачэнні сваіх родных і блізкіх.

І гэта ўсё таксама адбылося без асаблівых недарэчнасцей, калі не лічыць, што Лёдзі не вельмі хацелася мяняць сваё, як ёй падавалася, вельмі прыгожае прозвішча Кавальчук на непрывычнае ў той час для яе - Шышэя. Але і гэта ўсё стала на месца: яна, як жанчына, была ўжо не адна, амела надзейную апору ў жыцці ў асобе чалавека, якога яшчэ падлеткам называлі арлом, мужчыны, які да гэтага часу прайшоў праз многія выпрабаванні і нідзе не сагнуўся. Ды і Косця, які хоць і даваў сваім сябрам абяцання не жаніцца на Поўначы, адчуў сябе ўжо не адзінокім, побач з ім стала прыгожая, сімпатычная, ды таксама, як і ён, загартаваная жыццём сяброўка.

* * *

Лёдзя некалькі маладзейшая за Косцю. Яна нарадзілася ў 1928 годзе ў вёсцы Церахоўшчына, належаўшай у той час да Слонімскага павета Наваградскага ваяводства. Сям`я Кавальчукоў мела прыкладна 12 гектараў зямлі. Праўда, ворная зямля і сенажаці знаходзіліся ў розных месцах, прычым самы вялікі кавалак - на адлегласці ад сядзібы 15 кіламетраў, што з`яўлялася вялікай перашкодай пры выкананні сельскагаспадарчых работ. Маці Лёдзі звалі Казімірай, і была яна па веравызнанню каталічкай. Бацька быў праваслаўным і зваўся Лук`янам. Але гэта не перашкаджала ім кахаць адно другога, нарадзіць і выхаваць сына і трох дачок, што падцвярджала ўласцівую беларускаму народу талерантнасць. Лёдзя сярод дзяцей была самай старэйшай. Таму, як гэта было прынята ў той час амаль ва ўсіх сялянскіх сем`ях, яна павінна была дапамагаць “падымацца” маладзейшым брацiку і сястрычкам. У школу пайшла спачатку Навасёлкаўскую. Вучыцца прыйшлося, як і ўсім дзецям Заходняй Беларусі яе

пакалення, пры розных уладах: польскай, савецкай, нямецкай, зноў савецкай. Таму і мовы патрэбна было вывучаць: беларускую, на якой размаўлялі дома, польскую, нямецкую і рускую. Але, не гледзячы на цяжкасці ваеннага перыяду, бацькі Лёдзі разумелі, што якая ўлада не была бы, а дзецям патрэбна вучыцца, і рабілі для гэтага ўсё, што ад іх залежала. У час нямецкай акупацыі Лёдзя вучылася ў Слоніме. У Слоніме яна скончыла ў 1947 годзе і дзесяць класаў.

Слонімшчына, як і Наваградчына, багатая беларускімі традыцыямі, і мясцовае насельніцтва тут не адзін раз прыбягала да актыўнага змагання за свае правы. Як і ў іншых раёнах Захожняй Беларусі, дзе бальшавікі яшчэ не паспелі вытравіць з людзей нацыянальную свядомасць, дзе ў памяці многіх мясцовых жыхароў жыла барацьба за свае правы супраць панскай Польшчы і нямецка-фашысцкіх акапантаў, асабліва востра і балюча ўспрымаліся масавыя абвінавачванні людзей у антысаветызме і высылка няўгодных на Поўнач і ў Сібір, гвалтоўная арганізацыя калгасаў, абраза нацыянальнай культуры і засілле ўсіх устаноў прышлымі з Усходу, часта мала адукаванымі, але палітычна-заангажаванымі кадрамі. Усё гэта штурхала, і ў першую чаргу, канешне, інтэлігенцыю і моладзь да супраціву па-сутнасці новай акупацыі Беларусі. Ужо ў першы пасляваенны год у многіх раёнах Заходняй Беларусі ўзніклі патрыятычныя арганізацыя, якія былі гатовыя змагацца за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы. У Слоніме ў гэты час узнікла падпольная арганізацыя “Чайка”, якая, згодна сцвярджэнню яе кіраўніка Васіля Супруна, ставіла сваёй задачай “праз патрыятычнае падполле спрыяць нацыянальнаму самаўсведамленню моладзі, рыхтуючы тым самым супраціў шквалу чужацкай агрэсіі, што несла с сабой маральнае і духоўнае разлажэнне нашага народу, знішчэнне яго гістарычных каштоўнасцяў.” У праграме “Чайкі” было асобна агаворана, што дадзеная арганізацыя не павінна займацца тэрорам і падрыўной дзейнасцю, а праз ідэйна-асветніцкую патрыятычную індывідуальную працу пашыраць свае шэрагі. Удзел у першым Устаноўчым сходзе “Чайкі”, акрамя Васіля Супруна, прымалі Міхась Ракевіч, Міхась Чыгрын, Аляксандр Гардзейка, Ніна Карач і Лёдзя Кавальчук. Апошняя хадзіла тады ў дзевяты клас.

“Чайка” праіснавала да лета 1947 года. За гэты перыяд яна стала разгалінаванай і мела свае абласныя і раённыя

аддзяленні. “Патрыятызм і маладосць не мелі перашкодаў”, - так характэрэзуе тую самааданасць гэтай падпольнай патрыятычнай арганізацыі яе кіраўнік Васіль Супрун. Для кіраўніцтва патрыятычнымі арганізацыямі быў створаны Цэнтр беларускага вызваленчага руху (ЦБВР).

Аднак не спалі ў шапку і спецслужбы, якія лічылі, што “лепш вырваць з савецкага грамадства лішніх падазроных, чым пакінуць адну гніль”. Менавіта з гэтай мэтаю і з`явіліся “Курапаты”, працавалі Бабруйскія парылкі, праводзіліся массавыя заключэнні ў так званыя выхаваўча-працоўныя лагеры і адпраўка людзей на спецпасяленне.

Першым з арганізатараў “Чайкі” арыштавалі самога яе кіраўніка - Васіля Сапруна. Здарылася гэта 6 чэрвеня 1947 года, а праз дзесяць дзён забралі і Лёдзю Кавальчук. Яе завезлі ў Баранавічы і памясцілі ў асобную камеру тупмы КДБ, што размяшчалася на Крывым Коле.

Арышт з`явіўся для Лёдзі вялікім унутраным узбуджэннем. Ёй у той час ішоў толькі дзевятнаццаты год. Але на гэта следчыя не звярталі ўвагі і праводзілі допыты, галоўным чынам ноччу, прычым да знямогі дзяўчыны. У час допытаў да Лёдзі як бы і не прымянялі ніякіх фізічных мераў, але даводзілі яе да таго становішча, што яна падала са стула. Допыты праводзіў следчы КДБ па прозвішчу Наквакін. У яго задачу ўваходзіла “наквакаць” такога і столькі, каб падагнаць паказанні Лёдзі пад тыя, якія ўжо раней даў кіраўнік “Чайкі”, каб хутчэй скончыць справу. Таму, скарыстаўшыся нявопытнасцю маладой дзяўчыны, Наквакін пайшоў на прамы падман. Складаючы пратакол, ён прыпісаў Лёдзі і тыя дзеянні, якіх яна не рабіла. А калі яна паспрабавала адказацца ад подпісу на тым пратаколе, следчы яе ўгаварыў, што, маўляў, ты падпішы, а пасля мы ўсё ўдакладнім і з чым ты не пагаджаешся, тое выкраслім. Але яму патрэбны быў толькі подпіс і ніякага “пасля” не было. Дабіўшыся ад Лёдзі подпісу на пратаколе, яе перавялі ў другую турму, што знаходзіцца ў Баранавічах на Палескай вуліцы. Там, у камеры, акрамя яе, знаходзілася яшчэ пяць чалавек. У новай турме было крыху цяплей, ды, у адрозненне ад першай, дазваляліся перадачы. У названай турме Лёдзя прасядзела аж да суда.

Суд адбываўся 16-18 кастрычніка 1947 года і быў закрытым. Судзілі адначасова дваццаць чалавек. Судзіў Ваенны Трыбунал войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Баранавіцкай вобласці.

Лёдзю прысудзілі да дзесяці гадоў зняволення і пяці гадоў паражэння ў правах. Пасля суда яе зноў адвезлі ў турму, але ўжо ў камеру, дзе знаходзілася каля сотні чалавек, сярод якіх былі і бандыты. Там яна прасядзела да 25 снежня, пакуль не забралі “на этап”. З Баранавіч Лёдзю адвезлі ў Оршу на перасылку, дзе памясцілі таксама ў вялізную камеру, у якую напіхалі столькі вязняў, скольки магло толькі ўлезці. З Оршы яе павезлі далёка на Поўнач, на станцыю Княж-Пагост Комі АССР, а адтуль, пагрузіўшы на грузавыя машыны, адвезлі ў саўгас, што знаходзўся на адлегласці ў 60 кіламетраў ад названай станцыі. Гэты лагер называўся Кылтава. Памясцілі Лёдзю ў памяшканне былога манастыра. Акрамя манастырскіх будынкаў, у лагеры стаяла яшчэ і некалькі баракаў. Пасля двухнядзельнага карантыну, усіх вязняў прапусцілі праз медычную камісію, на якой кожны з іх атрымаў сваё прызначэнне. Лёдзя апынулася на лесапавале.

А на двары стаяла паўночная халодная зіма. І ўжо праз тры дні Лёдзя прастудзілася і захварэла. Некалькі дзён праляжала ў сваёй камеры, а ачуняўшы, стала працаваць на нарыхтоўцы дроў для цяпліцаў. Там ўжо можна было зайсці на некалькі хвілін у цяпліцу і крыху пагрэцца. Кармілі вязняў галоўным чынам паўночнай зялёнай капустай і салёнай рыбай. Па гэткай ежы ўвесь час хацелася есці. Спалі вязні на нарах у вялікім памяшканні.

У сакавіку 1948 года Лёдзю разам з многімі іншымі вязнямі перавезлі ў другі лагер, які размяшчаўся каля станцыі Ракпас. І вось тут Лёдзя ўпершыню спаткала жанчыну, якая праявіла аб ёй клопат. Убачыўшы, што Лёдзя выглядам слабая, жанчына падыйшла да яе і сказала: “Я цябе забяру да сябе ў ганчарны цэх быткамбіната. Крыўдзіцца не будзеш.” Жанчына працавала начальнікам гэтага цэху. Як Лёдзя пасля высветліла, жанчына, адбыўшы свой тэрмін, знаходзілася ўжо на спецпасяленні. Таму яна разумела вязняў, спачувала ім і чым магла, імкнулася дапамагчы. Вязні, якія працавалі ў яе цэху, атрымлівалі адносна нядрэнную ежу. У ганчарным цэху выпрацоўвалі розны посуд. У абавязкі Лёдзі ўваходзіла расцірка на шкле фарбы, што ішла на афарбоўку посуда. Аднак і тут Лёдзя хутка захварэла, і начальнік цэха адправіла яе ў амбулаторыю.

Да гэтага Лёдзя паспела ўжо з многімі пазнаёміцца. Сярод вязняў аказалася шмат віленскіх жанчын, сярод якіх была і

пажылая па прозвішчу Янкоўская. Яна таксама адносілася да добрых і спагадлівых людзей. У яе там знаходзіўся і брат, які працаваў урачом. Янкоўская папрасіла брата, каб той паклаў Лёдзю ў бальніцу. Аднак Янкоўскага хутка перавялі ў іншы лагер. Але, ад`язджаючы, ён папрасіў таго ўрача, які стаў на яго месца, каб і ён паклапаціўся аб Лёдзі. У сувязі з гэтым, калі Лёдзя ачуняла, яе ўладкавалі ў бальніцу дапамагаць медычным сёстрам, дзе яна і прабыла пакуль не накіравалі яе ў мінлаг у Абезь. У Абезі размяшчаўся лагер, куды звозілі ўсіх старых і хворых, якія не маглі выконваць цяжкіх фізічных работ.

У Абезі Лёдзя спачатку трапіла ў пажарную каманду, а пасля працавала на падстанцыі, адкуль і выйшла 9 верасня 1955 года на волю. Праз некаторы час пасля прыезду сюды Лёдзі, у Абезі з`явілася і Ларыса Геніюш, якую прывезлі з Інты. Ларыса Антонаўна працавала на розных работах, адзін час нават адвозіла бочкаю нечыстоты, пасля была сястрою-гаспадыняю ў бальніцы. Менавіта Ларыса Антонаўна Геніюш і сыграла канчатковую ролю ў збліжэнні Лёдзі і Косці. Вось як аб гэтым яна піша ў сваёй "Споведзі": "Лёдзю я завочна пазнаёміла з Кастусём Шышэям, ён і ажаніўся з ёю. А пакуль да гэтага дайшло, яна працавала электрыкам у Абезі, як вольная. Была маладзенькай, прыгожай, сядзела за арганізацыю "Чайка"... І так дзяжурачы ў Абезі як электрык, апаясвала сваю канурку дротам з высокім напражэннем, каб ніхто не смеў да яе прыблізіцца, бо аматарам танных пачуццяў хапала. Так дачакалася яна свайго Кастуся..."

Але калі быць больш дакладным, дык неабходна адзначыць, што Косцю з Лёдзяю першымі пазнаёмілі хлопцы, якія сядзелі ў Інце па адной справе з ёю. Калі Косця выйшаў на волю, ён дапамог ім спісацца з Лёдзяю, але з таго часу і сам стаў пісаць ёй пісьмы. А калі вызвалілася і Лёдзя, дык сапраўды яна прыехала ў Інту афармляць дакументы з рэкамендацыяй Ларысы Геніюш знайсці там і звярнуцца да Косці, апошняга папрасіла дапамагчы ў гэтай справе добрай і прыгожай дзяўчыне.

А пасля вяселля, прабыўшы некалькі дзён у бацькоў Лёдзі, Косця паехаў дамоў. Заехаўшы ў свае Краскоўскія Горы, ён спачатку зайшоў да дзядзькі - Цішука Паўла, які яму паведаміў, што да іх прыходзіла пісьмо ад Сашы, але ён яго, маўляў, згубіў. Дзядзька Павел параіў Косці схадзіць да Пятра Бондара (па-

вясковаму Клэіна), куды Кастусь адразу і накіраваўся. Адбывалася ўсё гэта ў нядзелю. У хаце Клэіны была п`янка, на якой прысутнічала і Трафімчыкава Надзя. З ею Косця калісьці хадзіў у школу, таму Надзю зацікавіла, дзе ён увесь гэты час знаходзіўся і, наогул, як склаўся яго лёс. Але Косця сказаў, што гэта вялікая размова і яе патрэбна адкласці, а сам, звярнуўшыся да гаспадара, запытаў: “Дзядзька, кажуць, што ты атрымаў ад майго брата Сашы письмо. Можа ты даў бы мне яго адрас?” На што Бондар адказаў: “Так, письмо было. Але я яго спаліў. Ты ж ведаеш, які цяпер час.” А пасля гэтага паведаміў, што, калі яго выклікалі ў Менск на суд Сашы, ён нічога дрэннага не сказаў.

Калі казаць праўду, дык Косця іншага адказу ад Бондара і не чакаў, бо гэтую запалоханасць людзей ён адчуў, прабыўшы некалькі дзён на Радзіме Лёдзі. Таму паспяшаўся развітацца, каб не перашкаджаць сабраўшайся кампаніі, ды зноў пайшоў да дзядзькі Паўла. А там ужо быў падрыхтаваны стол, сабраліся дзядзькавы дочкі, сыны, што даводзіліся Косці стрыечнымі сёстармі і братамі. Кожнаму з іх хацелася спаткацца з братам, якога доўга не бачылі.

Выпіўшы за такое нечаканае спатканне, пачалі ўзгадваць былое і расказваць аб перажытым. Дзядзька Павел паведаміў Косці аб тым, ад чаго згарэла яго сядзіба. А здарылася, з яго слоў, гэта ў час адступлення казакаў з Расейскай Вызваленчай Арміі, якія, адыходзячы, далі арудзійны залп па вёсцы, ад чаго і згарэла некалькі сядбзібаў, у тым ліку і Шышэяў. А калі выпілі па другому кіліху, дык дзядзька без папрокаў, а хутчэй нават шкадуючы пляменніка, сказаў: “Вось дарэмна ты, Косця, звязаўся з гэтымі рагулеўцамі. Бачыш, колькі за гэта напакутаваўся.” Сам Косця разумеў, што рана ці позна, але пытанне аб ацэнцы яго лёсу нехта ўздыме: калі не сам дзядзька, дык яго дзеці, якія, як і многія іншыя сапвецкія людзі, увесь час слухалі толькі адну “праўду” - бальшавіцкую, а таму і глядзелі на жыццё праз закрытыя гэтай “праўдай” акуляры. І калі гэтае пытанне дзядзька падняў, дык свой адказ на яго вырашыў даць і Косця. Ён, у прыватнасці, сказаў: “На гэтыя вашы словы, дзядзька Павел, я хачу выказаць сваю думку. Я нічуць не шкадую гэтых дванаццаці гадоў, дзесяць з якіх я правёў у турме і сталінскіх лагерах. Я паклаў сваё жыццё на алтар, каб знішчыць сталінізм з яго калгасамі, у адным з якіх і вы пакутуеце.” Ад гэткіх Косціных слоў дзядзька, нібыта аж

прыгнуўся, і стаў азірацца па баках, быццам бы яму паведамілі, што ў кожнай сцяне нехта паставіў падслухоўваючы апарат. І каб адмежавацца ад Касціных размоў ён моцна сказаў: “Ціха ты!” Але Косця вырашыў выказаць сваю думку наконт іх калгаснага жыцця да канца. А такая думка ў яго склалася, калі ён пабыў і паглядзеў на жыццё бацькоў Лёдзі. Таму ён працягнуў: “Што ціха! Якое ж гэта ў вас жыццё? Вамі камандуе былая варажэя Кавaліха (так па-вясковаму звалі Ганну Трафімаўну Кумец - старшыню мясцовага калгаса), для якой у свой час не было розніцы, каму варажыць, яна варажыла нават тым жа немцам. А вы ўсё маўчыце, як калісьці даўней маўчалі прыгонныя селяне.”

Аднак, каб адыйсці ад палітычных размоў, дзядзька Павел перавёў, як кажуць, пласцінку на іншую тэму. Чалавекам ён быў не толькі бывалым і разумным, але і асцярожным, ніколі не вытыкаўся наперад. Гаварылі, што, калі арганізоўвалі калгас, дык ён не пажадаў застацца ў ім старшынёю, бо менавіта не Каваліху, а яго прапаноўвалі на гэтую пасаду. Аднак Павел Цішук ад прапановы адмовіўся, спаслаўшыся пры гэтым, што ў яго вялікая сям`я і таму старшыня з яго не атрымаецца. А разам з тым запрапанаваў абраць на гэтую пасаду вось тую самую Каваліху, аргументаваўшы пры гэтым тым, што “Ганна - гэта варажэя, яна добра ведае людзей, умее гаварыць, а значыць знойдзе агульную мову як з усімі намі, так і з начальствам.” Сядзеўшая ж на сходзе Ганна Трафімаўна нібыта гэтага толькі і чакала. Пачуўшы прапанову Паўла Цішука, якога аднавяскоўцы паважалі як добрага гаспадара і разумнага чалавека, яна адразу падхапілася са свайго месца і сказала: “А што - калі аберацe, дык і буду.” На тым пытанне з абраннем старшыні калгаса было і вырашана. Ды для раённага начальства Ганна Кумец сапраўды больш падыходзіла, чым Павел Цішук са сваімі гаспадарчымі прынцыпамі, а большасць сялян у той час не вельмі яшчэ верылі, што калгас доўга пратрымаецца, таму амаль кожны думаў: няхай будзе хто хоча, абы толькі не я. Ну а тыя, хто хадзіў у савецкім актыве, дык яны ўжо былі ўладкаваныя на іншых, на іх думку, больш прэстыжных і менш адказных пасадах, чым старшыня тады невялікага калгаса ў адной вёсцы. Гэткіх калгасаў у тым жа невялікім па памерах Шчорсаўскім сельскім савеце было некалькі.

А ў той дзень, калі дзеці пачалі ўжо разыходзіцца, дзядзька

ўзяў Косцю за руку і сказаў : “Няхай ідуць, ім патрэбна дамоў, а ты на хвілінку затрымайся.” І калі ўсе разышліся, дзядзька вывеў Косцю ў сені, ўзяў кельму і адбіў у адным месцы ад сцяны атынкоўку, пад якой было схавана пісьмо ад Косцінага роднага брата Сашы. Пры гэтым дзядзька аглянуўся ва ўсе чатыры бакі: “Вось вазьмі. А пачытаеш пазней.” І на гэтым стаў развітвацца. Косця таксама спяшаўся, бо патрэбна было наведаць і іншых дзядзькоў: Мікалая, Янку. Таму ён яшчэ раз падзякаваў дзядзьке Паўлу за пачастунак і за пісьмо, развітаўся і пайшоў далей. Ды трэба было хутчэй вяртацца і на Слонімшчыну, дзе яго чакала маладая жонка. У той час Косця думаў і аб тым, што хутчэй патрэбна ехаць і ў Інту, бо там ён павінен быў прадоўжыць свае клопаты наконт дазволу выезду ў Польшчу.

А пытанне з выездам у Польшчу пачалося з таго, што перад ад`ездам у вотпуск Косця вычытаў у газэце аб ад`ездзе з Савецкага Саюза палякаў у Польшчу, а беларусаў, хто жадае, - з Польшчы ў Савецкі Саюз. Таму і ён звярнуўся ў польскую амбасаду ў Маскве з просьбай дазволіць яму выехаць у Польшчу. Але, як яму сказалі, для таго, каб атрымаць канчатковы дазвол на гэта, неабходна было мець дакумент, які падцвярджаў бы, што ад`язджаючы сапраўды жыў да верасня 1939 года на тэрыторыі Польскай дзяржавы. І таму Косця вырашыў зайсці яшчэ і ў Шчорсаўскі сельскі савет і папрасіў выдаць яму гэткую даведку. Пры гэтым Косця ведаў, што старшынёй у сельскім савеце працаваў у той час Чарняўскі з Панямоння, які быў добра знаёмы і бацьку Косці (яны разам вазілі лес), ды і самому Косці. Таму прыйшлося пераначаваць яшчэ адну ноч, каб на раніцы зрабіць і дадзеную справу.

Зайшоўшы ў сельскі савет і прывітаўшыся са старшыней Косця паказаў апошняму характарыстыку, якую яму выдалі з месца працы, ды сказаў некалькі слоў аб сваім жыцці. Прачытаўшы характарыстыку, Чарняўскі яшчэ раз паглядзеў на Косцю, якога ён бачыў толькі падлеткам, сказаў: “Ну дык ты ж цяпер малайчына. Але ж ты, мабыць, нечага хочаш, бо не прыйшоў жа ты ў сельскі савет толькі для таго, каб паказаць гэтую характарыстыку.” І тут Косця сказаў аб тым, што яму патрэбна. Уважліва выслухаўшы Шышэю, Чарняўскі адказаў на просьбу наступным чынам: “Я магу даць табе гэткую даведку, але патрэбна, каб два чалавекі пісьмова падцвердзілі, што яны цябе ведаюць, як чалавека, які да восені 1939 года жыў у вёсцы

Краскоўскія Горы. Тут Косця спачатку нічога не зразумеў. “Дык вы ж аб гэтым самы ведаеце, і навошта вам падцвярджэнне”, - запытаў Шышэя ў старшыні сельсавета. Але, у адрозненне ад Шышэі, Чарняўскі ўжо крыху “цяміў” у савецкай бюракратыі і таму патлумачыў: “Я ж дзяржаўная асоба і буду падпісваць даведку, а таму патрэбна знайсці для падцвярджэння два іншых чалавекі.” Пасля гэтага Косця зразумеў, што ў яго іншага выйсця няма, чым шукаць такіх людзей. І ён выйшаў на вуліцу, а там у гэты час ішла Моніч Марфа, якая працавала брыгадзірам Любчанскай МТС. Прывітаўшыся яшчэ з адной знаёмай Косця стаў прасіць Марфу зайсці ў сельсавет і паставіць свой подпіс на патрэбным для старшыні Чарняўскага дакуменце. На прывітанне Марфа адказала і нават кінулася ў размову з Косцем, але, калі пачула, што патрэбна ёй паставіць свой подпіс, на падставе якога Косці дадуць якісьці дакумент, адразу сказала: “Гэта не.” І, нават не развітаўшыся са знаёмым ёй, лічы, з дзіцячых гадоў чалавекам, кінулася наўцёкі.

Крыху пастаяўшы і сам з сабою паразважаўшы аб тым, да каго можна звярнуцца са сваёй просьбай і хто не збаяўся бы пісьмова падцвердзіць вядомую ўсім жыхарам Шчорсаўскага сельскага савета ісціну, Косця ўбачыў свайго аднагодку Васю Шастака, які ўжо быў добра выпіўшы і круціўся каля крамы. Косця падыйшоў да Васі і нават не паспеў яшчэ за руку прывітацца, як аднекуль з`явілася і Васіна жонка. Прывітаўшыся пасля гэтага ўжо з сямейнай парай, Косця папрасіў іх, як знаёмых, даць яму адпаведнае падцвярджэнне. Шастакі без усялякага адказу пагадзіліся і яны ўсе трое пайшлі ў сельскі савет. Хутка аформіўшы неабходныя падцвярджэнні Чарняўскі выдаў Шышэі патрэбную даведку. Аднак на запрашэнне Косці зайсці ў краму і замачыць выданы ім ліст, Чарняўскі спачатку адмовіўся. Але, калі Косця з Шастакамі ўжо стаялі ў краме і “мачылі” даведку, туды прыйшоў і старшыня сельскага савету і таксама выпіў кіліх гарэлкі за здароўе Косці.

А ў Інце, пакуль Косця адсутнічаў, хлопцы пафарбавалі ў хаце падлогу і пабялілі сцены. Да гэтага часу хата стала ўжо амаль агульным інтэрнатам для беларусаў-халасцякоў, якія выходзілі з лагера. Але прывёзшы з сабою маладую жонку, якую хлопцы ўжо даўно ведалі як прыгожую дзяўчыну і патрыётку, Косця дамовіўся з Іванам Мазго, што апошні ўступіць пары Шышэяў свой асобны пакойчык, а сам пойдзе ў большую залу

на Косціна месца. З першых дзён пасля прыезду Косця пайшоў зноў на працу. Больш таго, ён узяў для сябе яшчэ і дадатковую працу, бо патрэбны былі грошы, каб неяк да зімы адзецца і самому, і купіць нешта Лёдзі, якую ён не пусціў на працу; хацеў, каб Лёдзя крыху адпачыла, ды і сэрца адчувала штосьці не зусім добрае…

У першыя дні пасля прыезду ў Інту Косця паслаў ліст брату Сашы ў Англію. А праз месяцаў два, замест ліста атрымаў пасылку з Амерыкі. Праўда, заплаціў за яе больш 2 тысяч рублёў. Са значных рэчаў у пасылцы былі: туфлі, якія не падышлі Косці па памеру, світар, касцюм і для Лёдзі асенняе паліто. А праз два тыдні прыйшла і яшчэ адна пасылка, за якую патрэбна было плаціць ужо амаль 3 тысячы рублёў, таму Косця адмовіўся ад яе і напісаў брату, каб больш нічога не пасылаў.

А неўзабаве Косцю выклікаў пракурор Інты Лапшын і гаворыць: “Ты ж ведаеш, усё, што ідзе за мяжу, правераецца. Мы чыталі і тваё пісьмо. І мне прыемна табе паведаміць, што ты адзіны, хто адмовіўся ад заакіянскага дабра. Уяўляеш сабе - ёсць людзі, якія маюць тут нядрэнны заробак, а ўсяроўна просяць, каб ім нешта прыслалі з-за мяжы. А ты адмовіўся. У гэтай сувязі мы падрыхтавалі ў газэту артыкул і хочам, каб ты падпісаў. Няхай ім будзе брыдка.” Перш чым падпісваць, ці адмовіцца ад гэтага Косця прачытаў артыкул, а пасля і кажа: “Вы што, хочаце, каб з мяне людзі смяяліся. Хто ж гэта паверыць, што ў нас усё ёсць, і мне нічога не трэба. Я такога артыкула падпісваць не буду.” Пачуўшы гэткае меркаванне наконт артыкула, пракурор застаўся незадаволены. Ён паглядзеў на Косцю коса і сказаў: “Мы хацелі зрабіць як лепш. А калі ты так паступаеш, дык і я табе скажу: у нас ёсць даведкі органаў дзяржбяспекі аб тым, што творыцца ў цябе ў хаце.” І тут Шышэя зразумеў, што на яго будзе рабіцца ўціск, а таму патрэбна сабрацца з думкамі і вытрымаць. Ён запытаў у пракурора: “А што там творыцца?” На што пракурор адказаў: “У цябе збіраюцца дзесяткі людзей, і вы спяваеце антыдзяржаўныя песні.” Косця вырашыў удакладніць: “А якія менавіта? Я, напрыклад, ніякіх антыдзяржаўных песень не ведаю.” Пасля гэтага пракурор назваў некалькі беларускіх песень, якія сапраўды хлопцы і дзяўчаты спявалі, калі збіраліся разам. Далей працягваць размову пракурор не стаў, нібы даўшы гэтым Косці ведаць, што мы за табою, маўляў, наглядаем, а таму ты

задумайся над гэтым…

Канчаўся 1956 год - год XX з`езда КПСС, на якім быў асуджаны культ асобы Сталіна, а значыць і тыя парадкі, якія існавалі ў краіне ў час кіраўніцтва ею названым дыктатарам. Але не практыцы не ўсё было так, як гаварылася на вышэйшым партыйным форуме. Працягвалася барацьба з іншадумствам, па-ранейшаму існавала цэнзура, рабіўся ўціск на рэлігію. Вось і ў тыя дні ў другім раёне Інты судзілі прапаведніка рэлігійнай секты "Браты Іяговы" - Хаменку. І Косця вырашыў з`ездзіць і папрысутнічаць на судзе.

Хаменка быў чалавекам, прыкладна, гадоў сарака, высокага росту, стройны, па яго адказам было бачна, што і адукаваны. Выступіўшы на судзе, пракурор патрабаваў для прапаведніка вышэйшай меры пакарання; матываваў ён сваё патрабаванне тым, што Хаменка, маўляў, арганізоўвае антыдзяржаўныя сходы. І суд пагадзіўся з патрабаваннем пракурора. Сам Хаменка ўспрыняў гэта як пакаранне яго за грахі грамадства, якое дазволіла безбожнікам прыйсці да ўлады. І калі яму далі апошняе слова, Хаменка падняў уверх рукі і сказаў: "Госпадзі! Даруй ім, бо яны самы не ведаюць, што твораць." Пасля гэтага ў залі ўстанавілася цішыня, а многія сталі плакаць. Косця яшчэ раз узгадаў пры гэтым аб папярэджанні яго Лапшыным. Ён зразумеў, што над ім згушчаюцца хмары. І таму пастараўся ўгаварыць Лёдзю яшчэ раз з`ездзіць у Беларусь. А сам у душы падумаў, што, мабыць, жаніцца ўсё ж такі было не патрэбна.

Не прайшло і двух нядзель пасля ад`езду Лёдзі, як Кастуся выклікалі ў Сыктыўкар да міністра ўнутраных спраў Комі АССР Урнышава. Да гэтага часу ў Сыктыўкары Косця ніколі не быў. А гэта, як аказалася, быў немалы горад над ракою Вычагдай. Праўда, тады Сыктыўкар яшчэ не быў звязаны з іншымі гарадамі чыгункай. Даехаць да сталіцы Комі АССР можна было або ракою, або самалётам. Косця абраў апошняе. Пераначаваўшы ў калгасным гатэлі, які стаяў за горадам, і папіўшы на раніцы чаю, Кастусь накіраваўся шукаць патрэбнае яму міністэрства. Увайшоўшы ў прыёмную, паказаў павестку, прачытаўшы якую, яму запрапанавалі пачакаць. А каля 11 гадзін яго правялі ў спецыяльны пакой ды праверылі, каб не было зброі і выбуховых рэчаў. Праз хвілін дзесяць адчыніліся дзверы кабінета самога міністра Ўрнышава.

Міністр выглядаў ужо дастаткова пажылым чалавекам з

сівымі валасамі на галаве. Побач з ім сядзеў яшчэ адзін, прычым значна маладзейшы чалавек, мабыць, памочнік міністра. Назваўшы Шышэю па імю і імю па бацьку, міністр запрапанаваў сесці, за што Косця падзякаваў. Размову міністр пачаў з пытання, як наведвальніку спадабаўся горад, ці снедаў ён, а пасля ўзгадаў яму, што ён нядаўна ажаніўся, а далей зноў запытаў, на гэты раз - як яму жывецца. Пасля гэтага распавёў размову аб доме, аб пабудове якога, як высветлілася, міністру расказаў Бэрман. І такім чынам падыйшоў да галоўнага пытання: “А навошта табе, маючы сям`ю, жыллё, ехаць у Польшчу? Ты што, далей хочаш ехаць у Англію? Ну чым ты не задаволены? Мне паведаміў пракурор Лапшын, што ты нават адказаўся ад заакіянскай пасылкі. Маладзец!” А пасля засмяяўся і працягнуў размову: “Мне гаварылі, што цябе нават з лагера выганялі, так табе, мабыць, там спадабалася. Дык навошта табе тая Польшча?” Увесь гэты роспавед Косця ўважліва слухаў і імкнуўся зразумець, што будзе далей? Але патрэбна было гаварыць і штосьці самому. І Косця пачаў: “Гражданін начальнік!” Але міністр яго перабіў і сказаў: “Я табе таварыш.” На што Косця адказаў: “Але ж які я вам таварыш? Вы генерал, міністр…” І тут яго зноў перабіў міністр, настойваючы на сваім: “Але ж мы ўсе таварышы. І павінны ісці разам, адным шляхам. Праўда, ты хочаш кудысьці ехаць. Табе тут нешта не падабаецца.”

Косця зразумеў, што патрэбна гаварыць больш канкрэтна па справе. “Навошта мне Англія, ці Германія, - пачаў ён. - Гэта чужыя для мяне краіны. Я не ведаю іх мовы, звычаяў. А мне ўжо амаль сорак. Таму я прашу дазволу пераехаць у Польшчу, дзе мне ўсё вядома. Я хачу забраць туды і жонку, а пасля маці і сястру. Думаю, што там я заўжды зараблю на кавалак хлеба.” Але міністр настойваў на сваім: “А што табе не падабаецца тут у нас? Людзі? Культура?” На што Косця адказаў: “Я гэтага не гаварыў. Але ж культура тут зусім іншая, чым у Польшчы. Калі заходзіць у аўтобус жанчына, ці нават стары чалавек, яму тут ніхто не ўступіць месца сесці. Пры размовах паветра напаўняецца матам. Я не хачу ўсяго гэтага бачыць і чуць. Я прапакутаваў 12 гадоў, дык дайце мне магчымасць дажыць апошнюю частку майго існавання на свеце ў сваім асяродзі. Вы ж чалавек у гадах і павінны мяне разумець.”

Уважліва выслухаўшы роспавед Шышэі, міністр паглядзеў на

яго, а пасля кажа: “А ты пакліч маці і сястру сюды.” На што Клсця адказаў пытаннем: “Куды сюды? Тут жа нават кіслародa не хапае ў паветры.”

Гэткая пастаноўка Косцем пытання, відаць, прымусіла міністра быць больш катэгарычным. Таму ён задаў яшчэ адно пытанне: “Ну а дома ў цябе што?” Але і адказ Косці таксама быў канкрэтным: “У мяне ўжо няма дома.” Тады міністр вырашыў перайсці ў атаку: “Ты гаворыш няпраўду. Ніякі ты не паляк. Ты беларус. Мы гэта ведаем. І аб якой польскай культуры ты гаворыш?” Аднак і Косця не стаў здавацца. “Вы прабачце. Вось, скажам, у лагеры сядзяць людзі розных нацыянальнасцяў. Але там жа няма палякаў. Яны лічаць сябе беларусамі, хаця культура ў іх заходняя, польская. Вось я быў у Беларусі і зайшоў у касцёл. Там людзі моляцца, грае арган. І гэта ўскалыхнула маю душу, я плакаў, бо зразумеў, што маё жыццё толькі там. Мне гэтага не хапала ўсе дванаццаць гадоў. Менавіта тады я палічыў, што мне патрэбна жыць толькі на Захадзе, - тлумачыў Косця.

І тут міністр злавіў Косцю на слове. “Дык ты і едзь у беларусь, а не ў Польшчу”, - сказаў ён. Аднак Косця не разгубіўся і хутка адказаў: “Але ж там таксама зачыняюцца цэрквы і касцёлы. У Польшчы ж гэтага няма. Там працуюць касцёлы. Таму я вас вельмі прашу адпусціць мяне. Гэта ўсё залежыць ад вас.” Размова ў міністра скончылася тым, што на развітанне ён сказаў: “Ты падумай! Ты ўсё ж такі беларус.” А праз два дні пасля вяртання Косці ў Інту яго выклікалі ўжо ў міліцыю. Прыняўшы яго маёр загадаў Шышэі прынесці две фатакарткі, як на дакументы, і даў для гэтага тры дні. Косця зразумеў, што гэта нешта нядобрае, і вырашыў пайсці і пракансультавацца да былога пракурора аднага з раёнаў Масквы - Елізарава, які, як і Косця, не так даўно выйшаў з лагера. А каб размова была больш сяброўскай і адкрытай, узяў з сабою бутэльку гарэлкі.

Елізараў быў рады прыходу Шышэі і з зацікаўленасцю слухаў яго роспавед аб размове з міністрам і выкліку ў міліцыю. А пасля запытаў: “Ну а сам ты як думаеш - навошта маёру спатрэбіліся твае фатакарткі?” Для Косці гэткае пытанне былога пракурора не стала нечаканым. Таму ён адразу адказаў: “Думаю, што хочуць даць мне беларускі пашпарт.” Пагадзіўшыся з адказам Косці, Елізараў пачаў у голас разважаць: “На мой погляд, яны не захочуць з табою вазіцца. Бо на самай справе цябе можна

судзіць за абман дзяржаўных органаў і даць табе ад 3 да 7 гадоў зняволення. І калі ты пагадзішся з імі, што ты беларус, дык так яно можа і быць. Але, калі ты будзеш настойваць на сваім, дык, я паўтараю, яны не захочуць з табою вазіцца. У цябе напісана, што ты маеш толькі 5 класаў адукацыі, і яны проста махнуць рукой і пакінуць усё так, як ёсць. Так што трымайся сваёй лініі.”

Косця таксама гэтак думаў у той час. Але больш за ўсё зноў думаў аб тым, навошта ажаніўся? навошта ў сваю бяду ўцягнуў яшчэ і Лёдзю? Аднак завярнуць усё гэта назад было нельга, як і нельга сабраць з падлогі ў жбан разлітае малако. І таму пачаў разважаць аб выйсці, якое можна было б знайсці ў дадзенай сітуацыі. Гэткае выйсце з матэрыяльнага боку ён знайшоў: калі з ім штосьці здарыцца - Лёдзі застанецца хата, напісаў і даверанасць на атрыманне ў ашчаднай касе грошай, якія ў яго былі. А каб нешта зрабіць для Лёдзі і з другога, духоўнага, боку - вырашыў напісаць ёй развітальны ліст. На жаль той ліст не захаваўся, але тады Косця настолькі пранікся думкамі аб лёсе маладой жонкі, што змест яго ён запамятаў на ўсё жыццё. І калі ён яго ўзгадваў, было бачна, як Косця ўсё гэта перажываў нанава.

“Дарагая Лёдзя! Я люблю цябе як свет, як блакітнае неба і сонца, як свой родны Нёман, як краявіды нашых палёў і лугоў. Я імкнуўся ўцячы з гэтага бязбожнага свету ў хрысціянскі. Не атрымалася. Таму прабач мне. Я бачыў і тваё становішча, а таму хацеў дапамагчы і табе. Але ўсё гэта не атрымалася. Мабыць, жыццё ў мяне такое, што я, як сказана ў святым пісаніі, павінен цярпець пакуты і за сябе і за сваіх продкаў. Але рук на сябе я не налажу, а буду несці свой крыж да канца жыцця. А ты яшчэ раз прабач мяне і забудзь.” Напісана ад шчырага сэрца і так, што мімаволі прабівае слязу. І Лёдзя гэткіх слоў заслугоўвае. Яна, паклаўшая на алтар Бацькаўшчыны ўсю сваю маладосць, адносіцца да тых жанчын, аб якіх паэты пішуць вершы і складаюць балады. А яе жаночая пяшчотнасць і прыцягальнасць не падуладны ні лагерам, ні часу. Гэта сапраўдная чайка, у якой так удала спалучаюцца знешняя прыгажосць і грацыёзнасць палёту. І Косця, які сам сваім патрыятызмам і свабодалюбствам змог падняцца на вышыню арлінага палёта, усё гэта прыкмеціў і ацаніў.

Адыходзячы ў міліцыю ліст і даверанасць на атрыманне

грошай у ашчаднай касе Косця аддаў суседцы па дому Жэні - жонцы Кобуся і папрасіў яе перадаць Лёдзі. А ў міліцыю прыйшоў роўна ў 10 гадзін раніцы, як яму і загадвалі. Роўна ў 10 да справы прыступіў і маёр. Ён папрасіў Шышэю паказаць свой пашпарт і аддаць две фатакарткі. Узяўшы пашпарт у рукі, паглядзеў на яго і паклаў у свой стол. У той жа час маёр узяў са стала новы пашпарт, наклееў на яго фатакартку, паставіў пячатку, падаў Косці і запрапанаваў паставіць подпіс, які падцвярджаў бы атрыманне дадзенага дакумента. Шышэя ўзяў новы пашпарт у рукі, прачытаў усе яго старонкі, а пасля вярнуўся да той старонкі, дзе указана нацыянальнасць - беларус, яшчэ раз пачытаў яе і сказаў: “А чаму не цыган? Гэта ж адбылося следства і там запісалі нацыянальнасць паляк, а на падставе чаго вы ўстанавілі, што я беларус?” На што маёр громкім голасам адказаў: “А ты ведаеш, колькі сродкаў затрачана, каб удакладніць тваю нацыянальнасць? Так што бяры пашпарт і не муці ваду.”

Але Косця не збіраўся мяняць сваю лінію, як яму і раіў Елізараў. Таму на крык маёра ён спакойна адказаў: “Вы не крычыце. Я ўжо ўсе гэтыя крыкі перажыў. Мяне білі, “мачылі”, але я заўжды заставаўся пры сваім. І вы таксама не псуйце сваіх нерваў.” Гэткага адказу маёр, напэўна, не чакаў. І таму яшчэ больш громкім голасам крыкнуў: “Сяржант! Машыну!” А пасля, звярнуўшыся да Шышэі, закрычаў яшчэ мацнее: “Згноім у турме!”

Косця вырашыў зноў даць адказ на крык маёра. “Я гатовы ўсё цярпець. У вас сіла. Але не крычыце, бо гэта нічога не дасць.”

У той час падыйшла машына - “варанок”, на якой Шышэю адвезлі ў прыстасаванае пад турму памяшканне, дзе аднаго пасадзілі ў бокс, што азначала нядоўгае прыбыванне ў гэтым месцы.

Так яно і здарылася - праз некаторы час падыйшоў той жа “варанок” і адвёз Шышэю зноў у міліцыю да таго ж самага маёра, які адразу запытаў: “Ну што - адумаўся?” Косця зразумеў, што самыя галоўныя жахі засталіся ўжо ззаду. І таму амаль жартам сказаў: “Там без свету дрэнна думаецца.” А пасля ўжо больш сур`ёзна дадаў: “Ды і буду я тым, кім і быў.”

Аднак маёр паспрабаваў яшчэ раз пераканаць Косцю: “Ты падумай. У цябе ж дом, ты ж ажаніўся.” А ўбачыўшы, што ні крыкамі, ні ўгаворамі ён Шышэю не пераканае, дастаў са стала

яго стары пашпарт і сказаў: “Атрымлівай. Скончыцца тэрмін, дык усяроўна заменяць.”

Узяўшы пашпарт, Косця пералістаў яго, палічыў ці ўсе ёсць лісты, паклаў у кішэню і выйшаў з памяшкання міліцыі з адчуваннем, падобным на тое, калі выходзіў з лагера. Уздыхнуў, набраў поўныя грудзі свежага паветра і пайшоў дамоў. Па дарозе ўзяў бутэльку гарэлкі і, не заходзячы дамоў, накіраваўся да суседзяў Кобусевых, ды запрапанаваў выпіць па кіліху за волю. Адначасова забраў у Жэні і той канверт, які ён даваў перадаць Лёдзі.

А праз некалькі дзён Косця вырашыў яшчэ раз паспрабаваць пакінуць СССР, для чаго паехаў у Маскву ў польскую амбасаду да прадстаўніка па рэпатрыяцыі палякаў з Савецкага Саюза. Ім быў чалавек, якога ў амбасадзе ўсе звалі па імі - пан Збышэк. Але, як падалося Косці, мабыць, ва ўсім адзеле рэпатрыяцыі гэта і быў толькі адзін паляк, таму што паўсюдна гучала руская мова. Зайшоўшы да пана Збышэка Косця прывітаўся і паказаў пісьмовы дазвол міністэрства СССР на яго ад`езд у Польшчу, а пасля стаў скардзіцца, што, маўляў, міністэрства Комі АССР забараняе яму выехаць. Выслухаўшы роспавед Шышэі, пан Збышэк прапанаваў яму прыйсці заўтра, а сам мігнуў вокам, падаўшы тым самым знак, як зразумеў Косця, аб сустрэчы адзін на адзін. Таму, падзякаваўшы загадчыка адзела па рэпатрыяцыі Шышэя пакінуў амбасаду. Ноч правёў на вакзале. А на заўтрашні дзень зноў пайшоў да польскай амбасады, прычым на нейкую гадзіну раней, чым пачынаецца працоўны дзень, каб сустрэцца з панам Збышэкам адзін на адзін.

Так і атрымалася. Загадчык адзела ішоў на працу на нейкую паўгадзіну раней, чым належала. Сустрэўшыся, пан Збышэк і Шышэя цёпла прывіталіся, пасля чаго першы пачаў тлумачыць: “Вы ж, мабыць, зразумелі, што вакол мяне рускія, і я тут нічога не вырашаю. Вырашаюць яны.” А пасля дадаў: “Вось такая яна - самастойнасць Польскай дзяржавы. І я, на жаль, нічым не магу дапамагчы. Прабачце, але гэта так.” На тым і развіталіся.

Косці стала зразумела, што яго мара аб пераездзе ў Польшчу на жыхарства не будзе здзейснена. Таму патрэбна было думаць аб пераездзе нейдзе ў новае месца. Бо заставацца ў Інце было нельга, прычым ужо не толькі з-за клімата, але і з-за таго, што тут яго ўсе ведалі і маглі ўвесь час нечага чэпляцца.

А тым часам Янка Гінько і Саша Вашкевіч купілі сабе на дваіх

двухпавярховы дом: у Сашы быў верхні паверх, а ў Янкі - другі. Вашкевіч Саша паходзіў родам з Масквы, меў дыплом горнага інжынера. І займеўшы ўласную кватэру, ён паехаў у Маскву, каб забраць да сябе паралізаваную дзяўчыну Валю, якую скрывіла, калі яна даведалася аб арышце каханага ею чалавека. І калі аба ўсім гэтым думаеш, дык пачынаеш яшчэ глыбей разумець, якімі ж патрэбна было быць кадэбістам злачынцамі, каб знішчаць і калечыць жыццё гэткім дабрадзейным людзям як Валя і Саша.

Прывёз Саша з Масквы і апаратуру, з дапамогай якой можна было выяўляць наяўнасць у вугальным пыле маленькіх частачак мятала, якія, пранікаючы ў лёгкія чалавека, іх раз`ядалі. Гэткая хвароба называлася селікозам. Але да Вашкевіча Сашы ў Інце ніколі ніхто не правяраў вугальны пыль на наяўнасць у ім мятала. Таму людзі працавалі ў шахтах да тых пор, пакуль канчаткова не аслабявалі. А калі гэткае здаралася, іх паднімалі на паверхню, дзя яны дажывалі сваё жыццё. А тут Вашкевіч падняў пытанне аб наяўнасці частачак мятала ў вугальным пылі перад упраўленнем Пячорскага вугальнага басейна. І кіраўніцтва басейна падцвердзіла вынікі доследу Вашкевіча, пасля чаго праверылі здароўе ўсіх шахцёраў і многім забаранілі далейшую працу ў шахце. Праз некаторы час самога Вашкевіча перавялі на працу ў Варкуту, дзе даручылі яму кіраваць лабараторыяй. Пабыўшы разам з каханым чалавекам стала папраўляцца і Валя.

Прабыўшы месяцаў тры дома, у Інту з`явілася і Лёдзя. За гэты час, як яна паведаміла Косці, наведала не толькі сваіх родных, але і з`ездзіла на яго радзіму, дзе пабыла ў гасцях ва ўсіх яго дзядзькоў і нават сустракалася са старшынёю тады ўжо ўзбуйненага Шчорсаўскага калгаса - Ганнай Трафімаўнай Кумец, якая стала ўжо дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Ганна Трафімаўна расказала Лёдзі аб сваіх паездках у Маскву і, канешне, не забылася пры гэтым пахваліць кіраўніцтва партыі і краіны за тыя клопаты, якія, на яе думку, яны праяўляюць аб развіцці калгасаў. Лёдзя слухала ўсе гэтыя роспаведы пра клопаты партыі і ўрада аб сялянах і параўноўвала хвальбу Кумец з тым рэальным становішчам у сваёй вёсцы Церахоўшчына тагачаснага Казлоўшчынскага раёна, якое яна бачыла і аб якім ёй расказвалі яе аднавяскоўцы. Якая ж гэта была вялікая розніца…

З вяртаннем Лёдзі ў Інту Шышэі цяпер ужо ўдваіх пачалі

планаваць, куды выехаць на пастаяннае месца жыхарства. Але, каб паехаць нейдзе і ўладкавацца на працу, патрэбна было мець нейкі дакумент аб адукацыі, якога ў Лёдзі не было, бо яе атэстат сталасці забралі, калі арыштоўвалі. Таму ў 1957 годзе Шышэі вырашаюць зноў паехаць на Слонімшчыну, каб заадно з наведваннем сваякоў зайсці ў школу і папрасіць выдаць Лёдзі дублікат атэстата.

Прыехаўшы ў Слонім, Лёдзя зайшла ў сваю школу, а Косця застаўся чакаць яе ў скверыку. І вось у гэты час са школы выйшлі двое прыгожаапранутых мужчыны, адзін з якіх сказаў: “Патрэбна даць ёй дублікат атэстата.” А другі, як пасля высветлілася, інспектар раяна па прозвішчу Бажко, выказаў зусім іншае: “Каму? Яна ж была ў СБМ.” Косця зразумеў, што размова ішла аб Лёдзі, таму ён адразу ў яе ўмяшаўся: “Вы ж, як бачна, ужо пажылы і адукаваны чалавек. Як вам не брыдка? Сталінізм жа ўжо скончыўся.” Пачуўшы ў свой адрас папрокі, старэйшы мужчына прыбавіў крокі, а за ім паспяшаўся і маладзейшы.

Косці стала зразумела, што нічога не будзе - дублікат атэстата Лёдзі не дадуць. Гэтак яно і атрымалася: куды толькі пасля гэтага яны не пісалі, ды так нічога і не дабіліся. У тую паездку ў Беларусь Косця з Лёдзей пабылі таксама ў Шчорсах, на Краскоўскіх Горах. Асабліва Косці запамяталіся тады госці ў яго стрыечнай сястры - дачкі Паўла Цішука Марыі. Працавала Марыя Паўлаўна ў той час настаўніцай матэматыкі ў сваёй школе. Была замужам. У Шчорсах пабудавала ўласны дом. І калі ў яго зайшоў Косця яго спаткаў размаўляючы на чыста рускай мове адносна малады мужчына. На прывітанне Косці “Добры дзень у хату”, малады чалавек адказаў: “Здравствуйте!” Пачуўшы рускую гаворку і сухі адказ на прывітанне, Косця стаў сумнявацца - ці ў тую хату ён зайшоў. І таму запытаў: “А ці тут жыве Марыя Цішук?” На што мужчына зноў па-руску і гэтак жа суха адказаў: “Не знаю.” Пасля гэтага Косця ўжо хацеў сказаць: “Прабачце”, ды запытаць ў маладога мужчыны хату Марыі Паўлаўны. Але, пачуўшы знаёмы голас, выбегла сама Марыя Паўлаўна ды сказала: “Как не знаю. Это же Костя, о котором я тебе рассказывала. Давай, беги за бутылкой.” А сама кінулася да Косці вітацца і пытацца, як ён жыве.

Сеўшы за пакрыты абрусам стол, на якім стаялі гарэлка, закуска, і, выпіўшы па два кіліхі, Косця запытаў у сваёй сястры і

яе мужыка, чаму яны так настойліва размаўляюць толькі на рускай мове, у той час, калі ён гаворыць з імі па-беларуску. І яго вельмі здзівіла, што яны адказалі яму: “Ты нічога не разумееш: у краіне мова дзяржаўная - руская ж.” Гэта Косцю здзівіла яшчэ больш, бо ён ведаў, што ў рэспубліках у той час дзяржаўнымі мовамі юрыдычна лічыліся две. Дык хто ж у такім выпадку можа забараніць людзям размаўляць на сваей роднай мове? “Ці гэта людзі сталі ўжо зусім іншымі, чым раней?” - падумаў ён. Бо Косця ж памятаў, што за польскім часам дзяржаўнай мовай была толькі польская. На польскай мове працавалі і школы. Больш таго, настаўнікі давалі дзецям загад, каб яны і дома з бацькамі размаўлялі таксама на польскай мове. Але, калі аднаго разу Косця запрапанаваў маці размаўляць дома на дзяржаўнай мове, дык пасля гэтага ледзь выбег з хаты, бо тая схапіла нейкі атнімач і хацела паказаць яму на спіне, на якой мове патрэбна размаўляць. Ды столькі было пакладзена ахвыраў, каб захаваць родную мову і сваю беларускую культуру. Таму, акрамя зададзенага пытання, Косця выказаў і сваё меркаванне на гэты конт: “Ну і перарабілі ж вас бальшавікі, што вы нават матчынай мовы выракліся.” Але зразумець адно другога Марыя Паўлаўна са сваім мужам і Косця так і не змаглі, бо размаўлялі яны сапраўды на розных мовах: ён - на сваёй роднай, атстойваючы якую перанёс шмат пакутаў, а яны - на дзяржаўна-палітычнай, за што ім плацілі.

Калі Косця з Лёдзяй вярнуліся ў Інту, праведаць іх прыйшлі Янка Гінько і Аляксандр Кратовіч, якія заадно і паведамілі, што паедуць у адпачынак у Прыбалтыку. Шышэі пажадалі хлопцам добра правесці час у Прыбалтыцы, ды, калі каго спаткаюць знаёмага перадаць і іх прывітанні.

Аляксандр і Янка паехалі спачатку ў Вільню, дзе верагоднасці спаткацца са знаёмымі было найбольш, асабліва ў Янкі. Вось тады Гінько і пазнаёміў Кратовіча з Зоей Аляксандраўнай Коўш, якую ён ведаў раней. Пазнаёміўшыся, Зоя і Аляксандр вырашылі сысціся і стварыць сям`ю. Таму Кратовіч больш ужо нікуды не паехаў, а, пабыўшы некалькі часу ў Зоі, накіраваўся ў Інту, каб там з усім разлічыцца, ды зноў вярнуцца да Зоі. А Гінько тым часам аб`ездзіў сваіх некаторых сваякоў і сустрэўся з Максімам Танкам (сапраўднае імя і прозвішча - Яўген Скурко). З паэтам Янка быў знаёмы яшчэ са школы. А пазней, у канцы трыццатых гадоў, Янка нават фінансаваў выданне кнігі М.Танка

“На этапах”. Таму адмовіцца ад сустрэчы з Гінько Танк ніяк не мог. Ён прыняў былога сябра ў сябе на дачы, падарыў яму свае кнігі, але без подпісу. А на развітанне сказаў: “Янка, у цябе свой час, а ў мяне свой. Мы з табою больш не сябры.”

Вярнуўшыся ў Інту і дачакаўшыся наступнага адпачынку, Гінько паехаў ужо з Косцем на Слонімшчыну ў Лёдзіну Цераховўшчыну, а пасля на Рыжскае Ўзмор`е крыху адпачыць. А там пазнаёміўся з жанчанай, жыдоўкай па нацыянальнасці, якая раней працавала партыйным сакратаром Міністэрства лёгкай прамысловасці Саюза. Звалі яе Ганна Аляксандраўна. У той час яна была ўжо беспрацоўнай, бо Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў распачаў чарговую хвалю барацьбы з іншадумствам і, як яму падавалася, засіллем у Савецкім Саюзе семітызма. Таму, спадабаўшыся адно другому, Ганна Аляксандраўна пагадзілася паехаць з Янкам Гінько на першым часе ў Інту, тым больш, што ў яго ўжо было сваё ўласнае жыллё.

Будучы ад прыроды жвавай і кемлівай, Ганна Аляксандраўна хутка знайшла сабе і працу - у гаркоме партыі. Увайшла яна і ў кола сяброў Янкі, у тым ліку пазнаёмілася і з сям`ёй Шышэяў. Яны часта адны ў другіх гасцявалі, а калі нікалі, узяўшы бутэльку, Косця і адзін хадзіў да Янкі і Ганны. Тады Ганна з задавальненнем бегла ў краму за сваёй бутэлькай і закускай каб пачаставаць госця, ды нешта ў яго запытаць пра тамашняе жыццё, аб якім да прыезда ў Інту яна не ведала. Але, пакуль Ганна прыходзіла з крамы, дык мужчыны ўжо з адной бутэлькай спраўляліся, не паказваючы пры гэтым ніякіх прыкметаў гаспадыні. І таму, калі прымаліся за яе бутэльку, дык ужо пасля першага кіліха амаль п`янелі. Аднак Ганна Аляксандраўна адносіла гэта на тое, што ім прыйшлося доўга пакутаваць, а таму іх арганізм аслабеў. Яна пачынала іх шкадаваць, маўляў, ваша маладосць загублена, ды і здароўя ў вас не стала, нават шклянкі гарэлкі не можаце выпіць.

І вось аднаго разу, у чарговы раз пачуўшы гэткае спачуванне, Косця гаворыць: “Ганна Аляксандраўна, вы, мабыць, нас не зусім правільна разумееце. Мы не лічым, што гады нашых пакутаў прапалі дарма. Вы партыйная жанчына, масквічка, і вам цяжка зразумець, але мы рабілі справу. Вы ж падумайце, як жывуць людзі ў калгасах - яны ж працуюць амаль бясплатна. А вазьміце - сколькі людзей жыве на спецыяльным пасяленні, і ім, як і калгаснікам, нельга стаць членамі прафсаюза. Дык што ж

гэта за дзяржава і ўлада, якія не бароняць сваіх грамадзян, а аддаюць іх на пакуты?"

У Ганны Аляксандраўны не было аргументаў каб пярэчыць Косці, але, мабыць, яна і не жадала пагадзіцца з тым, што ім за нешта патрэбна пакутаваць. Таму запытала: "А што вы можаце зрабіць?" На што Косця пачаў тлумачыць: "Нічога, калі ты адзін. А калі нас стане шмат, ды будзе арганізацыя, якая выпрацуе праграму і арганізуе тых, хто змагаецца за лепшую долю, дык нешта і атрымаецца. Бо нельга ж цярпець усё жыццё пакуты, ды яшчэ і мірыцца з імі. Вы ж вазьміце вас - жыдоў. Вось і зараз, за што на вас робіцца ўціск?"

А Ганна Аляксандраўна тым часам хацела ўсё больш і больш паслухаць меркаванні Косці наконт савецкай улады. І таму, амаль правакуючы на далейшую размову, сказала: "Гэта жахліва, аб чым ты гаворыш. Ты што - так ненавідзіш савецкую ўладу? І выступаеш на баку фашыстаў?"

Але Косця, не звяртаючы ўвагі на падтэкст пытання, працягваў тлумачыць: "Ды не. Што вы! Фашызм і бальшавізм - гэта, як сказана ў свяым пісаніі, чорны і чырвоны драконы. І пабіліся яны паміж сабою за заваяванне ўсяго свету. А раней яны спрабавалі паміж сабою дамовіцца. Але і адзін і другі з`яўляюцца вельмі вялікімі драпежнікамі. І таму ў рэшце рэшт паміж сабою шчапіліся. А для людзей і адзін і другі - яны небяспечныя. Таму з імі людзі і павінны змагацца."

Пасля гэткай Косцінай размовы Ганна Аляксандраўна стала яшчэ больш праяўляць цікавасці да яго, і, калі ён прыходзіў да Янкі, яшчэ з большай ахвотаю бегла за бутэлькаю і накрывала стол. У размову ўцягваўся і Янка.

Аднойчы, у 1958 годзе, прыходзіць Косця дамоў, а Лёдзя сядзіць ды плача: яна атрымала з дому ліст, у якім паведамлялася, што яе сястра, якая нядаўна скончыла дзесяць класаў, працавала ў краме, і ёй налічылі некалькі соцен рублёў недахопу. У тыя гады, калі не ўнесці грошы пагражала некалькі гадоў турмы. А ў бацькоў гэткіх грошай не было. І тут Косця стаў разважаць жонку, сказаўшы пры гэтым, што ў нас жа, маўляў, грошы ёсць, таму няма чаго плакаць, а давай хутчэй пашлем ёй тысяч паўтары, няхай унясе, колькі там патрэбна, у касу, ды едзе да нас.

Праз некалькі тыдняў пасля атрымання грошай маці і сястра Лёдзі былі ўжо ў Інце. Але праз дзён тры маці стала прасіцца,

каб яе адправілі дамоў. Косця на гэта адрэагаваў па-свойму: ён патлумачыў цешчы, што так рабіць нельга, бо церахоўцы расцэняць яе хуткі зварот з гасцей ад дачкі, што зяць яе прагнаў. Маці з довадам зяця пагадзілася, аднак сваё рабілі кліматычныя ўмовы: у жанчыны пачалі пухнуць суставы, зашаталіся зубы. Таму сапраўды патрэбна было хутчэй вяртацца дамоў. Туды яе суправаджала Лёдзя.

А тым часам, каб удакладніцца, што сабою ўяўляе Кратовіч, Зоя Коўш прыехала ў Інту. І яны ўдваіх прыйшлі да Шышэі. Больш таго, будучы ў гасцях, Зоя паабяцала, што яна і Косці з Лёдзею дапаможа прыпісацца ў Вільні, дзе ў яе быў свой дом. За гэта Косця шчыра падзякаваў ёй. Але пакуль кудысьці ад`язджаць, Косця працягваў будаўніцтва: на гэты раз рабіў пад хатай склеп. У час працы яго прыхапіў радыкуліт. Для лячэння яму прапанавалі курсоўку на 24 дні ў санаторый горада Пярну (Эстонія), дзе ёсць гразевыя ванны. Прыехаўшы туды, Косця вырашыў падстрыгчысь. І калі зайшоў у цырульню, і стаў чакаць сваёй чаргі, заходзіўшыя туды мясцовыя жыхары не звярталі на яго нават увагі: хто прыходзіў, той адразу і садзіўся ў крэсла. Але ў гэты час у цырульню зайшоў Ганц Салумец, які да гэтага таксама працаваў у Інце аўтагеншчыкам, прычым, у тым цаху, у якім працаваў і Шышэя. Гэткай нечаканай для абодвух сустрэчы былыя сябры абрадаваліся, прывіталіся, абняліся і пачалі размаўляць. У час размовы некалькі слоў сказаў па-эстонску і Косця. Усё гэта цырульнікік заўважылі і пачалі адзін за другім прасіць у Косці прабачэння за тое, што яны быццам бы проста яго не прыкмецілі і таму не запрашалі садзіцца ў рабочае крэсла. Косця не пакрыўдзіўся на цырульнікаў, бо ведаў іх адносіны да рускіх. У дадзеным выпадку яны, мабыць, і яго прынялі за рускага. Ну а спатканне з Ганцам скончылася, як гэта і бывае пры сустрэчах былых сяброў, сумесна распітай бутэлькай гарэлкі.

Скончыўшы сваё лячэнне, Косця паехаў у Вільню, памятаючы пры гэтым аб абяцанні Зоі Коўш. Туды са сваёй Слонімшчыны прыехала і Лёдзя. Астанавіліся яны ўсё ў той жа Зоі. Пахадзілі па горадзе, пасля чаго ў Лёдзі Косця запытаў: “Ну што, ты хацела бы жыць у гэтым горадзе?” На што Лёдзя адказала: “А што пра гэта гаварыць. Хто нас сюды прыпіша?” Спадабалася Вільня і Косці, хоць ён ужо быў тут у 1939 годзе. Пагасцяваўшы ў Вільні, Шышэі паехалі ў Церахоўшчыну, а адтуль - зноў у Інту,

прычым, ужо з надзеей, што, мабыць, сапраўды пераедуць у Вільню на пастаяннае месца жыхарства. У тым жа 1959 годзе ў Інту прыязджаў і бацька Лёдзі. Паглядзеў горад і вельмі зацікавіўся пры гэтым, як з аэрадрома ўздымаюцца самалёты. І так яму захацелася хоць адзін раз у жыцці падняцца ў неба, што ён не вытрымаў і сказаў аб сваім жаданні зяцю. І тут Косця захацеў зрабіць цесцю прыемнае і дапамагчы яму здзейсніць сваю мару. Для гэтага ў наступную нядзелю, узяўшы з сабою бутэльку гарэлкі, Косця з цесцем адправіліся на аэрадром. Там Кастусь знайшоў знаёмага лётчыка і папрасіў яго пакатаць дзеда на самалёце. Лётчык пагадзіўся, тым больш, што ў Інце ў тыя гады па выхадных днях сапраўды можна было за 20 рублёў палятаць 40 хвілін у самалёце. А калі самалёт сеў, Косця запытаў у цесця: “Ну як?” На што цесць адказаў: “Дык нядрэнна, але калі самалёт ляцеў над возерам, дык было вельмі страшна, каб не ўпаў у ваду.” А наогул бацька Лёдзі застаўся задаволены паездкай у Інту, і асабліва тым, што праляцеў на самалёце, бо было шмат аб чым расказаць сваім церахоўцам.

А ў Косці і Лёдзі не выходзілі з галавы думкі аб пераездзе з Інты. Спгсаліся яны з сябрамі, якія ўжо жылі ў розных гарадах Беларусі і Прыбалтыкі. А да Сяргея Кожана Косця нават з`ездзіў у Полацк. Было гэта ў канцы красавіка і на пачатку мая. І калі ў горадзе праводзілі на 1 мая мітынг, Косця запрапанаваў Сяргею схадзіць і паглядзець, што там робіцца. Але Сяргей адмовіўся, спаслаўшыся на тое, што, калі ў іх няма медалёў за вайну, дык і хадзіць на мітынгі нельга, бо, маўляў, там могуць запытаць, дзе твае ўзнагароды. Косці стала зразумела, што былы сябра не можа яму нічым дапамагчы, бо жыве тут, “як мыш пад венікам”, увесь час азіраючыся і баючыся.

З Полацку Косця паехаў у Шчорсы, дзе таксама пачуў вельмі сумныя і жахлівыя весткі: Янковіч, якога ў час нямецкай акупацыі гвалтам забралі ў паліцыю, за што ён адбыў пэўны тэрмін зняволення, вярнуўшыся дамоў у Шчорсы, вымушаны быў скончыць жыццё самагубствам. Ён не вытрымаў тых папрокаў, якія амаль кожны дзень чуў ад савецкіх актывістаў. Больш таго, калі Янковіч паехаў у лес за дравамі, дык нехта перасёк яму гужы, і гэта з`явілася апошняй кропляй яго цярпення. Не вытрымаў здзекаў і Міша Верабей з Заполля, які служыў з Косцем у эскадроне і таксама, адбыўшы тэрмін зняволення, вярнуўся дамоў. Пачуў Косця і аб тым, што хтосьці

рассек галаву Мурашку з Клецка пасля яго вяртання з Інты. Усё гэта гаварыла аб тым, што распал класавай і палітычнай варожасці паміж людзьмі, які праводзілі бальшавікі, не супакойваўся. І Косця канчаткова зразумеў, што вяртацца дамоў і яму непажадана, тым больш, што і вяртацца не было куды.

Запамяталася Косці і Ледзі сустрэча новага 1960 года - апошняга года, пасля якога знаёмыя Шышэяў пачалі раз`яджацца з Інты. Адзначыць гэтую падзею да іх прыйшлі больш за 50 чалавек. У той вечар гучала шмат песень, было шмат смеху, і ніхто не хацеў узгадваць пра тыя пакуты, якія кожнаму давялося нядаўна перажыць. У 1961 годзе Косця з Лёдзей ездзілі адпачываць на ўзбярэжжа Чорнага мора ў пасёлак Лоа. У час адпачынку ўдалося шмат дзе пабыць, у тым ліку на гары Ахун, дзе Косця купіў бутэльку ямайскага рому, паспрабавалі і грузінскай чачы. У тым жа годзе яны прадалі свой дом за 700 рублёў, бо больш ніхто не даваў. Вызваліўшыся з няволі і атрымаўшы дазвол на выезд з Поўначы, кожны імкнуўся скарыстацца такой магчымасцю. Таму на жыллё ў Інце не было попыту. З атрыманых 700 рублёў Косця па 200 рублёў аддаў Івану Мазго і Федзе Клімцу, якія дапамагалі яму будаваць дом і мелі ўжо свае кватэры ў горадзе. 100 рублёў Косця патраціў на “замочку” праданага дому, і 200 рублёў засталося сабе. Праўда, у час прадажы дома з новым гаспадаром дамовіліся, што ён дазволіць Косці і Лёдзі пажыць у доме да траўня наступнага года.

Звольніўся Косця і з працы. 10 лістапада 1961 года зноў паехаў у Вільню, а Лёдзя пакуль што заставалася ў Інце. У Вільні прыехаў да Зоі Коўш, якой яшчэ ў 1959 годзе даў аванс за будучае пражыванне. Але за гэты час Зоя ўзяла на кватэру ўжо новую маладую пару, у якой нарадзілася яшчэ і дзіцё, якое яна таксама прыпісала ў дом. І як вынік - Косці з Лёдзею, каб прыпісацца, стала ўжо не хапаць плошчы: на іх дваіх заставалася 24 метры і 75 квадратных сантыметраў, а патрэбна было не менш як 26 метраў. І таму ў Косці пачаліся новыя мытарствы. Для ўладкавання на працу ён пачаў шукаць прадпрыемства, кіраўніцтва якога дапамагло б яму і Лёдзі атрымаць прыпіску ў Вільні. Гэткім прадпрыемствам спачатку стаў завод сантэхнічнага абсталявання, дырэктар якога абяцаў дапамагчы з прыпіскай. Але ўжо праз пяць дзён паведаміў, што ён не можа нічога зрабіць. І Косці прыйшлося зноў пайсці ў

пошукі. Але, на жаль, у многім перашкаджаў у гэтым інцінскі пашпарт…

І вось, ходзячы па горадзе, Косця ўбачыў, што на беразе ракі стаіць вопытны завод валаконных вырабаў, які набірае рабочых. Косця зайшоў да дырэктара. На першы погляд кіраўнік завода паказаўся нейкім хмурым і непрыветлівым. Але ў размову з Косцем ён уступіў ахвотна, паглядзеў дакументы, задаў некалькі пытанняў, у тым ліку і пытанне наконт таго, чаму ён не можа ў Вільні прыпісацца. І ў рэшце рэшт дырэктар сказаў: “Калі ты зможаш пусціць у работу шліфавальна-фарбовачны станок, я табе дапамагу з прыпіскай.” А далей паглядзеў на Косцю і нечакана для апошняга з усмешкай сказаў: “Але ж ты не жартуй, што ў цябе для прыпіскі не хапае толькі 1 метр і 25 сантыметраў. Такога не можа быць. А калі гэта так, дык няма тут ніякай праблемы.” І адразу патэлефанаваў нейкаму палкоўніку, які на запытанне дырэктара адказаў, што ў нас, маўляў, вось гэткія цвёрдыя законы. Дырэктар здзівіўся, але размову з Косцем працягнуў. Пасля зноў кудысьці патэлефанаваў і ў рэшце рэшт сказаў: “Я вазьму цябе на працу, але ўсё з той жа ўмовай - пусціць ў работу названы станок.” Выклікаў тэхнолага і даў загад паказаць Шышэі станок.

Калі Косця падыйшоў да станка, дык убачыў, што ён увесь паразвінчаны. А ў той час і тэхнолаг паведаміў, што, маўляў, хто тут гэты станок ужо не наладжваў, нават прыязджалі з Масквы спецыялісты, і тыя не здолелі яго пусціць. Але Косцю ўсё гэта не палохала, і ён узяўся за справу. Праўда, пры гэтым папрасіў дырэктара дазволіць яму працаваць у другую змену, калі няма рабочых, бо апошнія прыходзілі і ўвесь час смяяліся, што, маўляў, знайшоўся “прафесар”, які хоча зрабіць тое, чаго нельга.

Дырэктар пагадзіўся з просьбай Шышэі, бо яму вельмі хацелася пусціць у работу станок. Да станка падвялі электрычны свет і далі Косці ключы, каб ён ні ад каго не залежаў.

Прайшоў тыдзень, але справы не рухаліся. Косцю ахапіла паніка, бо, як яму здавалася, ён зрабіў ужо ўсё, што мог, а станок па-ранейшаму не працаваў. У нядзелю ён паехаў да Мікалая Рулінскага, свайго знаёмага па Наваградскаму эскадрону і Дальвіцу. Жонка Мікалая Кіра Прохараўна паходзіла з Любчы, з вядомай у мястэчку сям`і Крупічаў. Косця расказаў

Мікалаю і Кіры аб сваёй бядзе. Дапамагчы чымсьці Косці Рулінскія не маглі. Таму паспачуваўшы знаёмаму чалавеку, Кіра параіла Косці купіць у Людвінаве, што непадалёку ад Вільні, палову дома. Гэткая прапанова Косцю некалькі падбадзёрыла.

А ў панядзелак, як і заўжды, Косця прыйшоў на працу ў другую змену. Зноў усё праверыў, паклаў на падлогу французкія чарцяжы станка, бо і сам гэты станок прывезлі са Швейцарыі. І так, у думках над чарцяжамі, ён прасядзеў амаль усю ноч. Некалькі разоў спрабаваў пусціць станок, але апошні па-ранейшаму не рухаўся. Таму Косця вырашыў нават не ісці дамоў, а адпачыць на месцы, пры гэтым чамусьці лёг не побач, а пад самім станком і закрыў вочы. Аднак Косцю сон не браў, усё новыя і новыя думкі забівалі галаву.

Паляжаўшы ў такім стане нейдзе больш гадзіны, Косця нечакана сам для сябе адкрыў вочы… і ўбачыў у ніжняй частцы станка нейкую шчыліну, якой да гэтага не заўважаў. Як вопытны токар, Косця зразумеў, што, калі ў станку ёсць такая шчыліна, значыць яна для нечага патрэбная, у ёй нешта было. Таму ён знайшоў якуюсьці бляшку і паспрабаваў усунуць у гэтую шчыліну, ад чаго валікі станка нібы зварухнуліся з месца. Косця ўсунуў бляшку ў наступны раз, і ўсё зноў паўтарылася, а разам з уздыргам валікаў у яго з`явілася якаясьці надзея на пуск станка. Таму Косця, яшчэ раз выняўшы са шчыліны бляшку, зачарніў яе дымам і стаў дапускаць памеры бляшкі да вялічыні шчыліны. Дапусціў, устанавіў бляшку на патрэбнае месца… і валікі закруціліся. Пасля гэтага Косця ўжо ўключыў рычагі станка і апошні стаў працаваць. Канешне, у Косці не было мяжы радасці. Ён, як веруючы чалавек, лічыць, што і на гэты раз яму дапамог Бог. Бо калі б не было так, дык, безумоўна, ён не стаў бы лажыцца адпачываць пад станком, а напэўна лёг бы побач з ім, а значыць і не прыкмеціў бы той шчыліны, з якой у час перавозкі станка на далёкую адлегласць, мабыць, вывалілася гэткая, ці крыху іншая бляшка, без якой станок не працаваў.

Ідучы дамоў на адпачынак, Косця ўвесь час быў узбуджаным і не пераставаў думаць аб тым, што некалькі хвілін назад здарылася. А крыху адпачыўшы, раніцай прыгожа апрануўся і пайшоў на працу. І калі прыйшоў у прыёмны пакой дырэктара, дык там усе здзівіліся, што гэта з Шышэям здарылася, чаму ён гэткі шчаслівы, што прыйшоў на працу не ў спецадзенні, а ў касцюме, нібы на кірмаш. А калі зайшоў у кабінет да дырэктара,

дык той таксама здзіўлена запытаў: “Што гэта з вамі?” І вось тут Косця даклаў дырэктару: “Мікалай Уладзіміравіч! Я сваё заданне выканаў.” Дырэктар яшчэ больш здзіўлена запытаў: “Што, пусціў станок?” На што Косця адказаў: “Так, станок працуе.” Пачуўшы ўпэўнены даклад Шышэі, дырэктар хутка выклікаў галоўнага інжынера Іёнаса Чапайціса і галоўнага тэхнолага Малышава. і, калі яны зайшлі ў кабінет, дырэктар ім паведаміў: “Шышэя пусціў у работу станок.” Адначасова дырэктар запрапанаваў усім неадкладна пайсці ў цэх і паглядзець. Прыйшоўшы ў цэх, Косця спачатку ўключыў святло, а пасля нажаў на рычагі станка: апошні стаў працаваць, як нібыта так і было раней. Галоўны інжынер ухапіўся за галаву і ўзбуджана стаў пытацца: “Як гэта табе ўдалося? Што ты яму зрабіў?”

Такім чынам, Косця не толькі знайшоў прычыну, па якой станок не працаваў, але, адрамантаваўшы яго, яшчэ і даклаў аб гэтым з эфектам, сапраўды неяк па-арлінаму. Ад гэтага дырэктар заводу Нумераў Мікалай Уладзіміравіч яшчэ больш зразумеў, што цяпер настала яго чарга выканаць сваё абавязацельства і дапамагчы Шышэі прыпісацца. Ды па-іншаму ён не мог і паступіць, бо не хацеў страціць адукаванага і кемлівага спецыяліста. Ён хутка звярнуўся да начальніка пашпартнага стала Віленскага гарадскога адзела міліцыі капітана Тацяскаса з адпаведнай просьбай, у якой указаў, што “Шышэя з`яўляецца высокакваліфікаваным спецыялістам, неабходным заводу для выканання работ на новай тэхніцы.” Прычым, як тады і было прынята, просьбу падпісалі, акрамя дырэктара, сакратар парткома і старшыня мясцовага прафсаюзнага камітэта.

Але, калі Косця паказаў просьбу кіраўніцтва завода разам з дамавой кнігай Зоі Коўш і іншымі неабходнымі для прыпіскі дакументамі Тацянскасу, апошні ўважліва ўсё пачытаў і катэгарычна адмовіў у просьбе, спаслаўшыся на тое, што Шышэі Кастусю патрэбна вяртацца ў Тракай, адкуль, згодна дакументаў, ён лічыўся родам, і там прыпісвацца і жыць.

А Косця да гэтага часу ўжо зноў заплаціў за кватэру Зоі наступны аванс, прывёз на зіму вугаль, дровы, таму нават з-за гэтага яму не прыходзілася мяняць месца жыхарства. Ды, калі казаць праўду, дык і ехаць у яго не было куды.

Аднак і ў дадзеным выпадку кожны кіраваўся сваімі

інтарэсамі: Косці патрэбна было прыпісацца ў Вільні, дырэктар завода не хацеў пазбавіцца высакаадукаванага токара, таму імкнуўся яму дапамагчы з прыпіскай, а задачай капітана Тацянскаса было паставіць заслону прыпіскам у Вільні людзей, прыехаўшых з-за межаў Літвы і не з`яўляўшыхся літоўцамі. Таму начальніка пашпартнага стала нельга было асуджаць - ён дзейнічаў як сумленны патрыёт свайго народа, каб апошні не мог растварыцца ў вялікім рускамоўным асяродзі. Тацянскас не толькі не прыпісаў Косцю ў дом Зоі Коўш, але і, мабыць, падказаў участковаму міліцыянеру, што ў яе жыве чалавек без прыпіскі. Бо, калі Косця толькі прыйшоў на кватэру і стаў секчы дровы, у двор Зоі Коўш зайшоў участковы і запытаў у Косці яго прозвішча і аб тым, што ён тут робіць. Шышэя зразумеў у чым справа і адказаў: "Чарняўскі. Гаспадыня папрасіла мяне дапамагчы пасекчы дровы, вось я і сяку." Думаецца, што міліцыянт таксама зразумеў, што гэта быў той самы Шышэя, з якім ён жадаў пабачыцца, але заранёў не хацеў падымаць гвалт. Таму ён яшчэ звярнуўся да гаспадыні і запытаў у яе, ці жыве ў гэтым доме Шышэя. На што Зоя адказала, што рэчы яго ляжаць у яе доме, але, маўляў, самога яго няма - нейдзе на працы. Пасля гэтага ўчастковы загадаў: "Калі кватэрант з`явіцца, перадайце яму, каб прыйшоў на участак." Гаспадыня паабяцала выканаць загад участковага.

Справа ў тым, што ўсе разумелі тыя жорсткія правілы прыпіскі і адказнасць за пражыванне без яе, якія ў тую пару існавалі. І жартаваць з гэтым можна было толькі да пэўнай мяжы. Калі выкрывалася, што нехта жыве ў Вільні без прыпіскі, яго на першы раз садзілі ў машыну, вывозілі на соты кіламетр ад горада і выпускалі на ўсе чатыры бакі; на другі раз маглі нават пасадзіць у турму за парушэнне пашпартнага рэжыму. І Косця аб гэтым ведаў, а таму вырашыў зноў ісці да дырэктара за дапамогай. Дырэктар, выслухаўшы Шышэю, сказаў: "Гэты капітан - малая асоба каб нешта вырашыць. А начальнік гарадской міліцыі пакуль што ў адпачынку і патрэбна яе дачакацца. Пасля нейкую хвіліну падумаў, што ў такім выпадку рабіць, і далей сказаў: "На табе ад бібліятэкі ключ, пастаў там дыван і пакантуйся на ім некалькі ночаў, пакуль з адпачынку вернецца начальнік. Ды глядзі - нікога туды не пускай, нават калі і будуць ламаць дзверы. А днём наглядай за вакном кабінета начальніка міліцыі, і, як толькі там убачыш жанчыну ў

міліцэйскай форме, адразу мне паведаміш. Я думаю, што мы з ею знойдзем агульную мову.”

Косці нічога не заставалася рабіць, як пагаджацца, хаця ён і разумеў, што так доўга працягвацца не можа. Таму думкі з галавы ў яго не выходзілі, як далей жыць. Спадзяванне было толькі на таго паўдома, аб якім яму казала жонку Рулінскага. І ён вырашыў зноў з`ездзіць да былога сябра, тым больш, што Кіра абяцала высветліць кошт таго паўдома, што прадаецца. Дачакаўшыся нядзелі, ён так і зрабіў - паехаў да Рулінскіх, якія самі жылі таксама не ў Вільні, а ў Тракайскім раёне. У Рулінскіх Косця даведаўся, што кошт той паловы дома складае 1,5 тысячы рублёў. У гэтай сувязі ён зноў павесялеў і вырашыў хутчэй дзейнічаць, пакуль яшчэ ніхто не купіў дома ў Людвінаве.

У панядзелак са сваёй прапановай Косця зайшоў да дырэктара завода. Але дырэктар быў упэўнены, што ён зможа, як і абяцаў, дапамагчы Шышэі, а таму сказаў: “Ты не кідайся ва ўсе бакі. Вёска - гэта не горад, а тым больш сталічны. Тут табе і гарачая вада, і цёплая прыбіральня, і ванна, а там, у сельскім доме, нічога гэтага няма. Ды і на працу тут ужо ўладкаваўся. Так што пачакай, не на вуліцы ж пад дажджом стаіш.”

Такім чынам, зноў прыходзілася чакаць: начаваць усё ў той жа бібліятэцы на дыване, а пасля працы непрыкметна выходзіць, садзіцца на лаўку і гадзінамі глядзець на вакно, пакуль там не пакажацца жанчына ў міліцэйскай форме… І вось, калі Косця аднойчы выйшаў за прахадную завода, да яго падыйшлі два незнаёмых чалавекі, адзін з якіх назваў Кастуся па імі і імі па бацьку, а пасля папрасіў на хвілінку затрымацца. Косця зразумеў, што гэта за людзі, і адразу запытаў: “Вы з КДБ?” На што закрануўшы яго адказаў таксама пытаннем: “Чаму?” І тут Косця патлумачыў: “А больш мяне так ніхто не заве.” Зразумеўшы, што маюць справу з вопытным у адносінах з работнікамі спецорганаў чалавекам, усё той жа незнаёмы адказаў: “Так.” А далей запрапанаваў пагаварыць. У гэты момант пад`ехала і машына. Але Косця сказаў: “Я працую. Выйшаў з завода, каб паабедаць.” На што работнік КДБ патлумачыў: “Разумею,” - і запрапанваў сесці ў машыну.

Праз некалькі хвілін машына заехала ў двор, дзе стаяў вялікі дом, у адзін з пакояў якога, што знаходзіўся на другім паверсе і заклікалі Косцю. Размову з ім працягнуў маладзейшы супрацоўнік КДБ, які меў званне маёра. А старэйшы не стаў

мяшаць размове і таму выйшаў з пакоя. Для Косці прынеслі два бутэрброды і шклянку чаю. Размова пачалася з таго, што маёр КДБ узгадаў Шышэі аб тым, што цяпер ён, маўляў, не толькі грамадзянін СССР, але і жыхар сталічнага горада, а пасля запрапанаваў супрацоўнічаць з органамі. На што Косця адказаў, што ён яшчэ нават не прыпісаны ў Вільні. Але, як і трэба было чакаць, маёр КДБ сказаў, што ўсё гэта чэпуха і паабяцаў дапамагчы ўладкаваць пытанне, канешне, пры ўмове, што Косця пагадзіцца на супрацоўніцтва і падпіша адпаведную паперу.

Будучы ўжо бітым вераб`ём, Косця адразу знайшоў, што адказаць, відаць, яшчэ не зусім вопытнаму, а хутчэй за ўсё нахабнаму кэдэбісту. У прыватнасці, ён сказаў: “Вы што, мяне вярбуеце працаваць у КДБ? Дык тады ж не так трэба рабіць. Навошта ж мне працаваць токарам. Дайце мне пашпарт, браўнінг,дазвольце выязджаць, калі патрэбна, за мяжу, скажам, да маці, да брата, да сястры.” Пасля такога роспаведу Косці, стаў разумець і маёр, куды хіліць справу агітуемы ім для супрацоўніцтва з органамі КДБ. Таму, перахапіўшы ў размове ініцыятыву, маёр сказаў: “Ну ты так далёка не замахвайся. Мы ведаем, чаго ты хочаш паехаць за мяжу - каб там застацца. Але над нашай прапановай ты падумай.” На тым і развіталіся.

Пасля адбыўшайся размовы Косця яшчэ больш зразумеў, што ў яго застаецца надзея толькі на завод, прычым, калі з прыпіскай справа зацягнецца, дык у яе могуць умяшацца работнікі КДБ і паставіць пытанне аб яго супрацоўніцтве з імі больш востра, на што ён ні пры якіх умовах не мог пагадзіцца.

І вось праз дзень ці два пасля размовы з супрацоўнікамі КДБ у тым вакне, на якое яму паказаў Нумераў і за якім ён наглядаў з вялікай надзеяй, Косця ўбачыў жанчыну з маёрскімі пагонамі. Ён абрадаваўся і хутка даклаў аб убачаным дырэктару. Мікалай Уладзіміравіч таксама не стаў адкладаць справу на заўтрашні дзень, а адразу патэлефанаваў маёру міліцыі. Назваўшы яе Кацярынай Мікалаеўнай, ён ветліва прывітаўся, павіншаваў жанчыну з выхадам пасля адпачынку на працу, а пасля гэтага расказаў ёй аб сваей просьбе. Маёр міліцыі, у сваю чаргу, запытала Нумерава, адкуль ён так хутка даведаўся аб яе вяртанні і паабяцала прыняць яго падапечнага. Пасля гэтага дырэктар напісаў новую просьбу прыкладна такога ж зместу, што і пісаў капітану, і адправіў Косцю ў міліцыю. Іхаця гэта быў

аўторак - дзень не прыёмны, але начальнік міліцыі Шышэю прыняла і забрала яго дакументы, пры гэтым сказаўшы, што яго справу будзе вырашаць камісія, у склад якой акрамя яе ўваходзяць яшчэ шэсць чалавек. Паседжанні камісіі праходзілі па чацвяргам, а таму маёр параіла Косці прыйсці за вынікам у панядзелак. Праўда, у наступны чацвер паседжанне камісіі не адбылося і таму Косці прыйшлося чакаць яшчэ аднаго панядзелка.

А калі ён прыйшоў у міліцыю і зайшоў у кабінет начальніка, там сядзеў капітан Тацянскас, які, убачыўшы Шышэю, запытаў: “А вы чаго тут ходзіце?” На што Шышэя адказаў, што прыйшоў за рашэннем камісіі. Тацянскас стаў глядзець дакументы, якія ляжалі на стале начальніка міліцыі. Косця ўбачыў там і свае, на якіх чырвоным чарнілам было напісана: “Прыпісаць.” А ніжэй стаяў подпіс старшыні гарвыканкома Вільні. Безумоўна, што пры гэтым Тацянскас адчуў сябе няёмка, але зрабіць штосьці іншае ён ужо не мог. Таму паставіў на дакументах яшчэ і сваю рэзалюцыю і накіраваў Шышэю ў раённы адзел міліцыі. 12 ліпеня 1963 года стала тым шчаслівым днём, калі Косцю прыпісалі ў дом Зоі Коўш, і ён сапраўды стаў жыхаром сталічнага горада. Дарэчы, будучы муж Зоі Кратовіч у той час працягваў яшчэ заставацца ў Інце.

* * *

Аднак Косця яшчэ не паспеў як след парадавацца таму, што настаў канец яго мытарствам з прыпіскай, як яго напаткала новая бяда - у вока папаў маленькі кавалачак мятала. Гэта здарылася ў пятніцу. Спачатку вока рэзала, але бачыла. Таму Косця не прыдаў здарыўшымуся ўвагі і не пайшоў да ўрача-акуліста.

Праз два выхадных дні вока зчырванела і запухла. Больш таго, пачало балець і другое вока. І калі ён паказаў свае вочы ўрачу, дык на першых парах яна не пазнала сапраўднай прычыны здарыўшагася - ёй падалося, што Косці нейдзе надула ў вочы ветрам, і таму ў яго звычайнае запаленне, якое хутка пройдзе. Але на заўтрашні дзень Косці яшчэ пагоршыла - перастала бачыць і другое вока. Таму ён зноў пайшоў да ўрача, якая на гэты раз стала ўжо разумець, што з вокам здарылася нешта больш сур`ёзнае і сабрала кансіліўм урачоў-акулістаў. У час паўторнага абследвання ў вацы знайшлі

кавалачак мятала. Косцю паклалі ў бальніцу і праз некалькі часу мятал дасталі магнітам, пасля чаго яму прыйшлося паляжаць у бальніцы яшчэ пяць дзён з завязанымі вачыма. Але, дзякаваць Богу, усё абыйшлося добра; праз два тыдні Косцю выпісалі дамоў, хаця вока бачыла яшчэ дрэнна.

Косця выйшаў на працу, бо трэба было неяк жыць. Падыйшоў да станка, а працаваць не мог. У гэты час нечакана для яго побач аказаўся той самы маёр КДБ і прывітаўшыся з Косцем хацеў працягнуць сваю агітацыю. Ад такіх нахабных паводзінаў кэдэбіста Косцю ахапіла злосць і ён на ўсю моц закрычаў: “Адкуль у вас столькі нянавісці да людзей? Ты чаго да мяне сляпога прыстаеш, злавесная ты цень?” Маёр зразумеў, што жарты будуць дрэнныя, таму, у сваю чаргу, крыкнуў: “Ціха!” Але Косця ўжо паспеў схапіць ляжачую побач жалязяку і, каб маёр не паспеў схавацца за дзверы, уваліў бы ею яму па спіне, а можа і па галаве. А так жалязяка ўдарылася ў вушак. Маёр як толькі мог уцёк з тэрыторыі завода, а Косця сеў каля станка і пачаў плакаць. У гэты час да яго падыйшлі іншыя рабочыя і сталі пытаць: у чым справа? А праз нейкую гадзіну ў цэх прыйшоў пасыльны дырэктара і паклікаў Шышэю ў кабінет

Калі Косця увайшоў у кабінет дырэктара, апошні запытаў: “Што там здарылася?” На што Косця адказаў: “Сарваўся я, Мікалай Уладзіміравіч, не вытрымаў. Ён прыстае да мяне, каб я супрацоўнічаў з КДБ, а мне свет нямілы. Я амаль нічога не бачу.” Пасля зноў загаварыў дырэктар і, звярнуўшыся да Шышэі, запытаў: “Кажуць, ты яго хацеў забіць?” Ведаючы прыстойнасць дырэктара Шышэя і на гэты раз быў з ім адкрыты. “Шкада, што не забіў гэткую шэльму”, - сказаў Косця. А далей пацікавіўся, адкуль аб гэтым ведае дырэктар. На што апошні адказаў: “Дык аб гэтым ужо гаворыць увесь завод.” А пасля, перайшоўшы на звычайны тон размовы, хоць зрабіць яму гэта было нялёгка, Косця паскардзіўся дырэктару, што ён перастаў бачыць і не можа працаваць на такарным станку. Але дырэктар яшчэ раз вярнуўся да здарыўшагася і сказаў: “Ты зра пагарачыўся. Ты ж іх ведаеш. Калі б ты нават аднаго і забіў, дык іх жа шмат.” Шышэя таксама не мог ніяк супакоіцца, увесь дрыжэў. “Што адбылося, тое і адбылося”, - сказаў ён у адказ дырэктару. Пачуўшы заклапочаны голас Шышэі, якога ён прывык бачыць заўжды ўпэўненым у сабе і спакойным, дырэктар яшчэ раз уважліва глянуў на Косцю і сказаў: “Вазьмі

памыйся, выпі шклянку гарэлкі, ды ідзі пахадзі дзе-небудзь у парку, адпачні, а заўтра прыходзь на працу. Я цябе звальняць не буду, нешта ж будзем рабіць. А можа навогул схадзі да доктара, ды папрасі яшчэ на дзён тры бюлетэнь. А калі гэтыя, якіх ты хацеў на аднаго паменшыць, штосьці будуць пытаць, дык я, канешне, скажу, што ты патрэбны нам на заводзе.”

Аднак супрацоўнікі КДБ маўчалі, нібы яны кудысьці праваліліся, нават Немераў здзівіўся. А праз месяц у Кастуся адкрыліся і адно і дрыгое вочы. Прайшло паўгода і са зрокам навогул стала амаль усё нармальна, праўда, пакалечанае вока ўсё ж такі на 25 працэнтаў стала недабачваць. Але гэта ўжо была не бяда, бо можна было працаваць, што ён і працягваў рабіць на ўніверсальным такарным станку. А тым часам у 1963 годзе ён уступіў у кааператыў па будаўніцтву кватэры. Праз год дом пабудавалі і 13 травеня 1964 года Косця пайшоў у пашпартны стол, каб падаць дакументы на прыпіску ўжо ў сваю кватэру. Праўда, і тут без асобай цікавасці да Косцінай асобы з боку органаў не абыйшлося. Праверыўшы паданыя на прыпіску паперы, Шышэю выклікалі ў пашпартны стол, пры гэтым назвалі чагосьці нумар шостага кабінета, які ўжо не належыў да званай установы, хаця і быў побач з ею. І калі туды Шышэя зайшоў, там сядзела тры міліцыянты, у тым ліку адзін палкоўнік, які адразу ўстаў і прывітаўся з Косцем, сказаўшы пры гэтым: “Канстанцін Іванавіч! Здароў, галубчык!” На што Шышэя адказаў: “Добры дзень, грамадзянін начальнік!” Безумоўна, што палкоўнік адрэагаваў на такі яго зварот пытаннем: “А чаму грамадзянін?” І далей запрасіў Шышэю сесці і паразмаўляць. Дарэчы, уся размова зводзілася да высвятлення пытання аб тым, як гэта магло здарыцца, што Шышэя, будучы з 1922 года нараджэння, не служыў у войску. Пры гэтым палкоўнік папярэдзіў Косцю, што гэты допыт ніякага дачынення да яго прыпіскі ў сваю кааператыўную кватэру не мае, ён будзе прыпісаны. Але, маўляў, яны хацелі бы для цікавасці ўсё ж такі высветліць вось гэтае пытанне - з яго неабучанасцю вайсковай справе.

Адказваючы на пастаўленае пытанне, Косця перш за ўсё адзначыў, што ён усё жыццё думаў і ўсё рабіў, каб не ісці ў войска, якое займаецца забойствам людзей. Але палкоўнік стаў пасля гэтага тлумачыць аб тым, што ёсць жа войны і вызваленчыя, справядлівыя. На што Шышэя адказаў: “Вось аб

гэтым я і хачу выказаць вам сваю думку. Я нарадзіўся пры Польшчы, кіраўніком якой у тыя гады быў Юзаф Пільсудскі. І я памятаю, што яго фатаграфавалі заўжды з дзіцём на руках. Паказваючы на гэтую фатакартку, настаўніца гаварыла нам у школе, што маршал Пільсудскі вызваліў свой народ ад расійскага царызма. Але, калі мне было 17 гадоў, у Заходнюю Беларусь, як і ў Заходнюю Ўкраіну, прыйшлі саветы, і з`явілася карціна, на якой ужо быў Юсіф Сталін, прычым таксама на руках з дзіцём, якое трымала ў руках кветкі. І яго сталі называць вызвольнікам народа Заходняй Беларусі ад польскага іга. Не прайшло і два гады і прыйшлі немцы. Паявіўся партрэт Адольфа Гітлера, які зноў такі трымаў на руках дзіцё. Пад партрэтам было напісана, што Гітлер - вызвольнік ад юда-бальшавізму. Праз тры гады зноў прыходзяць бальшавікі, і на сценах з`явілася тая ж карціна, на якой намаляваны Сталін з дзіцём на руках. Дарэчы, усе яны трымалі на руках чамусьці дзяўчынак, і кожны з іх хацеў, каб менавіта яму паверылі, што ён вызвольнік. Дык вось, я не веру ім ніводнаму, а таго, каму я паверыў бы, пакуль што няма. Таму, каб выжыць, я бяру прыклад з жыцця бабра, які робіць сабе лежбішча каля самай вады, або і навогул над ею, і, калі над ім навісае пагроза, ён знікае ў вадзе. Але саветы пачалі шукаць з дапамогай сабак усіх гэтых бброў, якія ад іх хаваліся. І вось, каб неяк заблытаць сабаку, мы пасыпалі свае лежбішчы вакол тутунём, якога ў Беларусі ў тыя гады хапала."

Міліцыянты ўважліва слухалі роспавед Шышэі, а калі ён скончыў, адзін запытаў: "Дык, значыць, ты не адзін хаваўся?" Шышэя адказаў, што, канешне, не адзін. Тады палкоўнік дастаў запісную кнігу, дзе былі перапісаны ўсе былыя зняволеныя, але Шышэі ў гэтых спісах не было, чаму міліцыянты зноў здзівіліся, яны запыталі ў Косці і аб гэтым, на што ён адказаў: "Не ведаю." На тым размова была скончана. У гэты дзень Шышэю Кастуся прыпісалі ў сваю кватэру, што яго яшчэ больш узрадавала, чым тады, калі яго прыпісалі ў дом Зоі Коўш. Гэта была ўжо не проста кватэра, а ўласная, заробленая сваім мазалём.

Не было пытання ў Косці і на працы аж да 1968 года, калі ён захварэў на стэнакардыю. Ды гэта і не дзіва. Усё тое, што гадамі кіпела ўнутры ад няспраўядлівасці і крыўды, якія прыйшлося перажыць Косці, стала выходзіць на паверхню і даваць аб сабе ведаць. Ён не мог нават даехаць тралейбусам да працы -

задыхаўся. І калі пайшоў да ўрача, той параіў знайсці бліжэй працу, каб не перанапрагаць у час язды сэрца. Але ўсё гэта зрабіць было няпроста - у той час Косця яшчэ не разлічыўся з крэдытам, які браў на кааператыўную кватэру. Аднак сэрца гэтага не разумела, яно патрабавала зменшыць на яго нагрузку. Таму Косця пачаў шукаць іншай працы. З гэтай мэтай зайшоў у самую блізкую ад кватэры ўстанову - кінастудыю, дзе, як высветлілася, быў патрэбен гэткі спецыяліст. Але галоўны інжынер Батунер задаў Шышэі пытанне: “А чаму вы прыйшлі сюды? Вы ж ведаеце, што наша ўстанова адносіцца да Міністэрства культуры, таму ў нас вельмі маленькія заробкі.” І тут Косця вырашыў не хлусіць, а расказаць усю праўду. “У мяне бяда, - паведаў ён галоўнаму інжынеру. - Я хворы: у мяне стэнакардыя. Таму мне нельга ездзіць на транспарце. А я тут блізка жыву, таму прашу вас, вазьміце мяне на працу. Я буду старацца. Але, калі мне стане на працы дрэнна, я вас буду прасіць адпускаць мяне дамоў адпачыць. Пасля гэты час я адпрацую ў другі раз.” Уважліва выслухаўшы Косцю, Батунер сказаў: “Я вам веру. Прыносьце свае дакументы. Ваш месячны заробак будзе складаць 162 рублі, больш даць мы не можам.”

Канешне, той заробак, які яму назваў галоўны інжынер кінастудыі, складаў толькі палову ад таго, які Косця меў на заводзе. Але іншага выйсця, чым перамяніць працу і знайсці гэткую, якая была бы значна бліжэй да кватэры, у яго не было. Справа ішла аб здароўі, да якога, пакуль яно ёсць, людзі адносяцца не заўжды з пашанай, але, калі яно пачынае пагаршацца, хапаюцца за ўсё, каб яго захаваць. Праўда, у дадзеным выпадку нельга сказаць, што Косця яго прапіў і марна страціў; ён паклаў яго, як ахвяру, на алтар незалежнасці Бацькаўшчыны. Аднак гэта не рабіла яго здаравейшым. Таму ён забраў з завода дакументы і здаў іх у адзел кадраў кінастудыі, дзе і працаваў да 1974 года, пакуль не адчуў сябе крыху лепш.

У названым годзе Косця перайшоў на працу ў інстытут электраграфіі, дзе, дарэчы, у той час працаваў і Леванід Кароль, з якім Косця ўжо быў знаёмы, але які не меў ніякага дачынення ні да ўладкавання Шышэі на працу, ні да яго звальнення. А звольніўся адтуль ён вельмі хутка, бо знайшоў для сябе яшчэ больш аплачваемую працу - на вайсковым заводзе магнітных запісаў. Аднак у 1976 годзе Шышэі прыйшлося пакінуць працу і на гэтым месцы. Справа ў тым, што ў тым годзе ў Маскву

прыехаў яго знаёмы, які жыў і працаваў у Канадзе. Знаёмы запрасіў Косцю прыехаць у Маскву, каб пабачыцца. Але ж для гэтага патрэбна было ўзяць на некалькі дзён вотпуск. І калі Шышэя аб гэтым сказаў у адзеле кадраў, там навогул атарапелі - як гэта магло здарыцца, што на іх вайсковым заводзе працуе чалавек, які падтрымлівае адносіны з канадыйскім грамадзянінам? Косця таксама вырашыў звольніцца з названага завода і паспрабаваць паехаць у Маскву. Але з яго намаганняў нічога не атрымалася. Справу з выездам у Маскву так забюракратылі, што канадыец вымушаны быў ад`ехаць з СССР, так і не дачакаўшыся прыезду Шышэі. Пасля гэтага Косця стаў працаваць у тралейбусным дэпо, адкуль і выйшаў у 1997 годзе на пенсію.

Што тычыцца Лёдзі, дык у сакавіку 1962 года яна пайшла ў дэкрэтны вотнуск і паехала да сваіх бацькоў, дзе і нарадзіла ў чэрвені таго ж года дачушку, якую назвалі Ліляй. У траўні 1963 года яна з`ездзіла ў Інту для зняцця судзімасці і звальнення з працы. На пастаяннае месца жыхарства ў Вільню яна прыехала аж у 1964 годзе. На працу ўладкавалася ў лістападзе 1965 года на заводзе электраканструкцый і адначасова пайшла ў дзевяты клас вячэрняй школы, каб, замест знішчанага органамі КДБ, атрымаць атэстат сталасці. А калі атрымала, дык адразу паступіла на вячэрнее адзяленне фінансава-крэдытнага тэхнікума, які скончыла ў 1973 годзе. Атрымаўшы дыплом эканаміста-фінасіста стала працаваць у сістэме ЦСУ, адкуль у 1985 годзе выйшла на пенсію.

13 кастрычніка 1975 года рашэннем Вярхоўнага суда Беларускай ССР быў адменены прысуд ваеннага трыбунала і спынена ў адносінах да Лёдзі з-за адсутнасці ўлік злачынства крымінальная справа. Пасля гэтага застаецца толькі запытаць: чаму да гэтага часу ў Беларусі не ўзбуджана крымінальная справа супраць тых, з-за каго Лёдзя і тысячы ёй падобных гадамі дарма пакутвалі, а многія і навогул былі застрэлены. Хочацца спадзявацца і верыць, што прыйдзе час, калі ў Беларусі будзе асуджана і камуністычная партыя Савецкага Саюза, уключна з яе філіяй у Беларусі - КПБ, у тым, што, як сказана ў Абвінаваўчым заключэнні Генеральнага пракурора Рэспублікі беларусь Рыгора Пракаповіча на паседжанні Вільнюскага міжнароднага грамадскага трыбунала ў тым, што стварыўшы класавую, антысавецкую і антыгуманную ідэалогію і

давёўшы яе да злачыннай накіраванасці, узначаліўшы дзяржаву і ўрад здзейсніла супраць Беларусі і яе народа наступныя злачынствы:

- знішчыла больш 1,5 мільёнаў беларусаў па прыкмеце іх маёмаснага стану і антыкамуністычных перакананняў;
- рэпрэсавала ўсе іншыя палітычныя партыі ў Беларусі;
- ліквідавала больш паловы святароў рымска-каталіцкай, праваслаўнай і іншых канфесій, зачыніла амаль усе касцёлы і сінагогі, часткова праваслаўныя храмы, у буйных памерах канфіскавала і разрабавала царкоўную маёмасць, г.зн. злачынствы, прадугледжаныя п."в" арт.6 Статуту МВТ (злачынствы супраць чалавечнасці);
- рэпрасавала і знішчыла да 90% інтэлектуальнага патэнцыялу нацыі, г.зн. - у злачынствах, прадугледжаных п."а" арт.2 Канвенцыі аб папярэджанні злачынстваў генацыду і пакарання за яго (ад 9.12.1988г.);
- дэпартавала на аснове палітычных, рэлігійных і сацыяльных прыкмет з тэрыторыі Беларусі сотні тысячаў беларусаў і, падрываючы этнічны склад нацыі, пасяліла на Беларусі тысячы рускіх, г.зн. - у злачынствах, прадугледжаных п."с" арт.2 названай Канвенцыі аб генацыдзе;
- падарваўшы інтэлектуальны патэнцыял Беларусі, выцесніла беларускую мову і прымусова навязала рускую, чым адрывала наступныя пакаленні ад духоўнай культуры продкаў, г.зн. - здзейсніла злачынствы этнацыду;
- стварыла рэпрэсіўную структуру, якая ў маштабах усёй Беларусі шырока прымяняла жорсткія здзекі і гэтым падвяргала нацыю да непапраўнага маральнага і псіхічнага ўрону, г.зн. - у злачынствах, прадугледжаных Канвенцыяй супраць здзекаў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў адносін, ці пакарання ад 10.12.1984 г.;
- ператварыла працу грамадзян Беларусі ў прымусовы стан, чым парушыла Канвенцыю №29 "Аб прымусовай ці абавязковай працы" ад 28.06.1930 г..

* * *

Пераехаўшы на пастаяннае жыхарства ў Вільню, Шышэя адразу пачаў шукаць тут знаёмых беларусаў. Гэткімі спачатку сталі Косціны знаёмыя па Дальвіцу - Мікалай Рулінскі з жонкай і

сын Зоські Верас - Шантар Антон. Апошні запрасіў Шышэяў да сябе ў госці, дзе яны пазнаёміліся не толькі з яго маці - вядомай беларускай паэткай, але і са знакамітым беларускім мастаком, Заслужаным дзеячом мастацтва Літвы Пятром Сяргеевічам і яго прыгожай жонкай Станіславай. Жывапісныя партрэты Сяргеевіча “Беларуская настаўніца”, “Партрэт маці”, “Дзяўчына ў сінім сарафане”, пісьменніка Францішка Багушэвіча, “Селянін”, “Нарачанскі рыбак” і іншыя вылучаюцца глыбокім псіхалагізмам і філасофскім сэнсам. А такія карціны мастака як “Усяслаў Полацкі”, “Каліноўскі і Ўрублеўскі на аглядзе паўстанцаў”, “Скарына ў друкарні”, “Скарына ў рабочым кабінеце”, “Арышт П.Багрыма” адлюстроўваюць нашу гісторыю.

Шышэі хутка сышліся і сталі сябраваць сем`ямі з Леванідам Каралём і яго жонкай Зінаідай Аляксееўнай. Іх прыгожыя галасы і вялікая цяга да песні сталі чымсьці неад`емным у дружных сяброўскіх кампаніях, якія сабіраліся ў тыя гады ў Вільні. Неўзабаве да іх кампаніі далучыліся Лявон і Юрка Луцкевічы. Першы стаў зяцем Зоські Верас, ажаніўшыся на яе дачцы Галіне Войцік. Калі-нікалі да гэтай кампаніі далучаўся і паэт Андрэй Чэмер (сапраўднае імя і прозвішча Аляксей Анішчык). І, вядома, Шышэі заўжды заставаліся ўдзячны за прыют і ўвесь час сябравалі з Зоей Коўш і яе мужам Кратовічам.

У 1965 годзе ў госці да Шышэяў прыязджаў Глеб Багдановіч, якога пасля дэсантавання з парашута затрымалі на тэрыторыі Польшчы і асудзілі на поўныя 25 гадоў зняволення. Пакаранне Глеб адбываў у Варкуце, а пасля вызвалення пасяліўся ў Рудзенску, што недалёка ад Менска. У Рудзенску ён працаваў тэрапеўтам, хоць меў прафесію хірурга. Справа ў тым, што, калі ў зняволенні ён працаваў у лагернай бальніцы, дык адзін з вязняў, каб не хадзіць на працу, хацеў увесь час лічыцца ў бальніцы. Зразумела, што ўрач Багдановіч не мог задаволіць гэткіх пажаданняў вязня. Тады апошні параніў нажом Багдановічу руку, пасля чаго ўрач ужо не змог працаваць хірургам.

Усё сваё наступнае жыццё Косця захоўваў у сваіх думках і вобраз вядомага беларускага фальклярыста і музыказнаўцы, кампазітара і дырыжора Паўла Карузы, з якім Шышэям таксама пашчасціла спаткацца і пазнаёміцца ў Вільні. У Паўла Восіпавіча, як і ў іншых беларускіх патрыётаў тых часоў, лёс склаўся вельмі трагічна - амаль 20 гадоў ён правёў у савецкіх

турмах і высылках. Музычная творчасць Карузы адметна тым, што яна разлічана галоўным чынам на аматарскія калектывы. Таму яго музычная мова простая, а самі творы невялікія па памерах, але ў іх адчуваецца душа народа. “Мне важна, - пісаў аб сваёй творчасці Павел Восіпавіч, - каб наша такая адметная архаіка магла выконвацца не толькі ў выглядзе дыямента ў сырым выглядзе фальклорнымі калектывамі, але і ў мастацкай аправе, толькі такой, якая не схавае за аправай самую сутнасць… песні. Пры гэтым у роднай вопратцы, а не пазычанай.” У рэшце рэшт Паўла Карузу, як і многіх іншых рэабілітавалі. Таму зноў такі ўзнікае пытанне - чаму на волі тыя, хто яго прымусіў задарма пакутаваць?

Будучы ў Вільні, Шышэі давялося яшчэ раз пераажыць бесчалавечнасць савецкай бюракратыі і тых жа спецслужбаў. У 1972 годзе ў Англіі памерла яго мама, аб чым яму паведамілі тэлеграмай. Натуральна, што ён вельмі імкнуўся паехаць на пахаванне маці, з якой разлучыўся летам 1944 года ў Наваградку. Але куды Косця не звяртаўся, ва ўсіх інстанцыях яго накіроўвалі ў другую… і так справа дайшла аж да Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР. А калі ён звярнуўся і туды, дык там адказалі, што за дазволам на выезд у Англію на пахаванне маці трэба звяртацца ў Вярхоўны Савет СССР. Безумоўна, што ўсё на тым і скончылася, бо пакуль Косця даехаў бы да Масквы, дык ужо безсэнсоўна было бы ляцець у Англію. Праз тры гады пасля смерці маці там, у Англіі, памерла і сястра Косці Ганна, а ў 2000 годзе не стала і барата Сашы, які апошнія гады жыў у ЗША. Дарэчы, ні Саша, ні Ганна не мелі сем`яў. Мабыць, на прыкладзе іх лёсаў і праявіўся закон прыроды птушак, якія ў чужых краінах не размнажаюцца.

А тым часам кола знаёмых беларусаў-віленчукоў у Шышэяў пашыралася. І каб неяк яшчэ больш прыцягнуць да сябе ўвагу і пабачыцца са сваімі знаёмымі, у тым ліку і тымі, што жылі ў Беларусі, Шышэі вырашылі шырока адзначыць у 1982 годзе Косцін дзень нараджэння, тым больш, што яму спаўнялася 60 гадоў. Трэба сказаць, што задумка ўдалася: з Полацка прыехаў Кажан Сяргей, з Наваградка - Усюкевіч Жэня, з Баранавіч - Дудка Іван і Рашэтнік Пятро, прычым, усе прыехалі з жонкамі. Сабраліся і віленчукі з жонкамі: Рулінскі Мікалай, Шантар Антон, Кароль Леванід, Юрка і Лявон Луцкевічы, Зоя Коўш з Кратовічам Аляксандрам. Павіншаваць Косцю з 60-годдзем прыйшоў і брат

Глеба Багдановіча - Алег з жонкай, які жыў і працаваў у Вільні. Такім чынам, гасцей сабралася на чатыры сталы. І можна сабе толькі ўявіць, якія ўсе былі шчаслівыя і ўдзячныя Лёдзі і Косці за створаную магчымасць усім сабрацца, выпіць чарку, ды заспяваць свае любімыя беларускія песні. І тут таксама асабліва вылучаліся сваімі галасамі Зіна і Леванід Каралі, якія заўжды з вялікай ахвотаю самі ішлі ў госці і любілі прымаць гасцей у сябе дома. Не адставаў ад сямейнай пары Каралёў і сам імяніннік. На развітанне ён заспяваў адну са сваіх самых любімых песень, аўтарам слоў і музыкі якой з`яўляецца Сяргей Новік-Пяюн, - “Зорачкі”.

Праз некаторы час Косця з Лёдзяю зноў з`ездзілі і на Слонімшчыну, і на Наваградчыну, дзе пастараліся наведаць не толькі сваякоў, але і сваіх знаёмых, напрыклад, таго ж Пятра Путрыча. І як было крыўдна бачыць, што некалі знешне прыгожы, адукаваны, ініцыятыўны, заўжды жыццярадасны і вясёлы чалавек быў настолькі скалечаным савецкай уладай, што пры спатканні з Шышэямі, толькі цытаваў Біблію і больш не жадаў ні пра што размаўляць. Пашукалі Шышэі і Міснікевіча Жэню, які ў свой час працаваў сакратаром воласці, але, на жаль, не знайшлі.

З`ездзілі Косця з Лёдзей і ў Зельву наведаць Ларысу Геніюш, якую яны па-ранейшаму паважалі, як аднаго з самых дарагіх у сваім жыцці чалавека, ды як і сваццю, якая іх пазнаёміла. У той час паэтка жыла ўжо адна, бо мужык памёр. Таму была рада ўдвайне пабачыць таксама блізкіх ёй людзей, якія там, на далёкай Поўначы, падзялялі з ею адну бяду, што прынёс беларускаму народу крывавы сталінскі рэжым.

І вось прыйшоў 1989 год. Стала бачна, што савецкая імперыя хутка разваліцца.Людзі жылі надзеямі і чаканнямі перамен. Стаў адраджацца беларускі нацыянальны рух. Зямляк, былы камандзір і сябра Косці Уладзімір Сіўко ў тыя дні ў сваім вершы “Векавы набат” пісаў:

Сягодня пад сваё крыло
Збірае ўсіх нас наша маці,
Усім месца хопіць за сталом
У беларускай нашай хаце.

У адзін з дзён у музычнай школе імя Чурлёніса сабралася

больш за двесце беларусаў, каб стварыць у Літве Таварыства Беларускай Культуры. Сярод іх быў і Кастусь Шышэя. І калі ў зале залунаў бел-чырвона-белы сцяг, Косці здавалася, што на гэты раз беларускі народ ужо не ўпусціць свайго шанца і давядзе адраджэнчаскую справу беларускасці да перамогі. Яму здавалася, што і сам ён у той дзень памаладзеў. Менавіта на тым сходзе былі прыняты ўсу неабходныя для рэгістрацыі ТБК дакументы і быў абраны старшыня Таварыства. Ім стаў Хведар Нюнька, з якім Шышэі таксама сталі вельмі блізкімі сябрамі.

І Косця і Лёдзя актыўна ўключыліся ў беларускую справу. Яны ўдзельнічалі амаль ва ўсіх праводзімых ТБК мерапрыемствах, жыва цікавіліся тымі зьмяненнямі, якія адбываліся на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў Беларусі. І вельмі перажывалі, калі ў 1996 годзе там быў здзейснены дзяржаўны пераварот, і беларусь стала вяртацца да савецкіх чысоў: замест нацыянальнага беларускага сцяга, вывесілі, як выказаўся Косця, “кусок чырвонай дзяругі з зялёнай каймой”, а замест устаяўшагася на працягу доўгіх гадоў герба “Пагоні” пачапілі, навогул, няведама што, ганьбіцца беларуская мова і нацыянальныя традыцыі, груба парушаюцца правы чалавека, на чале дзяржавы сталі або расійцы, або іх слугі, якія ніколі не мелі сваёй нацыянальнай годнасці.

На жаль, большая па колькасці частка і беларусаў, якія жывуць у Літве па тых ці іншых прычынах сталі падтрымліваць той дыктатарскі рэжым, які сёння пануе на Беларусі. А некаторыя, навогул, сталі супрацоўнічаць з лукашэнкаўскімі чыноўнікамі з беларускай амбасады. Гаворачы аб такіх людзях, Косця адзначыў, што ён не разумее іх, як яны могуць падтрымліваць “гэткага манкурта, узгадаванага расійскімі шавіністамі”. У той жа час Кастусь вельмі высока цэніць дзейнасць Хведара Нюнькі, які цвёрда стаіць на нацыянальна-свядомых пазіцыях і робіць усё для таго, каб на гэткіх пазіцыях стаяла і ўсё ўзначальваемае ім Таварыства.

Калі я пазнаёміўся з Шышэямі, Косця ўжо стаў недамагаць; дае аб сабе ведаць усё тое ж сэрца, якое і зараз не застаецца абыякавым і да тых падзей, якія адбываюцца ў Беларусі, і да беларускіх спраў у Вільні. Напрыклад, калі ў камуністычнай газэце “Товарищ” з`явіўся паклёп на яго былога камандзіра Барыса Рагулю, Кастусь адразу даў паклёпнікам адлуп. Ён лічыць вельмі крыўдным для сябе і многіх іншых беларусаў-

патрыётаў, што “прайшло больш як паўвеку часу, а ў лукашэнкаўскай Беларусі і сёння ўзводзіцца паклёп на нацыянальны ўздым у той цежалейшы перыяд для нашай Радзімы на людзей адданых барацьбе за незалежнасць нашай Бацькаўшчыны”. А Лёдзя і зараз прыходзіць на ўсе мерапрыемствы, якія адбываюцца ў памяшканні ТБК у Літве.

Пішучы дадзены аповед, я многа разоў бываў у Шышэяў і змог адчуць, што і турмы, і сталінскія лагеры аказаліся бязсільнымі і не маглі вытравіць з душаў гэтых людзей беларускую дабрату і прыстойнасць, іх любоў да Маці-Радзімы. Аб гэтым сведчыць і пісьмо Косці, якое ён напісаў аднаму са сваіх сяброў 17 ліпеня 2000 года, калі яму ішоў ужо 78-ы год:

**Добры дзень дарагія Н. і А.!**

Вельмі дзякуям за паздраўленне, а таксама за пісьмо, у якім апісваеш жыццё-быццё як сваё так і блізкіх сяброў.

Насунуўшаяся старасць, а з ёю надакучлівыя здравотныя недамаганні выбілі нас з абычнага нам штодзённага жыцця, із-за чаго мы цяжка перажываем. Аднак у жыцці кожнаму гэты прамяжутак часу неабходна прайсці , дык пастараемся прайсці яго па-чалавечы, спакойна і ганарова. А. пішаш, што цябе “мучыць сумленне за безрэзультатыўнае пражытае жыццё”. Ці ж гэта так? Я гэтага не адчуваю, было бы крыўдна сёння, каб мы ў цяжкі час для Бацькаўшчыны сталі ў шэрагі варожых груповак нашай Радзімы, маю на ўвазе, руска-бальшавіцкую партызанку, ці польскую АК. Ганаруся, што выбар мой праўдзівы і чэсны, калі ў крытычны момант для Радзімы мне давялося стаць у абароне сямей ды і ўсяго насельніцтва нашых вёсак і гарадоў.

Лічу, што служачы ў эскадроне і нясучы вызваленчы наш бел-чырвона-белы штандар, - гэта гонар усіх нашых сяброў па змаганню.

Няхай стыдзяцца тыя, у каторых бразгаюць на грудзях бальшавіцкія медалі за партызанскія дзеянні ў атрадах забойцаў падобных на камандзіраў Міцькі-марака, каторы праславіўся сваім садзізмам над насельніцтвам.

Не, брат, у далейшай гісторыі высветліцца, хто з нашага пакалення пайшоў шляхам безкарыснага змагання за народную Волю.

Жыццёвы шлях наш цяжкі, але мы выстаялі ганарова і сёння

спаткаўшыся з наваградчанамі можам з любым гутарыць, не апускаючы вочы. Таму што крыўды за свае дзеянні, служачы ў эскадроне, нікому не зычылі.

З глыбокай да вас Лёдзя і Кастусь павагай!

З гэтымі людзьмі заўжды хочацца быць, з імі размаўляць і чэрпаць у іх той багаты вопыт, які яны набылі за сваё нялёгкае жыццё. Да таго ж гэта вельмі акуратныя і знешне прыгожыя людзі, таму, калі на іх глядзіш, дык і зараз хочацца параўнаць іх з Арлом і Чайкай, якія сваім палётам прыносяць асалоду позіркам і душам тым, каму пашчасціла іх бачыць і ведаць.

KAMUNIKAT.org